ДАПАМОЖНІК
ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ДЛЯ ПАСТУПАЮЧЫХ У ВЫШЭЙШЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ

ДАПАМОЖНІК ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

ДЛЯ ПАСТУПАЮЧЫХ У ВЫШЭЙШЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ



Пад рэдакцыяй
А.Г.Каханоўскага, Ю.Л.Казакова, У.А.Сосны,
П.А.Лойкі, В.І.Менькоўскага

Мінск
НКФ "Экаперспектыва"
1995

ББК 63.3(4 Бел)я 729
Д 19
УДК 947.6 (075.4)

Аўтары: А.Л.Абецэдарская, П.І.Брыгадзін, Л.А.Жылуновіч, П.І.Зялінскі, У.П.Емельянчык, А.П.Ігнаценка, Т.П.Казакова, Ю.Л.Казакоў, А.Г.Каханоўскі, П.А.Лойка, В.І.Менькоўскі, Я.Ю.Несцяровіч, С.В.Палуцкая, М.Ф.Піліпенка, В.Р.Рудкін, Г.М.Сагановіч, У.А.Сосна, С.Я.Сяльвестрава-Куль, С.В.Тарасаў, С.М.Ходзін, В.А.Цяплова

Дапаможнік па гісторыі Беларусі для паступаюД 19 чых у вышэйшыя навучальныя ўстановы / А.Л.Абецэдарская, П.І.Брыгадзін, Л.А.Жылуновіч і інш.; Пад рэд. А.Г.Каханоўскага, Ю.Л.Казакова, У.А.Сосны, П.А.Лойкі, В.І.Менькоўскага. — Мн.:"Экаперспектыва", 1995. — 311 с.

ISBN 985—6102—11—1.

Дапаможнік уяўляе сабой кароткі нарыс гісторыі Беларусі, у якім у храналагічнай паслядоўнасці асвятляюцца факты і падзеі са старажытных часоў да нашых дзён, аналізуецца эканамічнае, палітычнае, культурнае развіццё кожнай гістарычнай эпохі. Разглядаюцца важнейшыя пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, сацыяльнай барацьбы і грамадскага руху. Дапаможнік складзены з улікам праграмы па гісторыі Беларусі для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі.

Разлічаны на настаўнікаў, вучняў сярэдніх школ, абітурыентаў, усіх, хто цікавіцца гісторыяй роднага края.

Д 9470600000

ББК 63.3(4 Бел)я 729

ISBN 985—6102—11—1

© Калектыў аўтараў, 1995

АД АЎТАРАЎ

Ва ўмовах рэалізацыі курсу на незалежнасць Рэспублікі Беларусь, ажыццяўлення працэсаў нацыянальна-культурнага адраджэння беларускага народа асабліва ўзрастае роля вывучэння гісторыі Беларусі. Справа не толькі у тым, што пашыраецца кола асоб, якія жадаюць задаволіць цікавасць да гісторыі, а і павялічваецца патрэбнасць у асэнсаванні гістарычнага шляху, пройдзенага Беларуссю.

У дадзеным дапаможніку асвятляюцца асноўныя гістарычныя падзеі ў жыцці краіны са старажытных часоў да нашых дзён. У ім аналізуецца эканамічнае, сацыяльнае, палітычнае і культурнае развіццё кожнай гістарычнай эпохі, разглядаюцца важнейшыя пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, сацыяльнай барацьбы і грамадскага руху.

Дапаможнік не замяняе ьучэбнай літаратуры па курсу гісторыі Беларусі. Яго мэтазгодна выкарыстоўваць, працуючы з дзеючымі цяпер школьнымі падручнікамі. Значную дапамогу ў засваенні матэрыялу даюць карты і розныя даведачныя публікацыі: слоўнікі, энцыклапедыі, дапаможнікі ў форме пытанняў і адказаў, успаміны ўдзельнікаў знамянальных падзей, хрэстаматыі з падборам дакументаў, мастацкая гістарычная літаратура.

Пры падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў неабходна карыстацца праграмай, якая публікуецца ў даведніку для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь.

РАЗДЗЕЛ 1

ПЕРШАБЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

1. Каменны і бронзавы вякі на беларускіх землях

Пачатак гісторыі Беларусі адносіцца, як вядома, да каменнага веку, які ахоплівае сотні тысяч гадоў. За гэты час чалавек, які жыў на яе тэрыторыі, авалодаў тэхнікай апрацоўкі каменя і косці, навучыўся будаваць жыллё. Галоўнымі сродкамі яго існавання былі паляванне і збіральніцтва.

Каменны век паклаў пачатак самай працяглай у гісторыі чалавецтва сацыяльна-эканамічнай фармацыі — першабытнаабшчыннаму ладу. Яна складае эпоху ад паяўлення чалавецтва (па апошніх даных, каля 3 млн гадоў назад) да станаўлення сацыяльнай няроўнасці і ўтварэння дзяржаў.

Распрацаваны дзве перыядызацыі першабытнага грамадства: сацыяльна-гістарычная і археалагічная. У адпаведнасці з першай выдзяляюцца тры перыяды (этапы, ступені): 1) станаўленне старажытнага чалавечага грамадства (першабытны чалавечы статак); 2) родавая абшчына (матрыярхат); 3) разлажэнне першабытнаабшчыннага ладу і пераход да сацыяльнай няроўнасці (патрыярхат, суседская абшчына).

Паводле археалагічнай перыядызацыі, гісторыя першабытнага грамадства падраздзяляецца на вякі: каменны — 3 млн гадоў таму назад — канец 3-га тысячагоддзя да н.э.; бронзавы — мяжа III — II — VIII — VII стст. да н.э.; жалезны — ад VII ст. да н.э. да VIII ст. н.э. Па тэхніцы апрацоўкі сыравіны каменны век падзяляецца на палеаліт (старажытнакаменны век), мезаліт (сярэднекаменны век) і неаліт (новакаменны век). У сваю чаргу палеаліт падзяляецца на ранні, ці ніжні, сярэдні і позні, ці верхні. Кожны з гэтых перыядаў мае свае дзяленні на археалагічныя эпохі, ці культуры.

На тэрыторыі Беларусі людзі з'явіліся ў сярэднім палеаліце (прыкладна 100 — 35 тыс. гадоў таму назад), аб чым сведчаць грубаабабітыя прылады працы з крэменю, знойдзеныя каля вёсак Падлужжа (Чачэрскі раён), Кляевічы (Касцюковіцкі раён), Абідавічы на Дняпры (Быхаўскі раён), Свяцілавічы на Бесядзі (Веткаўскі раён). Чалавек тут быў прадстаўлены неандэртальцамі (назву атрымалі ад

знаходак частак шкілета ў даліне Неандэрталь у Германіі ў 1956 г.), непасрэднымі папярэднікамі людзей сучаснага тыпу, якія захавалі і ў абліччы і ў паводзінах звярыныя рысы. Тэрыторыя Беларусі, такім чынам, уваходзіла ў зону, дзе адбываўся працэс антрапагенезу, г. зн. эвалюцыі з'яўлення першабытнага чалавека.

Перыяд першабытнага чалавечага статка характарызаваўся пераважна прысваеннем гатовых прадуктаў прыроды. Людзі ў пошуках ежы вандравалі невялікімі групамі, займаліся збіральніцтвам, рыбалоўствам, паляваннем. Аб'ектамі палявання з'яўляліся алені, быкі, коні, маманты, шарсцістыя насарогі. Палявалі першабытныя людзі калектыўна. Звычайна яны наладжвалі аблавы з выкарыстаннем агню, заганялі жывёлу на высокія абрывы, у багну, лоўчыя ямы і г.д. Зброяй, напэўна, былі дубінкі з цвёрдага дрэва з абпаленым канцом. Шырока ўжывалася і кідальная зброя з крамянёвымі наканечнікамі. Жыццё гэтых людзей было вельмі цяжкім і небяспечным. Большасць з іх не дажывалі да 20 гадоў: адны гінулі ў барацьбе з драпежнікамі, іншыя — ад хвароб і голаду.

Удасканаленне паляўнічай зброі і спосабаў здабычы матэрыяльных сродкаў спрыяла стварэнню запасаў ежы, працягламу знаходжанню паляўнічых калектываў на адным месцы.

Найбольш добра захаваныя рэшткі жылля познапалеалетычнага чалавека выяўлены на стаянках паблізу вёсак Бердыж і Юравічы. На бердыжскім паселішчы знойдзены рэшткі чатырох паўзямлянак і пяці гаспадарчых ям. Паўзямлянкі авальнай, паўавальнай і прадаўгаватай формы былі заглыблены ў зямлю на 0,5 — 0,6 м. Фундамент складалі буйныя косці маманта, сцены — плоскія косці, пастаўленыя вертыкальна, і трубкаватыя косці, пакладзеныя адна на адну гарызантальна ў выглядзе муроўкі. Падпоркамі для іх служылі чарапы маманта. У цэнтры двух жытлаў былі адкрыты вогнішчы, якія сведчаць аб тым, што жыхары былі знаёмы з агнём і ўмелі яго здабываць. Выкарыстанне агню мела велізарнае значэнне для развіцця першабытнага грамадства. Яно давала магчымасць рассяляцца на большай тэрыторыі і ўжываць у ежу новыя прадукты.

Даследаванні рэшткаў пастаяннага жылля дазволілі зрабіць вывад, што сацыяльнай ячэйкай эпохі верхняга палеаліту была ўжо парная сям'я. Некалькі парных, напачатку яшчэ няўстойлівых сем'яў аб'ядноўваліся ў абшчыну,

або род. Ён складаўся з нашчадкаў адной пэўнай родапачынальніцы — маці. У той час існавала экзагамія, г. зн. звычай, які забараняў шлюбныя сувязі ўнутры роду: муж, з аднаго боку, і жонка, з другога, павінны былі належаць да розных абшчын (родаў). Асновай абшчыны з'яўлялася група родзічаў па маці, г. зн. мацярынскі род. Ён і быў асноўным гаспадарчым і грамадскім ядром. Уся маёмасць, якая знаходзілася ў агульным карыстанні, і большасць сродкаў вядзення гаспадаркі належалі роду. Некалькі абшчын, звязаных экзагамнымі адносінамі, утваралі племя.

Аднак у хуткім часе прыродныя ўмовы пагоршыліся. Наступілі жорсткія халады, і людзі пакінулі тэрыторыю Беларусі амаль на 10 тыс. гадоў. Шматметровы пласт суглінкаў перакрыў колішнія стаянкі першабытных людзей і тым самым захаваў іх рэшткі да нашых дзён. Жыццё людзей працягвалася толькі на поўдні Беларусі — у басейне Дзясны (стаянкі Елісеевічы, Мезін, Юдзінава), на сярэднім Дняпры, Днястры і Гарыні.

На працягу 12 — 10-га тысячагоддзяў да н.э. ледавік адступае. Клімат становіцца больш цёплым і вільготным. Стварыліся спрыяльныя ўмовы для распаўсюджвання лясоў. Змянілася і фауна: буйныя млекакормячыя ледніковай эпохі — маманты і насарогі — вымерлі. Паўночны алень, пясец, прыстасаваныя да халоднага клімату, прасунуліся далёка на поўнач. Шырока распаўсюдзіліся тур, лось, кабан, мядзведзь, воўк, лісіца і інш. Рэкі і азёры напоўніліся рыбай.

У 6 — 2-м тысячагоддзях да н.э. раслінны і жывёльны свет на тэрыторыі Беларусі ўжо мала адрозніваўся ад сучаснага. У гэты час насельніцтва, якое тут жыло, як і насельніцтва ўсёй Еўропы, зрабіла буйны крок у развіцці прадукцыйных сіл. Самым важным дасягненнем было пашырэнне шліфавання і свідравання каменных прылад, якія зрабілі працу людзей больш прадукцыйнай. У сувязі з новай тэхнікай апрацоўкі каменя гэты перыяд прынята называць новакаменным векам, або неалітам.

Пачаткам неаліту лічаць час вынаходства спосабу вырабу глінянага посуду, канцом — з'яўленне металургіі.

Посуд ляпілі ўручную. З гліны і расліннай прымесі, а пазней прымесі пяску або тоўчанага каменя выцягваліся ленты. Яны налепліваліся на спіралі, утвараючы венца, тулава і донца посуду. Пасудзіна атрымлівалася вастрадонная, з прамымі сценкамі, іншы раз злёгку звужанымі ўверсе. Паверхня, асабліва ўнутраная, часта загладжвалася

зубчастым штампам. Пасудзіна пакрывалася арнаментам, прасушвалася і абпальвалася на агні.

Авалоданне прыёмамі лепкі і абпалу посуду палепшыла спосабы прыгатавання ежы і дазволіла прадоўжыць тэрмін яе захавання. Гэта дасягненне садзейнічала пераходу да аселага спосабу жыцця.

На тэрыторыі Беларусі выяўлена больш за 500 паселішчаў, якія адносяцца да розных перыядаў эпохі неаліту. Невялікія паселішчы з наземнымі паўзямлянкавымі жытламі размяшчаліся найчасцей на рачных тэрасах малых рэк, на берагах старыц і пясчаных дзюнах. Існуе меркаванне, што да канца эпохі неаліту на тэрыторыі Беларусі пражывала каля 5 — 6 тыс. чалавек.

Асноўнымі заняткамі насельніцтва ў гэты час былі паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Пад канец эпохі пашырыліся вытворчыя формы гаспадаркі — прымітыўнае земляробства і жывёлагадоўля.

Матэрыяльная культура неалітычных плямён не была аднароднай. Разам з агульнымі рысамі ў ёй ужо выяўляюцца і адрозненні. Асабліва гэта датычыцца форм глінянага посуду і яго арнаментацыі.

Археалагічныя даныя дазволілі высветліць, што на тэрыторыі Беларусі ў неалітычную эпоху жылі тры вялікія групы плямён. Паколькі сапраўдныя назвы гэтых плямён невядомы, іх культуры прынята называць паводле тыпу арнаментацыі на посудзе, а таксама па формах гаршкоў або па абласцях іх распаўсюджання.

На Беларускім Палессі і на тэрыторыі Украіны ў гэты час склалася культура грабеньчата-накольчатай керамікі. Асноўная вобласць яе распаўсюджання апрача Палесся ахоплівала тэрыторыю Украіны паміж Дняпром і Данцом. Таму і культура была названа днепра-данецкай. Прадстаўнікі гэтай культуры выраблялі шыракагорлыя вастрадонныя гаршкі, упрыгожаныя адбіткамі грэбеня і наколамі, і мікралітычныя прылады працы — лістападобныя, пласцінчатыя наканечнікі стрэл, таксама серпападобныя нажы, долаты, цёслы, невялікія трапецападобныя сякеры і інш.

Раскопкі паселішчаў культуры грабеньчата-накольчатай керамікі ажыццяўляліся паблізу вёсак Слабодка і Юравічы Калінкавіцкага раёна на ніжняй Прыпяці. Устаноўлена, што паселішчы складаліся з некалькіх невялікіх памяшканняў, размешчаных на беразе ракі або возера. Адно з такіх памяшканняў, па форме блізкае да авала

даўжынёй 4 м пры шырыні каля 3 м і паглыбленае ў зямлю на 0,8 м, было раскапана на беразе возера Ліцвін. Унутры яго захаваліся рэшткі ачага, выкладзенага каменем. На паселішчы, якое размяшчалася паблізу, выяўлены наземныя памяшканні як з ачагамі, выкладзенымі з каменя, так і без выкладак.

Прадстаўнікі днепра-данецкіх плямён былі еўрапеоідамі — познімі краманьёнцамі, рослымі, шыракатварымі, з высокім чэрапам. Яны насілі адзенне з выраблены скур жывёлы, каралі і падвескі з шліфаваных пласцінак, ракавін і клыкоў. Іх адзенне, галаўныя ўборы і нават абутак упрыгожваліся касцянымі пласцінкамі, зубамі аленя, дзіка, рыбы і г.д.

Другая група плямён засяляла вярхоўі Дняпра і Сажа. Для верхнедняпроўскай культуры характэрны посуд, арнаментаваны ямачнымі і "лапкавымі" адбіткамі. Наколы амаль адсутнічаюць. З гэтай прычыны кераміку называюць грабеньчата-ямачнай. Яна знойдзена на стаянках ля вёсак Весць Быхаўскага, Лучын і Хадосавічы Рагачоўскага, Стрэліца і Рудня Шлягінская Веткаўскага, Сябровічы Чачэрскага, Струмень Кармянскага раёнаў.

Трэцяя група неалітычных плямён рассялялася ў вярхоўях Прыпяці, па Ясельдзе і ў басейне Нёмана. Плямёны нёманскай культуры займаліся вырабам вастрадоннага таўстасценнага посуду, пад венцам якога наносіліся наколы, насечкі і перакрэсленыя рысы. Большая ж частка паверхі посуду не арнаментавалася.

Помнікі з падобнай керамікай выяўлены пры раскопках ля вёсак Лысая Гара Стаўбцоўскага, Добры Бор Баранавіцкага, Камень Пінскага, Русакова Слонімскага раёнаў і ў іншых месцах.

Каля 2000 г. да н.э. насельніцтва еўразійскага рэгіёна ўступіла ў перыяд, які ў археалогіі мае назву бронзавага веку.

Выкарыстанне металу зрабіла глыбокі пераварот у развіцці прадукцыйных сіл, выклікала вялікія змены ў грамадскіх адносінах, аказала значны ўплыў на далейшы ход гістарычнага працэсу. У стэпавых і лесастэпавых раёнах назіраліся значныя перамяшчэнні жывёлагадоўча-земляробчых плямён, разгортваліся барацьба за пашу, заваёвы зямель, зліццё плямён. Працягвалася фарміраванне буйных этнічных і культурных супольнасцей.

На тэрыторыі Беларусі не знойдзена слядоў вырабу медных і бронзавых прадметаў. Гэта тлумачыцца тым, што

тут не сустракаецца выкапняў медзі. Медныя і бронзавыя прылады працы, якія знойдзены пераважна ў могільніках (каля 80 бронзавых і некалькі медных рэчаў), сваімі формамі ўказваюць на паходжанне іх з іншых, сумежных, тэрыторый.

Сярод прылад працы мясцовага вырабу асабліва былі пашыраны сякера і матыка, што выкарыстоўваліся пры апрацоўцы зямлі, лук са стралою — пры паляванні, човен і сець — для лоўлі рыбы. Важнейшымі заняткамі людзей гэтага перыяду робяцца матычнае земляробства і жывёлагадоўля. Распачаўся пераход да вытворчай гаспадаркі, які надаў большае значэнне мужчынскай працы. Магчыма, толькі тады стала практыкавацца перасяленне жонкі ў род мужа. Гэта новая з'ява сведчыла пра пачатак разлажэння матрыярхату. Аднак роля жанчыны як захавальніцы старажытных звычаяў і абрадаў, прадказальніцы і знахаркі захоўвалася яшчэ працяглы час. Больш таго, занятак земляробствам, гадоўля буйной рагатай жывёлы, будаўніцтва дамоў, наяўнасць пласкадоннага посуду яскрава сведчаць, што тагачасныя плямёны вялі аселае жыццё. Іх паселішчы былі невялікімі, без ахоўных збудаванняў і размяшчаліся ля рэк і азёр. Рэшткі многіх такіх паселішчаў сустракаюцца па ўсёй тэрыторыі Беларусі, асабліва па берагах Дняпра, Сажа, Прыпяці, Нёмана.

2. Насельніцтва Беларусі ў раннім жалезным веку (VII ст. да н.э. — V ст. н. э.)

У VII — VI стст. да н.э. плямёны, што жылі на тэрыторыі Беларусі, як і іншыя плямёны Усходняй Еўропы, навучыліся здабываць жалеза і вырабляць з яго прылады працы, зброю, упрыгожанні. Адкрыццё жалеза азначала пераварот у гісторыі чалавецтва. Вырабы з жалеза далі магчымасць чалавеку ажыццяўляць земляробства на вялікіх плошчах, расчышчаць пад ворыва шырокія масівы, узводзіць больш трывалыя жылыя і гаспадарчыя памяшканні, забяспечылі далейшае развіццё іншых галін хатняга рамяства — апрацоўку дрэва, косці і інш.

Жалеза здабывалася з балотнай жалезнай руды, якой была багата тэрыторыя Беларусі. Для гэтага будавалі невялікія прымітыўныя плавільныя печы ("домніцы"). Ля самага дна печы мелася адтуліна, куды ўстаўляліся гліняныя трубкі — соплы. У домніцу засыпалі пластамі

драўляны вугаль (часткова падпалены) і руду. Пры дапамозе мяхоў у печ нагняталі халоднае "сырое" паветра. Таму працэс, які адбываўся ў печы, даследчыкі называюць сыродутным. Выплаўленае жалеза затым некалькі разоў пракоўвалі ў кузні. На гарадзішчах каля вёсак Лабеншчына Мінскага, Свідна Лагойскага, Цербахунь Віцебскага раёнаў выяўлены амаль цэлыя печы-домніцы, а каля в. Урагва Верхнядзвінскага і в. Буракова Гарадоцкага раёнаў — майстэрні, у якіх апрацоўвалі жалеза.

Сыродутны спосаб здабычы жалеза патрабаваў ад старажытных людзей вялікіх намаганняў і ведаў.

Жалеза пачало ўжывацца для вырабу шматлікіх прылад працы, з якіх асабліва важнае значэнне мелі сякера і матыка. Ужыванне жалезнай сякеры дазволіла высякаць лясы пад пасевы на значнай тэрыторыі. Страціўшы свой першапачатковы "агародны" характар, земляробства стала больш прадукцыйным і ператварылася ў галоўны занятак насельніцтва, што жыло на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Па спосабу падрыхтоўкі глебы да пасеву сістэма земляробства атрымала назву ляднай, ці падсечнай. Палі апрацоўвалі наступным чынам. На месцы, выбраным для пасеву, высякалі лес. Ссечаныя дрэвы спальвалі, а попел выкарыстоўвалі ў якасці ўгнаення. Верхні пласт глебы разрыхлялі жалезнымі матыкамі, затым сеялі зерне і баранавалі поле драўлянай бараной — "сукаваткай". Калі ўраджайнасць зніжалася, распрацаваныя дзялянкі пакідалі і пераходзілі на іншыя, папярэдне падрыхтаваныя такім жа чынам.

Аб развіцці ляднага земляробства на тэрыторыі Беларусі сведчаць выяўленыя пры раскопках жалезныя сякеры і матыкі, каменныя зерняцёркі, зярняты пшаніцы, гароху, бабоў і вікі. Рэшткі гэтых раслін у абвугленым выглядзе знойдзены пры раскопках Банцараўскага гарадзішча каля Мінска, зерне пшаніцы — на гарадзішчы Загорцы Гарадоцкага раёна і на Збаровіцкім гарадзішчы каля Заслаўя, а адбіткі зярнят пшаніцы на гліняных пасудзінах — на гарадзішчах Гарошкаў Рэчыцкага раёна і паблізу Чапліна Лоеўскага раёна. Ураджай зжынали жалезнымі сярпамі. Ад сярпоў больш позняга часу яны адрозніваліся адсутнасцю насечкі на лязе, значна меншымі памерамі і невялікай выгнутасцю. Зерне расціралі на каменных зерняцёрках.

Разам з земляробствам развівалася і жывёлагадоўля, якая набывала ўсё большае значэнне ў гаспадарцы. Мяркуючы па рэштках касцей, знойдзеных на паселішчах,

тагачасныя жыхары разводзілі перш за ўсё буйную рагатую жывёлу. Дробная рагатая жывёла, а таксама коні, свінні адыгрывалі другарадную ролю. Паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва сталі падсобнымі заняткамі.

З ужываннем жалезных прылад працы, з развіццём ляднага (падсечнага) земляробства і жывёлагадоўлі мужчына заняў у абшчыннай гаспадарцы роду пануючае становішча. Праца жанчыны ў гаспадарцы страціла сваё ранейшае першынствуючае значэнне. У сувязі з гэтым нашчадкі па мужчынскай лініі заставаліся ў яго родзе, а паходжанне пачало лічыцца не па маці, а па бацьку. Так на змену мацярынскаму прыйшоў бацькоўскі (патрыярхальны) род.

У грамадскім ладзе плямён ужо ў самым пачатку жалезнага веку вызначыліся прыкметы разлажэння першабытнаабшчынных адносін. У выніку росту прадукцыйных сіл і шырокага распаўсюджання жалезных прылад працы з'явілася магчымасць назапашваць унутры роду больш матэрыяльных каштоўнасцей, жалезных прылад працы, зброі, збожжа, жывёлы, прадуктаў палявання і інш. А гэта прывяло да ўзнікнення супярэчнасцей паміж родамі і плямёнамі, да частых ваенных сутыкненняў паміж імі.

Працэс разлажэння першабытнаабшчыннага ладу знайшоў адлюстраванне і ў характары паселішчаў. Асноўным іх тыпам становяцца ўмацаваныя гарадзішчы. Першапачаткова такія паселішчы абгароджваліся толькі драўлянай сцяной, потым сталі выкопваць глыбокія равы, насыпаць валы, павялічваць стромкасць схілаў і інш. Наяўнасць матэрыяльных каштоўнасцей у сем'яў і родаў выклікала імкненне ў суседзяў гвалтоўна захапіць іх. Зразумела, што здабычай пераможцаў станавіліся не толькі каштоўнасці, але і людзі, якіх ператваралі ў рабоў. Так узнікла патрыярхальнае рабства і зараджалася эксплуатацыя.

Трэба адзначыць, што разлажэнне першабытнаабшчынных адносін у плямён, якія жылі на поўдні Беларусі па суседству са скіфа-сармацкімі плямёнамі, пачалося значна раней і мела больш інтэнсіўны характар, чым у цэнтры і на поўначы Беларусі. Вялікія абшчынныя дамы, якія адпавядалі таму часу, калі патрыярхальная сям'я з'яўлялася яшчэ адзіным калектывам, на поўдні зніклі не пазней трэцяй чвэрці 1-га тысячагоддзя да н.э. і ўступілі месца індывідуальнаму жыллю, якое прызначалася для індывідуальнай сям'і.

Археалагічныя помнікі сведчаць, што ў гэтых плямён

ужо ўзнікла маёмасная няроўнасць. У Чаплінскім могільніку (в. Чаплін Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці), напрыклад, знойдзены параўнальна багатыя пахаванні з мноствам розных рэчаў, у тым ліку са зброяй, і бедныя, дзе рэчаў амаль не было.

У I — II стст. н.э. на поўдні Беларусі насельніцтва пакінула ўмацаваныя гарадзішчы і пасялілася на адкрытых месцах — селішчах. Даследчыкі мяркуюць, што гэта адбылося ў выніку ўзнікнення вялікіх племянных аб'яднанняў, у межах якіх для кожнай асобнай абшчыны адпала неабходнасць ва ўмацаваных паселішчах.

У выніку вывучэння археалагічных помнікаў устаноўлена, што ў перыяд жалезнага веку тэрыторыю Беларусі засялялі некалькі вялікіх племянных груп. Гэта былі даволі ўстойлівыя аб'яднанні, у склад якіх уваходзілі плямёны, што не пакідалі свайго жыхарства на працягу многіх стагоддзяў. Племянныя групы былі аб'яднаны агульнасцю тэрыторыі, аднолькавым характарам жылля і паселішчаў, тоеснасцю пахавальных абрадаў і г.д.

У раннім жалезным веку тэрыторыі сучасных Гомельскай, поўдзень Магілёўскай і Мінскай, паўднёвы ўсход Брэсцкай абласцей, а таксама значную частку паўночнай Украіны займалі плямёны мілаградскай культуры (ад назвы в. Мілаграды Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці). На поўначы мяжа іх рассялення даходзіла да Слуцка, Бабруйска, Рагачова, Крычава. Тут яны межавалі з плямёнамі штрыхаванай керамікі. На поўдні Украіны мілаградскія плямёны займалі прастору да р.Рось, дзе яны суседнічалі са скіфскімі плямёнамі. Усходнімі суседзямі плямён мілаградскай культуры былі плямёны юхноўскай культуры, якія жылі ў басейне Дзясны на тэрыторыі сучаснай Бранскай і суседніх з ёю абласцей. На захадзе з мілаградцамі суседнічалі плямёны лужыцкай і ўсходнепаморскай культур, якія жылі ў басейне Вісты.

Прадстаўнікі мілаградскай культуры жылі на ўмацаваных гарадзішчах і неўмацаваных паселішчах у паўзямлянках, а таксама ў невялікіх жытлах слупавой канструкцыі. Займаліся яны земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рамёствамі, здабычай і апрацоўкай жалеза. Гэтай культуры ўласцівы своеасаблівыя рысы, якія вылучаюць яе сярод іншых культур ранняга жалезнага веку. Найбольш характэрная з іх кераміка. Пераважнай формай посуду былі кругладонныя гаршкі з рэзка адагнутым венцам. У верхняй частцы пасудзіна часта пакрывала-

ся арнаментам, які складаўся з круглых увагнутасцей на ўнутраным і знешнім баках сценак, а таксама з розных па форме і глыбіні ямак. Пахавальны абрад — трупаспаленне і трупапалажэнне на бескурганных і курганных могільніках. На думку адных археолагаў, мілаградская культура належала славянам. Але існуе і другая думка вучоных, якія адносяць яе да балцкай.

У канцы 1-га тысячагоддзя да н.э. у Верхнім і Сярэднім Падняпроўі, дзе раней жылі плямёны мілаградскай культуры, склалася зарубінецкая культура (па назве сяла Зарубінцы Пераяслаў-Хмяльніцкага раёна Кіеўскай вобласці). Насельніцтва гэтых тэрыторый займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, здабычай і апрацоўкай жалеза і рамёствамі. Прылады працы, зброя, упрыгожанні сталі ў параўнанні з рэчамі мілаградскай культуры больш разнастайнымі і дасканалымі. Прадстаўнікі зарубінецкай культуры падтрымлівалі сувязі з кельтамі, сарматамі, скіфамі, антычнымі гарадамі Паўночнага Прычарнамор'я, паўночнымі правінцыямі Рымскай імперыі, пра што сведчаць знаходкі рэчаў з эмаллю, бронзавага посуду, рымскіх манет і г.д.

У VII ст. да н.э. — IV ст. н.э. басейны Нёмана, Заходняй Дзвіны і Верхняе Падняпроўе засяляла група індаеўрапейскіх плямён штрыхаванай керамікі, якія лічацца балцкімі. На поўдні і паўднёвым усходзе іх суседзямі былі іранамоўныя плямёны (скіфы, сарматы) і славяне, што жылі ў басейне Прыпяці, на поўначы і паўночным усходзе — фіны, на захадзе і паўднёвым захадзе — славяне (у басейне Віслы і ў Паўднёвай Прыбалтыцы) і германцы.

Паводле даных археалогіі і мовазнаўства, балты фарміраваліся ў эпоху позняга неаліту і бронзы (канец 3-га — 2-е тысячагоддзе да н.э.). У пісьмовых крыніцах балты ўпершыню ўпамінаюцца ў канцы I ст. н.э. (Тацыт); у скандынаўскіх хроніках IX ст. называюцца куршы, земгалы, прусы; у старажытнарускіх летапісах (XI ст.) — куршы, латгалы, прусы, яцвягі, пазней (XII ст.) — літва, жмудзь і інш.

На поўначы Беларусі і на суседняй з ёю тэрыторыі ў 1-м тысячагоддзі да н.э. і ў першай палове 1-га тысячагоддзя н.э. жылі плямёны, культура якіх была падобна да культуры штрыхаванай керамікі. У археалогіі яна, як і іншыя культуры, не мела спецыяльнай назвы. У сувязі з тым што асноўная маса паселішчаў гэтай культуры размяшчалася ў басейнах Дняпра і Заходняй Дзвіны, умоўна яе назвалі днепра-дзвінскай.

Плямёны днепра-дзвінскай культуры засялялі даволі вялікую тэрыторыю. На поўдні яны межавалі з плямёнамі штрыхаванай керамікі, на паўднёвым усходзе і на Смаленшчыне — з плямёнамі юхноўскай культуры, на ўсходзе, у заходняй частцы волга-окскага басейна — з плямёнамі дзякаўскай культуры, на поўначы, паўночным захадзе і захадзе — са старажытнымі плямёнамі Прыбалтыкі.

Асноўным тыпам паселішчаў плямён днепра-дзвінскай культуры з'яўляліся ўмацаваныя гарадзішчы, што былі размешчаны галоўным чынам на берагах рэк і азёр, якія мелі заліўныя лугі і зручныя зямельныя ўгоддзі. У эканамічным жыцці гэтыя плямёны адставалі ад сваіх паўднёвых суседзяў. Жалезны век тут пачаўся на некалькі стагоддзяў пазней, а таму, паводле даных археалагічных раскопак, у гэтых плямён доўгі час асноўную ролю ў гаспадарцы адыгрывалі не земляробства, а жывёлагадоўля і паляванне. Толькі к канцу 1-га тысячагоддзя да н.э. каменныя і касцяныя прылады тут саступаюць месца жалезным, у выніку чаго земляробства і жывёлагадоўля становяцца галоўнымі галінамі гаспадаркі.

Пытанне аб этнапрыналежнасці днепра-дзвінскай культуры ў навуцы канчаткова не вырашана. Большасць даследчыкаў лічыць, што яе стварылі ўсходнебалцкія плямёны. На карысць гэтай думкі сведчыць той факт, што назвы рэк і азёр на тэрыторыі, дзе размяшчаліся паселішчы днепра-дзвінскай культуры (Воп, Каспля, Лучоса, Обаль і інш.), паходзяць ад старажытных балцкіх моў.

РАЗДЗЕЛ 2

ПАХОДЖАННЕ БЕЛАРУСАЎ

Славяне шырока рассяляліся на тэрыторыі нашага краю ў раннім сярэднявеччы. У яго пачатку, у прыватнасці ў VI—VIII стст. н.э., кампактна, суцэльным масівам яны жылі толькі ў самых паўднёвых раёнах сучаснай тэрыторыі Беларусі, у басейне р. Прыпяць, пераважна на поўдзень ад яе. Славянскімі з'яўляюцца археалагічныя помнікі гэтага часу Хатомель, Сямурадцы, Хільчыцы, Петрыкаў. Асноўным тыпам славянскіх пасяленняў былі селішчы (неўмацаваныя пасяленні). Звычайна яны размяшчаліся групамі (па тры — чатыры ў адной групе). Характэрны тып жытла славян — паўзямлянка. У адным з яе вуглоў, часцей за ўсё ў процілеглым ад уваходу, знаходзілася печ. Печы мелі прамавугольную або круглую форму. У кераміцы пераважалі слабапрафіляваныя гаршкі карычневага колеру. На іх звычайна не было арнаменту. У славян панаваў абрад трупаспалення. Крэмацыя адбывалася па-за межамі пахавання. Попел змяшчалі ў бескурганных магілах або ў невысокіх акруглай формы курганах, вакол якіх выкопвалі раўкі.

У VI — VII стст. н.э. славяне пачынаюць пранікаць на поўнач — у балцкі арэал. Пра гэта сведчаць славянскія культурныя элементы, якія знаходзяць у старажытнасцях тыпу Банцараўшчына — Калочын. У балцкім арэале ў гэты час з'яўляюцца паўзямлянкі з тыповым славянскім інтэр'ерам. Паўзямлянкі з печамі-каменкамі ў адным з вуглоў выяўлены ў археалагічных помніках Шчаткава ў ніжнім цячэнні Бярэзіны, Тайманава ў Магілёўскім Падняпроўі, Гарадзішча, Дзядзілавічы, Рэвячкі на Міншчыне. У балтаў ачаг знаходзіўся ў цэнтры жытла. Да славянскіх культурных элементаў адносяцца і каменныя жорны, якія знойдзены ў археалагічных помніках Гарадзішча, Дзядзілавічы. Балцкае насельніцтва карысталася каменнымі зерняцёркамі.

Масавае рассяленне славян у балцкім арэале на тэрыторыі Беларусі адбываецца ў VIII — IX стст. н.э. Вялікімі групамі яны пасяляюцца спачатку ў раёнах, размешчаных на поўнач ад р. Прыпяць. На гэтыя землі славяне прыйшлі з паўднёвага боку басейна Прыпяці. Аб гэтым сведчаць аднолькавыя назвы рэк правабярэжнай і левабярэжнай частак Прыпяцкага Палесся і басейна Бярэзіны: Случ,

Грыўка, Стаў і інш. У VIII — IX стст. н.э. славяне пасяляюцца ў Пасожжы. Гэтым часам датуюцца славянскія археалагічныя помнікі — круглыя курганы з пахаваннямі па абраду трупаспалення. У IX ст. н.э. славяне рассяліліся і ў Падзвінні. Ім належаць археалагічныя помнікі гэтага часу — круглыя (паўсферычныя) курганы. Яны размяшчаліся скучана, знаходзіліся непадалёку адзін ад аднаго. Вакол курганоў выкопвалі раўкі. К IX — X стст. н.э. славяне рассяліліся таксама ў Верхнім Панямонні. У гэты час тут з'явіліся акруглыя курганы.

Такім чынам, у VIII — IX стст. н.э. адбыліся істотныя змены ў этнічным складзе і культуры насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Вялікія групы славян пасяліліся ва ўсіх яе рэгіёнах. Пачаліся цесныя кантакты славян з мясцовым балцкім насельніцтвам. Узаемадзеянне славян і балтаў істотна змяніла іх культуру. Балцкае насельніцтва было асімілявана. Ранейшая культура тыпу Банцараўшчына — Калочын у VIII ст. знікла. У выніку славяна-балцкага сінтэзу к IX — X стст. н.э. сфарміраваліся новыя славянскія этнічныя супольнасці, што неаднаразова ўпамінаюцца ў сярэдневяковых пісьмовых крыніцах, — дрыгавічы, крывічы і радзімічы. Яны займалі ў гэты час асноўную частку тэрыторыі Беларусі.

Дрыгавічы першапачаткова засялілі значную частку Папрыпяцця. Паўднёвая мяжа дрыгавічоў праходзіла за Прыпяццю, на поўдзень ад яе. Ад суседніх драўлян дрыгавічоў аддзялялі балоцістыя мясцовасці. Потым дрыгавічы прасунуліся на поўнач, апынуліся ў вярхоўях Нёмана. Асобныя групы дрыгавічоў, магчыма, рассяляліся і далей на поўнач. Мова дрыгавічоў была славянскай. Славянскімі па паходжанню былі і такія элементы іх культуры, як буйныя металічныя пацеркі, пакрытыя зерню, пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы. Славянскімі былі сярпы, нажы, кераміка. Да элементаў балцкага паходжання ў культуры дрыгавічоў адносіліся спіральныя пярсцёнкі, змяінагаловыя бранзалеты, зоркападобныя спражкі. Аб змешаным славяна-балцкім паходжанні дрыгавічоў, верагодна, сведчыць і сама назва гэтай супольнасці. Корань гэтай назвы, магчыма, балцкі. У літоўскай мове шмат слоў з такім коранем (drėgnas — сыры, вільготны, drėgme — сырасць, вільготнасць і інш.). Словы з гэтым коранем адлюстроўваюць адну з асаблівасцей мясцовасці, на якой жыла вялікая група дрыгавічоў, менавіта вільготнасць, забалочанасць зямель у парэччы Прыпяці. На думку вядо-

мага лінгвіста Ю.Хабургаева, падобна назве суседняй балцкай супольнасці (lietuva), назва балцкай супольнасці ў парэччы Прыпяці мела форму dregnva. Пасля змешвання славян з балтамі і асіміляцыі апошніх у назве новай супольнасці, якая сфарміравалася, захавалася ранейшая балцкая аснова, да якой было дададзена славянскае "ічы". Так узнікла новая назва — дрыгавічы, якая з'явілася славянізаванай формай ранейшай балцкай назвы.

Такога ж змешанага славяна-балцкага паходжання былі і радзімічы, якія сфарміраваліся ў Пасожжы і займалі гэтую тэрыторыю ў пазнейшы час. Мова радзімічаў была славянскай. Славянскімі па паходжанню ў культуры радзімічаў былі таксама сяміпрамянёвыя кольцы, бразготкі, кераміка. Разам з тым у культуры радзімічаў мелі месца і элементы балцкага паходжання. Да іх адносіліся бранзалеты са змяінымі галовамі на канцах, бронзавыя спіралькі, касцяныя прывескі ў выглядзе качак, зоркападобныя спражкі. Назва "радзімічы", верагодна, таксама змешанага славяна-балцкага паходжання. Самымі блізкімі да гэтай назвы з'яўляюцца балцкія (літоўскія) словы radimas (знаходжанне), radimviete (месцазнаходжанне). У славянскай і балцкай назвах агульная аснова (радзім), адрозніваюцца толькі канчаткі. Назва ўсходнеславянскай супольнасці заканчваецца на славянскае "ічы".

Змешанага славяна-балцкага паходжання была і самая вялікая ўсходнеславянская супольнасць таго часу — крывічы, што сфарміравалася на тэрыторыі, размешчанай на поўнач ад дрыгавічоў і радзімічаў. Крывічы рассяляліся вельмі шырока. Паўночная мяжа крывічоў дасягнула вярхоўяў Волгі. Арэал іх рассялення, апрача Падзвіння, уключаў таксама і Верхняе Падняпроўе. Як адзначаецца ў старажытным летапісе, "кривичи иже седять на верх Волги, и на верх Двины, и на верх Днепра". Мова крывічоў была славянскай. Славянскімі па паходжанню элементамі культуры крывічоў з'яўляліся бранзалетападобныя скроневыя кольцы з завязанымі канцамі, крывіцкія бранзалеты, кераміка. Адначасова ў культуры крывічоў ёсць і элементы балцкага паходжання. Да іх адносіліся бранзалеты са змяінымі галовамі, шыйныя грыўні балцкага тыпу, галаўны вянок і інш. Змешанага славяна-балцкага паходжання, магчыма, і сама назва гэтай супольнасці. Верагодна, яна адлюстроўвае своеасаблівасць той значнай часткі іх тэрыторыі на Міншчыне і Смаленшчыне, дзе шмат узгоркаў і мясцовасць як бы крывая. Высокія мясціны чаргуюць з

больш нізкімі. Такі характар мясцовасці асабліва тыповы для поўдня і ўсходу іх тэрыторыі. У адрозненне ад першапачатковай балоцістай мясцовасці дрыгавічоў яе маглі назваць крывой. Шмат слоў са значэннем крывізны ёсць не толькі ў славянскіх, але і ў балцкіх мовах, напрыклад літоўскай (kreivas — крывы, kreivinti — крывіць, kreivis, kreivimas — крывізна, kreivuzas — крывая рэч). Паколькі першапачаткова на тэрыторыі крывічоў жылі не славяне, а балты, то можна меркаваць, што словам з першапачатковай асновай "крыў" (kreiv) тут называлі балцкае насельніцтва. Лінгвіст Ю.Хабургаеў лічыць, што гэты тэрмін першапачаткова меў форму kreuva, krieva, якая пасля змешвання славян з балтамі і фарміравання новай супольнасці некалькі змянілася, але захавала ранейшую аснову, да якой было дададзена славянскае "ічы". Так магла з'явіцца назва адной з усходнеславянскіх супольнасцей — крывічы. У балцкіх мовах пасля гэтага па-ранейшаму захавалася некалькі зменена балцкая форма, якой балты называлі славянскіх суседзяў на ўсходзе, — kreivs, krievai. Да цяперашняга часу яна захавалася ў латышскай мове для абазначэння велікарусаў (рускіх): krievs — рускі, Kreivja — Расія.

Да IX — X стст., калі цалкам сфарміраваліся вышэйназваныя супольнасці, яны, асабліва крывічы і дрыгавічы, ужо падняліся на ступень ранняклясавага грамадства і стварылі першапачатковыя дзяржавы, якія можна назваць прадзяржавамі (протадзяржавамі). Аб гэтым сведчыць узровень развіцця іх гаспадаркі, у прыватнасці земляробства і рамёстваў. У земляробстве пачалі выкарыстоўвацца больш дасканалыя прылады для заворвання зямлі, у якіх з'явіліся жалезныя наканечнікі. У гэты ж час у крывічоў і дрыгавічоў шырока выкарыстоўваліся сярпы новага тыпу, якія вядуць сваё паходжанне ад аналагічных рымскіх прылад, былі ўдасканалены кавальскае і ганчарнае рамёствы. У кавальстве ўдасканальваюцца сыradутныя печы. У ганчарстве пачалі выкарыстоўвацца ганчарныя колы і спецыяльныя печы для абпальвання ганчарных вырабаў. Апрацоўка жалеза і гліны паступова становіцца прафесійным відам дзейнасці, асобным заняткам. Рамёствы пачынаюць аддзяляцца ад земляробства. Гэта стварае спрыяльныя ўмовы для ўзнікнення пастаяннага гандлю. У IX — X стст. у крывічоў і дрыгавічоў з'яўляецца ўстойлівае грашовае абарачэнне. На тэрыторыі крывічоў, у прыватнасці на Полаччыне, каля в.Козенкі, знойдзены клад гэтага часу, у якім было больш за 7500 манет.

У выніку такіх важных змен у гаспадарчых занятках крывічоў і дрыгавічоў узнікаюць першапачатковыя гарады (прагарады, протагарады). На тэрыторыі крывічоў у IX ст. узнікае Полацк, у X ст. — Віцебск, а на тэрыторыі дрыгавічоў у X ст. з'яўляецца першапачатковы горад Тураў. У гэты час змяняецца і сацыяльны склад насельніцтва. Яно падзяляецца на знаць (князёў) і астатніх жыхароў. Першыя адрозніваліся сваімі функцыямі і становішчам, якое адлюстравана ў пахаваннях. На Полаччыне ў адным з курганоў каля в. Боркі знойдзена каля 200 упрыгожанняў.

У крывічоў і дрыгавічоў у адрозненне ад папярэдніх балцкіх супольнасцей усталявалася іншая сістэма кіравання. Родаплемяннае кіраванне змянілася палітычным. Узніклі першапачатковыя дзяржавы, якія называліся княжаннямі. У полацкіх крывічоў і дрыгавічоў кіраванне ўзначальвалі князі, якія атрымлівалі гэтыя пасады па спадчыне. Старажытныя пісьмовыя крыніцы называюць нават імёны такіх князёў (Рагвалод — у полацкіх крывічоў, Тур — у дрыгавічоў). У княжаннях меўся першапачатковы дзяржаўны апарат для збірання дані. Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што памылкова называць крывічоў і дрыгавічоў, верагодна, і радзімічаў плямёнамі, паколькі сярод іх ужо не было сацыяльнай роўнасці, аднолькавага сацыяльнага становішча ўсіх членаў супольнасці. У крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў узнікла родаплемяннае дзяленне і родаплемяннае кіраванне. Памылкова называць гэтыя супольнасці і саюзамі плямён, таму што калі не было плямён, то не існавала падставы для іх саюза. Саюзамі плямён звычайна называюць, асабліва ў этнаграфічнай літаратуры, часовыя аб'яднанні, якія заснаваны на дагаворы, што мае пэўны тэрмін дзеяння. У саюзы аб'ядноўваюцца і нароўнасныя плямёны, якія адрозніваюцца сваёй культурай, мовай. Такім чынам, саюзы плямён — гэта часовыя іх аб'яднанні, якія вызначаюць пэўныя адносіны паміж плямёнамі. Што датычыцца крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, то ў адрозненне ад такіх саюзаў яны былі перш за ўсё культурнымі супольнасцямі, г. зн. устойлівымі аб'яднаннямі, якія ўзніклі не на аснове дагавору, а сфарміраваліся стыхійна. Яны не плямёны і не саюзы плямён, а першапачатковыя народы (пранароды, протанароды) і адносяцца да новага тыпу этнічных супольнасцей, які адпавядае пачатку цывілізацыі — больш высокай стадыі ў развіцці чалавецтва, чым плямёны і саюзы плямён. Сапраўды, крывічы, дрыгавічы і радзімічы

праіснавалі да сярэдзіны XII ст. (апошняе ўпамінанне дрыгавічоў датуецца 1149 г., крывічоў як асобнай этнічнай супольнасці – 1162 г., радзімічаў – 1169 г.) і стварылі высокаразвітую культуру, яркім сімвалам якой з'яўляецца Сафійскі сабор у Полацку, пабудаваны ў XI ст. Не толькі культура, у прыватнасці архітэктура, але і сацыяльны і палітычны лад крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў сведчыць аб тым, што яны дасягнулі стадыі цывілізацыі. Крывічы, дрыгавічы і радзімічы адыгралі велізарную ролю ў айчыннай гісторыі. Многія вучоныя (Я.Ф.Карскі, У.І.Пічэта і інш.) нават лічылі, што крывічы, дрыгавічы і радзімічы былі непасрэдна продкамі беларускай этнічнай супольнасці, беларускага народа. Аднак існуюць і іншыя погляды на гэта пытанне.

Праблема паходжання беларускага народа вельмі складаная і недастаткова вывучаная. Складанасць яе абумоўлена тым, што яна даследуецца шляхам аналізу многіх, прытым розных па характару, крыніц – пісьмовых помнікаў, даных этнаграфіі, археалогіі, антрапалогіі, лінгвістыкі і інш. Глыбока вывучыць усе гэтыя крыніцы, супаставіць інфармацыю, якая ў іх ёсць, даволі цяжка. Да таго ж этнагенез – вельмі багаты па зместу гістарычны працэс. Каб наблізіцца да ісціны, неабходна ахапіць усе яго бакі. Ёсць розніца і ў спосабах аналізу фактычнага матэрыялу даследчыкамі гэтай праблемы. Усё гэта і абумоўлівае існаванне розных поглядаў на паходжанне беларускага народа. Сярод іх можна вылучыць "фінскую", "балцкую", "крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкую", "старажытнарускую" канцэпцыі беларускага этнагенезу. Згодна з "фінскай" канцэпцыяй (І.Ласкоў), продкамі беларускага народа былі славяне і фіны. У якасці доказу ён спасылаецца на тое, што некаторыя назвы беларускіх рэчак і азёр, напрыклад Дзвіна, Мардва, Свір, фінскага паходжання. Прыхільнікі так званай "балцкай" канцэпцыі (В.Сядоў, Г.Штыхаў і інш.) лічаць, што продкамі беларусаў з'яўляюцца славяне і балты. Яны спасылаюцца на назвы беларускіх рэчак і азёр балцкага паходжання (Арэса, Клёва, Рэста і інш.), сцвярджаюць, што пра балтаў як продкаў беларусаў сведчаць некаторыя элементы традыцыйнай беларускай культуры і мовы (культ вужа, жаночы галаўны ўбор намітка, цвёрды "р" і інш.). Аўтары "крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкай" канцэпцыі (Я.Карскі, М.Доўнар-Запольскі, У.Пічэта і інш.) лічылі, што асноўнымі продкамі беларускага этнасу з'яўляюцца крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Да ліку іх

аргументаў адносяцца пераемнасць матэрыяльнай культуры і моўныя запазычанні. Так, яны меркавалі, што саха з перакладной паліцай і "аканне" першапачаткова былі характэрныя для крывічоў, а палеская саха і дыфтонгі ўо, іе на поўдні першапачаткова з'яўляліся элементамі культуры і мовы дрыгавічоў. Тыя, хто прытрымліваецца "старажытнарускай" канцэпцыі паходжання беларускага народа (Я.Карнейчык і інш.), сцвярджаюць, што продкамі беларусаў была адна з частак так званай старажытнарускай народнасці. Пры гэтым яны пераканаиы ў існаванні адзінай старажытнай дзяржавы — Русі, у якой існавала адзіная старажытнаруская мова і культура (напрыклад, былiны).

Каб вызначыць адносіны да розных канцэпцый, неабходна спачатку высветліць, якое месца ў этнічнай (культурнай) гісторыі краю займаюць факты, на якія абапіраюцца гэтыя погляды. Ці з'яўляюцца назвы некаторых беларускіх рэчак фінскага паходжання доказам таго, што продкамі беларусаў былі і фінамоўныя групы насельніцтва? Можна ўпэўнена сказаць, што не з'яўляюцца. Фінамоўнае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі жыло ў глыбокай старажытнасці, у канцы каменнага веку, і было асімілявана тут не славянамі, а старажытнымі балтамі, якія рассяляліся ў Панямонні, Падзвінні і Верхнім Падняпроўі ў бронзавым веку. Фіны на тэрыторыі Беларусі былі субстратам (падасновай) не беларусаў, а старажытных балтаў. Фінскія назвы рэчак і азёр у нашым краі спачатку былі ўспрыняты балтамі, а потым ад балтаў перайшлі ў лексіку славянскага насельніцтва, якое з'явілася ў Панямонні, Падзвінні і Верхнім Падняпроўі пасля балтаў. Шмат спрэчнага і ў доказах "балцкай" канцэпцыі. Факты, на якія спасылаюцца яе прыхільнікі, характэрны не толькі для балтаў і беларусаў. Цвёрды "р", напрыклад, апрача балтаў і беларусаў уласцівы таксама мове ўкраінцаў, балгараў, сербаў, чэхаў, славакаў, на якіх балты не зрабілі культурнага ўплыву. Жаночы галаўны ўбор — намітка быў пашыраны не толькі ў балтаў і беларусаў, але і ў іншых славянскіх народаў, у прыватнасці ўкраінцаў, балгараў, палякаў. А такая з'ява, як культ вужа, была распаўсюджана яшчэ шырэй. Яна ўласцівая рэлігіі не толькі балтаў і славян, але і грэкаў, албанцаў. Назвы беларускіх рэчак і азёр балцкага паходжання нельга лічыць доказам балцкага субстрату (падасновы) беларусаў. Яны сведчаць толькі аб тым, што ў мінулым пасля фінаў на тэрыторыі

Беларусі жылі старажытныя балты. У выніку шырокага рассялення славян на тэрыторыі нашага краю і змешвання іх з усходнімі балтамі ўтварыліся не беларусы, а першасныя ўсходнеславянскія этнічныя супольнасці — крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Пашыраны да гэтага часу погляд, што дрыгавічы, крывічы і радзімічы з самага пачатку былі чыста славянскімі этнічнымі супольнасцямі, а не змешанага паходжання, не мае грунтоўных доказаў. Значна больш аргументаў на карысць погляду, што дрыгавічы, крывічы і радзімічы сфарміраваліся на тэрыторыі Беларусі. Частка славян была толькі адной з груп продкаў кожнай этнічнай супольнасці, а другой групай продкаў гэтых этнічных супольнасцей была частка балтаў. У параўнанні са старажытным фінамоўным і балтамоўным насельніцтвам гістарычна бліжэй да беларусаў усходнеславянскія этнічныя супольнасці крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў. Але і ў аргументацыі погляду, што непасрэднымі продкамі беларускага народа з'яўляюцца крывічы, дрыгавічы і радзімічы, ёсць спрэчныя моманты. Тыя элементы культуры і мовы беларусаў (розныя тыпы сахі — палеская і з перакладной паліцай, асаблівасці гаворак асобных рэгіёнаў — "аканне", дыфтонгі ўо, іе, якія лічацца састаўнымі элементамі культуры і мовы дрыгавічоў ці крывічоў, узніклі пазней, чым існавалі крывічы, дрыгавічы і радзімічы, не раней XII ст., і займалі больш шырокія арэалы, чым тэрыторыі дрыгавічоў, крывічоў і радзімічаў. Шмат схематычнага ва ўяўленнях "старажытнарускай" канцэпцыі паходжання беларусаў. Спрэчна лічыць старажытную Русь агульнай калыскай беларускай, украінскай і велікарускай супольнасцей, таму што яна распалася, знікла раней, чым утварыліся беларускі і велікарускі народы. Рэгіянальныя асаблівасці культуры і мовы ўсходніх славян як ранняй, так і позняй пары не адпавядаюць усходнеславянскім этнасам — беларусам, украінцам і велікарусам. Заходняя частка тэрыторыі ўсходніх славян, якая стала арэалам фарміравання беларускага этнасу, у час існавання старажытнай Русі не вылучалася ў асобную лінгвістычна-этнаграфічную зону. Уяўленне аб тым, што старажытная Русь з'яўляецца калыскай трох усходнеславянскіх этнічных супольнасцей, дэманструе спрошчаны падыход да складанага гістарычнага працэсу.

Верагодна, асноўнымі продкамі сучасных беларусаў былі групы насельніцтва, якія жылі на сучасных беларускіх

землях пасля таго, як зніклі крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Імі сталі перш за ўсё насельнікі, якія займалі поўнач падзвінска-дняпроўскага і папрыпяцкага рэгіёнаў. Першая супольнасць сфарміравалася ў выніку трансфармацыі крывічоў, вяцічаў і паўночнай часткі радзімічаў, а другая — дрыгавічоў, драўлян і паўднёвых радзімічаў. Абедзве мелі таксама агульную назву "русіны", "рускія" (г. зн. усходнія славяне). Яны адрозніваліся ад крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў новымі рысамі культуры і мовы. У жыхароў падзвінска-дняпроўскага рэгіёна былі пашыраны саха з перакладной паліцай, гумны прамавугольнай формы, світа прамога крою, зачынальная вясельная песня (стаўбавая), трансфармаваны валачобны абрад. У іх гаворцы ўзнікла "аканне" (вымаўленне галоснага гука "о" не пад націскам як "а"), а таксама "дзеканне" (зычны гук "д" сталі вымаўляць больш мякка).

Характэрнымі элементамі культуры насельнікаў басейна Прыпяці з'яўляліся палеская саха, шматвугольныя гумны, развітая форма каравайнага абраду, зімовае навагодняе свята Каляды. У гаворцы старажытных палешукоў гукі "р" і "ч" пачалі вымаўляць цвёрда. У ёй узніклі дыфтонгі ўо, іе.

Другім вельмі важным бокам беларускага этнагенезу была дыфузія (пашырэнне) культурных і моўных з'яў. Дыфузія зрабіла прыкметны ўплыў на ўтварэнне беларускай мовы, у прыватнасці яе фанетыкі. Фанетыка беларускай мовы ўзнікла шляхам злучэння некаторых рыс гутарковай мовы папрыпяцкага насельніцтва, з аднаго боку, і падзвінскага — з другога. Яно спачатку адбылося ў цэнтральным рэгіёне — панёманскіх і падняпроўскіх землях, а потым праз цэнтральны рэгіён пашырылася далей у паўднёвыя і паўночныя часткі краю. З поўдня (Папрыпяцця) на поўнач (Падзвінне) шырока распаўсюджваўся цвёрды "р" і цвёрды "ч", а з поўначы на поўдзень — мяккі "д" ("дзеканне"), а таксама "аканне". Дыфузіі культурных і моўных з'яў садзейнічалі перасяленні як усходнеславянскіх, так і неўсходнеславянскіх груп, змешванне іх з мясцовымі жыхарамі і асіміляцыя ўсходнеславянскім насельніцтвам заходнеславянскага (польскага), балцкага, цюркскага (татарскага). Беларускі этнагенез цесна звязаны з палітычнай гісторыяй краю. Ён адбываўся як у час існавання старажытных княстваў — Полацкага, Тураўскага і іншых, так і ў перыяд утварэння новай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

РАЗДЗЕЛ 3

БЕЛАРУСЬ У IX – СЯРЭДЗІНЕ XIII СТ.

1. Полацкае княства

Полацкае княства было першай паўнавартаснай дзяржавай, якая сфарміравалася на беларускіх землях. Падчас яе ўтварэння вялікая роля належала геаграфічнаму, этнічнаму і сацыяльна-эканамічнаму фактарам.

Паўночнае Прыдзвінне, дзе ў VIII – X стст. ішлі дзяржаваўтваральныя працэсы і фарміравалася ядро Полацкай зямлі, мае шэраг геаграфічных асаблівасцей. У першую чаргу да іх адносяцца разгалінаваная рачная сетка, вялікая колькасць азёр і хваёвыя лясы. Ворныя землі на месцы апошніх былі асабліва ўрадлівымі. Акрамя таго, у гэтай зоне значна цяплей і больш вільготна, снежнае покрыва з'яўляецца пазней і, наадварот, на 15 – 20 дзён раней, чым на іншых беларускіх землях, сыходзіць снег і на 7 – 12 дзён раней пачынаюцца сельскагаспадарчыя работы.

Да з'яўлення ў Прыдзвінні славян-крывічоў тут жылі балцкія плямёны днепра-дзвінскай і банцараўскай культур, якія займалі вялікія прасторы Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі. Гэтыя плямёны пакінулі пасля сябе шматлікія гарадзішчы, курганы, тапанімічныя і гідранімічныя назвы.

Ужо ў VI ст. на Беларусь пранікаюць першыя славяне. Найбольш актыўна яны рассяляюцца ў VII – VIII стст., займаючы вольныя плошчы, пакінутыя балтамі месцы, а часам і выцясняючы апошніх. Пачаўся працэс сумеснага пражывання розных этнасаў і паступовае іх змешванне – асіміляцыя. Крывічы, якія прыйшлі ў Прыдзвінне і Верхняе Падняпроўе, мелі больш высокі ўзровень сацыяльнай арганізацыі – зародкі дзяржаўнасці. Іх культура стала дамінуючай. Крывічы прыгадваюцца ў летапісах пад 856, 862, 907, 944 і 980 гг. Іпацьеўскі летапіс згадвае іх нават пазней – у 1128 г. і называе полацкіх князёў крывіцкімі ў 1140 і 1162 гг.

Ужо ў недатаванай частцы летапісу сустракаецца тэрмін "палачане" разам з крывічамі. Гэтым была вылучана тая частка крывічоў (у адрозненне ад пскоўска-ізборскіх і смаленскіх), якія атабарыліся вакол Полацка. Сам Полацк упершыню згадваецца крыніцамі пад 862 г. Да з'яўлення крывічоў тут існавала гарадзішча днепра-дзвінцаў, якія і далі гораду назву ад назвы ракі Палаты. У IX – X стст. ён уяўляў сабою

паселішча мысавага тыпу. Плошча ўмацаванага дзяцінца складала каля 1 га, навакольнага горада-прадграддзя — каля 7,5 га. У горадзе магло жыць на той час да 1 тыс. чалавек.

У другой палове X ст. летапісы згадваюць першага полацкага князя Рагвалода, які прыйшоў з-за мора, "трымаў, валадарыў і княжыў Полацкую зямлю". Вызначэнне, якое далі храністы полацкаму князю, сведчыць аб завяршэнні першага этапу ва ўсталяванні полацкага гаспадарства: з'яўленне межаў, зацвярджэнне палітычнай сістэмы, упарадкаванне ўнутраных гаспадарчых адносін. Працэс утварэння першай полацкай дзяржавы Рагвалода супаў з усталяваннем многіх славянскіх еўрапейскіх гаспадарстваў: чэхаў і мараваў, харватаў і славенцаў, палякаў, а таксама першых цэнтралізаваных дзяржаў у Скандынавіі — Даніі, Швецыі, Нарвегіі. На землях Усходняй Еўропы ўсталяваліся тры моцныя дзяржаўныя цэнтры. Сярод іх акрамя крывіцкага Полацка палянскі Кіеў і славенскі Ноўгарад. Апошні быў пад моцным уплывам скандынаваў.

Каля 970 — 980 гг. да полацкай князёўны Рагнеды — дачкі Рагвалода — пасваталіся два браты: Уладзімір наўгародскі і Яраполк кіеўскі. Рагнеда абрала Яраполка. Абражаны адмоваю Уладзімір робіць напад на Полацк і прымусам бярэ Рагнеду ў жонкі. Пасля ён забівае падманам свайго брата і становіцца валадаром Кіева. На перыяд каля 20 гадоў утвараецца "імперыя Рурыкавічаў" з цэнтрам у Кіеве, якая часам атаясамліваецца з Кіеўскай Руссю. Але гэтае штучнае ўтварэнне не мела надзейных унутраных мацуючых ніцяў і трымалася на даніне, якую выплачвалі Кіеву астатнія землі.

Пасля спробы забіць Уладзіміра полацкая княжна Рагнеда была выслана на бацькаўшчыну, дзе спецыяльна для яе быў заснаваны новы горад Ізяслаўль — у гонар сына Ізяслава (сучаснае Заслаўе). Ад Рагнеды Уладзімір меў чатырох сыноў — Ізяслава, Яраслава (Мудры), Мсціслава (чарнігаўскі князь) і Усевалада (князь уладзіміра-валынскі) і дзвюх дачок — Прадславу (замужам за чэшскім князем Баляславам III Рудым) і Прэміславу (замужам за вугорскім прынцам Ласла Сара Лысым). У канцы жыцця Рагнеда пастрыглася ў манашкі пад імем Анастасіі. Памерла ў 1000 г.

Князь Ізяслаў памёр у 1001 г., але з яго зарадзілася полацкая княжацкая дынастыя. Пераемнікам стаў князь Брачыслаў Ізяславіч (1001 — 1044). Пры ім пачала складвацца другая полацкая дзяржава, росквіт якой прыпаў на сярэдзіну — другую палову XI ст. У часы Брачыслава

пашыраюцца межы Полацкай зямлі, у першую чаргу на захад і поўнач. Паўстаюць новыя гарады і сярод іх Брачыслаўль (названы так у гонар князя — сучасны Браслаў) і гарады па сярэдняму рэчышчу Заходняй Дзвіны — Кукенойс, Герсіка (зараз на тэрыторыі Латвіі). Палачане цалкам кантралююць гандлёвы шлях па Дзвіне аж да Варажскага (Балтыйскага) мора, збіраюць даніну з балтыйскіх плямён.

Разам з тым абвастраліся адносіны паміж Полацкам і Ноўгарадам. Гэта было выклікана, верагодна, барацьбой за прыярытэтнае права кантролю над скандынаўска-візантыйскім экспартам-імпартам па шляху "з варагаў у грэкі". Два буйнейшыя адгалінаванні гэтага шляху праходзілі праз Полацк і Ноўгарад. У першай палове XI ст. актыўнасць на гэтым шляху рэзка зменшылася, адпаведна і колькасць тавараў і дабрабыт дзяржаў-саперніц. Да таго ж узніклі тэрытарыяльныя спрэчкі на памежжы, спрэчкі за кантроль над Кіевам. Адпаведна крыніцам, да 1026 г. Брачыслаў полацкі і Яраслаў наўгародскі кіравалі Кіевам праз сваіх намеснікаў. Магчыма, Брачыслаў адзін час быў таксама і князем кіеўскім. Напружанасць адносін паміж суседзямі дапаўнялася традыцыямі звычаёвага права, па якому Ноўгарад быў кроўным ворагам Полацка пасля забойства Рагвалода і зняволення Рагнеды.

У 1021 г. Брачыслаў полацкі нападае на Ноўгарад і захоплівае яго. Тады ж паміж Брачыславам і Ярасла-вам адбылася бітва на р. Судамір. У выніку была заключана мірная дамова паміж князямі як паміж братамі і Полацкай зямлі вернуты гарады Віцебск і Усвяты. У 1026 г. Яраслаў стаў кіеўскім князем і мірная дамова была парушана. Пасля 1036 г. на тэрыторыі Усходняй Еўропы засталіся толькі два княжацкія радаводы: Яраславічы і Рагвалодавічы. Абодва па жаночай лініі вялі пачатак ад Рагнеды полацкай.

Пасля смерці Брачыслава на яго месца заступіў сын Усяслаў, празваны Чарадзеем (каля 1029 — 1101), бо, па паданню, быў народжаны ад чарадзейства. Да 60-х гадоў XI ст. уся дзейнасць полацкага князя была скіравана на ўладкаванне сваёй дзяржавы. З 35 гарадоў на тэрыторыі Беларусі, якія існавалі ў IX — XIII стст., да Полацкай зямлі ў XI ст. належаць Віцебск, Заслаўе, Друцк, Браслаў, Менск, Орша, Лагойск, Лукомль і згаданыя вышэй Кукенойс і Герсіка. Растуць плошчы гарадоў, часам нават адбываецца іх перанос на новыя месцы. Уласна Полацк займае ў гэтыя часы больш за 20 га з насельніцтвам 10 — 15 тыс. чалавек. Тут хутка развіваецца гандаль і рамяство.

Але з 1065 г. аднаўляецца зацятая барацьба з Ноўгарадам і Кіевам. Яна абумоўлена тым, што пасля смерці Яраслава Мудрага ў 1054 г. землі ўласна Кіеўскай Русі былі падзелены паміж усімі яго сынамі (іх было сем), але з цягам часу ўлада апынулася ў руках траіх: Ізяслава, Святаслава і Усевалада. Гэтыя браты-Яраславічы пачалі прыбіраць да рук землі малодшых князёў – траюрадных пляменнікаў, парушаючы тым самым запавет бацькі. Мелі яны намеры захапіць і Полацкую зямлю. У такіх абставінах Полацк выступаў гарантам спадчыннага права і захавання справядлівасці.

У перыяд з 1065 па 1078 г. адбываюцца бітвы паміж Усяславам Чарадзеем і Яраславічамі за Пскоў, Ноўгарад, Менск, Смаленск. У 1067 г. полацкі князь трапляе ў палон і 14 месяцаў сядзіць у кіеўскай турме-порубе разам з двума сынамі. У выніку паўстання кіяўлян 15 верасня 1068 г. ён становіцца вялікім князем кіеўскім, але ў хуткім часе вяртаецца да сябе ў Полацк. Усведамляючы праўду за Усяславам, на яго баку выступаюць такія вядомыя дзеячы XI ст., як кіеўскі ігумен Антоні Пячэрскі і Нікан Летапісец. Апошні раз Усяслаў заступаецца ў 1078 г. за князёў-выгнаннікаў Барыса смаленскага, Расціслава наўгародскага і Алега чарнігаўскага. Пасля гэтага аж да смерці ў 1101 г. ён знікае са старонак летапісаў.

Тым часам у канцы XI — пачатку XII ст. адбываюцца знакамітыя з'езды князёў у Любечы, Увечічах, каля Долбскага возера. На з'ездах вырашаецца пытанне аб падзеле зямель Кіеўскай Русі: "Хай кожны трымае вотчыну сваю". Полацкіх князёў на гэтых з'ездах не было. Яшчэ пры жыцці Усяслаў размеркаваў асобныя княствы Полацкай зямлі паміж сямю сынамі (Давідам, Рагвалодам, Барысам, Глебам, Раманам, Расціславам, Святаславам (Юрыем)). Найбольш буйное княства — Полацкае — дасталася Рагвалоду, Менскае — Глебу. Асабліва актыўную палітыку па ўмацаванню свайго княства праводзіў Глеб менскі. Гэта выклікала незадаволенасць Кіева, бо Менскае княства ў асноўным размяшчалася на этнічных дрыгавіцкіх землях. Частка ж гэтых зямель падпарадкоўвалася Кіеву. Войны Кіева і Менска скончыліся палонам Глеба і яго смерцю, відавочна, прымусовай, у Кіеве ў 1119 г.

Нягледзячы на раздробленасць Полацкай зямлі, якая часам прыводзіла да спрэчак і крывавых боек паміж самімі полацка-менскімі князямі Усяславічамі, на Полацкую зямлю звонку паглядалі як на ранейшую цэласную дзяржаву. Роля і аўтарытэт полацкіх валадароў не давалі спакою

паўднёварускім князям. У 1129 г. кіеўскі князь Мсціслаў, аб'яднаўшы вялікія сілы, напаў на палачанаў. У выніку ўвесь радавод — князі Расціслаў, Святаслаў, Васіль, Іван, Давыд былі схоплены і разам з сем'ямі высланы ў Візантыю. Там яны ў якасці военачальнікаў змагаліся на тэрыторыі Малой Азіі з сарацынамі. Жывымі засталіся Васіль ды Іван, якія ў 1138 — 1139 гг. вярнуліся на радзіму.

Ад пачатку XII ст. у грамадска-палітычным жыцці Полацкай зямлі пачалі адбывацца вялікія зрухі. Актывізавалася веча — агульны сход гараджан для вырашэння рознабаковых пытанняў. Веча выганяла і запрашала князёў, заключала мірныя дамовы і аб'яўляла войны, рэгулявала адносіны паміж рамеснікамі, заключала гандлёвыя дагаворы. Веча стала таксама і вышэйшай судовай інстанцыяй. Гэта было абумоўлена паглыбленнем і развіццём шматукладнай гаспадаркі ў грамадстве. Феадальны ўклад паступова перамагаў традыцыйную родаплемянную вытворчасць і рабаўладальніцкую эксплуатацыю. Паступова на першы план выступалі баяры і дружыннікі, якія праз пачатковае права збіраць даніну з дазволу князя падпарадкоўвалі сабе свабодных вытворцаў. Даніна змяняецца феадальнай рэнтай, з'яўляюцца вотчыны і воласці, разбураецца патрыярхальны ўклад, у гарадах ствараюцца першыя цэхавыя арганізацыі па ўзору "братчын". Паміж "старэйшымі" і "малодшымі" князямі ўсталёўваюцца васалітэтныя адносіны. Узрастае актыўнасць царквы як буйнога землеўладальніка. Але гэты час быў менавіта пераходным да феадалізму, бо захоўваліся і вольныя сяляне-абшчыннікі, і вольныя рамеснікі, і рабы — "халопы", "смерды". Рамяство яшчэ не аддзялілася канчаткова ад сельскай гаспадаркі. Разам з тым інтарэсы новых класаў, якія нараджаліся, і старых княжацка-патрыярхальных інстытутаў усё часцей прыходзілі ў супярэчнасць.

Ад пачатку XIII ст. новая небяспека пачала навісаць над Полацкай зямлёй — на поўначы і захадзе з'явіліся нямецкія рыцары-крыжакі. У 1201 г. з неабачлівага дазволу полацкага князя Уладзіміра яны заснавалі ў вусці Заходняй Дзвіны горад Рыгу (назва ад беларускага "рыгво" — месца, дзе рака выкідае воды ў мора). Пачалася паступовая і настойлівая акупацыя зямель балтаў, якія былі ў саюзніцкіх адносінах з палачанамі ці плацілі ім даніну, і ўласна полацкіх зямель. Ордэн мечаносцаў, які з 1237 г. называўся Лівонскім, узяў пад свой кантроль землі латгалаў і ліваў па ніжняму цячэнню Заходняй Дзвіны, былі

захоплены полацкія гарады Кукенойс (1208) і Герсіка (1209), у 1224 г. імі быў заняты эстонскі горад Тарту (Юр'еў). Крыжацкая пагроза прымушала ісці на вайсковы саюз Полацка з Ноўгарадам і Полацка з Літвою. Дачка полацка-віцебскага князя Брачыслава — Параскева стала жонкай Аляксандра Ярасла́віча наўгародскага (Неўскага) у 1239 г. Але пераможныя бітвы з крыжакамі на Няве ў 1240 г. і Чудскім возеры ў 1242 г. карэнным чынам сітуацыю не змянілі. Полацкая зямля паступова губляла сваю магутнасць і былую веліч. У такіх абставінах палачане і пайшлі на саюз з землямі Верхняга Панямоння, сталіцай якіх быў Наваградак, праз запрашэнне на сваё княжанне літоўскіх князёў. У канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў XIII ст. на полацкім княжанні з'яўляецца першы літоўскі князь Таўцівіл. Пачынаецца перыяд існавання Полаччыны ў саюзе з Літвою ў новай дзяржаве — Вялікім Княстве Літоўскім.

2. Тураўскае княства

Тураўскае княства ўтварылася ў межах рассялення дрыгавічоў — у Паўднёвай Беларусі, басейне Прыпяці. Сталіца княства —горад Тураў прыгадваецца пад 980 г., калі на Беларусі з'яўляюцца князі, магчыма, браты Рагвалод і Тур. Ад апошняга, як паведамляе летапіс, "тураўцы празваліся". Першая звестка і падзеі 988 г., калі былі вызначаны межы Тураўскай зямлі, сведчаць аб тым, што Тураўшчына ад пачатку развівалася як самастойная дзяржаўная адзінка з усімі адпавядаючымі гэтай пабудове інстытутамі. Галоўнай складанасцю ў фарміраванні гэтай дзяржавы было тое, што яна займала не ўсю этнічную тэрыторыю дрыгавічоў, а толькі землі левага берага Прыпяці з гарадамі Туравам, Пінскам, Слуцкам, пазней — Бярэсцем. На поўначы землі вакол Менска належалі Полацкай дзяржаве, на поўдні і ўсходзе Брагінская воласць належала Кіеўскаму княству, Рэчыцкая — Чарнігаўскаму, на захадзе частка зямель была ва уладанні ўладзіміра-валынскіх князёў. Разам з тым крыніцы дазваляюць меркаваць, што да канца X ст. у Тураве кіравала ўласная дынастыя князёў, чый радавод быў спынены падчас утварэння "імперыі Уладзіміра Святаславіча".

У 988 г. Уладзімір кіеўскі выдзеліў Тураўскую зямлю свайму трэцяму сыну Святаполку. Парадкавая лічба свед-

чыць аб вялікай значнасці і ролі гэтага княства. Акрамя таго, Святаполк быў сынам Уладзіміра Святаславіча ад грачанкі — былой жонкі Яраполка. Як паведамляе летапіс, калі Уладзімір забіў свайго брата Яраполка, грачанка была ўжо цяжарнай. Верагодна, Святаполк не быў упэўнены ў бацькоўстве Уладзіміра, што праявілася ў далейшым у яго імкненні да незалежнасці Тураўшчыны ад Кіева. Ён зрабіў гэту спробу яшчэ ў 1012 г. пры жыцці Уладзіміра, узяўшы напярэдадні шлюб з дачкой польскага караля Баляслава Харобрага і запрасіўшы да сябе каталіцкага епіскапа Рэйнберна. Менавіта апошнім, можна меркаваць, выклікана такое страшэннае непрыняцце асобы Святаполка кіеўскімі летапісамі.

Аднак у барацьбе Святаполка за самастойнасць Тураўскай зямлі былі падставы геапалітычнага плана. Справа ў тым, што Тураўшчына знаходзілася ў выгадным геаграфічным становішчы. Яна ляжала на шляху з Польшчы ў Кіеў. Акрамя таго, праз Тураў праходзіла адно з адгалінаванняў знакамітага шляху "з варагаў у грэкі". Да таго ж тут былі надзвычай ураджайныя і багатыя ворныя землі.

Пасля смерці Уладзіміра Святаславіча ў 1015 г. менавіта Святаполк тураўскі становіцца кіеўскім князем, але пакідае за сабой і Тураўскую зямлю. З гэтым не пагадзіўся Яраслаў Мудры і распачаў супраць Святаполка вайну. Пасля бітвы на р. Альце ў 1019 г. па дарозе ў Польшчу ён гіне.

Напрыканцы свайго жыцця Яраслаў Мудры — князь кіеўскі — аддаў Тураўшчыну свайму сыну Ізяславу. Верагодна, гэта адбылося да смерці вялікага князя ў 1054 г. і сведчыць пра ўстойлівасць дзяржаўна-княжацкай традыцыі ў Тураве, гэтаксама як і пра пастаянства тэрыторыі гэтай дзяржавы. Пасля смерці Яраслава Ізяслаў становіцца вялікім князем кіеўскім, але пакідае за сабой і Тураў. Два сыны Ізяслава — Яраполк і Святаполк — трымалі за сабой Тураў. Але ў 1113 г. са смерцю Святаполка ўлада Ізяславічаў у Тураве скончылася і горад з зямлёй перайшоў да роду Манамахавічаў. Яны трымалі княства ў якасці дадатку да сваіх асноўных уладанняў — Кіева, Пераяслаўля і іншых зямель. Але гэта было права сілы, а не вынік прыналежнасці Тураўскай зямлі да Кіеўшчыны.

У сярэдзіне XII ст. паміж паўднёварускімі князямі адбывалася зацятая барацьба за валоданне Кіевам. Разам з Кіевам з рук у рукі пераходзіў і Тураў — то да суздальскіх, то да валынскіх князёў. Але ў 50-х гадах XII ст. на

тураўскім троне апынуўся князь Юрый Яраславіч, які вярнуў зямлю ва ўладанне дынастыі Ізяславічаў. З гэтым не жадалі змірыцца кіеўскія князі. Аб'яднаўшыся ў 1158 г., яны зрабілі паход на Тураў, каб адабраць яго ў Юрыя. Відавочна, што Юрый Яраславіч быў не толькі ўдалым военачальнікам, але карыстаўся павагай тураўцаў, іх поўнай падтрымкай. Ён клапаціўся ў першую чаргу пра жыхароў зямлі, разглядаючы княства як сваю законную спадчыну. Толькі гэтым і моцнай фартыфікацыяй горада можна растлумачыць, што дзесяцідзённая аблога была паспяхова вытрымана. Гэтаксама быў адбіты напад на Тураў валынскіх князёў у 1160 г. На гэты раз варожыя войскі прастаялі пад сценамі горада тры тыдні.

Праз цяжкую барацьбу Тураўскае княства аднавіла сваю самастойнасць і незалежнасць. На Тураўшчыне аднавілася самастойная княжацкая дынастыя — неабходная ўмова дзяржаўнага існавання. У наступныя дзесяцігоддзі зямлёй кіруюць сыны Юрыя: Святаполак (1189), Іван (1170), Глеб (1196), Яраслаў (1183), Яраполак (1190). Былі ў Юрыя і дзве дачкі — Ганна і Малфрыд. У гэты час Тураўская зямля падзялілася на ўдзельныя княствы: Тураўскае, Пінскае, Клецкае, Слуцкае, Дубровіцкае. У кожным з іх кіравалі сыны Юрыя Яраславіча. Аднак некаторыя землі трапілі ў залежнасць ад кіеўскіх і галіцка-валынскіх князёў. Але, нягледзячы на ўдзельную раздробленасць, можна меркаваць, што Тураўская зямля і ў XII ст. успрымалася цэласнай дзяржаўна-палітычнай адзінкай. У летапісах згадваюцца "з Турава Святаполчычы"(1204) і "князі Тураўскія" (1274). Маецца на ўвазе дынастыя Святаполка Юр'евіча і ўвогуле ўсе ўнукі Юрыя Яраславіча. Тураў па-ранейшаму разглядаецца як цэнтр усёй зямлі.

Сярод гарадоў Тураўскага княства найбуйнейшымі былі Пінск і Бярэсце, меншымі — Кобрын, Камянец, Драгічын, Бельск, Мельнік, Мазыр, Рагачоў, Брагін. У крыніцах XII — XIII стст. досыць часта згадваюцца першыя два. Недалёка ад Бярэсця прайшліся мангола-татары і на навакольных палях было "многа пабітых". Аб зруйнаванні самога горада звестак няма. З'яўляючыся памежнымі, часта адбівалі гарады напады польскіх і літоўскіх дружын. Разам з галіцка-валынскімі князямі тураўцы і пінчукі хадзілі паходамі на Літву (1251 — 1252, 1275). Але неўзабаве, у канцы XIII — пачатку XIV ст., Тураўская зямля была цалкам далучана да Вялікага Княства Літоўскага. Адбылося гэта падчас праўлення Віценя і Гедыміна.

3. Феадальная раздробленасць у XII — XIII стст.

У XII — першай палове XIII ст. Полацкая, Тураўская землі і іншыя дзяржаўныя ўтварэнні на Беларусі перажывалі этап феадальнай раздробленасці. Гэта быў заканамерны і прагрэсіўны крок на шляху станаўлення і далейшага развіцця беларускай дзяржаўнасці. Аналагічныя працэсы адбываліся паўсюдна ў Еўропе. У Італіі, Францыі і Нямеччыне ў гэты час паўставалі самастойныя каралеўствы, дзе ўлада належала феадальным сеньёрам. Асобна ўзвышаліся гарады-полісы з зародкамі алігархічна-дэмакратычнага кіравання. Сярод славянскіх зямель толькі Балгарыя і Сербія ў канцы XII ст. дзякуючы нацыянальна-вызваленчай барацьбе з Візантыяй ішлі да кансалідацыі зямель. Астатнія — Харватыя, Чэхія, Польшча, Венгрыя — распадаліся на асобныя княствы, землі. Усюды паступова ўзмацняўся слой буйных феадалаў. Велікашы ў Харватыі, шляхта ў Чэхіі, можнаўладцы ў Польшчы пачыналі лічыць караля альбо вялікага князя толькі "першым сярод роўных". Самастойнае развіццё зямель і княстваў спрыяла росту гарадоў і ўнутраных рынкаў.

Аналагічныя працэсы адбываліся і на Беларусі. Полацкая зямля ў пачатку XII ст. была падзелена паміж сынамі Усяслава Чарадзея. Узніклі асобныя княствы з цэнтрамі ў Менску, Друцку, Віцебску, Лагойску, Заслаўі, Вільні, Кукенойсе, Герсіке і інш. Полацк па-ранейшаму лічыўся "старэйшым" горадам. Ён хутчэй духоўна, а не палітычна заставаўся носьбітам ідэі адзінадзяржаўя. Натуральна, што княствы падзяляліся не толькі па абшарах, але і па магутнасці, ступені незалежнасці. На першае месца ў пачатку XII ст. пачало вылучацца Менскае княства-зямля, дзе кіраваў Глеб Усяслявіч. Гэты князь уступіў у зацятую барацьбу з Уладзімірам Манамахам за самастойнасць паўночных дрыгавіцкіх зямель, імкнуўся падпарадкаваць сабе земгалаў. Менскае княства хутка набірае моц. У 1104 г. Глеб паспяхова адбівае напад кааліцыі паўднёварускіх князёў: войска Святаполка Ізяславіча на чале з ваяводам Пуцятаю Вышацічам, войска Яраполка, сына Уладзіміра Манамаха, і Алега Святаславіча. Да гэтага паходу далучыўся і полацкі князь Давыд Усяславіч. Глеб менскі памірыўся са Святаполкам кіеўскім і больш за 10 гадоў умацоўваў сваю "отчыну". Яго ўлада распаўсюдзілася аж да Дняпра — Друцкага княства і верхняга Нёмана. Але пасля ўвакняжання ў Кіеве Уладзіміра Манамаха (1103) адносіны Глеба з паўднёварускімі князямі пагаршаюцца. У 1116 г. ён нападае на Слуцк. У адказ Манамах з сынамі ідзе

паходам на Менск, па дарозе займае Оршу і Копысь. У сакавіку таго ж года Менск быў узяты ў аблогу. Убачыўшы перавагу праціўніка, Глеб здаўся. Яму ва ўладанне быў пакінуты толькі Менск. Але няўрымслівы князь не мог пагадзіцца са стратай сваіх зямель. У 1117 г. разам з палачанамі ён нападае на смаленскія і новагародскія землі, чым выклікае паўторны паход сына Манамаха Мсціслава на Менск. На гэты раз Глеб быў узяты ў палон і вывезены ў Кіеў, дзе ў 1119 г. памірае, хутчэй за ўсё ад атруты.

Да смерці ў 1125 г. Уладзімір Манамах імкнуўся навязваць сваю волю полацкім удзельным князям. Але як толькі ён памёр, палачане адмовіліся падпарадкавацца яго сыну Мсціславу. Тым самым яны выклікалі вялікі паход кааліцыі паўднёварускіх князёў "на крывічы" ў 1128 г. З дзевяці розных накірункаў уварваліся варожыя войскі, нападаючы на Заслаўе, Лагойск, Барысаў, Друцк і Некалач. У выніку былі захоплены ў палон полацкія князі Усяславічы і разам з сынамі высланы ў Візантыю. У 30-я гады XII ст. жывымі вярнуліся на бацькаўшчыну толькі два князі.

У сярэдзіне XII ст. паўсюдна ўзмацнілася роля веча ў кіраванні гарадамі і княствамі. Яскравы прыклад: у 1158 г. палачане выганяюць князя Расціслава Глебавіча і садзяць на прастол Рагвалода Барысавіча, а ў 1161 г. бяруць за князя Усяслава Васількавіча. Пры нестабільнасці знешнепалітычнай абстаноўкі веча станавілася гарантам абароны інтарэсаў жыхароў пэўнага горада і княства. З другога боку, веча выступала следствам паглыблення вытворчых адносін у гарадах. Менавіта XII — XIII стст. самыя багатыя на розныя праявы матэрыяльнай, пабытовай культуры. Аб актыўным развіцці рамяства і гандлю сведчаць шматгадовыя археалагічныя раскопкі беларускіх гарадоў. У другой палове XII ст. з'яўляецца большасць помнікаў мураванага дойлідства часоў развітога сярэднявечча. У гэты час узнікаюць прататыпы будучых цэхавых рамесных арганізацый XV — XVI стст. Рамеснікі, гандляры, баяры-землеўладальнікі, кроўна зацікаўленыя ў развіцці свайго народа ці княства, бяруць у рукі ўладу праз веча. Не застаецца ўбаку і царква, якая па колькасці належачых ёй матэрыяльных каштоўнасцей і зямель паступова вылучаецца на адно з першых месцаў.

Канец XII — пачатак XIII ст. вызначаліся пранікненнем ва Усходнюю Прыбалтыку рыцараў-крыжакоў. З часоў заснавання Рыгі ў 1201 г. пачынаўся перыяд змагання полацкіх княстваў за самастойнасць і ўплыў у ніжнім цячэнні Заходняй Дзвіны. Няўзгодненасць дзеянняў,

міжусобная барацьба прыводзілі да знікнення саміх княстваў, як здарылася з Кукенойсам і Герсікай.

Раздробленасць пражывалі і іншыя беларускія землі. Тураўская зямля, якая стала самастойнай пры Юрыі Ярославічу, падзялілася на ўдзельныя княствы: Тураўскае, Пінскае, Клецкае, Слуцкае і інш. Па гэтых княствах сядзелі нашчадкі Юрыя. Сярод іншых вылучаецца Пінскае княства, дзе ў канцы XII ст. сядзяць князі Яраслаў і Яраполак, а ў 1204 г. прыгадваецца князь Уладзімір. Паступова княствы Тураўскай зямлі падпадаюць пад уплыў Кіева і Галіцка-Валынскай Русі. У 1228 г. пінскі князь Расціслаў скардзіцца на паланенне сваіх сыноў у Чартарыйску, а ў 1229 г. Уладзімір пінскі абараняе Бярэсце ад яцвягаў, пакуль Данііл Галіцкі з Васількам Раманавічам хадзілі на дапамогу Конраду Мазавецкаму. Саюзам з галічанамі карысталіся пінскія князі ў барацьбе з Літвой, бо ў саміх сіл на гэта не хапала. Так, дапамаглі абараніць Пінск ад Літвы Данііл з Васількам у 1246 і 1247 гг. У гэты час княствам кіраваў Міхаіл Расціславі. У 1275 г. тураўскія і пінскія князі разам з іншымі хадзілі на Літву на Тройдэна. Цікава, што шырокавядомы Іпацьеўскі летапіс завяршаецца артыкулам 1292 г., дзе апавядаецца пра смерць пінскага князя Юрыя Уладзіміравіча, які быў пакорлівым і справядлівым: "І плакала па яму княгіня, і сыны яго, і брат яго, Дзямід-князь, і ўсе людзі плакалі за ім плачам вялікім".

У Тураўскім княстве меліся ўнікальныя асаблівасці грамадска-палітычнага ладу. Пад 1146 г. той жа Іпацьеўскі летапіс апавядае аб наяўнасці ў горадзе і князя, і пасадніка. Кіеўскі князь Ізяслаў Мсціславіч, захапіўшы Тураў, вывеў адтуль епіскапа Іаакіма і пасадніка Жыраслава Іванкавіча. Апошні, верагодна, быў сынам тураўскага тысяцкага Іванкі. Абодва належалі да вядомага баярскага роду. Унікальнасць з'явы ў тым, што адначасова князь і пасаднік існавалі акрамя Турава толькі ў Ноўгарадзе Вялікім.

Разам з Полацкім і Тураўскім княствамі ў XII ст. актыўную ролю пачалі адыгрываць Гарадзенскае і Наваградскае княствы.

Гарадзенскае княства, верагодна, зарадзілася ў XI ст. Пад 1116 г. летапісы апавядаюць, што князь гарадзенскі Усевалад Давыдавіч узяў шлюб з дачкой Уладзіміра Манамаха — Агафіяй. Гэты шлюб — сведчанне значнай ролі Гарадзенскага княства ў агульнапалітычных варунках Усходняй Еўропы. Княства да сярэдзіны XIII ст. праводзіла яўную пракіеўскую палітыку. Князь Усевалад у 1128 г. прымаў удзел у паходзе

на Полацк, пасля разам з кіеўскімі князямі ў 1132 г. — на Літву. Яго сыны Барыс і Глеб у 1144 г. разам з кіяўлянамі ідуць на Галіцка-Валынскае княства, удзельнічаюць у барацьбе за Кіеў на баку Ізяслава Мсціславіча ў 1150 і 1151 гг. Потым гарадзенскія князі ў 1174 г. падтрымліваюць Андрэя Багалюбскага. Неаднойчы гарадзенскія дружыны разам з іншымі хадзілі паходамі на полаўцаў. Так, у 1183 г. Мсціслаў Усеваладавіч гарадзенскі разам з Яраславам Юр'евічам пінскім і Глебам Юр'евічам дубровенскім, іншымі князямі на чале са Святаславам Усеваладавічам кіеўскім разбілі палавецкага хана Канчака на р. Эрэлі. Пад тым жа годам летапіс паведамляе, што ў Гародні быў пажар і згарэла ад маланкі каменная царква. Археолагам вядомы яшчэ дзве царквы гэтага часу ў Гародні, што сведчыць аб значнасці горада ў Беларускім Панямонні. З 40-х гадоў XIII ст. Гарадзенскае княства ўваходзіць у склад Вялікага Княства Літоўскага.

Другім буйным беларускім княствам у Верхнім Панямонні было Наваградскае княства. У 1235 г. упершыню прыгадваецца наваградскі князь Ізяслаў, а ў 1252 г. тут адбываецца каранацыя князя Міндоўга. У наступным годзе ў летапісе прыгадваецца "зямля Новагародская", што сведчыць пра існаванне самастойнага княства. Гэта княства мела выгаднае геапалітычнае становішча і таму стала цэнтрам, вакол якога з цягам часу аб'ядноўваліся многія беларускія землі.

Акрамя вышэйзгаданых самастойнымі дзяржаўна-палітычнымі ўтварэннямі былі Слонімскае і Ваўкавыскае княствы, вядомыя з 1252 г.

Час феадальнай раздробленасці на Беларусі быў заканамерным этапам пераходу ад пачатковай дзяржаўнасці Полацкай і Тураўскай зямель да больш высокага ўзроўню кансалідацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім.

4. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем татар

У першай палове XIII ст. палітычна раздробленыя і аслабленыя феадальнымі міжусобіцамі землі старажытнай Беларусі сталі аб'ектам агрэсіі нямецкіх крыжаносцаў з захаду і мангола-татар з поўдня.

На самым пачатку XIII ст. нашы продкі жылі, павярнуўшыся тварам да Балтыкі, адкуль пагражалі крыжакі. Шмат крыві пралілося ў той час на берагах Заходняй Дзвіны і Нёмана. Знікалі цэлыя народы. Няма сёння палабскіх славян, прусаў і яцвягаў, ад ліваў засталася толькі маленькая

этнаграфічная група, якая жыве на Рыжскім узмор'і. Вядома, што прасоўванне нямецкіх феадалаў на ўсход пачалося яшчэ на рубяжы VIII — IX стст. У X — XIII стст. ім удалося зняволіць і анямечыць заходніх (палабскіх) славян, якія жылі на ўсход ад р. Лаба (Эльба) і на захад ад р. Одэр. Пачатак планамернага заваявання Прыбалтыкі, якая была заселена эстамі, лівамі, літвою, жмуддзю і іншымі плямёнамі, звязаны з імем епіскапа Альберта, па загаду якога ў 1201 г. у вусці Заходняй Дзвіны была пабудавана крэпасць Рыга. Імкнучыся акаталічыць насельніцтва Прыбалтыкі, Альберт пры дапамозе рымскага папы ў 1202 г. стварыў рыцарскі ордэн мечаносцаў. Адначасова з Палесціны ў Прусію перасяліўся Тэўтонскі ордэн. У 1237 г. гэтыя два ордэны аб'ядналіся і ўтварылі Прускі, ці Лівонскі, ордэн. Заваёўнікі разглядалі Прыбалтыку як зручны плацдарм для "націску на ўсход". Грабежніцкія паходы прыкрываліся ідэяй распаўсюджання хрысціянства сярод язычнікаў Прыбалтыкі і "схізматыкаў" Русі. Вядомы беларускі гісторык У.М.Ігнатоўскі пісаў: "У засені крыжа хаваліся палітычныя і эканамічныя інтарэсы ўдзельнікаў паходаў: рыцары шукалі для сябе новых феодаў, гандляры — новых рынкаў, сяляне-сервы — вольнага жыцця, духавенства — новых прыходаў, якія б плацілі яму дзесяціну, і г.д. Гэты натоўп з ланцугамі і інтарэсамі, далёкімі ад хрысціянства, прыйшоў з Заходняй Еўропы ў Лівонію і Літву для распаўсюджвання хрысціянскай рэлігіі".

Шматлікія прыбалтыйскія плямёны былі ў той час раз'яднаны. У іх адсутнічалі буйныя гарадскія цэнтры, свая ўласная дзяржаўная ўлада, вакол якой яны мелі б магчымасць аб'яднацца, а таму не маглі аказаць арганізаванага супраціўлення захопнікам. Зразумела, што гэтыя плямёны шукалі падтрымкі і абароны ў полацкіх князёў, улада якіх пашыралася тады на ўсё сярэдняе і ніжняе цячэнне Заходняй Дзвіны.

У "Аповесці мінулых гадоў" у ліку іншых плямён, што плацілі даніну Русі, названы земгалы, корсь, нарома (латгалы), ліб (лівы), літва, г. зн. плямёны, што жылі ў Ніжнім Падзвінні аж да Балтыйскага мора. Нікому іншаму, відаць, акрамя палачан, якіх летапісец таксама адносіў да Русі, гэтыя плямёны не маглі падначальвацца. Таму Ніжняе Падзвінне з'яўлялася адной з крыніц матэрыяльнай і ваеннай магутнасці Полацка. З'яўленне тут нямецкіх крыжаносцаў пагражала полацкім князям стратай гэтых падуладных ім зямель, а пабудова Рыжскай крэпасці ставіла пад пагрозу гандлёвыя сувязі полацкіх, віцебскіх, смаленскіх і

іншых купцоў з краінамі Заходняй Еўропы. Менавіта таму полацкім князям прыйшлося першымі ўступіць у жорсткую барацьбу з небяспечным ворагам.

У другой палове XII ст. у нізоўях Заходняй Дзвіны ўзніклі два залежныя ад Полацка княствы-гарады Герцыке і Кукенойс. Герцыке (Герсіка) упершыню ўпамінаецца пад 1203 г. у "Хроніцы Лівоніі" нямецкага храніста Генрыха Латвійскага, які з 1205 г. жыў у Рызе, як багатая княжацкая рэзідэнцыя, цэнтр удзела, падпарадкаванага Полацку. У пачатку XIII ст. тут княжыў васал полацкага князя Уладзіміра (? — 1216) Усевалад. Кукенойс (Кокнесе) упершыню ўпамінаецца ў той жа "Хроніцы" Г.Латвійскага пад 1205 г. Складаўся ён з замка, вакольнага горада і пасада. Крэпасць з'яўлялася рэзідэнцыяй другога васала полацкага князя — Уладзіміра Вячкі, ці Вячаслава (? — 1224).

Летам 1203 г. дружыны полацкага князя Уладзіміра ў саюзе з лівамі асадзілі нямецкія крэпасці Ікскюль, Гольм, што з'яўляліся ключом да Рыгі, а князь Герсікі Усевалад сумесна з літоўцамі ў тым жа 1203 г. напаў на Рыгу. Аднак гэтыя выступленні не прынеслі значных поспехаў.

У 1206 г. прадстаўнікі ліваў прыбылі да полацкага князя Уладзіміра. У прамове да полацкага ўладара, паводле Г.Латвійскага, "поўнай пракляццяў" захопнікам, яны "сцвярджалі, што епіскап рыжскі з яго прыхільнікамі для іх вялікі цяжар, а ярмо веры нясцерпнае", і прасілі Уладзіміра дапамагчы выгнаць крыжаносцаў. Той згадзіўся. Але дзеянні саюзнікаў не былі ўзгоднены. Лівы выступілі першымі і пацярпелі паражэнне.

Палачане 11 дзён асаджалі Гольм, аднак узяць крэпасць не змаглі. Адсутнасць адзінства паміж палачанамі, лівамі, латышамі і літоўцамі ў сумеснай барацьбе супраць крыжаносцаў дазволіла крыжакам ужо ў першым дзесяцігоддзі XIII ст. падпарадкаваць Ніжняе Падзвінне. Храбры князь Кукенойса Вячка, не дачакаўшыся дапамогі ад полацкага князя Уладзіміра, быў вымушаны ў 1208 г. пасля непрацяглай барацьбы спаліць замак і са сваёй дружынай перайсці ў Ноўгарад. У 1224 г. падчас мужнай абароны разам з эстонцамі г. Юр'ева (Тарту) ад крыжакоў Вячка загінуў смерцю героя. У 1209 г. крыжаносцы захапілі і разрабавалі і Герсіку, князь якой — Усевалад — таксама не атрымаў дапамогі ад Уладзіміра.

У 1210 г. паміж полацкім князем Уладзімірам і рыжскім епіскапам Альбертам была заключана мірная дамова, паводле якой Полацк захоўваў сваё права на атрыманне

даніны ад ліваў, але праз пасрэдніцтва епіскапа. Гэта быў хітры манеўр. Рыцары хацелі выйграць час, канчаткова падначаліць насельніцтва Прыбалтыкі, сабраць новыя сілы, а потым захапіць і Полацкае княства. Уладзімір разумеў гэта, таму мір не мог быць трывалым.

Крыжакі пагражалі не толькі Полацку, але і літоўцам і Ноўгараду. Таму ў 1216 г. полацкі князь Уладзімір падрыхтаваў сумесны паход палачан, наўгародцаў і літоўцаў супраць ордэна, аднак у дзень выступлення ён нечакана памёр. Ёсць меркаванне, што полацкага князя атруцілі найміты крыжаносцаў.

У пачатку 40-х гадоў XIII ст., відаць, па агульнаму плану, узгодненаму з рымскім папам, шведскія і нямецкія захопнікі адначасова рушылі на паўночна-ўсходнюю Русь: першыя — на Ноўгарад, другія — на Пскоў. Наўгародскім князем у той час быў таленавіты палкаводзец і дальнабачны палітык Аляксандр Яраславіч. Каб процістаяць небяспецы, наўгародскі князь устанавіў трывалыя сувязі з Уладзіміра-Суздальскім княствам, а таксама з Полацкам і Віцебскам, што было замацавана яго шлюбам з дачкой полацкага князя Яраслава ў 1239 г.

Раніцай 15 ліпеня 1240 г. Аляксандр Яраславіч з невялікім атрадам нечакана з'явіўся на берагах Нявы, дзе ў сваіх шатрах адпачывалі шведы, і разбіў іх. За гэту перамогу ён быў празваны Неўскім. У неўскай бітве разам з іншымі змагаліся і воіны Полацкай зямлі. Сярод "мужоў храбрых", што вызначыліся ў бітве, быў Якаў Палачанін, які, паводле Наўгародскага летапісу, "наехав на полк з мечем и мужествовав крепко и похвали его князь". Гэта перамога ліквідавала пагрозу страціць узбярэжжа Фінскага заліва, палепшыла міжнароднае становішча Русі.

5 красавіка 1242 г. Аляксандр Неўскі разграміў крыжакоў на лёдзе Чудскага возера. Лядовае пабоішча прыпыніла рух крыжаносцаў на ўсход. Паводле міру, які быў заключаны ў 1243 г., крыжакі не толькі адмаўляліся ад заваяваных раней рускіх зямель, але і аддавалі Ноўгараду частку сваёй тэрыторыі (так званую Ляцьголу).

У пачатку XIII ст. у Цэнтральнай Азіі ўтварылася мангольская дзяржава на чале з Чынгісханам. Уся грамадска-дзяржаўная структура манголаў знаходзілася ў цеснай сувязі з арганізацыяй іх магутнага войска, якое дзялілася на цьмы (10 тыс.),. тысячы, сотні і дзесяткі.

У 1219 г. мангола-татары ўварваліся ў Сярэднюю Азію, Паўночны Іран і Закаўказзе. У 1223 г. яны нанеслі пара-

жэнне рускім князям на р.Калка ў прычарнаморскіх стэпах. У гэтай бітве разам з іншымі загінушымі рускімі князямі летапіс называе і нясвіжскага князя Юрыя.

Зімой 1237/38 г. татарскія орды на чале з ханам Батыем свой галоўны ўдар накіравалі на паўночна-ўсходнюю Русь. Адзін за другім былі захоплены, разграблены і амаль дашчэнту знішчаны гарады Разань, Суздаль, Уладзімір, Растоў, Цвер, Яраслаўль і інш. Вясной 1238 г. мангола-татары пагражалі беларускім землям з усходу. Але гераічная барацьба насельніцтва Смаленскага княства і паражэнне войскаў чужаземцаў паблізу Смаленска папярэдзілі іх прасоўванне на захад. Відаць, у гэты час адзін з татарскіх атрадаў быў разгромлены і ў бітве пад Крычавам. Восенню 1239 г. татары рушылі на поўдзень Русі, захапілі і знішчылі Глухаў, Чарнігаў, напалі на Гомель. Археалагічныя раскопкі і знаходкі татарскіх стрэл сведчаць, што гандлёвы пасад Гомеля загінуў, але сам дзяцінец, цэнтр абароны, устаяў.

Упартае супраціўленне мангола-татарам аказвалі жыхары беларускіх гарадоў, калі яны, спусташаючы Русь, рушылі ў 1240 – 1242 гг. на захад. Флангавыя атрады хана Батыя на чале з Гуюнам і Кайданам прайшлі праз паўднёвую частку тэрыторыі Беларусі, зруйнавалі і разрабавалі Мазыр, Тураў, Пінск. У Іпацьеўскім летапісе пад 1240 г. ёсць сведчанне пра бітву, відаць, з татарамі каля Брэста: "Данилови же (галіцкавалынскі князь) со братом пришедшу ко Берестью, и не можаще проехати в град, ради смрада великого убиенных множества в поле лежащих". "Хто ляжаў у полі, – на думку гісторыка М.А.Ткачова, – зразумела. Хрысціяне ніколі не пакідалі на ратным полі сваіх забітых. У любым выпадку іх прыносілі на шчыце дамоў і хавалі на роднай зямлі. Значыць, летапіс гаворыць, што палегла татарская раць. Яна не змагла перамагчы войска, якое закрыла ёй праход на тэрыторыю сённяшніх Брэсцкай і Гродзенскай абласцей".

Летапісы і іншыя крыніцы данеслі да нас некалькі паданняў пра жорсткія бітвы з мангола-татарамі ў нізоўях Прыпяці, "за Мазыром на рацэ Акунеўцы", каля Крутагор'я, дзе былі разгромлены атрады цемніка Кайдана. З таго часу Крутагор'е быццам бы ў адзнаку за разгром войск Кайдана сталі называць Койданавам (сучасны Дзяржынск). У сярэдзіне – другой палове XIII ст. мангола-татары неаднаразова ажыццяўлялі паходы на беларускія і літоўскія землі. "Того же лета (1258 г.), – гаворыцца ў летапісе, – взяша татарове всю землю Литовскую, и со многим палоном и багатством идоша в свояси". Ман-

гольскія нашэсці на беларускія і літоўскія землі мелі месца ў 1275, 1277, 1287, 1315, 1325, 1338 гг. "Татарове же, — чытаем у летапісе, — велико зло и велику пакость и досаду сътвориша христианом, идуще на Литву... по волостем, по селам дворы грабяще, кони и скоты и мение отъемлюще", а таксама захапіўшы шмат палонных, вярталіся ў Арду.

Такім чынам, не балоты і лясы, хоць і гэтага адмаўляць нельга, а гераічная барацьба рускага народа, што ў значнай ступені аслабіла і абяскровіла сілы мангола-татарскіх заваёўнікаў, а таксама ўпартае і працяглае супраціўленне насельніцтва Беларусі і Літвы спрычыніліся да таго, што яны захавалі сваю незалежнасць і не зведалі мангола-татарскага ярма.

5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў IX — XIII стст.

Характар эканамічнага жыцця беларускіх зямель раннефеадальнага часу ў асноўным вызначала сельская гаспадарка. Гэта пацвярджаюць як археалагічныя, так і пісьмовыя крыніцы. Асноўныя прылады апрацоўкі глебы — шматзубыя і двухзубыя сохі. Такімі сохамі можна было толькі ўзрыхляць зямлю. Сохі з прыстасаваннем для адкідвання скібаў увайшлі ва ўжытак у больш позні час, прыблізна ў XIV — XV стст. Сеялі ўручную, баранавалі драўлянай бараной. Пры рабоце на агародах ужывалася матыка з жалезнай акоўкай, так званым "рыльцам", і драўляная лапатка з жалезнай рабочай часткай. Адлюстраванне гэтых прылад знаходзяць у старажытных мініяцюрах, а жалезныя наканечнікі матык і акоўкі лапат — пры археалагічных раскопках. Найбольш распаўсюджанымі збожжавымі культурамі былі проса, жыта і пшаніца, а таксама авёс, гарох, ячмень. Збожжа жалі жалезнымі сярпамі. Зерне малацілі на таку драўлянымі цапамі, ачышчалі пры дапамозе драўляных лапат і рашот і захоўвалі ў свірнах. Зерне размолвалі на ручных каменных жорнах, а крупы абдзіралі ў драўляных ступах. У Мінску, напрыклад, былі вядомы драўляныя ручныя і складаныя нажныя ступы. Адна нажная ступа знойдзена ў пласце XII ст., другая — XIII ст. Нажная ступа складалася з масіўнай драўлянай плахі з адтулінай для засыпання зерня з аднаго боку і ўмацаванага рычага з другога. У рычаг на ўзроўні адтулін у пласе ўстаноўлены драўляны таўкач, які прыводзіўся ў рух шляхам перамяшчэння цяжару цела працуючага з адной нагі на другую.

Як сельскае, так і гарадское насельніцтва старажытнай Беларусі займалася агародніцтвам. Акрамя бабовых шырока былі распаўсюджаны агуркі, буракі, капуста, морква, рэпа і цыбуля. Трэба адзначыць, што бабы, знойдзеныя ў пластах XI — XII стст. у Менску, з'яўляюцца самай ранняй знаходкай гэтай культуры не толькі на тэрыторыі Бларусі, але і ва ўсёй Еўропе, у той час як драбнаплодныя (конскія) бабы — звычайная знаходка.

З развіццём земляробства іншыя галіны сельскай гаспадаркі — паляванне, рыбалоўства, бортніцтва — страчвалі ранейшае значэнне і ўсё больш набывалі характар падсобных заняткаў. Нездарма ў курганах IX — XII стст. слядоў палявання амаль не сустракаецца. Даніна, якую плацілі радзімічы па адной шкурцы з "дыма" (двара), таксама сведчыць аб мізэрных памерах паляўнічага промыслу.

Рост прадукцыйных сіл у земляробстве суправаджаўся развіццём хатніх промыслаў і выдзяленнем рамяства. Многія сельскія рамеснікі, якія добра асвоілі адно якое-небудзь рамяство, выходзілі з сельскай абшчыны і сяліліся ў такіх мясцінах, дзе быў большы попыт на іх вырабы. Так узнікалі гарады, у якіх канцэнтравалася рамеснае і гандлёвае насельніцтва, якое ў той ці іншай ступені было адарвана ад земляробства і забяспечвала сваімі вырабамі ўжо не асобную абшчыну, а больш шырокую тэрыторыю.

З IX па XIV ст. пісьмовыя крыніцы называюць больш за 50 пасяленняў гарадскога тыпу на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Гэта Полацк (862), Тураў (980), Бярэсце (1019), Віцебск (1021) і іншыя, але археалагічныя матэрыялы сведчаць, што большасць з гэтых населеных пунктаў з'явілася задоўга да таго, як пра іх паведамілі летапісы.

Працэс узнікнення старажытных гарадоў складаны і разнастайны. Можна меркаваць, што Полацк бярэ свой пачатак ад умацаванага паселішча крывічоў, культурныя слаі якога датуюцца VIII — IX стст. Аднак у аснове большасці беларускіх гарадоў былі княжацкія і феадальныя замкі. Так былі заснаваны Заслаўе (988), Браслаў (1065), Друцк (1078), Гародня (1127) і інш. З пачаткам феадальнай раздробленасці з'яўляюцца гарады-крэпасці асобных княстваў. Такой крэпасцю быў Менскі замак — важнейшы фарпост Полацкай зямлі на яе паўднёвых рубяжах, пабудаваны ў другой палове XI ст. у сутоку Нямігі і Свіслачы (упершыню Менск упамінаецца ў 1067 г.).

Гарады з'яўляліся не толькі цэнтрамі рамеснай вытворчасці (ужо ў IX — XI стст. у іх налічвалася звыш 40

спецыяльнасцей: кавалі, збройнікі, ювеліры, бондары, ткачы, шаўцы і інш.), але і гандлю, як унутранага, так і знешняга. У XII — XIII стст., відаць, склаўся абмен на ўнутраным рынку буйных гарадоў, таму шэраг пісьмовых крыніц указвае на аддзяленне горада ад вёскі, што не магло не выклікаць абмену паміж імі. Але гэты працэс толькі пачынаўся, таму што, паводле летапісаў, значная частка гарадскіх жыхароў яшчэ "делала нивы своя", г. зн. займалася земляробствам.

Развіваўся і знешні гандаль, а таксама гандаль паміж асобнымі землямі і княствамі. Крыніцы сведчаць, што ў XII ст. у Ноўгарад сістэматычна прыязджалі полацкія купцы, якія, як і смаленскія, павінны былі плаціць пошліны "по две гривины кун от берковъска вощанаго". Гэта плата была больш высокая, чым тая, якую плацілі мясцовыя купцы — жыхары Ноўгарада і Наўгародскай зямлі. Гэтым, трэба думаць, пагашалася канкурэнцыя. Шмат тавараў (жыта, пшаніца, агародніна, віны, фрукты, прыправы) дастаўляліся ў Ноўгарад праз Полацк і Віцебск транзітам. Вядомы выпадкі, калі іх наўмысная затрымка ставіла Ноўгарад у цяжкае становішча: у 1141 г., напрыклад, на працягу дзевяці месяцаў "ни жито к ним не идяще ни откуда же"; у 1167 г. "съложишася на Новъгородъ Андреи съ смолняны и съ полоцяны, и пути заяша, и сълы изъимаша новгородьския вьсьде, вести не дадите Кыеву..."

Значным гандлёвым цэнтрам быў і старажытны Менск. Шлях па рэках Свіслачы, Бярэзіне і Дняпры звязваў яго з Кіевам. З паўночнага захаду блізка да горада падыходзілі прытокі Віліі, якая ўпадае ў Нёман. Са шматлікімі гарадамі Менск злучалі сухапутныя дарогі. Невыпадкова тут у час раскопак пластоў XI — XIV стст. былі знойдзены ўпрыгожанні з бурштыну, што здабываўся на берагах Балтыкі, прасліцы з ружовага шыферу, вытворчасць якіх была сканцэнтравана ў ваколіцах Оўруча на Валыні, а таксама розныя вырабы кіеўскіх майстроў: флаконы і кубкі, шкляныя бранзалеты, пярсцёнкі, абломкі царкоўнага звана, некаторыя прадметы ўзбраення і інш.

Купцы з беларускіх зямель падтрымлівалі шырокія гандлёвыя сувязі не толькі з суседнімі, але і з больш далёкімі краінамі. Праз Русь праходзіў, як вядома, вялікі водны шлях "з вараг у грэкі" (Балтыйскае мора — Нява — Ладажскае возера — Волхаў — возера Ільмень — Ловаць — Днепр — Чорнае мора). Вядомы арабскі географ XI ст. Ібн Хордадбег пісаў: "Русы — купцы, — а яны са славянскіх плямён, прыбываюць з вельмі далёкіх абласцей Склаба (краіны сла-

вян) да Румскага мора, а таксама да Хазарскай сталіцы Іціль, да Багдада і тут прадаюць скуры бабра, чорнай лісіцы, а таксама мячы". На Русь прывозіліся дарагія самацветы, прадметы раскошы, перац, лаўровы ліст, фарбы і інш.

З узнікненнем прыватнай уласнасці на зямлю на тэрыторыі Беларусі ўмацоўвалася і пашыралася феадальнае землеўладанне. Першыя звесткі аб княжацкіх уладаннях на тэрыторыі Беларусі адносяцца да X ст. Летапіс паведамляе, што дачцэ полацкага князя Рагвалода, а жонцы вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Рагнедзе належаў "горад" (замак) Ізяслаўль (сучаснае Заслаўе). Акадэмік Б.Д.Грэкаў называе яго першым феадальным уладаннем ва Усходняй Еўропе. У дакументах XI ст. сярод "валасцей" тураўскага князя Яраполка названа Невельская воласць на Прыпяці (каля Пінска). У сярэдзіне XII ст. менскі князь Глеб завяшчаў сваёй жонцы пяць "вёсак з чэляддзю". У 1128 г. упамінаецца "Сяльцо", што каля Полацка, якое належала мясцоваму епіскапу Ілыі. Грамата князя Расціслава 1136 г. сведчыць, што княжацкае і царкоўнае землеўладанне існавала і ў Смаленскім княстве, у склад якога ўваходзіла ўсходняя частка беларускіх зямель.

З цягам часу феадальная ўласнасць на зямлю пашыралася: сёламі валодалі як князі, так і баяры і княжацкія дружыннікі, якія, паводле Наўгародскага летапісу, перасталі харчавацца "воюя другия страны", а пачалі збіраць "много имения" і абкладваць насельніцтва сваёй зямлі цяжкімі "вирами" і "продажамі", г. зн. штрафамі.

На працягу XI — XIII стст. на Беларусі развівалася не толькі свецкае, а і царкоўнае землеўладанне. Росту царкоўных уладанняў садзейнічала, па-першае, іх неадчужальнасць, а па-другое, тое, што яны ў адрозненне ад княжацкіх і баярскіх уладанняў не раздрабляліся на часткі, паколькі ў спадчыну не перадаваліся.

Сяляне-абшчыннікі траплялі ў феадальную залежнасць рознымі шляхамі. Значная частка сялян разаралася ад уплаты цяжкіх княжацкіх данін, ад частых войн, у час якіх іх гаспадарка рабілася аб'ектам рабаўніцтва. Разаралі сялян таксама судовыя штрафы і "кормы", якія яны павінны былі даваць прадстаўнікам велікакняжацкай улады на месцах. Разораныя сяляне-абшчыннікі, трапляючы ў кабалу, трацілі свабоду і зямлю. У некаторых выпадках сяляне-абшчыннікі, ратуючыся ад штодзённага гвалту і ўціску з боку многіх феадалаў, самі вымушаны былі аддаваць сябе пад уладу аднаго з іх. Персідскі гісторык XI ст. Гардзізі паведамляў, што "многія славяне прыходзяць да русаў і

служаць ім, каб службай здабыць сабе бяспеку". Відаць, смерды, паступаючы на службу да феадалаў, імкнуліся "здабыць сабе бяспеку" ад памкненняў на іх асобу іншых феадалаў. У выніку абшчынныя сялянскія землі пераходзілі да феадалаў, а землі, якія не былі імі захоплены, станавіліся ўласнасцю дзяржавы.

Не толькі сяляне-абшчыннікі, але і жыхары гарадоў траплялі ў феадальную залежнасць і выконвалі на карысць землеўладальнікаў розныя павіннасці. Так, сярод рамесных вырабаў, якія археолагі знаходзяць у час раскопак, нярэдка сустракаюцца клеймаваныя прадметы. На гарадзішчы ў Ваўкавыску, напрыклад, былі знойдзены цагліны з княжацкімі і царкоўнымі клеймамі. Значыць, адна частка рамеснікаў працавала на князя, другая — на царкву.

Сялянскі надзел і гаспадарка, якая на ім вялася, былі крыніцай для атрымання феадаламі і феадальнай дзяржавай прыбавачнага прадукту. На карысць дзяржавы сяляне плацілі перш за ўсё даніну — розныя футры (сабаліныя, гарнастаевыя, пясцовыя, куніцавыя, бабровыя), а таксама мёд, воск і іншыя прадукты лясной гаспадаркі. Трэба падкрэсліць, што раней гэту даніну збіралі варагі: "Имяху дань верязи изъ заморья на чюди и на словенах, и на мери и на всехъ кривичех", — запісаў летапісец пад 859 г. На радзімічаў варажская даніна не распаўсюджвалася: там яе "козари имяхи". Плата даніны была звязана з такімі павіннасцямі, як палюддзе, павоз і інш. Палюддзем называліся тыя паборы, якія дадаткова браліся з насельніцтва пры зборы даніны, павозам — павіннасць, звязаная з дастаўкай даніны ў пэўныя месцы.

Даніна збіралася з насельніцтва шляхам перыядычнага аб'езду князем і яго дружынай падуладных яму зямель. Пра тое, як гэта адбывалася, сведчыць сучаснік вялікага кіеўскага князя Ігара візантыйскі імператар Канстанцін Багранародны: "Зімні і жорсткі вобраз жыцця гэтых самых русаў такі. Калі наступае лістапад месяц, князі іх адразу ж выходзяць з усімі русамі з Кіева і накіроўваюцца ў палюддзе, г.зн. кругавы аб'езд і менавіта ў славянскія землі: драўлян, дрыгавічоў, севяран і астатніх славян, якія плацяць даніну русам. Харчуючыся так на працягу ўсёй зімы, яны ў красавіку месяцы, калі растае лёд на рацэ Дняпры, зноў вяртаюцца ў Кіеў". Памеры даніны не былі вызначаны, што вяло да злоўжыванняў. Нечарговы ваяж Ігара да драўлян скончыўся для яго трагічна. У 945 г. яго забілі пастаўшыя драўляне. У 984 г. радзімічы адмовіліся плаціць

даніну кіеўскаму князю, але былі разбіты на р. Пяшчана каля Прапойска (сучасны Слаўгарад) ваяводам вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча Воўчым Хвастом, пасля чаго зноў былі вымушаны плаціць даніну.

Далейшае развіццё феадальных адносін павялічвала сацыяльную процілегласць паміж нізамі і пануючым класам, абвастрала супярэчнасці ўнутры тагачаснага грамадства. "Руская праўда", напрыклад, у старажытнай сваёй частцы вызначала штраф (віру) за забойства "огнишчанина" і "княжа тивуна" ў 80 грыўняў, а за забойства смерда, радовіча і халопа — 5 грыўняў. Штрафы за забойства феадала былі, такім чынам, у 16 разоў большыя, чым за забойства простага селяніна. Рэзкае процістаўленне свабоднага чалавека несвабоднаму можна знайсці і ў іншых дакументах. Напрыклад, у дагаворы Смаленска, Віцебска і Полацка (1229) сказана, што забойства свабоднага чалавека аплачваецца віраю ў 10 грыўняў серабра, а забойства халопа — у 1 грыўню.

6. Рэлігія і культура

У цеснай сувязі з дзяржаваўтваральнымі працэсамі на Беларусі ў IX — XIII стст. ішло развіццё культуры. Найбольш яскравым праяўленнем гэтага боку грамадскага жыцця стала прыняцце і распаўсюджанне хрысціянства.

Першыя славянскія плямёны, якія рассяліліся на Беларусі, — крывічы, дрыгавічы і радзімічы — вызнавалі язычніцкую рэлігію. Гэта збліжала іх з аўтахтонным насельніцтвам — балтамі і, верагодна, стала адной з прычын прадзяржаўных утварэнняў з поліэтнічным насельніцтвам — Полацкага і Тураўскага княстваў.

Сапраўды, прынцыповай розніцы паміж язычнікамі ва ўсім свеце не існуе. Усе яны пакланяліся і пакланяюцца праявам навакольнга асяроддзя — сонцу, месяцу, агню, вадзе і інш. У нашых продкаў яны атаясамліваліся з багамі: Сварогам, Сварожычам, Жыжалем, Макошай (Цёцяй), Перуном і інш.

Аднак на мяжы Старога і Новага часу паўсюдна монатэістычныя вераванні паступова змяняюць язычніцкія. Сярод іх найбольш магутным было хрысціянства. Еўропа перажыла два этапы хрысціянізацыі. Першы вызначаецца ад узнікнення хрысціянства да VII —VIII стст. калі была ахрышчана Рыма-Візантыйская імперыя, Імперыя франкаў і брытанскія каралеўствы. На другім этапе — IX — X стст. Хрыстову веру прынялі славянскія дзяржавы і Сканды-

навія. Паўсюдна прыняцце хрысціянства супадала з утварэннем самастойных монаэтнічных дзяржаў.

На Беларусь хрысціянства пачало пранікаць у IX ст. Ужо ў X ст. ісландская епіскапская "Сага аб хрышчэнні" распавядае аб месіянеры Торвальдзе па прозвішчу Вандроўнік, які, прайшоўшы паломніцкі шлях у Палесціну, вярнуўся да сябе на радзіму праз Полаччыну. У Полацку, паводле звестак, ён заснаваў манастыр у гонар Іаана Прадцечы, дзе памёр і быў пахаваны. Пісьмовыя крыніцы XIV ст. сапраўды фіксуюць у Полацку такі манастыр. Можна спадзявацца, што ў хуткім часе будуць знойдзены і яго археалагічныя рэшткі. Не выключана, што да часу афіцыйнага прыняцця новай рэлігіі з верай былі знаёмы і Рагвалод, і Рагнеда. Інакш цяжка вытлумачыць пастрыжэнне Рагнеды ў манашкі пад імем Анастасіі і заснаванне ёю манастыра ў Заслаўі. Прыхільна ставіўся да хрысціянства сын Рагнеды — князь Ізяслаў. Летапісы згадваюць яго як першага князя-кніжніка, які "любіў і шанаваў манашы чын".

Прамых звестак пра хрышчэнне Беларусі няма. Такія падзеі, як у Кіеве і Ноўгарадзе (знішчэнне язычніцкіх багоў, прымусовае прывядзенне кіяўлян на Дняпро і крывавая бойка ў Ноўгарадзе), абмінулі нашы землі. Магчыма, гэтаму спрыяла тое, што беларускія князі праводзілі самастойную палітыку не толькі ў дзяржаўнай, але і ў духоўнай сферы. Ёсць меркаванне, што першыя епіскапы былі дасланы ў Кіеў, Ноўгарад і Полацк з балгарскай Ахрыдскай аўтакефальнай царквы. Яна была праваслаўнага накірунку ў статусе патрыярхату і роўнай візантыйскай Канстанцінопальскай царкве.

Ужо ў канцы IX ст. у Полацку была пабудавана першая царква ў імя Багародзіцы, якая прыгадваецца летапісамі пад 1007 і 1158 гг. У гэтую царкву ў XI ст. былі перанесены мошчы невядомых святых, што сведчыць аб наяўнасці ранніх мясцовых культур і самастойнасці полацкай царквы. У сярэдзіне XI ст. быў пабудаваны вялікі саборны храм — Сафія. Па духу і ўнутранаму зместу яна паўтарала храмы ў Ахрыдзе, Канстанцінопалі. Полацкая Сафія была сястрой і ў пэўнай ступені саперніцай аналагічных храмаў у Кіеве і Ноўгарадзе. Як і там, яна з'яўлялася яскравым увасабленнем ідэі магутнасці і адзінства, непадлегласці. Гісторыя захавала імёны першых беларускіх мулыраў — Давыда, Таўма, Мікулы і Капесы.

Ад першых храмаў у Полацку пачала развівацца сталая дойлідская традыцыя на Беларусі, якая мела шэраг адметных рысаў. Перш за ўсё яна вызначалася незвычайнай

узнёсласцю і стромкасцю цэркваў. Многія пабудовы менавіта полацкай дойлідскай школы мелі падоўжаны ў плане аб'ём па лініі захад — усход і змешчанасць на захад падкупальнай прасторы. У XII ст. у самім Полацку было восем храмаў, акрамя Сафіі і Багародзіцы, тры царквы ў Гародні, па адной у Віцебску, Менску, Наваградку, Ваўкавыску, Тураве і Пінску. Нельга забываць таксама этнічна і гістарычна звязаны з Беларуссю Смаленск, дзе ў гэты час было сем храмаў. Сярод дойлідаў XII ст. вядома імя Іаана, які кіраваў узвядзеннем царквы ў гонар Спаса Праабражэння Ефрасіннеўскага манастыра.

Разам з храмавым дойлідствам з'явілася хрысціянскае выяўленчае мастацтва. Жывапісцы распісвалі па сырой тынкоўцы сцены сабораў, пісалі абразы. Полацкую Спаскую царкву распісаў мастак Кузьма з памочнікамі. Імя яго жонкі — Кузьміная — захавалася сярод надпісаў на адной са сцен гэтага храма.

Надзвычай рана з'явілася на Беларусі пісьменнасць. Першым датаваным надпісам на ўсёй тэрыторыі Усходняй Еўропы з'яўляецца надпіс на пячатцы полацкага князя Ізяслава. Імя князя перададзена так званымі кірылічнымі літарамі, але ў грэчаскім гучанні — "Ізяславос". І ў гэтым няма нічога дзіўнага. Справа ў тым, што знакаміты балгарскі асветнік Кірыла Салунскі прыдумаў азбуку-глаголіцу ў 60-я гады IX ст., якая зусім не падобная на існуючую. Яго вучні, у тым ліку архіепіскап Ахрыдскі Клімент, адаптавалі сучасныя ім грэчаскія літары пад славянскую фанетыку. Ў такім выглядзе і трапілі да нас з Балгарыі першыя перакладныя кнігі і кніжнае пісьмо.

Першыя пабытовыя надпісы таксама з'явіліся на этнічных крывіцкіх землях. Падчас раскопак курганоў пад Смаленскам знойдзены вялікі гаршчок-карчага з надпісам "гараўшна" — гарчыца.

У XII ст. хрысціянская культура і пісьменнасць паступова ахапілі амаль усе слаі тагачаснага грамадства. Пісьмом пачалі карыстацца не толькі царкоўнікі і князі, але і простыя людзі. Археолагі знайшлі берасцяныя граматы ў Мсціславе і Віцебску, а таксама ў Ноўгарадзе і Смаленску, якія належалі палачанам. Ёсць узоры пісьма "полацкай вытворчасці" на сценах Сафійскага сабора ў Кіеве. Найвыдатнейшым узорам старажытнай эпіграфікі з'яўляецца надпіс на крыжы, які ў 1161 г. зрабіў полацкі майстар Лазар Богша па заказу Ефрасінні Полацкай. У гэтым надпісе пералічваецца, колькі матэрыялу пайшло на выраб крыжа, колькі было выплачана

майстру за работу, а таксама страшэннае закляцце-загавор супраць магчымых рабаўнікоў. У 30 – 40-я гады XX ст. гэты крыж знік і пакуль яшчэ не знойдзены. Выдатнымі помнікамі пісьменнасці з'яўляюцца так званыя "Барысавы" і "Рагвалодавы" камяні. Гэта былі язычніцкія культавыя камяні, на якіх полацкія князі загадвалі выбіваць надпісы хрысціянскага зместу. Такім чынам яны дамагаліся пакланення язычнікаў хрысціянскім святыням, а таксама ўвекавечвалі свае імёны.

Нарэшце, кніжная культура дасягнула сваіх вышынь у творчасці Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Аўрамія Смаленскага, Кліма Смаляціча, невядомага аўтара "Слова пра паход Ігаравы".

Найбольш знакамітым сярод іх быў Кірыла Тураўскі, якога яшчэ пры жыцці празвалі Златавустам. Гэты чалавек, які паходзіў з заможнай гарадской сям'і, добраахвотна стаў манахам. Ён карыстаўся такой павагай сярод сучаснікаў, што яны самі прасілі Кірылу стаць епіскапам тураўскім. Добра ведаючы шматлікія мовы і чытаючы кнігі ў арыгіналах, Кірыла сам быў выдатным прамоўцаю і пісьменнікам. Захаваліся некалькі яго філасофскіх прытчаў, восем слоў, 30 малітваў, два каноны. Гэтыя творы Кірылы Тураўскага раз-пораз перавыдаюцца і зараз.

Не менш багатай была і пабытовая культура. Старажытныя беларусы выдатна валодалі шматлікімі рамёствамі. Апошніх у XII – XIII стст. налічвалася каля 60. Аднак майстры-рамеснікі не проста выраблялі, напрыклад, прылады працы, але імкнуліся ўпрыгожыць іх. Яны выкарыстоўвалі шматлікія арнаментальныя матывы. Многія з іх – Сонца-кола, зорачка, ромб, трохкутнікі, што бяруць пачатак у далёкім язычніцтве, жывуць і сёння. Арнаменты былі вельмі пашыраны ў адзенні. Нават абутак, тады яшчэ мяккі, без абцасаў, часта цалкам вышывалі каляровымі ніткамі. Славіліся полацкія залатары. Акрамя Лазара Богшы працавалі многія іншыя. У Полацку, напрыклад, археолагі знайшлі чатыры ювелірныя майстэрні X – XII стст. Полацкія майстры выраблялі ўпрыгожанні з бронзы (бранзалеты, пярсцёнкі, розныя прывескі, грабеньчыкі), з косці (накладкі на пасы і кнігі, двухбаковыя грабеньчыкі), з бурштыну (пацеркі і пярсцёнкі). Вядома, працавалі і з каштоўным металам, але гэта былі рэчы выключна заказныя для князёў і духоўных іерархаў.

Такім чынам, культура старажытнай Беларусі вызначалася вельмі багатай гамай фарбаў, форм, гукаў (выраблялiся музычныя інструменты і пісалася музыка).

РАЗДЗЕЛ 4

БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIII — СЯРЭДЗІНЕ XVII ст.

1. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага

Літва, княства Наваградскае, княства Літоўскае і Наваградскае, Вялікае Княства Літоўскае і Рускае, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і іншых зямель — пад такімі назвамі паўставала ў гісторыі і ўпісвала сваю старонку ў еўрапейскую і сусветную гісторыі адна з самых магутных краін сярэднявечча, пачаткі якой адносяцца да сярэдзіны XIII ст.

У XIII ст. усходнеславянскія абшары былі яшчэ пакрыты мноствам феадальных удзельных княстваў, валадары якіх з пераменным поспехам змагаліся за першынство ў сваіх рэгіёнах. Прынамсі, на беларускіх землях такіх княстваў налічвалася каля 20.

Стан на землях балцкіх у сярэдзіне XIII ст. можна вызначыць як пераддзяржаўны. Тут узнікаюць племянныя саюзы, вылучаюцца "старшыя" князі (кунігасы), якія ўмацоўваюць сваю ўладу. Як сведчыць гісторыя, такі пераддзяржаўны стан мог праіснаваць даволі працяглы час. Але пагражальная для самога выжывання балцка-славянскага насельніцтва знешняя небяспека вымушала суцішыць міжкняжацкія ўнутраныя разборкі і вылучала ідэю кансалідацыі, аб'яднання на першы план. Бо гэтым часам на суседніх паўночных землях — тэрыторыях латышоў і эстаў — ордэн мечаносцаў далёка не прапаведніцкімі метадамі насаджаў хрысціянства. Рэальная пагроза ад нязваных хрысціцеляў паўставала для палачан, пскавічоў, Ноўгарада Вялікага, Жмудзі і Літвы. Асаблівую небяспеку сталі ўяўляць ворагі з паўночнага захаду, калі ў 1237 г. мечаносцы аб'ядналіся ў адзін ордэн з тэўтонамі, што знішчылі перад гэтым магутнае балцкае племя прусаў і марылі аб новых заваёвах на ўсходзе.

Не меншая пагроза навісла для нашых продкаў у сярэдзіне XIII ст. з паўднёвага ўсходу. Адно за другім падпадалі пад мангола-татарскае ярмо ўсходнія і паўднёвыя рускія княствы. Нават самыя магутныя з іх — тая ж Галіцка-Валынская Русь — вымушаны былі сплачваць даніну ардынскім захопнікам.

У такой сітуацыі дзеля абароны сваёй незалежнасці, у

рэшце рэшт дзеля выжывання насельніцтва балцка-ўсходнеславянскага памежжа павінна было аб'яднаць свае намаганні. Але спраўдзіць ідэю кансалідацыі балцка-славянскіх зямель было не так проста, бо на лідэрства ў гэтым рэгіёне прэтэндавалі тры цэнтры: Наваградак, літоўска-жмудзінскі асяродак і Полацк. Нельга забываць і аб палітычных амбіцыях у гэтым рэгіёне галіцкіх князёў.

Уяўляецца, што Полацкае княства, якое ў свой час першым вылучылася са складу Кіеўскай Русі і мела багатыя традыцыі незалежнага і самастойнага існавання, павінна было стаць тым цэнтрам, які б аб'яднаў вакол сябе змоглыя ад феадальных усобіц і іншаземных набегаў навакольныя землі. Аднак Полаччына XIII ст. не была ўжо настолькі багатай і магутнай, як у папярэднія стагоддзі, бо страта выхаду да Балтыкі, цяжкая зацяглая барацьба з крыжацкай агрэсіяй падарвалі яе сілы. І ў сярэдзіне XIII ст. цэнтр палітычнага жыцця на беларускіх землях пераходзіць у Наваградак. Шматлікія пацверджанні таму даюць крыніцы.

Летапісы, якія паведамлялі аб падзеях сярэдзіны XIII ст., змяшчалі шмат звестак аб Наваградку, аб Наваградскай зямлі. Археолагі, якія ў пасляваенны час пачалі праводзіць у Наваградку раскопкі, былі пастаўлены перад неабходнасцю тлумачэння такой з'явы, што ў XIII ст. гэты ў нядаўнім мінулым нічым не адметны рэгіянальны цэнтр "напоўнены імпартнымі вырабамі". Горад па сваіх памерах адносіўся да невялікіх, аднак па знаходках прадметаў раскошы сапернічаў са знакамітымі старажытнарускімі гарадамі, а ў шэрагу выпадкаў з'яўляўся ўладальнікам унікальных рэчаў.

Узвышэнне Наваградка ў сярэдзіне XIII ст. вынікае з яго геапалітычнага становішча ў гэты час. Тое, што багацце і раскоша пацяклі сюды, — натуральная з'ява, бо пацяклі яны ў самае бяспечнае месца, аднолькава аддаленае ад гарачых крывавых межаў, дзе сутыкаліся балты і славяне з крыжацкай і мангола-татарскай навалами. Грошы і багацце давалі моц і ўладу. І калі ў 30-х гадах XIII ст. Наваградак знаходзіўся ў залежнасці ад Галіцка-Валынскай Русі, то ў другой палове 40-х гадоў наваградцы праводзяць самастойную лінію ў складаных міждзяржаўных стасунках у гэтым рэгіёне.

Менавіта ў Верхнім Панямонні разгортваліся асноўныя падзеі, якія паклалі пачатак Літоўскай дзяржаве. Першым князем — прэтэндэнтам на ролю яе стваральніка — выступіў літоўскі князь Міндоўг. Трэба мець на ўвазе, што летапісная Літва размяшчалася на сучасных усходнелітоўскіх і паўночназа-ходніх беларускіх землях.

Да з'яўлення ў Наваградку Міндоўг у летапісах упамінаецца сярод іншых князёў-кунігасаў на балцкіх тэрыторыях. Фігураваў ён у асноўным у ролі наёмніка. Так, у 1219 г. Міндоўг даў абавязацельствы галіцка-валынскім князям ваяваць супраць палякаў. У 1237 г. ён па жаданню Данілы Галіцкага выступае супраць Конрада Мазавецкага. Аднак у сярэдзіне 40-х гадоў Міндоўг церпіць няўдачу ў бітве з крыжакамі, і пазіцыі яго ў Літве значна слабеюць. Скарыстаўшы гэта, праціўнікі-кунігасы Міндоўга выганяюць яго з Літвы. Тады і з'яўляецца Міндоўг у Наваградку, дзе, паводле Густынскага летапісу, у 1246 г. "прия веру Христову от Востока (г. зн. праваслаўную) со многими своими бояры".

Як князь Наваградка Міндоўг выконваў волю і памкненні наваградскіх баяраў, якія, між іншым, супадалі з яго асабістымі інтарэсамі. З дапамогай сілы Міндоўг напрыканцы 40-х — пачатку 50-х гадоў XIII ст. адваёўвае для сябе Літву і далучае яе да Наваградка. Паводле Іпацьеўскага летапісу, Міндоўг "Литву зане, поимана бе вся земля Литовьская".

Добра разумеючы, што гэты крок прыйдзецца недаспадобы магутным галіцка-валынскім князям, Міндоўг шукае падтрымку на Захадзе. Ён прымае каталіцтва і ў 1252 ці 1253 г. карануецца ў Наваградку з бласлаўлення папы рымскага Інакенція XIV. Тым самым валадар Літвы мяркуе спыніць крыжацкі ўціск і здабыць саюзнікаў у супрацьстаянні з галічанамі. Але надзеі Міндоўга не спраўдзіліся. Тройчы абрушвалася моц галіцка-валынскага войска на землі Наваградчаны, несучы з сабой смерць, рабаванне, гвалт.

Няўдачы, што даймалі Міндоўга, выклікалі незадаволенасць ім у баярскім асяродку наваградчан. У хуткім часе на княжацкі пасад яны запрашаюць сына Міндоўга — Войшалка. Гэта быў таленавіты, дальнабачны, жорсткі палітык-валадар. На пачатку сваёй кар'еры ў ролі князя наваградскага ён разыгрывае складанейшую палітычную камбінацыю, мэтай якой было захаванне незалежнасці Наваградка ад галіцкіх князёў. Войшалк аддае сваё наваградскае княжанне сыну Данілы Галіцкага Раману. Сам жа ўваходзіць у давер да магутнага паўднёварускага валадара. У зручны момант — напрыканцы 50-х гадоў XIII ст. — Войшалк забівае Рамана і вяртае страчаны пасад. У гэты час абвастраюцца адносіны паміж правадыром Літвы Міндоўгам і яго сынам князем Наваградка Войшалкам. Здаецца, пытанне аб лідэрстве ў рэгіёне павінна вырашыцца паміж гэтымі асобамі.

Але тут з'яўляецца трэцяя сіла — жмудскі князь Трайнята. Менавіта са жмудскага асяродка паўстае другая спро-

ба аб'яднання балцка-ўсходнеславянскіх зямель у адзіны палітычны арганізм. Увосень 1263 г., калі войска Міндоўга знаходзілася ў паходзе на Бранск, валадар Літвы і два яго малодшыя сыны былі забіты змоўшчыкамі, на чале якіх стаяў Трайнята. Ён вырашыў знішчыць усіх мажлівых канкурэнтаў і пачаў гэтую няўдзячную справу з пляменніка Міндоўга Таўцівіла, што на той час княжыў у Полацку. Полацк і сам меў намеры скарыстаць сітуацыю і, забіўшы Трайняту, далучыць суседнія балцкія землі да сваёй дзяржавы. Больш увішным аказаўся жмудскі князь, які забіў полацкага Таўцівіла. Тады, як сведчыць летапіс, "Войшалк убоявся того же и бежа до Пиньска".

Аднак трыумф Трайняты быў нядоўгім. Праз некаторы час яго зарэзаў конюх Міндоўга, пасля чаго надышла развязка: Войшалк "поиде с пиняны к Новогороду и оттоле пое с собою Новогородце и поиде в Литву княжить". Наступным этапам у дзейнасці Войшалка было далучэнне да сваіх уладанняў балцкіх зямель Нальшчанаў і Дзяволтвы.

Такім чынам, князь наваградскі Войшалк стварыў тое ядро дзяржавы, якое з цягам часу абрастала суседнімі землямі і пераўтварала княства Літоўскае, Літву ў Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае. Гэты працэс расцягнуўся не на адно дзесяцігоддзе і завяршыўся недзе ў 50 – 70-х гадах XIV ст.

Прыведзеныя факты пераканаўча сведчаць, што заходнебеларускія землі разам з балцкімі сталі асновай Вялікага Княства Літоўскага. Прычым у існаванні такога палітычнага аб'яднання было зацікаўлена насельніцтва як адных, так і другіх зямель. Менавіта таму ў хуткім часе далучаюцца да верхнянёманскага дзяржаўнага ядра і астатнія беларускія землі.

Шляхі іх уваходжання ў склад Літоўскай дзяржавы былі розныя. Скупыя, адрывістыя звесткі, што дайшлі да нас ад той далёкай пары, не дазваляюць вызначыць дакладную карціну гэтага працэсу. Напрыклад, пад 1326 г. упамінаецца ў летапісах князь менскі Васіль ужо як васал вялікага князя Гедыміна. Але на якіх умовах і пры якіх абставінах гэта адбылося, меркаваць складана. Сваю ролю ў пашырэнні тэрыторыі Літоўскай дзяржавы адыгрывалі шлюбныя сувязі, недругараднае месца адводзілася і ваенна-палітычнаму націску. Аднак ёсць падставы, каб з упэўненасцю гаварыць аб добраахвотна-дагаворнай аснове ўваходжання ў склад Літоўскай дзяржавы найбольш буйных беларускіх зямель – Полацкай і Віцебскай. Аб гэтым сведчаць земскія прывілеі

вялікіх князёў літоўскіх. Яны зацвярджалі аўтаномны статус вышэйназваных зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага. Па меншай меры можна выдзеліць чатыры характэрныя рысы аўтаномнасці. Першая рыса звязана з правам палачан і віцябчан выказваць сваю думку і самым сур'ёзным чынам уплываць на прызначэнне вялікім князем першай асобы ў сваёй зямлі. Вялікі князь быў абавязаны "им давать воеводу по старому, по их воли, и который им будет нелюб воевода..., ино нам воеводу им иного дати, по их воли".

Аўтаномнасць Полацкай і Віцебскай зямель, па-другое, прадугледжвала абмежаванне судовай улады велікакняжацкіх намеснікаў ці ваявод. Гэта вельмі важны момант, бо заканадаўчыя нормы і судовыя ўстановы практычна вызначаюць статус асобы ў грамадстве. Кантроль над гэтым статусам мясцовае баярства захоўвала за сабой. Так, у прыгаданых земскіх прывілеях спецыяльна агаворвалася: "А воеводе нашому полоцкому мешчан не судити одному, судити ему с бояры и мешчаны".

Фактарам аўтаномнасці, па-трэцяе, заставалася мажлівасць функцыяніравання полацкага і віцебскага веча (сейма). Прычым на гэтых сходах насельніцтва Полацка ці Віцебска вырашаліся многія важныя пытанні мясцовага кіравання: выбранне мясцовых улад, нормы нясення воінскай службы, гаспадарчыя гарадскія справы, нарэшце, абмяркоўваліся міждзяржаўныя гандлёвыя дагаворы.

Чацвёртая, бадай, самая важная з вызначаных рысаў пэўнай самастойнасці Полацкай і Віцебскай зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага заключаецца ў выключным, манапольным праве мясцовага баярства займаць усе пасады мясцовага кіравання. Гэта значыць мясцовыя землеўладальнікі захоўвалі за сабой права ўладарыць і ў сваёй зямлі. Нездарма менавіта з Падзвіння выйшла абсалютная большасць знакамітых родаў беларускага паходжання, прадстаўнікі якіх займалі кіруючыя пасады як у мясцовых, так і ў цэнтральных органах улады Вялікага Княства Літоўскага. Тут было родавае гняздо князёў Друцкіх, Лукомскіх, Адзінцэвічаў. Адсюль паходзілі такія вядомыя ў гісторыі прозвішча, як Глябовічы, Ільінічы, Няміравічы, Корсакі, Зяноўевічы і многія іншыя.

Вышэйпададзеныя факты дазваляюць гаварыць аб федэратыўнай будове Вялікага Княства Літоўскага, калі вакол першапачатковага ядра аб'ядноўваліся абласныя аўтаноміі.

Феадальныя княствы-дзяржавы, што існавалі на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў X – XII стст., вопытам дзяр-

жаўнасці, развітой эканомікай, культурай перадавалі свае багатыя традыцыі і новай Літоўскай дзяржаве, робячы яе Вялікім Княствам.

Усе народы, якія прымалі ўдзел у палітычным, эканамічным, культурным жыцці Вялікага Княства, найперш сучасныя беларускі і літоўскі, з'яўляюцца гістарычнымі спадкаемцамі гэтай дзяржавы. Таму ёсць усе падставы ўжываць тэрмін для вызначэння дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага — Беларуска-Літоўскае гаспадарства.

2. Унутры- і знешнепалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў XIV — першай палове XVI ст.

Дзяржава, што нарадзілася ў сярэдзіне XIII ст. на землях Верхняга Панямоння і далучыла да сябе на працягу наступных дзесяцігоддзяў суседнія землі, паўстала ў форме своеасаблівай федэрацыі зямель Літвы і Русі. Да сярэдзіны XV ст. дзяржава афіцыйна называлася Вялікім Княствам Літоўскім і Рускім, пазней — Вялікім Княствам Літоўскім, Рускім, Жамойцкім і іншых зямель. У Вялікім Княстве тэрмін "Літва" тады адносіўся да тэрыторыі Верхняга і Сярэдняга Панямоння, а пад "Руссю" разумелася Верхняе Падзвінне і Падняпроўе. Сучасныя заходнія этнічныя літоўскія землі (Жмудзь) канчаткова далучыліся да Вялікага Княства ў першай палове XV ст.

Ад таго, як складваліся суадносіны балцкага і славянскага пачатку Вялікага Княства Літоўскага, залежала ўнутраная еднасць і ўнутрыпалітычная стабільнасць гэтага шматэтнічнага дзяржаўнага ўтварэння. Цяжкую і працяглую барацьбу з боку жмудскай знаці вытрымаў вялікі князь Віцень (1293 — 1316), які ўвёў агульнадзяржаўны герб "Пагоня". Больш-менш стабільным ва ўнутрыпалітычным плане было княжанне Гедыміна (1316 — 1341). Пры ім граніцы гаспадарства пашырыліся амаль на ўсю беларускую тэрыторыю, а сталіцай стаў старажытны крывіцкі цэнтр — горад Вільня.

Магутны ўсходнеславянскі зачын Вялікага Княства (9/10 яго тэрыторыі і 8/10 насельніцтва) прадвызначыў пачатковы беларускі змест, "прарускую" накіраванасць гэтай дзяржавы. Выявілася яна ў памкненні Вільні аб'яднаць вакол сябе ўсе "рускія" ўсходнія землі і стаць палітычнай і ідэалагічнай дамінантай ва Усходняй Еўропе. На гэтым шляху Вялікае

Княства мела значныя здабыткі. На працягу 50 – 70-х гадоў XIV ст. назіраецца паспяховая літвінская тэрытарыяльная экспансія на ўсход. Княства далучае да сябе Валынь, Кіеўшчыну, Падолле, Смаленшчыну, Чарнігава-Северскія землі. У тым жа ўсходнім накірунку з боку Беларуска-Літоўскага гаспадарства не менш адчувальнай была ідэалагічная экспансія. З мэтай прадвырашэння першынства палітычнай улады вялікія князі літоўскія імкнуліся, і часам небеспаспяхова, да ўтварэння літвінскай праваслаўнай мітраполіі. Сваё 32-гадовае княжанне Альгерд падсумаваў стварэннем моцнага праваслаўнага бастыёна на ўсходзе Еўропы з вялікай патэнцыяй для далейшага развіцця. Але ў планы каталіцкага Захаду не ўваходзіла здзяйсненне той патэнцыі. Не без умяшання ва ўнутрыпалітычную, дынастычную барацьбу паміж Альгердавічамі рымскай курыі і Польскага каралеўства – правадніка яе лініі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне – адбылася палітычная пераарыентацыя Вялікага Княства ў празаходні, пракаталіцкі бок.

Перыяд 1385 – 1387 гг., калі Ягайла заключыў Крэўскую унію з Полыпчай, стаў каралём польскім і вялікім князем літоўскім, прыняў каталіцтва, можна лічыць часам змянення палітычна-прававога становішча беларускіх зямель у Вялікім Княстве. Паводле прывілея 1387 г., праваслаўная знаць, якая была ў асноўным беларуска-ўкраінскага паходжання, ставілася ў няроўнае эканамічнае становішча з феадаламі каталіцкага веравызнання, што паходзілі галоўным чынам з балцкіх зямель. У 1413 г. быў выдадзены Гарадзельскі прывілей, па якому праваслаўная знаць дыскрымінавалася ў палітычнай сферы – ёй не дазвалялася займаць пасады дзяржаўнага кіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Гэтыя пастановы выклікалі ў асяроддзі шматлікай арыстакратыі рэзкае незадавальненне палітыкай вярхоўнай улады, якое першым скарыстаў стрыечны брат Ягайлы Вітаўт (1350 – 1430). У 90-я гады XIV ст. ён узнавіў незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага і разам з гэтым узяў да рэалізацыі Альгердаву праграму націску на ўсход. "Хранограф" занатаваў мэту згоды Вітаўта са сваім саюзнікам ханам Тахтамышам: "Витовт рече : Я тебя (Тахтамыша) пасажю на Орде и на Сараи, и на Болгарех и на Азтархан и на Озове, и на Заяцьской Орде, а ты меня посади на Московском великом княжении ... и на Новгороде Великом, и на Пскове, а Тфер и Рязань мои есть, а Немцы и сам возму". Аднак ідэя стварэння літвінскай усходняй імперыі была пахавана на р.

Ворскле 12 жніўня 1399 г. пасля страшнага паражэння войскаў Вітаўта і Тахтамыша ад залатаардынцаў.

У перыяд пасля бітвы на р. Ворскле Усходняя Еўропа на пэўны час зарганізавалася пад эгідай Польскага каралеўства. Гэта дало свой плён у бітве пад Грунвальдам. 15 ліпеня 1410 г. аб'яднаным польска-велікакняжацкім войскам была разбіта крыжацкая армада. Славяне і балты перамаглі лютага ворага, які пагражаў ім духоўным і фізічным вынішчэннем. Удар па заваёўніках быў настолькі ашаламляльны, што славянскія землі пяць стагоддзяў не ведалі германскай агрэсіі.

Разам з тым трыццацігоддзе княжання Вітаўта ў XV ст. было часам яго змагання за вяртанне Вялікаму Княству былога першынства ў правядзенні ўсходняй палітыкі (пасля таго як Вітаўт зразумеў, што каталіцкая арыентацыя Вялікага Княства – гэта трывала) і адваяванне ў Польшчы яе месца як еўрапейскага заходняга фарпоста.

І калі ў першым Вітаўт дамогся значных поспехаў (ім кантраляваліся падзеі ў Маскве, яму прысягалі на вернасць цвярскі, разанскі, адоеўскі і іншыя князі, пад апекай Княства ўтварылася Крымскае ханства), то другую частку сваёй праграмы Вітаўт Вялікі давесці да канца не здолеў, хоць і быў блізкі да таго, спрабуючы каранавацца, а каранацыя вялікага князя – гэта акт прызнання Еўропай заслуг і пэўнага лідэрства Вітаўта ў палітычным жыцці Усходу. На словах палякі скептычна адносіліся да прыняцця літвінскага князя ў сям'ю еўрапейскіх каралёў (варта ўзгадаць папярэджанне епіскапа кракаўскага З.Аляшніцкага Вітаўту: "Ведай, што карона каралеўская хутчэй прынізіць тваю веліч, чым узвысіць: паміж князямі ты першы, а паміж каралямі будзеш апошнім"), але на практыцы баяліся згубіць першынство ў рэгіёне. Праз інтрыгі Ягайлы каранацыя Вітаўта так і не адбылася.

На працягу XV ст. дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага эвалюцыяніраваў ад неабмежаванай манархіі да манархіі парламенцкага тыпу, пры якой самаўладства абмяжоўвалася так званым парламентам, што складаўся з дзвюх палат: рады і сейма.

На ўнутраную палітыку вялікіх князёў літоўскіх і паноў радных усё больш уздзейнічала знешнепалітычная сітуацыя. На працягу XVI ст. Вялікае Княства абараняла сваю незалежнасць і багацце ад набегаў крымчакоў, якіх зведала 45 за першую палову гэтага стагоддзя. Але галоўны вораг Беларуска-Літоўскага гаспадарства ў гэты час паўстаў на ўсходзе. З канца XV ст. Маскоўская дзяржава

прыпісвае сабе ролю спадкаемцы Кіева, а пасля жаніцьбы Івана III на дачцэ візантыйскага імператара, спадкаемцы Візантыі, – галавою ўсіх праваслаўных хрысціян Усходняй Еўропы. Гэта з'явілася прычынай для аб'яўлення ўсходнеславянскіх зямель Вялікага Княства сваёй вотчынай і адкрытай агрэсіі супраць заходняга суседа.

Першая палова XVI ст. была запоўнена войнамі паміж Вялікімі Княствамі Маскоўскім і Літоўскім. Баявыя дзеянні вяліся ў 1500 – 1503, 1506 – 1508, 1512 – 1522, 1534 – 1537 гг. З аднаго і другога боку былі і перамогі, і паражэнні. Масква інспіравала ўнутраныя канфлікты ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве. Варта прыгадаць хаця б мяцеж Міхала Глінскага 1508 г. Уся захопніцкая палітыка Масковіі адбывалася пад ідэалагічным заклікам абароны праваслаўя. Гэта прымусіла велікакняжацкі ўрад пайсці на значныя змены ва ўнутранай палітыцы.

З пачатку XVI ст. усё выразней праводзілася лінія на роўнасць у правах прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя Вялікага Княства незалежна ад этнічнага паходжання і рэлігійнай прыналежнасці. З гэтага часу праваслаўных беларускага, украінскага паходжання можна было сустрэць сярод радных засядацеляў і кіраўнікоў самага высокага рангу (К.Астрожскі, Р.Хадкевіч). Гарадзельская пастанова ўжо не дзейнічала і як зжыўшая сябе была адменена ў 1563 г. Цяпер пасады дзяржаўнага кіравання маглі займаць прадстаўнікі шляхецкага саслоўя як каталіцкага, так і праваслаўнага веравызнання. Надалей заканадаўчае афармленне роўнасці ў правах усёй шляхты "веры хрысціянскай" знайшло месца ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.

У XVI ст. буйныя феадалы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага рознага этнічнага паходжання – беларускага, літоўскага, украінскага, рускага, рознай веры – каталіцкай, праваслаўнай, пратэстанцкай – уяўлялі сабой адну сацыяльную групу.

Яна была аб'яднана агульнасцю палітычных, эканамічных, класавых інтарэсаў. Вялікае Княства Літоўскае стала іх супольнай дзяржавай – Айчынай. Нездарма ў першай палове XVI ст. у найвышэйшым органе ўлады – гаспадарскай Радзе – не сустракалася груповак, якія б утварыліся на аснове этнічных ці рэлігійных адрозненняў.

Такім чынам, пасля першага – ваенна-абарончага – аб'яднання XIII – XIV стст. беларускіх і балцкіх зямель у адзіную дзяржаву і амаль двухсотгадовага перыяду "прыціркі" этнасаў поліэтнічнага дзяржаўнага ўтварэння ў

XVI ст. адбылося другое – дзяржаўна-палітычнае – аб'яднанне грамадства Вялікага Княства. У гэты час на другі план адыходзяць мясцовыя, этнічныя, рэлігійныя інтарэсы, а найперш усведамляецца агульнадзяржаўны літвінскі патрыятызм.

Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае XVI ст. увайшло ў сусветную гісторыю як адна з першых еўрапейскіх дзяржаў, што стварыла ўнікальны ўзор палітычнага і грамадскага ладу, прававой дэмакратыі, мірнага суіснавання і супрацоўніцтва розных народаў і царкоўна-рэлігійных сістэм.

3. Люблінская унія 1569 г. Месца Вялікага Княства Літоўскага ў палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай

Да аб'яднання ў 1569 г. дзве незалежныя суседнія краіны – Каралеўства Польскае і Вялікае Княства Літоўскае – ішлі амаль два стагоддзі. На працягу гэтага часу былі і сумесная барацьба супраць жорсткіх ворагаў, больш за дзесятак дагавораў-уній і супярэчнасці, сутычкі, спрэчкі. Нарэшце 1 ліпеня 1569 г. паўстаў акт Люблінскай уніі, які аб'яднаў дзве дзяржавы ў адзіную федэрацыю – Рэч Паспалітую (ад лацінскага – respublica). Сярод насельніцтва гэтага шматэтнічнага аб'яднання аказаўся і беларускі народ.

У шэрагу прычын уніі 1569 г. адной з самых важкіх бачацца ўнутрысаслоўныя супярэчнасці ў стане пануючага класа Вялікага Княства: сярэдняя і дробная шляхта хацела займець тыя ж шляхецкія вольнасці і той жа вызначальны ўплыў у кіраванні дзяржавай, якія мела польская шляхта. Справа ў тым, што сістэма палітычнай улады ў далюблінскі перыяд у Вялікім Княстве складвалася пад уплывам польскага ўзору дзяржаўнага ладу. Асабліва адчувальна гэта было ў другой палове XV – першай палове XVI ст., калі Княства і Карона (Польшча) мелі агульнага гаспадара – караля польскага, вялікага князя літоўскага. Польскі сенат па сваіх функцыях у прынцыпе адпавядаў радзе Вялікага Княства. Шляхецкі сейм з XVI ст. быў адным з асноўных органаў дзяржаўнага кіраўніцтва ў дзвюх суседніх краінах.

Але калі арганізацыйна вышэйшая ўлада ў Кароне і Княстве мела значнае падабенства, то па зместу рэзка адрознівалася. Каронная шляхта запраўляла ў сваёй дзяржаве, вырашаючы на сеймах кардынальныя праблемы і пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі. Галоўную ж палітычную вагу

ў Вялікім Княстве Літоўскім мелі буйныя землеўладальнікі — магнаты. Відавочна, прашляхецкі змест польскай дзяржаўнай арганізацыі прывабліваў велікакняжацкую шляхту, якая ў выніку аб'яднання Княства з Каронай меркавала далучыцца да шляхецкіх вольнасцей сваіх суседзяў.

Але ўсё ж галоўнай прычынай заключэння Люблінскай уніі стала цяжкае знешнепалітычнае становішча Беларуска-Літоўскай дзяржавы.

На пачатку 60-х гадоў баявыя дзеянні ў Лівонскай (Інфлянцкай) вайне, што пачалася паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім Княствам Літоўскім у 1558 г., перанесліся на тэрыторыю Княства. У 1562 г. маскоўскія войскі стаялі ля сцен Віцебска, Дуброўны, Оршы, Копысі, Шклова. 15 лютага 1563 г. быў захоплены Полацк. Да сталіцы Вільні заставалася напрасткі каля 200 кіламетраў. Сілы дзяржавы былі на мяжы магчымага. Вайна выцягнула са скарбу ўсе сродкі, амаль штогадовая сярэбшчына не наталяла патрэбы ў грошах. Неадкладна патрабаваўся саюзнік. У гэтай сітуацыі позірк быў кінуты на захад, таму што Княства мела значны вопыт уній з Польшчай.

Да таго ж заходні сусед сам дамагаўся уніі. На тое былі важкія прычыны як эканамічнага, так і палітыка-ідэалагічнага парадку. Па-першае, шматлікай польскай шляхце стала цесна ў каралеўстве. Яна сквапна паглядала на землі Княства, якія б далі новыя багацці, а з імі — пасады і ўзнагароды. Па-другое, Польшча з'яўлялася самым моцным каталіцкім фарпостам ва Усходняй Еўропе, а таму менавіта ёй адводзілася рымскай курыяй галоўная роля ў экспансіі каталіцызму на ўсход — на беларускія, украінскія, рускія землі.

Польшча на час аб'яднання знаходзілася ў лепшым палітыка-эканамічным становішчы, чым Княства (чаго вартыя былі для яго хаця б выдаткі падчас Лівонскай вайны), што дазваляла ажыццяўляць Кароне пэўным чынам вялікадзяржаўную палітыку. Ідэі паглынання Польшчай Вялікага Княства Літоўскага былі характэрнымі і адчувальнымі ў польскім грамадстве напярэдадні Люблінскай уніі. Дастаткова прыгадаць сеймавую прапанову аб перайменаванні "Літвы" ў "Новую Польшчу" ці адлучэнне ад Вялікага Княства на карысць Польшчы зямель Падляшша, Валыні, Падоліі і Кіеўшчыны.

Аднак, з аднаго боку, захаваўшаяся палітычная моц Вялікага Княства Літоўскага, з другога — адсутнасць моцнай цэнтралізаванай улады ў Польшчы не дазволілі

апошняй інкарпараваць Беларуска-Літоўскую дзяржаву ў свой склад. Люблінскі акт быў пэўным кампрамісам паміж памкненнямі і інтарэсамі двух бакоў, што ішлі на унію.

"З гэтага часу абедзве дзяржавы ўяўляюць сабой адно непадзельнае цэлае, а таксама адну агульную Рэч Паспалітую, у якой абодва гаспадары і абодва народы ўз'ядналіся ў адзіны народ і адзіную дзяржаву", — дэкларавaў акт Люблінскай уніі. Вышэйшым уладарным органам станавіўся агульны сейм, які мог збірацца толькі на тэрыторыі Польшчы. Асобных сеймаў як для Кароны, так і для Вялікага Княства не прадугледжвалася. Манарх бачыўся агульным: "... новы гаспадар пры выбранні і каранацыі павінен аб'яўляцца каралём Польскім, вялікім князем Літоўскім, Рускім, Прускім, Мазавецкім, Жмудскім, Кіеўскім, Валынскім, Падляшскім і Інфлянцкім ... Выбранне і ўзвядзенне князя на пасад Вялікага Княства Літоўскага, якое да гэтага часу праводзілася асобна, павінна спыніцца". Выключна да кампетэнцыі Рэчы Паспалітай адыходзіла знешняя палітыка. Усе ранейшыя законы і дагаворы, накіраваныя супраць інтарэсаў адной з частак новай федэрацыі, неабходна было скасаваць. У прыватнасці, "надалей... дазваляецца набываць маёнткі і валодаць імі паляку ў Літве, а літвіну — у Польшчы".

І ўсё ж не так цесна, як дэкларавалася, аб'ядналіся дзве часткі новаўтворанай дзяржавы. Нельга гаварыць, што люблінскі акт адводзіў Вялікаму Княству Літоўскаму ролю нейкай каланіяльнай ускраіны. Далёка не, бо ў Княстве цалкам захоўваліся ранейшы адміністрацыйны апарат, асобнае ад Польшчы заканадаўства і судовая арганізацыя, тытул і пячатка, а таксама войска. Нельга трактаваць Люблінскую унію як паглынанне Польшчай Вялікага Княства Літоўскага. Рэч Паспалітая ўяўляла сабой федэрацыю дзвюх дзяржаў, "абодвух народаў" (польскага і літвінскага), "прыцірка" паміж якімі ішла на працягу ўсёй яе гісторыі.

Адным з вынікаў гэтай "прыціркі" з'яўлялася пэўнае ўмацаванне самастойнасці Вялікага Княства ў складзе федэрацыі, бо так званая "люблінізацыя" Рэчы Паспалітай адбывалася не па пісаных дамоўленасцях, а з карэкціроўкай на гістарычную рэальнасць. На працягу 70 — 80-х гадоў XVI ст. насуперак люблінскаму акту аб уніі рэгулярна збіраліся ў Вялікім Княстве Літоўскім агульнадзяржаўныя сеймы, на якіх дэбатавалася нават пытанне аб выбары караля. З пачатку 80-х гадоў XVI ст. у Княстве пачынае дзейнічаць Галоўны Трыбунал.

Аднак самым моцным усплескам дзяржаўнай незалеж-

насці Вялікага Княства Літоўскага было прыняцце Статута 1588 г., які, па сутнасці, скасоўваў многія пастановы Люблінскай уніі. Прынамсі, у гэтым заканадаўчым акце аб Люблінскай уніі нават не ўспамінаецца. Згодна Статуту, Вялікае Княства Літоўскае — самастойная незалежная дзяржава са сваёй тэрыторыяй, дзяржаўным апаратам, войскам, фінансамі і асобным ад Польшчы заканадаўствам, дзе час ад часу з'яўляліся і антыпольскія артыкулы. Напрыклад, вялікі князь не меў права раздаваць велікакняжацкія землі і кіруючыя пасады ў гэтай дзяржаве ніякім "чужоземцам и заграничником..., але то всё ... давати повинни только литве, руси, жоймоти, родичом, старожитным и уроженцом великого князства..."

Такім чынам, сфарміраваная ў Польшчы манархічна-рэспубліканская дзяржаўна-палітычная сістэма была не ў стане зліць землі Рэчы Паспалітай. Гэтага можна было дасягнуць толькі цэнтралізацыяй накшталт маскоўскага самаўладства.

Але нельга не заўважаць і інтэграцыйныя працэсы ў Рэчы Паспалітай. Упэўненасць у непарушнасці вядучага становішча ў сваёй дзяржаве ў перыяд пасля прыняцця Статута не вымагала ад магнацка-шляхецкага асяродка Вялікага Княства барацьбы за былыя сімвалы незалежнасці: асобнае выбранне князя, асобных сеймаў, дзяржаўную старабеларускую мову. Збліжэнне з польскай шляхтай далучала літвінскую шляхту да "залатых вольнасцей". Менавіта праз іх у Рэчы Паспалітай паступова фарміравалася своеасаблівая саслоўна-палітычная супольнасць — "польскі народ шляхецкі".

Прычым базавалася гэта супольнасць на рэлігійна-моўна-карпаратыўнай еднасці. Што тычыцца этнічнага атаясамлення беларуска-літоўскай шляхты з польскай, то прыкметная эвалюцыя поглядаў яе на Рэч Паспалітую як Айчыну не выцесніла літвінскую самасвядомасць, якая моцна адчувалася ў велікакняжацка-шляхецкім асяродку і давала аб сабе знаць у самыя драматычныя моманты гісторыі Рэчы Паспалітай.

4. Царква і рэлігія (сярэдзіна XIII — сярэдзіна XVII ст.)

Да канца XII ст. у Еўропе склаліся дзве вялікія, выразна размежаваныя рэлігійныя зоны: усходняя (праваслаўна-візантыйская) і заходняя (рымска-каталіцкая), кожная са сваёй ідэалогіяй і культурай. Мяжа паміж імі праходзіла

па Заходняму Бугу. Беларусь з прычыны свайго геапалітычнага становішча апынулася на ўсходне- і заходнеславянскім, праваслаўным і каталіцкім сумежжы.

Суадносіны розных хрысціянскіх плыняў на Беларусі мяняліся ў розныя гістарычныя перыяды. У XI – XII стст. беларускія землі сталі амаль цалкам праваслаўныя, і іх нацыянальна-культурнае развіццё праходзіла пад уплывам культуры Візантыі. Крэўская унія парушыла манаполію праваслаўнай царквы ў духоўным жыцці Беларусі. Збліжэнне з каталіцкай Польшчай, гібель Візантыйскай імперыі ў 1453 г. і аслабленне ўплыву Канстанцінопальскага патрыярхату, канфрантацыя Вялікага Княства Літоўскага з Масквой, якая здзяйсняла духоўную экспансію пад лозунгам "трэцяга Рыма", прывялі да ўзмацнення сувязей беларускіх зямель з заходнім каталіцкім светам. Аднак у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., нягледзячы на пашырэнне сферы ўплыву каталіцызму, тон у грамадскім жыцці, ідэалогіі, культуры задавала праваслаўная царква, а ўсходне- і заходнехрысціянскія ўплывы ўраўнаважвалі адзін аднаго. Пасля Люблінскай уніі іх супрацьстаянне дасягнула апагея і раўнавага сіл на той час схіляецца на карысць каталіцкага Захаду. Менавіта на Беларусі была рэалізавана ідэя уніі дзвюх хрысціянскіх плыняў — каталіцызму і праваслаўя. Але да гэтага Беларуска-Літоўскае гаспадарства ішло больш за тры складаныя стагоддзі.

Вялікаму Княству Літоўскаму з моманту ўтварэння быў уласцівы этнічна-рэлігійны дуалізм. На балцкіх землях спавядалася язычніцтва. Асноўным веравызнаннем усходнеславянскага насельніцтва было праваслаўе. Язычніцтва і праваслаўе мірна суіснавалі пад уладай вялікіх князёў. Стваральнікі новай дзяржавы, застаючыся "паганцамі" ў душы, па палітычных меркаваннях з лёгкасцю мянялі старых багоў на новага, хрысціянскага, пры гэтым балансуючы паміж усходнім і заходнім хрысціянствам і язычніцтвам. У 1246 г. прыняў "веру хрысціянскую з Усходу з многімі сваімі баярамі" Міндоўг. Перамена веры, відаць, была ўмовай абрання яго князем у праваслаўнай Навагрудскай зямлі. Вывучаў "навукі рускія" на Валыні, там хрысціўся ў праваслаўе і нават стаў манахам Войшалк. Ён заснаваў каля Навагрудка Лаўрышаўскі манастыр, які павінен быў стаць аплотам праваслаўнай хрысціянізацыі Літвы. Аднак раптоўная гібель не дала магчымасці здзейсніць гэтую задуму. Праваслаўнымі былі большасць баяр пры Гедымінавым двары, а сам князь сімпатызаваў хрысціянству "грэчаскага ўзору". Незадоўга да

смерці прыняў гэту веру Альгерд, нейкі час яе спавядаў Вітаўт. Праект саюзу Княства з Масквой прадугледжваў пераход у праваслаўе Ягайлы. Цесна зрошчаная з усходнеславянскімі "рускімі" этнічнымі асаблівасцямі вера садзейнічала славянізацыі правячай дынастыі. Надзённыя інтарэсы ўсё больш падштурхоўвалі да праваслаўнага свету і літоўскіх баяр. У 80-я гады XIV ст., да крэўскай уніі, было даволі рэальным хрышчэнне Літвы ў праваслаўе і завяршэнне распачатага стагоддзем раней працэсу яе славянізацыі.

Праваслаўе ўмацоўвала пазіцыі вялікіх літоўскіх князёў на беларуска-ўкраінскіх землях. Першыя князі падтрымлівалі праваслаўную царкву, бо бачылі ў ёй сваю саюзніцу. За кошт іх падараванняў яна павялічвала свае багацці — атрымлівала землі, залежных сялян, узводзіла новыя цэрквы і манастыры і да канца XIV ст. не толькі манапольна панавала ў духоўным жыцці Беларусі, але і пашырала ўплыў у Літве.

Тэрыторыя Беларусі ўваходзіла ў склад епархій, што ўтварыліся раней: Полацкай, Тураўскай і часткова Смаленскай і Уладзіміра-Берасцейскай. Яны кіраваліся епіскапамі і аб'ядноўваліся ў Кіеўскую мітраполію, падпарадкаваную Канстанцінопальскаму патрыярхату. У канцы XIII — сярэдзіне XV ст. яна фармальна заставалася адзінай для Княства і паўночна-ўсходняй Русі. Пасля пераезду мітрапалітаў спачатку ва Уладзімір, а потым у Маскву і падтрымкі імі аб'яднаўчых пачынанняў маскоўскіх князёў вялікія літоўскія князі дамагаюцца ад Канстанцінопаля прызначэння асобнага мітрапаліта для сваёй дзяржавы. Пачынаючы з Віценя, яны імкнуцца зрабіць праваслаўную царкву Княства самастойнай. У 1317 г. з дазволу патрыярха была заснавана Літоўская мітраполія з рэзідэнцыяй у Наваградку. Ёй падпарадкоўваліся Полацкая і Тураўская епархіі. Гэта спрыяла нейтралізацыі царкоўна-палітычнага ўплыву Маскоўскай дзяржавы на ўсходнеславянскіх землях Княства і ўзмацняла пазіцыі Гедыміна і яго наступнікаў ва Усходняй Еўропе. У 1415 г. Вітаўт дамогся ад епіскапаў выбрання мітрапаліта без згоды патрыярха.

У сваю чаргу спробы крыжакоў усталяваць каталіцызм на беларуска-літоўскіх землях у XIII — сярэдзіне XIV ст. поспеху не мелі. Непрыняцце хрышчэння з іх рук было справай прынцыпу. Каб выбіць у іх рэлігійную зброю, якой прыкрывалася агрэсія, згадзіўся прыняць каталіцтва Міндоўг і ў якасці ўзнагароды за гэта ў 1253 г. атрымаў ад папы рымскага карону. Але саюз з Рымам не спраўдзіў

спадзяванняў літоўскага караля, і ён адрокся ад хрысціянства наогул. У надзеі спыніць крыжацкі націск Гедымін абяцаў папе хрысціць Літву па заходняму абраду. Такія захады былі рызыкоўнымі — маглі выклікаць апазіцыю прыхільнікаў язычніцтва і праваслаўных "русінаў", што і здарылася пры Гедыміне.

У канцы XIV ст. пад націскам Ватыкана, які баяўся ператварэння Княства ў магутны праваслаўны бастыён Усходняй Еўропы і страты сваёй патэнцыяльнай паствы, Польшча аддала Ягайлу каралеўскую карону ў абмен на акаталічванне Літвы, а ў перспектыве — і ўсходнеславянскіх зямель. Хоць Крэўская унія пакінула насельніцтву Беларусі свабоду належаць да сваёй веры, але ў праваслаўнай царквы Княства з'явіўся сур'ёзны канкурэнт.

"Рымская " вера ў тых умовах найбольш падыходзіла кіруючым колам Княства як адэкватная ўзмоцненым сувязям з Польшчай. Яна прадухіляла асіміляцыю літоўскай знаці ў масіве праваслаўнай Русі, садзейнічала яе кансалідацыі. Дзяржава, усе гаспадары якой, пачынаючы з Ягайлы, былі католікамі, стала апекаваць заходнюю царкву: перадае ёй вялікія надзелы зямлі, спрыяе заснаванню манаскіх ордэнаў, касцёлаў і кляштараў, стымулюе пераход у гэту веру літоўскіх і славянскіх феадалаў. Прывілеем 1387 г. улада прывабліваe да хрышчэння набыццём права спадчыннага валодання зямлёй літоўскую знаць, а граматай 1413 г. — і беларуска-ўкраінскіх феадалаў. Створаныя дзяржавай матэрыяльныя і маральныя перавагі, замацаваная Гарадзельскім прывілеем манаполія каталіцкаў на заняцце вышэйшых пасад стымулявалі зацікаўленасць у пераходзе прадстаўнікоў пануючага саслоўя у каталіцызм, які становіцца прывілеяванай рэлігіяй.

Хрысціянізацыя 1387 г. закранула толькі язычніцкую Літву. Тады была ўтворана Віленская епархія, пад уладу якой трапіла амаль уся Беларусь. Да сярэдзіны XVI ст. каталіцкая царква замацавалася ў паўночна-заходніх землях Вялікага Княства Літоўскага. Тым не менш праваслаўе заставалася найбольш уплывовай канфесіяй на ўсходнеславянскіх тэрыторыях, а Усходняя Беларусь — сферай яго манапольнай дзейнасці.

Каталіцкае хрышчэнне Літвы, пазбавіўшы праваслаўе надзеі на ролю пануючай рэлігіі ў Княстве, не ўшчамляла правоў праваслаўнага насельніцтва і царквы. Аднак паколькі феадалы-католікі атрымалі дадатковыя прывілеі, то ў параўнанні з імі становішча іх праваслаўных сабратоў

адносна пагоршылася. Дыскрымінацыя праваслаўных з канца XIV ст. пачала раздзіраць унутранае адзінства Княства і стала крыніцай шэрагу канфліктаў. Ягайла, Вітаўт, Свідрыгайла, Аляксандр хацелі залагодзіць антаганізм паміж праваслаўным і каталіцкім насельніцтвам пры дапамозе уніі. Аднак праваслаўныя княствы не падтрымалі Фларэнційскай уніі 1439 г.

Адназначна пракаталіцкая рэлігійная палітыка аказалася недальнабачнай і пацярпела крах. Урад уносіць у яе істотныя карэктывы. У 1432 і 1434 гг. ён здымае эканамічныя абмежаванні для праваслаўнай знаці, з канца XV ст. пачынае ўцягваць яе ў палітычную эліту дзяржавы, а ў 1563 г. поўнасцю ўраўноўвае ў правах праваслаўную шляхту з каталіцкай. 20 — 60-я гады XVI ст. адрозніваліся ад папярэдняга стагоддзя і наступных часоў верацярпімасцю, што стварыла спрыяльную глебу для распаўсюджвання ў княстве Рэфармацыі, якая часткова аслабіла і каталіцкую, і праваслаўную царкву.

Значныя зрухі ў грамадска-палітычным і культурным жыцці, гаспадарчы ўздым, эвалюцыя гарадоў, абвастрэнне ўнутрыпалітычных і сацыяльных супярэчнасцей падрыхтавалі грунт для ўзнікнення і развіцця рэфармацыйнага руху на Беларусі і ў Літве. У сярэдзіне XVI ст. тут пачалося імклівае распаўсюджванне ідэй заходнееўрапейскага пратэстантызму, італьянскага антытрынітарызму, рускай ерасі. Рэлігійнымі навінкамі захапіліся магнаты (Радзівілы, Сапегі, Валовічы, Глябовічы і інш.) — праціўнікі уніі з Польшчай. З дапамогай пратэстанцкай веры яна жадалі захаваць адасобленасць сваёй дзяржавы ад каталіцкай Польшчы. Шляхту і заможных гараджан Рэфармацыя прывабіла магчымасцю падарваць усёмагутнасць царквы, якая ўшчамляла іх правы. Шырокія народныя масы засталіся глухія да яе, таму рух не меў тут такога размаху, як у Еўропе.

Найбольшае пашырэнне ў Княстве атрымаў кальвінізм. У 50-я гады ў яго пераходзяць большасць магнатаў і значная частка шляхты. Пратэктар Рэфармацыі Мікалай Радзівіл Чорны заснаваў у Вільні першую пратэстанцкую абшчыну і залажыў ў Бярэсці першы збор. У хуткім часе арганізоўваюцца дзесяткі рэфармацыйных абшчын, пры іх — цэрквы, школы, прытулкі, друкарні. Буйнейшымі рэфармацыйнымі цэнтрамі на Беларусі сталі Бярэсце, Нясвіж, Віцебск, Навагрудак, Клецк, Лоск, Іўе, Слуцк, Койданава і інш. Вакол іх групуюцца выдатныя вучоныя, прапаведнікі, пісьменнікі, кнігавыдаўцы. Некаторыя з іх

(С.Будны, В.Цяпінскі) становяцца ўпоравень са знакамітымі еўрапейскімі мысліцелямі. Рэфармацыя спрыяла актывізацыі духоўнага жыцця грамадства, развіццю асветы і арганізацыі кнігадрукавання, распаўсюджанню рэнесансна-гуманістычных і рацыяналістычных тэндэнцый у беларускай культуры і пашырэнню яе міжнародных кантактаў.

Рэфармацыйны рух садзейнічаў развіццю талерантнасці ў Вялікім Княстве Літоўскім. Варшаўская канфедэрацыя 1573 г. санкцыяніравала свабоду веравызнання і рэлігійную згоду паміж рознымі канфесіямі. Статут 1588 г. заканадаўча замацаваў верацярпімасць у дзяржаве.

Пад сцягам кальвінізму спачатку аб'ядноўваюцца ўсе слаі, якія прымалі ўдзел у Рэфармацыі. Але ў 60-я гады сфарміраваўся арыянскі, ці антытрынітарскі, рух. Яго ідэолагі (С.Будны, В.Цяпінскі, Якуб з Калінаўкі, Павел з Візны, Пётр з Ганёндза, Марцін Чаховіц і інш.) патрабавалі сацыяльных пераўтварэнняў у грамадстве, што прывяло іх да канфлікту з кальвінісцкай шляхтай і магнатамі, выклікала занепакоенасць правячых колаў. Калі феадалы, пасля таго як дамагліся ад Рэфармацыі сваіх мэт, убачылі, што рух выходзіць з-пад іх кантролю, то сталі да яе яшчэ больш абыякавымі. Яны без ваганняў мяняюць свае рэлігійныя погляды і пераходзяць у каталіцызм.

Рэфармацыйная "мода" аказалася недаўгавечнай. Процідзеянне вярхоў, дзяржаўныя санкцыі, унутрырэлігійныя супярэчнасці абумовілі яе заняпад. Напужаныя тэалагічным і сацыяльным радыкалізмам арыянскіх ідэолагаў вярхі адыходзяць ад Рэфармацыі. Ужо ў 70-я гады яе сацыяльная база пачынае звужацца. У канцы XVI — першай палове XVII ст. крызіс Рэфармацыі прагрэсіруе. У другой палове XVII ст. пад ударамі контррэфармацыі яна вымушана была сысці з гістарычнай арэны.

Папства зрабіла стаўку ў выратаванні каталіцкай царквы ад крызісу на ордэн езуітаў. Яны ўваходзілі ва ўсе сферы палітычнага, культурнага, ідэалагічнага, эканамічнага жыцця еўрапейскіх народаў, якія паддаліся пратэстанцкім павевам. У Вялікім Княстве Літоўскім езуіты з'явіліся на наступны год пасля Люблінскай уніі, закліканыя сюды віленскім біскупам для барацьбы з Рэфармацыяй. Талерантнасць дзяржавы стварыла добры грунт для іх дзейнасці. Ордэн накіраваў сюды найбольш вопытных місіянераў. Галоўным ідэолагам контррэфармацыі на Беларусі і ў Літве стаў П.Скарга.

Рэфармацыя і контррэфармацыя на Беларусі часткова

супалі ў сваім развіцці, што прывяло да асабліва напружанай барацьбы ў апошнія дзесяцігоддзі XVI ст. Улічваючы цэнтралізатарскія пачаткі каталіцкай царквы, яе палітычныя сувязі і сацыяльны вопыт, правячыя колы Рэчы Паспалітай у гэты перыяд аказваюць ёй усё большую падтрымку. Яны надзялілі езуітаў вялікімі зямельнымі ўладаннямі з прыгоннымі сялянамі. Эканамічная моц забяспечыла ім магутны ідэалагічны і палітычны ўплыў.

Езуіты ўзялі ў свае рукі адукацыю — адкрылі акадэмію ў Вільні і 11 калегій на Беларусі, запаланілі яе кніжны рынак творамі пісьменнікаў і прапаведнікаў ордэна, пакрылі яе землі сеткай сваіх касцёлаў і кляштараў, заняліся дабрачыннай дзейнасцю. Гэта дало свае вынікі. Адноўлены і ўзмоцнены каталіцызм пачаў выціскаць пратэстанцкія секты. Працэс акаталічвання вышэйшых слаёў, уцягнутых раней у Рэфармацыю, набыў масавы характар. К канцу XVII ст. контррэфармацыя ў Княстве перамагла.

Распрацаваная Трыдэнцкім саборам праграма рэстаўрацыі пазіцый каталіцкай царквы прадугледжвала распаўсюджанне яе ўплыву ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Заснаванне Маскоўскага патрыярхату ў 1589 г. узмацняла праваслаўе на рускіх землях. Таму ў інтарэсах Ватыкана было прыблізіць да сябе праз унію насельніцтва беларуска-ўкраінскіх зямель. Яго намеры супалі з імкненнем палітыкаў умацаваць Рэч Паспалітую, якую раздзіралі рэлігійныя супярэчнасці, праз адзінавер'е ўсіх яе падданых. У гэты час розныя слаі беларуска-ўкраінскага грамадства шукалі шляхі вываду з заняпаду праваслаўнай царквы, пазіцыі якой падарвалі Люблінская унія, Рэфармацыя і контррэфармацыя. Некаторых мясцовых праваслаўных лідэраў (К.Астрожскага, І.Пацея, К.Тарлецкага і інш.) прывабіў сваёй жыццяздольнасцю каталіцкі Захад. Яны менавіта там знайшлі гатовыя мадэлі і спосабы перабудовы царкоўна-рэлігійнага жыцця ў сваёй мітраполіі. Яны ўбачылі шлях да пераадолення крызісу ў выхадзе з царкоўнай і культурнай арбіты Візантыі і ў заключэнні уніі з Рымам. Гэты шлях падтрымала вярхоўная ўлада, і ён быў рэалізаваны ў выглядзе Берасцейскай уніі — царкоўна-рэлігійнага наватвору, што стаў кампрамісам, народжаным у культурным, ідэалагічным, рэлігійным і палітычным супрацьстаянні Захаду і Усходу на беларускіх землях. Новы накірунак хрысціянства — уніяцтва — быў афармлены на Берасцейскім саборы 6 — 9 кастрычніка 1596 г. Ён прадугледжваў захаванне праваслаўнай абраднасці, царкоўнаславянскай мовы ў набажэнстве, традыцыйных свя-

таў, але прызнаваў вяршэнства папы рымскага, каталіцкае веравучэнне. Не ўсе спачатку зразумелі і прынялі Берасцейскую унію. Ахоўна-кансерватыўная пазіцыя праваслаўнага духавенства, якое ў імкненні адгарадзіць Беларусь ад заходніх уплываў выступіла супраць новаўвядзення, з аднаго боку, і прымусовае навязванне уніі, з другога, ускладнілі становішча ў краіне. Замест жаданага спакою унія прынесла разлад у грамадства. Асвета, літаратура, мова, кнігадрукаванне ўцягваюцца ў рэлігійную барацьбу. Па Беларусі пракацілася хваля антыуніяцкіх выступленняў. Рэформы мітрапалітаў Руцкага, Сялявы, Корсака, стварэнне базыльянскага ордэна, заснаванне манастыроў, школ, падрыхтоўка вопытных кадраў, увядзенне беларускай мовы ў літургію спрыялі росту ўплыву уніяцкай царквы сярод насельніцтва. Унія не спраўдзіла надзей польска-ватыканскіх палітыкаў. Намаганнямі яе мясцовых дзеячаў яна стала бар'ерам на шляху акаталічвання беларусаў і садзейнічала захаванню этнасу ва ўмовах паланізацыі. К канцу XVII ст. уніяцтва спавядалі тры чвэрці вясковага і гарадскога насельніцтва Беларусі.

5. Развіццё феадальных адносін

Аснову эканамічнага развіцця беларускіх зямель у другой палове XIII – першай палове XVII ст. складала сельская гаспадарка, з якой цесна былі звязаны рамяство і промыслы. Галоўнымі галінамі сельскай гаспадаркі з'яўляліся земляробства і жывёлагадоўля.

Права ўласнасці на зямлю ў феадальную эпоху манапольна належала класу феадалаў. Буйнейшым феадалам была дзяржава, якая мела ва ўласнасці вялікія зямельныя абшары. Значным зямельным фондам так званых гаспадарскіх зямель валодаў вялікі князь. Усё больш зямельных угоддзяў з рук манарха пападала ва ўласнасць шляхты. У сярэдзіне XVI ст. колькасць шляхты, якая мела землі ў Беларусі, складала каля 162 тыс. чалавек (9% усяго насельніцтва). Валодалі маёнткамі на беларускіх землях царкоўныя ўстановы і іерархі.

Напачатку панская гаспадарка насіла натуральны характар, задавальняючы неабходныя патрэбы землеўласнікаў. Аднак павелічэнне попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю ў Заходняй Еўропе давала феадалам усё большы прыбытак ад гандлю збожжам. Гэта вымагала карэннай перабудовы панскай гаспадаркі. На змену былому

двару прыходзіць фальварак, што арыентаваўся галоўным чынам на рынак. Вытворчасць у такой гаспадарцы была заснавана на працы не нявольнай чэлядзі (практычна рабоў), а селяніна-паншчынніка.

Рэарганізацыя панскай гаспадаркі паступова набірала тэмпы. Калі напрыканцы XV ст. фальваркі з'яўляліся спарадычна, то да сярэдзіны XVI ст. на той частцы тэрыторыі Беларусі, якая была звязана сплаўнымі рэкамі Бугам, Нёманам, Заходняй Дзвіной, дзе знаходзіліся буйныя гандлёвыя цэнтры і адсутнічалі пастаянныя ваенныя разбурэнні, фальварак стаў асноўнай формай арганізацыі гаспадаркі феадалаў. Ужо ў 1450 г. так называецца гаспадарка ў маёнтку Менедыкаўскі ў Наваградскай зямлі. Фальварак упамінаецца ў запісах Браслаўскага земскага суда за 1481 г. у маёнтку Відзы, а ў 1498 г. — "подле реки Дисны", у 1499 г. — у маёнтках Нясвіж, Хохла Менскага павета. Шэраг згадак аб фальварках утрымліваюць дакументы першай паловы XVI ст. — за 1507, 1524, 1528, 1529, 1548 гг.

"Устава на валокі" 1557 г. з'явілася дакументам, які падсумоўваў пэўны вопыт фальварачнага гаспадарання. Адной з асноўных мэт "валочнай памеры", якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай рэформы 1557 г., было ўпарадкаванне сялянскага землекарыстання, уніфікацыя памераў адзінак абкладання павіннасцямі. Да гэтага часу надзелы сялян не толькі называліся па-рознаму (службы, дворышчы, дымы, жарэб'і і г.д.), але і ўтрымлівалі розную колькасць зямлі, нават аднайменныя. Павіннасці ж з разнаколькасных надзелаў спаганяліся роўныя. Стандартызацыя адзінкі абкладання дазваляла землеўласнікам павялічыць свае прыбыткі. Паводле "Уставы", зямля наразалася на валокі (21,36 га). Часцей за ўсё сялянская сям'я не здольная была сплачваць павіннасці з валокі. Таму бралі валоку дзве сям'і, і сярэдні сялянскі надзел складаў прыблізна 10,6 га.

Інакш праходзіў працэс развіцця панскай гаспадаркі на ўсходзе Беларусі. Там фальварак быў з'явай рэдкай, прычым ён ствараўся толькі дзеля задавальнення патрэб феадальнай адміністрацыі. Панская гаспадарка на ўсходзе мела не земляробчы, а пераважна прамысловы характар (вытворчасць лесаматэрыялаў, попелу, дзёгцю, смалы і інш.). Асноўным вытворцам сельскагаспадарчай прадукцыі ва Усходняй Беларусі з'яўлялася сялянская гаспадарка, якая яшчэ не ведала паншчыны.

Эканамічная эвалюцыя панскай гаспадаркі выклікала істотныя змены ў становішчы сялянскіх мас. У канцы XV

— першай палове XVI ст. ішоў актыўны працэс запрыгонвання сялянства. Ранейшыя катэгорыі сялян (чэлядзь нявольная, людзі непахожыя, пахожыя) паступова ператвараліся ў адзінае саслоўе — прыгоннае сялянства.

Па формах рэнты сяляне падраздзяляліся на такія асноўныя катэгорыі, як даннікі, цяглыя, чыншавыя. Да канца XV ст. у час панавання натуральнай гаспадаркі першая група пераважала. Даніна натурай была галоўнай у сістэме павіннасцей. Але па меры ўсталявання фальварачна-паншчыннай сістэмы на захадзе Беларусі на першае месца выходзіць паншчына — праца ў панскай гаспадарцы. Так, паводле дакументальных даных, ва ўладаннях Ю.М.Радзівіла ў 1528 г. у Літве і на Беларусі з 1422 сялянскіх служб 1229 былі цяглымі, тады як даннікі складалі ўсяго 193 службы. Ва ўладаннях Віленскага епіскапства на сярэдзіну XVI ст. каля 2/3 вясковага насельніцтва складалі цяглыя сяляне. Тэксты грамат з Полацкай зямлі ўжо называюць "прыгон" у якасці павіннасці. У адной з полацкіх грамат, датаванай 26 снежня 1502 г., сказана, што царкоўныя сяляне вёсак Далчаны, Веснічы і Пуцілкаўляны "в пригон ... хоживали".

На пачатку XVI ст. устанавілася паншчына памерам адзін дзень на тыдзень. У сярэдзіне гэтага стагоддзя яна дасягнула прыкладна двух дзён на тыдзень.

Акрамя паншчыны сяляне давалі дзякло, якое складалася са збожжа, прадуктаў жывёлагадоўлі, промыслаў, і грашовы чынш. Ва Усходняй Беларусі галоўнай павіннасцю заставалася даніна, прычым большай часткай дарагім футрам, мёдам. У дадзены перыяд у гэтым рэгіёне назіраецца тэндэнцыя да замены натуральнай даніны грашовым эквівалентам.

Узмацненне прыгнёту выклікала супрацьдзеянне з боку сялянства, сацыяльныя канфлікты ў беларускай вёсцы. Адной з найбольш распаўсюджаных і масавых праяў антыфеадальнага пратэсту на Беларусі былі скаргі. Формай адкрытага супраціўлення ўзмацненню эксплуатацыі з'яўляліся ўцёкі ад сваіх гаспадароў. Больш радыкальнымі формамі класавай барацьбы сялянства былі адмовы ад выканання павіннасцей, нападзенні на маёнткі, парубкі лесу, патравы пасеваў і сенажацяў, у некаторых выпадках забойствы панскіх слуг, а то і саміх землеўласнікаў. Сялянскіх войнаў у класічным разуменні на Беларусі ў сярэднявеччы не было. Найбольш шырокімі і вядомымі сталі выступленні сялян з вёсак Багушэвічы і Задобрычы Свіслацкай воласці, казацкі рух пад

кіраўніцтвам Севярына Налівайкі, да якога далучылася частка беларускіх сялян і гараджан.

У XIV – XVI стст. на Беларусі назіраўся інтэнсіўны працэс урбанізацыі. Калі да 1500 г. крыніцы падаюць звесткі аб 83 гарадах Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага, то з 1500 па 1600 г. згадваюцца 530 гарадскіх пасяленняў, 387 з якіх знаходзіліся на тэрыторыі нашага краю. Населенасць гарадоў была не надта вялікая: ад 1,5 да 3 тыс. жыхароў. Аднак меліся і значныя цэнтры – больш за 10 тыс. насельнікаў. Вызначаўся сярод беларускіх гарадоў найстаражытнейшы Полацк. Жыхары добра разумелі яго вялікае значэнне, калі ў 1464 г. падчас перамоў з магістратам горада Рыгі заяўлялі: "А Полтеск тежи есть, хвалячи бога, место славутное ..., а не нижшое во чести и во всём ни Вилни, а ни Мариборка, а ни Кданьска".

Некаторыя беларускія гарады XIV – XVI стст. сталі буйнымі цэнтрамі рамяства. Гэта ў першую чаргу Бярэсце, Гародня, Слуцк, Менск, Магілёў, Пінск. Рамяство тут было прадстаўлена некалькімі дзесяткамі прафесій. З мэтай абароны рамеснай вытворчасці ад самавольстваў феадалаў, ад канкурэнцыі і наладжвання збыту прадукцыі гарадскія рамеснікі аб'ядноўваліся ў цэхі.

Выдзяленне мяшчанства ў асобнае саслоўе спарадзіла імкненне з іх боку ператварыць горад у непадлеглую для ўмяшальніцтва землеўладальнікаў тэрыторыю. Гараджане дамагаліся і ўрэшце дабіваліся ад вярхоўнай улады надання іх населеным пунктам магдэбургскага права. Паводле яго, мяшчане выходзілі з-пад юрысдыкцыі землеўласнікаў, вызваляліся ад шэрагу феадальных павіннасцей, выбіралі гарадскія органы ўлады – магістрат, суд. Першымі з беларускіх гарадоў атрымалі права на самакіраванне Бярэсце (1390), Слуцк (1441), Гародня (1496), Полацк (1498), Менск (1499).

Адной з галоўных гарадскіх функцый была гандлёвая. Рынкі гарадоў звязвалі паміж сабой усе рэгіёны Вялікага Княства Літоўскага. Беларускія ж купцы – "госці" – пракладвалі гасцінцы – тракты да Варшавы, Познані, Гданьска, Рыгі, Кралеўца (Калінінград), Ноўгарада, Цверы, Масквы, звязваючы тым самым Заходнюю Еўропу з Усходнім Светам.

Такім чынам, разгледжаныя асаблівасці аграрных адносін і урбанізацыйных працэсаў на беларускіх землях дазваляюць заключыць, што XV – першая палова XVII ст. сталі часам глыбокіх сацыяльна-эканамічных зрухаў, якія

парушалі векавыя асновы феадальных традыцый і стваралі спрыяльную глебу для развіцця новых вытворча-грамадскіх адносін. Аднак гэтыя працэсы былі перапынены крывавымі войнамі сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст.

6. Культура сярэдзіны XIII — сярэдзіны XVII ст.

Уваход беларускіх зямель у склад Вялікага Княства Літоўскага істотна паўплываў не толькі на этнічную кансалідацыю, але і на развіццё матэрыяльнай, духоўнай культуры беларускага народа. Гэты працэс адбываўся пры разнастайных культурных сувязях насельніцтва Беларусі з іншымі краінамі, а таксама з народамі, якія ўваходзілі ў склад адзінай шматэтнічнай дзяржавы. Высокі культурны ўзровень, колькасная і тэрытарыяльная перавага ўсходнеславянскага этнасу ў параўнанні з іншымі народамі садзейнічалі таму, што пачынаючы з XIV ст. менавіта беларуская культура адыгрывала важную, а ў асобных выпадках і вызначальную ролю ў культурным жыцці Вялікага Княства Літоўскага. Пры гэтым беларуская культура ўзнікла і развівалася на старажытных усходнеславянскіх традыцыях. На яе развіццё значна паўплывалі перадрэнесансныя і рэнесансныя ідэі. У выніку культура беларускага народа ў сярэдзіне XIII — сярэдзіне XVII ст. набыла арыгінальныя рысы, нацыянальную самабытнасць і дасягнула найвышэйшага ўздыму, што было заканамернай з'явай для таго часу.

Інтэнсіўна развівалася матэрыяльная культура. У гэты час узніклі і пашырыліся новыя формы і спосабы апрацоўкі глебы, арганізацыі земляробства. Двухпольны севазварот паступова змяніўся трохпольным, што дало магчымасць у буйных феадальных гаспадарках вырошчваць збожжа на продаж. З землеапрацоўчых прылад працы сталі шырока выкарыстоўвацца саха, бароны, сярпы, цапы і іншыя вырабы мясцовых рамеснікаў.

Адбыліся значныя змены ў развіцці рамеснай вытворчасці. Разам з разнастайнымі вырабамі, якія былі звязаны з апрацоўкай металаў, дрэва, ткацтвам, ганчарнай справай, ювелірным майстэрствам, на Беларусі ў XVI ст. з'яўляецца вытворчасць шкла, паперы, кнігадрукарства.

Духоўная творчасць беларускага народа адлюстравалася ў развіцці фальклору, песенным, харэаграфічным і музычным мастацтве. У XIII — першай палове XVII ст. далейшае развіццё атрымала вуснапаэтычная народная

творчаць. На Беларусі ўзнікае новы эпічны жанр — гістарычныя песні і паданні, якія былі прысвечаны барацьбе беларускага народа супраць іншаземных захопнікаў. Значнае месца ў вуснай народнай творчасці займала абрадавая паэзія. У адпаведнасці з асноўнымі этапамі сельскагаспадарчых работ яна падзялялася на зімовы, веснавы, летні і восеньскі цыклы. Разам з імі шырока былі прадстаўлены сямейна-абрадавая паэзія, лірычныя песні. Мудрасць народа, яго жыццёвы і гаспадарчы вопыт знаходзілі адлюстраванне ў казках, прыказках, прымаўках і загадках. Не выпадкова шмат з іх сталі затым узорамі сапраўднага фальклору і на працягу многіх стагоддзяў захоўваліся ў якасці выдатных твораў беларускага народа.

Абрадавая паэзія, калядаванне і шчадраванне, хаджэнні валачобнікаў на Вялікдзень, купальскія карагоды заўсёды суправаджалі музыкі. Удзельнікамі народных свят былі скамарохі, якія выступалі з драматычнымі і камічнымі інтэрмедыямі. У XVII ст. у Смаргоні нават узнікла спецыяльная акадэмія, дзе рыхтавалі акцёраў і дрэсіравалі мядзведзяў. Выступленні скамарохаў садзейнічалі ўзнікненню ў XVI ст. народнага лялечнага тэатра — батлейкі, які праз сваю сацыяльную і старажытную накіраванасць набыў асаблівую папулярнасць сярод народа.

У XV — XVI стст. на Беларусі склаліся пэўныя перадумовы для развіцця культуры Адраджэння. Гарады сталі цэнтрамі рамяства і гандлю, ажыўленай грамадска-палітычнай дзейнасці, пашырыліся іх узаемасувязі з краінамі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, адбывалася секулярызацыя духоўнага жыцця. Інтэнсіўна развіваліся кнігадрукаванне, адукацыя, шырылася цікавасць да культурных каштоўнасцей антычнасці. У асяроддзі гараджан і шляхты распаўсюджваліся ідэі Рэфармацыі і гуманізму, мецэнацтва. Даволі хутка ішоў працэс станаўлення беларускай мовы і нацыянальнай пісьменнасці. Спецыфічнай рысай Адраджэння на Беларусі была наяўнасць на працягу пэўнага перыяду адноснай верацярпімасці, узаемадзеяння і ўзаемаўплыву беларускай, рускай, украінскай і польскай культур, што абумовіла полілінгвізм літаратуры гэтага перыяду. Да 1696 г. беларуская мова выконвала ролю дзяржаўнай у Вялікім Княстве Літоўскім. На ёй былі створаны выдатныя помнікі грамадска-прававой думкі — Статуты Вялікага Княства Літоўскага (1529, 1566, 1588), накіраваныя на ўмацаванне дзяржаўна-юрыдычнага суверэнітэту краіны.

Своеасаблівай энцыклапедыяй гістарычных ведаў эпохі

Сярэднявечча сталі летапісы — Летапісец вялікіх князёў літоўскіх, Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага, Хроніка Быхаўца і інш. У летапісах адлюстраваны гістарычнае мінулае нашага народа, вядучыя грамадска-палітычныя ідэі эпохі, паказана дзейнасць гістарычных асоб.

У пачатку XV ст. на беларускіх землях жыў і стварaў шматлікія творы Рыгор Цамблак — выдатны славянскі царкоўны дзеяч і пісьменнік, які ў перыяд 1415 — 1419 гг. з'яўляўся мітрапалітам Вялікага Княства Літоўскага. Цамблак унёс у беларускую літаратуру гуманістычныя ідэі, узбагаціў яе яркімі творамі, напісанымі ў экспрэсіўна-эмацыянальным стылі.

Тытанічнай постаццю эпохі Адраджэння быў Ф.Скарына (каля 1490 — каля 1551) — вучоны, пісьменнік, перакладчык, гуманіст і асветнік, які аказаў значнае ўздзеянне на развіццё беларускай культуры, даў беларускаму народу друкаваную кнігу на яго роднай мове. У Празе на працягу 1517 — 1519 гг. Ф.Скарына надрукаваў 23 кнігі Бібліі, а ў Вільні заснаваў друкарню, дзе выпусціў "Малую падарожную кніжыцу" (1522) і "Апостал" (1525).

Заснаванне на Беларусі кнігадрукавання адкрыла нябачаныя магчымасці для развіцця асветы, навукі і культуры. Выданні Ф.Скарыны арганічна спалучалі традыцыі беларускага мастацтва з вопытам еўрапейскага кнігадрукавання. Ва ўяўленні Ф.Скарыны Біблія была скарбніцай не толькі рэлігійных, але і свецкіх ведаў, адной з крыніц "семи наук вызволеных".

Ф.Скарына, як і гуманісты Італіі, бачыў у ведах сродак барацьбы з руцінай, невуцтвам, цемрашальствам, шлях да павышэння нацыянальнай самасвядомасці і індывідуалізацыі асобы.

Ф.Скарына быў заснавальнікам жанру прадмоў да чытача. Яго прадмовы да розных выданняў культавых кніг трывала ўвайшлі ў літаратурны ўжытак. У іх першадрукар выкарыстаў моўны народны матэрыял. Усе прадмовы і пасляслоўі Ф.Скарыны прасякнуты клопатам аб разумным упарадкаванні грамадства, выхаванні чалавека, усталяванні дастойнага жыцця на зямлі.

Высокім духоўным пачуццём — любоўю да Радзімы — асветлены яго творы: "Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыне, знають ямы своя; птици, летающие по въздуху, ведають гнезда своя; рибы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, — тако ж и люди, игде зродилися

и ускормлены суть бо бозе, к тому месту великую ласку имають".

У скарбніцу еўрапейскай культуры ўвайшла літаратурная спадчына беларускага паэта-гуманіста, прадстаўніка новалацінскай літаратурнай школы Міколы Гусоўскага (1470 ? – каля 1533). Пяру Гусоўскага належаць тры паэмы, больш за 10 вершаў, але гімнам Бацькаўшчыне, паэмай жыцця стала "Песня пра зубра", якую ён напісаў у 1522 г. у Рыме на лацінскай мове. Пясняр прыроды, працы і свабоднага чалавека, паэт-гуманіст выказаў гарачую любоў да роднай зямлі, з вялікай мастацкай сілай маляваў жыццё простых людзей, гераічнае мінулае свайго народа, стварыў паэтычны вобраз Вітаўта, асуджаў міжусобныя войны.

У 1523 г. "Песня пра зубра" была выдадзена ў Кракаўскай друкарні.

Першая на сучаснай тэрыторыі Беларусі друкарня дзейнічала ў 1550 – 1570-я гады ў Бярэсці пад апекай канцлера Вялікага Княства Літоўскага Мікалая Радзівіла Чорнага. Першая кірылічная кніга ў межах сучаснай Беларусі была надрукавана ў Нясвіжы (1562). У XVI ст. друкарні існавалі і ў іншых мястэчках Беларусі: Заблудаве, Лоску, Цяпіне. У Заблудаве рускія першадрукары Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец выдалі "Евангелле вучыцельнае" (1569).

Традыцыі Ф.Скарыны і М.Гусоўскага працягвалі выдатныя пісьменнікі-гуманісты Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Лявонцій Карповіч, Мялецій Сматрыцкі, Лаўрэнцій Зізаній, якія выступалі супраць нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту, прызнавалі індывідуальны розум асноўнай крыніцай пазнання.

Таленавітым публіцыстам пачатку 60-х гадоў XVI ст., вядомым грамадска-палітычным дзеячам пратэстанцкага кірунку быў Сымон Будны (каля 1530 – 1593). У 1560 г. віленскі ваявода і канцлер Вялікага Княства Літоўскага Мікалай Радзівіл прызначыў яго пастарам клецкай саборнай царквы кальвіністаў. У 1562 г. Сымон Будны ў Нясвіжскай друкарні выдаў на беларускай мове свой "Катэхізіс", які стварыў для простых людзей і імкнуўся да таго, каб усе, хто хоча дасягнуць "истины разумения", звярталіся да гэтай кнігі, а таксама "деток своих поучали".

У 70-я гады Сымон Будны разгарнуў інтэнсіўную грамадска-палітычную дзейнасць, выдаў Біблію (1572), Новы запавет (1574), сваю працу "Аб галоўных палажэннях хрысціянскай веры" (1576). Пісьменнік-публіцыст палемізаваў з езуіцкімі тэолагамі, абвяргаў дагмат пра бес-

смяротнасць душы, самым надзейным аўтарытэтам у справах веры і пазнання лічыў Біблію, заклікаў да развіцця беларускай культуры на роднай мове.

Сучаснікам і аднадумцам Сымона Буднага быў Васіль Цяпінскі (? — каля 1599), які ў паланізацыі феадальных вярхоў Вялікага Княства Літоўскага бачыў смяротную пагрозу развіццю нацыянальнай культуры беларускага народа. У 70-я гады XVI ст. на свае сродкі ў маёнтку Цяпіна ён заснаваў друкарню, дзе выдаў "Евангелле", тэкст якога надрукаваў на царкоўнаславянскай і беларускай мовах. У прадмове да "Евангелля" ён выявіў сябе ахвярным абаронцам нацыянальнай культуры.

У паслялюблінскі перыяд на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага шырокую дзейнасць дзеля ўмацавання каталіцкай царквы разгарнулі езуіты. Яны стварылі шырокую сетку агульнадаступных бясплатных школ. У 1570 г. у Вільні была заснавана езуіцкая калегія, якая пры каралі Стэфане Баторыі ператварылася ў акадэмію. З'яўленне езуітаў у Вялікім Княстве Літоўскім паклала пачатак каталіцкай контррэфармацыі. Ва ўмовах міжканфесійнай барацьбы літаратура становіцца магутным ідэалагічным сродкам.

У перыяд контррэфармацыі значную ролю ў развіцці культуры Беларусі адыгрывалі праваслаўныя брацтвы, прадстаўнікі якіх тэарэтычна абгрунтоўвалі юрыдычныя правы праваслаўнай царквы. Для распаўсюджвання сярод народа пісьменнасці брацтвы адкрывалі прыхадскія школы, арганізоўвалі друкарні, выдавалі кнігі. Пачатковыя і сярэднія школы былі адкрыты ў Вільні, Бярэсці, Пінску, Слуцку, Менску і Магілёве. Брацкія друкарні ў канцы XVI — першай палове XVII ст. дзейнічалі ў Вільні, Еўі, Магілёве. Выдаўцы выпускалі рэлігійна-культавыя і школьныя кнігі: "Евангелле вучыцельнае" (1569), "Псалтыр з Часаслоўцам" (1570), "Граматыка славенская" (1596) і інш. Друкарня Мамонічаў выпусціла першыя ў беларускім кнігадрукаванні кірылічныя выданні прававога характару: "Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага" (1586) і "Статут Вялікага Княства Літоўскага" (1588).

Вострай палітычнай накіраванасцю і каларытнай жывой мовай гэтага часу вылучаюцца парадыйна-сатырычныя творы — "Пасланне апосталу Пятру", "Прамова Мялешкі" і "Ліст да Абуховіча".

Ананімны твор "Прамова Мялешкі" ўяўляе сабой літаратурную пародыю на сеймавую прамову, сатыру на грамадска-палітычныя парадкі, якія панавалі ў Рэчы Пас-

палітай. Асабліва асуджаецца тая частка феадальнай знаці, якая ў пагоні за ўсім іншаземным знішчае свае нацыянальныя традыцыі.

Наваградскі шляхціц Цыпрыян Камуняка ў "Лісце да Абуховіча" сатырычна паказвае амаральнасць і прадажнасць службовай шляхты, выступае супраць засілля "пальшчызны" на беларускіх землях.

Парадыйна-сатырычныя творы садзейнічалі далейшай дэмакратызацыі літаратуры, узмацненню ў ёй крытычнага пачатку, народнага гумару і сатыры.

У перыяд контррэфармацыі асаблівага росквіту дасягнула царкоўна-палемічная публіцыстыка. У 1577 г. у Віленскай друкарні Мікалая Крыштафа Радзівіла выйшла ў свет кніга вядомага царкоўнага дзеяча, заснавальніка полацкага езуіцкага калегіума Пятра Скаргі "Аб адзінстве царквы боскай пад адзіным пастырам", у якой аўтар дае ідэалагічнае абгрунтаванне царкоўнай уніі.

У канцы 80-х гадоў палемічную антыкаталіцкую публіцыстыку ўзначалілі палемісты астрожскай школы Герасім Сматрыцкі і Васіль Суражскі. Яны абвяргалі тэндэнцыйныя сцверджанні П.Скаргі аб нізкім інтэлектуальным узроўні праваслаўнага насельніцтва, аб непрыгоднасці яго пісьмовай мовы для ўжывання ў розных сферах духоўнага жыцця.

Важную ролю ў гэты час адыграў Канстанцін Астрожскі, які ў сваёй рэзідэнцыі адкрыў першую грэка-славянскую праваслаўную школу і арганізаваў пры ёй друкарню.

Выдатным творам антыуніяцкай публіцыстыкі быў "Апокрысіс" (Вільня, 1597) Х.Філалета.

Значны след у развіцці палемічнай публіцыстыкі пакінуў архімандрыт віленскага Святадухаўскага манастыра, рэктар брацкай школы Лявонцій Карповіч (1580 – 1620). Яго "казанні" змяшчаюць глыбокія разважанні пра сэнс жыцця і маральную чысціню чалавека, вылучаюцца ўзвышаным барочным стылем.

Адно з вядучых месцаў у літаратурным працэсе Беларусі канца XVI – першай паловы XVII ст. займае творчасць Мялеція Сматрыцкага (1577 – 1633). У 1610 г. пад псеўданімам Тэафіла Арталога на польскай мове выйшаў яго найбольш значны твор "Фрынас", у якім ад імя маці-царквы, што з'яўлялася сімвалам прыгнечанай радзімы, заклікаў народы Беларусі і Украіны да аб'яднання супраць каталіцызму. Непадалёку ад Вільні ў мястэчку Еўе М.Сматрыцкі займаўся педагагічнай дзейнасцю, выкладаў "свабодныя" навукі. У 1619 г. тут выйшла яго "Граматыка

славенска", якая стала шырокавядомай не толькі ў славянскіх краінах, але і ў Заходняй Еўропе. М.Сматрыцкі ў значнай ступені абапіраўся на "Граматыку славенску" (1596) Л.Зізанія. Упершыню ў гісторыі славянскага мовазнаўства ён склаў поўны курс граматыкі — арфаграфію, этымалогію, сінтаксіс і прасодыю. Гэта навуковая праца абяссмерціла яго імя ў вяках.

Прадстаўніком дэмакратычнага напрамку ў царкоўна-палемічнай публіцыстыцы быў Афанасій Філіповіч (1597 — 1648). У шматлікіх публіцыстычных артыкулах, аб'яднаных у звод пад назвай "Дыярыуш" (1646), ён змагаўся з палітычнай несправядлівасцю Рэчы Паспалітай, пагражаў свецкім феадалам "страшным божым судом", заклікаў да барацьбы супраць каталіцкай экспансіі.

У другой палове XVI ст. традыцыйнае летапісанне, па сутнасці, спынілася. Шырокае развіццё атрымала гісторыка-мемуарная літаратура: "Допісы" аршанскага старасты Філона Кміты-Чарнабыльскага, мемуары навагрудскага падсудка Фёдара Еўлашэўскага, "Баркулабаўская хроніка" і інш. Гісторыка-мемуарная літаратура па свайму характару была прасякнута свецкімі матывамі. Аўтары ўслаўлялі зямныя інтарэсы чалавека незалежна ад яго сацыяльнага паходжання, што абумовіла далейшае паглыбленне дэмакратызацыі і гуманізацыі літаратурнага працэсу на Беларусі ў канцы XVI — першай палове XVII ст.

У XVII ст. плённа развівалася сілабічная паэзія, ля вытокаў якой былі А.Рымша, Ф.Утчыцкі, І.Іяўлевіч і С.Полацкі.

Выдатным дасягненнем усёй старажытнай культуры ўсходніх славян былі зборнікі Сімяона Полацкага (1629 — 1680) "Псалтыр рыфмаваная", "Вертоград многоцветный" і "Рифмологион". У сваіх вершах паэт усхваляў высокае прызначэнне чалавека, асвятляў шматлікія грамадска-палітычныя падзеі, падымаў маральна-філасофскія і сямейна-бытавыя праблемы, палемізаваў з кансерватыўнымі прадстаўнікамі царкоўнай іерархіі. С.Полацкі ачысціў паэтычную мову ад уплыву гутарковай стыхіі і наблізіў яе да рытарычна-дэкламацыйных традыцый старажытнага віційства.

Значнае месца ў гісторыі культуры XIII — першай паловы XVII ст. займала архітэктура. У яе развіцці спалучаліся нацыянальныя і заходнееўрапейскія традыцыі, якія прынеслі на Беларусь гатычны, раманскі і стыль барока. Творча пераасэнсоўваючы гэту спадчыну, беларускія майстры стварылі самабытныя і арыгінальныя помнікі дойлідства.

У сувязі з пастаяннай знешняй небяспекай у гэты час было пабудавана шмат крэпасцей і замкаў. Адным з моцных абарончых збудаванняў стаў замак у Навагрудку, які быў абнесены мураванымі сценамі і шмат'яруснымі вежамі. Адначасова з'явіліся замкі ў Лідзе, Крэве, Гародні, якія разам з мураванымі і драўлянымі крапаснымі пабудовамі іншых гарадоў і мястэчак Беларусі стваралі абарончую сістэму агульнадзяржаўнага значэння.

Абарончы характар насіла і архітэктура некаторых свецкіх пабудоў. Найбольш значнымі з іх былі замкі ў Міры, Смалянах і Койданаве.

Дойліды дасягнулі высокага мастацкага ўзроўню ў культавай архітэктуры. Быў створаны зусім новы стыль — беларуская готыка, узорамі якой сталі цэрквы абарончага характару ў Сынкавічах, Малым Мажэйкаве (Мураванцы), Супраслі і Заслаўі. У другой палове XVI ст. на Беларусі пачалі з'яўляцца культавыя пабудовы ў стылі рэнесансу (пратэстанцкі збор у Смаргоні і каталіцкі касцёл у Нясвіжы). З канца XVI ст. узводзяцца барочныя помнікі (езуіцкі касцёл у Нясвіжы).

У выяўленчым мастацтве Беларусі пашыраюцца іканапіс, фрэскі, дэкаратыўная скульптура палацаў і культавых пабудоў. Найбольшую цікавасць з твораў жывапісу таго часу выклікаюць абразы "Адзігітрыі Іерусалімскай" з пінскай Варварынскай царквы, "Замілаванне" з Малары-ты. У XV ст. з'яўляюцца творы свецкага жывапісу — партрэты княгіні Ганны Радзівіл, слуцкага князя А. Алелькавіча, вядомага магната Аляксандра Хадкевіча і інш. Характэрнай іх асаблівасцю стаў адыход ад традыцый іканапісу да рэалізму, што адбываўся пад уплывам ідэй Рэнесанса. З канца XVI ст. у жывапісе акрамя партрэтнага ўзнікаюць гістарычны, батальны і іншыя жанры.

Такім чынам, менавіта XIII — XVII стст. сталі тым часам, калі культура беларускага народа, развіваючыся на ўласнай аснове, узбагацілася здабыткамі сусветнай цывілізацыі і актыўна ўключылася ў агульны культурна-гістарычны працэс.

7. Этнічныя працэсы на беларускіх землях (сярэдзіна XIII — сярэдзіна XVII ст.)

У другой палове XIII — XVI ст. пад уздзеяннем шэрагу этнаўтваральных фактараў (геаграфічны, сацыяльна-эка-

намічны, палітычны, канфесійны і інш.) насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі і на суседніх усходніх і паўночных землях трансфармавалася ў адзіную этнічную супольнасць. Аб'яднанне на працягу XIII – XIV стст. раздробленых зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага, падначаленне адзінай вярхоўнай уладзе прывяло да іх тэрытарыяльнай кансалідацыі і з'явілася штуршком для складвання этнічнай тэрыторыі беларусаў – тэрыторыі кампактнага рассялення народа, з якой звязаны яго этнагенез (фарміраванне) і этнічная гісторыя. Цэнтралізацыя краіны (арганізацыя кіравання, ліквідацыя рэшткаў раздробленасці, змяненне адміністрацыйнага падзелу, увядзенне адзінага заканадаўства, сімволікі) спрыяла больш цеснаму палітычнаму аб'яднанню беларускіх зямель і актыўнаму функцыяніраванню асноўнага для працэсу этнаўтварэння сацыяльна-эканамічнага фактару.

З узмацненнем гандлёва-эканамічных сувязей у межах Княства, складваннем агульнадзяржаўнай гаспадаркі, развіццём таварна-грашовых адносін, ростам гарадоў, некаторай уніфікацыяй у вагавых адзінках і грашовай сістэме пераадольвалася лакальная замкнутасць, пашыраліся ўнутрытэрытарыяльныя кантакты, нівеліраваліся некаторыя гаспадарчыя і бытавыя адрозненні, адбывалася моўная інтэграцыя.

Такім чынам, палітычная і сацыяльна-эканамічная інтэграцыя ў межах адзінай дзяржавы стварыла амаль аднолькавыя ўмовы для этнакультурнага развіцця розных зямель, прывяла да нівеліроўкі іх мясцовых асаблівасцей.

Этнічная тэрыторыя Беларусі ахапіла пераважна ўсходнеславянскія землі, на якіх жылі нашчадкі крывічоў (Віцебшчына, Смаленшчына, Віленшчына, Гарадзеншчына, Невельшчына), дрыгавічоў (Цэнтральная Беларусь і Палессе), радзімічаў (Магілёўшчына, Гомельшчына, заходняя Браншчына). На названай тэрыторыі ў познім сярэднявеччы сфарміраваліся своеасаблівы агульнабеларускі комплекс традыцыйнай культуры і сістэма мовы, якія сведчылі пра нараджэнне новага этнасу.

У XIII – XVI стст. узнікаюць важнейшыя граматычныя, фанетычныя і лексічныя рысы, што дыферэнцыравалі беларускую мову ад старажытнаславянскай, рускай, украінскай і надалі спецыфіку сучаснай беларускай мове. У галіне фанетыкі яе асаблівасцямі сталі "дзеканне", "цеканне", "аканне", "яканне", цвёрды гук "р", фрыкатыўнае вымаўленне "г" і іншыя, у сінтаксісе – выкарыстанне слоў "каб", "калі",

часціц "ці", "чы". Пад уплывам новых з'яў у жыцці ўзнікла новая лексіка з багатай тэрміналогіяй — назвамі феадальных павіннасцей, службовых асоб, рамеснымі, гандлёвымі тэрмінамі і інш. Характэрныя рысы старабеларускай мовы замацоўваюцца ў помніках пісьменнасці XV — XVI стст.

У перыяд фарміравання народнасці развіліся і замацаваліся ўласцівыя для яе этнічнай тэрыторыі спецыфічныя рысы матэрыяльнай і духоўнай культуры. Сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця, кліматычныя асаблівасці, старажытныя традыцыі парадзілі характэрныя для Беларусі тыпы пасялленняў (мястэчкі, фальваркі, засценкі, ваколіцы) і жылля — зрубавая хата з двума памяшканнямі (хата і сенцы). Распаўсюджваюцца аднолькавыя тыпы прылад працы (саха, драўляная барана), праяўляюцца асаблівасці ў гаспадарчых занятках. Устанаўліваецца характэрнае толькі для беларускай тэрыторыі народнае адзенне, складваецца своеасаблівая народная кухня.

Паступова ў адзіную этнічную супольнасць насельніцтва злучалі агульныя абрады (каляды, масленіца, купалле, дзяды і інш.), звычаі (сябрына, талака). Нацыянальна адметнымі рысамі адзначаюцца вусная народная творчасць, літаратурныя творы, летапісы, народныя песні і танцы, мастацтва. Этнаканслідуючую функцыю для ўсходнеславянскага насельніцтва Беларусі да сярэдзіны XVI ст. адыгрываў канфесійны фактар — прыналежнасць да праваслаўя была своеасаблівай прыкметай беларускага этнасу.

Этнічная тэрыторыя кожнага народа вызначаецца ўстойлівасцю на працягу стагоддзяў. Яшчэ ў пачатку XX ст. беларусы насялялі Смаленшчыну, сумежжа Браншчыны, Чарнігаўшчыны, Пскоўшчыны, Латгаліі, Падляшша і Віленскі край. У выніку наступных штучных падзелаў гэтыя землі апынуліся па-за палітычнымі межамі Беларусі.

Адным з галоўных вынікаў аб'яднальных этнічных працэсаў і асноўным паказчыкам ступені кансалідаванасці народа выступае этнічная самасвядомасць — усведамленне людзьмі прыналежнасці да свайго народа, яго адметнасці. Яна ўвасабляецца найперш у яго назве-этноніме.

У XIII — XVI стст. у дачыненні да насельніцтва Беларусі ўжываліся розныя этнонімы. Да XVII ст. абагульняючымі для праваслаўнага насельніцтва Беларусі, Украіны, Масковіі і часткова Літвы, Польшчы, Латгаліі з'яўляліся назвы "Русь", "рускія", "русіны". Хаця ў грамадскай свядомасці захоўвалася ўяўленне аб асаблівай блізкасці ўсходнеславянскіх народаў, якое замацоўвала правас-

лаўная царква, мясцовае насельніцтва ў большасці выпадкаў лічыла "рускім" толькі свой народ. Беларускія "русіны", напрыклад, называлі сучасных украінцаў "валынянамі", "падалянамі", "чаркасамі", менавіта сённяшніх рускіх — "маскавітамі", "маскалямі" ці "пскавічамі", "цверычамі" і г.д. Ужо ў XV — XVI стст. яны добра адрозніваліся сябе ад "маскавітаў" суседняй дзяржавы, называлі іх мову "маскоўскай", а сваю — "рускай". Этнонім "рускія людзі" меў больш стабільную распаўсюджанасць сярод жыхароў Усходняй Беларусі і Смаленшчыны. У канцы XVI — XVII ст. ён трансфармаваўся ў назву "беларусцы".

Украінцы, рускія і палякі называлі беларусаў "літвінамі", гэта ж паняцце было саманазвай і беларускага насельніцтва. У XIV — XV стст. "літвінамі" называлі сябе пераважна жыхары заходніх зямель Беларусі і ўсходу Літвы. У XVI і асабліва ў XVII — XVIII стст. гэта назва распаўсюджваецца амаль на ўвесь беларускі этнас. Такая форма "нацыянальнага" самавызначэння насельніцтва Беларусі (асабліва шляхты) умацоўваецца пасля аб'яднання Княства з Каронай у Рэч Паспалітую, якое разглядалася з боку палякаў як "аб'яднанне дзвюх нацый у адзіную нацыю". Мясцовая шляхта і магнаты доўгі час падкрэслівалі, што яны менавіта "літвіны", чым выказвалі даволі высокі ўзровень дзяржаўна-нацыянальнай самасвядомасці. "Мы і палякі, хоць і брацьця, але зусім адменных звычаяў", — пісаў у канцы XVI ст. канцлер Л.Сапега да К.Радзівіла. Назвы "Літва", "літвіны", на думку даследчыкаў, былі найбольш абагульняючай формай этнічнай самасвядомасці і самавызначэння беларускага насельніцтва. Яны ўжываліся на нашых тэрыторыях больш за 500 гадоў. У другой палове XIX ст. назва "Літва" перамясцілася на паўночны захад і наклалася на тэрыторыю суседняга балцкага народа.

Першая згадка пра Белую Русь у дачыненні да сучасных беларускіх зямель змяшчаецца ў Іпацьеўскім летапісе і датавана 1305 г. Гэта найменне паступова з канца XVI ст. замацоўваецца за ўсходнебеларускімі землямі Віцебшчыны, Смаленшчыны, Магілёўшчыны і толькі ў другой палове XIX ст. распаўсюдзілася на ўсю тэрыторыю сучаснай Беларусі. Тлумачэнняў паходжання і сэнсу назвы "Белая Русь" шмат. Іх звязваюць то з кліматычна-геаграфічнымі або этнаграфічнымі асаблівасцямі гэтых зямель, то са знешнепалітычнымі ці канфесійнымі фактарамі, то са своеасаблівым статусам іх у складзе Вялікага Княства Літоўскага.

Названыя этнонімы ў залежнасці ад абставін маглі ўжывацца паасобна і сумесна ("літвін рускага роду", "літвін беларусец"), але ўсе яны з'яўляліся элементамі этнічнай самасвядомасці беларускага народа.

Ва ўмовах шматсотгадовага процістаяння на нашых землях двух славянскіх цэнтраў — Польскай Кароны і Маскоўскага царства складваўся менталітэт беларусаў — склад розуму народа, лад яго думак, мысленне, нацыянальны характар. Да лепшых маральна-духоўных якасцей беларусаў адносяцца нацыянальная і рэлігійная талерантнасць, памяркоўнасць, гасціннасць, лагоднасць, мяккасардэчнасць, выноснівасць, шчодрасць, кемлівасць, няпомслівасць, сумленнасць, добразычлівасць, рахманасць, паэтычнасць душы, працавітасць. Недахопы народа — гэта працяг яго вартасцей. Да адмоўных бакоў беларускага менталітэту можна аднесці нерашучасць, кансерватыўнасць, недаверлівасць, скрытнасць, пакорнасць. Напрыклад, недастатковая рашучасць, магчыма, з'яўляецца вынікам празмернай талерантнасці, добразычлівасці беларусаў.

Менталітэт з'яўляецца ўстойлівай этнічнай прыкметай. Нарадзіўшыся ў выключна складаных умовах, прайшоўшы праз выпрабаванні лёсу, беларусы захавалі непаўторныя рысы свайго нацыянальнага характару, па якіх і сёння іх можна пазнаць.

Аснову новай беларускай этнічнай супольнасці склала ўсходнеславянскае насельніцтва. Але ў працэсе яе фарміравання прымалі ўдзел таксама іншаэтнічныя групы: заходнеславянская (палякі), балцкая (прусы, борці, яцвягі, літва, жамойты, латгалы), цюркская (татары). Яны аказалі ўплыў на мову, культуру, рэлігію беларускага этнасу і паслужылі дадатковым кампанентам гэтай супольнасці. Акрамя таго, у той час на землях Беларусі пражывалі таксама невялікія групы яўрэяў, цыганоў, караімаў, шатландцаў, французаў, немцаў, рускіх, украінцаў і інш. Беларусы таксама жылі ў Польшчы, Літве, на Украіне, у Рускай дзяржаве.

Першыя групы рускіх мігрантаў на Беларусі з'явіліся ў XV – XVI стст. Сюды ўцякаюць ад праследаванняў апальныя князі і вальнадумцы (А.Курбскі, Ф.Касы, Арцемій і інш.), з другой паловы XVII ст. — ад здзеку і ганенняў дзесяткі тысяч стараабрадцаў, сялян і гараджан. Рускія, а таксама ўкраінскія перасяленцы і ўцекачы адносна лёгка "ўпісваліся" ў блізкае этнічнае асяроддзе і ўжо ў другім-трэцім пакаленні амаль нічым не адрозніваліся ад мясцовых жыхароў.

Групы палякаў на этнічных беларускіх землях існавалі

ўжо ў XII ст. Прыкметнай міграцыі палякаў на Беларусь у наступныя стагоддзі не было, бо законы Княства забаранялі ім займаць тут пасады і набываць зямлю.

Пад уздзеяннем польскага этнакультурнага ўплыву, што ўзмацніўся пасля Люблінскай уніі, прадстаўнікі вышэйшага саслоўя змянялі сваё этнічнае самавызначэнне. Паланізацыі беларусаў-католікаў спрыяў касцёл, які прывіваў ім польскую этнічную свядомасць. Пераважная большасць тых, хто лічыць сябе сёння палякамі, спавядаюць каталіцтва, але маюць беларускія карані. Польская мова ўзбагаціла беларускую тапанімію і антрапанімію, аказала ўздзеянне на фарміраванне шэрагу характэрных асаблівасцей беларускай мовы. Ад палякаў успрыняты адміністрацыйны падзел на ваяводствы, запазычана магдэбургскае права, пераняты новы каляндар, у асноўным з Польшчы пранікаў каталіцызм.

У XIII – XIV стст. на Беларусь перамясцілася частка балтаў (прусаў, борцяў, жамойтаў), цяснімых крыжакамі. У заходніх раёнах беларускай этнічнай тэрыторыі пражывалі яцвягі (да канца XIII ст.) і літоўцы. Іх мова і культура цесна ўзаемадзейнічалі з беларускай. Літоўскія феадалы, што аселі на беларускіх землях, частка членаў велікакняжацкай дынастыі асімілявaліся беларусамі.

З канца XIV ст. на Беларусі пачалі сяліцца татары. Спачатку гэта былі палонныя, захопленыя Гедымінам і Альгердам. Пазней тут знаходзілі прытулак эмігранты з Залатой Арды. Іх сялілі на Віленшчыне, Гродзеншчыне і Меншчыне. Татары неслі вайсковую службу, займаліся рамёствамі і перадалі беларусам свае навыкі ў конегадоўлі, агародніцтве, гарбарстве, узбагацілі беларускую лексіку. Самі яны ўжо на пачатку XVI ст. пачалі асіміляваццa беларусамі, перанялі яго мову і забыліся ўласную. Татарскія рэлігійныя кнігі Аль-Кітабы, пісаныя арабскімі літарамі на беларускай мове, з'яўляюцца унікальнымі помнікамі старадаўняй беларускай мовы.

У канцы XIV – XVI ст. ідзе эміграцыя на Беларусь яўрэяў з краін Заходняй Еўропы, дзе яны час ад часу цярпелі фізічнае вынішчэнне. Першыя іх асяродкі ўзніклі ў канцы XIV ст. у Бярэсці і Гародні. Большая частка яўрэяў пасялілася ў гарадах і мястэчках і занялася рамёствамі, гандлем, дробным прадпрымальніцтвам, ліхвярствам. Яны жылі замкнёнымі тэрытарыяльнымі грамадамі – кагаламі і складалі ў гэты час да 20% гарадскога насельніцтва.

На землі Беларусі цыганы перавандравалі ў XV ст. праз

Польшчу і Германію, у канцы XVI — пачатку XVII ст. — з Венгрыі. Яны вялі вандроўны спосаб жыцця, збіраліся ў Зэльве, частка іх асела ў Міры. Цыганы захавалі племянную арганізацыю, побытавую спецыфіку і выконвалі абрады як свае традыцыйныя, так і беларускага народа, сярод якога жылі.

РАЗДЗЕЛ 5

БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII – XVIII СТ.

1. Войны сярэдзіны XVII ст.

У 1648 г. на Украіне пачалося паўстанне казакаў на чале з гетманам Б.Хмяльніцкім, якое хутка вылілася ў вялікую вызваленчую вайну. Украінскі гетман і казацкая старшына мелі планы стварэння сваёй дзяржавы, у межы якой яны хацелі ўключыць і землі паўднёва-ўсходняй Беларусі – Падняпроўе і Палессе. Б.Хмяльніцкі яшчэ ў маі 1648 г. пачаў засылаць у гэтыя раёны сваіх агітатараў, затым і казацкія загоны для пачатку ваенных дзеянняў. Такім чынам, у паветах, якія былі найбольш патрэбныя казацкай старшыне, інспіраваўся вызваленчы рух мясцовага насельніцтва.

З'яўленне казацкіх загонаў Галавацкага, Крывашапкі, Мікуліцкага, Гаркушы і іншых палкоўнікаў, у складзе якіх было шмат беларусаў, выклікала масавае далучэнне да іх бяднейшага сялянства і мяшчанства. Ужо летам 1648 г. на поўдні і ўсходзе Беларусі пачалася шырокая барацьба сялянска-казацкіх атрадаў супраць шляхты, купцоў, магнатаў і каталіцкага духавенства. Паколькі сацыяльныя вярхі грамадства былі ў многім апалячаныя, гэты вызваленчы антыфеадальны рух на Беларусі, як і на Украіне, меў антыпольскую скіраванасць. Хоць аснову паўстанцкіх аддзелаў складалі мясцовыя прыгонныя сяляне і мяшчане, іх арганізуючай сілай заставаліся казакі.

Доўгі час з боку дзяржавы не праводзілася ніякіх ваенных акцый супраць паўстанцаў. Да восені 1648 г. на іх баку апынулася нямала беларускіх гарадоў – Тураў, Пінск, Мазыр, Брагін, Лоеў, Гомель, Чачэрск, Крычаў, Бабруйск і інш. Казацка-сялянскае войска спрабавала нават захапіць Слуцк – буйнейшую фартэцыю сярэднявечнай Беларусі, але пасля нядоўгай аблогі горада адышло.

Толькі ўвосень на барацьбу з паўстанцамі ўрад Вялікага Княства Літоўскага накіраваў некалькі вайсковых аддзелаў шляхты і наймітаў. Каля Рэчыцы і Рагачова яны пацярпелі паражэнне ў бітвах з казакамі і сялянамі.У кастрычніку 1648 г. найбольш значныя сілы шляхецкага войска, якімі кіраваў Мірскі, пасля ўпартай барацьбы авалодалі Пінскам, а ў студзені 1649 г. на поўдні Беларусі з дзесяцітысячным корпусам з'явіўся гетман польны літоўскі Януш Радзівіл, які пачаў праводзіць буйную антыказацкую кампанію. Хутка яго

войска авалодала гарадамі Туравам, Мазыром, Бабруйскам, Рэчыцай, а ўдзельнікаў абароны жорстка пакарала.

Аднак вясной 1649 г., пасля таго як з Украіны прыйшоў трохтысячны казацкі корпус палкоўніка І.Галоты, вызваленчы рух на поўдні Беларусі ўзнавіўся. Калі Я.Радзівіл разграміў Галоту каля Прыпяці, гетман Хмяльніцкі прыслаў на Беларусь яшчэ 6 тыс. казакаў на чале з Гаркушам і Пабадайлам, да якіх пазней далучыўся загон палкоўніка М.Крычэўскага (беларускага шляхціца па паходжанню). Разам з атрадамі мясцовага сялянства, якое прыстала да казакаў, сілы М.Крычэўскага сягалі 30 тыс. Каб не даць ім злучыцца з Пабадайлам, Я.Радзівіл заатакаваў непрыяцеля і ў чэрвені ў бітве пад Лоевам разграміў злучэнне М.Крычэўскага. Пасля гэтага былі зліквідаваны ачагі руху ў Пасожжы і іншых раёнах Беларусі. Разам з рэгулярным войскам супраць паўстанцаў вёў барацьбу і аддзел мяшчан і дробнай шляхты. Апошнім значным усплёскам казацка-сялянскай вайны стала ажыўленне руху летам 1650 і ў 1651 г., але яно было хутка падаўлена гетманам Радзівілам, войска якога пакінула Беларусь і накіравалася на Украіну.

Антыфеадальная вайна 1648 – 1651 гг. на Беларусі была састаўной часткай вызваленчай вайны, распачатай на Украіне. Яна праходзіла не ў форме непарыўнага працэсу, а штуршкамі, як серыя лакальных паўстанняў. Адсутнасць адзінага кіраўніцтва, арганізацыйнага цэнтра, ваеннай практыкі і шэраг іншых характэрных асаблівасцей не дазваляюць ставіць яе на адзін узровень з вызваленчай вайной украінскага народа ці сялянскімі войнамі ў Расіі. Аднак у беларускай гісторыі гэта, бадай, самая маштабная адкрытая ўзброеная барацьба ніжэйшых слаёў народа супраць феадальнага прыгнёту. Па дэструктыўным уздзеянні на гаспадарку краіны і яе дэмаграфічнае становішча антыфеадальная барацьба 1648 – 1651 гг. мела вынікі, падобныя да вялікай спусташальнай вайны. У зоне ваенных дзеянняў загінулі дзесяткі тысяч людзей, былі знішчаны вёскі і маёнткі, папсаваны і спалены храмы, пабураны гарады і мястэчкі.

Калі ў Вялікім Княстве Літоўскім на некалькі гадоў усталяваўся ўнутраны спакой, у Кароне Польскай вайна паміж украінскімі казакамі і палякамі працягвалася і станавілася ўсё больш цяжкай. Б.Хмяльніцкі прасіў дапамогі ў Маскоўскай дзяржавы, бо сам не мог перамагчы ў гэтай барацьбе. Царскі ўрад, які ў 1648 – 1649 гг. ставіўся да ўкраінскіх казакаў дастаткова варожа, цяпер змяніў свае адносіны да Б.Хмяльніцкага. Стала відавочнай магчымасць

выкарыстаць зручную палітычную сітуацыю і, умяшаўшыся ў канфлікт Украіны з Польшчай, нанесці па Рэчы Паспалітай вырашальны ўдар.

Пасля адпаведнай дыпламатычнай і ваеннай падрыхтоўкі, афіцыйна ўключыўшы ў свае межы і ўзяўшы пад абарону тэрыторыю ўкраінскага гетманата, Маскоўская дзяржава ў маі 1654 г. распачала вайну супраць Рэчы Паспалітай. Асноўнай яе мэтай быў захоп новых зямель, у прыватнасці Беларусі, Заходняй Украіны, Прыбалтыкі. Ведаючы канфесійныя праблемы Вялікага Княства Літоўскага, маскоўскі ўрад зрабіў стаўку на праваслаўнае насельніцтва Беларусі, якая стала галоўным тэатрам ваенных дзеянняў. Шматлікія царскія граматы, што засылаліся сюды, пераконвалі жыхароў у гуманных мэтах вайны (маўляў, цар ідзе толькі для абароны праваслаўя, супраць "досадителей и разорителей святой восточной церкви") і агітавалі пераходзіць на бок маскоўскай арміі. Такая агітацыя часам мела поспех.

Цар Аляксей Міхайлавіч заатакаваў Беларусь з розных бакоў адначасова трыма арміямі і атрымаў дапамогу — злучэнне ўкраінскіх казакаў І.Залатарэнкі. Усяго ён засяродзіў на невялікім тэатры дзеянняў — у Падзвінні і Верхнім Падняпроўі — войска на 100 тыс. чалавек. Вялікае Княства Літоўскае мела на пачатку вайны толькі дзесяцітысячны корпус гетмана Я.Радзівіла, які адчайна спрабаваў абараніць краіну, але не мог стрымаць нашэсця. Пераможна займаючы горад за горадам, маскоўскія ваяводы за першы год вайны авалодалі практычна ўсёй тэрыторыяй Беларусі да Дняпра і Заходняй Дзвіны. Поспеху царскага войска напачатку ў пэўнай ступені спрыяла лаяльнасць мясцовага праваслаўнага жыхарства ў шэрагу раёнаў Усходняй Беларусі. Аднак адносіны насельніцтва да заваёўнікаў хутка мяняліся. Рабаванне і захоп у палон маскоўскімі ратнікамі як католікаў, так і праваслаўных выклікалі партызанскі рух супраць іх на занятай тэрыторыі. Сялянскія атрады самаабароны сталі ўтварацца на ўсходзе Беларусі ў першыя месяцы вайны. Узброеныя косамі, віламі і бердышамі, яны спрабавалі абараняць свае мястэчкі і вёскі, перашкаджалі заваёўнікам браць у няволю дзяцей і жанчын, нярэдка дапамагалі рэгулярнаму войску Вялікага Княства і ўступалі ў адкрыты бой з непрыяцелем. Так, у ліпені 1654 г. трохтысячны партызанскі атрад з Калеснікаўскай воласці заатакаваў групоўку ваяводы А.Трубяцкога (не менш 15 тыс.), якая збіралася штурмаваць Мсціслаў, і прычыніў ёй сур'ёзную шкоду.

Падчас другой кампаніі (1655) царскія ваяводы захапілі

Менск, пасля авалодалі Вільняй і занялі практычна ўсю Беларусь, за выключэннем паўднёва-заходніх раёнаў. Умяшанне Швецыі ў вайну супраць Рэчы Паспалітай пагражала цару канфліктам з моцным паўночным сапернікам, таму пад канец 1655 г. ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі і Літвы прыпыніліся. Яшчэ праз год паміж урадамі Маскоўскай дзяржавы і Рэчы Паспалітай было падпісана замірэнне.

Часовы мір мала што змяніў у становішчы насельніцтва Беларусі. Як і падчас ваенных дзеянняў, яно цярпела здзекі ад царскіх ратнікаў, казакаў, шведаў; яго рабавалі і бралі ў няволю. Паводле запісу сучасніка, які праязджаў у канцы 1655 г. у Панямоніі, скрозь было "трупаў па дарогах поўна, вёскі, мястэчкі, сядзібы папалены, беднай хаткі няможна пабачыць цэлай". Ад мноства непахаваных трупаў людзей і жывёлы на Беларусі ўспыхнулі эпідэміі, якія некалькі гадоў лютавалі па ўсім краі, асабліва ў Менскім і Берасцейскім ваяводствах. Вялізныя людскія страты ўзрасталі яшчэ і ў выніку здзяйснення праграмы масавага вываду насельніцтва з занятых тэрыторый у Маскоўскую дзяржаву, якую царскі ўрад праводзіў ад пачатку вайны. Паводле сведчанняў патрыярха Нікана, планавалася перасяліць з Беларусі на царскія землі каля 300 тыс. чалавек. Колькасць выведзеных за гады вайны пераўзыходзіла гэтую лічбу, бо мноства палонных прадавалася на Усход. Асобай дзяржаўнай задачай быў пошук і вывад з Беларусі рамеснікаў. Даваеныя чыноўнікі цара займаліся гэтым спецыяльна і пераманьвалі "добрых дел мастеров" высокім заробкам ці забіралі сілай, "по государеву указу".

Спусташэнні і голад, тыранія і масавы вывад людзей у няволю актывізавалі народна-вызваленчы рух на Беларусі, які развіваўся ў форме партызанскай барацьбы. Ужо ў 1655 г. партызаны прычынялі царскаму войску вялікую шкоду, і Аляксей Міхайлавіч быў вымушаны пасылаць на іх спецыяльныя карныя фарміраванні. Вызваленчым рухам былі ахоплены раёны Рослава, Мсціслава, Горак, Дуброўны, Барысава, Полацка, Ашмян, Смаргоні, Вільні і інш. Паказальна, што кіраўнікамі шмат якіх партызанскіх аддзелаў сталі шляхціцы, пры наяўнасці шляхціцаў у аддзеле ролю палкоўніка мог выконваць селянін. Гэта сведчыць аб пэўнай сацыяльнай кансалідацыі насельніцтва ў мэтах агульнай барацьбы.

У беларускім Падняпроўі стрыжнем вызваленчага руху ў гады перамір'я стала казацкае войска палкоўніка І.Нячая, складзенае пераважна з мясцовых сялян. Найбольш вядомай была сотня беларускага палкоўніка Д.Мурашкі, якая

ў 1656 – 1657 гг. трымала пад страхам прысяжную (тую, што прысягнула цару) шляхту Менскага і Наваградскага ваяводстваў.

У 1658 г. вызваленчы рух дасягнуў вышэйшай стадыі. Да казацка-сялянскіх партызанскіх атрадаў стала далучацца падданая цару беларуская шляхта. Паступова барацьба набывала актыўныя формы: партызаны пачалі вызваляць ад царскіх ратнікаў невялікія гарады (Лукомль, Чашнікі, Глыбокае і інш.), часцей уступаць у адкрыты бой з непрыяцелем, а мяшчане шэрагу гарадоў уздымалі паўстанні і самастойна знішчалі або выганялі маскоўскія гарнізоны (Мсціслаў, Крычаў, Дзісна, Себеж, Магілёў, Шклоў, Гомель і інш.). Гэта быў сапраўды народна-вызваленчы рух, які па сваіх прычынах, формах і складзе ўдзельнікаў, бадай, не адрозніваўся ад партызанскай вайны супраць шведаў у Польшчы і на Жмудзі.

Дзеянні мясцовага насельніцтва спрыялі поспеху рэгулярнага войска Рэчы Паспалітай, якое з 1659 г., пасля афіцыйнага ўзнаўлення вайны, праводзіла аперацыі і на тэрыторыі Беларусі. Як і раней, ваяваць даводзілася пры вялікай дыспрапорцыі сіл. Калі максімальная колькасць жаўнераў Вялікага Княства ў 1658 – 1659 гг. складала каля 20 тыс. (з якіх палова ваявала са шведамі ў Курляндыі), дык цар Аляксей Міхайлавіч трымаў на Беларусі ўдвая большую армію. Толькі пасля падпісання мірнага пагадненння паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай вясной 1660 г. стала магчымым перавесці на Беларусь для барацьбы з царскімі ваяводамі ўсё войска Вялікага Княства і ў дапамогу яму адну польскую дывізію. З гэтага часу ініцыятыва вядзення вайны канчаткова пераходзіла да вайсковага кіраўніцтва Рэчы Паспалітай, якое пачало паступова адваёўваць тэрыторыю Беларусі. Летам 1660 г. дывізіі П.Сапегі і С.Чарнецкага разграмілі пад Ляхавічамі вялікую групоўку ваяводы І.Хаванскага, восенню таго ж года на Магілёўшчыне каля р.Басі была пабіта армія Ю.Далгарукага, а праз год пад Кушлікамі ў Падзвінні зноў пацярпеў паражэнне І.Хаванскі. Тады ж была вызвалена сталіца дзяржавы Вільня. Пад кантролем царскай улады заставаліся практычна толькі Падзвінне і раёны Падняпроўя. Між тым абодва бакі былі настолькі стомленыя вайной, што рашучыя дзеянні прыпыніліся. Толькі ў 1663 г. кароль і вялікі князь Ян Казімір паспрабавалі агульнымі сіламі правесці наступальную кампанію за Дняпро, на тэрыторыю Маскоўскай дзяржавы. Аднак і яна сарвалася. Ні адзін з бакоў не меў сіл для перамогі. Пачаліся працяглыя перамовы аб замірэнні.

У студзені 1667 г. у в.Андросава, што недалёка ад Мсціслава, было нарэшце падпісана мірнае пагадненне тэрмінам на 13,5 года. Яно насіла кампрамісны характар. Смаленшчына і Северская зямля заставаліся ў складзе Маскоўскай дзяржавы, а землі беларускага Падзвіння вярталіся Вялікаму Княству. Украіна была падзелена па Дняпры, пры гэтым цар пакідаў сабе на два гады і Кіеў з невялікай акругай. Паводле пагаднення, сотні тысяч палонных, выведзеных за час вайны, заставаліся ў царстве Аляксея Міхайлавіча.

Па стратнасці і адмоўных выніках для развіцця грамадства вайна 1654 — 1667 гг. была, бадай, самай трагічнай у гісторыі феадальнай Беларусі. Яна рэзка абвастрыла канфесійныя супярэчнасці ў Вялікім Княстве Літоўскім, паскорыла працэсы паланізацыі і амаль цалкам пазбавіла беларусаў іх арыстакратыі і мяшчанства.

2. Эканамічны заняпад і сацыяльныя супярэчнасці ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст.

У другой палове XVII ст. шляхецкая Рэч Паспалітая, у тым ліку Беларусь, якая ўваходзіла ў яе склад, знаходзілася ў стане глыбокага эканамічнага заняпаду і палітычнага крызісу. З сярэдзіны XVII ст. гэта дзяржава ўступіла ў паласу разбуральных войнаў і ўнутраных міжусобіц. З 68 гадоў яе гісторыі (1648 —1716) 65 гадоў прыходзяцца на ваенныя падзеі. Войны, якім спадарожнічалі голад, эпідэміі, прычынілі велізарныя бедствы, а месцамі прывялі да поўнага разарэння сялян, цяжка адбіліся на панскай гаспадарцы, разбурылі гарады, зменшылі колькасць насельніцтва.

У пастанове сейма Рэчы Паспалітай, прынятай у 1661 г., стан асобных зямель Вялікага Княства Літоўскага характарызаваўся наступным чынам: ваяводства Берасцейскае ў "большай сваёй частцы ператворана ў папялішча і поўнасцю разбурана", Гарадзенскі павет "ператвораны ў руіны і пераважная частка яго спалена", Слонімскі — "амаль дашчэнту спалены і загрaблены", Браслаўскі — "ушчэнт разбураны", Аршанскі — "ушчэнт разбураны і спалены" і г.д. Руйнаванні населеных пунктаў, салдацкія пастоі і рабаванні садзейнічалі таму, што сельскае насельніцтва пакідала наседжаныя месцы. Натоўпы галодных і бяздомных сялян блукалі ў пошуках хлеба і прытулку.

У другой палове XVII ст. разарэнне сялян дасягнула такой ступені, што нават кароль Рэчы Паспалітай Ян

Казімір вымушаны быў даць абяцанне заняцца паляпшэннем яго становішча. На сходзе магнатаў і шляхты ў Львове ў 1656 г. ён заявіў: "Абяцаю і клянуся, што ад гэтага часу з усімі саслоўямі маёй дзяржавы, як толькі паспею заключыць мір, буду ўсяляк імкнуцца пазбавіць мой народ ад уціску і пакутванняў". Услед за каралём гэта абяцалі магнаты і шляхта. Аднак, паколькі Рэч Паспалітая пазбегла канчатковага разгрому, шляхта забылася пра абяцанні. Яна і не думала расстацца са сваімі прывілегіямі.

Пасля "крывавага патопу", як называлі сучаснікі падзеі сярэдзіны XVII ст., большая частка гарадоў таксама прыйшла да заняпаду. Так, у выніку пагромаў 1657 і 1660 гг. горад Бярэсце быў "увесь да апошняга будынка разрабаваны і спалены". Насельніцтва засталося толькі "вельмі малая жменька". Пагромы і пажары 1648, 1655 і 1660 гг. амаль цалкам знішчылі Пінск. Гараджане, "не маючы дзе прытуліцца, разышліся па розных мястэчках і вёсках". Паводле апісання чэшскага падарожніка Б.Таннера, якое адносіцца да 1678 г., "горад Гродна, калісьці нядрэнны, ляжаў у руінах, ад яго, здаецца, толькі і засталося гарадское смецце".

Непазбежныя спадарожнікі вайны — неўраджаі — выклікалі катастрафічныя галадоўкі. З-за голаду і блукання абяздоленага насельніцтва пачалася эпідэмія сыпнога тыфу, якая лютавала з 1653 па 1658 г. і зноў успыхнула ў 1664 г.

Заключэнне Андросаўскага перамір'я паклала канец вайне. Наступныя 30 гадоў былі перыядам адносна мірнага развіцця. Але ўжо ў пачатку XVIII ст. аднаўленне гаспадаркі было спынена Паўночнай вайной. Зноў на працягу некалькіх гадоў ваенныя дзеянні адбываліся на беларускай зямлі. 12 мая 1716 г. рускі пасол у Рэчы Паспалітай князь Г.Далгарукі пісаў украінскаму гетману І.Скарападскаму: "... не толькі Літва, але і Польшча ніколі такой не была, — у канец разрабавана: два гады хлебны няўрод быў, а да таго ж і цяпер саксонцы нязносную бяруць кантрыбуцыю і апошні кавалак хлеба з горла выдзіраюць без міласэрнасці, што не толькі па мястэчках і вёсках і ў самой рэзідэнцыі ў Варшаве як мухі голадам паміраюць". І без таго цяжкае становішча мірнага насельніцтва пагоршылася ў выніку засухі. З 1708 да 1711 г. (месцамі да 1717 г.) розныя эпідэміі ахапілі многія раёны.

З прычыны войнаў і эпідэмій рэзка скарацілася колькасць насельніцтва. Так, калі ў 1650 г. на Беларусі было 2,9 млн чалавек, то ў 1667 — 1673 гг. — не больш за 1,4 млн чалавек, г.зн. насельніцтва скарацілася больш чым у два разы. Да 1700 г. колькасць насельніцтва павялічылася

да 2,2 млн чалавек, а пасля Паўночнай вайны зноў зменшылася да 1,5 млн.

Цяжкія вынікі войнаў ускладняліся захаваннем і ўмацаваннем фальваркава-паншчыннай сістэмы гаспадаркі, кансервацыяй найбольш застарэлых форм прыгонніцтва, феадальнай анархіяй і міжусобіцамі.

У асабліва цяжкім становішчы знаходзілася сельская гаспадарка. У гады вайны не толькі паўстанцы грамілі маёнткі феадалаў, але і шляхта была не супраць пажывіцца за кошт сялянскай гаспадаркі. У лютым 1662 г. адзін з прадстаўнікоў пануючага класа скардзіўся на шляхціцаў і наёмнікаў, што яны "без жалю забіралі" ў сялян уладання Харошча Гарадзенскага павета "рознае адзенне, абмалочанае і неабмалочанае збожжа, розную жывёлу, коней, валоў, цёлак, авечак, свіней, розныя напіткі ... і вывозілі награбленае, акрамя таго, што самі елі і пілі". Разарэнне сялян не магло быць не заўважана ўрадам. У пачатку 1661 г. кароль Ян Казімір пісаў гетману Вялікага Княства Літоўскага: "У такой абстаноўцы, калі нашы падданыя надзвычай разбураны і знаходзяцца ў такой галечы, мы не можам атрымаць належных прыбыткаў у карысць нашага стала".

Крызіс сельскай гаспадаркі адмоўна адбіўся на развіцці беларускіх гарадоў, рамяства, унутранага і знешняга гандлю. З-за недахопу заказчыкаў і пакупнікоў у гарадах частка гарадскога насельніцтва вымушана была перасяліцца ў вёскі або займацца сельскай гаспадаркай у горадзе.

Вядома, што для вядзення войнаў урад Рэчы Паспалітай пазычаў буйныя грашовыя сумы ў магнатаў. Не маючы сродкаў для іх пакрыцця, ён раздаваў рэшткі дзяржаўных зямель. У выніку ў Беларусі ўтварыліся вялізныя латыфундыі, у некалькі разоў большыя за асобныя княствы Германскай імперыі. Так, Кароль Радзівіл ("пане Каханку") у сярэдзіне XVIII ст. акрамя буйных спадчынных уладанняў, што складваліся з Нясвіжскага, Клецкага, Біржанскага і Ольцкага княстваў, меў у так званых "каралеўшчынах" 16 гарадоў, 583 вёскі, 25 войтаўстваў, мноства графстваў і валасцей. Яго даход толькі са спадчынных маёнткаў дасягаў вялізнай сумы — 20 млн злотых, што ў паўтара раза перавышала гадавыя паступленні ў казну Рэчы Паспалітай. Не дзіўна таму, што ён трымаў вялікі двор, сваё войска. Маючы неабмежаваную ўладу, ён любіў паўтараць: "Кароль сабе каралём у Кракаве, а я ў Нясвіжы". Сучаснік Б.Міхалоўскі так пісаў аб "пане Каханку": "Было штосьці манархічнае ў нясвіжскім маёнтку Радзівілаўскага дома. Маўчу аб баляван-

нях..., на якія збіралася амаль уся Літва, маўчу нават аб тэатры, аркестры, міліцыі, дасягаўшай да 8000 рознага ўзбраення. Ахвотнікаў было мноства, што нават мала хто з каралёў меў столькі гайдамакаў і казакаў". Буйнымі латыфундыямі валодалі таксама Вішнявецкія, Глябовічы, Пацы, Сангушкі, Сяняўскія, Яблонскія, віленскае біскупства і інш.

Сканцэнтраваўшы ў сваіх руках велізарныя зямельныя ўладанні, свецкія і царкоўныя феадалы ператварыліся ў поўнаўладных гаспадароў у краіне. "Хто я? — ставіў пытанне магнат Ю.Яблонскі. — Князь, гэта мала. Герой і міністр, гэта яшчэ мала. Епіскап ці кардынал, мала. Я імператар рымскі, мала. Папа. Але і гэтага мне мала. Калі б існавалі яшчэ якія-небудзь высокія званні і пасады, то і тыя належалі б мне".

Развал апарату дзяржаўнай улады і феадальная анархія адмоўна адбіліся на эканоміцы Беларусі. Пастаянная міжусобная барацьба магнацкіх груповак, якая даходзіла да ўзброеных сутыкненняў, прычыняла вялікія спустошэнні насельніцтву. Сапраўдным няшчасцем для вёсак і мястэчкаў з'яўляліся і так званыя наезды адных узброеных шляхціцаў на маёнткі іншых, якім спадарожнічалі знішчэнне сялянскіх пасеваў, угон жывёлы, рабаванне маёмасці і інш. Свавольствы, якія выраблялі магнаты і шляхта, знайшлі шырокае адлюстраванне ў шматлікіх сялянскіх скаргах, пастановах павятовых і ваяводскіх сеймікаў, каралеўскіх універсалах. Кароль Аўгуст III у маніфесце, выдадзеным у 1735 г., адзначыў, што ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім узброеныя атрады, якія ўзначальвалі "некаторыя асобы", руйнуюць гарады, мястэчкі і вёскі, самавольна бяруць з іх падаткі, "чыняць вялікія насіллі і разбой". Ні мясцовыя, ні цэнтральныя ўлады не маглі не толькі спыніць, але нават абмежаваць свавольствы ў краіне.

Узмацненне феадальнага прыгнёту выклікала далейшае абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей на Беларусі. Найбольш пашыранымі формамі супраціўлення з'яўляліся падача скаргаў на злоўжыванні з боку феадальнай адміністрацыі, арандатараў, адмова выконваць павіннасці, уцёкі сялян ад сваіх уладальнікаў у іншыя ўладанні, гарады, мястэчкі, а таксама за межы Рэчы Паспалітай.

Вышэйшай формай барацьбы сялян і гараджан былі ўзброеныя выступленні, якія адбыліся ў Рэчыцкім і Мазырскім паветах (1676 — 1677), Крычаўскім старостве (1690, 1696), Слуцкім княстве (1695), у ваколіцах Дуб-

роўны і Слонімскім старостве (1701), Быхаве і Быхаўскім графстве (1702, 1740) і інш.

Адным з найбольш буйных узброеных антыфеадальных выступленняў сялян на Беларусі было Крычаўскае паўстанне 1740 — 1744 гг., якое ўзначаліў Васіль Вашчыла. Яго памочнікамі былі Карпач, Вецер, Бачко. Паўстанцы ўстанавілі ў старостве ўладу, выгнаўшы за межы Крычаўшчыны ненавісных арандатараў.

У студзені 1744 г. да Крычава падышло вялікае войска з гарматамі, якое ўзначаліў уладальнік староства І.Радзівіл. Насустрач карнікам выступілі атрады паўстанцаў, але яны былі дрэнна ўзброены і не маглі ўстаяць супраць рэгулярных войск. Расправа над паўстанцамі была жахлівай. "Крычаў, — сведчыць адзін з дакументаў, — увесь тады быў скрываўлены, расстаўленыя па ўсіх вуліцах і на правым беразе Сожа шыбеніцы і калы праз некалькі дзён уяўлялі страшэннае і грознае відовішча".

Барацьба не спынялася і ў наступныя гады. Так, у 1768 — 1769 гг. антыфеадальныя выступленні сялян адбываліся каля Мсціслаўля, Оршы, Віцебска, у Мазырскім павеце, Гарадзенскай і Кобрынскай эканоміях і інш. Гэтыя выступленні мелі абмежаваны, стыхійны, разрознены і лакальны характар, а таму былі падаўлены.

3. Палітычны крызіс

Эканамічны заняпад Рэчы Паспалітай дапоўніўся палітычным крызісам гэтай дзяржавы. Прычыны крызісу вынікалі як з унутранага становішча краіны, так і са змен у яе міжнародным становішчы.

На ўсталяванне палітычнай анархіі перш за ўсё ўплывала адсутнасць моцнай цэнтралізаванай улады. Адмоўны адбітак накладваў той факт, што ўся ўлада ў дзяржаве канцэнтравалася, па сутнасці, у руках аднаго саслоўя — шляхецкага. Гарадское саслоўе, мяшчане, было адхілена ад удзелу ў палітычным жыцці. Практычна аднасаслоўным з'яўляўся агульнадзяржаўны двухпалатны сейм, які склікаўся раз у два гады. У вышэйшай палаце, сенаце, засядалі магнаты і каталіцкія біскупы. Ніжэйшая, "пасольская ізба", складалася з дэпутатаў-паслоў ад павятовай і ваяводскай шляхты. Звычайна іх выбіралі па два чалавекі ад кожнага павета. Але і яны не валодалі правам свабоднага волевыяўлення на вальных сеймах, што па чарзе праводзіліся ў Варшаве і Гародні.

Кожны пасол павінен быў строга прытрымлівацца "інструкцыі", дакумента, які змяшчаў пажаданні-наказы павятовай шляхты сваім паслам пры вырашэнні таго ці іншага пытання. Адным з абавязковых наказаў было патрабаванне забароны ўстанаўлення новых падаткаў. Гэта не дазваляла павялічыць дзяржаўны бюджэт, а значыць, знайсці сродкі на ўмацаванне і павелічэнне войска, каб бараніць дзяржаву. Палітычная праграма беларуска-літоўскай шляхты (як і польскай) магла быць зведзена да адзінага самага галоўнага патрабавання "nihil novi" — нічога новага.

Краевугольным каменем "залатых шляхецкіх вольнасцей", а інакш — шляхецкага самаўладдзя і анархіі — лічылася права "liberum veto" (свабода забароны). Згодна з ім, кожны шляхціц-пасол меў права аднаасобна заблакіраваць прыняцце любой пастановы сейма ці нават увогуле сарваць яго працу. З моманту яго ўвядзення ў 1652 г. і да 1764 г. былі сарваны 42 сеймы з 55. Магнаты Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага праз падуладнае сабе шляхецтва выкарыстоўвалі права "liberum veto" для аховы ўласных інтарэсаў і свайго прывілеяванага становішча. Усё гэта прыводзіла да фактычнага паралічу дзяржаўнага кіравання, магчымасці зрыву любога памкнення да змены існуючага ладу.

Найбольш моцна гэта адбівалася на статусе караля і вялікага князя. Пасля смерці апошняга Ягайлавіча, Жыгімонта III Аўгуста (1572), які не пакінуў нашчадкаў, усталявалася традыцыя абрання (элекцыі) кожнага наступнага манарха на агульнадзяржаўных сеймах прадстаўнікамі польскай і літвінскай шляхты. Адсутнасць спадчыннага трона вяла да пастаяннай барацьбы сярод магнацкіх груповак за ўладу ў перыяд міжкаралеўя. Жадаючы прывесці свайго прадстаўніка да ўлады, яны звярталіся за дапамогай да іншаземцаў, скарыстоўвалі замежную вайсковую сілу. Пад канец XVIII ст. гэта звялося да простага ўплыву з боку замежных паслоў (Прусіі, Расіі, Швецыі, Аўстрыі) у Варшаве на абранне караля і вялікага князя праз падтрымку патрэбнай кандыдатуры з дапамогай свайго войска.

Новаабраны кароль і вялікі князь быў абцяжараны неабходнасцю выканання ўскладзеных на яго сеймам абавязкаў, якіх ён не павінен быў парушаць. Гэтыя абавязкі былі замацаваныя ў так званых "генрыхаўскіх артыкулах" (з 1573 г.), якія ўтрымлівалі асноўныя прынцыпы дзяржаўнага ладу і кіравання. Акрамя гэтага, кожны кандыдат на трон, пачынаючы з Генрыха Валуа, падпісваў персанальны дагавор (pacta conventa) на элекцыйным сейме і пацвярджаў яго

ўласнай прысягай. Пры невыкананні ці парушэнні ім гэтых дагавораў шляхта забяспечвала за сабой права аказаць супраціўленне, нават узброенае, каралю і вялікаму князю праз абвяшчэнне канфедэрацыі. Канфедэраты фіксавалі пісьмова свае скаргі і патрабаванні ў спецыяльным канфедэрацкім акце ў гродскім судзе. Пасля гэтага канфедэрацыя (калі манарх не прызнаваў прэтэнзій да сябе), а па сутнасці — грамадзянская вайна, лічылася ўзаконенай.

Кароль і вялікі князь не мог самастойна выдаваць "канстытуцыі" (пастановы), уводзіць падаткі, распараджацца дзяржаўнымі маёнткамі. Пры ім жа (з 1607 г.) у перапынку паміж сеймамі пастаянна павінна была знаходзіцца пэўная колькасць сенатараў. Іх парады павінен быў улічваць кароль і вялікі князь ва ўсіх важнейшых справах.

Вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім і ў Польшчы (вялікіх маршалкаў, канцлераў, гетманаў, падскарбіяў) займаліся пажыццёва. Яны не маглі быць скасаваныя манархам.

Важным крокам да замацавання шляхецкай улады ў Рэчы Паспалітай стала ўтварэнне незалежных найвышэйшых судоў-трыбуналаў. Галоўны Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага быў створаны ў 1581 г. У Трыбунале засядалі выбраныя ад павятовай шляхты дэпутаты, да якіх і перайшлі функцыі вышэйшага апеляцыйнага суда, што ажыццяўляліся раней самім манархам і яго ўраднікамі.

Гэтыя і іншыя шляхецкія памкненні да абмежавання ўлады караля і вялікага князя з'явіліся немалаважнай унутранай прычынай палітычнага крызісу і развалу дзяржавы. Можна сказаць, што шляхта амаль цалкам вызвалілася ад каралеўскай улады на падставе самакіравання. На працягу другой паловы XVI — XVIII ст. яна паступова стала пануючым саслоўем над іншымі і над самім манархам.

Пры гэтым адметнай рысай "шляхецкай рэспублікі" было ўладарства і перавага найбуйнейшых феадалаў-магнатаў. Яны "вялі рэй" палітычнага жыцця, асабліва ў Вялікім Княстве Літоўскім. Магутнасць такіх родаў, як Сапегі, Радзівілы, Пацы, Агінскія, Чартарыйскія, была амаль нічым не абмежаваная. Кароль і вялікі князь вымушаны быў лічыцца з імі. Асновай гэтай магутнасці сталі велізарныя зямельныя ўладанні магнатаў. Так, Ян Сапега, вялікі гетман Вялікага Княства Літоўскага, валодаў у 1690 г. 18 563 "дымамі". Магнаты мелі магчымасць утрымліваць нават сваё ўласнае войска. Да іх на службу, гаспадарчую і вайсковую, ішла сярэдняя і бяднейшая шляхта.

У канцы XVII – пачатку XVIII ст. у Вялікім Княстве Літоўскім амбіцыі магнацкіх родаў даходзяць да ўзброенага саперніцтва, перарастаюць у магнацкія войны. Спачатку на неабмежаванае, роўнае велікакняжацкаму першынство прэтэндуюць у Беларуска-Літоўскай дзяржаве Сапегі, змагаючыся з Агінскімі і Радзівіламі. Але ў вырашальнай бітве пад Алькенікамі (1700) са шляхтай, напалоханай абсалютысцкімі планамі Сапегаў, іх прыхільнікі церпяць паражэнне. У XVIII ст. уплывы ў Вялікім Княстве Літоўскім і ва ўсёй Рэчы Паспалітай дзеляць паміж сабой, пераважна з дапамогаю зброі, Чартарыйскія, Радзівілы, Агінскія, Касакоўскія.

Унутрыпалітычныя праблемы Рэчы Паспалітай у пачатку XVIII ст. спляліся са знешнімі, падкрэсліваючы згубную нявырашанасць першых. У гэты час Беларусь становіцца арэнай баявых дзеянняў, звязаных з расійска-шведскай (Паўночнай) вайной (1700 – 1721). Шведы, расійцы, саксонцы, не пытаючыся дазволу, праходзілі па краі, рабавалі, палілі і вынішчалі набыткі яго жыхароў. У 1704 г. частка шляхты, якая непрыязна ставілася да караля і вялікага князя Аўгуста II, пры падтрымцы шведскага караля Карла XII абрала новага манарха С.Ляшчынскага. Толькі пасля паражэння шведскіх войск пад Палтавай (1709) змог Аўгуст II вярнуцца на трон. Але ўжо ў 1715 г. зноў пачынаецца грамадзянская вайна, якая ахапіла і Вялікае Княства Літоўскае. Яе выклікала памкненне Аўгуста II усталяваць абсалютную манархію ў Рэчы Паспалітай. Зноў значная частка шляхты выступіла ў абарону "залатых шляхецкіх вольнасцей". Толькі ўмяшанне расійскіх войск прывяло да згоды шляхты з каралём на так званым "нямым" сейме 1717 г. (пастановы на ім прымаліся без абмеркавання). Гэты сейм абмежаваў уладу караля, замацаваў шляхецкую анархію, пацвердзіў права "liberum veto". Апошняе зноў паставіла заслону перад спробамі рэфармавання дзяржавы. Колькасць рэгулярнага войска была абмежаваная да 24 тыс. (18 тыс. у Польшчы і 6 тыс. у Вялікім Княстве Літоўскім).

З часу Паўночнай вайны Расія паступова бярэ пад свой пратэктарат знешнюю і ўнутраную палітыку Рэчы Паспалітай. Больш моцным суседзям была выгадная яе слабасць. Таму яны імкнуліся захаваць у ёй бязладдзе і анархію пад прыкрыццём аховы і гарантавання "шляхецкіх вольнасцей". У 1720 г. пра гэта дамовіліся Расія і Прусія. У 1726 г. да іх далучылася Аўстрыя.

Крызісныя з'явы ў грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай абвастрала нявырашанасць рэлігійнага пытання.

Ні адно з існаваўшых веравызнанняў тут не было забаронена. Але практычна толькі прадстаўнікі каталіцкай шляхты і святарства маглі займаць дзяржаўныя пасады, удзельнічаць у працы сеймаў. У 1717 г. апошні пасол-некаталік пратэстант Пятроўскі быў сілай выдалены з сейма ў Варшаве. Праваслаўнае святарства традыцыйна шукала падтрымкі ў Маскве. Уніяцкая вера, з-за таго што большасць беларускай шляхты перайшла ў каталіцтва, пераўтвараецца ў "хлопскую" (сялянскую). Негатыўныя вынікі такой недальнабачнай палітыкі кіруючых колаў Рэчы Паспалітай выразна адчуюцца ў другой палове XVIII ст.

Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай канца XVII — першай паловы XVIII ст. з-за пагрозы самога існавання дзяржавы ўсё выразней патрабаваў яе рэфармавання. Паступова сярод пануючага шляхецкага саслоўя, у першую чаргу магнацтва, сфарміраваліся дзве плыні. Першая выступала за рэформы і ўмацаванне цэнтральнай улады, другая — за захаванне існуючага становішча безуладдзя і анархіі.

4. Развіццё эканомікі ў другой палове XVIII ст.

Нармалізацыя эканамічнага жыцця на Беларусі пачалася толькі з сярэдзіны XVIII ст. Пасля многіх гадоў разбурэння паступова аднаўлялася сельская гаспадарка, павялічвалася колькасць насельніцтва, развіваўся ўнутраны і знешні гандаль, а з ім і таварна-грашовыя адносіны. Асобныя феадалы з мэтай павелічэння прыбытковасці сваіх маёнткаў станавіліся на шлях перабудовы вядзення сваёй гаспадаркі. Так, магнат Іаахім Храптовіч у сваіх маёнтках Шчорсы ў Наваградскім і Вішнёва ў Ашмянскім паветах ліквідаваў паншчыну і замяніў яе чыншам. Прыгонныя сяляне былі падзелены на дзве катэгорыі. Адна, больш заможная, частка сялян атрымлівала 10 моргаў (7,12 га) ворнай зямлі на двор і ператваралася ў арандатараў, якія плацілі ўласніку ці яго арандатару 90 — 100 злотых у год. Другая ж група сялян, пазбаўленых палявых надзелаў, ператваралася ў агароднікаў, іх абавязвалі наймацца на працу ў фальваркі. За акрэсленую плату яны апрацоўвалі панскую зямлю, вырошчвалі і збіралі ўраджай, даглядалі жывёлу, сплаўлялі лес і інш. Іх сыны ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў для "вывучэння" сельскай гаспадаркі бясплатна працавалі ў панскім двары. Новаўвядзенні, падобныя "рэформам" Храптовіча, праводзіліся таксама Масальскім у

8. Зак. 5396.

яго маёнтках на Ігуменшчыне, княгіняй Яблонскай у маёнтку Сямяцічы і інш.

Другая група феадалаў, захоўваючы ў палявой гаспадарцы паншчыну, стала заахвочваць прыгонных сялян, якія працавалі ў найбольш прыбытковых галінах, грашовым узнагароджаннем: у Гарадзенскай каралеўскай эканоміі, напрыклад, налічвалася больш за 330 сялян, а таксама 350 рамеснікаў, якія за сваю працу атрымлівалі грошы. Такія ж парадкі былі заведзены ў Берасцейскай і Кобрынскай каралеўскіх эканоміях, што сведчыла аб пранікненні ў панскую гаспадарку элементаў новых, буржуазных сацыяльна-эканамічных адносін.

У XVIII ст., асабліва ў яго другой палове, некаторыя феадалы засноўвалі ў сваіх уладаннях прамысловыя прадпрыемствы мануфактурнага тыпу. Найбольш буйнымі з іх былі шклозавод у Налібоках (20-я гады XVIII ст.), люстраная фабрыка ў мястэчку Урэчча (канец 30-х гадоў XVIII ст.), Слуцкая фабрыка шаўковых паясоў князёў Радзівілаў (1751), жалезаробчы завод графа Храптовіча ў в. Вішнёва (Ашмянскі павет, 80-я гады XVIII ст.) і інш.

Першым прадпрыемствам мануфактурнага тыпу на тэрыторыі Беларусі быў шкляны завод у Налібоках (зараз Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці), пабудаваны па загаду жонкі канцлера Вялікага Княства Літоўскага Ганны Радзівіл у 1727 ці ў 1728 г. Пры вызначэнні месца будаўніцтва завода Налібокі выбраны не выпадкова. Тут меліся вельмі спрыяльныя ўмовы для арганізацыі шкляной вытворчасці. У тыя часы ў шкловытворчасці галоўным відам сыравіны быў паташ, які выраблялі з драўнянага попелу. Каля в. Налібокі знаходзіліся вялізныя лясныя масівы, што давала магчымасць параўнальна лёгка арганізаваць вытворчасць попелу, а таксама нарыхтоўку паліва і будаўнічых матэрыялаў. Немалаважную ролю ў выбары месца будаўніцтва завода адыграла наяўнасць даволі вялікай ракі Лебяжады і таннай рабочай сілы — прыгонных сялян. У вялікім драўляным памяшканні, якое называлася гутай, стаялі печы, у адной з якіх "варылася", у другой закальвалася шкло. Паблізу галоўнага памяшкання, ля самай плаціны, размяшчалася шліфавальная майстэрня, у якой на спецыяльных станках праводзілася шліфоўка посуду, флаконаў, кубкаў і іншых шкляных вырабаў. Другая шліфавальная майстэрня была пабудавана ў пяці кіламетрах ад Налібок у в. Янковічы. Тут р. Шура была перагароджана плацінай, а каля яе стаяў вялікі

драўляны дом, у якім і шліфаваліся шкляныя вырабы. Як у першай, так і ў другой шліфавальных майстэрнях станкі прыводзіліся ў рух пры дапамозе вады.

Найбольш каштоўны шкляны посуд — вазы, кубкі, пудраніцы — упрыгожваўся разнымі ці маляванымі фарбай узорамі. Гэта рабілася ў спецыяльнай майстэрні, якая называлася рысавальняй.

Аснову кадраў прадпрыемства складалі кваліфікаваныя рабочыя — шліфавальшчыкі, рысавальшчыкі, шкловыдзімальшчыкі і іншыя, якіх ў розныя гады дзейнасці прадпрыемства налічвалася ад 40 да 50 чалавек.

Працавалі на заводзе прыгонныя радзівілаўскіх маёнткаў. У большасці выпадкаў яны былі з Налібок і сумежных вёсках. Паводле інвентара 1789 г., напрыклад, сяляне Налібок павінны былі адпрацаваць на заводзе 1872 дні ў год "упряжных", а сяляне в.Нівок — 1454 дні "пешых". Умовы працы на заводзе былі вельмі цяжкімі. У інструкцыі, якая вызначала рэжым працы на прадпрыемстве, было сказана, што шкловыдзімальшчыкі павінны прыступаць на працу ў чатыры гадзіны раніцы і працаваць да сямі гадзін вечара з двухгадзінным перапынкам на абед (з адзінаццаці да трынаццаці гадзін). Качагары прыступалі да працы значна раней. Такім чынам, працоўны дзень на заводзе працягваўся больш за 13 гадзін. Для асобных катэгорый рабочых і ў першую чаргу для тых, хто адбываў паншчыну, давалі норму выпрацоўкі і не адпускалі з завода, пакуль рабочы не выконваў яе. Паколькі нормы былі вельмі вялікімі, часта прыходзілася працаваць да ночы. За спазненне, а таксама за заўчасны ўход з працы сурова каралі — штрафавалі, білі палкамі і інш. Нават майстры за кожны час спазнення плацілі 20 грошаў штрафу.

Другой мануфактурай на Беларусі па часе стварэння быў Урэцкі шкляны завод (Любанскі раён Мінскай вобласці), які пачаў дзейнічаць у канцы 30-х гадоў XVIII ст. Урэчча было выбрана месцам будаўніцтва шклянога завода па тых жа прычынах, што і Налібоцкага. Па сваіх памерах і якасці прадукцыі гэты завод быў у той час самым буйным прадпрыемствам такога тыпу не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Калі ў Налібоках у асноўным выраблялі просты шкляны посуд і аконнае шкло, то на Урэцкім прадпрыемстве галоўную ўвагу звярталі на вытворчасць дарагога крышталь-нага посуду, дэкаратыўных шкляных вырабаў. Асабліва славіўся завод сваімі люстэркамі. Выраблялі іх тут даволі многа, розных памераў і формы. З дэкаратыўных вырабаў цэнтральнае месца займалі люстры з хрусталю.

Разам са шклянымі прадпрыемствамі ў маёнтках Радзівілаў былі створаны і іншыя прадпрыемствы мануфактурнага тыпу, перш за ўсё тэкстыльныя. Сярод гэтых прадпрыемстваў на першае месца неабходна паставіць Слуцкую фабрыку шаўковых паясоў, вырабы якой атрымалі сусветную вядомасць. Гэта фабрыка была заснавана ў 1751 г. Міхаілам-Казімірам Радзівілам. Для кіраўніцтва прадпрыемствам М. Радзівіл запрасіў майстроў з Персіі і Турцыі. Персы і туркі хоць і лічыліся ўмелымі майстрамі, але пад іх кіраўніцтвам фабрыка працавала дрэнна. У сувязі з гэтым у 1758 г. Радзівіл запрасіў для кіраўніцтва фабрыкай майстра са Стамбула Яна Маджарскага, які змог наладзіць і пашырыць вытворчасць. Праз некалькі гадоў яна вырабляла паясоў на суму да 10 тыс. злотых. Пасля смерці Яна Маджарскага ў 1780 г. кіраўніком вытворчасці стаў яго сын Лявон. У 1793 г. на фабрыцы працавала да 60 чалавек, у тым ліку такія мясцовыя майстры, як Яўфім і Ян Дубіцкія з Урэчча, Ян Канчыла і Аляксандр Лойка са Слуцка і інш. Галоўным майстрам-ткачом доўгі час працаваў беларус Васіль Барсук. Сярод рабочых было шмат дзяўчат, узятых на фабрыку са Слуцка і навакольных вёсак.

Вырабляліся слуцкія паясы да 1830 г. Пасля падаўлення паўстання 1830 – 1832 гг. царскі ўрад забараніў магнатам і шляхце насіць нацыянальнае адзенне – кунтуш і пояс. Пасля гэтага фабрыка стала вырабляць царкоўныя рызы. Паколькі вялікага попыту на гэту прадукцыю не было, то яна праіснавала нядоўга і ў 1844 г. закрылася.

Апрача пералічаных вышэй вотчынных прамысловых прадпрыемстваў на Беларусі існавалі шкляныя заводы графа Салагуба ў мястэчку Ілля і гетмана Масальскага ў маёнтку Мыш (Наваградскі павет), суконныя фабрыкі Бярновіча ў мястэчку Бабоўня і Нясвіжскага бернардзінскага манастыра ў в. Падласосня, суконная і палатняная фабрыкі князя Сапегі ў мястэчку Ружаны і інш.

У другой палове XVIII ст. актыўны ўдзел у развіцці мануфактурнай вытворчасці прымаў кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. У 60 – 70-х гадах XVIII ст. па яго загаду літоўскі надворны падскарбій (галоўны ўпраўляючы эканоміямі, якія належалі каралю ў Літве і Беларусі) Антоній Тызенгаўз стварыў ў Гарадзенскай і Берасцейскай эканоміях 21 буйное прадпрыемства мануфактурнага тыпу – залататкацкую, шаўкаткацкую, суконную, суконна-капялюшную, тонкасуконную, палатняную, панчошную, камлотавую, паркаленабіўную фабрыкі, а таксама металургічны, гарматны, ружэйны заводы, завод

металічных вырабаў і інш. У канцы XVIII ст. на Беларусі дзейнічалі звыш 50 прамысловых прадпрыемстваў мануфактурнага тыпу.

Вотчынныя мануфактуры абслугоўваліся, як правіла, прыгоннымі сялянамі, але разам з тым на іх ужывалася і праца наймітаў. Амаль усе працаўнікі разам з прадуктамі харчавання атрымлівалі пэўнае грашовае ўзнагароджанне, прычым на многіх аперацыях была ўведзена здзельная праца. Аднак нізкая прадукцыйнасць працы і плата замежным майстрам былі прычынай высокага сабекошту мануфактурных вырабаў, іх прадукцыя, асабліва прадметы раскошы, не мела збыту і залежвалася на складах, у выніку чаго большасць гэтых прадпрыемстваў да канца 80-х гадоў XVIII ст. закрылася.

Развіццё таварнай вытворчасці, ужыванне прымусовага найму, грашовая аплата, з'яўленне мануфактур — усё гэта сведчыла аб пачатку распаду феадальных адносін, развіцці элементаў капіталістычнай вытворчасці.

З мэтай навядзення парадку ў гандлі ў 1766 г. былі ўведзены адзіныя для Вялікага Княства Літоўскага меры вагі, аб'ёму і даўжыні. Рабіліся спробы зблізіць іх з адзінкамі вымярэння іншых дзяржаў, у тым ліку і Польшчы. Зліццю эканамічна раздробленых абласцей Рэчы Паспалітай у адно эканамічнае цэлае садзейнічала таксама паштовая рэформа 1764 г., якая паклала пачатак шырокаму развіццю паштовай сувязі паміж гарадамі.

У 1775 г. урад Рэчы Паспалітай увёў "генеральную мытную пошліну", абавязковую для ўсіх, у тым ліку караля, магнатаў, шляхты і духавенства, а сейм Вялікага Княства Літоўскага, каб абмежаваць ліхвярства, увёў даўгавы працэнт у памеры не больш за 7% для свецкіх і не больш за 6% для духоўных крэдытораў.

З развіццём унутранага і знешняга гандлю і ўцягненнем феадалаў у таварна-грашовыя адносіны пачаліся работы па паляпшэнню сухапутных дарог і ачыстцы суднаходных рэк. У другой палове XVIII ст. былі збудаваны дзве дарогі — Пінска-Слонімская і Пінска-Валынская. У 1767 г. віленскі ваявода М.Агінскі пачаў будаўніцтва канала, які злучыў Нёман праз Шчару, Ясельду і Прыпяць з Дняпром. У 1784 г. па каналу прайшло першае судна. У 1784 — 1784 гг. быў пабудаваны другі канал, што злучыў Прыпяць з Заходнім Бугам.

Рост вытворчых сіл у сельскай гаспадарцы, развіццё ўнутранага і знешняга гандлю садзейнічалі аднаўленню

гарадоў і мястэчак Беларусі. Яны паступова адбудоўваліся, знікалі сляды спусташэнняў і разрухі, расло гарадское насельніцтва, аднаўляліся рамяство і гандаль, хаця ў іх нават да канца XVIII ст. не быў дасягнуты той узровень, які існаваў у канцы XVI – першай палове XVII ст.

Аднаўленне разбуранай эканомікі Беларусі адбывалася ў абстаноўцы разлажэння феадальна-прыгонніцкай сістэмы, ва ўмовах феадальнай анархіі, усеўладдзя магнатаў, шырокіх эканамічных і палітычных прывілеяў шляхты і жорсткай эксплуатацыі сялян і гараджан, а таму зацягнулася на доўгі час і не закончылася да ліквідацыі Рэчы Паспалітай.

5. Спробы рэформ у Рэчы Паспалітай і яе падзелы

Паглыбленне палітычнага крызісу, узрастанне замежнага ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай узмацнілі імкненне прагрэсіўнай часткі грамадства да змен у палітычным ладзе краіны.

Кола рэфарматараў на чале з Чартарыйскімі дабілася ў 1764 г. абрання каралём і вялікім князем падтрыманага Расіяй Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Пачаўся першы этап рэформ (1764 – 1766). Былі адменены шматлікія гандлёвыя зборы. Іх замянілі адзіным "генеральным падаткам". Распачалася рэвізія каралеўскіх маёнткаў, што дало сродкі для павелічэння войска. Была зроблена спроба ліквідацыі права "liberum veto" пры вырашэнні на сеймах пытанняў эканамічнага характару.

Спроба рэформ выклікала незадавальненне як магнатаў, так і суседніх дзяржаў. Расія і Прусія выкарысталі для гэтага адмову на сейме 1766 г. надаць роўныя правы некатолікам – пратэстантам і праваслаўным ("дысідэнтам"). "Дысідэнты" пры дапамозе Расіі і Прусіі ствараюць дзве канфедэрацыі – у Слуцку і Торуні (1767) з мэтай ураўноўвання ў правах. На сейме 1767 – 1768 гг. пад ціскам расійскага войска і пасла М.Рапніна былі прыняты пастановы, згодна з якімі "дысідэнтам" надавалася поўная свабода веравызнання і палітычныя правы, роўныя з католікамі. Адначасова былі пацверджаны "вечныя і неадменныя кардынальныя правы" шляхты (права выбару караля, "liberum veto", права абвяшчэння канфедэрацый і інш.). Гарантам выканання гэтых рашэнняў сейм назваў Расійскую імперыю. Такім чынам, ужо і фармальна Рэч Паспалітая спусцілася да ўзроўню залежнай дзяржавы. Рэфарматарская дзейнасць была перапынена.

Незадаволеная палітыкай Станіслава Аўгуста шляхта ўтварае Барскую канфедэрацыю (1768), якая аб'яднала патрыятычныя і кансерватыўныя элементы пад сцягам аднаўлення незалежнасці, правядзення Рэччу Паспалітай самастойнай палітыкі, вяршэнства каталіцкай веры. На тэрыторыі Беларусі, як і ў Польшчы, канфедэраты ўжывалі партызанскія сродкі барацьбы. Найбольш буйныя бітвы канфедэратаў Вялікага Княства Літоўскага з расійскімі войскамі адбыліся ў 1769 г. пад в.Арэхава, у 1771 г. пад в.Бездзеж і мястэчкам Сталовічы. Аднак сілы былі няроўныя і ў 1772 г. канфедэрацыя спыніла сваё існаванне.

Знясіленая анархіяй і чарговай грамадзянскай вайной Рэч Паспалітая стала ахвярай больш моцных абсалютных манархій суседніх дзяржаў — Расіі, Прусіі і Аўстрыі. 5 жніўня 1772 г. у Пецярбургу быў падпісаны трохбаковы трактат, згодна з якім адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай. Прусія і Аўстрыя атрымалі частку польскіх і ўкраінскіх зямель, Расія — 92 тыс. км^2 усходнебеларускіх зямель з 1,3 млн насельніцтва. У абставінах фактычнай акупацыі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага замежнымі войскамі сейм у 1773 г. вымушана пагадзіўся з захопамі. На пачатку яго дзейнасці мужную апазіцыю акупантам і іх памагатым з ліку падкупленай шляхты і магнацтва на сейме склалі літвінскія паслы на чале з Т.Рэйтанам, С.Багушэвічам і С.Корсакам.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай прагрэсіўныя колы грамадства яшчэ больш пераканаліся, што выратаваць краіну змогуць толькі змены ў яе палітычным ладзе. З 1773 г. усе вальныя сеймы, каб пазбегнуць ужывання права "liberum veto", пачыналі сваю працу з абвяшчэння сябе канфедэрацкімі (гэта давала магчымасць прымаць рашэнні большасцю галасоў). У 1773 г. пасля ліквідацыі ордэна езуітаў у Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім было ўтворана першае ў Еўропе міністэрства асветы — Адукацыйная камісія. На сейме 1775 г. Рэч Паспалітая ўпершыню займела дакладна дзеючы орган выканаўчай улады — Пастаянную Раду на чале з каралём і вялікім князем. Фактычна ж дзейнасць Рады кантралявалася расійскімі пасламі ў Варшаве. Галоўны ідэал рэфарматараў эпохі Асветніцтва — утварэнне дзяржавы з дзейснай бюракратыяй на месцах і моцнай цэнтральнай уладай на чале з манархам-асветнікам — не быў здзейснены.

У канцы 80-х гадоў XVIII ст. склаліся больш спрыяльныя ўмовы для другога этапу дзейнасці рэфарматараў. Гэтаму не ў апошнюю чаргу садзейнічалі спрыяльныя зме-

ны ў міжнародным становішчы (расійска-шведская 1788 – 1790 гг., расійска-турэцкая 1787 – 1791 гг. войны, супярэчнасці паміж дзяржавамі, якія дзялілі Рэч Паспалітую).

Партыя рэфарматараў змагла згуртавацца падчас працы Вялікага сейма (1788 – 1792) і пачала дзейнасць па ўдасканаленню дзяржавы. На дзейнасць рэфарматараў вялікі ўплыў аказала буржуазная рэвалюцыя ў Францыі 1789 г. Зруйнаванне Бастыліі – сімвала ненавіснага народу феадальнага рэжыму – распачало пераможнае шэсце па краінах Еўропы ідэй дэмакратыі.

Праца сейма адбывалася на фоне росту палітычнай актыўнасці гарадоў, якія патрабавалі ўдзелу ў кіраванні дзяржавай. 18 красавіка 1791 г. сейм прыняў закон аб "вольных гарадах каралеўскіх", якія нарэшце атрымалі магчымасць свабоднага развіцця, не абцяжаранага феадальным правам. Першым крокам у вызваленні Рэчы Паспалітай ад пратэктарату Расіі сталі рашэнне аб павелічэнні войска да 100 тыс. чалавек і ліквідацыя скампраметаванай Пастаяннай Рады. Было ўведзена падаткаабкладанне святарства і шляхты. Спадзеючыся на дапамогу ў рэфармаванні краіны, Рэч Паспалітая ў 1790 г. заключыла вайсковы саюз з Прусіяй.

Вяршыняй дзейнасці Вялікага сейма з'явілася прыняцце 3 мая 1791 г. першай у Еўропе (другой у свеце пасля ЗША) Канстытуцыі. Згодна з ёю адмяняліся права "liberum veto", выбары караля шляхтай і абавязковасць сеймікавых "інструкцый" для паслоў, уводзілася спадчынная манархія, у якой выканаўчая ўлада перадавалася каралю і ўраду, падпарадкаванаму сейму. Канстытуцыя 3 мая абвясціла таксама, што бярэ "пад апякунства ўрада" сялян.

Каб урэгуляваць рэлігійнае пытанне і пазбавіць Расію падстаў для ўмяшання ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай, сейм ухваліў рашэнне аб утварэнні ў Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім самастойнай праваслаўнай іерархіі, падпарадкаванай канстанцінопальскаму патрыярху.

Аб'ектыўна Канстытуцыя 3 мая спрыяла развіццю краіны ў прагрэсіўным буржуазным накірунку.

Канстытуцыя 1791 г. зрабіла рашучы крок да ўтварэння цэнтралізаванай дзяржавы (адзінае войска, адзіны скарб і г.д.). Самастойнасць Вялікага Княства Літоўскага ў ёй была значна абмежаваная.

Рашэнні сейма выклікалі пратэсты часткі магнатаў і шляхты. Баючыся распаўсюджвання ідэй французскай рэвалюцыі з яе ідэаламі роўнасці, волі і братэрства, Кацярына II накіравала свае войскі ў Рэч Паспалітую. 18 мая 1792 г.

трыццаціпяцітысячны корпус генерала Крачэтнікава ўвайшоў на Беларусь. Перад гэтым праціўнікі Канстытуцыі 3 мая абвясцілі на Украіне аб утварэнні антырэфарматарскай Таргавіцкай канфедэрацыі з мэтай вяртання "паўнаты правоў шляхецкіх". Войска Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага не змагло аказаць дзейснага супраціўлення акупантам. Кароль Станіслаў Аўгуст вымушаны быў далучыцца да канфедэрацыі.

Расія і Прусія цяпер ужо ў апраўданне барацьбы з "якабінскай заразай" дамовіліся 23 студзеня 1793 г. аб чарговым падзеле тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Прусія захапіла Велікапольшчу з Торунем і Гданьскам. Расіі дасталася большая частка Беларусі і Украіны прыблізна па лініі Друя – Пінск – Збруч з тэрыторыяй у 250 тыс. км^2 і 4 млн насельніцтва. Астатняя частка тэрыторыі Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага была акупіравана расійскімі войскамі. Пад пагрозай прымянення вайсковай сілы Гарадзенскі сейм (1793) зацвердзіў чарговы ганебны падзел дзяржавы. Гэты сейм у асноўным аднавіў парадкі, якія былі ў Рэчы Паспалітай падчас існавання Пастаяннай Рады.

Правядзенне рэформ у чарговы раз было перарвана. Было зразумела, што сквапныя суседзі не спыняцца на дасягнутым. Каб абараніць гонар зганьбаванай дзяржавы, патрыёты Польшчы і Вялікага Княства ўзнялі паўстанне супраць Расійскай імперыі.

Кіраўніком паўстання быў абраны нашчадак старажытнага беларускага шляхецкага роду, змагар за незалежнасць ЗША Андрэй Тадэвуш Касцюшка. У Польшчы паўстанне пачалося 24 сакавіка 1794 г. Праз месяц, 24 красавіка, пасля вызвалення Вільні паўстанне ахапіла Літву і Заходнюю Беларусь. Тут яго ўзначаліў палкоўнік Якуб Ясінскі. Галоўнымі мэтамі паўстання былі вяртанне захопленых тэрыторый, выгнанне акупантаў, працяг дэмакратычных рэформ. Віленскія "якабінцы" на чале з Я.Ясінскім напачатку выступілі з больш радыкальнымі патрабаваннямі, чым іх паплечнікі ў Польшчы, – "воля, роўнасць, незалежнасць" і адразу салідарызаваліся з рэвалюцыйнай Францыяй. Быў утвораны самастойны орган кіраўніцтва паўстаннем – Найвышэйшая Рада Вялікага Княства Літоўскага.

Паўстанне зрабіла спробу аб'яднаць інтарэсы перадавой часткі шляхецтва, сялянства і гарадскога насельніцтва. Мэтай паўстанцаў была таксама дапамога ў вызваленні ад "ярма дэспатызму" народаў суседніх краін. Т.Касцюшка заклікаў да ўдзелу ў паўстанні прадстаўнікоў усіх веравыз-

нанняў. Ён паабяцаў ім поўную роўнасць і самастойнасць. Паланецкім універсалам (7 мая 1794 г.) Т.Касцюшка адмяніў асабістую залежнасць сялян. Сяляне, якія пайшлі ў паўстанне (касінеры), вызваляліся ад прыгону.

За кароткі тэрмін (з красавіка па верасень) на Беларусі ў паўстанні ўзяло ўдзел да 25 тыс. чалавек. Найбольш буйныя бітвы беларускіх касцюшкаўцаў адбыліся пад в.Паляны (7 мая), в.Солы (25 чэрвеня), Слонімам (4 жніўня), Любанню (4 верасня), в.Крупчыцы (17 верасня).

Але паўстанцкае войска не змагло супрацьстаяць аб'яднаным сілам Прусіі, Расіі і Аўстрыі. Кацярына II накіравала на барацьбу з паўстанцамі лепшых сваіх военачальнікаў разам з А.Суворавым. У лістападзе паўстанне было задушана. Менавіта за актыўны ўдзел у задушэнні паўстання А.Суворaў атрымаў званне фельдмаршала.

Яшчэ падчас паўстання ўзнік план ліквідацыі Рэчы Паспалітай. У 1795 г. адбыўся трэці яе падзел. Прусія захапіла польскія землі з Варшавай, Аўстрыя — з Кракавам. Да Расіі адышлі заходнебеларускія, украінскія і літоўскія землі з Курляндыяй. Частка Беларусі (захад Гарадзеншчыны) апынулася пад уладай Прусіі (да 1807 г.).

Захоп Рэчы Паспалітай з'явіўся гвалтоўным актам у дачыненні да дзяржавы, якая ўступала ў перыяд свайго гаспадарчага і грамадскага рэфармавання.

6. Культура Беларусі другой паловы XVII — XVIII ст.

Пасля войнаў сярэдзіны XVII ст. рэзка ўзмацнілася паланізацыя і каталізацыя ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай. Беларуская мова паступова выцяснялася з дзяржаўнага справаводства і афіцыйнага ўжытку. Гэта тэндэнцыя знайшла завяршэнне ў сеймавых пастановах 1696 — 1697 гг., паводле якіх паслы Вялікага Княства Літоўскага пагаджаліся: "У справах і пасольствах Рэчы Паспалітай мы, згодна з даўнімі законамі, не будзем карыстацца сваёй пакаёвай пячаткай або сыгнетам і абяцаем выдаваць усе лісты, справы і публічныя легацыі толькі на мове польскай і лацінскай, а не іншай". Узмацніўся ўціск у дачыненні да праваслаўных і пратэстантаў. У 1658 г. сейм Рэчы Паспалітай прыняў пастанову аб выгнанні арыян, а ў 1668 г. забараніў пераходзіць з каталіцтва ў іншыя веравызнанні. Праваслаўным шляхце, святарам і мяшчанам быў забаро-

нены доступ у дзяржаўныя органы ўлады і самакіравання. Паблажлівыя адносіны да уніяцкай царквы змяніліся на больш нецярпімыя, бо уніяты не здзейснілі ўсіх планаў ідэолагаў Брэсцкай уніі па распаўсюджванню каталіцкіх і польскіх культурных уплываў на Беларусь.

Інтэлектуальнае жыццё ў другой палове XVII — пачатку XVIII ст. характарызавалася адыходам назад. Забываліся здабыткі часоў эпохі Адраджэння і Рэфармацыі, зноў набылі папулярнасць ідэі часоў сярэднявечча. Гэта, а таксама схаластыка, фанатызм, нецярпімасць сталі вызначальнымі прынцыпамі перыяду контррэфармацыі. Умовы развіцця культуры Беларусі ў XVII — XVIII стст. вызначылі яе спецыфічную рысу — полілінгвістычны характар. З-за неспрыяльнай сітуацыі беларускамоўнай была пераважна народная культура — культура сялянства, гарадскіх нізоў, часткі шляхты і святарства. Многія ўраджэнцы Беларусі пісалі на лацінскай, польскай, часта на нямецкай і французскай мовах, але іх творы, пазіцыя аўтара заставаліся духоўна блізкімі да мясцовых вытокаў.

Вядучым мастацкім напрамкам у другой палове XVII — сярэдзіне XVIII ст. было пышнае і вытанчанае барока. Узнікла яно на аснове традыцый позняга Адраджэння і Рэфармацыі ў канцы XVII ст. у Італіі. На месца "сціплага" ў аздабленні, без вычварных упрыгожванняў мастацтва Рэфармацыі прыйшло пампезнае барока. Яно знайшло адбітак перш за ўсё ў развіцці архітэктуры і выяўленчых жанраў культуры. Эстэтыка гэтага стылю — крок наперад у параўнанні з папярэднім перыядам. Аднак у сферы ідэалагічнай і грамадска-палітычнага жыцця барока суправаджалася адыходам да схаластыкі і дагматызму часоў сярэднявечча. Асноўныя яго мастацкія прынцыпы — дынамічнасць кампазіцыі, кантрасты маштабаў, рытмаў, святлоценявыя і колеравыя эфекты, крывалінейнасць абрысаў, імкненне стварыць ілюзію бязмежнай прасторы. Эфектнасць барока была выкарыстана контррэфарматарамі ў сваіх мэтах для эмацыянальнага ўздзеяння на пачуцці чалавека і дэманстрацыі марнасці чалавечага жыцця перад вечным, велічным. Матэрыяльнай базай для станаўлення стылю з'явілася архітэктура. Тут барока знайшло найбольш поўную выяву. Пачатак гэтай плыні ў Беларусі звязаны з будаўніцтвам першага ў Рэчы Паспалітай помніка архітэктуры барока — касцёла езуітаў у Нясвіжы, што адбылося ў 1584 — 1593 гг. па праекту Я.М.Бернардоні.

На другую палову XVIII ст. прыходзіцца рас-

паўсюджванне ідэй Асветніцтва на Беларусі. Яны прыйшлі з Еўропы і іх з'яўленню спрыялі навуковыя адкрыцці ў прыродазнаўстве і дасягненні ў галіне гуманітарных ведаў. Ім уласціва прызнанне прыярытэту асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Ідэі Асветніцтва знайшлі адлюстраванне ў філасофіі, сацыялогіі, літаратуры і мастацтве. Для перыяду Асветніцтва характэрна суіснаванне шэрагу культурных стыляў — барока, класіцызму, сентыменталізму, ракако. Аднак характар эпохі вызначаў перш за ўсё класіцызм. Сутнасць яго выявілася ў кананізацыі антычнай класікі як дасканалага ўзору для наследавання нарматыўнасці эстэтычных крытэрыяў. Грунтаваўся ён на традыцыях Адраджэння і разам з тым сінтэзаваў у пераўтворанай форме дасягненні прасвятлення яму барока, якое папярэднічала і часткова суіснавала з новым напрамкам. На станаўленне беларускага Асветніцтва істотна паўплывала французская філасофская і эстэтычная думка. У сярэдзіне XVIII ст. на Беларусь пачалі пранікаць навукова-філасофскія ідэі французскіх энцыклапедыстаў, а таксама Д.Лока, Ф.Бэкана, Д.Юма, Р.Дэкарта. Іх творы карысталіся папулярнасцю, значыліся ў каталогах розных бібліятэк. Асаблівую цікавасць выклікала творчасць Вальтэра. Аднак развіццё асветніцкай думкі на Беларусі было абумоўлена пераважна патрэбамі мясцовага жыцця — развіццём эканомікі і грамадска-палітычнай сітуацыяй.

У перыяд контррэфармацыі школьная адукацыя канцэнтравалася ў асноўным у руках розных манаскіх ордэнаў. Большасць школ належала езуітам, асветніцкія ўстановы адчынялі таксама базыльяне, піяры і дамініканцы. Да пачатку XVIII ст. была спынена дзейнасць усіх брацкіх і пратэстанцкіх школ. Езуіцкія калегіумы і ніжэйшыя школы існавалі ў Полацку, Нясвіжы, Оршы, Бабруйску, Бярэсці, Менску, Пінску, Віцебску і інш. Выкладанне вялося на лацінскай мове, традыцыйнымі прадметамі для навучання з'яўляліся граматыка, рыторыка, дыялектыка, арыфметыка, геаметрыя, музыка і астраномія. Цэнтрам адукацыі і навукі для Беларусі была Віленская езуіцкая акадэмія, якая мела статус універсітэта. Акадэмія славілася ва Усходняй Еўропе талентам і вучонасцю шэрагу сваіх выкладчыкаў і выпускнікоў. Адным з найбольш вядомых прафесараў Віленскай акадэміі быў Мацей Сарбеўскі (1595 — 1640), які лічыўся адным з галоўных тэарэтыкаў барока ў Еўропе. Высокім узроўнем адукацыі славілася таксама

Полацкая езуіцкая калегія, прычым езуіты бралі для выхавання не толькі прадстаўнікоў каталіцкага веравызнання і шляхецкага стану. Пры калегіі былі музей, карцінная галерэя, бібліятэка, друкарня, тэатр, які ставіў з удзелам хору і балета п'есы на гістарычную, біблейскую тэматыку.

Школы, арганізаваныя уніяцкім ордэнам базыльянаў, працавалі ў асноўным па ўзору езуіцкіх. У арганізацыі адукацыі базыльяне вылучаліся найперш тым, што настаўнікі выкладалі на роднай для вучняў школ мове. Шырокую вядомасць мела Слуцкая гімназія. Яна была заснавана Янушам Радзівілам як кальвінісцкая школа. Слуцкая навучальная ўстанова вылучалася цярпімасцю ў справах рэлігіі, павагай да асобы вучня.

У другой палове XVIII ст. адбылося паступовае абнаўленне сістэмы адукацыі ў Рэчы Паспалітай. Гэта было звязана са зменамі ў эканамічным жыцці грамадства, з развіццём навукі. У 1773 г. была створана камісія па нацыянальнай адукацыі. Яе стараннямі школа набыла свецкую накіраванасць. Агульнае кіраўніцтва справай асветы ад духавенства перадавалася дзяржаўным органам. У школьнай адукацыі большае месца сталі займаць прадметы прыродазнаўчага цыкла. Больш чым за 20 гадоў сваёй дзейнасці Адукацыйная камісія заснавала шэраг школ. Асаблівую цікавасць выклікаюць закладзеныя ў Гародні і Паставах мецэнатам А.Тызенгаўзам шматлікія прафесіянальныя ўстановы. У 70-я гады XVIII ст. ён арганізаваў першыя ў Рэчы Паспалітай медыцынскую, ветэрынарную, акушэрскую, чарчэння і малявання, фінансавых кантралёраў, мастацка-тэатральную школы. У іх вучыліся пераважна дзеці беларускіх прыгонных сялян.

Асаблівасць развіцця грамадска-палітычнай думкі Беларусі ў перыяд панавання схаластыкі выявілася ў тым, што новыя філасофскія і навуковыя ідэі тут узнікалі галоўным чынам у нетрах самой схаластыкі, а не па-за яе межамі, як гэта было ў заходнееўрапейскіх краінах. Найбольш вядомымі схаластамі таго часу былі В.Тылкоўскі, А.Кміціц, А.Кярсніцкі і інш. Аднак панаванне схаластыкі не было непадзельным. Шырокую вядомасць атрымалі атэістычныя погляды Казіміра Лышчынскага (1634 – 1689). Пакінуўшы ордэн езуітаў, ён напісаў трактат "Аб неіснаванні Бога", дзе сцвярджаў, што Бог не існуе, а з'яўляецца толькі хімерай, народжанай фантазіяй людзей. Каталіцкае духавенства жорстка расправілася з беларускім вальнадумцам. У 1689 г. К.Лышчынскі быў спалены на вогнішчы.

Развіццё навуковых уяўленняў у Беларусі таго часу было абмежавана рамкамі навучальных школьных дысцыплін. Магчымасці для развіцця новага эксперыментальнага прыродазнаўства былі вельмі абмежаваныя. Навука развівалася дзякуючы працы і падзвіжніцтву геніяльных вучоных-адзіночак. Сярод іх — Казімір Семяновіч, які выдаў у 1650 г. у Амстэрдаме кнігу "Вялікае мастацтва артылерыі", што пазней шмат разоў перавыдавалася. Ён першым у сусветнай навуцы стварыў праект шматступеневай ракеты.

Пашырэнню навуковых ведаў спрыяла кнігавыдавецкая, асветніцкая дзейнасць ураджэнца Беларусі Іллі Капіевіча (1651 —1714). Ён зведаў ганенні, жыў у Аўстэрдаме, пазней Пятром I быў запрошаны на працу ў Маскву. Там Ілля Капіевіч выдаў больш за 20 падручнікаў па граматыцы, рыторыцы і інш. Ён быў першым у гэтай справе ў Расіі. З дапамогай яго кніг рускія людзі змаглі пазнаёміцца са здабыткамі, багаццем еўрапейскай навукі і культуры.

У другой палове XIII ст. адбываецца працэс паступовага вызвалення філасофіі і прыродазнаўства ад сярэдневяковай тэалогіі і схаластыкі. Пра гэта сведчыць творчасць вядомых мысліцеляў Казіміра Нарбута (1738 — 1807), Бенядзікта Дабшэвіча (1722 — ?), Анёла Доўгірда (1776 — 1835). Цікавую спадчыну пакінуў астраном і асветнік Марцін Пачобут-Адляніцкі (1728 —1810). Ён стаў адным з арганізатараў і дырэктарам Віленскай абсерваторыі. За заслугі ў прыродазнаўстве М.Пачобут-Адляніцкі выбіраўся членам-карэспандэнтам Парыжскай акадэміі навук і Лонданскага астранамічнага таварыства. Доўгі час ён працаваў рэктарам рэарганізаванай у Галоўную школу Вялікага Княства Літоўскага Віленскай езуіцкай акадэміі. Шэраг трактатаў на беларускай, польскай і лацінскай мовах па філасофіі, эканоміцы, эстэтыцы належыць вядомаму асветніку і мецэнату, апошняму канцлеру Вялікага Княства Літоўскага Іаахіму Храптовічу (1728 —1812). Шырокую вядомасць мела яго бібліятэка ў Шчорсах. Імя беларускага асветніка добра ведалі ў еўрапейскіх краінах. Адзін з дзеячаў Вялікай французскай буржуазнай рэвалюцыі А.Мірабо пісаў пра І.Храптовіча: "Я не ведаў лепшага эканаміста ў галіне практыкі як па сумленню свайго розуму, так і па дабраце сэрца". Прызнаным спецыялістам у галіне батанікі і заалогіі быў Станіслаў Юндзіл (1761 — 1847). Ён стаў адным з першых даследчыкаў расліннасці Бела-

русі, напісаў кнігу "Апісанне раслін у правінцыі Вялікага Княства Літоўскага" (1791).

На тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII ст. папулярнымі былі ідэі фізіякратаў, якія адстойвалі тэзіс аб натуральнай роўнасці людзей і крытыкавалі прыгоннае права. Іх прыхільнікамі былі І.Храптовіч, І.Стрыйкоўскі, М.Карповіч і інш. Шырокую вядомасць меў філосаф і царкоўны дзеяч Георгій Каніскі (1717 – 1795), які высока цаніў прыродазнаўчыя навукі і іх ролю ў пазнанні прыроды. Папярэднікам матэматычнай логікі, адным з першых інтэрпрэтатараў філасофскай сістэмы І.Канта быў С.Майман (1753 – 1800). Яго ведалі і высока цанілі І.В.Гётэ і Ф.Шылер. Знаёмства з многімі французскімі асветнікамі меў Антоній Тызенгаўз (1738 – 1785). Гродзенскі мецэнат прапанаваў нават Ж.-Ж.Русо пераехаць у Беларусь, абяцаў яму пабудаваць у Белавежскай пушчы ідылічную хатку.

Тагачасная беларуская літаратура знаходзілася на этапе пераходу ад сярэдневяковых ідэй і мастацкіх форм да ідэй і форм новага часу. Адміралі жанры летапісання, палемічнай і жыційнай прозы, панегірычнае вершаскладанне, нараджаліся песенна-інтымная лірыка, гумарыстычная і парадыйна-сатырычная паэзія, інтэрмедыя і інш.

Літаратура другой паловы XVII – сярэдзіны XVIII ст. развівалася пераважна пад уплывам еўрапейскага барока. Для прыгожага пісьменства гэтага часу характэрны розныя ідэйныя і стылявыя тэндэнцыі, розныя "шцілі" – высокі, які адпавядаў запатрабаванням эліты грамадства, сярэдні з арыентацыяй на густы сярэдняй і дробнай шляхты, гараджан і нізкі – народны. Паміж гэтымі трыма "пластамі" ішло бесперапыннае ўзаемадзеянне, узаемапранікненне ідэй і мастацкіх форм. Аднымі з найбольш значных прадстаўнікоў беларускай літаратуры з'яўляліся Сімяон Полацкі (1629 – 1680) і Андрэй (Ян) Белабоцкі . Істотная частка іх творчага шляху была звязана з Масквой. Менавіта з іх дзейнасці пачынаецца станаўленне рускай сілабічнай паэзіі і распаўсюджванне ідэй барока ў духоўным жыцці. С.Полацкі стварыў рукапісныя зборнікі "Вертоград многоцветный", "Рифмологион", пісаў на беларускай, лацінскай, польскай і стараславянскай мовах. Асноўны мастацкі твор А.Белабоцкага – "Пентатэугум" ("Пяцікніжжа"). Абодва пісьменнікі займаліся педагагічнай дзейнасцю. С.Полацкі быў выхавацелям царскіх дзяцей, таксама заснаваў друкарню ў Крамлі і Славяна-грэка-лацінскую акадэмію. На станаўленне беларускай літаратуры перыяду барока ў немалой

ступені паўплывала вусная народная творчасць. Ва ўмовах узмацнення сацыяльнай напружанасці ў гарадах і вёсках з'явіліся фальклорныя творы з акрэсленай антыпрыгонніцкай накіраванасцю. У гэты перыяд узнік цыкл казак аб асілках, у якіх традыцыйны вобраз волата чароўнай казкі саступае месца вобразу народнага заступніка. Далейшае развіццё атрымала сацыяльна-бытавая казка.

Літаратурнае жыццё Беларусі другой паловы XVIII ст. вызначалася яшчэ большым полілінгвізмам, чым у папярэднюю эпоху. Гэта ж заўвага датычыцца і яго мастацка-стылявога аблічча. Аднак класіцызм, які панаваў у перыяд Асветніцтва, асобнага этапу ў развіцці беларускай літаратуры не склаў. З-за існаваўшых у XVIII ст. культурна-палітычных абставін многія выхадцы з Беларусі пакінулі след у гісторыі прыгожага пісьменства суседніх народаў. Сярод іх Ю.Нямцэвіч, А.Нарушэвіч, Ф.Князьнін, Ф.Багамолец — пісьменнікі, якія занялі вядучае месца ў росквіце польскай літаратуры.

Тэатральнае жыццё Беларусі на мяжы XVII — XVIII стст. было прадстаўлена школьным тэатрам і народным лялечным — батлейкай. Дзейнічалі тэатры перш за ўсё пры езуіцкіх навучальных установах. У іх рэпертуарах пераважалі пастаноўкі на польскай і лацінскай мовах. Спектакль уяўляў сабой пышнае відовішча з музыкай, песнямі, танцамі, паміж дзеямі выконваліся інтэрмедыі, хоры, балеты. Сярод батлеечнікаў папулярнымі былі народныя драмы "Цар Ірад" і "Цар Максімільян".

У другой палове XVIII ст. на Беларусі адбываецца станаўленне прафесійнага тэатра. Пры гэтым пераважалі прыватнаўласніцкія тэатры. Яны былі блізкія па свайму прафесійнаму ўзроўню да сталічных. Рэпертуар гэтых тэатраў адлюстроўваў часцей агульнаеўрапейскую тэматыку. Магнаты актыўна запрашалі на прыдворную сцэну замежных артыстаў і музыкантаў і нават цэлыя тэатральныя трупы з Італіі, Аўстрыі, Францыі. Многія замежныя майстры пазней станавіліся выхавацелямі, настаўнікамі мясцовых прыгонных акцёраў. У Беларусі асабліва высокім быў прафесійны ўзровень у прыгонных тэатрах і капэлах Нясвіжа, Слуцка, Шклова, Гродна, Ружан, Слоніма, Магілёва. Пра высокую прафесійную падрыхтоўку беларускіх акцёраў сведчыць тое, што калектывы танцораў Слоніма і Гродна сталі пазней асновай вядомага ў Еўропе каралеўскага балета ў Варшаве, танцоры Шклова і музы-

канты з Горы-Горак праславіліся на сцэне санкт-пецярбургскіх тэатраў.

Адным з першых быў нясвіжскі тэатр, заснаваны Ф.У.Радзівіл. Для яго было пабудавана спецыяльнае памяшканне, заснаваны балетная, тэатральная школы, пазней — музычная. Адначасова з нясвіжскім працаваў слуцкі тэатр. Яго ўладальнікам быў Геранім Радзівіл, але пасля смерці мецэната тэатр аб'ядналі з нясвіжскім.

Значны цэнтр тэатральнага і музычнага жыцця быў створаны ў Слоніме Міхалам Казімірам Агінскім. У яго палацы існавала канцэртная зала, якая не ўступала славутай мангеймскай. Акрамя таго, дзейнічаў "плавальны тэатр", які перамяшчаўся па каналу і р.Шчары. У 1780 г. было пабудавана спецыяльнае памяшканне для тэатра. Пры ім існавала школа. Тут працавалі інструментальны аркестр, оперны ансамбль. М.К.Агінскі сам быў адораным чалавекам. Ён з'яўляўся аўтарам некалькіх опер на ўласныя лібрэта. Слонімскі тэатр выязджаў на гастролі ў Варшаву, меў некалькі труп, у тым ліку балет і драматычны калектыў. Слонімскі аркестр быў адным з найбольшых у тагачаснай Еўропе.

У мураваным дойлідстве яскрава выявіліся асаблівасці барока. У гарадах і вёсках будаваліся пампезныя касцёлы, кляштары, магнацкія рэзідэнцыі. Да такіх пабудоў адносяцца бернардынскі, брыгідскі і езуіцкі касцёлы ў Гродне, францысканскі касцёл і кляштар у Пінску і інш. Рысы барока прысутнічалі таксама ў манеры пабудовы і аздаблення праваслаўных і уніяцкіх храмаў. Гэта датычыцца Мікалаеўскай царквы ў Магілёве, базыльянскай царквы і іканастаса ў Супраслі, манастырскага комплексу ў Жыровіцах. Еўрапейскія ўплывы барока тут перапляталіся з мясцовымі і візантыйскімі традыцыямі, што надало непаўторны каларыт помнікам. З цягам часу барока пранікла ў свецкае дойлідства, жыллёвае будаўніцтва. Характэрны помнік у гэтым стылі — дом на рынку ў Нясвіжы (1721).

Станаўленне класіцызму ў архітэктуры Беларусі адносіцца да 1770 — 1790-х гадоў і супадае з часам далучэння да Расійскай імперыі. Асновай для пранікнення рысаў класіцызму ў архітэктуру стала дзейнасць па перапланіроўцы ўсходнебеларускіх гарадоў. Планы іх пабудовы і кварталы набылі геаметрычныя абрысы, у якасці кампазіцыйных восей вылучаліся галоўныя вуліцы і гарадскія плошчы. У Цэнтральнай і Заходняй Беларусі класіцызм не меў значнага развіцця.

У другой палове XVII — XVIII ст. працягваўся ўздым у беларускім іканапісе. Узбагацілася вобразная мова і жывапісная манера іканапісцаў. У іх творы пранікаюць рысы рэалістычнасці. Вядучае месца ў свецкім жывапісе па-ранейшаму займаў партрэт. У тагачасным беларускім мастацтве склалася некалькі яго тыпаў: парадны, рэпрэзентатыўны партрэт; тып так званага рыцарскага, ці "сармацкага", з характэрнай для яго падкрэсленай напышлівасцю героя карціны; трунны, ці пахавальны, партрэт — абавязковы атрыбут пахавальнага рытуалу ў прывілеяванага саслоўя.

На ўзроўні лепшых еўрапейскіх узораў развівалася кніжная графіка. Найбольш высокі мастацкі ўзровень афармлення і ілюстравання кніг дэманстравалі супрасльская і магілёўская друкарні. Іх выданні вылучаліся імпазантнасцю, своеасаблівай манументальнасцю, багаццем дэкору. Асновы магілёўскай гравёрнай школы былі закладзены Максімам і Васілём Вашчанкамі. Знакамітымі сталі таксама дрэварыты Фёдара Англійскі. Вядомымі майстрамі станковай гравюры былі Аляксандр і Лявонцій Тарасевічы.

Шырокую вядомасць па-за межамі Беларусі атрымала майстэрства мясцовых разьбяроў. З Масквы ў Вялікае Княства Літоўскае пасылалі ганцоў для падбору разьбяроў, цаніннікаў, збройнікаў, "залатых і срэбраных спраў майстроў" для работы пры царскім двары. Славу і прызнанне беларускім майстрам прынесла будаўніцтва Каломенскага палаца. Пад кіраўніцтвам старца Арсенія і Кліма Міхайлава імі былі выкананы ўсе разьбяныя работы па вонкаваму і ўнутранаму ўбранню палаца. Беларускія майстры стварылі шэраг высокамастацкіх іканастасаў для Данскога, Сімяонаўскага, Нова-Іерусалімскага, Валдайска-Іверскага, Свенскага і Новадзявочага манастыроў. Імі ж упрыгожаны многія саборы, памяшканні маскоўскага Крамля. Беларускія майстры прынеслі ў Расійскую дзяржаву таксама тэхніку вытворчасці паліхромнай ("цаніннай") кафлі, з якой яны выраблялі складаныя архітэктурныя дэталі, што дазваляла надаваць будынкам разнастайны паліхромны дэкор.

Такім чынам, нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, XVII — XVIII стст. сталі перыядам значнага і разнастайнага развіцця культуры Беларусі, прычым беларускае барока выканала гістарычную ролю культурнага моста паміж захадам і ўсходам Еўропы.

РАЗДЗЕЛ 6

БЕЛАРУСЬ У КАНЦЫ XVIII — СЯРЭДЗІНЕ XIX ст.

1. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі

Пасля ўключэння беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі царскі ўрад праводзіў тут цэнтралісцкую аб'яднаўную палітыку, маючы канчатковай мэтай іх зліццё з асноўнымі рускімі рэгіёнамі. З канца XVIII і да пачатку XX ст. у залежнасці ад абставін мяняліся толькі тактыка, тэмпы і метады ажыццяўлення гэтай палітыкі.

На тэрыторыю Беларусі былі распаўсюджаны агульнарасійскія адміністрацыйныя органы і ўстановы. У краі пачалі дзейнічаць намесніцкія, а пасля губернскія ўпраўленні, царскія судовыя органы і інш. У пачатку XIX ст. далучаныя ад Рэчы Паспалітай беларускія землі з больш чым трохмільённым насельніцтвам увайшлі ў склад Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў. Паводле Тыльзіцкага міру 1807 г. паміж Францыяй і Расіяй, да апошняй адышла Беласточчына, уключаная з 1843 г. у Гродзенскую губерню. У палітычных адносінах Беларусь была падзелена на два генерал-губернатарствы: Літоўскае (Віленская, Гродзенская і Мінская губерні) і Беларускае (Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні). Царскі ўрад, які быў вымушаны лічыцца з істотнымі адметнасцямі дзяржаўна-прававога становішча далучаных зямель, у якасці асноўнага заканадаўчага кодэкса пакідаў для іх Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Мясцовыя жыхары мелі мажлівасць займаць другарадныя пасады ў губернска-павятовай адміністрацыі. Што датычыцца тых чыноўніцкіх крэслаў, уладальнікі якіх удзельнічалі ў выпрацоўцы і рэалізацыі палітычнай лініі ўрада, то ў іх траплялі, за рэдкім выключэннем, толькі прадстаўнікі імперскага цэнтра.

У сваёй саслоўнай палітыцы ўрад імкнуўся перш за ўсё задобрыць шляхту. Для гэтага ёй даваліся правы расійскага дваранства. За шляхтай захоўваліся, пры ўмове прынясення прысягі на вернасць Расіі, маёнткі з сялянамі. Каб не дапусціць распаўсюджвання ідэй французскай буржуазнай рэвалюцыі, стварыць сабе апору ў захопленым краі і задаволіць жаданні расійскага дваранства і чыноўніцтва, царызм праводзіў на Беларусі палітыку насаджэння рускага землеўладання, пашырэння памешчыцкага сектара наогул. Пры-

ватнай маёмасцю расійскіх землеўласнікаў станавіліся сяляне былых каралеўскіх эканомій і старостваў, канфіскаваных маёнткаў свецкіх і царкоўных феадалаў, якія эмігравалі за мяжу ці выступілі супраць новай улады. Усяго на тэрыторыі Беларусі Кацярына II і Павел I падаравалі ў прыватнае спадчыннае ўладанне больш за 200 тыс. рэвізскіх (мужчынскіх) душ. Пашыраючы памешчыцкае землеўладанне за кошт дзяржаўных маёнткаў, царызм непазбежна асуджаў сялян на пагаршэнне іх прававога і маёмаснага стану. Новыя ўладальнікі маглі іх прадаць, перасяліць у іншае месца, сяляне ж не мелі права скардзіцца на паноў, уласнасць іх не была абароненая. Прыгонніцтва на Беларусі ўзмацнялася і пашыралася з прычыны запісу за землеўласнікамі часткі былых прывілеяваных і адносна свабодных катэгорый сельскага насельніцтва (зямянаў, выбранцаў, панцырных баяр, "вольных" людзей і інш.).

Беларускія сяляне, як і іншае падатковае насельніцтва, цікавілі ўлады Расійскай імперыі перш за ўсё як аб'екты феадальнай эксплуатацыі і папаўнення даходаў казны. З-за слабай плацежаздольнасці і неабходнасці паступовага прызвычайвання сялян да расійскай падатковай сістэмы ім некаторы час аказвалі ільготы ва ўплаце падушных грошай, пасля чаго насельніцтва беларускіх губерняў было падведзена пад агульны тып падатковага абкладання ва ўсёй імперыі. Але грашовая рэнта і дзяржаўныя падаткі збіраліся на Беларусі да 1811 г. не асігнацыямі, як гэта было ў рускіх губернях, а звонкай манетай, рэальны курс якой быў шмат вышэйшы. Акрамя штогадовага падушнага падатку, памер якога ў канцы XVIII ст. мог дасягаць аднаго рубля серабром, існавалі ў залежнасці ад мясцовых умоў земскія, "грамадскі" і "мірскі" зборы, натуральныя спагнанні (кватэрнае, фурманачнае, дарожнае). Уводзілася невядомая дасюль рэкруцкая павіннасць.

На Беларусі скасоўвалася магдэбургскае права, а на гарады, якія яго мелі, і мястэчкі, прызнаныя цэнтрамі паветаў, пашыраліся прынцыпы расійскага гарадскога самакіравання паводле даравальнай граматы гарадам 1785 г. Жыхары шэрагу мястэчак, якія такіх правоў не атрымалі, прыраўноўваліся да сялян і нават раздаваліся прыватным уладальнікам. Гэта выклікала іх упартую, праўда, без жаданых вынікаў, барацьбу за вяртанне мяшчанскага статуса. Для яўрэйскага насельніцтва, якое пражывала ў гарадах, указам 1794 г. вызначалася мяжа яўрэйскай аседласці, што ўключала беларускія і частку ўкраінскіх губерняў.

Каб дагадзіць мясцовым панам, у цэлым захоўвалася канфесіянальная сітуацыя, што склалася раней. Нават забаронены рымскім папам ордэн езуітаў знайшоў да 1820 г. прытулак на далучаных да Расіі землях Усходняй Беларусі. Афіцыйна каталіцкаму і уніяцкаму духавенству не дазвалялася схіляць у сваю веру праваслаўных. У барацьбе з паўстаннем Т.Касцюшкі Кацярына II палічыла патрэбным умацаваць пазіцыі праваслаўнай царквы на далучаных землях шляхам пераводу уніятаў у праваслаўе, аб чым быў выдадзены ўказ 22 красавіка 1794 г. Украінскія і беларускія уніяты сталі аб'ектам уціску з боку афіцыйных улад. Губернская адміністрацыя, паліцыя былі скіраваны на дапамогу праваслаўнаму духавенству. Колькасна вынікі "ўз'яднання" выглядалі даволі значнымі — у праваслаўе перайшло каля паўтара мільёна уніятаў, але "поспех" гэты быў больш фармальны. Афіцыйнае праваслаўе тады яшчэ не змагло давесці пачатую справу да канца, тым больш што імпэт урада да яе неўзабаве пасля падаўлення паўстання Т.Касцюшкі знік. Многія з "уз'яднаных" вярнуліся да уніі.

Далучэнне да імперыі ўключыла Беларусь у агульнарасійскую гаспадарчую сістэму, аказала ўплыў на развіццё ўсіх галін эканомікі, стала шмат у чым вызначаць напрамкі яе далейшай гаспадарчай спецыялізацыі. У хуткім часе былі створаны новыя мануфактуры (палатняныя, парусінавыя, канатныя, суконныя і інш.), заснавана суднаверф у Крычаве, дзе будаваліся лёгкія судны для Чарнаморскага флоту. Павялічваліся пасяўныя плошчы, пераважна пад тэхнічныя культуры. Збыт сельскагаспадарчых прадуктаў стымуляваўся адменай пошлін на іх продаж, ліквідаваліся ўнутраныя мытні. Пашыраліся гандлёвыя сувязі з рускімі і ўкраінскімі губернямі, павялічваўся вываз тавараў з Беларусі ў парты на Балтыцы, якія належалі Расіі.

Расійскімі ўладамі было арганізавана вывучэнне беларускага краю. Сюды пасылаліся навуковыя экспедыцыі (астранамічная на чале з І.Ісленьевым і фізічная на чале з І.Ляпёхіным), сенатарскія інспекцыі (місія Г.Р.Дзяржавіна). Беларусь таксама адкрывала для сябе Расію. У губернскіх і павятовых гарадах пачынаюць працаваць рускія школы, уводзіцца выкладанне геаграфіі і гісторыі Расіі, пашыраюцца рускія перыядычныя выданні. Пакуль гэта былі астраўкі ў моцна спаланізаванай сферы культуры, але яны паклалі пачатак будучай русіфікацыі краю. Царскі ўрад праводзіў палітыку адмаўлення самабытнасці і адмет-

насці беларускага народа. Прычым пры поўным патуранні апалячанаму панству ў канцы XVIII — першай чвэрці XIX ст. працэс паланізацыі працягваўся і нават узмацняўся. У гэтых цяжкіх варунках захавальнікам мовы і нацыянальна-культурных традыцый выступала пераважна сялянства. Але і сярод шляхты да канца не знікла повязь з роднай зямлёй, жыло, хоць часта і падсвядомае, пачуццё гістарычнай асобнасці, што праяўлялася ў так званым літвінскім патрыятызме.

Нягледзячы на лаяльныя адносіны царызму да пануючага саслоўя на Беларусі, у шляхты ўсё ж заставаліся прычыны для незадавальнення новай уладай, у першую чаргу з-за страты ўласнай дзяржаўнасці, памяць аб якой перадавалася з пакалення ў пакаленне, выклікаючы антырасійскія змовы і паўстанні.

Такім чынам, далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі канчаткова спыняла тут традыцыі сярэднявечнай дзяржаўнасці, пашырала і ўмацоўвала прыгонніцтва, паклала пачатак пераарыентацыі эканамічнага, палітычнага і культурнага жыцця Беларусі на Усход.

2. Вайна 1812 г. і Беларусь

Палітычныя і эканамічныя супярэчнасці паміж буржуазнай Францыяй і феадальнай Расіяй прывялі гэтыя дзяржавы да вайны. Яшчэ напярэдадні шырокамаштабнага ваеннага сутыкнення расійска-французскія адносіны выклікалі абвастрэнне палітычнай сітуацыі на беларускіх землях. У лістападзе 1806 г. французскія войскі занялі "прускую" частку Польшчы, дзе было створана так званае Княства Варшаўскае. За падзеямі, якія там адбываліся, уважліва сачыла вышэйшае саслоўе заходніх губерняў Расійскай імперыі. Многія памешчыкі рушылі праз граніцу, разлічваючы на атрыманне дзяржаўных пасад. Узмацніўся прыток у польскія войскі шляхецкай моладзі з Беларусі і Літвы.

Занепакоены гэтым царскі ўрад выдаў шэраг указаў аб канфіскацыі маёнткаў у асоб, якія самавольна выехалі за мяжу. Рэальная магчымасць згубіць свае зямельныя ўладанні напалохала ўцекачоў, якія пачалі вяртацца, каб прадаць ці закласці свае маёнткі. У адказ Камітэт міністраў забараніў продаж і заклад такіх маёнткаў тэрмінам да двух гадоў. Адзначаныя меры прымаліся стрымана і асцярожна

з-за магчымасці выклікаць лішнюю азлобленасць пануючага саслоўя і накіроўваліся пераважна на тое, каб не выкарыстоўваліся сродкі з маёнткаў для арганізацыі замежных атрадаў. Расійскі імператар Аляксандр I разлічваў адцягнуць памешчыкаў заходніх губерняў ад французскага імператара Напалеона перш за ўсё палітычнымі контркрокамі ў "польскім пытанні". Ён заявіў аб сваім жаданні аднавіць пад эгідай Расіі Вялікае Княства Літоўскае.

Па даручэнню імператара ў 1811 г. князі М.Агінскі, К.Любецкі і граф Л.Плятэр склалі праект "Палажэння аб праўленні аўтаномным Вялікім Княствам Літоўскім", якое павінна было ахапіць усе тыя тэрыторыі, што дасталіся Расіі ад былой Рэчы Паспалітай у 1772 — 1807 гг. У процівагу канстытуцыі Варшаўскага герцагства нават прадугледжвалася паступовае, на працягу дзесяці гадоў, асабістае вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці. Аднак ажыццяўленне праекта адкладвалася і зацягвалася: кансерватыўна-нацыяналістычныя сілы ў вышэйшым расійскім кіраўніцтве бачылі ў ім спробу расчлянення і аслаблення імперыі.

12 чэрвеня 1812 г. армія Напалеона пераправілася праз Нёман у раёне Коўна і ўварвалася ў межы Расійскай дзяржавы. "Вялікая армія" мела ў прыграниччы амаль трохкратную колькасную перавагу над расійскімі войскамі. Яна складалася з прадстаўнікоў многіх падпарадкаваных Францыі народаў Еўропы. З імі таксама ішлі палкі, сфарміраваныя з перайшоўшых на бок Напалеона шляхціцаў з Літвы і Беларусі. Толькі князь Дамінік Радзівіл за свой кошт выставіў трохтысячны уланскі полк, які ўжо 16 чэрвеня першым урачыста ўступіў у Вільню. Беларусь стала арэнай ваенных дзеянняў. 1-я і 2-я расійскія арміі, размешчаныя паасобку (адпаведна каля Вільні і Ваўкавыска), адступалі ад заходніх граніц з мэтай злучэння. У чэрвені — ліпені адбыліся жорсткія баі пад Кобрынам, Мірам, Салтанаўкай, Астроўна, Полацкам і ў іншых месцах. Расійскія арміі змаглі аб'яднацца толькі пад Смаленскам, адкуль пасля генеральнай бітвы 4 — 5 жніўня працягвалі адступаць, зберагаючы асноўныя сілы.

Амаль уся Беларусь, апрача паўднёвых паветаў, кантралявалася французскім ваенным камандаваннем. Напалеон тут знайшоў нямала прыхільнікаў сярод тых шляхціцаў, якія шчыра паверылі ў абяцанні імператара адрадзіць іх былую дзяржаўнасць і таму сустракалі французскія войскі як вызваліцеляў ад расійскіх захопнікаў. 1 ліпеня 1812 г.

у Вільні была створана Часовая камісія ўрада Вялікага Княства Літоўскага на чале з мясцовым памешчыкам Станіславам Солтанам, дзейнасць якой пашыралася на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць. Для Віцебскай і Магілёўскай губерняў было вызначана асобнае так званае "польскае праўленне".

Ад гэтых марыянетачных урадаў патрабавалася перш за ўсё забяспечваць усім неабходным і нават папаўняць рэкрутамі "Вялікую армію", што расчароўвала шляхту адносна Напалеона. Частка яе працягвала арыентавацца на Аляксандра I.

Асноўны цяжар вайны лёг на плечы сялян, якія сталі аб'ектамі рэквізіцый і проста рабаўніцтва ваюючых бакоў. Новая ўлада не толькі не адмяніла прыгон, а, больш таго, павялічыла на сваю карысць паборы з сялян, чым выклікала ўзмоцненае супрацьдзеянне і варожасць апошніх. Жыхары многіх вёсак пакідалі хаты, забіралі маёмасць і ўцякалі ў лясы. Яны стыхійна ператвараліся ў партызан, нападаючы на асобных салдат і фуражыраў. Вядомы партызанскія атрады вёсак Старасселле, Мажаны, Есьманы і Кляўкі у Барысаўскім , Варонкі ў Дрысенскім, Жарцы ў Полацкім паветах і інш.

Ваенныя падзеі і звязаныя з імі змены і паслабленні адміністрацыйнай улады далі магчымасць сялянам у шэрагу месц зусім выйсці з падпарадкавання памешчыкам, прычым незалежна ад зоны кантролю (французскага ці расійскага). Напрыклад, востры характар набылі хваляванні сялян чатырох паветаў на паўночным усходзе Віцебскай губерні. Пры спробе прымусіць падпарадкоўвацца сялян графіні Зубавай з мястэчка Усвяты быў забіты справаводца эканоміі Патоцкі, цяжка збіты пяць, ранены 30 і некалькі "усмирителей" прапалі без весткі. 15 верасня сяляне памешчыкаў Ракасоўскага і Савельева сумесна з казённымі падданымі з мястэчка Стайкі, усяго да 300 чалавек, узброіўшыся дзідамі і каламі, зрабілі напад на фальварак калежскага асэсара Вышынскага. Па патрабаванню губернатара ваенны міністр адправіў у Віцебскую губерню спецыяльную каманду для навядзення парадку.

У кастрычніку 1812 г. расійская армія вымусіла Напалеона пакінуць Маскву і адступаць па смаленскай дарозе. Адначасова перайшлі ў наступленне расійскія войскі на поўначы і поўдні Беларусі. Тут адбыўся канчатковы разгром французскай арміі. 14 —16 лістапада пры пераправе праз раку Бярэзіну каля в.Студзёнка, на поўнач ад Бары-

сава, Напалеон згубіў больш за 20 тыс. чалавек. Далейшае адступленне яго арміі ператварылася ў бязладныя ўцёкі. У перамогу Расіі ўнеслі ўклад і салдаты, рэкрутаваныя з беларускіх губерняў. Некалькі дзясяткаў тысяч іх было ў часцях 1-й арміі і асабліва ў 3-й, 24-й і іншых дывізіях, што вызначыліся ў вядомай Барадзінскай бітве.

Такім чынам, у барацьбе расійскай і французскай імперый за Беларусь (першая, каб утрымаць і працягваць эксплуатаваць нашы землі, а другая, каб перападпарадкаваць іх з той жа мэтай сабе) яе жыхары аказваліся па абодва бакі змагання розных сіл. Менавіта з гэтай прычыны вайна 1812 г. набывала тут характар грамадзянскай.

Гэта вайна прынесла вялікія спусташэнні Беларусі: шмат загінула людзей, былі разбураны многія гарады і вёскі, амаль напалову скарацілася колькасць жывёлы і зменшыліся пасяўныя плошчы. Вайсковыя дарогі былі ўсеяны трупамі. Толькі добрыя ўраджаі 1813 і 1814 гг. выратавалі народ ад масавага голаду і эпідэмій. Аднак царскі ўрад і ў гэтых умовах працягваў адстойваць прыгонніцкія парадкі. У царскім маніфесце 30 жніўня 1814 г., дзе ў сувязі з заканчэннем вайны дараваліся розныя міласці саслоўям, аб сялянах было сказана наступнае: "Сяляне, верны наш народ — няхай атрымаюць узнагароду сваю ад бога". Гэтым жа маніфестам былі канчаткова вернуты канфіскаваныя маёнткі ранейшым прыхільнікам Напалеона. "Усяміласцівейшае дараванне" шляхце не скарыстаў Дамінік Радзівіл, якому толькі ў Мінскай губерні належала больш за 50 тыс. мужчынскага полу сялян, бо памёр у Парыжы. Пазней яго спадчына перайшла, праз шлюб дачкі Стэфаніі, да Вітгенштэйнаў, якія сталі ў XIX ст. самымі буйнымі землеўладальнікамі на Беларусі.

Нягледзячы на тое што і пасля вайны характэрная для Аляксандра I дэмагагічная палітыка заляцанняў са шляхтай працягвалася, што выявілася ў стварэнні Царства Польскага, тым не менш ідэя вяртання, у якой бы там ні было форме, ранейшай дзяржаўнасці на беларускія землі была пахавана. Ужо ў студзені 1813 г., калі расійскія войскі перанеслі ваенныя дзеянні за межы сваёй дзяржавы, Аляксандр I у пісьме да Адама Чартарыйскага недвухсэнсоўна заявіў: "Не забывайце, што Літва, Падолле і Валынь дасюль лічаць сябе правінцыямі рускімі і ніякая логіка ў свеце не ўпэўніць Расію, каб яны маглі быць не пад уладай Гасудара Расіі, а пад якойсьці іншай".

3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё

У першай палове XIX ст. на Беларусі адбываліся агульныя для Расійскай імперыі працэсы, якія вялі да распаду феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Узнікалі адносіны новага, капіталістычнага тыпу. Пра гэта сведчылі поспехі прамысловасці: узрасла колькасць мануфактур, на многіх з іх пачала выкарыстоўвацца вольнанаёмная праца. Першыя фабрыкі былі пабудаваны ў 20-я гады XIX ст. у мястэчках Хомск і Косава Гродзенскай губерні. Яны займаліся вырабам сукна. Найбольш распаўсюджанымі былі прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны: вінакурныя, суконныя, палатняныя, цукровыя, мукамольныя. У сярэдзіне XIX ст. на шэрагу фабрык пачалі ўжывацца паравыя рухавікі. У канцы 50-х гадоў на Беларусі налічвалася 549 значных вотчынных і капіталістычных прадпрыемстваў з 6,5 тыс. рабочых, вольнанаёмныя сярод якіх складалі 43 %.

Праводзіліся работы па паляпшэнню шляхоў зносін, што садзейнічала ўключэнню гаспадаркі Беларусі ва ўсерасійскі рынак. Вялікае эканамічнае значэнне мелі каналы, што злучылі рэкі басейна Чорнага мора з рэкамі басейна Балтыйскага мора: Агінскі, Бярэзінскі, Дняпроўска-Бугскі. Па гэтых штучных водных шляхах Брэст, Кобрын, Пінск, Барысаў і іншыя гарады вялі ажыўлены гандаль, павышалася іх прамысловае значэнне. За перыяд з 1825 па 1861 г. насельніцтва 42 гарадоў Беларусі павялічылася са 151 тыс. да 320 тыс. чалавек. Шырокія дарогі, абсаджаныя бярозамі, так званыя "гасцінцы", звязалі беларускія гарады з іншымі гарадамі імперыі. У вывазе з Беларусі пераважалі лён і льнопрадукты, збожжа, гарэлка, спірт, воўна, сала, лес. На Беларусь прывозілі прамысловыя вырабы.

Новыя з'явы ў эканоміцы, выкліканыя фарміраваннем капіталістычных адносін, адзначаліся і ў беларускай вёсцы. Сельская гаспадарка ўсё больш звязвалася з рынкам, павялічвалася плошча ворыўных зямель, пашыраліся пасевы тэхнічных культур (ільну, канапель), значна ўзрасла ўдзельная вага бульбы і цукровых буракоў, узнікла танкарунная авечкагадоўля, у шэрагу памешчыцкіх гаспадарак пачалі выкарыстоўвацца сельскагаспадарчыя машыны. Прапагандай перадавых метадаў земляробства і жывёлагадоўлі займалася Беларускае вольнае эканамічнае таварыства, што існавала з 1826 па 1841 г. у Віцебску. У 40-я гады ў маёнтку Горы-Горкі Магілёўскай губерні быў адкрыты першы ў Расійскай імперыі земляробчы інстытут. Акрамя

сельскагаспадарчай працы сяляне ўсё больш займаліся промысламі, наймаліся на розныя работы. Паглыблялася іх маёмаснае расслаенне: выдзяляліся заможныя сяляне, якія арандавалі млыны, вялі гандаль і інш.

Далейшае развіццё прагрэсіўных з'яў у эканоміцы стрымлівалася панаваннем феадальнай сістэмы, існаваннем прыгоннага права. Памешчыкі з мэтай павелічэння прыбытковасці маёнткаў пашыралі ўласныя пасевы за кошт сялянскіх надзелаў. Але занядбаная, няўгноеная, дрэнна апрацаваная зямля радзіла ўсё горш. Ураджай сам-3 лічыўся ўжо добрым, часам не збіралі і пасеянага. За 30 гадоў (з 1820 па 1850) у Віцебскай і Магілёўскай губернях было дзесяць няўродаў. Сяляне ў сваёй масе ўсё больш разараліся і не маглі, як раней, несці ўзрастаўшыя павіннасці. Так, паншчына ў большасці маёнткаў Заходняй і Цэнтральнай Беларусі складала 6 чалавека-дзён на тыдзень з сялянскай гаспадаркі. З паглыбленнем крызісу прыгоннай гаспадаркі хутка расла запазычанасць памешчыцкіх маёнткаў прыватным асобам і асабліва казне. К 1859 г. па пяці беларускіх губернях каля 60 % прыгонных сялян былі закладзены іх уладальнікамі.

Адным з яскравых паказчыкаў нарастаючага крызісу існаваўшай сістэмы быў сялянскі рух. Калі ў першай трэці XIX ст. адбылося 46 найбольш буйных сялянскіх хваляванняў, то ў другой трэці — больш за 90. Прычым на Беларусі сацыяльныя супярэчнасці ўзмацняліся нацыянальна-рэлігійнай варожасцю паміж сялянамі і панамі. У той жа час дэмакратычныя колы шляхты разгортвалі сярод насельніцтва антыцарскую агітацыю, з чым улады напрамую сутыкнуліся пры ўціхамірванні ў 40-я гады выступленняў сялян у маёнтку Смаргонь Віленскай губерні.

Гэты маёнтак быў канфіскаваны ў графа Пшаздзецкага за ўдзел у шляхецкім паўстанні 1831 г. Смаргонскія сяляне былі незадаволены злоўжываннямі дзяржаўнай адміністрацыі. Размах і ўпарты характар іх барацьбы вымушаў улады часта ўводзіць воінскія каманды і экзекуцыі ў маёнтак. Сюды выязджалі вышэйшыя чыны губернскай адміністрацыі і Міністэрства дзяржаўных маёмасцей. У красавіку 1847 г. у маёнтку было распаўсюджана пісьмо з заклікам да сялян сумесна з мяшчанамі і ніжэйшымі чынамі знішчаць афіцэраў раскватараваных воінскіх часцей, выразаць усіх памешчыкаў і ўпраўляючых, як зрабілі сяляне Галіцыі ў 1846 г., каб здабыць сабе свабоду. Распаўсюджванне закліку вымусіла многіх памешчыкаў Ашмянскага, Вілейскага і Дзісенскага паветаў спешна выехаць у Вільню. Пад уплывам падзей у

Смаргоні адбыўся шэраг хваляванняў дзяржаўных і памешчыцкіх сялян. Уводам войск закончылася выступленне ў суседнім маёнтку Войстам Свянцянскага павета. У тым жа павеце была забіта сялянамі памешчыца Зейферт. Губернскія ўлады прыбеглі да надзвычайных мер, каб справіцца з сітуацыяй. Аўтарам "возмутительного воззвания" аказаўся дробны чыноўнік шляхціц Юльян Бакшанскі (1824 – 1863). Як паказала следства, ён адначасова пасылаў лісты ў некалькі паветаў, збіраўся даць смаргонскім сялянам значную суму грошай для набыцця зброі і пашырыць сялянскі рух аж да Вільні з мэтай забойства губернатара і генерал-губернатара. У выніку смаргонскага выступлення памешчыкі ўбачылі для сябе небяспеку знішчэння ад рук уласных прыгонных, а царызм апынуўся перад пагрозай зліцця сялянскай барацьбы з агульнадэмакратычным рухам у краі.

Усё гэта вымушала царызм праводзіць на Беларусі больш гнуткую сацыяльна-эканамічную палітыку і рабіць пэўныя захады па вырашэнню аграрнага пытання.

У 1840 – 1857 гг. праводзілася рэформа сярод дзяржаўных сялян, якія тады складалі каля пятай часткі ўсяго сялянства Беларусі. Амаль усе казённыя маёнткі здаваліся ў арэнду прыватным асобам і таму эканамічнае і прававое становішча сялян у іх да канца 30-х гадоў XIX ст. практычна не адрознівалася ад становішча памешчыцкіх прыгонных. Ідучы на рэформу, царскі ўрад меў на мэце зняцце сацыяльнай напружанасці ў дзяржаўнай вёсцы заходніх губерняў, павышэнне яе даходнасці і заваяванне сімпатый сялянскіх мас у процівагу шляхецкаму дэмакратычнаму руху. Ініцыятарам і асноўным правадніком рэформ стаў міністр дзяржаўных маёмасцей Расійскай імперыі граф П.Дз.Кісялёў – прыхільнік абмежавання і лібералізацыі феадальна-прыгонніцкіх адносін, тонкі палітык, які добра разумеў сітуацыю ў так званым Заходнім краі (меў уласны маёнтак на Правабярэжнай Украіне). Ён таксама быў начальнікам V Аддзялення імператарскай канцылярыі, якое стала "штабам па сялянскай частцы".

28 снежня 1839 г. былі падпісаны законы аб новай сістэме кіравання і люстрацыі дзяржаўных маёнткаў у заходніх губернях. На губернскім узроўні ствараліся палаты, а яшчэ ніжэй – акруговыя ўпраўленні дзяржаўных маёмасцей. У ходзе люстрацыі – новага апісання дзяржаўных уладанняў – змяншаліся павіннасці сялян і павялічваліся іх зямельныя надзелы. На аснове ўказаў 1844 і 1845 гг. сяляне казённых маёнткаў пераводзіліся з паншчыны на аброк і адначасова

спынялася практыка здачы іх у арэнду. На месцах ствараліся сельскія грамады з выбарным кіраваннем, якім давяралася самастойнае вырашэнне гаспадарчых, адміністрацыйных і судовых спраў. Прызнавалася "грамадзянская свабода" дзяржаўных сялян, што выгадна адрознівала іх ад бяспраўных памешчыцкіх падданых. Ажыццяўлялася, але малаэфектыўная з-за недахопу сродкаў, "папячыцельная палітыка". Аднак мэты рэформы, пры захаванні дзяржавай феадальнай сістэмы, не маглі быць у поўнай ступені дасягнуты.

Каб аслабіць крызіс прыгонніцкіх адносін у памешчыцкай вёсцы, урад пайшоў на правядзенне так званай інвентарнай рэформы. Традыцыя складання інвентароў — вопісаў феадальных уладанняў існавала на Беларусі яшчэ з XVI ст. У іх уладальнікі ўносілі звесткі аб межах маёнтка, даходах насельніцтва, фіксавалі памеры сялянскіх надзелаў і павіннасцей.

Інвентарная рэформа пачала ажыццяўляцца на падставе закона ад 15 красавіка 1844 г. Яе сутнасць зводзілася да рэгулявання памераў надзелаў і павіннасцей памешчыцкіх сялян і замацавання іх гранічных узроўняў у абавязковых не толькі для сялян, але і для памешчыкаў інвентарах. Гэтым практычна займаліся губернскія інвентарныя камітэты, што складаліся з царскіх чыноўнікаў і прадстаўнікоў мясцовага дваранства. Абавязковыя інвентары былі ўведзены ва ўсіх памешчыцкіх маёнтках Заходняй і Цэнтральнай Беларусі і частцы маёнткаў Усходняй Беларусі. Фактычна была нададзена сіла закону тым павіннасным адносінам, якія к таму часу склаліся. Рэформа выклікала супраціўленне памешчыкаў і нараканні сялян там, дзе павіннасці аказаліся падвышанымі. Таму ўрад некалькі разоў мяняў падыходы да яе правядзення. Перагляд і выпраўленне інвентароў цягнуліся да 1857 г., калі пачалася падрыхтоўка да адмены прыгоннага права. Нягледзячы на прыгонніцкую абмежаванасць інвентарнай рэформы, яе непаслядоўнасць і незавершанасць, абавязковыя інвентары афіцыйна ставілі мяжу памешчыцкай уладзе і адкрывалі некаторыя легальныя магчымасці для адстойвання сялянамі сваіх інтарэсаў.

У цэлым жа аграрныя рэформы 40-х — першай паловы 50-х гадоў хоць і стваралі лепшыя ўмовы для развіцця таварна-грашовых адносін і разгортвання гаспадарчай ініцыятывы сялянства (перш за ўсё ў дзяржаўнай вёсцы), але не закраналі асноў феадальных парадкаў, ліквідацыя якіх заставалася жыццёва неабходнай эканамічнай і палітычнай задачай часу.

4. Грамадскі рух і палітыка царызму

Ліквідацыя дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага, ідэі французскай рэвалюцыі канца XVIII ст., падзеі вайны 1812 г. аказалі вялікі ўплыў на развіццё грамадскай думкі Беларусі. Шляхецкая інтэлігенцыя, вучнёўская моладзь аб'ядноўваліся ў гурткі і таварыствы для выпрацоўкі і дасягнення сваіх сацыяльных і нацыянальных ідэалаў. Яны былі ідэйна і часта арганізацыйна звязаны з грамадскім рухам у Польшчы, кантактавалі з перадавымі людзьмі Расіі дзеля барацьбы супраць агульнага ворага — царскага самадзяржаўя.

Першай тайнай арганізацыяй у Літве і Беларусі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай стала Віленская асацыяцыя 1796 — 1797 гг., якая мела адгалінаванні ў Мінску, Брэсце, Кобрыне, Ашмянах. Асноўнай яе мэтай з'яўлялася аднаўленне ранейшай дзяржавы на аснове Канстытуцыі 3 мая 1791 г., для чаго вялікія спадзяванні ўскладаліся на дапамогу Францыі. За кароткі час свайго існавання, да раскрыцця царскімі ўладамі, асацыяцыя не паспела набраць сілу, але карысталася папулярнасцю сярод шляхты.

У 1817 г. па ініцыятыве студэнтаў Віленскага універсітэта Адама Міцкевіча, Тамаша Зана, Яна Чачота было створана "Таварыства філаматаў" (аматараў навук), якое мела аддзяленні (філіялы) у Свіслацкай гімназіі, Полацкім піярскім вучылішчы і іншых навучальных установах. Яны прапагандавалі сярод навучэнцаў і насельніцтва ідэі роўнасці і свабоды. На Беларусі жылі і дзейнічалі ў складзе раскватараваных тут расійскіх войск многія дзекабрысты — М.М.Мураўёў, А.А.Бястужаў (Марлінскі), К.Г.Ігельстром, С.І.Трусаў і інш. У 1823 г. быў распрацаваны так званы бабруйскі план паўстання: арышт цара і яго світы ў час агляду войск у Бабруйскай крэпасці, але з-за непадрыхтаванасці і рознагалоссяў у кіраўніцтве дзекабрысцкімі арганізацыямі не быў ажыццёўлены. 24 снежня 1825 г. таварыства "Ваенныя сябры" сарвала цырымонію прысягі на вернасць Мікалаю I у Асобным літоўскім корпусе, размешчаным на Беласточчыне. У лютым 1826 г. дзекабрысты Палтаўскага палка спрабавалі захапіць Бабруйскую крэпасць. Гэтыя першыя рэвалюцыянеры хоць і спачувалі сялянам, але не лічылі іх рэальнай сілай і не абапіраліся на іх у сваёй дзейнасці. У сярэдзіне 20-х гадоў тайныя таварыствы на Беларусі былі разгромлены. Многіх удзельнікаў арыштавалі і саслалі ў аддаленыя губерні. Выйшла забарона на навучанне жыхароў Літвы і Беларусі ў

замежных універсітэтах і ў Польшчы, у чыноўнікаў бралася падпіска аб няўдзеле ў тайных арганізацыях. Аднак поўнасцю спыніць грамадска-палітычны рух царскі ўрад не мог.

У лістападзе 1830 г. у Варшаве пачалося шляхецкае паўстанне, кіраўнікі якога ставілі галоўнай мэтай аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Вясной 1831 г. у руках паўстаўшых аказалася Літва і шэраг паветаў Заходняй Беларусі. Паўстанне развівалася тут у многім стыхійна, хоць і існаваў Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт. Сяляне і мяшчане мабілізоўваліся ў атрады пераважна пад прымусам і не былі зацікаўлены ваяваць без вырашэння сваіх сацыяльных праблем. У той жа час царскія ўлады абяцалі ім вызваленне ад паноў-паўстанцаў. Кульмінацыяй падзей стала бітва за Вільню 19 чэрвеня 1831 г., у якой аб'яднаныя паўстанцкія сілы краю разам з прысланым у дапамогу польскім корпусам не змаглі дасягнуць перамогі над царскімі войскамі. Летам 1831 г. асобныя выступленні адзначаліся ў паўднёвых паветах Беларусі, але ў цэлым паўстанне на беларускіх землях пайшло на спад і ў жніўні было задушана. Многія яго ўдзельнікі былі аддадзены пад суд. У шляхціцаў канфіскоўваліся маёнткі, асоб недваранскага паходжання аддавалі ў салдаты ці ссылалі ў Сібір. Сваіх маёнткаў пазбавіўся цэлы шэраг прадстаўнікоў фамілій, якія валодалі тысячамі прыгонных: Агінскія, Плятэры, Пшаздзецкія, Радзівілы, Сапегі, Чартарыйскія і інш. Толькі частка ўладальнікаў змагла атрымаць "дараванне". На тэрыторыі Беларусі (у сучасных межах) у 1837 г. лічыліся канфіскаванымі 115 маёнткаў з 38 544 сялянамі мужчынскага полу. Пасля працяглай барацьбы ва ўрадавых сферах яны ў масе сваёй папоўнілі дзяржаўны фонд.

Урад разумеў, што адных рэпрэсій мала. Таму пасля 1830 г. быў распрацаваны канкрэтны план ажыццяўлення поўнага зліцця далучаных ад Рэчы Паспалітай зямель з усёй тэрыторыяй Расіі пад сцягам праваслаўя і адзінай рускай народнасці. Важнейшым мерапрыемствам у гэтым накірунку было ўвядзенне ўказам ад 1 студзеня 1831 г. расійскага заканадаўства і адмена 25 чэрвеня 1840 г. дзеяння Статута Вялікага Княства Літоўскага ў беларускіх губернях. З 1831 па 1848 г. у якасці дарадчага органа пры цару функцыяніраваў асобы Камітэт па справах заходніх губерняў. У склад Заходняга камітэта ўвайшло шэсць чалавек: міністры і вышэйшыя дзяржаўныя саноўнікі. Яго ўзначаліў старшыня Камітэта міністраў В.П.Качубей. Мікалай I даручыў Камітэту "ўнікнуць у меркаванне захадаў, якія прыняты быць могуць,

9. Зак. 5396.

каб губерні, ад Польшчы далучаныя, прыведзены былі да таго парадку, які для кіравання ў другіх расійскіх губернях існуе". Камітэт разглядаў праекты адміністрацыйных і палітычных мерапрыемстваў у адносінах да Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны, што паступалі ад міністэрстваў, губернатараў, генерал-губернатараў, і падаваў на зацвярджэнне цару.

Цэлы комплекс мерапрыемстваў ажыццяўляўся для папярэджання магчымых шляхецкіх выступленняў, сярод якіх галоўнае месца займаў так званы "разбор" шляхты. Гэта працэдура ўяўляла сабой праверку дакументаў аб дваранскім паходжанні і перавод на гэтай аснове часткі шляхты ў падатковае саслоўе: аднадворцаў — у сельскай мясцовасці і грамадзян — у гарадах. Ужо на пачатку 40-х гадоў аднадворцамі ў пяці беларускіх губернях лічыліся больш за 20 тыс. душ мужчынскага полу. Дваранскага звання пазбаўляліся звычайна дробныя, беспамесныя шляхціцы, якіх царскі ўрад зліваў у далейшым з масай сялянства.

Адным з важнейшых напрамкаў урадавай палітыкі стала барацьба супраць уплыву каталіцкай царквы, што змыкалася са шляхецкай апазіцыяй. Урад ішоў па лініі змяншэння колькасці каталіцкага духавенства і падрыву яго эканамічнай базы. У 1832 г. выйшаў указ аб ліквідацыі некамплектных (што не мелі поўнага складу манахаў) каталіцкіх манастыроў і перадачы іх маёнткаў у склад казённых. 25 снежня 1841 г., са спасылкай на тое, "як непрыстойна духоўнай асобе адрывацца ад яго прамых святарных абавязкаў", быў падпісаны шэраг указаў аб прыёме ў дзяржаўную маёмасць усіх маёнткаў вышэйшага праваслаўнага і іншавернага духавенства заходніх губерняў. Да сярэдзіны 40-х гадоў секулярызацыя царкоўных уладанняў была ў асноўным завершана, у выніку чаго дзяржаўнае сялянства беларускіх губерняў папоўніла каля 100 тыс. рэвізскіх (мужчынскіх) душ. Асноўная маса зямельных уладанняў была адабрана ад каталіцкага духавенства, бо праваслаўная царква мела параўнальна невялікую колькасць сялян. Ліквідацыя царквы як буйнога феадала-ўласніка ставіла яе ў большую залежнасць ад дзяржаўнай улады.

Ва ўмовах небяспекі антыўрадавых змоў і выступленняў важнейшым чыннікам палітычнай стабільнасці ў рэгіёне лічылася праваслаўнае яднанне афіцыйных улад і народа з мэтай ізаляцыі паўстанцаў-католікаў. Гэта прадвызначыла лёс уніяцкай царквы, да якой напрыканцы XVIII ст. належала больш 2/3 насельніцтва і ў якой яшчэ захоўваліся ранней-

шыя беларускія праваслаўныя традыцыі, што не дазволіла ёй зліцца з каталіцкай царквой. У 30-я гады XIX ст. улады схіляюць на свой бок вышэйшае уніяцкае духавенства на чале з літоўскім епіскапам Іосіфам Сямашкам. 12 лютага 1839 г. на саборы ў Полацку прымаецца рашэнне аб далучэнні уніяцкай царквы да рускай праваслаўнай. Аб метадах "уз'яднання" уніятаў сведчаць успаміны віцябчаніна Максіміліяна Маркса, у будучым актыўнага ўдзельніка расійскага рэвалюцыйнага руху. У адной з вёсак пад Віцебскам ён назіраў, як тых сялян, што згаджаліся "пераварочвацца", заахвочвалі гарэлкай, а для тых, хто адмаўляўся, былі падрыхтаваны бізуны. Ліквідацыя уніяцкай канфесіі суправаджалася знішчэннем шматлікіх яе культурных каштоўнасцей, спальваннем богаслужэбнай літаратуры. З гэтага часу на нашай зямлі запанавала расійскае праваслаўе, але многія з былых уніятаў працягвалі тайна трымацца сваіх ранейшых традыцый.

Дзеля русіфікацыі заахвочваўся пераезд на Беларусь рускіх чыноўнікаў і абмяжоўваўся доступ да заняцця дзяржаўных пасад мясцовых ураджэнцаў. Рабіліся спробы насаджэння рускага дваранскага землеўладання і перасялення рускіх праваслаўных сялян і інш.

Уніфікатарская дзейнасць Заходняга камітэта хоць і мела вынікі, але не магла хутка ліквідаваць асаблівасці беларускіх зямель і выкараніць тут апазіцыйныя настроі. Шляхецкія рэвалюцыянеры са свайго боку таксама ўлічылі ўрокі паўстання. Іх рух, асабліва ў 40-я гады, дэмакратызаваўся і радыкалізаваўся, набыў антыпрыгонніцкі характар. У ім удзельнічала ўсё больш прадстаўнікоў разначыннай інтэлігенцыі, якая імкнулася павесці за сабой сялянскія масы.

Шляхецкая паўстанцкая эміграцыя, што асела пераважна ў Францыі, першапачаткова не губляла надзей на ўзнаўленне ваенных дзеянняў і засылала на Беларусь сваіх эмісараў. Сярод іх быў ураджэнец Слонімшчыны Міхал Валовіч (1806 – 1833), які ў сакавіку 1833 г. тайна вярнуўся на радзіму, сфарміраваў у асноўным з сялян уласнай вёскі невялікі атрад і ажыццяўляў партызанскія дзеянні ў Слонімска-Наваградскай акрузе. Мэтай сваёй барацьбы ён лічыў вызваленне сялян і абвяшчэнне Беларусі і Літвы дэмакратычнай рэспублікай. Аднак ужо ў маі "экспедыцыя Валовіча" была ліквідавана ўладамі.

Студэнт Медыка-хірургічнай акадэміі ўраджэнец Піншчыны Франц Савіч (1815 – 1845) заснаваў у 1836 г. у Вільні "Дэмакратычнае таварыства", члены якога прапа-

гандавалі ідэі дружбы народаў у барацьбе супраць царызму, стаялі за вызваленне сялян і надзяленне іх зямлёй. "Ліцвін, валынец, падайце ж мне рукі ... Царам — на згубу, панам — для навукі", — заклікаў Савіч у сваім вершы "Дзе ж тое шчасце падзелася?.." Праз тры гады ўдзельнікі гэтага таварыства былі арыштаваны.

У 1846 — 1849 гг. у Вільні, Мінску, Гродне, Лідзе, Ашмянах і іншых гарадах існавала тайная арганізацыя "Саюз свабодных братоў", якая налічвала каля 200 членаў. Вялася прапаганда сярод салдат і афіцэраў мінскага гарнізона, выраблялася зброя. На развіццё грамадскага руху мелі вялікі ўплыў палітычныя падзеі, перш за ўсё рэвалюцыі 1848 — 1849 гг. у Заходняй Еўропе, і толькі прысутнасць вялікай колькасці царскіх войск прадухіляла на беларускіх землях масавыя выступленні.

Беларуская нацыянальна-дзяржаўная ідэя ў грамадскім руху канца XVIII — першай паловы XIX ст. яшчэ не аформілася, але калі дзекабрысты наогул ігнаравалі нацыянальныя правы беларускага і іншых народаў Расійскай імперыі, то ўдзельнікі гурткоў і арганізацый, створаных на мясцовай, хаця і моцна спаланізаванай глебе, праяўлялі так званы "літоўскі сепаратызм", любілі родны край, што пры збліжэнні іх з беларускай сялянскай масай стварала неабходныя перадумовы для фарміравання такой ідэі і выдзялення яе як самастойнай у недалёкай будучыні.

5. Культура

У параўнанні з папярэднім перыядам у першай палове XIX ст. у культурным развіцці Беларусі назіраецца шмат новых з'яў і працэсаў. Змены былі выкліканы як логікай самога гісторыка-культурнага працэсу, так і новымі з'явамі ў эканоміцы, палітычным і сацыяльным жыцці грамадства. Фактарамі, якія аказвалі вялікі ўплыў на культурнае жыццё беларускіх зямель, у гэты час былі рост насельніцтва, эканамічнае развіццё Беларусі, фарміраванне новых, буржуазных адносін і складванне беларускай нацыі, каланіяльная палітыка расійскага самаўладдзя, актыўны нацыянальна-вызваленчы рух, узаемадзеянне з культурамі суседніх народаў.

Вызначальнай з'явай гісторыка-культурнага працэсу на Беларусі ў канцы XVIII — першай палове XIX ст. было паступовае фарміраванне беларускай нацыянальнай культуры. Нягледзячы на існаванне прыгонніцтва, саслоўны

падзел грамадства, іншыя праявы феадальнага ладу, якія стрымлівалі працэс фарміравання новай беларускай культуры, а таксама насуперак памкненням улад затрымаць развіццё беларускай культуры на ўзроўні фальклору культура беларусаў перажывае ў гэты час перыяд адраджэння. Складваюцца яе тыпалагічныя, характэрныя рысы, ствараюцца нацыянальны тэатр, літаратура, іншыя галіны мастацтва, навукі, асветы.

Адной з найбольш важных галін духоўнага жыцця ў першай палове XIX ст. была асвета. У гэты час у сістэме адукацыі адбываюцца значныя змены. Пачатак гэтых перамен звязаны з дзейнасцю Адукацыйнай камісіі — створанага ў часы Рэчы Паспалітай міністэрства асветы. Расійскі ўрад пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі першапачаткова захаваў агульны накірунак асветніцкай палітыкі. У 1802 г. пачалося правядзенне школьнай рэформы, якая закранула Беларусь. У 1803 г. Галоўная літоўская школа была перайменавана ў Віленскі універсітэт, які з'яўляўся навучальным і адміністрацыйным цэнтрам аднайменнай навучальнай акругі, у якую ў гэты перыяд уваходзіла ўся тэрыторыя Беларусі, а таксама Літва і значная частка Украіны.

Згодна з рэформай утвараліся некалькі тыпаў навучальных устаноў. На самай ніжняй ступеньцы стаялі аднакласныя прыхадскія вучылішчы, прызначаныя для падатных саслоўяў. Сярэднюю адукацыю давалі павятовыя вучылішчы і гімназіі. Школа насіла саслоўны характар, — доступ у гімназіі для дзяцей падатных саслоўяў быў абмежаваны, а ва універсітэт іх наогул не дапускалі.

Акрамя вышэйназваных навучальных устаноў на Беларусі дзейнічала ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст. сетка вучылішчаў пры каталіцкіх кляштарах і базыльянскіх манастырах. Яны давалі сярэднюю адукацыю і прыраўноўваліся да павятовых вучылішчаў ці гімназій. Аднак іх колькасць на працягу першай трэці стагоддзя паступова скарачалася, а ў 1832 г. яны былі пераўтвораны ў свецкія ў сувязі з закрыццём каталіцкіх кляштараў.

У першай чвэрці XIX ст. сістэма асветы на Беларусі, асабліва ў заходняй яе частцы, была значна спаланізавана. Польская мова з'яўлялася асноўнай мовай выкладання, дзеці вывучалі польскую гісторыю і літаратуру. Такое становішча было звязана з агульным накірункам палітыкі самаўладдзя — царызм шукаў саюзніка ў мясцовай паланізаванай шляхце і ішоў на свядомае патуранне па-

ланізацыі, асабліва ў першае дзесяцігоддзе XIX ст. Польскія патрыёты на чале з папячыцелем Віленскай навучальнай акругі і куратарам універсітэта Адамам Чартарыйскім зрабілі асвету надзейным сродкам распаўсюджання ідэалаў польскага нацыянальнага руху.

Сітуацыя пачала паступова змяняцца пасля раскрыцця тайных таварыстваў у навучальных установах. Уводзіцца выкладанне рускай мовы ў якасці абавязковага прадмета, польская гісторыя замяняецца гісторыяй Расіі. У гэты ж час у сувязі з рэпрэсіямі ў адносінах да выкладчыцкага саставу універсітэта і пераглядам праграмы новы куратар М.М.Навасільцаў пачынае русіфікацыю універсітэта, узмацняе нагляд за выкладчыкамі і студэнтамі. Але, як і раней, Віленскі універсітэт яшчэ не страчвае сваёй ролі як галоўная навучальная ўстанова Літвы і Беларусі. У яго склад уваходзілі чатыры факультэты — фізіка-матэматычны, медыцынскі, маральна-палітычных навук, літаратуры і прыгожых мастацтваў, а таксама настаўніцкая і духоўная семінарыі. Штогод на ўсіх факультэтах універсітэта вучылася больш за 1 тыс. чалавек, тут меліся выдатная бібліятэка, батанічны сад, астранамічная абсерваторыя, анатамічны музей, лабараторыі. Універсітэт быў добра вядомы не толькі ў імперыі, але і за яе межамі. Віленскі універсітэт з'яўляўся своеасаблівым цэнтрам культурнага жыцця, вакол якога гуртавалася мясцовая інтэлігенцыя.

Пасля падаўлення паўстання 1830 — 1831 гг. у сістэме асветы на Беларусі адбываюцца значныя змены. 1 мая 1832 г. Мікалай I падпісвае ўказ аб закрыцці Віленскага універсітэта з-за ўдзелу яго студэнтаў у паўстанні. У Вільні застаецца Медыка-хірургічная акадэмія, створаная на базе медыцынскага факультэта (працуе да 1840 г.), і Рымска-каталіцкая акадэмія, базай для якой стала тэалагічнае аддзяленне маральна-прававога факультэта (працуе да 1842 г.). Выкладанне ва ўсіх тыпах навучальных устаноў пераводзіцца на рускую мову. На ўсходзе Беларусі польская мова выключаецца з праграмы выкладання, на захадзе выкладаецца толькі як асобны прадмет па скарочанай праграме. Выпускнікам Віленскага універсітэта забараняецца выкладаць у мясцовых школах, Пецярбургскі настаўніцкі інстытут і створаная ў Віцебску ў 1834 г. настаўніцкая семінарыя (працуе да 1839 г.) пачынаюць падрыхтоўку выкладчыкаў для Беларусі. Сярод іншых важных падзей у галіне асветы неабходна адзначыць адкрыццё ў 1840 г. у Горы-Горках земляробчай школы,

якая ў 1848 г. была пераўтворана ў земляробчы інстытут, а таксама адкрыццё кадэцкіх карпусоў у Полацку і Брэсце.

Усяго ў пачатку 60-х гадоў XIX ст. на Беларусі налічвалася 567 навучальных устаноў усіх тыпаў, у тым ліку адна вышэйшая, 12 сярэдніх, 45 прыватных і дзяржаўных жаночых вучылішчаў, 21 духоўнае вучылішча і звыш 400 пачатковых школ. Гэтыя навучальныя ўстановы наведвала 16 500 чалавек, або кожны двухсоты.

Навуковае жыццё Беларусі ў першай палове XIX ст. было звязана з дзейнасцю выкладчыкаў Віленскага універсітэта, Горы-Горацкага земляробчага інстытута, а таксама з даследаваннямі энтузіястаў-аматараў.

У Віленскім універсітэце значнага развіцця дасягнулі дакладныя навукі. Выдатны ўклад у матэматыку і астраномію ўнёс Ян Снядэцкі, які быў доўгі час рэктарам універсітэта. Дзякуючы яму ў Вільні была адкрыта астранамічная абсерваторыя, яго падручнік па сферычнай трыганаметрыі лічыўся найлепшым у Еўропе і быў выдадзены ў Лейпцыгу. Брат Яна Снядэцкага Андрэй, выдатны біёлаг і хімік, які таксама працаваў ва універсітэце, быў аўтарам працы "Тэорыя арганічных рэчываў", у якой стварыў упершыню стройную навуковую тэорыю на падставе эмпірычных даных біялогіі.

Выкладчыкі універсітэта ўнеслі значны ўклад у развіццё медыцыны, фізіялогіі, гісторыі, літаратуры і іншых навук. Гэтыя галіны пазначаны імёнамі батаніка і біёлага С.Юндзіла, прафесара медыцыны А.Бекю, фізіёлага М.Гамаліцкага, прававедаў І.Даніловіча і Ю.Ярашэвіча, мовазнаўцы І.Лабойкі.

Знакамітым вучоным быў прафесар універсітэта І.Лялевель, заснавальнік рамантычнай школы ў польскай гістарыяграфіі, адзін з кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху ў Польшчы і на Беларусі.

У Горы-Горацкім земляробчым інстытуце выдатныя вынікі дасягнуты ў галіне хіміі і біялогіі. Тут працавалі пачынальнік хімічнай навукі на Беларусі К.Д.Шміт, выдатны хімік і педагог І.Цютчаў і інш.

Значных поспехаў у першай палове XIX ст. дасягнулі гістарычная навука, этнаграфія, археалогія, краязнаўства. Як асобная галіна ведаў пачало складвацца беларусазнаўства. Гэтыя галіны навуковых ведаў звязаны з імёнамі З.Даленгі-Хадакоўскага, Т.Нарбута, А.Кіркора, П.Шпілеўскага, К.Калайдовіча і ішых даследчыкаў. Вялікі ўклад у вывучэнне гісторыі і культуры Беларусі ўнеслі браты Яўстафій і Кан-

станцін Тышкевічы — гісторыкі, збіральнікі, заснавальнікі музеяў. Па ініцыятыве Я.Тышкевіча былі створаны Віленскі музей старажытнасцей і Віленская археаграфічная камісія, якая займалася збіраннем, вывучэннем і друкаваннем старажытных дакументаў. Цікаўнасць да вывучэння мінулага Беларусі, яе культуры, мовы і народных традыцый сведчыла аб працэсе нацыянальнага адраджэння беларусаў, фарміравання беларускай нацыі.

Адметнай рысай культурнага жыцця Беларусі ў першай палове XIX ст. з'яўлялася развіццё літаратуры і журналістыкі. Гэтыя галіны культуры становяцца своеасаблівай трыбунай палітычнай думкі, месцам ідэалагічнай барацьбы. Літаратура Беларусі ў гэты час характарызуецца шматмоўнасцю, разнастайнасцю мастацкіх накірункаў, шматлікасцю жанраў.

Выдатным літаратарам Беларусі ў першыя дзесяцігоддзі XIX ст. быў Адам Міцкевіч. Яго творы, напісаныя на польскай мове, могуць лічыцца культурнай спадчынай не толькі польскага народа. У сваіх ранніх творах "Мешка, князь Навагрудка", "Бульба", а таксама буйнейшых паэмах "Дзяды", "Пан Тадэвуш", "Гражына" А.Міцкевіч выкарыстаў тэмы і вобразы беларускага фальклору, сюжэты беларускай гісторыі, а яго літаратурная мова адчула на сабе значны ўплыў мовы беларускага народа, паэтыкі беларускай песні.

Характэрнай з'явай беларускай літаратуры першай паловы XIX ст. было ўзнікненне ананімных твораў "Гутарка Данілы са Сцяпанам", "Вось які люд стаў", "Вясна гола перапала", "Панаманія" і іншых, у якіх адлюстроўваліся думкі і настроі беларускіх сялян, сцвярджаліся правы прыгоннага селяніна звацца чалавекам, гучала асуджэнне існуючага сацыяльнага парадку.

Доўгі час ананімнымі былі знакамітыя беларускія паэмы "Тарас на Парнасе" і "Энеіда навыварат". Зараз найбольш верагоднымі іх аўтарамі лічацца адпаведна К.Вераніцын і В.Равінскі, але гэтае пытанне да канца не высветлена. Травесційныя па форме, напісаныя з вялікім гумарам, гэтыя паэмы тым не менш вырашалі вельмі сур'ёзную праблему — праблему народнай самабытнасці, даказвалі каштоўнасць народных традыцый, прыгажосць мовы, сцвярджалі новы жанр у беларускай літаратуры.

Сярод літаратурнай спадчыны першай паловы XIX ст. асобае месца займае ўзор рамантычнай прозы "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях"

Я.Баршчэўскага, дзе шырока выкарыстаны беларускія казкі і паданні. Тагачасныя крытыкі называлі гэты твор беларускім цыклам "1000 і адной ночы". Значны ўклад у развіццё беларускай літаратуры ўнеслі таксама Ян Чачот, аўтар фальклорных зборнікаў і вершаў на беларускай і польскай мовах, Ул.Сыракомля, В.Каратынскі і інш. У 20 — 30-я гады развіваецца паэтычны талент беларускага сялянскага паэта Паўлюка Багрыма. Аднак ва ўмовах расійскага самаўладдзя талент гэты не змог цалкам раскрыцца. За перапісванне забароненых літаратурных твораў, перш за ўсё паэмы Я.Баршчэўскага "Рабункі мужыкоў", а таксама за ўдзел у сялянскім выступленні сын вясковага рамесніка быў здадзены ў салдаты. З некалькіх сшыткаў вершаў маладога паэта, канфіскаваных паліцыяй, да нас дайшоў толькі адзін верш.

У 40-я гады да беларускага прыгожага пісьменства звяртаецца выдатны пісьменнік, драматург, грамадскі дзеяч Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Першымі творамі пісьменніка сталі "Рэкруцкі яўрэйскі набор", "Спаборніцтва музыкантаў", "Чарадзейная вада" — п'есы, напісаныя на польскай мове і ў 40-я гады пастаўленыя на мінскай сцэне. У 1846 г. убачыла свет выдатная музычная п'еса В.Дуніна-Марцінкевіча "Сялянка" ("Ідылія"), дзе ўпершыню загучала жывая беларуская гаворка. У 50-я гады В.Дунін-Марцінкевіч стварае вершаваныя апавяданні "Вечарніцы", "Гапон", "Халімон на каранацыі" і іншыя, а таксама займаецца перакладамі. Адзін з найлепшых і самых вядомых сваіх твораў — фарсвадэвіль "Пінская шляхта" пісьменнік стварыў у пачатку 60-х гадоў.

У канцы XVIII — першай палове XIX ст. найбольш масавымі відамі мастацтва становяцца тэатр і музыка. Асноўнай формай тэатральнага мастацтва ў гэты час з'яўляўся тэатр прыватнай антрэпрызы, які ўвасабляў новы, камерцыйны падыход да арганізацыі відовішчаў. Па форме дзейнасці тэатры былі "аб'язнымі". Такі тэатр меў сталую базу ў губернскім ці буйным павятовым горадзе і час ад часу рабіў турнэ па навакольных мястэчках, гарадах, маёнтках і кірмашах. У пачатку XIX ст. сталыя тэатральныя калектывы дзейнічалі ў Вільні (трупа Мараўскага), Гродне (Тэатр Саламеі Дзешнер), Мінску (трупа Кажынскага). У 30-я гады тэатральныя відовішчы адбываюцца ўжо бесперапынна ва ўсіх губернскіх і ў многіх павятовых гарадах.

Для палягчэння нагляду за тэатральным мастацтвам Беларусі ўрад у 1845 — 1847 гг. праводзіць тэатральную

рэформу. Усе вандроўныя трупы забараняліся, у губернскіх гарадах ствараліся пастаянныя руска-польскія тэатры і тэатральныя дырэкцыі. Гэтыя тэатры мелі манапольнае права на паказы ў гарадах губерні. Але рэформа не была даведзена да канца. Ужо ў сярэдзіне 50-х гадоў на Беларусі, як і раней, дзейнічаюць "аб'язныя" трупы, хаця тэатральныя дырэкцыі, створаныя ў час рэформы, працягваюць сваю работу.

Значнай падзеяй у тэатральным жыцці Беларусі стала ўзнікненне першай беларускай трупы В.Дуніна-Марцінкевіча. Аматарскае мастацтва наогул было вельмі распаўсюджана сярод беларускіх тэатралаў, а гэтая трупа спецыяльна створана для пастаноўкі п'есы В.Дуніна-Марцінкевіча "Сялянка" ў 1852 г. У яе ўваходзіла больш за 20 чалавек. Нягледзячы на тое што мінскія ўлады забаранілі публічны паказ п'есы, яна ўсё ж была пастаўлена на кватэры купца Саламонава. Затым гэтую п'есу неаднаразова ставілі на прыватных кватэрах не толькі ў Мінску, але і ў Бабруйску, Слуцку, Глуску і іншых мясцінах, куды выязджала трупа В. Дуніна-Марцінкевіча.

З тэатрам цесна было звязана музычнае мастацтва. Музыка на Беларусі ў гэтыя часы з'яўлялася адной з важных галін мастацтва. Яна гучала ў салонах мясцовай шляхты, яе выкладалі ў навучальных установах, адбываліся сольныя і аркестравыя канцэрты, музычныя спектаклі.

На Беларусі добра ведалі творы заходнееўрапейскіх кампазітараў, папулярнасцю карысталіся таксама кампазіцыі мясцовых музыкантаў. Сусветнай славай карыстаюцца творы нашых землякоў М.К.Агінскага, С.Манюшкі, добра вядомы імёны Д.Стафановіча, Ф.Міладоўскага, А.Абрамовіча і іншых таленавітых музыкантаў і кампазітараў.

У першай палове XIX ст. назіраецца значны рост будаўнічай дзейнасці: ідзе рэгулярная забудова гарадоў, узнікаюць новыя тыпы грамадзянскіх будынкаў, упершыню пачынаюць шырока выкарыстоўвацца тыпавыя праекты. Асноўным архітэктурным стылем у гэты час становіцца класіцызм. Значную ролю ў фарміраванні архітэктурнага выгляду беларускіх гарадоў і мястэчак адыграла Віленская архітэктурная школа (навучэнцы Віленскага універсітэта М.Шульц, Стуока-Гуцявічус, К.Падчашынскі). Да буйнейшых помнікаў гэтага часу адносяцца Петрапаўлаўскі сабор у Гомелі, Праабражэнская царква ў Чачэрску, Жыліцкі палац, Пакроўская царква ў Стрэшыне і інш.

Выдатных дасягненняў у першай палове XIX ст. дабілася

выяўленчае мастацтва. Важнейшую ролю ў яго развіцці ў гэты перыяд адыграла Віленская школа жывапісу — аддзяленне прыгожых мастацтваў факультэта літаратуры і мастацтва Віленскага універсітэта. Яе выкладчыкамі былі прафесар Ф.Смуглевіч — заснавальнік школы, а таксама яго вучні Я.Рустэм, К.Ельскі. Тут выкладалі выдатны графік Дж.Саўндэрс, А.Ле Брун (Лебрэн) і іншыя таленавітыя мастакі і скульптары. За 35 гадоў сваёй работы школа падрыхтавала больш за 250 мастакоў, гравёраў, скульптараў. Яе выхаванцамі былі вядомы майстар партрэтнага жанру і гістарычных кампазіцый Я.Дамель, аўтары соцень беларускіх пейзажаў графікі М.Кулеша і Н.Орда, адзін з найлепшых беларускіх партрэтыстаў В.Ваньковіч і многія іншыя.

Пасля закрыцця Віленскага універсітэта мастацкае жыццё Беларусі становіцца менш інтэнсіўным, пачынаецца адток таленавітых мастакоў у Пецярбург, у Акадэмію мастацтваў, у Маскоўскае Строганаўскае вучылішча і за мяжу. Большасць з іх пазней прыязджаюць на Беларусь толькі на нядоўгі час (К.Карсалін, Т.Гарэцкі, М.Андрыёлі і інш.). На Беларусь вярнуўся выдатны майстар нацюрморта акадэмік І.Хруцкі, у творчасці якога выразна гучыць беларуская тэматыка. Вярнуўся сюды і выдатны скульптар, актыўны дзеяч вызваленчага руху, які доўгі час пражыў у Амерыцы, Г.Дмахоўскі.

Выяўленчае мастацтва Беларусі ў гэты час багатае на стылі, жанры, тэхнікі. На змену класіцызму, які панаваў у мастацтве ў канцы XVIII — пачатку XIX ст., у 20-я гады прыходзіць рамантызм. Менавіта ў рэчышчы гэтага ідэйна-стылявога накірунку былі зроблены лепшыя творы ў жанры партрэта — вышэйшае дасягненне беларускага жывапісу першай паловы XIX ст. Многае з мастацкай спадчыны беларускіх мастакоў загінула або вывезена ў Польшчу, Расію, Літву, раскідана па замежных музеях і прыватных калекцыях.

Культура Беларусі першай паловы XIX ст. з'яўлялася важнай часткай гістарычнага працэсу. Яна была цесна звязана з культурамі суседніх народаў. У многіх галінах — выяўленчым мастацтве, літаратуры, тэатры, навуцы яна дасягнула еўрапейскіх вышынь. У гэты час фарміраваліся яе самабытнасць, непаўторныя традыцыі.

Такім чынам, ва ўмовах працяглай паланізацыі і распачатай русіфікацыі беларускі народ здолеў захаваць этнічны воблік і, нягледзячы на вялікія страты, адстаяў сваю нацыянальную перспектыву.

РАЗДЗЕЛ 7

БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX — ПАЧАТКУ XX СТ.

1. Паўстанне 1863 г. Прычыны і характар паўстання

Пачатак 1863 г. азнаменаваўся новым пад'ёмам сялянскага руху ў Беларусі, які быў вызваны надзеямі былых памешчыцкіх сялян атрымаць "сапраўдную волю" ў сувязі з пераводам іх у становішча часова абавязаных. Гэта супала па часу з нацыянальна-вызваленчым паўстаннем, якое ахапіла ў 1863 г. усю Польшчу.

Напярэдадні паўстання тут аформіліся два крылы, за якімі замацаваліся назвы "белыя" і "чырвоныя". "Белыя" (партыя землеўладальніцкай шляхты і буржуазіі) хацелі дабіцца аднаўлення Польшчы ў межах 1772 г., г. зн. з уключэннем у яе склад Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны, выкарыстоўваючы націск заходнееўрапейскіх дзяржаў на Пецярбург. "Чырвоныя" ўяўлялі сабой разнастайны ў сацыяльных і палітычных адносінах блок, у які ўваходзілі дробная і беззямельная шляхта, інтэлігенцыя, гарадскія нізы, студэнцтва і часткова сялянства. Барацьбу за незалежнасць яны звязвалі з вырашэннем аграрнага пытання. Аднак па метаду яго вырашэння "чырвоныя" дзяліліся на "правых" — памяркоўных і "левых" — прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычных колаў. "Правыя" ў рашэнні сваёй палітычнай праграмы адводзілі вядучую ролю шляхце. Баючыся сялянскага паўстання, яны ў той жа час стаялі за надзяленне сялян зямлёй за кошт канфіскацыі часткі яе ў памешчыкаў з адпаведнай грашовай кампенсацыяй.

"Левыя", прызнаючы права на нацыянальнае самавызначэнне літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў, залог поспеху нацыянальна-вызваленчай барацьбы бачылі ў саюзе з рэвалюцыйнымі сіламі Расіі. Для кіраўніцтва паўстаннем "чырвонымі" вясной 1862 г. у Варшаве быў створаны Цэнтральны нацыянальны камітэт (ЦНК).

Падобныя палітычныя плыні існавалі ў Беларусі і Літве. Так, у Вільні летам 1862 г. з мэтай падрыхтоўкі паўстання ўтварыўся Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК), які фармальна быў падначалены ЦНК. У ЛПК уваходзілі прадстаўнікі як "чырвоных", так і "белых". Па ініцыятыве ЛПК збіраліся сродкі на паўстанне і былі створаны мясцовыя рэвалюцыйныя арганізацыі: гродзен-

ская (кіраўнік К.Каліноўскі), мінская (А.Трусаў), навагрудская (У.Борзабагаты) і інш.

"Левую" частку паўстанцаў у Беларусі ўзначальваў Кастусь Каліноўскі (1838 – 1864). Ён быў выхадцам з сям'і збяднелага шляхціца Гродзенскай губерні, скончыў Пецярбургскі універсітэт, з'яўляўся актыўным членам тайнага гуртка выдатнага польскага рэвалюцыянера З.Серакоўскага. Разам з В.Урублеўскім і Ф.Ражанскім К.Каліноўскі ў 1862 – 1863 гг. выдаваў на беларускай мове газету "Мужыцкая праўда" (усяго выйшла сем нумароў), прасякнутую рэвалюцыйна-дэмакратычнымі ідэямі. Газета растлумачвала сялянам прыгонніцкі характар рэформы, заклікала іх не верыць цару і разам з мужыкамі з-пад Варшавы і ўсёй Расіі са зброяй у руках ісці здабываць "сапраўдную волю і зямлю". Развенчваючы царысцкія ілюзіі сялян, "Мужыцкая праўда" брала пад абарону уніяцкую царкву.

У ходзе паўстання, якое пачалося ў Варшаве ў ноч на 23 студзеня, ЛПК прыняў праграму, якую раней абвясціў ЦНК. Гэта праграма прадугледжвала раўнапраўе грамадзян незалежна ад саслоўя, нацыянальнасці і веравызнання, перадавала ў поўную ўласнасць сялян надзелы, якія знаходзіліся ў іх карыстанні, адмяняла іх феадальныя павіннасці. Тым не менш яна захавала памешчыцкае землеўладанне і выкуп зямлі, якая пераходзіла сялянам. Беззямельныя сяляне, удзельнікі паўстання, павінны былі атрымаць па 3 моргі зямлі. Па свайму сацыяльна-эканамічнаму характару гэта была буржуазная праграма, якая супярэчыла інтарэсам "чырвоных".

1 лютага 1863 г. ЛПК, які ўзначальваў К.Каліноўскі, звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з заклікам падняцца на ўзброеную барацьбу. Першыя паўстанцкія атрады былі створаны ў канцы студзеня на тэрыторыі заходніх паветаў Беларусі, а на астатняй тэрыторыі – у сакавіку – красавіку. Яны фарміраваліся з дробнай шляхты, афіцэраў, рамеснікаў, студэнтаў, гімназістаў старэйшых класаў, сялян. Атрады паўстанцаў, якія ўзначальвалі В.Урублеўскі, Ф.Ражанскі (Гродзенская губерня), З.Серакоўскі і А.Мацкевічус (Ковенская губерня), А.Трусаў (Мінская губерня), Л.Звяждоўскі (Магілёўская губерня), М.Чэрняк (Віленская губерня), імкнуліся прыцягнуць да паўстання як мага больш сялян, спрабавалі рэалізаваць аграрную праграму. Кіраўнікі паўстання, асабліва К.Каліноўскі, мелі намер распаўсюдзіць паўстанне на пры-

балтыйскія і рускія губерні. Для гэтага прадугледжвалася стварэнне новых атрадаў: З.Серакоўскага ў Літве і Эстоніі, О.Грабніцкага, Б.Кульчыцкага і іншых у Віцебскай губерні. На дапамогу Л.Звяждоўскаму з Пецярбурга і Масквы прыбылі афіцэры І.Будзіловіч, К.Жаброўскі і іншыя з мэтай распаўсюджвання паўстання на Смаленск і Маскву.

Баючыся актывізацыі дзеяння паўстанцаў, уплыву на сялян К.Каліноўскага, "белыя" захапілі кіраўніцтва паўстаннем у свае рукі. У сакавіку 1863 г. па ўказанню ЦНК быў створаны Аддзел кіраўніцтва правінцыямі Літвы замест распушчанага ЛПК. У склад мясцовых рэвалюцыйных арганізацый былі ўведзены прыхільнікі "белых".

У маі паўстанне ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях было падаўлена. Цэнтрам паўстанцкага руху Беларусі становіцца Гродзенская губерня, куды ў красавіку 1863 г. у якасці камісара прыязджае К.Каліноўскі. У Беларусь і Літву былі кінуты буйныя сілы для падаўлення паўстання. У маі 1863 г. генерал-губернатарам з неабмежаванымі паўнамоцтвамі быў назначаны М.Мураўёў, які атрымаў ад сучаснікаў назву "вешацель" за бязлітасную расправу над удзельнікамі руху. Тады ж для заспакаення сялян быў створаны ў змяненне "Палажэнняў 19 лютага" шэраг указаў. Згодна з імі, для Беларусі і Літвы быў уведзены абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў і прадугледжана неадкладнае вяртанне сялянскіх адрэзкаў, а таксама змяншэнне выкупных плацяжоў на 20 % і інш. Беззямельныя сяляне надзяляліся трыма дзесяцінамі зямлі.

Гэтыя меры, а таксама нерашучая палітыка ЦНК у значнай ступені скарацілі геаграфію сялянскага руху. Асноўная маса сялян Беларусі ўдзелу ў паўстанні не прымала (сярод паўстанцаў сяляне складалі не больш 18 %). Такім чынам, тактыка "левых", якія разлічвалі на пашырэнне сялянскага руху, не апраўдалася. Акрамя таго, кіраўнікі Літоўска-беларускага аддзела, асцерагаючыся рэпрэсій, пакідалі свае пасады. Панічны настрой сярод "белых" у Вільні выклікаўся таксама стратай імі веры ў дапамогу з боку Англіі і Францыі, урады якіх, нягледзячы на адкрытае спачуванне заходнееўрапейскай дэмакратыі, нічога не зрабілі для падтрымкі паўстання.

У чэрвені 1863 г. у Вільню быў вернуты К.Каліноўскі. Кіраўніцтва паўстаннем зноў перайшло ў рукі "чырвоных". Прыхільнікамі К.Каліноўскага быў створаны падпольны ўрад — "Літоўска-Беларускі чырвоны жонд". Новае кіраўніцтва зрабіла перамены ў мясцовых арганізацыях,

выкрывала паклёп урада на паўстанне як на спробу памешчыкаў вярнуць прыгоннае права, імкнулася аднавіць страчаныя сувязі з рэвалюцыйнай арганізацыяй "Зямля і воля". Аднак ажывіць паўстанне ўжо не ўдалося. Мясцовае дваранства канчаткова адышло і прыняло ўдзел у кампаніі "вернападданніцкіх адрасоў". 28 жніўня 1863 г. польскі нацыянальны ўрад аддаў загад аб спыненні ваенных дзеянняў. Узброеная барацьба ў Беларусі спынілася восенню 1863 г., а летам 1864 г. была ліквідавана апошняя рэвалюцыйная арганізацыя ў Навагрудскім павеце. Паўстанне было падаўлена. У студзені 1864 г. К.Каліноўскі быў арыштаваны. Знаходзячыся ў турме, мужны рэвалюцыянер звярнуўся да народа з "Лістамі з-пад шыбеніцы", у якіх заклікаў працягваць барацьбу. 22 сакавіка 1864 г. К.Каліноўскі быў павешаны ў Вільні.

Удзельнікі паўстання цярпелі бязлітасныя рэпрэсіі. Іх сядзібы разбураліся, маёмасць канфіскоўвалася. У Беларусі і Літве 128 паўстанцаў былі пакараны смерцю, больш за 850 чалавек сасланы на катаргу, каля 12,5 тыс. чалавек выселены, у тым ліку 500 — на пасяленне ў Сібір. Маёнткі памешчыкаў, удзельнікаў паўстання, канфіскоўваліся ў казну і на ільготных умовах прадаваліся выхадцам з цэнтральных губерняў. Землеўладальнікам "польскага паходжання" забаранялася купляць на Беларусі зямлю, сялянам — католікам норма зямлі на гаспадарку абмяжоўвалася 60 дзесяцінамі. За ўдзел у паўстанні каталіцкіх святароў закрываліся або пераўтвараліся ў праваслаўныя цэрквы некаторыя касцёлы. За падтрымку паўстання студэнтамі ўлады закрылі Горы-Горацкі земляробчы інстытут, скарацілі колькасць сярэдніх навучальных устаноў. Настаўнікі і іншыя катэгорыі мясцовай інтэлігенцыі (медыцынскія работнікі, землямеры) былі пераведзены на службу ў цэнтральныя губерні і заменены новымі, якім урад давяраў рэалізацыю сваёй палітыкі. Мэтай яе стала русіфікацыя краю.

Паўстанне 1863 г. па сваіх мэтах з'яўлялася буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй. Яно было накіравана супраць самадзяржаўя, рэшткаў прыгоннага права, супраць нацыянальнага прыгнёту і саслоўнай няроўнасці. Яно прымусіла царскі ўрад пайсці на больш выгадныя ўмовы правядзення сялянскай рэформы ў Беларусі і Літве. Паўстанне аказала вялікі ўплыў на ажыўленне рэвалюцыйнага руху ў Расіі і Заходняй Еўропе, садзейнічала абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа.

2. Сельская гаспадарка ў другой палове XIX ст.

Беларусь сярэдзіны XIX ст. уяўляла сабой аграрны рэгіён. Сельская гаспадарка вызначала яго эканамічнае становішча. Асноўную масу насельніцтва (72,3 %) складалі сяляне, якія дзяліліся на памешчыцкіх і дзяржаўных. Акрамя гэтага, на Беларусі меліся нязначныя групы сялян: удзельныя (належалі царскай сям'і), паезуіцкія, ленныя, царкоўныя і манастырскія.

Нягледзячы на прыгоннае права, паступальнае развіццё эканомікі непазбежна ўцягвала Беларусь на шлях капіталізму. Аднак гэтаму супраціўлялася дваранства, якое трымалася за свае саслоўныя правы і прывілеі. Каб павялічыць даходнасць сваіх маёнткаў, памешчыкі за кошт памяншэння сялянскіх надзелаў расшыралі панскую ворную зямлю і пераводзілі сялян з аброку на паншчыну (у 50-я гады на ёй было звыш 90 % сялян). Працэс абеззямельвання ў сувязі з увядзеннем у 40 — 50-я гады абавязковых інвентароў, якія рэгламентавалі памеры сялянскіх надзелаў і павіннасцей, дасягнуў найбольшага размаху. На ўзмацненне эксплуатацыі беларускае сялянства адказвала супраціўленнем. Толькі за 1858 — 1860 гг. на Беларусі адбылося больш за 40 выступленняў сялян, многія з якіх (каля 1/4) былі падаўлены з дапамогай войск.

Урад Аляксандра II, які разумеў неабходнасць хутчэйшай адмены прыгоннага права, у студзені 1857 г. зрабіў першы практычны крок да ажыццяўлення сялянскай рэформы: пад кіраўніцтвам імператара быў утвораны Сакрэтны камітэт.

Пад непасрэднай пагрозай хуткага ўвядзення цяжкіх для іх інвентарных правіл памешчыкі Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай губерняў праз генерал-губернатара У.І.Назімава выказалі сваю згоду на вызваленне сялян. Прадугледжвалася, што сяляне бясплатна атрымаюць толькі асабістую свабоду, а ўся зямля і нерухомая сялянская маёмасць застануцца ва ўласнасці памешчыкаў. У адказ 20 лістапада 1857 г. паследаваў рэскрыпт Аляксандра II на імя У.І.Назімава, які абвяшчаў пачатак падрыхтоўкі сялянскай рэформы. Абавязковай умовай яе правядзення было прадастаўленне сялянам акрамя сядзібнага таксама і палявога надзелу. Самадзяржаўная ўлада аказалася больш дальнабачнай, чым літоўскае і беларускае дваранства. Каб пазбегнуць рэвалюцыі, сяляне павінны атрымаць зямлю. Для падрыхтоўкі праектаў рэформы былі створаны губернскія дваранскія камітэты.

У лютым 1858 г. Сакрэтны камітэт быў перайменаваны

ў Галоўны камітэт па сялянскай справе. Цяпер гэта была публічная заканадаўча афармленая ўстанова. Губернскім камітэтам даручалася распрацаваць праекты палажэнняў аб паляпшэнні быту памешчыцкіх сялян і падаць іх у Галоўны камітэт. Большасць беларускіх памешчыкаў па-ранейшаму выказалася за беззямельнае вызваленне сялян, за ператварэнне іх у вечных арандатараў, прывязаных да памешчыцкіх маёнткаў.

Прапановы беларускіх памешчыкаў аказаліся настолькі грабежніцкімі, што рэдакцыйныя камісіі, створаныя ў сакавіку 1859 г. пры Галоўным камітэце, адхілілі іх. Для Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губерняў быў выпрацаваны спецыяльны праект "Мясцовага палажэння".

19 лютага 1861 г. Аляксандр II падпісаў адобраныя Дзяржаўным саветам заканадаўчыя акты (палажэнні) аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці, і адначасова Маніфест аб адмене прыгоннага права. Гэтыя дакументы былі апублікаваны 5 сакавіка 1861 г.

У адпаведнасці з палажэннямі памешчыкі пазбаўляліся права распараджацца асобай селяніна (прадаваць, дарыць, умешвацца ў сямейныя справы). Сяляне атрымлівалі права набываць на сваё імя нерухомую маёмасць, займацца гандлёва-прамысловай дзейнасцю. Аднак памешчык па-ранейшаму заставаўся ўласнікам на ўсю зямлю. Хаця сялянам і давалася ў карыстанне пэўная колькасць ворнай зямлі, аднак да яе выкупу яны не з'яўляліся ўласнікамі гэтай зямлі.

Да заключэння выкупной здзелкі селянін знаходзіўся ў стане часоваабавязанага і выконваў на карысць памешчыка вызначаныя павіннасці (у выглядзе паншчыны або аброку). Пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і часоваабавязанымі сялянамі рэгуляваліся ўстаўнымі граматамі, у якіх указваліся памеры зямельнага надзелу і павіннасці за яго. Складанне ўстаўных грамат ускладвалася на самога памешчыка. Землеўпарадкаванне беларускіх сялян праводзілася па двух "Мясцовых палажэннях". У Магілёўскай і васьмі паветах Віцебскай губерняў землеўпарадкаванне сялян праводзілася па "Мясцоваму палажэнню для велікарускіх, новарасійскіх і беларускіх губерняў". У беларускіх паветах, дзе панавала абшчыннае землекарыстанне, памеры зямельных надзелаў складалі: вышэйшы — ад 4 да 5,5 дзесяціны, ніжэйшы — 1/3 вышэйшага. Згодна з устаўнымі граматамі сялянам давалася ў карыстанне тая колькасць зямлі, якую яны мелі да рэформы. Калі памер надзелу перавышаў вышэйшы, памешчык меў права адрэзаць лішак на сваю карысць.

За карыстанне "поўным", г. зн. вышэйшым, надзелам сяляне павінны былі плаціць аброк (у сярэднім 8 руб. у год) або адбываць паншчыну (40 мужчынскіх і 30 жаночых дзён у год). Акрамя гэтага, сяляне павінны былі несці на карысць памешчыка і іншыя павіннасці (падводную, будаўнічую і г.д.). Захаванне кругавой парукі гарантавала памешчыкам спраўнае выкананне ўстаноўленых павіннасцей.

У Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і чатырох паветах Віцебскай губерняў землеўпарадкаванне сялян праводзілася па асобнаму "Мясцоваму палажэнню", якое не ўстанаўлівала пэўныя нормы надзелаў. У пастаянным карыстанні сялян гэтых губерняў захаваліся прысядзібныя і ворныя землі і ўгоддзі, якімі яны, згодна з інвентарамі, карысталіся да 1861 г. Калі ў сялян было больш, чым паказана ў інвентары, або ў памешчыка заставалася менш 1/3 часткі зручных зямель, то апошні меў права адрэзаць на сваю карысць да 1/6 часткі сялянскіх зямель. Памер павіннасцей вызначаўся незалежна ад памераў надзелу, але не павінен быў перавышаць інвентарную норму: паншчына — не больш 23 дзён, аброк — не больш 3 руб. з дзесяціны ў год. За выкананне павіннасцей сяляне паветаў неслі асабістую адказнасць перад памешчыкам, таму што надзел адводзіўся ў падворнае карыстанне кожнаму гаспадару.

Набыццё сялянамі зямель ва ўласнасць ажыццяўлялася праз выкуп. Правілы выкупу зямельнага надзелу былі аднолькавымі для ўсіх губерняў Расіі. Памер выкупной сумы вызначаўся на аснове шасціпрацэнтнай капіталізацыі гадавога аброку. У гэтую суму ўключаўся даход ад прыгоннай працы, якога памешчык быў пазбаўлены ў сувязі з вызваленнем сялян. Такім чынам, выкуп зямлі сялянамі, па сутнасці, з'яўляўся выкупам асобы, яе аброчных павіннасцей. Дзяржава для ажыццяўлення выкупной аперацыі давала сялянам доўгатэрміновую грашовую пазыку. Сяляне на 49 гадоў рабіліся даўжнікамі дзяржавы і павінны былі выплочваць ёй доўг высокімі працэнтамі — так званыя выкупныя плацяжы. Памер выкупу значна перавышаў фактычны кошт зямлі: напрыклад, рыначны кошт зямлі ў Мінскай губерні складаў 18 руб. за дзесяціну, а па выкупу сяляне павінны былі заплаціць за яе 79 руб. 20 кап.

"Агульным палажэннем" вызначаўся парадак кіравання сялянамі. Сельская абшчына, што складалася з сялян, якія пражывалі на землях аднаго памешчыка, выбірала сельскага старасту і зборшчыка падаткаў. Некалькі сельскіх абшчын утваралі воласць. На валасным сходзе выбіралася

праўленне на чале з валасным старшынёй, а таксама валасны суд. Сельскія і валасныя праўленні ведалі раскладам і зборам падаткаў, аб'яўлялі сялянам законы і распараджэнні цэнтральных і мясцовых улад, сачылі за грамадскім парадкам. Для ажыццяўлення рэформы ствараліся спецыяльныя органы — павятовыя міравыя з'езды і міравыя пасрэднікі, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці.

Міравым пасрэднікам, якія прызначаліся губернатарамі з мясцовых памешчыкаў, падпарадкоўвалася сялянскае кіраванне некалькіх валасцей. Асноўным іх абавязкам было садзейнічанне складанню актаў, якія вызначалі пазямельны лад і павіннасці сялян згодна з "Палажэннямі". Губернская па сялянскіх справах прысутнасць кіравала правядзеннем рэформ у губернях, старшынёй яе быў губернатар, членамі — мясцовыя памешчыкі і чыноўнікі.

Умовы адмены прыгоннага права не былі прыняты беларускім сялянствам і паслужылі штуршком да развіцця шырокага сялянскага руху. У 1861 — 1862 гг. беларускае сялянства чыніла сур'ёзныя перашкоды дзейнасці міравых пасрэднікаў, стварэнню новых органаў сялянскага "самакіравання" і ўвядзенню ўстаўных грамат. Кульмінацыяй гэтага руху з'явілася паўстанне пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага, якое супала з польскім нацыянальна-вызваленчым рухам. Паўстанне было падаўлена, аднак аказала сур'ёзны ўплыў на палітыку царызму ў адносінах да Беларусі. Царскі ўрад вымушаны быў пайсці на ўступкі сялянам.

1 сакавіка 1863 г. выйшаў указ аб адмене часоваабавязаных адносін у Ковенскай, Гродзенскай і Мінскай губернях і чатырох паветах Віленскай губерні. Праз тры месяцы гэты ўказ быў распаўсюджаны на Магілёўскую і беларускія паветы Віцебскай губерняў. Указ уводзіў абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў. Абавязковыя адносіны паміж сялянамі і памешчыкамі спыняліся з 1 мая 1863 г. Выкупныя плацяжы за надзельную зямлю зніжаліся на 20%. Сяляне пераходзілі ў разрад сялян-уласнікаў і павінны былі ўносіць выкупныя плацяжы ў павятовае казначэйства. Указам ад 9 красавіка 1863 г. ствараліся праверачныя камісіі, якія павінны былі праверыць правільнасць складання ўстаўных грамат пасля 19 лютага. Няправільна складзеныя анулявaліся. У выніку праверкі ўстаўных грамат у часткі сялян былі павялічаны зямельныя надзелы, зніжаны аброк і адпаведна выкупныя плацяжы, за сялянамі замацоўваліся сервітутныя ўгоддзі (пашы, вадапоі і г.д.), якімі яны карысталіся да рэформы 1861 г. Урадавай адміністрацыяй надавалася вялікае значэнне зем-

леўладкаванню беззямельных і малазямельных сялян. На падставе цыркуляра 17 жніўня 1863 г. сяляне, абеззямеленыя пасля 1857 г., павінны былі атрымаць свае надзелы ў поўным аб'ёме. Змянілася і землеўладкаванне дзяржаўных сялян Беларусі. Па закону ад 16 мая 1867 г. аброчны падатак пераўтвараўся ў выкупныя плацяжы, і дзяржаўныя сяляне станавіліся ўласнікамі зямельных надзелаў. Такім чынам, у выніку рэформы 1863 г. сялянству Беларусі вярнулі адрэзаныя раней землі, а таксама былі значна аблегчаны ўмовы выкупу зямлі. У адрозненне ад унутраных губерняў Расійскай імперыі феадальныя адносіны ў Беларусі былі ліквідаваны ў 1863 г. шляхам спынення часовазабавязанага становішча сялян.

Адмена прыгоннага права стварыла ўмовы для больш хуткага развіцця капіталістычных адносін у Беларусі. Наяўнасць перажыткаў і перш за ўсё буйнога памешчыцкага землеўладання вызначыла для Беларусі павольны, паступовы ("прускі") шлях буржуазна-аграрнай эвалюцыі, пры якім буйная памешчыцкая гаспадарка, якая перарастала ў буржуазную, надоўга захавала свае прыгонніцкія рысы. У 70-х гадах у Беларусі памешчыкам належала звыш 55% усёй зямлі, сялянам — менш 33,5%. Буйныя памешчыкі валодалі дзесяткамі і сотнямі тысяч дзесяцін зямлі. У большасці сялянскіх двароў ва ўласнасці знаходзілася ад 2 да 5 дзесяцін.

У развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі другой паловы XIX ст. трэба вылучыць два перыяды. Першы з іх ахоплівае 60 — 70-я гады, другі — 80 — 90-я гады. Першы перыяд характарызуецца панаваннем у памешчыцкай і сялянскай гаспадарках збожжавых напрамкаў, шырокім распаўсюджаннем адработачнай сістэмы, сутнасць якой заключалася ў апрацоўцы памешчыцкай зямлі сялянскім інвентаром за прадастаўленне яму ў арэнду ворнай зямлі і іншых угоддзяў. Найбольшае распаўсюджанне адработачная сістэма атрымала ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях памешчыкі шырока выкарыстоўвалі працу наёмных рабочых. Але і ў гэтых губернях адработкі займалі значнае месца, асабліва ў перыяд уборкі збожжа і траў. Трэба адзначыць, што ў цэлым тэхнічная ўзброенасць земляробства як у памешчыцкай, так і ў сялянскай гаспадарках амаль нічым не адрозніваласа ад дарэформеннай.

Нягледзячы на рэшткі феадальна-прыгонніцкіх адносін, капіталізм у сельскай гаспадарцы Беларусі развіваўся адносна хутка. Гэтаму садзейнічаў шэраг абс-

тавін: развіццё прамысловасці, сістэмы капіталістычнага крэдыту, рост чыгуначнага будаўніцтва і гарадоў, а таксама канцэнтрацыя войск на тэрыторыі Беларусі. Усё гэта стварала спрыяльныя ўмовы для развіцця гандлёвага земляробства і рынкавых адносін.

Моцным каталізатарам эвалюцыі сельскай гаспадаркі Беларусі з'явіўся сусветны аграрны крызіс 80 — 90-х гадоў, які выклікаў рэзкае зніжэнне цэн на хлеб. Гэта прывяло да карэнных змяненняў у эканамічнай арганізацыі і тэхнічнай аснашчанасці сельскай гаспадаркі, да канчатковай перамогі гандлёвага земляробства і павелічэння рынкавага попыту. У сувязі з вялікім скарачэннем у пачатку 80-х гадоў пасяўных плошчаў пад збожжавыя культуры сельская гаспадарка Беларусі пачала спецыялізавацца на вытворчасці тэхнічных культур (бульбы, ільну і інш.) і мяса-малочнай жывёлагадоўлі, звязанай з вытворчасцю мяса і сыру.

Развіццё малочнай гаспадаркі аказала ўплыў на змяненне структуры пасяўных плошчаў. Так, у буйных маёнтках, на землях заможных сялян (часцей за ўсё купленых і арэндных) уводзілася шматпольная сістэма севазвароту, прымяняліся мінеральныя ўгнаенні, пашыралася выкарыстанне машын (малатарні, арфы) і палепшаных сельскагаспадарчых прылад (жалезныя плугі, бароны). Па прымяненню машын Беларусь стаяла на адным з першых месц у Расійскай імперыі, хаця ў цэлым ва ўсёй сельскай гаспадарцы пераважала ручная тэхніка.

Важным відам капіталістычнай прадпрымальнасці як у памешчыкаў, так і ў заможных сялян было вінакурства, асноўнай сыравінай для якога спачатку было зерне, пераважна жыта, затым бульба. Адходы вінакурства ішлі на корм жывёле.

Развіццё гандлёвага земляробства, спецыялізацыя яго па асобных галінах (малочная жывёлагадоўля, вытворчасць ільну, пянькі, вінакурства) пашырылі абмен паміж земляробствам і прамысловасцю. Гэта садзейнічала росту ўнутранага рынку і прывяло ў канцы XIX ст. да паяўлення ў памешчыцкай гаспадарцы буйных высокатаварных капіталістычных форм, якія працавалі выключна на рынак. Колькасць малатаварных маёнткаў, заснаваных на адработачнай сістэме, паступова скарачалася. Збяднелыя дваране прадавалі маёнткі і ішлі на дзяржаўную службу, а іх зямля трапляла ў капіталістычны абарот. Адна яе частка куплялася дваранствам, астатняя набывалася купцамі і заможнымі сялянамі.

Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадар-

цы ўзмацніла працэс сацыяльнага расслаення сялянства. З аднаго боку, расла сельская буржуазія, а з другога — павялічвалася маламаёмаснае сялянства. Надзельная зямля, атрыманая ў 60-х гадах па ўраўняльнаму прынцыпу, ужо к канцу 70-х гадоў была размеркавана нераўнамерна. Павялічылася колькасць беззямельных двароў. Малазямельныя і беззямельныя сяляне, вымушаныя наймацца да памешчыкаў або заможных сялян, па сутнасці рабіліся наёмнымі сельскагаспадарчымі рабочымі.

На пачатак XX ст. у беларускай вёсцы беднята складала 60%, сераднякі — каля 30, сялянская буржуазія — 10% ад усіх сялян.

Тысячы сялян-беднякоў ішлі ў адходныя промыслы — на будаўніцтва чыгунак, у шахты Данбаса, на заводы прамысловых цэнтраў Расіі. Заможныя сяляне вялі сваю гаспадарку, выкарыстоўваючы наёмную працу, нярэдка спалучалі гандлёвае земляробства і жывёлагадоўлю з ліхвярскімі аперацыямі. Такі селянін выступаў і як капіталіст-фермер, і як гандляр, і як ліхвяр. Гэта сведчыла аб магчымасці развіцця ў Беларусі фермерскага ("амерыканскага") шляху развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Аднак рэалізацыі гэтай магчымасці ў рэчаіснасць перашкаджала наяўнасць памешчыцкага землеўладання.

3. Развіццё прамысловасці і гарадоў у другой палове XIX ст.

У 60-я гады XIX ст. прамысловасць Беларусі знаходзілася пераважна на дробнатаварнай і мануфактурнай стадыях развіцця. У 1860 г. тут налічвалася 20 тыс. рамесніцкіх майстэрняў, 7,8 тыс. немеханізаваных дробнакапіталістычных прадпрыемстваў (з колькасцю рабочых да 16 чалавек), 140 мануфактур і 76 фабрык і заводаў. Большая частка рамесніцкай вытворчасці Беларусі была сканцэнтравана ў гарадах і мястэчках. За чатыры паслярэформенныя дзесяцігоддзі адбылося павелічэнне кошту яе вытворчасці з 4,3 млн руб. у 1860 г. да 14,1 млн руб. у 1900 г., што было абумоўлена перш за ўсё павелічэннем попыту сялянства, местачковага і гарадскога насельніцтва на прадметы штодзённага ўжытку і паслугі, якімі не магла забяспечыць фабрыка. Хуткімі тэмпамі развіваліся новыя віды рамёстваў — хімічныя, метала- і дрэваапрацоўчыя і інш. Павялічылася ўдзельная вага рамяства ў агульнай колькасці прадпрыемст-

ваў і па колькасці працуючых на іх рабочых адпаведна з 23,2 (1860 г.) да 55,8% (1900 г.) і з 21,5 да 40%. У канцы XIX ст. налічвалася звыш 58 тыс. рамесніцкіх майстэрняў. Аднак доля іх у агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці знізілася за паслярэформенны перыяд з 18,7 да 9,0%.

У гэты час адбываўся рост дробнай вытворчасці ў форме простай кааперацыі, у якую ва ўмовах развіцця грашовых адносін перарастала рамяство. У 1860 г. дробнакапіталістычная прамысловасць складала 9% ад агульнай колькасці прадпрыемстваў і 62% вырабленай прадукцыі. Да 1888 г. на яе прадпрыемствах выпрацоўвалася больш паловы прамысловых вырабаў Беларусі. Аднак у сувязі з інтэнсіўным павелічэннем мануфактурна-фабрычнай вытворчасці ўдзельная вага дробнакапіталістычнай паменшылася да 28,2% у канцы XIX ст., хаця доля апошняй у той жа час па колькасці прадпрыемстваў павялічылася на 7%.

У другой палове XIX ст. адзначаны значны рост мануфактурнай вытворчасці. Удзельная вага яе ў гэты перыяд павялічылася па аб'ёму вытворчасці з 7,2 да 15,1%, па колькасці наёмных работнікаў з 3,3 да 10,4%, па колькасці прадпрыемстваў з 0,2 да 0,7%. У 1900 г. у Беларусі працавала 760 мануфактур, у тым ліку 193 дрэваапрацоўчыя, 185 сілікатных, 166 харчасмакавых і інш. Мануфактуры заклалі асновы росту фабрычнай прамысловасці, фарміравання пралетарыяту і буржуазіі.

Машынная вытворчасць у другой палове XIX ст. развівалася асабліва інтэнсіўна. Колькасць фабрык і заводаў павялічылася ў Беларусі ў 15 разоў і склала на канец XIX ст. 1137. Аб'ём вытворчасці на іх узрос у 37 разоў, колькасць рабочых — у 9. Найбольш высокімі тэмпамі машынная індустрыя развівалася ў 90-х гадах. Да 1900 г. доля фабрычна-завадской прамысловасці ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці склала 46,2% (1860 г. — 8,4%, 1890 г. — 29,3%), па колькасці прадпрыемстваў — 1,1% (1860 г. — 0,1%, 1890 г. — 0,6%), па колькасці рабочых — 12,1% (1860 г. — 2,2%, 1890 г. — 6,4%). Тэмпы росту аб'ёму вытворчасці і колькасці занятых наёмных работнікаў у мануфактурнай і машыннай прамысловасці ў чатыры — сем разоў перавышалі адпаведныя паказчыкі ў дробнай.

Шырокае чыгуначнае і прамысловае будаўніцтва спрыяла паскоранаму развіццю галін па вырабу сродкаў вытворчасці. Пры росце прадукцыі ўсёй прамысловасці Беларусі ў 6,8 раза у цяжкай прамысловасці аб'ём вытворчасці павялічыўся амаль у 12 разоў. У канцы XIX ст. сродкі

вытворчасці складалі 32% усёй прамысловай прадукцыі Беларусі (для параўнання: па Расійскай імперыі наогул каля 40%). Найбольш буйныя фабрыкі і заводы знаходзіліся ў гарадах. Аднак 2/3 фабрык і заводаў Беларусі і амаль палова занятых на іх рабочых былі сканцэнтраваны ў вёсцы. Гэта было абумоўлена ў значнай ступені спецыялізацыяй беларускай прамысловасці на апрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны.

Гарадское насельніцтва Беларусі за другую палову XIX ст. павялічылася ў 2,2 раза. Яго рост перавышаў тэмпы росту насельніцтва наогул. Гарадское насельніцтва ў сучасных межах дзяржавы склала ў 1858 г. 293,6 тыс. чалавек (9% ад агульнай колькасці жыхароў), а ў 1897 г. — 655,1 тыс. чалавек (10,3%). Буйных гарадоў на Беларусі ў той час не было. У канцы XIX ст. толькі два з іх (Мінск і Віцебск) мелі колькасць жыхароў у межах ад 50 да 100 тыс. чалавек, сем (Брэст, Гродна, Гомель, Магілёў і інш.) — ад 20 да 50 тыс. Каля 500 тыс. чалавек жыло ў канцы XIX ст. у мястэчках Беларусі. Большая частка іх насельніцтва, як і ў гарадах, займалася гандлёва-прамысловай дзейнасцю.

Росту гарадоў, развіццю прамысловасці, пашырэнню гандлёвых сувязей спрыяла ўдасканаленне транспартнай сістэмы. У пачатку XX ст. з разліку на 100 кв. вёрст Беларусь мела шашэйных дарог у два разы, а рачных — у тры разы больш, чым у сярэднім у Еўрапейскай Расіі. У рачным суднаходстве ў гэты час значна ўзрасла роля параходаў. Аднак вялікі ўплыў на гаспадарчае жыццё Беларусі аказала чыгуначнае будаўніцтва. У 1862 г. праз тэрыторыю Беларусі прайшла Пецярбургска-Варшаўская дарога, у 1866 г. — Рыга-Арлоўская чыгунка, у 70-х гадах — Маскоўска-Брэсцкая і Лібава-Роменская магістралі. У 80-я гады пачалі дзейнічаць Палескія чыгункі, з 1902 г. — Пецярбургска-Адэская магістраль. У выніку Беларусь атрымала больш цесную сувязь паміж рознымі ўласнымі рэгіёнамі, а таксама з важнейшымі індустрыяльнымі раёнамі Расійскай імперыі. У гандлі паступова страчваюць сваю ролю кірмашы, затое актывізуюць дзейнасць крамы і гандлёвыя лаўкі. У канцы XIX ст. на магазінна-лавачны гандаль прыходзілася 95% усяго ўнутранага абароту гарадоў. Аднак большасць купцоў на Беларусі мела нязначныя капіталы. Павелічэнню таварнага абароту і развіццю гандлю садзейнічала дзейнасць розных гандлёвых аб'яднанняў, крэдытных устаноў, банкаў і ашчадных кас. У 80-я гады XIX ст. на Беларусі ўжо працавалі аддзяленні Дзяр-

жаўнага, Сялянскага, Дваранскага банкаў, Мінскі камерцыйны банк і інш.

Развіццё прамысловасці і гандлю выклікала фарміраванне значнага слоя прадпрымальнікаў. Буржуазія пашыралася за кошт прадстаўнікоў розных саслоўяў, найперш дваранства і купецтва, а таксама мяшчан, пачэсных грамадзян, сялян і інш. Асноўная маса мануфактур і фабрык да канца XIX ст. належала дваранам. Гэта былі пераважна прадпрыемствы па прамысловай перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі з памешчыцкіх маёнткаў. Уладальнікамі дробных прадпрыемстваў у гарадах і мястэчках Беларусі з'яўляліся звычайна мяшчане, у большасці сваёй прадстаўнікі яўрэйскай нацыянальнасці. За другую палову XIX ст. агульная колькасць уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў у Беларусі вырасла з 28,2 тыс. у 1860 г. да 77,1 тыс. чалавек у 1900 г. Сюды ўключаны гаспадары рамесных, дробнакапіталістычных і мануфактурна-фабрычных прадпрыемстваў, пры гэтым звыш 75% складалі ўладальнікі першых з іх і толькі каля 2,5 % (1897 чалавек) адносіліся да буйной і сярэдняй буржуазіі, уладальнікаў фабрык, заводаў, мануфактур. У 1890 г. сярод 343 уладальнікаў фабрык і заводаў Беларусі, улічаных афіцыйнымі статыстычнымі крыніцамі Расійскай імперыі, 169 (49,3%) з'яўляліся дваранамі, 113 (32,9%) купцамі, 14 (4,1%) мяшчанамі, 5 (1,5%) сялянамі. З цягам часу паступова змяншалася доля дваран сярод уладальнікаў буйных і сярэдніх прадпрыемстаў. У паслярэформенныя дзесяцігоддзі значна пашырылася гандлёвае прадпрымальніцтва. Да канца XIX ст. заканадаўча яно спалучалася з прыналежнасцю да купецкага саслоўя. Перапіс насельніцтва 1897 г. зафіксаваў на тэрыторыі Беларусі звыш 18 тыс. прадстаўнікоў купецтва. Па памерах капіталаў гандлёвая буржуазія ў Беларусі пераважала над прамысловай.

Да часу правядзення рэформы 1861 г. у прамысловасці Беларусі налічвалася 41,5 тыс. наёмных работнікаў, у тым ліку 3,1 тыс. фабрычных і 4,7 тыс. мануфактурных. У 60 — 70-х гадах XIX ст. павелічэнне колькасці пралетарыяту ў Беларусі адбывалася адносна невысокімі тэмпамі. У далейшым, асабліва ў 90-я гады, рост колькасці рабочых паскорыўся. У пачатку XX ст. у прамысловасці Беларусі працавала 237 тыс. рабочых. На чыгунках колькасць рабочых дасягала 25 тыс. чалавек. Разам з іншымі сферамі народнай гаспадаркі агульная колькасць пастаянных наёмных работнікаў дасягала ў той час 460 тыс. чалавек. Найбольш масавай сацыяльнай базай папаўнення прадстаўнікоў пралетарыяту было збяднe-

лае сялянства, але з-за існаваўшай у той час рысы аседласці яўрэяў яно не магло знайсці працу на прадпрыемствах гарадоў і мястэчак Беларусі, а шукала найму на работу ў сельскай і лясной гаспадарцы, а таксама на транспарце і прамысловых прадпрыемствах, размешчаных у вёсках. Гарадскі пралетарыят на Беларусі найперш папаўняўся за кошт збяднелых мяшчан, рамеснікаў, гандляроў.

Наогул для другой паловы XIX ст. характэрна паступовае разлажэнне класаў-саслоўяў папярэдняй эпохі і станаўленне як адметных сацыяльных сіл пралетарыяту і буржуазіі, сацыяльна-класавай структуры буржуазнага грамадства. У аснове гэтых пераўтварэнняў ляжалі працэсы, якія адбываліся ў той час у эканоміцы Беларусі.

4. Грамадскэ-палітычнае жыццё ў другой палове XIX ст.

Сялянскі рух. Сялянская рэформа 1861 г. знішчыла шматвяковы знешнеэканамічны прымус сялян, ліквідавала прыгонніцкае самавольства, стварыўшы тым самым перадумовы для арганізацыі працы на новых, капіталістычных асновах. Аднак умовы, на якіх адбылася адмена прыгоннага права, вызначылі асаблівасці аграрнай эвалюцыі Беларусі ў парэформенны час, якія выяўляліся перш за ўсё ў вострым сялянскім малазямеллі.

Акрамя таго, ва ўласнасці памешчыкаў па ўмовах рэформы заставаліся і так званыя сервітутныя землі (лясы, сенажаці, выганы), без якіх сялянская гаспадарка не магла абысціся. Выкарыстоўваючы зямельную патрэбнасць сялян, памешчыкі закабалялі іх арэндай, якую сяляне вымушаны былі браць за празмерна высокую грашовую плату і за адработкі, што, па сутнасці, з'яўлялася падноўленай формай старой паншчыны. І пасля рэформы сяляне па-ранейшаму заставаліся нераўнапраўным, ніжэйшым саслоўем. У адрозненне ад дваранства, духавенства і купецтва сяляне павінны былі плаціць дзяржаве падушную подаць, пазямельны падатак, выкупныя плацяжы, выконваць падворную, дарожную, паліцэйскую павіннасці, маглі атрымліваць цялесныя пакаранні.

Расслаенне і збядненне большасці сялян, іх абеззямельванне, захаванне буйнога памешчыцкага землеўладання абумовілі развіццё сялянскага руху ў Беларусі ў парэформенны час. Асноўнымі патрабаваннямі сялян былі вяртанне

зямель, адрэзаных памешчыкамі ў час рэформы, памяншэнне падаткаў і павіннасцей, пазбаўленне ад паліцэйскай апекі і саслоўнай нераўнапраўнасці.

Дынаміка сялянскіх выступленняў была неаднолькавай. Калі ў першыя гады пасля падаўлення паўстання 1863 г. адбываўся спад сялянскіх выступленняў, то ў 70-я гады наглядаўся іх значны пад'ём. Асаблівую вастрыню і размах сялянскі рух набывае ў сярэдзіне 80-х — 90-я гады, калі разам з традыцыйнымі канфліктамі паміж сялянамі і памешчыкамі з'яўляюцца новыя — паміж сялянскай буржуазіяй і беднатой. Своеасаблівай формай барацьбы тых гадоў з'явіўся масавы рух сялян, асабліва Магілёўскай, Віцебскай і асобных паветаў Мінскай губерняў за перасяленне на свабодныя землі — у Сібір і паўднёварасійскія губерні. Паступова элементы арганізаванасці і свядомасці пранікаюць у сялянскае асяроддзе. Жыццё без прыгнёту адбілася на свядомасці селяніна, сцвердзіла ў ім пачатак грамадзянскасці.

Звычайным адказам мясцовай адміністрацыі на сялянскія хваляванні было прыцягненне войска.

Народніцкі рух. Нявырашанасць аграрнага пытання выклікала ў парэформенай Расіі шырокі рух разначыннай інтэлігенцыі, які атрымаў назву народніцтва. Ідэалогія народніцтва шукала шляхі сацыяльнай перабудовы Расіі зыходзячы з асаблівасцей яе развіцця. Вера ў магчымасць непасрэднага пераходу, мінуючы капіталізм, да сацыялістычнага ладу праз сялянскую абшчыну складала галоўны змест тэорыі рускага утапічнага сацыялізму наогул і народніцтва ў прыватнасці. Заснавальнікамі гэтай тэорыі былі А.І.Герцэн і М.Г.Чарнышэўскі. Спрадвечна ў народніцтве прысутнічалі дзве тэндэнцыі: рэвалюцыйная і рэфарматарская. Радыкальна настроеная інтэлігенцыя ўспрымала ідэі сялянскага сацыялізму як заклік да непасрэднага рэвалюцыйнага руху, а больш памяркоўная яе частка — як праграму паступовага прасоўвання наперад праз рэформы. Найвышэйшага пад'ёму рэвалюцыйны рух народніцтва дасягнуў у 70-я — пачатку 80-х гадоў, што праявілася тэарэтычна і практычна ў трох праграмах: прапагандысцкай (П.Л.Лаўроў), бунтарскай (М.А.Бакунін), змоўніцкай (Л.Н.Ткачоў). Народніцтва мела месца і ў Беларусі, дзе атрымала распаўсюджанне як ідэалогія і грамадскі рух сярод перадавой беларускай моладзі.

Народнікі Беларусі былі ідэйна і арганізацыйна звязаны з рускім народніцтвам. Ідэі Герцэна і Чарнышэўскага былі знаёмы К.Каліноўскаму, В.Урублеўскаму, З.Серакоўскаму і іншым будучым кіраўнікам і ўдзельнікам паўстання 1863 —

1864 гг. Так, у канцы 1862 г. у склад "Зямлі і волі" поўнасцю ўвайшоў "Камітэт рускіх афіцэраў" у Польшчы, 40% членаў якога складалі ўраджэнцы беларуска-літоўскіх губерняў. Сярод вядомых прапагандыстаў-удзельнікаў "хаджэння ў народ" пачатку 70-х гадоў былі ўраджэнцы Беларусі С.П.Кавалік, М.К.Судзілоўскі, К.Н.Брэшка-Брэшкоўская і інш. У 1874 – 1884 гг. зямляцтвы і нелегальныя групы беларускіх студэнтаў існавалі ў многіх вышэйшых навучальных установах Расіі. Члены гэтых арганізацый нярэдка з'яўляліся кіраўнікамі народніцкіх гурткоў у Мінску, Магілёве, Віцебску, Пінску, Гродне, Слуцку і іншых гарадах Беларусі. Як правіла, гэта былі пераважна гурткі навучэнцаў, якія займаліся самаадукацыяй, вывучалі забароненую літаратуру і рабілі спробы весці агітацыю ў сялянскім асяроддзі. Гэтыя нясталыя ў палітычных адносінах гурткі дзейнічалі цалкам у традыцыях агульнарасійскіх народніцкіх арганізацый. Нават такія вядомыя дзеячы агульнарасійскага рэвалюцыйнага руху, выхадцы з Беларусі, як Г.Ісаеў, А.Зундзілевіч, С.Гаховіч, М.Янчэўскі, І.Гецаў і іншыя, не змаглі ўбачыць гістарычных, сацыяльна-эканамічных і нацыянальных асаблівасцей Беларусі.

З узнікненнем у Пецярбургу арганізацыі "Зямля і воля" (1876) народніцкі рух у Беларусі развіваецца пад яе непасрэдным уплывам. Цэнтрам руху становіцца Мінск, дзе найбольш актыўна дзейнічаў гурток М.Вэлера, створаны ў 1877 г.

Рэпрэсіі ўрада супраць членаў "Зямлі і волі" прымусілі народнікаў перагледзець тактыку барацьбы з самаўладствам. У 1879 г. адбыўся раскол "Зямлі і волі" на дзве арганізацыі – "Чорны перадзел" і "Народную волю". Адмовіўшыся ад палітычнай барацьбы, чорнаперадзельцы лічылі галоўнай мэтай ажыццявіць перадзел зямлі памешчыкаў паміж сялянамі. "Народная воля" адстойвала неабходнасць узмацнення палітычнай барацьбы супраць самаўладства і стаяла за індывідуальны тэрор. Раскол знайшоў адлюстраванне і сярод беларускіх арганізацый "Зямлі і волі". Спачатку вялікая частка беларускіх народнікаў пайшла за чорнаперадзельцамі. Гэтаму садзейнічалі прыезды Г.В.Пляханава ў Мінск, дзе пасля правалу ў Пецярбургу была арганізавана ў 1881 г. нелегальная друкарня "Чорнага перадзелу". Аднак арышты чорнаперадзельцаў у Маскве і Пецярбургу, разгром друкарні ў Мінску, вымушаная эміграцыя яе кіраўнікоў адмоўна сказаліся на настроі чорнаперадзельцаў Беларусі, большая частка якіх перайшла на пазіцыі "Народнай волі". Асабліва

аўтарытэт "Народнай волі" павысіўся пасля 1 сакавіка 1881 г., калі бомбай, якую кінуў ураджэнец Мінскай губерні І.Грынявіцкі, быў забіты Аляксандр II. Пераходу чорнаперадзельцаў на бок "Народнай волі" садзейнічаў таксама прыезд у Беларусь маскоўскіх нарадавольцаў Р.Апельберга, І.Лампе, М.Грачэўскага, М.Аўчыннікава і інш. Задача заключалася ў стварэнні з разрозненых мясцовых народніцкіх гурткоў адзінай рэгіянальнай арганізацыі Беларусі і Літвы. У пачатку 1882 г. такая арганізацыя пад назвай "Паўночна-Заходняя арганізацыя "Народнай волі" была створана. Яе кіруючы цэнтр — цэнтральная група — знаходзіўся ў Вільні. Арганізацыя аб'ядноўвала народніцкія гурткі Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губерняў. Дзейнасць гэтай арганізацыі была накіравана на стварэнне новых груп, на збор сродкаў для партыі, на арганізацыю падпольнай друкарні. Нарадавольцы Беларусі актывізавалі таксама работу "Ваеннай арганізацыі", "Народнай волі" ў гарнізонах беларускіх гарадоў.

Аднак у хуткім часе паліцыі ўдалося напасці на след цэнтральнай групы і арыштаваць яе членаў. Да канца 1882 г. цэнтр фактычна перастаў існаваць. Народніцкія гурткі працягвалі існаваць у Гродне, Віцебску, Мінску, Пінску, Магілёве, Горках і вялі работу сярод навучэнцаў, рамеснікаў, рабочых Беларусі.

У пачатку 80-х гадоў была зроблена спроба стварыць цэнтр беларускіх народнікаў у Пецярбургу. Ініцыятарам выступіла беларускае зямляцтва пры Пецярбургскім універсітэце. Яно аб'ядноўвала прадстаўнікоў усіх напрамкаў народніцтва. У 1881 г. зямляцтва выступіла са зваротам "Да беларускай моладзі", у якім заклікала беларускую інтэлігенцыю і студэнцтва да грамадскай дзейнасці на карысць Беларусі ў межах існуючага ладу. Блізкія да іх шырокія ліберальна-асветніцкія погляды выказаны ў 1882 г. у ананімных гектаграфічных "Лістах аб Беларусі" за подпісам Данілы Баравіка. У адказ з'явілася таксама ананімнае "Пасланне да землякоў-беларусаў" (1884), у якім аўтар ("Шчыры беларус") палемізуе з рэфарматарскімі палажэннямі "Лістоў аб Беларусі" і заклікае да звяржэння самадзяржаўя ў саюзе з усімі рэвалюцыйнымі сіламі Расіі.

У пачатку 1884 г. з ініцыятывай аб'яднання ў агульную арганізацыю ўсіх народніцкіх гурткоў Беларусі выступіла група "Гоман", у якую ўваходзілі беларускія студэнты, што навучаліся ў Пецярбургу. Імі былі надрукаваны два нумары перыядычнага выдання пад назвай "Гоман". Члены

групы А. Марчанка, Н. Ратнер і іншыя прызнавалі праграму "Народнай волі", але лічылі неабходным аб'яднаць усе рэвалюцыйныя сілы Расіі для звяржэння самадзяржаўя.

Вельмі выразна гоманаўцы паставілі нацыянальнае пытанне. Зыходзячы з прынцыпу раўнапраўя ўсіх народаў, члены "Гоману" абвяшчалі права беларускага народа на нацыянальную самастойнасць. Гоманаўцы ўпершыню ў гісторыі грамадскай думкі Беларусі заявілі аб існаванні беларускай нацыі. Будучую вольную ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту Расію яны ўяўлялі як федэрацыю самакіруючых абласцей на чале з Устаноўчым сходам. "Беларуская сацыяльна-рэвалюцыйная група", як называлі сябе гоманаўцы, мела сувязі са студэнцкімі арганізацыямі Расіі, гурткамі Віцебска, Магілёва і Мінска. Аднак стварыць адзіную арганізацыю ўсёй Беларусі гоманаўцы так і не змаглі. Гэта было абумоўлена тым, што ў той час беларускае рэвалюцыйнае народніцтва, таксама як і расійскае, перажывала крызіс і сыходзіла з гістарычнай сцэны, уступаючы дарогу марксізму.

У 1884 — 1890 гг. пануючым накірункам у народніцтве становіцца ліберальны. Адмовіўшыся ад рэвалюцыйнай барацьбы з урадам, ліберальныя народнікі сканцэнтравалі ўвагу на ўмацаванні сялянскага землеўладання, спадзеючыся тым самым затрымаць працэс абеззямельвання сялян. Яны прапаноўвалі ўзмацніць абшчыннае землеўладанне, даць сялянам ільготныя крэдыты, развіваць пад апекай урада сялянскія промыслы. Беларускія народнікі віталі праект адмены сервітутаў і чыншавую рэформу, адкрылі ў Мінску аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка. Погляды беларускіх ліберальных народнікаў аказалі значны ўплыў на павелічэнне цікавасці інтэлігенцыі да нацыянальнай гісторыі і культуры Беларусі.

Рабочы рух. Развіццё капіталістычных адносін у эканоміцы Беларусі прывяло да фарміравання значных кадраў рабочага класа, занятага ў фабрычнай, мануфактурнай і дробнай прамысловасці, на чыгунках і водных шляхах. З-за спецыфікі прамысловага развіцця рэгіёна (наяўнасць мноства дробных прадпрыемстваў з невялікай колькасцю занятых на іх рабочых) становішча пралетарыяту Беларусі было больш цяжкім, чым па Расіі ў цэлым.

Нялёгкае становішча рабочых (13 — 14-гадзінны працоўны дзень, нізкая аплата працы, адвольныя штрафы, жабрацкія жыллёвыя ўмовы, а таксама адсутнасць страхавога і пенсіённага забеспячэння) вымушала іх да правядзення ста-

чак з вылучэннем патрабаванняў эканамічнага характару. Разнастайнымі былі і формы пратэсту беларускіх рабочых. Так, у 1864 — 1865 гг. на будаўніцтве чыгункі Віцебск — Дзінабург асноўнай формай пратэсту былі ўцёкі, а ў 70-я гады асноўнай формай сацыяльнага пратэсту становіцца стачка. Па няпоўных даных, у 70-я — першай палове 90-х гадоў адбыліся 23 забастоўкі і хваляванні, якія адрозніваліся ўсё ўзрастаючай арганізаванасцю. Найбольш буйныя хваляванні былі на цагельным заводзе ў Брэсцкай крэпасці (1873), у слясарна-кавальскіх майстэрнях Маскоўска-Брэсцкай чыгункі (1876), на будаўніцтве чыгуначных дарог Вільна — Баранавічы (1884), Лібава-Роменскай у Гомелі (1886, 1894), а таксама ў чыгуначных майстэрнях у Пінску (1893), трыкатажных майстэрнях Смаргоні (1895).

На чале рабочага руху, як правіла, ішлі чыгуначнікі, адзін з найбольш арганізаваных і буйных атрадаў рабочага класа Беларусі. У цэлым жа рабочы рух 70-х — пачатку 90-х гадоў заставаўся стыхійным і быў накіраваны на паляпшэнне матэрыяльнага становішча рабочых: павышэнне заработнай платы, скарачэнне працоўнага дня, паляпшэнне ўмоў працы, супраць спагнання штрафаў.

Безумоўнымі прыкметамі з'яўлення рабочага пытання ў краіне было рабочае заканадаўства 80 — 90-х гадоў, якое абмяжоўвала выкарыстанне дзіцячай і жаночай працы (1882, 1885), памеры штрафаў (1886), працягласць працоўнага дня (11,5 гадзіны) (1897). Для выканання гэтых і іншых абмежаванняў была ўведзена ў 1882 г. фабрычная інспекцыя.

У той жа час рабочы рух 70-х — першай паловы 90-х гадоў падрыхтаваў умовы для пераходу ў другой палове 90-х гадоў масавага рабочага руху да свядомай палітычнай барацьбы.

Прапаганда марксізму і ўтварэнне нерабочых саюзаў. Упершыню планамерную прапагандысцкую работу сярод беларускіх рабочых пачалі весці народнікі. У гуртках, створаных у 1876 і 1877 гг. у Мінску, а таксама ў пачатку 80-х гадоў у Магілёве, Віцебску, Гомелі, Брэсце і Гродне, рабочыя займаліся самаадукацыяй, чыталі рэвалюцыйную літаратуру. Пад'ём рэвалюцыйнага руху ў 80-я — пачатку 90-х гадоў садзейнічаў абуджэнню цікавасці рабочых да палітычнага жыцця, распаўсюджванню сярод іх марксісцкіх ідэй.

Знаёмства з марксісцкай літаратурай у Беларусі пачалося яшчэ да сярэдзіны 70-х гадоў, калі ў асобных народніцкіх гуртках разам з работамі Дарвіна і Ласаля вывучаліся працы К.Маркса і Ф.Энгельса. Многае для распаўсюджвання

марксізму ў Беларусі зрабілі польская партыя "Пралетарыят" (1882) і асабліва група "Вызваленне працы" (1883), у якой актыўна ўдзельнічалі беларускія народнікі А.Трусаў і С.Пяўкоў, пісьменнік і рэвалюцыянер А.Гурыновіч. У другой палове 80-х — пачатку 90-х гадоў у Мінску (З.Абрамовіч, Л.Гурвіч, С.Трусевіч), Гродне (Н.Дземяновіч, С.Галюн), Віцебску (М.Сакоўкін-Заслаўскі і яго жонка П.Дубінская), Гомелі (А.Поляк) былі арганізаваны марксісцкія гурткі і групы, у якіх вывучаліся працы К.Маркса і Ф.Энгельса. Першыя марксісцкія гурткі ў Беларусі былі нешматлікімі і слаба звязаны з масавым рабочым рухам.

Новы этап распаўсюджвання марксізму пачынаецца з сярэдзіны 90-х гадоў, калі ў выніку стварэння ў Пецярбургу "Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа" (1895) рабочы рух Беларусі злучаецца з агульнарасійскім сацыял-дэмакратычным рухам. Членамі гэтага саюза былі ўраджэнцы Беларусі Л.Н.Лепяшынскі, М.Левашкевіч, Т.Максімаў і інш. У другой палове 90-х гадоў сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ўжо існавалі ў Мінску, Гомелі, Віцебску, Смаргоні, Ашмянах, Брэст-Літоўску, Гродне, Пінску. Яны праводзілі палітычную агітацыю сярод рабочых, распаўсюджвалі лістоўкі і рэвалюцыйную літаратуру. Пад непасрэдным уздзеяннем сацыял-дэмакратаў з другой паловы 90-х гадоў актывізуецца стачачны рух беларускіх рабочых. Так, з 59 стачак, праведзеных у 90-х гадах, на другую палову прыпадае 53, г.зн. звыш 90%.

Дзейнасць польскіх і яўрэйскіх нацыянальна-палітычных арганізацый. Іх уплыў на сацыяльнае жыццё. У рабочым і сацыял-дэмакратычным руху Беларусі ў канцы 90-х гадоў з'яўляюцца і свае спецыфічныя рысы: імкненне яўрэйскіх, літоўскіх і польскіх сацыял-дэмакратаў стварыць рабочыя арганізацыі па нацыянальнай прыкмеце. Гэта была своеасаблівая рэакцыя на нацыянальную палітыку ўрада (напрыклад, яўрэйскае заканадаўства 80 — 90-х гадоў).

У верасні 1897 г. у Вільні адбыўся з'езд прадстаўнікоў яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый Вільні, Мінска, Віцебска, Беластока, Коўна, Варшавы, на якім было абвешчана аб стварэнні "Усеагульнага яўрэйскага саюза ў Расіі і Польшчы" (Бунда). Упэўненасць Бунда ў тым, што толькі нацыянальная арганізацыя рабочых можа найлепш абараніць іх інтарэсы, прывяла сацыял-дэмакратыю Беларусі да расколу на тры групы. Так, брэсцкая арганізацыя і частка гродзенскай далучаліся да бундаўцаў. Гродзенскія сацыял-дэмакраты, якія адмовіліся ад узаемадзеяння з расійскім пра-

летарыятам, уступілі ў Польскую сацыялістычную партыю (ППС). Мінскія сацыял-дэмакраты стварылі рабочую партыю палітычнага вызвалення Расіі (РППВР). Яе члены наладзілі рэвалюцыйныя сувязі з сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі Расіі, Украіны і былі прыхільнікамі і прапагандыстамі тэрарыстычнай барацьбы з самадзяржаўем.

Рост рэвалюцыйнага руху, павелічэнне колькасці сацыял-дэмакратычных арганізацый, пашырэнне сферы іх дзейнасці ў розных рэгіёнах Расійскай імперыі, імкненне падпарадкаваць свайму ўплыву рабочы рух — усё гэта рабіла неабходным стварэнне адзінай партыі. Гэта задача была выканана ў сакавіку 1898 г., калі ў Мінску адбыўся I з'езд сацыял-дэмакратычных арганізацый Расіі, які абвясціў аб стварэнні Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП). Пасля з'езда мясцовыя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі сталі называцца камітэтамі РСДРП.

5. Фарміраванне беларускай нацыі

Працэс фарміравання беларускай нацыі вызначаўся асаблівасцямі і характарам сацыяльна-эканамічнага развіцця, накірункам палітыкі расійскага ўрада ў Беларусі, традыцыйнымі рысамі нацыянальна-культурнага развіцця і інш. Праз шэраг складаных этапаў у сваёй эвалюцыі этнагенез беларусаў у XIX ст., асабліва ў яго апошнія дзесяцігоддзі, і на пачатку XX ст. значна паскорыўся і выйшаў на стадыю фарміравання нацыі. Існаванне апошняй адзначалася наяўнасцю наступных рыс: агульнасці тэрыторыі і эканамічнага жыцця, супольных рыс нацыянальнага характару, культуры і адзінай літаратурнай мовы.

Асноўная тэрыторыя беларусаў уваходзіла ў межы пяці губерняў: Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай. Колькасць насельніцтва, паводле перапісу 1897 г., складала ў сучасных межах Беларусі 6 млн 387 тыс. чалавек. Удзельная вага прадстаўнікоў карэннай нацыянальнасці перавышала 73%. Значнай доля беларусаў была (па даных перапісу 1897 г. аб роднай мове) у Веліжскім (87,5%), Невельскім (84,0%), Себежскім (47,1%) паветах Віцебскай губерні, Сакольскім (83,9%) павеце Гродзенскай губерні, Красненскім (90,0%) павеце Смаленскай губерні, Суражскім (каля 70%) павеце Чарнігаўскай губерні і некаторых іншых, што знаходзяцца па-за межамі тэрыторыі сучаснай беларускай дзяржавы. Каля 90% прадстаўнікоў беларускага этнасу жылі ў сельскай мясцовасці. Прыкладна 40 — 50 % гарадскога

і местачковага насельніцтва складалі яўрэі, што з'явілася вынікам існавання ў межах 10 заходніх губерняў Расійскай імперыі рысы аседласці яўрэяў; каля 20% гараджан былі рускімі, беларусы сярод іх складалі 17,1%.

Паскарэнне пасля рэформы 1861 г. тэмпаў эканамічнага развіцця, пашырэнне капіталістычнага прадпрымальніцтва ў прамысловасці, паступовая, хоць і павольная, пераарыентацыя памешчыцкіх гаспадарак на рынак, павелічэнне бессаслоўнага землеўладання, развіццё гандлю і шляхоў зносін, інтэнсіўнае чыгуначнае будаўніцтва спрыялі стварэнню на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёна і ў той жа час станаўленню беларускай нацыі. Аднак апошні працэс стрымліваўся агульным накірункам палітыкі ўрада. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. царызм канчаткова пазбавіўся ілюзій наконт польскіх культурна-палітычных уплываў на тэрыторыі Беларусі і перайшоў на шлях інтэнсіўнай русіфікацыі. Пачатак гэтай палітыкі быў закладзены крывавым катам паўстання і ў той жа час таленавітым дзяржаўным дзеячам М.М.Мураўёвым. Асновай стала стварэнне сацыяльнай базы палітыкі — пашырэнне расійскага землеўласніцтва, на ільготных умовах продаж зямлі для запрошаных на службу ў беларускія губерні расійскіх чыноўнікаў. Спрыяльнай глебай для русіфікацыі лічылася таксама шматлікае беларускае праваслаўнае сялянства. У сувязі з гэтым становіцца зразумелым стрымліванне эміграцыі сялянства Беларусі ў другой палове XIX ст. у Сібір і за мяжу ў пошуках зямлі і працы, а таксама абмежаванні ў набыцці зямлі асобамі польскай і яўрэйскай нацыянальнасці. Школа цалкам была пераведзена на рускую мову навучання. Вышэйшыя навучальныя ўстановы і беларускамоўны друк адсутнічалі. Выкарыстанне беларускай мовы не дапускалася ні ў школе, ні ў дзяржаўных установах, ні ў друку, за выключэннем толькі этнаграфічных публікацый. Прычым і настаўнік, і праваслаўны святар, і дзяржаўны чыноўнік, і афіцыйная газета настойліва і паслядоўна даказвалі беларусам, што яны — рускія і не маюць ніякіх адрозненняў, акрамя лакальна-дыялектных. Адпаведным чынам пісалася і беларуская гісторыя. У гэтым накірунку вельмі дарэчы сталася ідэалогія "западнорусизма". Сярод яе прыхільнікаў вылучаліся дзве плыні: ліберальная і кансерватыўная. Агульным для іх было адмаўленне самастойнасці беларускага этнасу, але прадстаўнікі першай у адрозненне ад другой дапускалі самакаштоўнасць беларускай культуры і магчымасць яе вывучэння для ўзбагачэння велікарускай. Ліберады — "западнорусы" зрабілі ўсё ж шмат для даследа-

вання нацыянальнай спадчыны беларусаў і аднымі з першых звярнулі ўвагу ўрадавых колаў і сталічнага грамадства на тое, што Беларусь насуперак доўга панаваўшаму ў той час меркаванню не з'яўляецца часткай Польшчы.

Станаўленне буржуазнага грамадства ў другой палове XIX і на пачатку XX ст. мела ў Беларусі шэраг спецыфічных рыс. Забарона яўрэям сяліцца па-за межамі гарадоў і мястэчак, эканамічная слабасць гарадоў, немагчымасць знайсці ў іх працу для вялікай колькасці беззямельных і малазямельных сялян, стрымліванне разлажэння памешчыцкага землеўладання адмоўна адбіліся на ўтварэнні класаў буржуазнага грамадства, дэфармавалі нацыянальны склад гарадскога насельніцтва і ў канчатковым выніку стрымлівалі фарміраванне беларускай нацыі. Прычым беларуская нацыянальная буржуазія знаходзілася яшчэ на стадыі станаўлення і ўяўляла сабой найбольш слабую праслойку мясцовай шматнацыянальнай буржуазіі. Асноўныя капіталы краю знаходзіліся ў руках польскіх і рускіх памешчыкаў, яўрэйскіх купцоў і прамыслоўцаў. Беларуская аграрная буржуазія, падзеленая па веравызнанню на праваслаўных і католікаў, да канца не ўсвядоміла свайго нацыянальнага адзінства і часта індыферэнтна ставілася да праяў беларускага нацыянальнага руху. Наогул падзел беларускага этнасу на католікаў і праваслаўных, што актыўна выкарыстоўваўся ў мэтах адпаведна паланізацыі і русіфікацыі, таксама адмоўна адбіўся на фарміраванні беларускай нацыі. Слабасць нацыянальнай эканамічнай эліты — буржуазіі і дваранства — стала прычынай нешматлікасці і павольнага сталення нацыянальнай інтэлігенцыі. Паводле даных перапісу 1897 г. аб роднай мове, 51,8% агульнай колькасці прадстаўнікоў спадчыннага дваранства прызнавалі сябе беларусамі. З ліку асабістых дваран (чыноўніцтва) 25,9% назвалі сваёй роднай мовай беларускую. Гэтыя лічбы развейваюць старадаўні міф аб выключна польскім і рускім этнічным складзе беларускага вышэйшага саслоўя, а таксама ў пэўнай ступені сведчаць аб пашырэнні нацыянальнай самасвядомасці сярод дваранства. Сялянства, пралетарыят і паўпралетарскія слаі грамадства ў Беларусі складаліся пераважна з прадстаўнікоў карэннага этнасу.

У XIX — пачатку XX ст. прадоўжылася станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы. Фарміраванне яе ў гэты час адбывалася пераважна ў жанрах мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. Гэта не дазваляла развіваць усебакова яе слоўнік, у якім, акрамя слоў, звязаных з паняццямі штодзённага побыту, іншыя пласты лексікі былі развіты слаба. Не

далі жаданых вынікаў і спробы скласці граматыку і правапіс беларускай мовы, якія пачалі рабіцца з сярэдзіны XIX ст. Граматыкі П.Шпілеўскага 1846 г. і К.Нядзвецкага 1854 г. засталіся ў рукапісах. Пры друкаванні беларускіх выданняў выкарыстоўвалася пераважна лацінка. Гэтай графікай былі надрукаваны творы В.Дуніна-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча, газета "Мужыцкая праўда", гутарка "Дзядзька Антон..." і інш. У канцы XIX ст. лацінку паступова пачала выцясняць кірыліца. Пасля ўвядзення закона аб свабодзе друку ў 1905 г. і з'яўлення беларускіх легальных выданняў, асабліва "Нашай нівы", фарміраванне літаратурнай мовы, выпрацоўка яе навуковай тэрміналогіі пайшлі хутчэй.

Працэс сталення нацыі праявіўся ў нацыянальным руху. Беларускі рух узрастаў паміж спрэчкамі расійскіх і польскіх шавіністаў за панаванне над тэрыторыяй краю. Вытокі беларускага нацыянальнага руху звязаны з дзейнасцю мясцовых інтэлігентаў у першай палове XIX ст., якія вывучалі беларускую культуру і зрабілі шмат для яе папулярызацыі (Ян Баршчэўскі, Ян Чачот, Вінцук Дунін-Марцінкевіч, Уладзіслаў Сыракомля і інш.). Працяг ён знайшоў у беларускім нацыянальна-культурным руху Вільні, Мінска, Віцебска (гурткі А.Кіркора, А.Вярыгі-Дарэўскага і інш.), рэвалюцыйнай дзейнасці К.Каліноўскага і яго паплечнікаў. У 80-х гадах XIX ст. у Пецярбургу дзейнічаў беларускі народніцкі гурток "Гоман", які выдаў два нумары аднайменнага гектаграфічнага часопіса (1884). У публікацыях на яго старонках ("Лісты аб Беларусі", "Пасланне да землякоў-беларусаў") дадзена тэарэтычнае абгрунтаванне існавання самастойнага беларускага этнасу, вылучаны задачы перад інтэлігенцыяй па пашырэнню нацыянальнай самасвядомасці. Дачыненне да гэтага выдання мелі студэнты ўраджэнцы Беларусі А.Марчанка, Х.Ратнер і інш. На пачатку 90-х гадоў XIX ст. у Маскве і Пецярбургу дзейнічалі арганізацыі беларускага студэнцтва пад кіраўніцтвам А.Гурыновіча, М.Абрамовіча і інш. У 1902 — 1903 гг. у Пецярбургу ўзніклі нацыянальныя арганізацыі В.Іваноўскага, братоў А. і І.Луцкевічаў, якія сталі пачаткам утварэння першай беларускай сталай палітычнай партыі — Беларускай сацыялістычнай грамады.

З працэсамі фарміравання беларускай нацыі неадрыўна звязаны таксама і развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст., яго характар, накірунак і перш за ўсё месца ў ім нацыянальнай плыні. Наяўнасць і багацце нацыянальнай культуры — паказчык стану сталасці нацыі.

6. Культура Беларусі другой паловы XIX ст.

Культура Беларусі 60 – 90-х гадоў развівалася ва ўмовах сцвярджэння і панавання капіталістычных адносін.

Нягледзячы на каланіяльную палітыку расійскага самаўладства, у гэты час пачала фарміравацца беларуская нацыянальная інтэлігенцыя, якая вывучала і стварала нацыянальную культуру, выступала ў якасці ідэолага нацыянальнага руху. Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі тэарэтычна абгрунтавалі існаванне самастойнага беларускага этнасу і абвясцілі яго права на роўнасць з іншымі народамі, на палітычнае самавызначэнне свайго лёсу.

Пад уплывам грамадскага руху 60-х гадоў царскі ўрад вымушаны быў правесці некаторыя рэформы ў галіне асветы, але іх вынікі на Беларусі былі значна меншыя, чым у цэнтральных губернях Расіі. Паражэнне паўстання 1863 – 1864 гг. прывяло да ўзмацнення рэакцыі і нацыянальнага прыгнёту. У 1864 г. былі закрыты Горы-Горацкі земляробчы інстытут, Навагрудская гімназія, Свіслацкая і Маладзечанская прагімназіі. Выкладанне на беларускай і польскай мовах забаранялася. Агульны ўзровень народнай асветы заставаўся нізкім. Пачатковых школ было вельмі мала, сярэднія існавалі толькі ў найбольш буйных гарадах.

У пачатку парэформеннага перыяду на Беларусі існаваў толькі афіцыйны друк. Беларуская кніга ў гэты час выдавалася пераважна за мяжой. У кожнай губерні выходзіла газета "Губернскія ведамасці". З 1886 г. выдавалася першая на Беларусі легальная неафіцыйная грамадска-палітычная і літаратурная газета "Мінскі лісток", якая адыграла пэўную ролю ў развіцці беларускай нацыянальнай свядомасці. Разам з гістарычнымі і этнаграфічнымі даследаваннямі і фальклорнымі запісамі М.Доўнар-Запольскага, М.Янчука, А.Багдановіча і іншых вучоных на яе старонках змяшчаліся мастацкія творы на беларускай мове Я.Лучыны, К.Каганца і інш.

У 60 – 90-я гады XIX ст. пашырылася ўсебаковае вывучэнне Беларусі. Шэрагам вучоных былі створаны буйныя працы па гісторыі Беларусі. М.Доўнар-Запольскі, М.Уладзімірскі-Буданаў, М.Любаўскі і іншыя сабралі і апублікавалі вялікі фактычны матэрыял, які выклікаў сярод беларускай інтэлігенцыі цікавасць да вывучэння гісторыі свайго народа. Навукоўцы цікавіліся беларускай народнай культурай – песнямі, казкамі, легендамі. Этнографы А.Кіркор, М.Нікіфароўскі, М.Федароўскі, Е.Раманаў, П.Шэйн і іншыя ў сваіх грунтоўных даследчых працах

сцвярджалі, што мова і культура беларускага народа працягваюць свой гістарычны працэс. У 1870 г. выйшаў першы беларуска-расійскі слоўнік І. Насовіча. У гэты час пачалася навуковая дзейнасць заснавальніка беларускай філалогіі Я. Ф. Карскага.

Важную ролю ў духоўным жыцці беларускага народа адыгрываў фальклор. У вуснапаэтычнай творчасці адбывалася станаўленне новых жанраў, узбагачэнне тэматыкі, ідэйнага зместу, мастацкіх сродкаў.

Капіталістычнае развіццё вёскі выклікала з'яўленне новых тэм фальклору. Гэты працэс знайшоў шырокае адлюстраванне ва ўзнікненні асобага цыкла рэалістычных твораў — казак, песень, прыказак, частушак-прыпевак. Вялікім мастацкім густам вылучаліся творы беларускіх народных майстроў.

Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей у краіне напярэдадні і ў перыяд рэформы 1861 г., развіццё капіталізму і з'яўленне на арэне палітычнай барацьбы пралетарыяту, уплыў перадавой грамадскай думкі стварылі глебу для развіцця беларускай літаратуры дэмакратычнага напрамку.

Вядомым прадстаўніком дэмакратычнай культуры беларускага народа ў другой палове XIX ст. з'яўляўся адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 г. на Беларусі і Літве К. Каліноўскі (1838 — 1864). У сваіх пракламацыях і газеце "Мужыцкая праўда" К. Каліноўскі ў даходлівай форме выкрываў грабежніцкі характар рэформы 1861 г., палітыку царызму на беларускіх землях, заклікаў сялян да ўзброенага паўстання за зямлю і волю, за чалавечыя правы. Нацыянальныя пачуцці К. Каліноўскага найбольш поўна выявіліся ў "Лістах з-пад шыбеніцы", напісаных перад пакараннем смерцю ў Віленскай турме.

Ф. К. Багушэвіч (1840 — 1900) — пісьменнік сацыяльнага пафасу, буйнейшы прадстаўнік дэмакратычнага напрамку ў беларускай літаратуры. Патрыёт сваёй радзімы, Ф. Багушэвіч выступаў у абарону беларускага народа і яго мовы, якой пагарджалі і якую зневажалі як царскія сатрапы, так і польскія паны. Творы Ф. Багушэвіча прасякнуты пратэстам супраць прыгонніцкіх парадкаў, аграблення сялян рэформай 1861 г., бяспраўя і прыніжэння селяніна-працаўніка з боку царскай бюракратыі. Ва ўмовах царызму Ф. Багушэвіч не мог друкаваць свае творы ў Расіі. Таму свой першы зборнік вершаў "Дудка беларуская" ён надрукаваў у 1891 г. у Кракаве, другі зборнік "Смык беларускі" — у 1894 г. у Познані.

Паслядоўнікамі Ф. Багушэвіча, якія адыгралі значную

ролю ў развіцці беларускай прагрэсіўнай літаратуры другой паловы XIX ст., былі паэты-дэмакраты Янка Лучына (1851 — 1897) і Адам Гурыновіч (1869 — 1894).

Найбольш вядомым творам Я.Лучыны з'яўляецца верш "Роднай старонцы", у якім ён выражае сваю любоў да радзімы, да свайго беларускага народа. Творчасць Я.Лучыны выяўляла розныя ўзроўні мастацкага асэнсавання беларускай рэчаіснасці, але была мэтанакіраванай у дэмакратычным сцвярджэнні грамадзянскага ідэалу свайго часу.

Паэзія А.Гурыновіча — мастацкае адлюстраванне сацыяльна-палітычных працэсаў парэформеннага часу. Вызначаючы задачы літаратуры, А.Гурыновіч сцвярджаў, што яна павінна "будзіць у сэрцы думку аб лепшай долі, якой мы не зналі дагэтуль ніколі". Я.Лучына і А.Гурыновіч былі таксама таленавітымі перакладчыкамі.

Значны след у беларускай літаратуры канца XIX ст. пакінулі такія пісьменнікі, як Альгерд Абуховіч (1840 — 1898), Фелікс Тапчэўскі (каля 1838 — 1892), Карусь Каганец (1868 — 1918).

Беларуская літаратура дэмакратычнага напрамку ў гэты час узбагацілася шэрагам новых ананімных твораў-вершаў, "гутарак", якія ярка адлюстравалі рэвалюцыйна-дэмакратычны настрой шырокіх мас беларускага сялянства. Узорам такіх твораў з'яўляецца "Дзядзька Антон, або Гутарка аб усім, што баліць, а чаму баліць — не ведаем". Яна напісана жывой народнай мовай, у рэалістычнай манеры.

У другой палове XIX ст. на Беларусі развіваліся розныя формы народнага тэатра (народная драма, батлейка). Пачаў фарміравацца беларускі прафесійны тэатр. Яго ўзнікненне звязана з дзейнасцю пісьменніка, драматурга і тэатральнага дзеяча В.Дуніна-Марцінкевіча. На развіццё беларускай культуры і беларускага тэатральнага мастацтва спрыяльны ўплыў аказала тэатральнае мастацтва рускага, украінскага і польскага народаў.

У перыяд 70 — 90-х гадоў мінскім гледачам былі паказаны лепшыя творы рускай і сусветнай класікі. У буйнейшых гарадах Беларусі гастралявалі тэатральныя калектывы, у склад якіх уваходзілі вядомыя майстры рускай сцэны М.Савіна, У.Давыдаў, К.Варламаў і інш.

У 90-я гады ў Мінску знаходзілася на гастролях трупа маскоўскага Малога тэатра на чале з А.Яблачкінай і А.Южыным, пецярбургская оперная трупа, якую ўзначальваў Я.Ізмайлаў, украінская трупа М.Старыцкага. З вялікім поспехам на Беларусі выступаў вядомы рускі хор

Ф.Славянскага, які папулярызаваў таксама беларускую народную песню.

У 1898 г. было арганізавана "Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў", якое неўзабаве стала цэнтрам літаратурнага і тэатральна-музычнага жыцця Мінска.

У другой палове XIX ст. актывізавалася музычнае жыццё Беларусі. Вялікае значэнне набыла дзейнасць музычных таварыстваў, якія наладжвалі публічныя канцэрты і музычныя вечары, лекцыі аб жыцці і творчасці вядомых кампазітараў і выканаўцаў, адкрывалі музычныя навучальныя ўстановы і бібліятэкі.

У канцы XIX ст. на Беларусі з вялікім поспехам гастралявалі выдатныя выканаўцы-спевакі Л.Собінаў, М.Фігнер, А.Мазіні, піяністы і кампазітары С.Рахманінаў, Л.Скрабін, А.Зілоці і іншыя славутыя артысты.

У выяўленчым мастацтве другой паловы XIX ст. асноўнае месца займаў рэалістычны жанр, звязаны з імёнамі К.Альхімовіча, Н.Сіліванoвіча, А.Гараўскага, І.Хруцкага і інш. У беларускім жывапісе ў гэты час на першы план выходзіць гістарычны жанр. Адным з найбольш вядомых гістарычных жывапісцаў Беларусі другой паловы XIX ст. лічыцца К.Э.Альхімовіч (1840 – 1916). Ён стварыў палотны "Хрысціянскія пакутнікі", "Пахаванне Гедыміна", "Пасля бітвы", "Смерць Глінскага ў турме" і іншыя, якія сведчаць пра выдатнае веданне мастаком гісторыі свайго роднага краю.

Да гістарычнага непасрэдна прымыкаў бытавы жанр. У жывапісе, як і ў творах літаратуры, з'яўляецца вобраз селяніна-бедняка. Вядомым майстрам бытавога жанру быў мастак Н.Ю.Сіліванoвіч (1830 – 1918). Ён зрабіў шэраг манументальных роспісаў, партрэтаў, пейзажаў, сярод якіх карціны "Дзеці ў двары", "У школу", "Пастух са Свянцяншчыны", "Салдат з хлопчыкам" і інш.

Выдатным майстрам беларускага пейзажу і рэалістычнага партрэтнага жывапісу быў мастак А.Гараўскі (1833 – 1900). Ён адлюстраваў родную прыроду ў карцінах "Вечар у Мінскай губерні", "На радзіме", "Бераг ракі Свіслач" і інш.

У 50 – 80-я гады XIX ст. адбыліся станоўчыя змены ў архітэктуры Беларусі. Галоўнае значэнне пачалі набываць грамадзянскае будаўніцтва і прамысловая архітэктура. Хутка развівалася будаўнічая тэхніка, выкарыстоўваліся новыя будаўнічыя матэрыялы. У цэнтральных раёнах паявіліся асабнякі буржуазіі і шматпавярховыя будынкі фінансавых і гандлёва-прамысловых устаноў. У перыяд

1860 — 1890 гг. у архітэктуры Беларусі панаваў эклектызм (спалучэнне разнастайных мастацкіх элементаў у архітэктурных формах фасадаў і інтэр'ераў — старажытнарускага дойлідства, готыкі, барока, класіцызму).

Такім чынам, нягледзячы на вялікадзяржаўную палітыку царызму, развіццё беларускай культуры ў другой палове XIX ст. характарызавалася значнымі поспехамі і дасягненнямі.

7. Рэвалюцыйныя падзеі 1905 — 1907 гг. на Беларусі

На пачатку XX ст. інтэнсіўны прамысловы ўздым змяніўся сусветным эканамічным крызісам, які ахапіў большасць галін народнай гаспадаркі Расійскай імперыі. У беларускіх губернях на працягу 1900 — 1903 гг. былі закрыты 532 фабрычна-завадскія прадпрыемствы. У меншай ступені крызіс закрануў лёгкую прамысловасць. Гэта дало магчымасць многім прадпрыемствам Беларусі прадоўжыць сваю работу. Між тым эканамічны крызіс, канкурэнцыя з боку фабрычнай вытворчасці прывялі да складанай сітуацыі ў рамесніцкай вытворчасці, якая з'яўлялася дамінуючай на Беларусі. Для таго каб быць канкурэнтаздольнымі, рамеснікі, невялікія прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці павінны былі інтэнсіфікаваць працу наёмных рабочых, павялічваць працоўны дзень.

Асаблівасці эканамічнага развіцця беларускіх губерняў не з'яўляліся дамінуючым фактарам. Эканоміка Беларусі падпарадкоўвалася агульным эканамічным законам, усё больш уцягвалася ў сусветную эканамічную сістэму. Тут назіралася канцэнтрацыя вытворчасці і капіталу, узнікалі акцыянерныя таварыствы, манапалістычныя аб'яднанні. На беларускі рынак пранікае замежны капітал.

У гэты час на Беларусі адбываўся працэс капіталізацыі вёскі. Скарачалася дваранскае землеўладанне. Фарміравалася буржуазная зямельная ўласнасць. Сельская гаспадарка беларускіх губерняў на пачатку XX ст. арыентавалася на развіццё мяса-малочнай жывёлагадоўлі. На Беларусі дзейнічала каля 300 сыраварных і масларобчых заводаў, 430 заводаў па перапрацоўцы бульбы. Даволі шырока выкарыстоўваліся розныя сельскагаспадарчыя машыны, жалезныя плугі і іншыя прылады працы. Па ўзроўню тэхнічнай узброенасці сельская гаспадарка Беларусі была адной з перадавых сярод еўрапейскіх губерняў Расійскай імперыі. Разам з тым развіццё капіталістычных

адносін стрымлівалася феадальнымі перажыткамі: сервітутамі, адработкамі, натуральнымі павіннасцямі. Накладвала свой адбітак на лёс вёскі беззямелле і малазямелле сялянства. У 1905 г. каля 50% сялянскіх гаспадарак мелі надзел да 10 дзесяцін зямлі. Аграрная перанаселенасць вёскі, высокія падаткі і павіннасці выклікалі значную міграцыю беларусаў у прамысловыя гарады Расіі, Сібір, за межы краіны.

Сацыяльная напружанасць у гарадах і вёсках стварала спрыяльныя ўмовы для радыкалізацыі рабочага і сялянскага руху, стварэння палітычных партый. Аднымі з першых палітычных партый на тэрыторыі беларускіх губерняў былі Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя (1897), Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі (Бунд, 1897), РСДРП (1898), Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы (1900), партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (1901).

Першыя палітычныя партыі стварала не буржуазія, як гэта было ў дзяржавах Заходняй Еўропы, а рабочы клас. На тэрыторыі Беларусі на пачатку стагоддзя вядучую ролю ў рэвалюцыйна-дэмакратычным руху займалі агульнарасійскія, польскія, яўрэйскія палітычныя партыі. Станаўленне беларускіх палітычных арганізацый стрымлівалася слабай нацыянальнай самасвядомасцю беларускай буржуазіі, сялянства, рабочага класа. Беларускае нацыянальнае пытанне знаходзіла водгук перш за ўсё ў асяроддзі інтэлігенцыі, вучнёўскай і студэнцкай моладзі. У канцы 1902 г. на базе гурткоў, якія дзейнічалі ў Вільні, Мінску, Пецярбургу, была створана Беларуская рэвалюцыйная грамада. У 1903 г. яна прыняла назву "Беларуская сацыялістычная грамада" (БСГ). Асноўнае сваё назначэнне гэта партыя бачыла ў знішчэнні самадзяржаўя ў саюзе з расійскімі рэвалюцыйнымі сіламі і будаўніцтве сацыялістычнага грамадства, выступала за дэмакратычную рэспубліку ў межах Расійскай Федэрацыі. Аграрная праграма БСГ па характару была эсэраўскай праграмай сацыялізацыі зямлі: патрабавала ліквідацыі прыватнай зямельнай уласнасці, роўнага падзелу зямлі паміж тымі, хто яе апрацоўвае.

Найбольш значны ўплыў на рабочы рух меў Бунд. Выступаючы як "адзіны прадстаўнік яўрэйскага пралетарыяту", Бунд зваў да звяржэння самадзяржаўя і ўстанаўлення дэмакратычнай рэспублікі. Бундаўскія дэлегаты прынялі актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні I з'езда РСДРП. Бунд увайшоў у склад РСДРП як

аўтаномная арганізацыя, самастойная ў пытаннях, што мелі дачыненне да яўрэйскага пралетарыяту. На II з'ездзе РСДРП (1903) Бунд выйшаў з партыі ў сувязі з непрыняццем яго прапановы аб федэратыўнай пабудове РСДРП.

У 1903 — 1904 гг. на Беларусі ішло фарміраванне бальшавіцкіх сацыял-дэмакратычных арганізацый. Яно завяршылася стварэннем Палескага і Паўночна-Заходняга камітэтаў РСДРП.

Беларусь была адным з цэнтраў, дзе стваралася партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. У канцы 1901 г. яна была арганізацыйна аформлена, а ў 1902 г. у склад эсэраў увайшла Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі, якая дзейнічала ў Мінску. Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў выступала за ліквідацыю самадзяржаўя і ўстанаўленне дэмакратычнай рэспублікі, правядзенне сацыялізацыі зямлі. Тактыка партыі заключалася ў спалучэнні арганізатарскай і агітацыйна-прапагандысцкай работы з індывідуальным тэрорам супраць прадстаўнікоў дзяржаўнай улады.

Развіццё класавых супярэчнасцей, нарастанне канфрантацыі ў грамадстве набліжалі рэвалюцыйную сітуацыю ў краіне. Эканамічныя і палітычныя яе перадумовы фарміраваліся ў перыяд эканамічнага крызісу, калі рабочы рух паступова набывае палітычны характар. Да таго ж руска-японская вайна паскорыла працэс палітызацыі вёскі.

Пачаткам першай расійскай рэвалюцыі з'явіліся падзеі 9 студзеня 1905 г. Расстрэл шматтысячнага шэсця рабочых да цара ўскалыхнуў краіну. Пратэст супраць гэтай акцыі выказалі працоўныя Беларусі. З 11 па 17 студзеня праходзілі акцыі пратэсту ў Мінску, забастоўка рабочых і рамеснікаў, дэманстрацыі. Палітычныя стачкі адбыліся ў Брэсце, Віцебску, Гродне, Гомелі, Полацку, Смаргоні. Рабочыя 30 гарадоў і мястэчак удзельнічалі ў гэтай барацьбе.

З палітычных партый найбольш актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай барацьбе прынялі Бунд, РСДРП, эсэры, якія спрабавалі аб'яднаць свае намаганні шляхам стварэння кааліцыйных камітэтаў.

Другі этап палітычных выступленняў працоўных быў звязаны са святкаваннем 1 Мая і правядзеннем мітынгаў салідарнасці з рабочымі Лодзі, Варшавы, Адэсы.

Разам з палітычнымі выступленнямі назіралася і эканамічная барацьба рабочых і сялянства. Летам 1905 г.

узмацніўся сялянскі рух. Акрамя традыцыйных форм барацьбы (патравы памешчыцкіх угоддзяў, рубкі лесу) на вёсцы праходзілі сходы, мітынгі, на якіх выказваліся палітычныя патрабаванні.

Восенню 1905 г. ініцыятарамі рэвалюцыйных выступленняў сталі чыгуначнікі. У кастрычніку яны спынілі рух на асноўных чыгуначных магістралях. Пачалася Усерасійская палітычная стачка.

17 кастрычніка 1905 г. Мікалай II падпісаў Маніфест аб абвяшчэнні дэмакратычных свабод, скліканні Дзяржаўнай думы з заканадаўчымі паўнамоцтвамі. Буржуазна-ліберальны лагер быў задаволены такім рашэннем. Прадстаўнікі буржуазіі атрымалі магчымасць стварацьпалітычныя партыі і ўдзельнічаць у прадстаўнічых органах улады. Бліжэйшыя іх задачы, такім чынам, былі вырашаны. Рэвалюцыйна-дэмакратычныя сілы лічылі неабходным працягваць барацьбу. Для каардынацыі дзеянняў у гарадах Беларусі ствараліся стачачныя камітэты, кааліцыйныя саветы. У палітычную барацьбу былі ўцягнуты працоўныя 53 гарадоў і мястэчак. У Мінску, Гомелі, Мазыры, Віцебску і іншых гарадах пры разгоне дэманстрацый мясцовыя ўлады прымянілі сілу. Сотні чалавек былі забіты і паранены. 18 кастрычніка на вакзальнай плошчы ў Мінску, напрыклад, расстраляны ўдзельнікі мітынгу.

У канцы 1905 г. у рэвалюцыйны рух усё больш уцягваецца армія. Салдацкія хваляванні адбыліся ў Віцебску, Магілёве, Гродне, Бабруйску, Брэсце.

У снежні 1905 г. царскі ўрад закрыў апазіцыйныя газеты, якія надрукавалі так званы фінансавы маніфест. 7 снежня ў Маскве пачалася палітычная забастоўка. Праз некалькі дзён яна перарасла ва ўзброенае паўстанне, якое доўжылася да 18 снежня.

На Беларусі снежаньскія палітычныя забастоўкі адбыліся ў Мінску, Гомелі, Баранавічах, Пінску і іншых гарадах. Аднак гэтыя выступленні не перараслі ва ўзброенае паўстанне. Рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі ў гэты час занялі пазіцыю чакання. Што датычыць мясцовых улад, то яны дзейнічалі рашуча. Былі праведзены арышты кіраўнікоў і актывістаў апазіцыйнага руху, уведзена ваеннае становішча альбо становішча надзвычайнай аховы, праведзена перадыслакацыя войск у тыя раёны, дзе набіраў сілу забастовачны рух.

Трэба адзначыць, што царскі ўрад прымяняў не толькі

рэпрэсіі. 2 снежня 1905 г. была адменена крымінальная адказнасць за ўдзел у эканамічных стачках, 11 снежня прыняты закон аб выбарах у Дзяржаўную думу. З'яўлялася магчымасць калі не рашэння, дык пастаноўкі ў парламенце эканамічных, сацыяльна-палітычных праблем. Выбары ў I Дзяржаўную думу, дазвол на стварэнне прафесійных саюзаў (сакавік 1906 г.) некалькі аслабілі канфрантацыю ў грамадстве.

Рэвалюцыйна-дэмакратычныя партыі байкатавалі выбары. Аднак яны адбыліся. Ад беларускіх губерняў у I Дзяржаўную думу было абрана 36 дэпутатаў, у тым ліку 13 сялян. З палітычных партый найбольш моцныя пазіцыі мелі кадэты. Дзейнасць Думы па многіх накірунках насіла апазіцыйны характар. Яна выказала недавер ураду, у ліпені Дума зрабіла зварот у сувязі з публікацыяй дзяржаўнай аграрнай праграмы, якая разыходзілася з думскім праектам. 9 ліпеня 1906 г. Дума была распушчана і назначаны новыя выбары.

Ва ўмовах спаду рэвалюцыі палітычныя партыі, у тым ліку рэвалюцыйна-дэмакратычныя, прынялі ўдзел у выбарах у II Дзяржаўную думу. Яны спрабавалі выступіць адзіным блокам. Такі блок, напрыклад, быў створаны ў Мінску ў складзе арганізацый РСДРП, Бунда, эсэраў, БСГ, сіяністаў-сацыялістаў. Правыя таксама аб'ядналі свае сілы. У кастрычніку 1906 г. быў створаны "Русский окраинный союз", які выступаў пад шавіністычнымі лозунгамі, вёў антыпольскую і антыяўрэйскую агітацыю.

Польскія, часткова беларускія памешчыкі, святары (аўтанамісты) выступалі ў абарону каталіцкай веры, за аўтаномнае развіццё краю.

На выбарах у беларускіх губернях перамаглі правыя групоўкі. Але ў цэлым II Дзяржаўная дума была больш радыкальная, чым папярэдняя. Як і ў I Дзяржаўнай думе, галоўным было аграрнае пытанне. Трудавікі, эсэры, сацыял-дэмакраты адстойвалі рэвалюцыйны шлях яго вырашэння. Прадстаўнікі акцябрыстаў, памешчыцкіх партый падтрымалі ўрадавую праграму П.А.Сталыпіна. Разлічаны на абмежаванне памешчыцкага землеўладання праект кадэтаў не атрымаў падтрымкі дэпутатаў.

Паколькі II Дзяржаўная дума выходзіла з-пад кантролю ўрада, 3 чэрвеня 1907 г. яна была распушчана. Выбарчы закон, прыняты ў адпаведнасці з Маніфестам 17 кастрычніка, быў зменены. Першая расійская рэвалюцыя скончылася.

8. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі ў 1906 — 1913 гг.

На пачатку XX ст. на Беларусі, як і ў іншых рэгіёнах Расійскай імперыі, адбыліся значныя змены ў эканамічным і сацыяльным развіцці. Сусветны крызіс у меншай ступені закрануў лёгкую прамысловасць, таму эканоміка беларускіх губерняў не панесла значных страт. Скарачэнне рамесніцкай вытворчасці кампенсавалася ростам фабрычна-завадской прамысловасці. У гэты час назіраецца развіццё харчовай, дрэваапрацоўчай прамысловасці. На Беларусь актыўна пранікае замежны капітал. З 1909 г. эканоміка набывае тэндэнцыю стабільнага росту. Ствараліся новыя прамысловыя прадпрыемствы, пашыраліся аб'екты вытворчасці. На тэрыторыі беларускіх губерняў у 1913 г. налічвалася 1200 фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў, на якіх працавала каля 40 тыс. рабочых. Большасць прадпрыемстваў былі невялікімі па колькасці рабочых. 62,4% з іх мелі да 15 чалавек. На буйных прадпрыемствах (больш за 100 чалавек) працавала каля 50% рабочых. Такім чынам, па ўзроўню канцэнтрацыі вытворчасці Беларусь адрознівалася ад іншых прамысловых рэгіёнаў Расійскай імперыі, дзе гэта канцэнтрацыя была значна вышэйшай.

Развіццё прамысловасці вяло да пашырэння акцыянерных таварыстваў, манапалістычных аб'яднанняў. У 1909 — 1910 гг. былі арганізаваны Акцыянернае таварыства запалкавых фабрык, Акцыянернае таварыства Мазырскай фанернай фабрыкі, Дняпроўскай мануфактуры і інш. Ствараліся прадпрыемствы з удзелам замежнага капіталу. Руска-бельгійскае таварыства валодала Віцебскай ільнопрадзільнай фабрыкай "Дзвіна", Руска-амерыканскае таварыства — фабрыкай абутку ў Мінску.

Атрымала развіццё банкаўская сістэма. У беларускіх гарадах дзейнічалі канторы Азоўска-Данскога, Маскоўскага, Дзяржаўнага, Руска-Азіяцкага камерцыйнага, Віленскага прыватнага камерцыйнага і іншых банкаў. Акрамя гэтага, мясцовую прамысловасць фінансавалі банкірскія канторы і таварыства ўзаемнага крэдыту.

Нягледзячы на высокія тэмпы прамысловага росту, большасць рабочых працавала ў саматужна-рамеснай вытворчасці. На Беларусі было каля 90 тыс. такіх майстэрань, дзе працаваў гаспадар і адзін-два рабочыя. Дробная і рамесная вытворчасць давала большасць прамысловай прадукцыі.

Прамысловы ўздым працягваўся да першай сусветнай вайны. Аднак прамысловасць Беларусі захавала сваю спецыфіку: пераважнасць рамесна-саматужнай вытворчасці і невялікіх прадпрыемстваў з размяшчэннем іх у сельскай мясцовасці ў непасрэднай блізкасці да вытворчасці сыравіны і рабочай сілы.

У перадваенны перыяд сельская гаспадарка Беларусі арыентавалася на вытворчасць мяса-малочнай прадукцыі. З ростам жывёлагадоўлі ішло будаўніцтва масларобных, сыраварных заводаў. Важным накірункам з'яўлялася вырошчванне бульбы, якая паступала на перапрацоўку на мясцовыя бровары. З 1907 па 1913 г. колькасць вінакурных заводаў павялічылася з 430 да 630.

У беларускіх губернях ішоў працэс капіталізацыі сельскай гаспадаркі. Дваранскае землеўладанне, якое ў 1905 г. складала 41%, паступова скарачалася. Расла колькасць аб'ектаў прыватнай зямельнай уласнасці. Гэтаму садзейнічала аграрная рэформа. Яе ініцыятарам выступіў П.А.Сталыпін. Рэформа прадугледжвала ліквідацыю сельскай абшчыны, перадачу надзельнай зямлі ў прыватную ўласнасць, выдзяленне зямлі пад хутарскую гаспадарку альбо пад адруб, перасяленне малазямельных сялян у Сібір, на Далёкі Усход.

Трэба адзначыць, што плошча зямельных угоддзяў размяркоўвалася сярод сялян так, што значная іх колькаць не магла пракарміцца на сваёй зямлі. 6,2% гаспадарак мелі надзел да 5 дзесяцін, 43,1% двароў – ад 5 да 10 дзесяцін, 14,3% – 15 – 20 дзесяцін, 12% – больш за 20 дзесяцін. Такім чынам, толькі чвэрць двароў была заможнай.

Сталыпінская рэформа садзейнічала далейшай дыферэнцыяцыі сялянства. На надзельных купчых землях 12% сялянскіх двароў утварылі хутарскія і адрубныя гаспадаркі. Адны з іх сталі набіраць моц, іншыя прадалі зямлю і падаліся на заробкі ў горад альбо выязджалі ў Сібір. У выніку перасяленчай палітыкі Беларусь пакінула 335 тыс. сялян.

Па меры фарміравання заможнага сялянства ўрад спрабуе зрабіць на іх апору. У 1911 г. па ініцыятыве П.А.Сталыпіна прынята рашэнне аб увядзенні земстваў у Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай губернях шляхам выбараў па так званых нацыянальных курыях: рускай і польскай. У рускую курыю залічвалі не толькі рускіх, але і праваслаўных беларусаў. Маёмасны цэнз для выбаршчыкаў быў паніжаны ўдвая. У Гродзенскай і Віленскай губер-

нях земствы не ўводзіліся. Стварэнне мясцовых органаў кіравання не па саслоўных, а па нацыянальных курыях было скіравана на замацаванне пазіцый прыхільнікаў вялікадзяржаўнага шавінізму.

Пасля заканчэння рэвалюцыі царскі ўрад перайшоў да больш жорсткіх форм кіравання. Прадпрымальнікі атрымалі права прымяняць лакауты ў сувязі з забастоўкамі рабочых. Летам 1907 г. былі праведзены арышты кіраўнікоў і актывістаў рэвалюцыйна-дэмакратычных партый. Партыйныя арганізацыі РСДРП, Бунда, эсэраў, БСГ знаходзіліся ў заняпадзе. Значна аслаблены быў ліберальна-апазіцыйны цэнтр. Многія арганізацыі, напрыклад партыі кадэтаў, распаліся. У 1907 г. на платформе кадэтаў была створана Краявая партыя Літвы і Беларусі. Яе аснову складалі польскія памешчыкі, святары. Партыя выступала за палітычнае раўнапраўе палякаў і католікаў.

У гэты час на Беларусі пашырылася прапаганда вялікадзяржаўнага шавінізму. Праваслаўнае беларускае насельніцтва аб'яўлялася рускім. Чарнасоценцы, акцябрысты пры падтрымцы мясцовых улад і праваслаўнай царквы на выбарах у III і IV Дзяржаўную думу атрымалі ў беларускіх губернях абсалютную большасць. Ні адна з рэвалюцыйных партый не змагла тут правесці сваіх кандыдатаў. Скараціўся рабочы і сялянскі рух. Некаторае яго пашырэнне назіраецца з 1912 г., а агульны пад'ём забастовачнай барацьбы наступае ў 1913 — 1914 гг.

9. Культура Беларусі ў пачатку XX ст.

Культура Беларусі ў пачатку XX ст. развівалася ў цеснай сувязі з нацыянальным рухам, культурамі суседніх народаў. У гады рэвалюцыі 1905 — 1907 гг. і пасля адбываецца ўздым у многіх яе галінах, асабліва ў літаратуры. У кароткі тэрмін з'явіліся новыя высокамастацкія творы. Нягледзячы на розныя перашкоды, беларуская культура змагла захаваць сваю самабытнасць, арганічна ўвайшла ў агульнаславянскую, еўрапейскую культуры. Творы літаратуры і мастацтва папоўнілі скарбонку сусветнай культуры.

У пачатку XX ст. прыкметныя змены адбыліся ў развіцці асветы. Замест царкоўна-прыходскіх школ, якія знаходзіліся ў заняпадзе, адкрываліся народныя вучылішчы. Гарадскія вучылішчы ператварыліся ў вышэй-

шыя пачатковыя школы. Хутка пашыралася сетка дзяржаўных і прыватных сярэдніх школ — гімназій і рэальных вучылішч. Агульная колькасць школ усіх тыпаў у 1914 г. склала 7682, у якіх навучалася толькі 1/5 частка дзяцей школьнага ўзросту. Атрымала развіццё і прафесійная адукацыя. На пачатак студзеня 1910 г. у Беларусі налічвалася 66 чыгуначных, сельскагаспадарчых, рамесніцкіх і іншых школ і вучылішч. Для дарослага насельніцтва адкрываліся нядзельныя школы, вячэрнія змены і курсы. Для падрыхтоўкі педагогаў у 1909 — 1916 гг. былі адкрыты пяць настаўніцкіх семінарый, тры настаўніцкія інстытуты — у Віцебску, Мінску і Магілёве. Гэтыя інстытуты не мелі правоў вышэйшай навучальнай установы. Педагагічныя таварыствы, дзеячы беларускай культуры выступалі за стварэнне беларускай нацыянальнай школы. За навучанне на роднай мове выказаўся настаўніцкі з'езд у Вільні (1907). Дзякуючы дзейнасці найбольш свядомай інтэлігенцыі сярод вясковага насельніцтва праваслаўнага веравызнання атрымалі распаўсюджанне "тайныя" руска-беларускія школы. У школах выкарыстоўваліся падручнікі К.Каганца "Першая навука чытання", Я.Цёткі "Першае чытанне для дзетак беларусаў", Я.Коласа "Другое чытанне для дзяцей беларусаў", а таксама мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў.

У 1911 — 1914 гг. у Віцебску працавала аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. Грамадскасць узымала пытанне аб адкрыцці ў Беларусі універсітэта.

На Беларусі меліся даволі значныя дасягненні ў вывучэнні этнаграфіі, гісторыі і культуры краю, а таксама ў прыродазнаўчых навуках. Пры ўдзеле мясцовай інтэлігенцыі ствараліся навуковыя таварыствы. Да 1914 г. дзейнічала больш за 50 навуковых і культурна-асветніцкіх таварыстваў. Члены Віцебскай архіўнай камісіі і Мінскага таварыства аматараў прыродазнаўства, этнаграфіі і археалогіі падрыхтавалі некалькі навуковых прац. Шэраг даследаванняў па этнаграфіі Беларусі зрабіў Паўночна-заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства. Пытаннямі быту і культуры Беларусі займаліся вядомыя даследчыкі Е.Раманаў, М.Федароўскі, М.Нікіфароўскі, А.Сержпутоўскі. Гісторыі Вялікага Княства Літоўскага прысвяціў свае працы М.Доўнар-Запольскі. В.Ластоўскі выдаў "Кароткую гісторыю Беларусі". Заснавальнік беларускай філалогіі Я.Карскі падрыхтаваў і часткова апублікаваў навуковую працу "Беларусы", у якой змешчаны цікавы матэрыял па

філалогіі, этнаграфіі, утварэнню беларускай народнасці, карта рассялення беларусаў. Дасягненні ў галіне фізікі звязаны з навуковай дзейнасцю Я.А.Наркевіча-Ёдкі, Я.В.Сняткова, А.В.Садоўскага і інш. Сярод тэхнічнай інтэлігенцыі асабліва вызначыліся таленавітыя інжынеры М.Р.Стульгінскі і К.М.Паўлоўскі. М.Р.Стульгінскі, працуючы дырэктарам папяровай фабрыкі ў Добрушы, шмат зрабіў па абсталяванню прадпрыемства навейшай тэхнікай, увядзенню самых сучасных тэхналогій. Фабрыка забяспечвалася электраэнергіяй сваёй электрастанцыі, першай у Беларусі. Па тэхнічнаму ўзроўню і энергаўзброенасці падобных прадпрыемстваў у Расіі не было. К.М.Паўлоўскі працаваў на розных пасадах Віцебскага чыгуначнага вузла, прымаў удзел у пабудове і пераабсталяванні прадпрыемстваў горада, быў ініцыятарам адкрыцця ў Віцебску трамвайнага руху, апублікаваў звыш 40 навуковых прац. Павышэнню агульнаадукацыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва садзейнічалі бібліятэкі. Адкрываліся школьныя і грамадскія бібліятэкі, бібліятэкі розных ведамстваў. Буйнейшай сярод іх была мінская публічная бібліятэка імя А.С.Пушкіна, створаная ў 1900 г. У 1914 г. у Беларусі працавала 851 бібліятэка з кніжным фондам 423 тыс. экземпляраў.

На Беларусі даволі хутка развіваўся друк. З 1901 да 1914 г. у пяці беларускіх губернях колькасць перыядычных выданняў павялічылася з 15 да 109. Большасць газет, кніг друкавалася на рускай мове. У прапаганду беларускай культуры ўнесла значны ўклад грамадска-палітычная і літаратурная газета "Северо-Западный край" (1902 – 1905). На яе старонках асвятляліся розныя галіны беларускай культуры. Першае друкаванае слова Я.Купалы – верш "Мужык" – з'явілася менавіта ў гэтай газеце. У верасні – снежні 1906 г. выходзіла першая легальная беларуская газета "Наша доля", заснаваная групай членаў БСГ. У газеце востра ставіліся пытанні палітычнага і культурнага характару. Пасля закрыцця "Нашай долі" барацьбу за нацыянальнае адраджэнне ўзначаліла газета "Наша ніва" (1906 – 1915). Яна стала трыбунай беларускага нацыянальнага руху, выступала за нацыянальнае раўнапраўе беларускага народа, свабоднае развіццё яго культуры, пастаянна ўздымала пытанне аб выкарыстанні беларускай мовы ў школе, друку, цэрквах і касцёлах. Значную ролю адыграла газета ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці, развіцці беларускага мастацтва і літаратуры. Газета друка-

вала творы Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча і іншых беларускіх пісьменнікаў і публіцыстаў, а таксама рускіх, украінскіх, польскіх, літоўскіх і замежных аўтараў. Пры садзейнічанні "Нашай нівы" выходзіў папулярны "Беларускі каляндар", часопісы "Саха" і "Лучынка". Пачатак легальнаму беларускаму кнігадрукаванню паклала выдавецтва "Загляне сонца і ў наша ваконца", створанае ў 1906 г. у Пецярбургу. За няпоўныя восем гадоў выдавецтва надрукавала 40 беларускіх кніг з накладам больш за 100 тыс. экземпляраў. Беларускія кнігі выдавалі таксама выдавецтвы "Наша ніва", "Наша хата", "Мінчук" і інш.

Найбольшыя поспехі ў развіцці беларускай культуры звязаны з літаратурай. Яна была прасякнута пачуццём гонару за свой народ і яго барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, ідэяй сцвярджэння чалавечай годнасці мужыка-беларуса. Вялікі ўклад у развіццё беларускай літаратуры ўнеслі Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, К.Каганец, Ц.Гартны, М.Гарэцкі і інш. У іх творах адчуваецца любоў да радзімы, жаданне бачыць свой народ свабодным і шчаслівым. У грамадстве атрымалі шырокую вядомасць зборнікі твораў Цёткі "Скрыпка беларуская", "Хрэст на свабоду"; Я.Купалы "Жалейка", "Гусляр"; Я.Коласа "Песні жальбы", "Апавяданні"; М.Багдановіча "Вянок", а таксама творы іншых беларускіх пісьменнікаў. З твораў беларускіх драматургаў найбольш вядомымі былі "Модны шляхцюк" К.Каганца, "Паўлінка", "Раскіданае гняздо" і "Прымакі" Я.Купалы.

У пачатку XX ст. актывізавалася тэатральнае жыццё на Беларусі. У гарадах праходзілі гастролі рускіх і ўкраінскіх тэатральных труп. Перад гледачамі выступалі вядомыя майстры сцэны А.Яблачкіна, В.Камісаржэўская, К.Варламаў і інш. У гарадах і вёсках атрымалі распаўсюджанне аматарскія тэатральныя гурткі, "беларускія вечарынкі" — своеасаблівая форма мастацкай самадзейнасці. Праграмы гэтых аматарскіх калектываў уключалі беларускія песні і танцы, вершы і драматычныя творы К.Каганца, Я.Купалы, Я.Коласа, а таксама п'есы рускіх, украінскіх і польскіх аўтараў.

З "беларускіх вечарынак" у 1910 г. узнік нацыянальны прафесійны тэатр — "Першая беларуская трупа" І.Буйніцкага. Трупа гастралявала ў многіх гарадах і мястэчках Беларусі, а таксама ў Варшаве і Пецярбургу. У рэпертуары тэатра былі вершы Я.Купалы, Я.Коласа, Я.Лучыны і іншых пісьменнікаў, народныя песні "Дудка веся-

луха", "Чаму ж мне не пець", танцы "Лявоніха", "Мяцеліца", пастаноўкі "Модны шляхцюк" К.Каганца, "У зімовы вечар" паводле Э.Ажэшкі, "Сватанне" А.Чэхава і інш. У 1913 г. з-за ўціску ўлад і адсутнасці матэрыяльных сродкаў тэатр спыніў сваё існаванне. Арганізаваны ў Вільні Беларускі музычна-драматургічны гурток у 1912 г. з вялікім поспехам здзейсніў першую пастаноўку п'есы Я.Купалы "Паўлінка". Удзячныя гледачы — віленскія беларусы падарылі аўтару залаты гадзіннік.

У прапагандзе беларускага тэатра і музыкі актыўны ўдзел прымаў клуб мастацкай інтэлігенцыі "Беларуская хатка" (1916 — 1920). У яго ўваходзілі некалькі творчых калектываў.

Прадаўжальнікам народных традыцый тэатра І.Буйніцкага з'явілася "Першае таварыства беларускай драмы і камедыі", якое ўзнікла ў сакавіку 1917 г. Трупа таварыства першай паставіла п'есу Я.Купалы "Раскіданае гняздо". Шырокае распаўсюджанне атрымаў народны тэатр — батлейка. На кірмашах, плошчах паказваліся сатырычныя і гумарыстычныя сцэнкі "Вольскі — купец польскі", "Барыня і доктар" і інш.

Прыкметныя поспехі меліся і ў развіцці беларускай прафесійнай музыкі. Зборам і апрацоўкай народных песень займаліся А.Грыневіч, Л.Рагоўскі, М.Чуркін і інш. Л.Рагоўскі на тэму беларускіх песень напісаў "Беларускую сюіту для сімфанічнага аркестра", кантату "А хто там ідзе?" на верш Я.Купалы.

У выяўленчым мастацтве ў пачатку XX ст. усталяваліся рэалістычныя традыцыі. На Беларусі працавала адносна вялікая колькасць мастакоў-прафесіяналаў, якія атрымалі вышэйшую адукацыю ў Пецярбургскай акадэміі мастацтва, Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства, а таксама першапачатковую ў Кіеве, Адэсе, Варшаве, Вільні і прыватных мастацкіх школах Мінска, Віцебска і Магілёва, адкрытых у канцы XIX — пачатку XX ст. Шырокае распаўсюджанне ў жывапісе атрымаў пейзаж. Вядомымі творамі гэтага жанру былі "Зямля", "Эмігранты" Ф.Рушчыца; "Снег", "Беларускія могілкі" Г.Вейсенгофа; "Нёман", "Восеньскі вечар" С.Жукоўскага; "Вечныя снягі", "Зімні пейзаж" В.Бялыніцкага-Бірулі і інш. Бытавому жанру прысвечаны карціны "Гадзіншчык", "Стары кравец" Ю.Пэна; "На суд прафесара", "Партрэт скрыпача Жухавіцкага" Я.Кругера; "Швачкі", "Вечар у сям'і" Л.Альпяровіча. У

кніжнай графіцы плённа працавалі К.Каганец, Я.Драздовіч. На высокім мастацкім узроўні імі праілюстраваны некаторыя беларускія выданні.

Што датычыцца скульптуры, то яна не атрымала такога распаўсюджання, як жывапіс і графіка. Са станковай скульптурай звязана творчасць К.Каганца, Я.Багушэўскага, А.Краснапольскага і інш. Пэўным поспехам карысталася манументальная скульптура. У 1908 г. каля в.Лясная ўстаноўлены помнік з нагоды 200-годдзя перамогі тут рускіх войск над шведскімі. Помнікі, прысвечаныя вайне 1812 г., узведзены ў 1912 г. у Віцебску і Кобрыне.

У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве назіраўся заняпад некаторых яго галін. Вялікім попытам карысталася мастацкае шкло. У Беларусі ў пачатку XX ст. працавала звыш 30 буйных прадпрыемстваў па вырабу шкла. Па аб'ёму вытворчасці беларускія заводы займалі трэцяе месца ў Расіі. Сваёй высокамастацкай прадукцыяй славіліся прадпрыемствы "Нёман А", "Нёман Б", "Барысаў", "Ноўка" і інш. Вырабы беларускіх майстроў неаднаразова адзначаліся высокімі ўзнагародамі на расійскіх і міжнародных выставах. У 1910 г. на міжнароднай выставе ў Парыжы вырабы хрустальнай фабрыкі "Барысаў" былі ўдастоены залатога медаля.

Ажыўленню мастацкага жыцця на Беларусі садзейнічалі перыядычныя выставы выяўленчага мастацтва ў Мінску. З 1890 па 1917 г. тут адбылося 10 выстаў. Асаблівым поспехам карысталася выстава ў 1911 г., на якой былі прадстаўлены творы 30 беларускіх, рускіх, украінскіх і польскіх мастакоў.

У арганізацыі культурных мерапрыемстваў для насельніцтва прымалі ўдзел земствы. Яна наладжвалі спектаклі, лекцыі, народныя чытанні, святочныя гулянкі і інш. У буйных гарадах атрымала распаўсюджанне кіно. У Мінску ў 1912 г. працавалі тры кінатэатры — "Мадэрн", "Эдан" і "Гігант". Дэманстраваліся ў іх неагучаныя кінафільмы. У архітэктуры Беларусі ў пачатку XX ст. не было адзінай мастацкай плыні. Існавалі розныя стылі: неаготыка, неарускі, неараманскі і інш. Найбольшае распаўсюджанне атрымаў неакласіцызм. Захаваліся такія помнікі архітэктуры, як касцёлы ў Красным, касцёл Святых Сімяона і Алены (неараманскі), царкоўна-археалагічны музей (неарускі) (зараз Дом мастацтва) у Мінску і інш.

РАЗДЗЕЛ 8

БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914 — 1918)

1. Становішча на Беларусі ў гады вайны

Абвастрэнне супярэчнасцей паміж блокамі капіталістычных дзяржаў — Траістым саюзам (Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія) і Антантай (Англія, Францыя і Расія) за калоніі, рынкі збыту тавараў, крыніцы сыравіны і сферы ўплыву прывяло да першай сусветнай вайны, якая пачалася 19 ліпеня (1 жніўня) 1914 г. У вайну былі ўцягнуты 33 краіны з насельніцтвам 1,5 млрд. чалавек.

З першых дзён вайны заходнія губерні краіны, у тым ліку беларускія, знаходзіліся на ваенным становішчы. У сувязі з гэтым ваенныя ўлады і губернатары атрымалі неабмежаваныя правы. Уводзіліся ваенна-палявыя суды. Без дазволу ваенных улад забаранялася распаўсюджванне газет і кніг, правядзенне маніфестацый, сходаў, забастовак. Праверцы на палітычную добранадзейнасць падлягалі ўсе чыгуначнікі. Згодна з загадам камандуючага Паўночна-Заходнім фронтам, прадугледжваліся жорсткія меры ў адносінах да ўдзельнікаў забастовак на чыгунцы.

Удзел Расіі ў вайне адпавядаў інтарэсам буржуазіі і дваранства. Яны разгарнулі ў краіне шавіністычную прапаганду. У першыя дні вайны на Беларусі прайшлі "патрыятычныя" маніфестацыі, сходы, малебны, збіраліся грошы на "абарону айчыны". Асобую "ініцыятыву" па збору сродкаў сярод насельніцтва па загаду ўлад праявілі земствы. Мікалаю II пры наведванні ў кастрычніку 1914 г. Мінска дэпутацыя дваранства і гарадской думы перадала 30 тыс. руб. на "патрэбы вайны". Шавінізм ахапіў не толькі памешчыкаў і буржуазію, але і частку рабочых, інтэлігенцыі, вучнёўскай моладзі і асабліва сялянства. На сацыял-шавіністычныя пазіцыі сталі эсэры, меншавікі, бундаўцы. Бальшавікі выступілі супраць вайны. Яны заклікалі да ператварэння імперыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую. Асудзіла вайну газета беларускага нацыянальнага руху "Наша ніва".

У пачатку вайны Расія паспяхова пачала ваенныя дзеянні на Заходнім фронце. Па патрабаванню Францыі, якая была пад пагрозай акупацыі нямецкімі войскамі, дзве рускія арміі пачалі наступленне ў Прусіі. Адначасова Расія

захапіла Галіцыю. Аднак становішча на Заходнім фронце к восені 1914 г. пагоршылася ў сувязі з тым, што сюды Германія перакінула значныя ваенныя сілы з Францыі. Пруская наступальная аперацыя дзвюх рускіх армій закончылася іх паражэннем. У 1915 г. Германія пачала актыўнае наступленне з мэтай хуткага разгрому Расіі. Летам рускія войскі былі выцеснены з Галіцыі. Нямецкае камандаванне планавала таксама акружэнне рускай арміі ў Польшчы.

Ваенныя дзеянні на Беларусі пачаліся ў жніўні 1915 г. Да пачатку верасня руская армія пад пагрозай акружэння вымушана была пакінуць значную частку яе тэрыторыі. У сувязі з гэтым стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага была пераведзена з Баранавіч у Магілёў. 9 верасня нямецкія войскі прарвалі фронт у раёне Свянцян. Руская армія спыніла наступленне немцаў у пачатку кастрычніка 1915 г. Фронт стабілізаваўся на лініі Дзвінск — Паставы — Смаргонь — Баранавічы — Пінск. Безвынікова закончылася спроба рускай арміі ў сакавіку, а таксама ў чэрвені — ліпені 1916 г. прарваць фронт у раёне возера Нарач і Баранавіч. У ходзе баёў на Беларусі руская армія панесла вялікія страты. Толькі ў нарачанскай аперацыі было забіта, паранена і захоплена ў палон звыш 90 тыс. чалавек.

Немцы акупіравалі 1/4 частку Беларусі, дзе жыло да вайны амаль 2 млн чалавек. Захопленая тэрыторыя была ўключана ў склад так званай "зямлі Обер-ост". Насельніцтва цярпела масавыя грабяжы, якія нярэдка заканчваліся падпаламі дамоў, забойствамі людзей. У жыхароў Гродна немцы запатрабавалі 10 тыс. руб. у якасці кантрыбуцыі. Дзейнічала жорсткая сістэма розных падаткаў, прымусовых работ, штрафаў, рэквізіцый. Насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў плаціла падушную подаць. Абсталяванне прамысловых прадпрыемстваў, працаздольнае насельніцтва, сельскагаспадарчыя прадукты, жывёла, лясныя багацці Белавежскай пушчы вывозіліся ў Германію. Нямецкія ўлады планавалі каланізаваць і германізаваць мясцовых жыхароў шляхам перасялення на захопленыя землі немцаў. Пашыралася дзейнасць каталіцкага касцёла, адкрываліся прыватныя нямецкія школы, у астатніх школах уводзілася нямецкая мова.

Цяжкае сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча склалася і на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі. У час наступлення кайзераўскіх войск тысячы людзей кінуліся на ўсход. Групы бежанцаў немцы пастаянна абстрэльвалі і бамбілі. Адступаючая руская армія часта прыму-

шала жыхароў пакідаць свае населеныя пункты. Перш за ўсё падлягала высяленню мужчынскае насельніцтва ад 15 да 45 годоў. Шмат бежанцаў, якія не мелі сродкаў, каб рухацца ў глыб краіны, заставаліся ў прыфрантавой паласе. У Мінскай і Віцебскай губернях у канцы 1915 г. іх налічвалася 247 тыс. Дапамогі, якая аказвалася бежанцам з боку саюзаў земстваў і гарадоў, Чырвонага крыжа, было недастаткова. Бежанцы гінулі ад холаду, голаду і эпідэмій. Цывільныя і ваенныя ўлады выкарыстоўвалі бежанцаў як танную рабочую сілу на розных работах.

Насельніцтва прыфрантавой паласы выконвала цяжкія ваенныя павіннасці: рамонт дарог, пабудову масгоу, ахову чыгуначных ліній і інш. У адной Мінскай губерні ў перыяд з чэрвеня 1915 г. па жнівень 1916 г. у капанні акопаў удзельнічала звыш 219 тыс. мужчын і жанчын. Маштабы абарончых работ былі такімі вялікімі, што для іх выканання ваенныя ўлады вырашылі мабілізаваць на Заходні фронт 100 тыс. чалавек з некаторых раёнаў краіны. Першая партыя кітайцаў з Сібіры прыбыла ў Оршу ў жніўні 1916 г.

Вайна прынесла вялікія страты сельскай гаспадарцы Беларусі. Пасяўныя плошчы ў неакупіраваных паветах скараціліся ў 1914 – 1917 гг. на 15,6%. Пагалоўе жывёлы зменшылася на 11,4%. З беларускай вёскі было мабілізавана больш за палову працаздольных мужчын. Шмат часу і сіл у сялян забіралі ваенныя павіннасці. За нявыхад на абарончую работу селяніну пагражалі штраф і турэмнае зняволенне. Шматлікія рэквізіцыі хлеба, фуражу, хатняй жывёлы садзейнічалі росту гаспадарак, у якіх не было кароў і коней. У вёсцы хутка ішоў працэс расслаення сялян. У гады вайны спынілася ўтварэнне хутарскіх і адрубных гаспадарак, ішло іх разарэнне. Толькі Віцебскім аддзяленнем Сялянскага банка ў студзені 1915 г. былі прададзены 333 хутарскія ўчасткі. Істотныя змены адбыліся і ў памешчыцкай гаспадарцы. У ёй востра адчуваўся недахоп рабочай сілы. Таму ваенныя ўлады, каб дапамагчы памешчыкам, прымушалі сялян, бежанцаў і салдат працаваць у іх маёнтках. Увядзенне ў Расіі ў канцы 1914 г. "сухога закону" прывяло да заняпаду памешчыцкага вінакурства, а гэта ў сваю чаргу садзейнічала скарачэнню вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі, пасеваў бульбы, асабліва ў Мінскай губерні. Ва ўмовах вайны некаторыя памешчыкі аддавалі свае землі ў арэнду, частка з іх разаралася.

У цяжкім становішчы знаходзілася прамысловасць Беларусі. Многія фабрыкі і заводы з-за адсутнасці паліва, сыравіны, попыту на прадукцыю скарачалі сваю вытворчасць, закрываліся. Кольскасць цэнзавых прадпрыемстваў у гады вайны зменшылася на 65%. Разам з тым і існаваўшыя, і створаныя ваеннымі ведамствамі, саюзамі земстваў і гарадоў прадпрыемствы, якія выконвалі ваенныя заказы, хутка павялічвалі прыбытак. У той жа час выпуск цывільнай прадукцыі прамысловасцю Беларусі складаў усяго 12 – 16% даваеннага ўзроўню. Адбыліся якасныя і колькасныя змены ў складзе рабочых. Большасць іх (58,4%) складалі падлеткі і жанчыны. На прадпрыемствы прыйшлі выхадцы з дробнабуржуазных слаёў горада і вёскі, а таксама кваліфікаваныя рабочыя, мабілізаваныя з прамысловых цэнтраў краіны для работы на армію. Адбывалася канцэнтрацыя пралетарыяту. На прадпрыемствах цэнзавай прамысловасці, на якіх працавала звыш 100 чалавек, у 1917 г. налічвалася 62,4% рабочых, у той час як у 1913 г. – 49,5%.

Скарачэнне сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці, разруха на транспарце, казнакрадства, спекуляцыя прывялі да вострага недахопу тавараў народнага ўжытку, росту цэн. На пачатак 1917 г. пакупная здольнасць рубля знізілася да 27 кап. Цэны на харчовыя прадукты і адзенне з 1913 па 1917 г. узраслі ў пяць – восем разоў. Для пакрыцця расходаў на вайну царскі ўрад толькі за два гады вайны павялічыў прамыя падаткі на 43%, ускосныя – на 54%. Асабліва цяжкія ўмовы жыцця склаліся ў гарадах, якія былі перапоўнены вайскоўцамі, бежанцамі і беспрацоўнымі. Не хапала жылля, транспарту, рабочых месц, востра адчуваўся харчовы крызіс. Становішча рабочых у гады вайны значна пагоршылася. На прадпрыемствах павялічваўся рабочы дзень, уводзіліся звышурочныя работы, дзейнічала шырокая сістэма штрафаў. Сярэдняя заработная плата рабочых Беларусі была меншай за агульнарасійскую на 47,6%. Праца на прадпрыемствах, якія выконвалі ваенныя заказы, разглядалася як "спецыфічны від вайсковай службы". Таму ўдзельнікі забастовак накіроўваліся на фронт у штрафныя роты.

Рабочы рух на Беларусі ў гады вайны не набыў такога размаху, як у прамысловых цэнтрах краіны. Больш таго, напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі ён амаль спыніўся. Да сакавіка 1917 г. вядомы 34 стачкі, 32 з якіх насілі эканамічны характар. За гэты ж перыяд адбыліся 202 ся-

лянскія выступленні. Разам з традыцыйнымі формамі сялянскага руху з'явіліся новыя — адмаўленне ад выканання ваенных павіннасцей і прымусовых ваенных работ, супраціўленне рэквізіцыям і інш.

Паражэнне рускай арміі, цяжкія ўмовы франтавога жыцця садзейнічалі росту антываенных настрояў сярод салдат. Да сакавіка 1917 г. з Заходняга фронту дэзерціравалі 13 648 салдат. За гэты перыяд адбылося звыш 60 салдацкіх хваляванняў. Самым буйным выступленнем салдат на Заходнім фронце і Беларусі з'явілася паўстанне 4 тыс. салдат і матросаў на гомельскім размеркавальным пункце ў кастрычніку 1916 г. Паўстанне было задушана ваеннай сілай.

Ва ўмовах ваеннага становішча на Беларусі левыя партыі не праяўлялі палітычнай актыўнасці. Эсэры засяродзілі сваю ўвагу на рабоце ў крэдытных таварыствах і спажывецкай кааперацыі. Бундаўцы займаліся аказаннем дапамогі бежанцам і беспрацоўным. Бальшавікі, якіх была нязначная колькасць, пры магчымасці праводзілі агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод насельніцтва і салдат Заходняга фронту. З канца 1914 г. пачаў дзейнічаць Палескі камітэт РСДРП, які быў разгромлены перад пачаткам вайны. У Мінску летам 1915 г. узнікла латышская сацыял-дэмакратычная група. У арміях Заходняга фронту дзейнічала звыш 30 бальшавіцкіх арганізацый. Аднак адзінай партыйнай арганізацыі бальшавікоў у Беларусі не было.

У гады вайны склаліся неспрыяльныя ўмовы для развіцця беларускага нацыянальнага руху. Частка яго ўдзельнікаў вымушана была пакінуць Беларусь. Перасталі друкаваць беларускамоўныя газеты і кнігі. У жніўні 1915 г. спынілася выданне газеты "Наша ніва". З 1915 г. у Вільні пачаў дзейнічаць Беларускі народны камітэт, які выказаўся за незалежнасць Беларусі і Літвы ў форме Вялікага Княства Літоўскага. Створаная ім для практычнага вырашэння гэтай задачы "Канфедэрацыя Вялікага Княства Літоўскага" па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах распалася. Пытанне аб незалежнасці беларускага народа дзеячы беларускага народнага камітэта ўздымалі ў 1916 г. на Стакгольмскай і Лазанскай канферэнцыях народаў Расіі.

Ідэю незалежнасці Беларусі прапагандавала на сваіх старонках і газета "Гоман", якая выходзіла ў Вільні пад рэдакцыяй В.Ластоўскага.

2. Змены ў грамадска-палітычных адносінах на Беларусі з лютага па снежань 1917 г.

Цяжар першай сусветнай вайны, гаспадарчая разруха выклікалі ўсё большую незадаволенасць у грамадстве. Нарастала забастовачная барацьба. 23 лютага 1917 г. на вуліцы Петраграда выйшлі работніцы тэкстыльных прадпрыемстваў. У наступныя дні мітынгі і дэманстрацыі праходзілі пад лозунгамі "Далоў вайну", "Далоў самадзяржаўе". Стачка набыла характар агульнагарадской, а 27 лютага з пераходам на бок рабочых салдат Петраградскага гарнізона перарасла ва ўзброенае паўстанне. Цар Мікалай II адрокся ад трона. У гэтых умовах рабочыя і салдаты стварылі свой орган улады — Петраградскі Савет. Паралельна з дэпутатаў Дзяржаўнай думы вылучаецца Часовы ўрад. Так узнікла двоеўладдзе.

У пачатку сакавіка 1917 г., калі звесткі аб перамозе рэвалюцыі дайшлі да Беларусі, у гарадах і мястэчках прайшлі мітынгі, дэманстрацыі, акцыі непадпарадкавання ўладам. Пачалі стварацца Саветы рабочых, салдацкіх дэпутатаў. 4 сакавіка быў абраны Мінскі Савет рабочых дэпутатаў, а 6 сакавіка на сумесным пасяджэнні яго выканкама і салдат-дэпутатаў ад воінскіх часцей было вырашана стварыць аб'яднаны Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

Адначасова дзейнічаў Часовы грамадскі камітэт парадку, створаны 4 сакавіка па даручэнню схода прадстаўнікоў думы, земстваў, Саюза гарадоў, ваенна-прамысловага камітэта, палітычных партый, духавенства, рабочых. 6 сакавіка Часовы ўрад назначыў губернскіх і павятовых камісараў, да якіх пераходзіла мясцовая ўлада. Быў выпрацаваны парадак фарміравання ўстаноў самакіравання: павятовых, валасных, гарадскіх камітэтаў. Мясцовыя органы ўлады падпарадкоўваліся дырэктывам Часовага ўрада.

Значны ўплыў на палітычнае жыццё мела войска. Пры захаванні падпарадкаванасці салдат камандзірам па ваенных пытаннях вайсковыя падраздзяленні ўсё больш уцягваліся ў падзеі, якія адбываліся ў раёнах дыслакацыі часцей. У сакавіку — красавіку 1917 г. пачаліся выбары салдацкіх камітэтаў. Яны павінны былі садзейнічаць павышэнню палітычнай і культурнай адукаванасці салдат, дэмакратызацыі армейскага жыцця. Хутка салдацкія камітэты пад уздзеяннем палітычных партый пачалі ўмешвацца ў работу камандзіраў, весці антываенную

агітацыю. У красавіку (7 — 17) 1917 г. I з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тылу Заходняга фронту зацвердзіў Палажэнне аб салдацкіх камітэтах. Дэлегаты падтрымалі курс Часовага ўрада на працяг вайны ў мэтах абароны дэмакратычнай рэвалюцыі, выступілі за прадастаўленне салдатам свабоды слова, друку, сходаў і г.д. З'езд унёс прапанову ўраду па рабочаму і сялянскаму пытаннях (увядзенне васьмігадзіннага рабочага дня, устанаўленне мінімальнай заработнай платы, канфіскацыя царкоўных, манастырскіх зямель, сацыялізацыя зямлі). Прынятыя рашэнні былі ў рамках патрабаванняў буржуазна-дэмакратычнага характару.

У сакавіку — красавіку 1917 г. пашыраецца сялянскі рух. 20 — 23 красавіка ў Мінску адбыўся з'езд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і неакупіраваных паветаў Віленскай губерняў. Ён выказаўся за хутчэйшае заключэнне міру, але пакуль існавала неабходнасць абароны краіны, з'езд лічыў магчымым далей весці вайну. Па аграрнаму пытанню дэлегаты рэкамендавалі правесці сацыялізацыю зямлі, увесці ўраўняльнае землекарыстанне. Канчатковае рашэнне праблемы адкладвалася да ўстаноўчага сходу. Эсэраўскую аграрную праграму падтрымалі сялянскія з'езды Магілёўскай і Віцебскай губерняў.

Лютаўская рэвалюцыя абудзіла палітычную актыўнасць шырокіх мас насельніцтва, якую выкарыстоўвалі палітычныя партыі для пашырэння свайго ўплыву ў грамадстве. Найбольш моцныя пазіцыі мелі бундаўцы, эсэры і меншавікі. Актыўна дзейнічалі бальшавіцкія арганізацыі. Ідэі нацыянальна-вызваленчага адраджэння выклікалі да жыцця дзесяткі партый і груповак. Памешчыцка-клерыкальныя арганізацыі (Саюз беларускай дэмакратыі, Саюз беларускага народа, Саюз ксяндзоў-беларусаў, Беларускі нацыянальны камітэт, Беларускі Саюз зямельных уласнікаў) зрабілі крок у бок ліберальнай буржуазіі. Яны арыентаваліся на партыю кадэтаў і бачылі Беларусь у складзе Расійскай дзяржавы.

Блізкімі да гэтай групоўкі былі Беларуская партыя народных сацыялістаў (БПНС) і Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Праграмныя дакументы пералічаных партый зафіксавалі патрабаванні захавання прыватнай уласнасці, памешчыцкага землеўладання. Яны выступалі за аўтаномію Беларусі з заканадаўчым органам — краёвай радай у федэратыўнай Расійскай рэспубліцы.

Каля 5 тыс. чалавек налічвала Беларуская сацы-

ялістычная грамада (БСГ). На канферэнцыі ў сакавіку 1917 г. БСГ падтрымала палітыку Часовага ўрада, ідэю стварэння федэратыўнай рэспублікі з аўтаноміяй Беларусі.

25 сакавіка 1917 г. па ініцыятыве БПНС і БСГ адбыўся з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. Ён абраў Беларускі нацыянальны камітэт (БНК) на чале з Р.Скірмунтам. З 18 членаў 10 з'яўляліся сябрамі БСГ. Прызнаючы палітыку Часовага ўрада, з'езд даручаў БНК правесці выбары ў Беларускую краёвую раду, распрацаваць мясцовую канстытуцыю. У маі БНК пачаў выдаваць газету "Вольная Беларусь". Беларускія нацыянальна-дэмакратычныя партыі зрабілі спробу дабіцца ад Часовага ўрада перадачы ўлады Беларускай краёвай радзе. Але расійскія буржуазныя палітыкі не падтрымалі гэтыя аўтанамісцкія захады. БНК пайшоў па шляху стварэння мясцовых устаноў улады, вайсковых фарміраванняў. Супрацьдзеянне палітыцы БНК аказвалі не толькі прадстаўнікі дзяржаўнай улады, але і арганізацыі РСДРП(б), якія імкнуліся завалодаць ініцыятывай у Саветах, фабрычна-заводскіх камітэтах, прафсаюзах, салдацкіх арганізацыях.

Складаным было становішча на фронце. 18 чэрвеня руская армія перайшла ў наступленне на паўднёва-заходнім напрамку. У выніку мела месца няўдача на Паўднёва-Заходнім і Заходнім франтах. Дзесяткі тысяч салдат і афіцэраў загінулі і былі паранены. Наспеў востры палітычны крызіс. 4 ліпеня 1917 г. у Петраградзе прайшла несанкцыяніраваная паўмільённая дэманстрацыя. З дазволу выканкама Усерасійскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў яна была расстраляна. Двоеўладдзе закончылася. Уся ўлада перайшла да Часовага ўрада, які прымяніў сілу да апазіцыйных партый і рухаў. У падполле перайшлі бальшавікі. Распускаліся салдацкія камітэты, расфарміроўваліся некаторыя вайсковыя часці. На Заходнім фронце ўводзілася пакаранне смерцю. У гэтых умовах РСДРП(б) на VI з'ездзе (26 ліпеня – 3 жніўня) прымае рашэнне аб падрыхтоўцы ўзброенага паўстання супраць Часовага ўрада. 8 – 10 ліпеня 1917 г. у Мінску адбыўся II з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. Была абрана Цэнтральная рада беларускіх арганізацый на чале з Я.Лёсікам. Цэнтральная рада рабіла спробы аб'яднаць беларускі рух вакол нацыянальнай ідэі. Меншавікі, эсэры, бундаўцы былі супраць палітычнай аўтаноміі Беларусі. Яны лічылі лепшым абласное самакіраванне беларускіх губерняў у межах дэмакратычна-рэспубліканскай Расіі. У

ліпені — жніўні 1917 г. на Беларусі праходзілі выбары ў мясцовыя органы самакіравання — гарадскія думы, земствы. Найбольшую колькасць месц у гарадскіх думах атрымалі эсэры, бундаўцы, польскі сацыялістычны блок, яўрэйскі нацыянальны блок, кааліцыя польскіх партый. На выбарах у валасныя земствы перамогу атрымалі эсэры, у мястэчках — бундаўцы. Такім чынам, ні беларускія нацыянальныя партыі, ні бальшавікі летам 1917 г. не карысталіся значнай падтрымкай сярод насельніцтва. Аднак Часовы ўрад працягваў рэпрэсіўную палітыку навядзення парадку. 18 ліпеня Вярхоўным галоўнакамандуючым прызначаны генерал Л.Г.Карнілаў, які 25 — 30 жніўня патрабаваў устанавіць у краіне ваенную дыктатуру. Супраць выступілі многія вайсковыя часці, рабочыя беларускіх гарадоў. Узначалілі гэтую барацьбу бальшавікі, што значна павысіла іх уплыў на працоўныя масы. У другой палове верасня 1917 г., напрыклад, у ходзе перавыбараў Саветаў бальшавікі атрымалі большасць у Мінскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў, затым Слуцкім і Рэчыцкім. Трэба адзначыць, што працэс бальшавізацыі Саветаў не насіў масавага характару. Але бальшавіцкія арганізацыі збіралі сілы. Бальшавікі Беларусі, Заходняга фронту і Смаленшчыны на канферэнцыі 15 — 18 верасня ў Мінску абралі адзіны кіруючы орган — Паўночна-Заходні камітэт РСДРП(б).

Лідэры беларускага руху ў мэтах каардынацыі сваёй дзейнасці 24 верасня 1917 г. склікалі ў Маскве І Беларускі з'езд. Большасць дэлегатаў прадстаўлялі БСГ. На з'ездзе БСГ стварыла дзве фракцыі. Прэтэндавала на лідэрства БНГ (А.Цвікевіч, Ф.Турук, І.Васілевіч). Пры абмеркаванні пытання аб палітычнай сістэме Беларусі прадстаўнікі БСГ пакінулі з'езд. Захады па кансалідацыі сіл у адзіны нацыянальны фронт не атрымалі падтрымкі. У беларускім руху назіраюцца супярэчнасці і размежаванні. На аснове Петраградскай арганізацыі БСГ стварылася Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя. Петраградская, Маскоўская і Бабруйская арганізацыі БСГ пасля III з'езда партыі (14 — 25 кастрычніка) заявілі аб непадпарадкаванні ЦК БСГ.

15 кастрычніка на II сесіі Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый адбылася рэарганізацыя кіруючага органа — абрана Вялікая беларуская рада. У яе склад увайшлі прадстаўнікі Беларускай рады Заходняга фронту. Была створана Цэнтральная вайсковая беларуская рада. Яна павяла

работу на Заходнім і Румынскім франтах па фарміраванню беларускага войска.

25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе адбылося ўзброенае паўстанне рабочых і салдат. У той жа дзень выканкам Мінскага Савета аб'явіў аб пераходзе ўлады ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З палітычных вязняў быў створаны 1-ы рэвалюцыйны полк. Разам з 37-м і 289-м запаснымі палкамі, атрадам чырвонаармейцаў-чыгуначнікаў яны склалі ўзброеныя сілы Мінскага Савета. У хуткім часе пры Савеце быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (К.Ландар, А.Мяснікоў і др.).

Супраць новай улады выступілі буржуазныя партыі, эсэры, бундаўцы, меншавікі, гарадскія думы, Вялікая беларуская рада, цэнтральнае бюро прафсаюзаў Мінска і інш. 27 кастрычніка яны стварылі Камітэт ратавання рэвалюцыі на чале з эсэрам Т.Калатухіным. Маючы перавагу сіл, Камітэт ратавання рэвалюцыі ультыматыўна патрабаваў перадачы яму ўлады. Мінскі Савет пагадзіўся пры ўмове, што войскі не будуць накіраваны на падаўленне паўстання ў Петраград і Маскву. Пасля заключэння пагаднення большавікі павялі агітацыю сярод салдат. 2 лістапада ў Мінск увайшоў бліндзіраваны поезд і некаторыя вайсковыя часці, якія ўзялі пад ахову Мінскі Савет. У горадзе зноў была ўстаноўлена савецкая ўлада.

У канцы кастрычніка — пачатку лістапада савецкая ўлада перамагла ў Віцебску, Гомелі, Полацку і іншых гарадах. 19 лістапада новую ўладу прызнаў Магілёўскі Савет. Такім чынам у лістападзе на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі была ўстаноўлена ўлада Саветаў. У гэты час прайшлі салдацкія з'езды 2, 3 і 10-й армій Заходняга фронту. Яны сведчылі аб падтрымцы арміяй рэвалюцыйных змен, дэкрэтаў савецкай улады.

У лістападзе 1917 г. адбыліся выбары ва Устаноўчы сход. З 56 дэлегатаў ад Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай акруг і Заходняга фронту было выбрана 30 большавікоў, 22 эсэры, чатыры прадстаўнікі іншых арганізацый. Перамога большавікоў на Беларусі на выбарах ва Устаноўчы сход была невыпадковай. Арганізацыі РСДРП(б) вялі актыўную работу па замацаванню новай улады. Яны атрымалі падтрымку на з'ездах Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці (19 — 21 лістапада), III з'ездзе Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў (18 — 20 лістапада), II з'ездзе армій Заходняга фронту (20 — 25 лістапада). 26 лістапада ў адпаведнасці з рашэннямі

з'ездаў выканкамы і франтавы камітэт утварылі Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах) на чале з М.Рагазінскім. Абласны камітэт сфарміраваў Савет народных камісараў вобласці і фронту (старшыня К.Ландар), які ўзначаліў палітычную і гаспадарчую дзейнасць Саветаў (увядзенне на прадпрыемствах рабочага кантролю, канфіскацыя памешчыцкіх зямель і г.д.).

Што датычыцца нацыянальнага самавызначэння, то Аблвыкамзах не зрабіў ніякіх рэальных крокаў на шляху стварэння беларускай дзяржаўнасці. Беларускія нацыянальныя партыі, эсэры, меншавікі і многія іншыя палітычныя партыі і групоўкі, якія не прынялі ўладу Саветаў, выступілі пад лозунгам поўнага нацыянальнага самавызначэння Беларусі. Выканкам Вялікай беларускай рады пачаў падрыхтоўку назначанага на 5 снежня Усебеларускага з'езда. Мэтай з'езда было стварэнне прызнанай дэмакратычнай краёвай улады. Паралельна ў гэтым накірунку працаваў Беларускі абласны камітэт (БАК), які быў сфарміраваны ў лістападзе 1917 г. на I Усебеларускім з'ездзе сялянскіх дэпутатаў у Петраградзе. Дэпутаты-беларусы з'езда стаялі на пазіцыях эсэраў. Пры падтрымцы Наркамата па справах нацыянальнасцей РСФСР БАК выступіў з прапановай правядзення 15 снежня з'езда прадстаўнікоў земстваў, Саветаў сялянскіх дэпутатаў, беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацый арміі, настаўніцкага саюза, кааператыўных і культурна-асветніцкіх устаноў.

Вялікая беларуская рада ўстанавіла сувязь з БАК, які атрымаў грашовую падтрымку ўрада Расіі для правядзення з'езда. Беларускі абласны камітэт заявіў, што ён прызнае савецкую ўладу і пагаджаецца з тым, каб у рабоце з'езда прынялі ўдзел і прадстаўнікі Аблвыкамзаха.

5 снежня 1917 г. Вялікая беларуская рада аб'явіла аб адкрыцці Усебеларускага з'езда. На з'ездзе прысутнічала 300 дэлегатаў. У сувязі з гэтым БАК выказаў пратэст. Арганізатары пагадзіліся з тым, каб перанесці пачатак работы Усебеларускага кангрэса на 15 снежня. Палітычныя партыі, гарадскія думы, земствы, зямельныя камітэты, вайсковыя беларускія рады і іншыя арганізацыі і ўстановы дэлегавалі на кангрэс 1872 прадстаўнікоў. 1167 дэлегатаў мелі права рашаючага голасу, у тым ліку каля 800 чалавек з'яўляліся прадстаўнікамі рабочых, сялян, салдат. З палітычных партый найбольш уплывовымі на кангрэсе былі

эсэры і БСГ. Барацьба разгарнулася вакол пытання аб формах самавызначэння Беларусі. Беларуская рада выступала за аб'яўленне незалежнасці Беларусі. БАК патрабаваў абласной аўтаноміі ў складзе Расіі. Левыя эсэры, народніцкае крыло БСГ выступалі за аўтаномію са сваёй краёвай радай і адміністрацыяй.

З'езд не прызнаў легітымнасць бальшавіцкай улады. Ён абвясціў сябе вышэйшай уладай. Была прынята рэзалюцыя аб усталяванні рэспубліканскага ладу і стварэнні часовага органа краёвай улады — Усебеларускага Савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў.

СНК Заходняй вобласці ў ноч з 17 на 18 снежня правёў арышты некаторых членаў прэзідыума, шэрагу дэлегатаў і аб'явіў, што з'езд распушчаны. 18 снежня дэлегаты — лідэры беларускіх палітычных партый канспіратыўна стварылі выканаўчы камітэт савета з'езда. Камітэт спрабаваў арганізаваць супрацоўніцтва з губернскімі земствамі, гарадскімі думамі і сумесна з Цэнтральнай беларускай вайсковай радай стварыць беларускае войска. Саўнаркам Заходняй вобласці і фронту абвясціў аб роспуску Вялікай беларускай рады, Беларускай вайсковай рады. Савецкая ўлада прыступіла да ліквідацыі апазіцыі: скасоўваліся гарадскія думы, земскія ўстановы, суды, закрываліся апазіцыйныя газеты. Ствараўся новы апарат кіравання — мясцовыя Саветы.

3. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасць яе Рады

9 снежня 1917 г. паміж Савецкай Расіяй і Германіяй пачаліся мірныя перагаворы. Занепакоены тым, што ўзнікла рэальная небяспека падзелу роднага краю, Выканкам Усебеларускага з'езда накіраваў у Брэст-Літоўск сваіх прадстаўнікоў. Дэлегацыя на чале з А.Цвікевічам, нягледзячы на шматлікія перашкоды і адсутнасць афіцыйнага статуса, тым не менш здолела данесці да ведама ўдзельнікаў канферэнцыі, што яна выступае ад імя беларускага народа і адстойвае цэласнасць і непадзельнасць яго тэрыторыі, неабходнасць нацыянальнага самавызначэння. Але мірныя перагаворы па віне Л.Троцкага былі сарваны. Германскае камандаванне аддало загад сваім войскам пачаць 18 лютага 1918 г. наступленне, што рэзка абвастрыла сітуацыю на Заходнім фронце. Дзейнічаючы сумесна з часцямі 1-га

13. Зак. 5396.

польскага корпуса, германскія войскі хутка набліжаліся да Гомеля і Мінска. У такіх умовах кіраўніцтва Аблвыкамзаха і СНК Заходняй вобласці, якія раней неаднойчы заяўлялі аб сваім імкненні застацца ў горадзе і арганізаваць абарону, вымушаны былі спешна эвакуіравацца. У ноч на 19 лютага з Мінска ў Смаленск выехалі партыйныя і савецкія ўстановы, штаб Заходняга фронту.

Пасля ўцёку бальшавікоў Выканкам Усебеларускага з'езда вырашыў узяць уладу ў свае рукі. 21 лютага 1918 г. ён звярнуўся да народаў Беларусі з першай устаўной граматай, у якой абвясціў сябе часовай уладай. "Мы павінны ўзяць свой лёс у свае ўласныя рукі", — падкрэслівалася ў грамаце. Беларускі народ павінен ажыццявіць сваё неад'емнае права на поўнае самавызначэнне, а нацыянальныя меншасці — на нацыянальна-персанальную аўтаномію. Планавалася, што права нацый павінна вырашацца праз скліканне на дэмакратычных пачатках устаноўчага сейма, а да яго адкрыцця функцыі ўлады ўскладаліся на створаны Выканкамам Народны Сакратарыят Беларусі. Гэта быў першы беларускі ўрад, старшынёй і сакратаром міжнародных спраў якога быў прызначаны адзін з лідэраў БСГ Я.Варонка. Акрамя яго ў склад урада ўвайшлі яшчэ 14 сакратароў, якія прадстаўлялі БСГ, сацыялістаў-рэвалюцыянераў і яўрэйскія сацыялістычныя арганізацыі.

Дзейнасць Народнага Сакратарыята праходзіла ў складаных умовах. У Мінск увайшлі нямецкія войскі, дзе яны нечакана сутыкнуліся з палітычным цэнтрам, які называў сябе беларускім урадам. Асновай сваёй палітыкі Германія лічыла толькі мірны дагавор з РСФСР і разглядала Беларусь як частку акупіраванай расійскай тэрыторыі. 25 лютага 1918 г. нямецкія салдаты занялі будынак Народнага Сакратарыята, знялі з яго нацыянальны сцяг, у памяшканні зрабілі вобыск і захапілі касу. Неўзабаве пасля інцыдэнту акупацыйным уладам быў адасланы мемарандум. Пасля наведвання беларускімі прадстаўнікамі капітана фон Пільца непаразуменне было вырашана. Аднак рэальнай улады Народны Сакратарыят не атрымаў і працягваў сваё існаванне толькі фармальна.

9 сакавіка 1918 г. адбылося пашыранае пасяджэнне Выканкама Усебеларускага з'езда, на якім прымаецца другая ўстаўная грамата да народаў Беларусі. У межах рассялення і колькаснай перавагі яе насельніцтва Беларусь была абвешчана Народнай Рэспублікай — БНР. Выканкам быў

перайменаваны ў Раду, прэзідыум якой узначаліў І. Серада. Да склікання ўстаноўчага сейма яна аб'яўлялася заканадаўчай уладай, а Народны Сакратарыят, які назначаўся Радай, стаў выканаўчым органам і быў адказным ва ўсім перад ёй. Граматай дэкларавалiся дэмакратычныя правы і свабоды, адмянялася права прыватнай уласнасці на зямлю, устанаўліваўся васьмігадзінны рабочы дзень.

Другая ўстаўная грамата фактычна з'яўлялася пашырэннем першай і вызначала асноўныя прынцыпы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на Беларусі. З імі пагадзіліся нават меншавікі і эсэры, якія раней ігнаравалі саму ідэю беларускай дзяржаўнасці. Адбылося іх прымірэнне з беларускімі палітычнымі партыямі, перш за ўсё з БСГ. Пачала выпрацоўвацца агульная тактыка ў нацыянальным пытанні, на падставе якой складваўся палітычны блок. Прадстаўнікі расійскіх сацыялістычных партый увайшлі ў Раду. 18 сакавіка 1918 г. Рада Усебеларускага з'езда абвясціла сябе Радай БНР і папоўніла свой склад. У яе ўвайшлі прадстаўнікі палітычных партый і аб'яднанняў, земстваў і гарадоў, нацыянальных меншасцей, якія жылі на Беларусі. У Прэзідыум Рады былі абраны І. Серада, Я. Варонка і К. Езавітаў.

3 сакавіка 1918 г. паміж Савецкай Расіяй і Германіяй быў падпісаны мірны дагавор, па якому землі, што ляжалі на захад ад лініі Рыга — Дзвінск — Свянцяны — Ліда — Пружаны і належалі раней Расіі, перадаваліся Германіі і Аўстра-Венгрыі. Будучы іх лёс павінен быў вырашацца ў згодзе з пажаданнямі насельніцтва. Усходняя частка захопленых Германіяй беларускіх зямель да заканчэння вайны заставалася пад акупацыяй. Гэта яшчэ больш узмацніла незалежніцкія тэндэнцыі ў радах беларускага нацыянальнага руху, бо бальшавікі парушылі дадзенае Л. Троцкім абяцанне, што лёс Беларусі не будзе вырашацца без удзелу яе прадстаўнікоў.

У склад Рады былі кааптаваны прадстаўнікі Віленскай беларускай рады, якія прапанавалі абвясціць незалежнасць БНР. Прапанова спачатку была разгледжана фракцыяй БСГ у Радзе БНР, затым на пленарным пасяджэнні. Пасля доўгіх спрэчак паміж прыхільнікамі незалежнасці і аўтаноміі Беларусі ў складзе РСФСР 25 сакавіка 1918 г. была прынята трэцяя ўстаўная грамата, якой абвяшчалася незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі. У параўнанні з папярэднімі актамі ўдакладнялася, што БНР павінна ўключыць усе землі, дзе жыў і меў лічбавую

перавагу беларускі народ. Згодна з этнаграфічнай картай, якую склаў акадэмік Я.Карскі, сюды ўключаліся Магілёўшчына, беларускія часткі Міншчыны, Віцебшчыны, Віленшчыны, Гродзеншчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і іншых губерняў. У грамаце падкрэслівалася, што траціліся сілу ўсе старыя дзяржаўныя сувязі і Брэсцкі мірны дагавор. Рада БНР павінна была ўвайсці ў адносіны з зацікаўленымі бакамі і самастойна падпісаць мірнае пагадненне, маючы на ўвазе захаванне цэласнасці і непадзельнасці беларускіх зямель.

Акт аб незалежнасці адлюстраваў надзеі на прызнанне БНР суседнімі краінамі. Аднак гэты крок спачатку не атрымаў падтрымкі. Украіна, Латвія і Літва мелі прэтэнзіі на беларускія тэрыторыі. У Расіі адразу пачаліся акцыі пратэсту супраць абвяшчэння БНР, бо яна лічыла Беларусь неад'емнай часткай сваёй тэрыторыі. Дзяржавы Антанты і ЗША ва ўмовах вайны з Германіяй і грамадзянскай вайны ў Расіі таксама не праявілі зацікаўленасці да БНР. Праціўнікамі беларускай дзяржаўнасці з'яўляліся польскія і рускія арганізацыі на Беларусі, яўрэйскія колы, якія арыентаваліся на мову і культуру вялікіх народаў і мелі эканамічныя інтарэсы за яе межамі. Што ж тычылася Германіі, то яе канцлер у адказ на ноту Народнага Сакратарыята паведаміў, што Берлін трактуе Беларусь як частку Савецкай Расіі, паводле Брэсцкага пагаднення, не мае права без згоды ленінскага ўрада прызнаць новастворануюдзяржаву.

Пад пагрозай зброі акупацыйныя ўлады разагналі Раду і Народны Сакратарыят, а ў пачатку красавіка забаранілі іх дзейнасць.

У сувязі са знешнімі абставінамі Рада і Сакратарыят пайшлі на збліжэнне з дзеячамі Мінскага беларускага прадстаўніцтва Р.Скірмунтам і П.Алексюком, якія выступалі супраць сацыяльных пераўтварэнняў, за больш цеснае супрацоўніцтва з Германіяй. Яны былі кааптаваны ў склад Рады БНР, а 25 красавіка 1918 г. пад іх націскам прымаецца рашэнне накіраваць тэлеграму кайзеру Вільгельму II, у якой выказвалася падзяка за вызваленне Беларусі ад бальшавіцкага прыгнёту і анархіі. Члены Рады заявілі, што будучыню сваёй краіны яны бачаць толькі пад апекай германскай дзяржавы.

Але адказу не было, не далі вынікаў і іншыя намаганні ў гэтай справе. Як затым высветлілася, гэта быў памылковы крок, які выклікаў востры палітычны крызіс і прывёў да

расколу БСГ і Раду БНР. Беларуская сацыялістычная грамада раскалолася на тры часткі: Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларускую сацыял-дэмакратычную і Беларускую партыю сацыялістаў-федэралістаў. Раду БНР пакінулі сацыялісты-рэвалюцыянеры, меншавікі, яўрэйскія сацыялісты, частка членаў БСГ. Пачаў распадацца Народны Сакратарыят. Пад уплывам абставін Рада пачала эвалюцыяніраваць у кааліцыйны орган, дзе перавагу атрымалі кансерватары на чале з Р.Скірмунтам. У выніку палепшыліся яе адносіны з акупацыйнымі ўладамі, якія ў адрозненне ад афіцыйнага Берліна супрацоўнічалі з Радай БНР.

Пры падтрымцы камандуючага 10-й арміяй генерала Эрыха фон Фалькенгайнама Рада дабілася згоды на дзейнасць Мінскай гарадской думы, арганізацыю мясцовай улады. Быў выдадзены часовы загад мясцовым беларускім радам, у якім акрэсліваліся прынцыпы выбараў і прыняцця ўлады ад акупантаў у асобных адміністрацыйных галінах. Пры павятовых камендатурах ствараўся інстытут дарадцаў для ўрэгулявання спрэчак паміж акупантамі і насельніцтвам. Пасля таго як у чэрвені 1918 г. урад БНР аб'явіў несапраўднымі дэкрэты савецкай улады, акупанты перадалі ў кампетэнцыю Народнага Сакратарыята гандаль, прамысловасць, органы апекі, адукацыю і культуру.

Паспяхова развівалася дзейнасць Рады БНР на міжнароднай арэне. Па яе ініцыятыве нямецкае вайсковае камандаванне пачало летам 1918 г. перагаворы з Савецкай Расіяй аб аб'яднанні з тэрыторыяй БНР усходніх раёнаў Беларусі, занятых расійскімі войскамі. З гэтай нагоды ў Маскву выязджала беларуская дэлегацыя, але народны камісар замежных спраў РСФСР Г.Чычэрын яе не прыняў. Прадстаўніцтвы БНР з'явіліся на Украіне, у Літве і Савецкай Расіі. Дыпламатычныя місіі былі накіраваны ў Варшаву, Берлін, Бёрн, Капенгаген. У Кіеве была адкрыта Беларуская гандлёвая палата. Грамадзяне рэспублікі пачалі атрымліваць пашпарты БНР, у тым ліку дыпламатычныя. У 1918 г. у якасці дзяржаўнага быў зацверджаны бела-чырвона-белы сцяг і герб "Пагоня".

Найбольшых поспехаў БНР дасягнула ў развіцці асветы і культуры. У красавіку 1918 г. Народны Сакратарыят прыняў пастанову аб абвяшчэнні беларускай мовы дзяржаўнай. Усе акты, дакументы і пастановы павінны былі пісацца на ёй. Паводле розных падлікаў, было адкрыта ад 150 да 350 беларускіх школ, 13 гімназій. Пры народным

сакратарыяце асветы створана бюро па справах распрацоўкі школьных падручнікаў і выдавецтва "Прасвета", якое займалася іх выданнем. У Мінску пачаў работу Беларускі педагагічны інстытут, дзе лекцыі чыталі прафесары Я.Карскі, В.Іваноўскі, У.Ігнатоўскі, Б.Тарашкевіч і інш. У красавіку 1918 г. заснавана Мінская вышэйшая музычная школа, якая ў тым жа годзе перайменавана ў Беларускую кансерваторыю. Была створана падрыхтоўчая камісія па адкрыццю Беларускага універсітэта, куды ўвайшлі А.Смоліч, М.Доўнар-Запольскі, Я.Карскі. У Мінску працавалі Беларускі тэатр, Таварыства драмы і камедыі, іншыя культурныя ўстановы. Пад кантролем Народнага Сакратарыята выходзіла 14 газет і часопісаў на беларускай мове.

Поспехі ў дзяржаўным будаўніцтве БНР былі абмежаваныя, бо германскія ўлады не дазволілі стварыць свае ўзброеныя сілы і паліцыю, адсутнічалі фінансавая сістэма, мясцовыя органы ўлады. У выніку, калі адбылася лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі (1918), а Савецкі ўрад дэнансаваў Брэсцкі дагавор, Рада БНР аказалася безабароннай. Частка яе членаў засталася ў Мінску, астатнія выехалі ў Гродна і Вільна. Аднак, нягледзячы на неспрыяльныя умовы, першая спроба ўтварэння беларускай дзяржаўнасці мела вялікае гістарычнае значэнне. Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасць яе Рады аказалі значны ўплыў на развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Не дабіўшыся ўлады, Рада БНР тым не менш прымусіла бальшавіцкі ўрад перагледзець сваю палітыку ў адносінах да Беларусі і пайсці па шляху ўтварэння абмежаванай у правах савецкай дзяржавы.

РАЗДЗЕЛ 9

БЕЛАРУСЬ У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1919 — 1939)

1. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Савецкай Беларусі

Падрыхтоўчая работа па стварэнню БССР пачалася адразу пасля роспуску Усебеларускага з'езда. Паводле дэкрэта СНК РСФСР ад 31 студзеня 1918 г., пры Наркамнацы ў Петраградзе быў арганізаваны Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам), які прыступіў да сваёй працы 2 лютага. Старшынёй яго стаў А.Р.Чарвякоў, а У.В.Скарынка — яго намеснікам. Д.Ф.Жылуновіч быў прызначаны на пасаду галоўнага сакратара. Белнацкам меў агітацыйна-палітычны, культурна-асветніцкі, бежанскі, выдавецкі, ваенны, працы і іншыя аддзелы.

У сакавіку 1918 г. Белнацкам пераехаў у Маскву разам з урадам У.І.Леніна. У Петраградзе, Смаленску і Віцебску пачалі дзейнічаць аддзяленні камісарыята. Друкаваным органам Белнацкама з'яўлялася газета "Дзянніца" (рэдактар Д.Ф.Жылуновіч) — першая савецкая газета на беларускай мове. Сярод супрацоўнікаў Белнацкама было многа вядомых дзеячаў навукі і культуры: Д.Жылуновіч, І.Пятровіч (Янка Нёманскі), Б.Тарашкевіч, У.Дабравольскі, І.Баранкевіч, А.Грыневіч, Ф.Турук, Ф.Шантыр, Я.Канчар, І.Дварчанін, Л.Родзевіч, М.Мялешка і інш. У арганізаваным Белнацкамам Беларускім народным універсітэце ў Маскве лектарамі былі географ Д.Анучын, гісторык У.Пічэта, моваznавец П.Растаргуеў, славіст А.Ясінскі і інш.

Маючы такія моцныя інтэлектуальныя сілы, Белнацкам сваю дзейнасць накіраваў на стварэнне сапраўднай нацыянальнай дзяржаўнасці і развіццё беларускай культуры, займаўся падрыхтоўкай нацыянальных кадраў для многіх галін гаспадаркі і асветы, удзельнічаў у стварэнні Беларускага дзяржаўнага універсітэта, клапаціўся пра бежанцаў-беларусаў у Расіі, адкрываў для іх "беларускія хаткі", школы для дзяцей, арганізаваў у Маскве два з'езды бежанцаў з Беларусі і падтрымліваў цесную сувязь з У.І.Леніным. Асабліва энергічна Белнацкам змагаўся з правым крылом беларускага нацыянальнага руху, якое

імкнулася дабіцца любой цаной дзяржаўнасці Беларусі пры дапамозе германскіх акупантаў.

У цесным кантакце з Белнацкамам працавалі беларускія секцыі РКП(б), якія з восені 1918 г. існавалі ў Петраградзе (на базе БСДРП), Маскве пры Белнацкаме, Сараташе, Тамбове, Казані і іншых гарадах. Яны складаліся з рабочых і бежанцаў-беларусаў — членаў РКП(б). Трэба мець на ўвазе, што як у Белнацкам, так і ў беларускія секцыі РКП(б) уваходзіла лепшая, самая свядомая ў нацыянальных адносінах частка беларускай нацыі.

21 — 23 снежня 1918 г. у Маскве адбылася канферэнцыя беларускіх секцый РКП(б). У яе рабоце прынялі ўдзел 19 дэлегатаў, якія прадстаўлялі амаль тысячу камуністаў-беларусаў, у асноўным бежанцаў. На канферэнцыі было абрана Цэнтральнае бюро (ЦБ) беларускіх камуністычных секцый РКП(б). Старшынёй яго стаў Д.Ф.Жылуновіч, членамі — А.Р.Чарвякоў, Ф.Д.Балбека, І.С.Надзецкі і інш. ЦБ беларускіх секцый павінна было аб'яднаць намаганні камуністаў-беларусаў, якія жылі на тэрыторыі РСФСР і УССР, на рашэнне нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі ў сувязі з аднаўленнем на яе тэрыторыі савецкай улады. Канферэнцыя прыняла рашэнне аб неабходнасці стварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і звярнулася да У.І.Леніна і ў ЦВК з просьбай дапамагчы беларусам у ажыццяўленні гэтай ідэі. У апошні дзень работы канферэнцыі ў Наркамнаце РСФСР адбылася гутарка з прадстаўнікамі Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый аб дзяржаўным станаўленні Беларусі.

У гэты ж час шэраг кіруючых асоб (А.Ф.Мяснікоў, В.Г.Кнорын і інш.) партыйных і савецкіх органаў Заходняй вобласці выступілі з адмаўленнем правамернасці нацыянальнага самавызначэння Беларусі. Яны лічылі, што пасля вызвалення краю ад нямецкай акупацыі павінна захавацца Заходняя вобласць як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка РСФСР.

Аднак ЦК РКП(б), улічваючы прапановы ЦБ беларускіх секцый і Белнацкама, 24 снежня 1918 г. прыняў рашэнне аб неабходнасці абвяшчэння незалежнай і суверэннай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. З гэтай пастановай вымушаны былі пагадзіцца партыйныя і савецкія кіраўнікі Заходняй вобласці і фронту.

25 снежня 1918 г. адбылася экстранная нарада супрацоўнікаў Белнацкама, членаў ЦБ беларускіх ка-

муністычных секцый і камітэта маскоўскіх беларускіх секцый РКП(б). На нарадзе было вырашана вылучыць у склад урада БССР 15 кандыдатур, на пасаду Старшыні Саўнаркама рэспублікі большасцю галасоў быў вылучаны Д.Ф.Жылуновіч. 27 снежня адбылася другая нарада работнікаў Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый. На ёй прысутнічалі і прадстаўнікі Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) А.Ф.Мяснікоў і М.І.Калмановіч. Нарада вырашала наступныя пытанні: будову ўрада Савецкай Беларусі, прыкладныя граніцы новай рэспублікі і інш. Д.Ф.Жылуновічу і А.Р.Чарвякову было даручана падрыхтаваць праект Маніфеста Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі.

30 снежня 1918 г. у Смаленску адкрылася VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б).

Паколькі на канферэнцыі былі прадстаўлены ўсе камуністычныя арганізацыі Беларусі, яна аб'явіла сябе Першым з'ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларускай Рэспублікі (КП(б)Б). З'езд абраў Цэнтральнае Бюро КП(б)Б, у склад якога ўвайшлі амаль усе члены Паўночна-Заходняга абкама партыі, у мінулым працаўнікі стварэння БССР. З 15 яго членаў толькі Д.Ф.Жылуновіч і І.В.Лагун з'яўляліся прадстаўнікамі беларускіх камуністычных секцый.

31 снежня 1918 г. і 1 студзеня 1919 г. адбыліся пасяджэнні ЦБ КП (б)Б, на якіх разгарнуліся вострыя спрэчкі ў сувязі з фарміраваннем Часовага ўрада рэспублікі. Д.Ф.Жылуновіч дамагаўся 10 з 17 месц ва ўрадзе для прадстаўнікоў Белнацкама і ЦБ беларускіх камуністычных секцый, а таксама цвёрда патрабаваў выключыць са складу ўрада А.Ф.Мяснікова, М.І.Калмановіча і Р.В.Пікеля. Пасля асабістых перагавораў І.В.Сталіна з Д.Ф.Жылуновічам па тэлефоне апошні павінен быў зняць свае патрабаванні. Познім вечарам 1 студзеня быў канчаткова сфарміраваны Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі на чале з Д.Ф.Жылуновічам, наркамамі былі прызначаны сем прадстаўнікоў Белнацкама і камуністычных секцый, а таксама дзевяць прадстаўнікоў Паўночна-Заходняга абкама і Аблвыкамзаха. У гэты ж вечар, 1 студзеня 1919 г., Часовы рабоча-сялянскі ўрад па радыё абнародаваў Маніфест, які абвясціў аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Маніфест быў першым канстытуцыйным актам Савецкай Беларусі. 7 студзеня 1919 г. урад БССР пераехаў са Смаленска ў Мінск, які з гэтага часу стаў сталіцай рэспублікі.

Сваю дзейнасць урад БССР пачаў у вельмі цяжкіх палітычных і эканамічных умовах. На вызваленай ад нямецкіх акупантаў беларускай зямлі панавалі разруха, холад і галеча, не хапала нават самых неабходных прадметаў народнага спажывання. Асабліва складанымі былі знешнепалітычныя ўмовы. У пачатку 1919 г. кіраўнікі Польшчы пачалі ўзмоцненую падрыхтоўку да вайны з Савецкай Расіяй, асноўнай мэтай якой было аднавіць Польшчу ў межах 1772 г. Першачарговай іх задачай з'яўлялася далучэнне Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў. Улічваючы прэтэнзіі Польшчы на заходнюю частку Беларусі і Літву, ЦК РКП(б) па ініцыятыве У.І.Леніна 16 студзеня 1919 г. прыняў рашэнне, у якім прапаноўвалася Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерням выйсці са складу БССР, а Мінскай і Гродзенскай губерням аб'яднацца з Літоўскай Савецкай Рэспублікай. Галоўным матывам (аб якім адкрыта не гаварылася) гэтага рашэння было стварэнне Літоўска-Беларускай дзяржавы, якая павінна была стаць буферам паміж Расіяй і Польшчай.

З пастановай ЦК РКП(б) ад 16 студзеня не пагадзілася большая частка ўрада БССР. Д.Ф.Жылуновіч і яго аднадумцы лічылі, што падзел рэспублікі немэтазгодны і недапушчальны ні ў якім разе. Яны неаднаразова звярталіся ў ЦК РКП(б) з прапановай адмяніць сваё рашэнне. Аднак у хуткім часе кіраўнікі ЦК РКП(б) змаглі пераканаць урад БССР у неабходнасці такога падзелу рэспублікі.

2 — 3 лютага 1919 г. у Мінску ў памяшканні гарадскога тэатра адбыўся І Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. З'езд прыняў наступныя дэкларацыі: да ўсіх народаў і іх урадаў, дзе заклікаў прызнаць незалежнасць БССР і ўстанавіць з ёю дыпламатычныя адносіны; аб устанаўленні федэратыўных сувязей з РСФСР; аб аб'яднанні савецкіх сацыялістычных рэспублік Беларусі і Літвы ў адзіную дзяржаву. З лютага з'езд прыняў першую Канстытуцыю БССР, зацвердзіў герб і сцяг рэспублікі.

У склад Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК), выбранага на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў, увайшло 50 чалавек (старшыня А.Ф.Мяснікоў). Функцыі пастаяннага ўрада БССР павінен быў выконваць Вялікі прэзідыум ЦВК рэспублікі, у якім "белнацкамаўцы" і члены беларускіх камуністычных секцый — члены ранейшага Часовага ўрада (акрамя І.І.Пузырова і Д.С.Чарнушэвіча) былі пазбаўлены пасад наркамаў.

27 лютага 1919 г. у Вільні адбылося аб'яднанае пасяджэнне ЦВК Літоўскай і Беларускай Савецкіх Рэспублік, якое прыняло рашэнне аб стварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Літвы і Беларусі (ЛітБелССР) — афіцыйная назва рэспублікі "ССР Л і Б". Аб'яднаны ЦВК ЛітБелССР узначаліў К.Г.Цыхоўскі, а СНК — В.С.Міцкявічус-Капсукас. У склад ЛітБелССР увайшлі тэрыторыі Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і частка Сувалкаўскай губерняў з больш як шасцімільённым насельніцтвам. Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні па рашэнню I Усебеларускага з'езда адышлі да РСФСР.

Урад ЛітБелССР займаўся практычным вырашэннем пытанняў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Атрымаўшы ад урада РСФСР 200 млн руб., ён у кароткі тэрмін аднавіў працу на многіх фабрыках і заводах, правёў шэраг мерапрыемстваў у галіне асветы і культуры. Быў прыняты дэкрэт аб абавязковым навучанні дзяцей і юнакоў ва ўзросце 7 — 18 гадоў. Аднак пры вырашэнні аграрнага пытання ўрад ЛітБелССР дапусціў сур'ёзныя памылкі, аб чым сведчыць адмова ад перадачы сялянам канфіскаваных зямель і паскоранае стварэнне ва ўмовах разрухі саўгасаў. Гэта выклікала ў сялян незадавальненне дзейнасцю ўрада ЛітБелССР, што адмоўна адаб'ецца на ходзе баявых дзеянняў у перыяд польскага наступлення вясной 1919 г.

У выніку грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі ў складзе БССР засталося шэсць паветаў Мінскай губерні: Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі (з 1923 г. Чэрвеньскі), Мазырскі, частка Мінскага і Слуцкага. Іх плошча складала ўсяго 52,3 тыс. км^2, а насельніцтва — 1544 тыс. чалавек. Таму першыя крокі мірнага будаўніцтва ў БССР паказалі, што многія эканамічныя задачы цяжка вырашаць без узгаднення з Віцебскім і Гомельскім губвыканкамамі, паколькі гэтыя губерні з'яўляліся арганічнай часткай Беларусі, яе палітычнага і эканамічнага жыцця. Неабходнасць і гаспадарчая мэтазгоднасць зліцця Віцебскай і Гомельскай губерняў з БССР асабліва відавочна паўстала ў сувязі з пераходам да нэпа, калі тэрыторыя краіны была падзелена на шэраг гаспадарчых раёнаў. Такое зліццё неабходна было таксама для стварэння ўмоў далейшага развіцця і кансалідацыі беларускай нацыі, яе культуры.

Пасля ўтварэння Саюза ССР VII з'езд Кампартыі Беларусі і II сесія ЦВК БССР, якія адбыліся ў сакавіку 1923 г., звярнуліся ў ЦК РКП(б) з просьбай вырашыць пытанне

аб канчатковым вызначэнні тэрыторыі БССР шляхам уключэння ў яе склад раёнаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, дзе жыло пераважна беларускае насельніцтва. Аднак асобныя кіруючыя партыйныя і савецкія работнікі гэтых губерняў выступілі супраць аб'яднання з БССР. Яны сцвярджалі, што ў Віцебскай, Гомельскай губернях і заходніх паветах Смаленскай губерні, паводле перапісу 1920 г., пражываюць у асноўным рускія.

Аднак правільнае вырашэнне тэрытарыяльнага пытання патрабавала ўсебаковай падрыхтоўкі. З гэтай мэтай была ўтворана пры ЦК РКП(б) спецыяльная камісія. У яе склад увайшлі прадстаўнікі ЦК, ЦКК РКП(б), ЦБ КП(б)Б, Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай партыйных арганізацый. У выніку вывучэння тэрытарыяльнага пытання камісія прадставіла ЦК РКП(б) спецыяльны даклад, у якім дадзены аналіз нацыянальнага складу насельніцтва ў Віцебскай, Гомельскай губернях і двух паветах Смаленскай губерні: Горацкім і Мсціслаўскім. У дакладзе падкрэслівалася: "Перапіс 1920 г. павінен быць пракарэктаваны данымі Усерасійскага перапісу 1897 г. Справа ў тым, што ў момант заканчэння польскай вайны, калі яшчэ недастаткова ясна была вызначана граніца з Польшчай, імкнуліся наўмысна паменшыць лік беларусаў у суседніх з ёю паветах у сувязі з намерам плебісцыту ..." У дакладзе прыводзіліся прыклады, што па перапісу 1897 г. беларусаў у Гомельскім павеце лічылася 89%, а па перапісу 1920 г. — 20%; у Рэчыцкім адпаведна 98 і 45%; у Рагачоўскім — 98 і 31%. Таму камісія прыйшла да высновы аб неабходнасці ўзбуйнення БССР за кошт поўнага ўключэння ў яе склад Віцебскай, а таксама Гомельскай губерняў, за выключэннем пяці паветаў — Клінцоўскага, Гомельскага, Суражскага, Пачэпскага і Стародубскага, у якіх, па разліках камісіі, беларусы складалі меншасць. Пазней да гэтых паветаў быў далучаны Рэчыцкі. Але камісія прапанавала дадаткова вывучыць пытанне аб Гомельскім і Рэчыцкім паветах, каб далучыць іх да БССР. Мсціслаўскі і Горацкі паветы Смаленскай губерні таксама намячалася ўключыць у склад БССР. У дакладзе прапаноўвалася перанесці сталіцу БССР па стратэгічных меркаваннях з Мінска ў Магілёў.

29 лістапада 1923 г. Аргбюро ЦК РКП(б) па дакладу камісіі прыняло пастанову аб далучэнні да Беларусі тэрыторыі Віцебскай, Мсціслаўскага і Горацкага паветаў Смаленскай і большасці паветаў Гомельскай губерняў, як "родных ёй у бытавых, этнаграфічных і гаспадарча-эка-

намічных адносінах". Насуперак гэтай пастанове Віцебскі губкам РКП(б) 8 снежня 1923 г. прыняў рашэнне, у якім выказаўся супраць аб'яднання Віцебскай губерні з БССР. Сваё рашэнне губкам аргументаваў тым, што "насельніцтва Віцебскай губерні згубіла бытавыя беларускія рысы, і беларуская мова незнаёма большасці насельніцтва". У заключэнне Віцебскі губкам лічыў неабходным "настойваць на пераглядзе пытання на пленуме ЦК РКП(б) аб далучэнні Віцебскай губерні да Беларускай ССР".

18 снежня 1923 г. адбылося пасяджэнне спецыяльна створанай пры ЦВК СССР камісіі па змене граніц паміж РСФСР і БССР. На камісіі былі заслуханы меркаванні прадстаўнікоў БССР, Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў аб узбуйненні БССР і яе граніцах. Прадстаўнікі Гомельскай і Смаленскай губерняў заявілі, што насельніцтва станоўча адносіцца да ідэі ўзбуйнення БССР. У адказ прадстаўнік Віцебскай губерні зноў выступіў супраць і заявіў, што рашэнне ЦК РКП(б) аб узбуйненні БССР супярэчыць рашэнням XII з'езда РКП(б). Аргументы, прыведзеныя ў рашэннях Віцебскага губкама і выступленні яго прадстаўніка на камісіі, былі памылковымі і не адпавядалі нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва губерні.

Паказальна, што ў час перапісу 1920 г. большасць насельніцтва Віцебскай губерні называла сябе беларусамі. Довады праціўнікаў узбуйнення БССР аб'ектыўна з'яўляліся праяўленнем вялікадзяржаўнага шавінізму.

У канцы 1923 г. у Віцебскую, Гомельскую і Смаленскую губерні былі камандзіраваны кіруючыя работнікі ЦВК БССР і ЦБ КП(б)Б, якія растлумачылі насельніцтву гэтых губерняў гістарычную неабходнасць узбуйнення Беларусі для яе эканамічнага і палітычнага развіцця, для нацыянальнай кансалідацыі ў мэтах захавання беларускай нацыі. Гэтая растлумачальная работа дала плённыя вынікі. На Віцебскім, Гомельскім і Смаленскім губернскіх з'ездах Саветаў былі прыняты рашэнні аб далучэнні да БССР тых паветаў, дзе пераважала беларускае насельніцтва.

Рашэнні трох губернскіх з'ездаў Саветаў горача вітаў У з'езд Саветаў БССР, які праходзіў у пачатку студзеня 1924 г. З'езд даручыў ураду рэспублікі падрыхтаваць матэрыялы аб устанаўленні граніцы з РСФСР, канчаткова разгледзець пытанне аб узбуйненні БССР на Надзвычайным з'ездзе Саветаў Беларусі пры ўдзеле прадстаўнікоў усіх уключаных у склад БССР тэрыторый.

Для кіраўніцтва арганізацыйнымі і палітычнымі мерапрыемствамі па ўзбуйненню БССР на аснове рашэння Палітбюро ЦК РКП(б) ад 4 лютага 1924 г. было створана Часовае Беларускае бюро ЦК РКП(б). У яго склад увайшлі прадстаўнік ЦК РКП(б) А.М.Асаткін, пяць прадстаўнікоў ЦБ КП(б)Б – В.А.Багуцкі, А.Р.Чарвякоў, Я.А.Адамовіч, Ш.Ш.Ходаш, В.А.Нодэль, чатыры – ад Віцебскага, два – ад Гомельскага і адзін – ад Смаленскага губкамаў партыі. ЦБ КП(б)Б самаліквідавалася.

3 сакавіка 1924 г. УЦВК прыняў пастанову аб перадачы БССР тэрыторыі пераважна з беларускім насельніцтвам. 7 сакавіка змены граніц БССР і РСФСР зацвердзіў Прэзідыум ЦВК Саюза ССР.

13 – 16 сакавіка 1924 г. у Мінску адбыўся YI Надзвычайны з'езд Саветаў Беларусі. На з'ездзе прысутнічалі 405 дэлегатаў. Сярод 244 дэлегатаў з рашаючым голасам 134 прадстаўлялі насельніцтва далучаемых да БССР паветаў. Даклад "Аб пашырэнні граніц Савецкай Беларусі і задачах савецкага будаўніцтва" на з'ездзе зрабіў А.Р.Чарвякоў. Ён падкрэсліў вялікае эканамічнае, палітычнае, культурнае і нацыянальнае значэнне факта пашырэння граніц БССР. Дэлегаты з'езда аднадушна ўхвалілі аб'яднанне тэрыторыі з большасцю беларускага насельніцтва ў адзіную Беларускую савецкую дзяржаву.

У выніку ўзбуйнення да БССР адышло 15 паветаў і асобныя воласці Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў. Тэрыторыя рэспублікі павялічылася з 55,2 да 110,5 тыс. км^2, а колькасць насельніцтва – з 1 554 670 да 4 171 886 чалавек. У новых граніцах БССР пражывала 2 959 199 беларусаў , у тым ліку ў сельскай мясцовасці – 2 719 139 і ў гарадах – 240060; 743 275 – рускіх і ўкраінцаў, у тым ліку ў сельскай мясцовасці 580 545 і ў гарадах – 162 730; 447 667 – яўрэяў, у тым ліку ў гарадах – 260 441 і ў сельскай мясцовасці – 187 623; 87 915 –палякаў, у тым ліку ў сельскай мясцовасці – 73 405 і ў гарадах – 14 510. Прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей складалі 33 830 чалавек. У адносінах да Саюза ССР тэрыторыя БССР складала 0,53%, а насельніцтва – 3,13%.

Узбуйненне Беларускай ССР садзейнічала кансалідацыі беларускай нацыі, яе эканамічнаму і культурнаму развіццю, умацаванню дружбы беларускага і рускага народаў.

Другая сесія ЦВК БССР, якая адбылася 10 – 17 жніўня 1924 г., увяла новы адміністрацыйна-тэрытарыяль-

ны падзел рэспублікі. Было ўтворана 10 акруг: Аршанская, Бабруйская, Барысаўская, Віцебская, Калінінская (цэнтр Клімавічы), Магілёўская, Мазырская, Мінская, Полацкая і Слуцкая. Акругі падзяліліся на 100 раёнаў і 1202 сельскія Саветы. Часова, да склікання з'ездаў Саветаў, органамі ўлады ў акругах з'яўляліся выканкамы тых паветаў, якія сталі цэнтрамі акруг.

У лістападзе 1926 г. Палітбюро ЦК УКП(б) на падставе даных камісіі, якая вывучала пытанне аб далучэнні да БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў, прыняло пастанову аб аб'яднанні іх з БССР. У снежні 1926 г. Прэзідыум ЦВК БССР уключыў гэтыя паветы ў склад рэспублікі, перайменаваў іх у акругі, а воласці — у раёны. У выніку другога ўзбуйнення тэрыторыя БССР павялічылася на 15 270 км^2, а насельніцтва — на 649 тыс. чалавек.

Пасля двух узбуйненняў БССР яе тэрыторыя да пачатку 1927 г. склала 125 950 км^2 з насельніцтвам каля 5 млн чалавек. У межах рэспублікі склаўся адзіны ў эканамічных, культурна-бытавых і нацыянальных адносінах раён.

2. Савецкая Беларусь ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі

Да пачатку 20-х гадоў Беларусь зведала не толькі разбуральны характар першай сусветнай вайны, але і тры гады жорсткага супрацьстаяння розных класаў і сацыяльных груп. Насельніцтва стамілася ад пабораў і рэквізіцый. Гаспадарка была разбурана. У другой палове 1920 г. на савецкай тэрыторыі Беларусі былі нацыяналізаваны фактычна ўсе прамысловыя прадпрыемства, з якіх дзейнічалі менш за палову. Рабочыя пакідалі галодны горад і імкнуліся ўладкавацца на вёсцы, дзе і без іх хапала рабочых рук. Вясковае насельніцтва імкнуліся абіраць усе — вайсковыя часці, харчовыя атрады і бандыты. Пасяўныя плошчы Беларусі скараціліся больш чым на 30%, а пагалоўе жывёлы — на 50%.

Цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча ўскладнялася супярэчлівай палітычнай сітуацыяй. Тэрыторыя Беларусі ў 1921 г. была падзелена паміж Расіяй і Польшчай. Незадаволеныя харчразвёрсткай сяляне браліся за зброю, іх збіралі пад свае сцягі беларускія эсэры, выкарыстоўвала суседняя Польшча. Многія з юнакоў, прызваных у 1914 — 1916 гг., за шмат гадоў вайны звыкліся

здабываць хлеб вінтоўкамі. Савецкія ўлады вымушаны былі да 1922 г. уключна захоўваць у БССР надзвычайнае становішча.

Сялянскія выступленні, правал ілюзій хуткай перамогі сусветнай рэвалюцыі садзейнічалі таму, што найбольш дальнабачныя з бальшавіцкіх кіраўнікоў ужо ў 1920 г. выступалі за перагляд ранейшай палітыкі ("ваеннага камунізму"). У снежні 1920 г. кіраўнік бальшавіцкай партыі У.І.Ленін падкрэслівае, што "зараз трэба абапірацца на адзінаасобнага селяніна" і "марыць аб пераходзе да сацыялізму і калектывізацыі не выпадае". У сакавіку 1921 г. быў зроблены першы практычны крок, да якога ён заклікаў: харчовая развёрстка была заменена харчовым падаткам (гэта значыць лішкам, што заставаўся пасля выканання харчпадатку, селянін распараджаўся сам). Адзначаны крок, аднак, у большай ступені з'яўляўся прапагандысцкім. Па-першае, харчпадатак 1921 г. для БССР вызначаўся ў памерах большых, чым развёрстка папярэдняга года. Па-другое, хлеб прадаваць напачатку забаранялася, а абмен яго на прамысловыя тавары па істотна завышаных цэнах быў нявыгадным. К канцу 1921 г. стала зразумела, што непасрэднага тавараабмену горада з вёскай не атрымалася, і У.І.Ленін, карыстаючыся тэрміналогіяй таго часу, заявіў аб чарговым "адступленні". У выніку паступова вызначалася сутнасць новай эканамічнай палітыкі (нэп): свабода выбару форм гаспадарання, кааперацыя, рынкавыя адносіны паміж горадам і вёскай.

Такім чынам, новая эканамічная палітыка ўяўляла сабой не дакладна распрацаваную праграму, а шэраг так званых "адступленняў" у мэтах прыстасавання бальшавіцкіх улад да рэальна існуючых абставін краіны з пераважна вясковым насельніцтвам. Але ў выніку мерапрыемстваў савецкага кіраўніцтва ў сярэдзіне 1920-х гадоў складалася гаспадарчая сістэма новай эканамічнай палітыкі, якая ўздзейнічала і на культуру, і на грамадска-палітычнае жыццё ў рэспубліцы.

Пераважнае эканамічнае значэнне для Беларусі на пачатку 1920-х гадоў захоўвала сельская гаспадарка. Аднак нэп, які пачаўся з сельскагаспадарчай палітыкі, развіўся ў палітыку фінансавай стабілізацыі і ўрэшце вызначыўся і як палітыка прамысловая. Паколькі буйная прамысловасць не магла быць адноўлена без вялікіх капіталаўкладанняў, пачаць гэты працэс можна было з развіцця дробнай і сярэдняй прамысловасці. Пры гэтым неабходна ўлічваць,

што на Беларусі гістарычна пераважалі менавіта дробныя і сярэднія прадпрыемствы.

У сферы прамысловасці БССР новая эканамічная палітыка выявілася ў наступным:

1. Скасоўвалася празмерная цэнтралізацыя. Прамысловасць БССР атрымлівала магчымасць лепш выкарыстоўваць мясцовыя рэсурсы. Былі створаны групавыя ўпраўленні, якія падпарадкоўваліся непасрэдна Саўнаргасу рэспублікі. У паветах дзейнічалі эканамічныя аддзелы, да сферы кампетэнцыі якіх належалі пытанні аднаўлення прамысловасці мясцовага значэння (кустарная вытворчасць, мясцовае будаўніцтва).

2. Усе прамысловыя прадпрыемствы былі падзелены на чатыры групы. У першую групу ўваходзілі найбольш буйныя дзяржаўныя прадпрыемствы, якія павінны былі працаваць на аснове гаспадарчага разліку (за кошт прыбытку пакрываць страты). Да другой адносіліся тыя, што падлягалі часовай кансервацыі. У трэцяй групе знаходзіліся прадпрыемствы, якія не мелі дзяржаўнага значэння, яны аддаваліся ў арэнду кааператыўным арганізацыям і прыватным асобам. Да чацвёртай групы належалі прадпрыемствы, якія падлягалі закрыццю, іх рабочыя і служачыя пераводзіліся на працуючыя фабрыкі і заводы. Аднак значная частка рабочых (пераважна нізкай кваліфікацыі) не змагла знайсці работу і трапіла ў лік беспрацоўных. Існаванне рынку працоўнай сілы было характэрным для грамадства часоў новай эканамічнай палітыкі.

3. Ліквідавалася ўраўнілаўка ў аплаце працы рабочых. Формы аплаты ўлічвалі кваліфікацыю рабочага, прадукцыйнасць яго працы. Уводзілася калектыўнае забеспячэнне рабочых і служачых у непасрэднай залежнасці ад вынікаў работы прадпрыемства. У першыя гады новай эканамічнай палітыкі разам з грашовай захавалася і натуральная аплата за кошт мясцовых харчовых рэсурсаў.

З пачатку 20-х гадоў адбыўся пераход да рыначных адносін на вёсцы. Услед за заменай харчовай развёрсткі харчовым падаткам з 1922 г. быў дазволены свабодны выбар форм землекарыстання, зменшылася і без таго нешматлікая колькасць калектыўных гаспадарак, павялічыўся рост хутароў. Адначасова сялянства атрымала права свабодна прадаваць лішкі сваёй прадукцыі. Наступным крокам на шляху фарміравання сістэмы новай эканамічнай палітыкі на вёсцы стаў пераход з 1923/24 гаспадарчага года ад сістэмы натуральнага падаткаабкладання

да грашовага. Сяляне атрымалі магчымасць лепш прыстасоўвацца да рынку, сеяць больш выгадныя культуры, займацца дробным промыслам.

Ужо на пачатку 20-х гадоў развеяліся ілюзіі аб тым, што ўраўняльнасць у размеркаванні гарантуе сацыяльную роўнасць.

Дыферэнцыяцыя на вёсцы працягвалася, дзе-нідзе нават загаварылі аб неабходнасці "другой рэвалюцыі". У гэты ж час частка сялянства не магла забяспечыць эфектыўнага выкарыстання рабочых рук і інвентару з-за недахопу зямлі, а другая не здольна была яе апрацаваць. У кастрычніку 1924 г. намеснік наркама земляробства БССР (з 1925 г. — наркам) З.Прышчэпаў падкрэсліваў, што "зараз нам трэба даць магчымасць развівацца нэпу на вёсцы". У 1925 г. было пацверджана права сялян на свабодны выбар форм землекарыстання, зямельным кодэксам БССР замацавана арэнда зямлі, інвентару і наём рабочай сілы. Гэта дазваляла эканамічнымі метадамі зменшыць верагоднасць сутыкненняў паміж рознымі па ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця гаспадаркамі.

Змякчэнню сацыяльных канфліктаў на вёсцы дапамагала і кааперацыя, істотная ўвага на якую звяртаецца з 1923 г. Меры, прадугледжаныя новай эканамічнай палітыкай, далі штуршок развіццю сельскагаспадарчай вытворчасці, што абумовіла зацікаўленасць селяніна ў крэдытах, сродках вытворчасці для развіцця ўласнай гаспадаркі, знайсці якія паасобку было вельмі складана, прымушала яго шукаць рынкі збыту для сваёй прадукцыі. Адзначаныя абставіны прадвызначылі хуткі рост крэдытных кааператываў, развіццё такіх відаў сельскагаспадарчай кааперацыі, як малочна-жывёлагадоўчая, садова-агародная, пчалаводчая, насенняводчая, меліярацыйная і інш. Працэнт ахопу рознымі формамі кааперацыі сялянскіх гаспадарак павялічыўся з 7,4 у 1924 г. да 27 у 1926 г. Аднак ужо ў 20-я гады дзяржава выпрацавала розныя формы кантролю над кааперацыяй, якія скажалі яе сутнасць.

Вызначальнай рысай новай эканамічнай палітыкі стала развіццё свабоднага гандлю, дзе пераважная роля належала прыватнаму капіталу. У адрозненне ад іншых савецкіх рэспублік у БССР на пачатку 20-х гадоў меўся разгалінаваны прыватнагандлёвы апарат, які за папярэдні перыяд выявіў выключныя здольнасці да выжывання ў неспрыяльных умовах.

Для станаўлення збалансаваных рыначных адносін

паміж горадам і вёскай вялікае значэнне мела грашовая рэформа, паколькі ў 1920 г. у грашовым абароце Беларусі знаходзілася шмат савецкіх, асабліва залатых, і грошай іншых краін. Савецкія папяровыя грошы, што выпускаліся з гэтага года, вельмі хутка абясцэньваліся. Патрэбны быў канверсаваны рубель, з'яўленне якога стрымлівалася эмісіяй новых грашовых знакаў. З лютага 1924 г. іх друкаванне спынілася і з сакавіка гэтага ж года быў устаноўлены цвёрды выкупны курс — 50 тыс. руб. выпуску ранейшых гадоў за адзін новы чырвоны рубель. Канверсаваны рубель праіснаваў з 1924 па 1929 г.

Развіццё эканомікі Беларусі ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі мела істотныя вынікі. Аб'ём валавой прадукцыі індустрыі, па-ранейшаму ў значнай ступені дробнай, у 1927 г. перавысіў даваенны ўзровень хоць і пры большай колькасці рабочых, занятых на вытворчасці. У лістападзе 1926 г. былі выпушчаны першыя станкі на заводзе "Энергія". У ліпені 1927 г. пачалося будаўніцтва Асінаўскай раённай электрастанцыі (БелДРЭС) — буйнейшай у 20 — 30-я гады на Беларусі. Першы пяцігадовы план прадугледжваў у першапачатковым варыянце пераважнае развіццё традыцыйных галін прамысловасці.

Разам з тым новая эканамічная палітыка выявіла і шэраг супярэчнасцей, перш за ўсё паміж плюралістычным эканамічным базісам і манапольна-аднапартыйнай надбудовай. Як кіруючая камуністычная партыя павінна была падтрымліваць найбольш актыўны і заможны склад насельніцтва, а як партыя пралетарская — яго бяднейшую частку.

У сферы сельскагаспадарчай вытворчасці гэта мела вынікам узмацненне падаткавага прэса на сярэднія і заможныя слаі сялянства, што ва ўмовах адсутнасці рынку зямлі і аграрнай перанаселенасці вяло да драблення гаспадарак, змянення ўдзельнай вагі таварнай прадукцыі. Моцная залежнасць БССР ад хлебавытворчых раёнаў Савецкага Саюза, імкненне савецкага ўрада ў канцы 1927 — пачатку 1928 г. забіраць хлеб прымусова ("хлебанарыхтоўкі") выклікалі натуральны рост цэн на збожжа і істотнае змяншэнне колькасці хатняй жывёлы на Беларусі. Чарговы рынкавы крызіс быў выкарыстаны для перарастання адміністрацыйнага пачатку ў арганізацыйную палітыку злому гаспадарчай сістэмы нэпа. У сферы прамысловасці неаднаразова вызначалася імкненне забяспечыць пераважны ўздым дабрабыту рабочых за кошт фарміравання росту

заработнай платы, не збалансаванага з павелічэннем вытворчасці працы. Пры гэтым цэны на прамысловыя тавары ўзрасталі настолькі, што сялянам станавілася нявыгадна прадаваць сваю і купляць прамысловую прадукцыю. Калі ў 1923 – 1924 і 1925 – 1926 гг. таварны голад пераадольваўся эканамічнымі метадамі, то на мяжы 20 – 30-х гадоў ва ўмовах разгортвання барацьбы з прыватнікамі (крэдытаванне прыватнікаў Прамбанкам спынілася ўжо ў 1925 г.) дзяржава звярнулася да надзвычайных мерапрыемстваў.

Як вынік можна адзначыць наступныя ўрокі нэпа. Па-першае, пашырэнне эканамічнай свабоды садзейнічае развіццю дэмакратычных прынцыпаў палітычнага жыцця, аб'ектыўна супярэчыць цэнтралізацыі. Невыпадкова ў 1926 г. урад БССР (Старшыня СНК Я.Адамовіч) не згадзіўся з праектам СНК СССР "Аб пачатках землекарыстання і землеўпарадкавання Саюза ССР". Урад выступіў супраць таго, што ў праекце дэталізаваліся ўсе пытанні, а на карысць рэспублік пакідалася толькі выкананне зямельнага заканадаўства, і прапанаваў, каб уся зямля, якая ўваходзіць у склад тэрыторыі рэспублікі, з'яўлялася ўласнасцю гэтай рэспублікі (а не Саюза, як па праекту). У 1927 г. на VIII Усебеларускім з'ездзе, які ўхваліў праект Канстытуцыі БССР, наркам земляробства З.Прышчэпаў прапанаваў, каб саюзны ўрад распрацоўваў толькі агульныя прынцыпы сельгаспадатку, якія б канкрэтызаваліся на месцы. Зразумела, што цэнтралізацыйна-таталітарны прэс найперш знішчыў гэтых дзеячаў.

Па-другое, выключная залежнасць ад аднаго сыравіннага рынку, адсутнасць незалежнай знешнеэканамічнай палітыкі з'яўляюцца такімі ўмовамі, пры якіх паспяховае развіццё эканомікі рэспублікі немагчыма.

3. БССР у перыяд усталявання таталітарнага рэжыму

На мяжы 20 – 30-х гадоў адміністрацыйна-камандныя метады кіравання распаўсюдзіліся на ўсе сферы жыцця грамадства. Пастановы вышэйшых органаў падлягалі абавязковаму выкананню ніжэйстаячымі. Дэмакратычная сістэма кіравання была поўнасцю выключана з жыцця грамадства. Гэта адбывалася ва ўсіх звёнах савецкай палітычнай сістэмы. Бюракратычны апарат, які ўзвысіўся над грамадствам і фактычна ператварыўся ў самастойны клас, рэалізоўваў свае інтарэсы і спекуляваў на энтузіязме мас.

Грамадскія інстытуты і самадзейныя арганізацыі працоўных арыентаваліся толькі на выкананне распараджэнняў партыйных органаў. Саветы стваралі бачнасць улады народных мас. Вялікі ўрон панеслі прафсаюзы: іх тэрытарыяльныя Саветы былі скасаваны, уводзіліся пасады ўпаўнаважаных УЦСПС па БССР на грамадскіх пачатках.

Характэрнымі рысамі грамадскага жыцця Беларусі, як і ўсёй краіны, сталі татальная цэнтралізацыя кіравання і адміністрацыйна-камандныя метады ў спалучэнні з дзяржаўным тэрорам, аж да арганізацыі масавых рэпрэсій і ўтварэння лагераў з прымусовай працай, экстэнсіўны і стратны гаспадарчы і палітычны механізм, пры якім поўнасцю выключаецца ацэнка дасягненняў на аснове сацыяльнай эфектыўнасці, адбываецца адмова ад каштоўнасцей папярэдніх форм дэмакратыі, адхіленне мас ад кіравання і фармалізацыя інстытутаў дэмакратыі, абагатварэнне ўлады; непадуладнасць грамадскага жыцця нават фармальным дэмакратычным працэдурам, зрошчванне партыйнага і дзяржаўнага апарату, кантроль выканаўчых органаў над выбарнымі, выхад караючых органаў з падпарадкавання законам і грамадству.

Такому сцвярджэнню быццам супярэчыла прынятае Канстытуцыі СССР 1936 г. і Канстытуцыі БССР 1937 г., у якіх абвяшчалася пашырэнне дэмакратычных свабод. Аднак канстытуцыйныя нормы мелі чыста намінальны характар, не ўздзейнічалі на паўсядзённае жыццё. Асноўны Закон абвясціў роўныя палітычныя правы для ўсіх грамадзян, у тым ліку і права выбіраць і быць абраным. Але выбары ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных праходзілі на безальтэрнатыўнай аснове. Яны адбыліся ва ўсходніх абласцях рэспублікі ў чэрвені 1938 г. і снежні 1939 г., у заходніх — у сакавіку і снежні 1940 г. Удзельнічала каля 100% выбаршчыкаў, якія прагаласавалі за кандыдатаў, вылучаных партыйна-савецкімі органамі.

У працэсе ўтварэння і станаўлення адміністрацыйна-камандная сістэма абапіралася на розныя слаі грамадства. Першапачаткова галоўнай апорай улады сталі найменш забяспечаныя ў матэрыяльным сэнсе, не маючыя палітычнай культуры слаі рабочага класа і сялянства, а таксама частка інтэлігенцыі, якая крытычна адносілася да буржуазнага ладу. Простыя, зразумелыя лозунгі Кастручніка, спадзяванні на хуткае паляпшэнне свайго становішча ў грамадстве прыцягнулі на бок бальшавікоў шы-

рокія масы. Паступова сацыяльная база новай улады мяняецца. Усё большую вагу набывае партыйна-дзяржаўная бюракратыя, апарат арміі і праваахоўных органаў. Дзеля захавання падтрымкі сярод рабочых і сялян шырока выкарыстоўваецца сацыяльная дэмагогія, прапаганда ідэі "светлай будучыні".

Магутны ідэалагічны апарат, што ахапіў сваім уздзеяннем практычна ўсё грамадства, аказаў значны ўплыў на людзей, многія з якіх шчыра верылі ў правільнасць навязанага ім шляху развіцця, прапагандаваных маральных каштоўнасцей. Але ні адзін з таталітарных рэжымаў не можа мець у сваёй аснове толькі веру.

Асаблівае значэнне для рэжыму меў тэрор, рэпрэсіі супраць народа. Для абгрунтавання неабходнасці насілля ўсё шырэй пачаў выкарыстоўвацца тэзіс аб абвастрэнні класавай барацьбы.

Жорсткасць стала нормай жыцця савецкага грамадства. Рэпрэсіі былі патрэбны кіруючаму колу па шматлікіх прычынах. Яны дазвалялі спісваць на "шкоднікаў і ворагаў народа" пралікі ў эканоміцы і сацыяльнай палітыцы, далі мільёны бясплатных рабочых, на якіх не распаўсюджваліся ні сацыяльныя праграмы, ні працоўнае заканадаўства, стварылі атмасферу страху, што заглушаў спробы супраціўлення, знішчалі палітычных праціўнікаў.

Ужо вядомы прыкладныя памеры страт, панесеных народам у перыяд сталінскіх рэпрэсій. Беларусь стала адной з першых ахвяр рэпрэсій, якія разгарнуліся ў рэспубліцы ўжо ў 20-я гады і не спыняліся да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, затым працягваліся і ў пасляваенныя гады. Сімвалам генацыду ў Беларусі стала адкрытае ў 1988 г. месца масавых расстрэлаў людзей — Курапаты. Але, як сказаў Васіль Быкаў, Курапаты — гэта толькі адна кропля ў моры крыві. Па адзнаках даследчыкаў, ахвярамі сталінскіх рэпрэсій сталі звыш 250 тыс. жыхароў нашай рэспублікі.

У другой палове 20-х гадоў Беларусь заставалася аграрнай рэспублікай, якая практычна не мела цяжкай прамысловасці, прадпрыемствы былі дробнымі, а іх тэхнічны ўзровень заставаўся нізкім. Індустрыяльны рост быў неабходны, але дасягнуць яго можна было рознымі спосабамі. Выбар варыянтаў індустрыялізацыі і стварэння матэрыяльнай базы сацыялізму адбываўся ў складаных і супярэчлівых формах. Права на рашэнне рэальна мела толькі камуністычная партыя, якая валодала палітычнай уладай і ключавымі фінансава-эканамічнымі механізмамі.

Першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР, які з'яўляўся часткай агульнасаюзнай пяцігодкі, быў зацверджаны IX Усебеларускім з'ездам Саветаў у маі 1929 г. З'езд канстатаваў, што выкананне першага пяцігадовага плана (1928/29 — 1932/33) павінна забяспечыць узмацненне эканамічных і палітычных пазіцый пралетарскай дыктатуры ў яе барацьбе з класавымі ворагамі як унутры краіны, так і за яе межамі. Было падкрэслена, што ўтрыманне высокага напружанага тэмпу сацыяльнага будаўніцтва выклікана разам з унутранымі прычынамі яшчэ і тым, што БССР, знаходзячыся на рубяжы з варожым капіталістычным Захадам, з'яўляецца фарпостам СССР.

Вялікая ўвага ўдзялялася развіццю ў рэспубліцы металаапрацоўчай, хімічнай, дрэваапрацоўчай, гарбарнай, швейнай, харчовай, мясной галін прамысловасці і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Найважнейшай умовай, якая забяспечвала развіццё народнай гаспадаркі, павінна было з'яўляцца стварэнне неабходнай энергетычнай і паліўнай базы. Для гэтага намячалася павялічыць здабычу торфу, закончыць будаўніцтва БелДРЭС, пабудаваць новыя электрастанцыі і павялічыць іх агульную магутнасць.

Асноўныя вытворчыя даходы БССР за пяцігодку павялічыліся ў 3,7 раза (у цэлым па СССР — у 2,2 раза), пры гэтым каля 80% прыпадала на новыя і цалкам рэканструяваныя прадпрыемствы. Беларусь ператварылася з аграрнай у індустрыяльна-аграрную рэспубліку. Было збудавана 78 буйных і каля 460 дробных прадпрыемстваў. Увайшлі ў эксплуатацыю Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання, Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, швейныя фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі" і "КіМ" у Віцебску, Мінская швейная фабрыка "Кастрычнік", фабрыка штучнага валакна ў Магілёве, цэментавы завод у Крычаве. Удзельная вага буйной прамысловасці ўзрасла з 41,3 да 67%. З прамысловасці былі выцеснены капіталістычныя элементы, дзяржава зрабілася манапольным уласнікам.

Эканоміка Беларусі стала часткай эканамічнага механізма, дырэктыўна накіроўваемага з цэнтра. Гэта патрабавала змянення сістэмы кіравання прамысловасцю. У 1932 г. быў ліквідаваны ВСНГ Беларусі, а замест яго створаны галіновыя наркаматы. Першапачаткова іх было тры: цяжкай, лёгкай і лясной прамысловасці.

Адміністрацыйная структура кіравання, што пачала

складвацца, сутыкнула Беларусь з тымі цяжкасцямі, якія перажывала савецкая эканоміка ў цэлым. Рост прадукцыйнасці працы адставаў ад зададзеных тэмпаў, сабекошт прадукцыі заставаўся высокім, многія галіны не выканалі пяцігадовы план (прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, хімічная, паліўная, энергетычная). Сур'ёзнай праблемай стаў выпуск бракаванай, недабраякаснай прадукцыі.

Прычыны правалу заключаліся перш за ўсё ў станаўленні і ўсталяванні адміністрацыйнай сістэмы. К канцу першай пяцігодкі камандная эканоміка стала дамінуючай ва ўсіх сферах гаспадарчага жыцця. Рынак, таварна-грашовыя адносіны былі паўсюдна выцеснены дырэктыўным планавым размеркаваннем рэсурсаў і прадукцыі. Не трэба болей было думаць аб народнагаспадарчай збалансаванасці, раўнавазе рынку, цэнах і іншых "нэпаўскіх атрыбутах", якія абмяжоўвалі ўладу бюракратыі. Цэны цяпер устанаўліваліся зверху, самімі чыноўнікамі, рыначныя адносіны былі заменены складанай і грувасткай сістэмай прадпісанняў, фондаў і лімітаў. "Адміністрацыйны сацыялізм" ператварыўся ў рэальнасць.

Такі эканамічны механізм працягваў дзейнічаць і ў гады другой (1933 – 1937) і трэцяй (1938 – 1941) пяцігодак. Рост прамысловасці быў нераўнамерным і характарызаваўся ўзмацненнем дыспрапорцый і цяжкасцей.

На перакананні, што пераадолення эканамічнай адсталасці трэба дамагацца цаной любых сацыяльна-эканамічных, палітычных, ідэйна-маральных выдаткаў, грунтавалася сталінская стратэгія. Дзеля падтрымання высокіх тэмпаў індустрыялізацыі прапаноўвалася скарачэнне фондаў спажывання і самая жорсткая эканомія сродкаў, якія вызначаюць жыццёвы ўзровень народных мас.

З гэтай жа мэтай лічылася неабходным і магчымым дапусціць "таварны голад" (г.зн. недахоп спажывецкіх тавараў), незбалансаванасць бюджэту, інфляцыйны рост цэн. Стратэгія паскоранага індустрыяльнага развіцця адкрыта патрабавала ад савецкіх людзей сур'ёзных ахвяр і заклікала працоўных свядома пайсці на іх.

Каардынацыя паміж галінамі народнай гаспадаркі, узгодненасць мэт пяцігодкі пры такім метадзе правядзення індустрыялізацыі захоўвацца не магла. Для звышхуткіх "бальшавіцкіх" тэмпаў не хапала сродкаў. Фінансавыя крыніцы, прадугледжаныя першым пяцігадовым планам, трэба было дапаўняць новымі. Пачала практыкавацца штогадовая прымусовая падпіска на дзяржаўную пазыку, рэзка

павялічыліся падаткі, "замарожвалася" заработная плата пры павелічэнні норм выпрацоўкі.

Гэтымі мерамі можна было павялічыць прыток у казну рублёў, якія ўжо былі неканверсаванымі, а патрэбна была валюта для закупкі за мяжой сучаснага абсталявання, вырабіць якое на адсталых машынабудаўнічых заводах унутры краіны было немагчыма. Валюту мог даць хлеб — галоўны артыкул экспарту дарэвалюцыйнай Расіі. Адмовіўшыся ад метаду нэпа, дзяржава распачала прымусовую канфіскацыю збожжа ў сялян.

К пачатку першай пяцігодкі аснову сельскай гаспадаркі Беларусі складалі індывідуальныя сялянскія гаспадаркі. Больш за 60% з іх было аб'яднана спажывецкай і вытворчай кааперацыяй, невялікі грамадскі сектар складаў 213 саўгасаў і каля 400 калектыўных гаспадарак. Адносіны горада і вёскі будаваліся ў асноўным на эканамічных прынцыпах. Але "крызіс хлебанарыхтовак" 1927/28 года, дакладней шляхі выхаду з яго, узятыя кіраўніцтвам краіны, стварылі прынцыпова новае становішча.

Яшчэ ўвосень 1928 г. набываюць моц надзвычайныя метады — за ўтойванне хлебных лішкаў кулакоў і частку сераднякоў прыцягвалі да суда, хлеб канфіскоўвалі, прычым 1/4 яго частка аддавалася вясковай беднаце. Адраджаўся абшчынны прынцып кругавой парукі — сялянам самім давалася права размяркоўваць хлебанарыхтоўкі паміж асобнымі гаспадаркамі. Пры гэтым нарыхтоўчыя цэны на збожжа заставаліся на ўзроўні сярэдзіны 20-х гадоў, а цэны на прамысловую прадукцыю хутка раслі. Дзяржаўныя нарыхтоўкі фактычна ператвараліся з добраахвотных; аб'ём якіх рэгуляваўся эканамічнымі рычагамі, у неэканамічную канфіскацыю выраблёнага прадукту.

Летам 1929 г. абвяшчаецца лозунг суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа. Каб узяць збожжа ў селяніна-аднаасобніка, трэба было аднавіць узброеную сілу тыпу харчармііі часоў грамадзянскай вайны. Найбольш зручнай формай канфіскацыі збожжа ў вёсцы былі калгасы, дзе збожжа адразу засыпалася ў агульны свіран.

Пад вельмі моцным націскам зверху ўзровень калектывізацыі імкліва павышаўся, к пачатку студзеня 1930 г. у калгасах налічвалася каля 21% сялянскіх гаспадарак, к пачатку сакавіка — 58%. Не засталіся ўбаку і мясцовыя партыйныя і савецкія кіраўнікі. Яны ўбачылі магчымасць за кошт сялянства зрабіць кар'еру, умацаваць сваё становішча, вызначыцца ў вачах цэнтра. Напрыклад, згодна з

пастановай ЦК УКП(б) ад 5 студзеня 1930 г., для Беларусі меркавалася завяршыць калектывізацыю к 1933 г. Аднак першы сакратар ЦК КП(б)Б К.В.Гей запатрабаваў калектывізаваць вёску за 1931 г. Неўзабаве і гэты тэрмін здаўся надта вялікім. Было прынята рашэнне аб завяршэнні калектывізацыі за паўтода. У ЦК УКП(б) была накіравана тэлеграма з просьбай уключыць Беларусь у лік раёнаў поўнай калектывізацыі.

Свой уклад у працэс калектывізацыі ўнёс і рабочы клас. Адабраныя па прынцыпу палітычнай адданасці рабочыя-дваццаціпяцітысячнікі, пасланыя на кіруючыя пасады ў калектыўныя гаспадаркі, сталі праваднікамі сталінскай палітыкі на месцах. Работа па мабілізацыі рабочых у калгасы БССР пачалася ў лістападзе 1929 г. Па заданню калгасцэнтра СССР у Беларусі належала мабілізацыі 200 рабочых і 100 рабочых павінны былі прыбыць з Ніжняга Ноўгарада з завода "Чырвонае Сормава". Прыбыўшыя працавалі ў Магілёўскай (акруга суцэльнай калектывізацыі) і Полацкай акругах.

У краіне стварылася надзвычай вострая палітычная сітуацыя. Вынікам націску пры стварэнні калгасаў сталі масавае незадавальненне сялян, адкрытыя пратэсты, аж да ўзброеных выступленняў. Баючыся масавай узброенай барацьбы, Сталін вырашыў адмежавацца ад так званых перагібаў і ўскласці адказнасць за іх на мясцовыя арганізацыі. Створаныя сілай калгасы за вельмі кароткі тэрмін распаліся, да ліпеня 1930 г. іх засталося толькі 11% ад былой колькасці.

Выхад з калгасаў мог быць значна большым, калі б сяляне напярэдадні ўступлення ў іх не парэзалі жывёлу і маглі б вярнуць сваю зямлю, якую забраць цяпер было вельмі цяжка. Адступленне ў сакавіку было тактычным ходам, які аслабіў напружанне ў вёсцы.

Важным накірункам калектывізацыі стала стварэнне ў сельскай мясцовасці машынна-трактарных станцый (МТС). Першая МТС у рэспубліцы была ўтворана ў канцы 1929 г. у Койданаўскім (цяпер Дзяржынскім) раёне. Усяго ж у гады першай пяцігодкі было створана 57 МТС, якія ў 1932 г. ужо абслугоўвалі 33,1% усіх калектыўных гаспадарак БССР. У студзені 1934 г. у МТС мелася 93,8% трактароў, 99,8% зернявых сеялак, 78% механічных малацілак. Манапольна валодаючы тэхнікай, МТС рабілі калгасы поўнасцю залежнымі ад дзяржавы. Больш таго, з пачатку 1933 г. улада ў вёсцы фактычна перайшла да надзвычайных

органаў — палітаддзелаў МТС. Яны актыўна займаліся далейшай калектывізацыяй, барацьбой з "кулакамі", умацаваннем гвалтоўных метадаў кіравання вёскай.

Колькасць калектыўных гаспадарак працягвала расці. Да канца 1934 г. у БССР ужо налічваліся 10 923 калгасы, якія аб'ядналі 72,6% сялянскіх двароў.

Сельская гаспадарка рэспублікі ўвесь час знаходзілася ў крызісным стане, з'яўлялася нерэнтабельнай. У 1935 г. беларускім калгасам была спынена запазычанасць па крэдытах (19,7 млн руб.). У жніўні 1937 г. СНК СССР і УКП(б) прынялі пастанову "Аб аказанні дапамогі калгасам БССР". Калгасам Беларусі былі дадзены ільготы па пастаўках сельгасвырабаў і запазычанасці за мінулыя гады. План пасеваў па БССР скарачаўся на 300 тыс. га.

Аднак насілле над вёскай працягвалася. У 1939 — 1940 гг. калектывізацыя праводзілася ў заходніх раёнах рэспублікі. У БССР к 1941 г. быў арганізаваны 10 261 калгас, у тым ліку ва ўсходніх абласцях — 9608, у якія было аб'яднана 93,4% аднаасобных сялянскіх гаспадарак і 99,3% пасяўной плошчы. Становішча ў сельскай гаспадарцы рэспублікі было такім жа цяжкім, як і па СССР наогул. Калектыўная праца не паказала сваёй перавагі над індывідуальнай.

Дык ці была суцэльная калектывізацыя жыццёва неабходнай? Вядома, без пераўтварэння сельскай гаспадаркі на аснове карэннай тэхнічнай рэканструкцыі, без уздыму агульнай культуры вёскі абысціся было нельга. Гаспадараванне на дробных кавалачках зямлі з дапамогай прымітыўных прылад працы вымушала сялян на цяжкую ручную працу, стрымлівала агульнае эканамічнае развіццё краіны. З цягам часу дробнатаварная сялянская гаспадарка прыйшла б да буйных форм гаспадарчай вытворчасці, хоць і не ўсюды. Але гэта павінна было адбыцца натуральным, добраахвотным шляхам, пры эканамічнай зацікаўленасці працоўнага сялянства. Калектывізацыя ў насільнай форме, праведзеная ў краіне, уяўляла сабой спробу праігнараваць законы грамадскага ўзнаўлення, інтарэсы вытворцаў, насілле ператварылася ў норму сацыялістычнай дзяржавы.

Прымусовая калектывізацыя, жорсткае, бесчалавечнае раскулачванне было злачынствам не толькі супраць сялян, але і супраць усяго народа.

У выніку пераўтварэнняў 20 — 30-х гадоў у Беларусі, як і ў СССР у цэлым, усталявалася адміністрацыйна-камандная мадэль сацыялізму. Органы ўлады ўяўлялі сабой

адзіную бюракратычную сістэму, пабудаваную па іерархічнаму прынцыпу. Партыйны апарат падпарадкаваў сабе дзяржаўны, практычна зліўся з ім. Рэальная ўлада сканцэнтравалася ў руках вузкага кола асоб ці аднаго чалавека.

У Канстытуцыі 1937 г. былі замацаваны сацыяльныя правы працоўных — права на працу, на адпачынак, адукацыю і г.д. Але панаванне "рэшткавага падыходу" ў пытаннях развіцця сацыяльнай сферы на тым узроўні грамадскага багацця, якім валодала краіна ў 30-я гады, рабіла немагчымым поўнае ажыццяўленне абвешчаных прынцыпаў. Дапасаванне дзяржаўнай формы ўласнасці да сацыялістычнай, адносіны да ўсіх астатніх форм як да другарадных стварылі грунтоўную эканамічную базу існуючаму апарату кіравання. Будаваўся гаспадарчы механізм не ў адпаведнасці з эканамічнымі законамі, а на падставе абмежаваных і дагматычных канцэпцый наменклатуры і яе лідэраў.

Асноўным метадам "будаўніцтва сацыялізму" стала ўзмацненне рэпрэсіўнай палітыкі. Быў прыняты цэлы шэраг надзвычайных мер, сярод якіх рашэнні 1939 г. пра абавязковы мінімум працадзён для калгаснікаў, указ ад 26 чэрвеня 1940 г., што замацаваў рабочых і служачых за прадпрыемствамі (да пачатку вайны на яго аснове было асуджана больш за 3 млн чалавек), указ ад 10 ліпеня 1940 г. аб крымінальнай адказнасці за выпуск няякаснай і некамплектнай прадукцыі.

Усё гэта дапамагло стабілізаваць сітуацыю, але не вырашала абвостраных праблем нізкай эфектыўнасці і якасці. Перад самай вайной урад быў вымушаны зноў загаварыць пра гаспадарчы разлік, эканамічныя стымулы, матэрыяльнае заахвочванне.

Значныя карэктывы ў трэці пяцігадовы план унеслі палітычныя падзеі. У 1939 г. у склад БССР была ўключана Заходняя Беларусь. У 1941 г. напад Германіі на СССР выклікаў патрэбу ў змяненні эканамічных прыярытэтаў. Аднак неабходна адзначыць, што ваенныя галіны займалі значнае месца ў эканоміцы і ў 1938 — 1941 гг.

Адміністрацыйна-камандная сістэма не толькі не змагла поўнасцю падрыхтаваць абарону краіны, але не вырашыла і галоўную для сацыялізму задачу — не забяспечыла вышэйшую ў параўнанні з капіталізмам прадукцыйнасць працы, г.зн. эканамічную перавагу новага ладу над старым. Сістэма кіравання, якая склалася пры Сталіне і была захавана яго пераемнікамі, асудзіла савецкую народную

гаспадарку на адставанне ў навукова-тэхнічным прагрэсе, на хранічны дэфіцыт усяго, што патрэбна чалавеку, — жылля, прадуктаў харчавання, тавараў і паслуг, якія забяспечваюць нармальны быт.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і праблемы, эканоміка СССР і Беларусі у 1928 — 1941 гг. развівалася. За перадваенныя гады выраслі ў буйныя прамысловыя цэнтры Бабруйск, Барысаў, Орша, Рэчыца. Палепшылася тэхнічнае аснашчэнне сельскай гаспадаркі. У 1940 г. у БССР налічвалася 316 МТС, 10 413 трактароў, 1675 камбайнаў, больш за 6 тыс. грузавых аўтамабіляў.

Беларусь ператварылася ў індустрыяльна развітую рэспубліку. К 1940 г. 80% усёй прадукцыі народнай гаспадаркі прыходзілася на долю прамысловасці. Калі ў цэлым па СССР прырост прамысловай прадукцыі павялічыўся ў 7,7 раза, дык на Беларусі — у 8,8, магутнасць электрастанцый — адпаведна ў 9,8 і ў 24,3 раза. Поспехам з'явілася асваенне выпуску розных відаў складанай сельскагаспадарчай тэхнікі, станкоў, радыёапаратуры, штучнага валакна і іншай прадукцыі.

Аднак цяпер вядома, што маглі быць дасягнуты больш значныя вынікі, прычым без тых неймаверна вялікіх ахвяр, якімі краіна аплаціла сталінскі валюнтарызм. Абмяркоўваючы метады кіраўніцтва, мы не ставім пад сумненне гераізм савецкага народа, яго веру ў ідэалы. Калі гаварыць пра феномен першых пяцігодак, дык ён заключаўся ў непрымірымай супярэчнасці паміж стваральнай працай простага народа і сталінскім самаўладствам.

4. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы

У 1921 г. на Рыжскіх мірных перамовах Польшчы пры дапамозе Антанты ўдалося далучыць да сваёй дзяржавы заходнюю частку Беларусі (Гродзенскую, усходнія паветы Віленскай і заходнія Мінскай губерняў). У большасці выпадкаў польскія дзяржаўныя ўлады называлі яе "усходнія крэсы (ускраіна) Польшчы", "Малая Польшча". Тэрыторыя Заходняй Беларусі складала 112 955 км^2. Яна была падзелена на чатыры ваяводствы: Палескае (цэнтр Пінск), Віленскае, Навагрудскае і Беластоцкае, якія ў сваю чаргу дзяліліся на паветы і гміны.

У Заходняй Беларусі пражывала 4,6 млн чалавек, з іх 85% у вёсцы і 15% у горадзе. Пры гэтым беларусы складалі

65%, палякі — 15, яўрэі — 11, украінцы — 4, літоўцы — 2,5, рускія — 2%.

Кіруючыя колы Польшчы разглядалі Заходнюю Беларусь толькі як крыніцу таннай сыравіны, рабочай сілы і рынак збыту для польскай прамысловасці. Акрамя гэтага, у планах Польшчы ёй прызначалася роля ваеннага плацдарма ў выпадку вайны з СССР. Унутранае жыццё і знешняя палітыка польскай дзяржавы вызначаліся панаваннем капіталістаў і памешчыкаў, амаль поўнай яе залежнасцю ад буйных дзяржаў Захаду, асабліва ЗША.

Прамысловасць Заходняй Беларусі пасля войн аднаўлялася павольна, новыя фабрыкі і заводы не будаваліся. Большасць прамысловых прадпрыемстваў — дробныя фабрыкі і заводы — займаліся перапрацоўкай прадуктаў сельскай гаспадаркі і некаторых відаў мясцовай сыравіны. Пераважалі харчовая і дрэваапрацоўчая галіны прамысловасці. Усяго ў прамысловасці, рамястве, транспарце, гандлі і ўстановах грамадскага абслугоўвання было занята 86 тыс. рабочых (на 1931 г.). Працавалі яны па 12 — 14 гадзін у суткі, а атрымлівалі зарплату ў 1,5 — 2 разы меншую, чым у цэнтральных раёнах Польшчы. Рабочыя жылі ў паўразваленых хацінах, сырых падвалах, халодных цесных бараках.

У выніку пастаяннага скарачэння прамысловай вытворчасці, закрыцця фабрык і заводаў у Заходняй Беларусі зніжаўся жыццёвы ўзровень рабочых, з'яўлялася вялікая армія беспрацоўных, якіх толькі ў 1936 г. было больш за 25,5 тыс. чалавек.

Па-драпежніцку знішчаліся прыродныя багацці Заходняй Беларусі. Напрыклад, з 1921 да 1936 г. плошча лясоў тут зменшылася больш як на 400 тыс. га. Асабліва моцна знішчалася Белавежская пушча.

Больш 80% насельніцтва Заходняй Беларусі займалася сельскай гаспадаркай. На долю бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, якія складалі 94,2% агульнай колькасці гаспадарак, прыпадала толькі 38,8% зямлі, астатняя — 61,2% — знаходзілася ў руках памешчыкаў і кулакоў, якія складалі 5,6% колькасці гаспадарак. 516 памешчыкаў мелі зямельныя плошчы ад 1 да 14 тыс. га зямлі кожны. У той жа час 17 тыс. батрацкіх гаспадарак зусім не мелі зямлі, каля 55 тыс. гаспадарак мелі надзел крыху большы за 1 га. У 15% гаспадарак не было буйной рагатай жывёлы, у 30% — коней.

У пачатку 20-х гадоў польскі ўрад правёў зямельныя рэформы, якія ўключалі парцэляцыю (продаж праз Зя-

мельны банк часткі памешчыцкай зямлі дробнымі ўчасткамі – парцэлямі), ліквідацыю сервітутаў (сумесных зямель памешчыкаў і сялян) і камасацыю (звядзенне ў адзін участак дробных сялянскіх палосак з адначасовым высяленнем на хутар). Польскі ўрад насаджаў на "ўсходніх крэсах" ваенных каланістаў – асаднікаў, большасць якіх складалі польскія афіцэры і унтэр-афіцэры. Яны атрымлівалі бясплатна або за невялікую цану зямельныя ўчасткі па 15 – 45 га. Да 1934 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі паселены 8742 асаднікі, якія з'яўляліся ва ўсім апорай польскай буржуазіі ў краі.

Памешчыкі, кулакі і асаднікі жорстка эксплуатавалі сялян, якія бяднелі і масава разараліся. Многія з сялян выязджалі ў пошуках лепшай долі ў краіны Заходняй Еўропы, ЗША, Канаду. Толькі з 1925 па 1938 г. вымушаны былі эмігрыраваць у іншыя краіны 78 тыс. чалавек.

Працоўныя Заходняй Беларусі цярпелі жорсткі нацыянальны прыгнёт і поўнае палітычнае бяспраўе. Па ўмовах Рыжскага мірнага дагавора Польшча абавязалася прадаставіць беларускаму і ўкраінскаму насельніцтву "ўсе правы, якія забяспечваюць свабоднае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў", выбарчыя правы народуні з палякамі. Аднак на практыцы ўсё было інакш. За беларускай нацыяй не прызнавалася права на існаванне, ставілася задача яе поўнага знішчэння.

У 1921 – 1931 гг. польскія ўлады правялі перапіс насельніцтва краіны для вызначэння яго нацыянальнага складу. Згодна з гэтым перапісам, у Заходняй Беларусі пераважалі палякі. Напрыклад, па перапісу 1931 г. у Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах беларусы складалі толькі 28%, палякі – 49%. На Палессі 707 тыс. чалавек былі запісаны "тутэйшымі", якіх лічылі дыялектнай групай польскай нацыянальнасці. У графу польскай нацыянальнасці запісвалі прыслугу панскіх маёнткаў, людзей, якія хадзілі маліцца ў касцёл, бо цэрквы былі зачынены, і г.д. На самай справе ў 1931 г. у Заходняй Беларусі было больш за 77% беларусаў, палякаў – каля 10%. Робячы махінацыі ў час перапісу насельніцтва, польскія ўлады імкнуліся паказаць свае правы на захопленыя землі, выкараніць у свядомасці беларускага народа пачуццё нацыянальнай годнасці. Беларус, калі не згаджаўся стаць палякам, быў пастаўлены ў невыноснае становішча. У горадзе яму цяжка было ўладкавацца на працу, на вёсцы беларускія землі ў першую чаргу прадаваліся палякам-католікам. Па-

лякі лічыліся прадстаўнікамі вышэйшай расы, беларусы — рабамі, якія мелі адны абавязкі і ніякіх правоў.

Асабліва жорсткія захады рабілі польскія ўлады па ліквідацыі беларускай мовы. Тых, хто чытаў і пісаў на беларускай, а не на польскай мове, лічылі непісьменнымі і пазбаўлялі выбарчага права. Забаранялася карыстацца беларускай мовай ва ўрадавых установах, арганізацыях сувязі, транспарту і органах мясцовага самакіравання. З першых дзён захопу польскія ўлады пачалі закрываць беларускія школы, гімназіі і семінарыі. На скаргу беларусаў аб тым, што ўсюды закрываюцца беларускія школы, міністр асветы Скульскі адказваў: "Запэўніваю вас, што праз 10 год у Польшчы нават са свечкай не знойдзеце ні аднаго беларуса". Ужо ў 1938/39 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі не было ніводнай беларускай школы. Таму невыпадкова, што ў Палескім ваяводстве непісьменных дзяцей ва ўзросце 10 гадоў было 70%, у Навагрудскім — 60%.

Польскія ўлады ўпарта праводзілі палітыку выкаранення беларускай культуры. Жорстка праследавалася беларуская прэса, закрываліся выдавецтвы, клубы, бібліятэкі, праваслаўныя цэрквы і г.д. Дзеячаў беларускай культуры зневажалі, іх арыштоўвалі і кідалі ў турмы.

Насельніцтва Заходняй Беларусі амаль не атрымлівала медыцынскай дапамогі. Нізкі жыццёвы ўзровень працоўных і адсутнасць медыцынскай дапамогі выклікалі высокую смяротнасць сярод беларускага насельніцтва.

Затое Заходняя Беларусь была напоўнена яўнай і тайнай палітычнай паліцыяй (дэфензівай), арміяй, дзейнічалі шматлікія суды, карныя экспедыцыі і турмы. У 1934 г. па распараджэнню Я.Пілсудскага быў створаны адзін з першых у Еўропе Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер.

Тэрор, масавыя арышты, здзекі і катаванні былі звычайнай з'явай у Заходняй Беларусі. Яны з'яўляліся асноўным сродкам зацвярджэння ўлады і метадам праўлення польскіх кіруючых колаў. Усё гэта выклікала ў народа нянавісць да акупантаў, уздымала яго на барацьбу за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

5. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі

Працоўныя Заходняй Беларусі не прызнавалі акупацыі, не мірыліся са сваім цяжкім становішчам, вялі барацьбу

супраць прыгнятальнікаў. Першымі ў абарону сваіх класавых інтарэсаў выступілі рабочыя, якія ў 1921 — 1922 гг. арганізавалі шэраг забастовак у Гродне, Брэсце, Пінску. У 1923 г. забастовачны рух ахапіў усе галіны прамысловасці. Адбыліся 62 забастоўкі, у якіх удзельнічалі рабочыя 177 прадпрыемстваў. Рабочыя патрабавалі ад уладальнікаў прадпрыемстваў павышэння заработнай платы, устанаўлення васьмігадзіннага рабочага дня, аплаты за працу ў звышурочны час і інш.

Адначасова з рабочымі на ўзброеную партызанскую барацьбу ўзняліся сяляне. Дзейнічаючы невялікімі атрадамі і групамі, партызаны нападалі на паліцэйскія раз'езды і патрулі, грамілі паліцэйскія ўчасткі, гмінныя ўправы, палілі памешчыцкія сядзібы і асадніцкія хутары. Вясной 1922 г. некалькі тысяч партызан Брэсцкага, Ваўкавыскага, Пружанскага і іншых паветаў накіравалі польскаму ўраду ультыматум, у якім патрабавалі спыніць насілле над беларускім народам, вызваліць з турмаў зняволеных, забараніць высяканне лясоў і даць Заходняй Беларусі права на самавызначэнне. Але ў першыя гады партызанская барацьба часцей была стыхійнай.

У кастрычніку 1923 г. адбылася І канферэнцыя камуністычных арганізацый Заходняй Беларусі, якая абвясціла аб стварэнні Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Яе кіруючае ядро складалі С.А.Дубовік, С.А.Мертэнс, А.С.Славінскі і інш. У канцы 1923 г. у КПЗБ уступіла Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА), якая выйшла са складу левага крыла беларускіх эсэраў і выступала супраць польскай акупацыі. Старшынёй ЦК КПЗБ з 1926 да 1937 г.з'яўляўся Я.К.Лагіновіч (Павел Корчык). У 1924 г. быў створаны Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), сакратаром ЦК стала В.З.Харужая.

Са стварэннем КПЗБ партызанскі рух пашырыўся на ўсю тэрыторыю Заходняй Беларусі. У 1923 г. агульная колькасць партызан складала 6 тыс. чалавек. Яны правялі каля 300 баявых аперацый, якія прыводзілі ў жах польскіх памешчыкаў. Некаторыя з іх сталі прадаваць маёнткі і ўцякаць у Польшчу. Актыўную барацьбу павялі сяляне некалькіх вёсак Пружанскага павета супраць братоў С. і Я.Булак-Балаховічаў, якія высякалі лясы Белавежскай пушчы і прадавалі іх за мяжу. Сяляне арганізавалі партызанскі атрад, які разграміў лесапільны завод Балаховічаў у Гута-Мехалінскай. У 1925 г. пружанскія партызаны вырашылі знішчыць, як яны называлі, братоў-разбойнікаў Балаховічаў. Каб гэтаму акту

надаць юрыдычную сілу, яны стварылі рэвалюцыйны трыбунал, які вынёс завочны смяротны прыгавор Станіславу і Язэпу Булак-Балаховічам. У хуткім часе Язэп быў забіты, Станіслаў уцёк у Варшаву. У 1924 – 1925 гг. партызанскія атрады ядналіся ў буйныя фарміраванні па ваеннаму прынцыпу. Імі камандавалі К.П.Арлоўскі, В.З.Корж, С.А.Ваупшасаў і інш. Рыхтавалася сапраўдная вайна супраць акупантаў. Польшча была вымушана ўвесці асаднае становішча ў Заходняй Беларусі, накіравала на яе тэрыторыю шмат карных ваенных і паліцэйскіх атрадаў на чале з генералам Рыдз-Сміглам, надзяліўшы яго надзвычайнымі паўнамоцтвамі. Па вёсках, гарадах і мястэчках пракацілася хваля аблаў, арыштаў, працавалі ваенна-палявыя суды, гарэлі вёскі, пачаўся масавы тэрор. У некаторых месцах партызаны вялі сапраўдныя баі з войскамі і паліцыяй. Але сілы былі далёка не роўныя. Партызанскі рух пад напорам шматразова перавышаючых сіл праціўніка ішоў на спад. У гэтых умовах ЦК КПЗБ заклікаў камуністаў і партызан спыніць узброеную барацьбу як несвоечасовую і пачаць рэвалюцыйную барацьбу супраць акупантаў.

24 чэрвеня 1925 г. група паслоў левага накірунку беларускага пасольскага клуба стварыла Беларускую сялянска-рабочую грамаду (БСРГ), якая ў маі 1926 г. аформілася як самастойная палітычная арганізацыя. Яе ўзначалілі Б.А.Тарашкевіч (старшыня ЦК), П.В.Мятла, П.П.Валошын, С.А.Рак-Міхайлоўскі. На студзень 1927 г. БСРГ яднала больш за 2 тыс. гуртоў з 120 тыс. членаў. Грамада мела праграму, якая патрабавала канфіскацыі памешчыцкіх зямель і падзелу іх без выкупу паміж беззямельнымі і малазямельнымі сялянамі, стварэння сялянска-рабочага ўрада і ўстанаўлення дэмакратычных свабод, самавызначэння Заходняй Беларусі, увядзення васьмігадзіннага рабочага дня, ліквідацыі асадніцтва, адкрыцця школ на роднай мове і г.д. Арганізаваныя грамадой працоўныя сяляне выступалі супраць камасацыі, парцэляцыі і ліквідацыі сервітутаў. Напалоханы размахам рэвалюцыйнага руху ўрад Пілсудскага ў 1927 г. разграміў БСРГ, больш за 800 яе дзеячаў былі арыштаваны і над імі ўчынілі палітычныя працэсы. Працоўныя Заходняй Беларусі адказалі на разгром грамады шматлікімі рэзалюцыямі пратэсту, мітынгамі і масавымі дэманстрацыямі. Рабочыя Косава 3 лютага 1927 г. арганізавалі дэманстрацыю пратэсту супраць разгону грамады. Мірная дэманстрацыя была расстраляна, шэсць чалавек забіта, некалькі дзесяткаў паранена.

У 1927 г. перад выбарамі ў польскі сейм у Заходняй Беларусі быў створаны сялянска-рабочы клуб "Змаганне", дзеячы якога былі блізкія да КПЗБ. У 1934 г. улады разгромілі "Змаганне", арыштавалі яго кіраўнікоў-дэпутатаў сейма Ф.І.Валынца, І.Е.Гаўрыліка (старшыня), Я.М.Грэцкага, І.С.Дварчаніна, П.С.Крынчыка, якіх суд прыгаварыў да васьмі гадоў зняволення.

З 1921 г. у Заходняй Беларусі дзейнічала прагрэсіўная культурна-асветная арганізацыя Таварыства беларускай школы (ТБШ). У 1928 г. каля 500 гурткоў ТБШ аб'ядноўвалі ў сваіх радах амаль 30 тыс. чалавек. Кіраўнікамі і актыўнымі дзеячамі ТБШ у розны час былі Б.А.Тарашкевіч, Р.Р.Шырма, П.Пястрак і інш. ТБШ змагалася за распаўсюджанне пісьменнасці сярод насельніцтва, за беларускую школу, стварала бібліятэкі, клубы, мастацкую самадзейнасць, выдавала беларускія газеты, падручнікі, кнігі і інш. У канцы 1937 г. польскія ўлады забаранілі дзейнасць ТБШ.

У дзейнасці БСРГ, клуба "Змаганне", ТБШ і іншых рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый Заходняй Беларусі актыўны ўдзел прымалі П.Пястрак, Р.Шырма і І.Дварчанін. Апошні ў 1927 г. склаў "Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры", якая была выдадзена ў Вільні.

У гады сусветнага эканамічнага крызісу (1929 – 1933) у Заходняй Беларусі склалася выключна цяжкае становішча. Яе і без таго слабая эканоміка ў выніку крызісу прыйшла ў поўны заняпад, былі паралізаваны цэлыя галіны прамысловасці, закрываліся прадпрыемствы, выросла колькасць беспрацоўных. У гэтых умовах прадпрыемцы ўзмацнілі эксплуатацыю рабочых, памяншалі і без таго іх мізэрную заработную плату.

Эканамічны крызіс моцна ўдарыў і па вёсцы. Рэзка знізіліся цэны на сельскагаспадарчыя прадукты, а на прамысловыя тавары ўзняліся ў некалькі разоў. У той час частай з'явай былі неўраджаі (1928, 1931, 1933 гг.), у выніку якіх голад ахапіў сотні тысяч сялян. Так, толькі ў пяці паветах Віленскага ваяводства галадала каля 200 тыс. чалавек.

Цяжкія ўмовы жыцця працоўных выклікалі ў 1929 – 1933 гг. моцную хвалю стачачнай барацьбы, якая пранеслася па ўсёй Заходняй Беларусі. Вясной і летам 1929 г. баставалі 186 рабочых трох лесапільных заводаў Брэста, рабочыя лесапільных заводаў у Гродне, Івацэвічах, Стоўбцах, 300 рабочых Гродзенскага шкляного завода і шэрагу іншых прадпрыемстваў у розных гарадах Заходняй

Беларусі. У 1931 г. баставалі рабочыя шклозаводаў у Вільні і Ганцавічах, Гродзенскай тытунёвай фабрыкі, камунальных прадпрыемстваў Слоніма. У гэтым годзе ў гарадах, паводле няпоўных даных, адбылося 19 забастовак, якія ахапілі 15,2 тыс. рабочых. У 1931 г. прайшлі выступленні беспрацоўных у Кобрыне, Баранавічах, Навагрудку, Слоніме, Лідзе. Выступаўшыя выстаўлялі антыўрадавыя лозунгі, патрабавалі работы і жылля. Забастовачная барацьба значна ўзмацнілася ў 1932 г. У лютым баставалі рабочыя лесапільных заводаў Гайнаўкі, Белавежы і Слоніма. Каля месяца цягнулася забастоўка гродзенскіх камунальных рабочых. Ва ўзброенай сутычцы рабочых з паліцыяй былі забітыя і раненыя. Асабліва вызначылася стачка беластоцкіх тэкстыльшчыкаў. Яна ахапіла 30 фабрык і вылілася ва ўсеагульную стачку рабочых тэкстыльнай прамысловасці.

Сялянскі рух 1929 — 1930 гг. у цэлым перажываў спад, які працягваўся з часу разгрому грамады. Але ўжо ўвосень 1932 г. у Гродзенскім павеце ўзмацнілася барацьба сялян супраць камасацыі. У в. Завадзічы сяляне ўступілі ў бойку з атрадам паліцыі. Многія з сялян былі забіты, звыш 20 чалавек трапілі ў гродзенскую турму.

У 1933 г. забастовачная барацьба дасягнула свайго найвышэйшага ўзроўню. Адбылася 81 забастоўка, дзе ўдзельнічала 36,7 тыс. рабочых. Усё часцей эканамічныя стачкі перарасталі ў палітычныя, якія нярэдка завяршаліся сутычкамі з паліцыяй.

Вясной 1933 г. у Заходняй Беларусі пачаўся ўздым сялянскага руху. Барацьба набывала розныя формы, пачынаючы ад масавых хваляванняў і канчаючы актыўным узброеным супраціўленнем уладам. Для падаўлення сялянскіх выступленняў улады пасылалі карныя экспедыцыі паліцыі, вайсковыя падраздзяленні. Карныя атрады дзейнічалі ў вёсках Брэсцкага, Кобрынскага, Навагрудскага і іншых паветаў. За 1931 — 1933 гг. у Заходняй Беларусі было зарэгістравана, акрамя масовак, больш за 460 выступленняў сялян. Улады толькі ў 1931 — 1932 гг. вынеслі 120 смяротных прысудаў сялянам.

У ноч на 3 жніўня 1933 г. каля 100 сялян (пераважна моладзь) некалькіх вёсак Кобрынскага павета арганізавалі паход у маёнтак. Па дарозе яны грамілі сядзібы асаднікаў, напалі на паліцэйскі ўчастак, пашкодзілі тэлефонную сувязь. Сюды ўлады сцягнулі паліцыю і вайсковыя часці, якія жорстка расправіліся з паўстанцамі. Арганізатары выступ-

лення былі арыштаваны і аддадзены ваенна-палявому суду. Ім пагражала смяротная кара, але пад націскам грамадскасці смяротны прыгавор васьмі чалавекам быў заменены пажыццёвай катаргай.

У 1934 – 1935 гг. рэвалюцыйны вызваленчы рух у Заходняй Беларусі развіваўся ў цяжкіх умовах. На падставе рэакцыйнага закона аб ізаляцыі "небяспечных элементаў", прынятага ў 1934 г., сотні камуністаў, камсамольцаў, рэвалюцыйна настроеных рабочых і сялян былі кінуты за краты і ў Бяроза-Картузскі канцэнтрацыйны лагер.

II з'езд КПЗБ, які адбыўся ў маі 1935 г., нацэліў камуністаў на стварэнне адзінага рабочага і антыфашысцкага фронту. Ідэя яго атрымала шырокае распаўсюджанне і падтрымку ў рабочых і сялян. Пад лозунгамі адзінага фронту ў 1935 – 1938 гг. прайшла магутная хваля забастовак, дэманстрацый рабочых. Яны адбыліся амаль ва ўсіх гарадах Заходняй Беларусі. Рабочыя патрабавалі павелічэння заработнай платы, заключэння калектыўных дагавораў, прыёму на работу звольненых.

Летам 1935 г. пачалося буйное выступленне нарачанскіх сялян-рыбакоў, у якім удзельнічалі каля 5 тыс. чалавек. Прычынай паслужылі спробы ўлад пазбавіць сялян права лавіць рыбу. Кіравала барацьбой рыбакоў КПЗБ. Кіраўнікі забастоўкі былі арыштаваны, але барацьба нарачанскіх рыбакоў вялася аж да 1939 г.

Пасля рэвалюцыйнага ўздыму 1936 – 1937 гг. у Заходняй Беларусі пачаўся спад рабочага і сялянскага руху. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічаў неабгрунтаваны роспуск у 1938 г. Выканкамам Камінтэрна КПП і яе састаўных частак – КПЗБ і КПЗУ. Роспуску КПЗБ папярэднічалі сталінскія рэпрэсіі ў 1936 – 1937 гг. яе кіруючых работнікаў, якія знаходзіліся ў Маскве і Мінску. У ліку арыштаваных былі члены ЦК КПЗБ Я.К.Лагіновіч, А.С.Славінскі, А.А.Альшэўскі, В.З.Харужая, дзесяткі актыўных дзеячаў нацыянальна-вызваленчай барацьбы працоўных Заходняй Беларусі. Амаль усе яны загінулі ў турмах і лагерах.

Гераічная барацьба працоўных Заходняй Беларусі за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне мела вялікае гістарычнае значэнне не толькі для народных мас заходніх абласцей, але і для ўсяго беларускага народа. Сваёй упартай рэвалюцыйнай барацьбой яны засведчылі імкненне да ўз'яднання з Савецкай Беларуссю, за кансалідацыю беларускай нацыі ў адзінай дзяржаве.

6. Культура беларускага народа

З пашырэннем нэпа і станаўленнем яго гаспадарчай сістэмы на вёсцы ў нацыянальна-культурнай палітыцы кампартыі на Беларусі вызначыўся накірунак, які атрымаў назву беларусізацыі (афіцыйны пачатак — ліпень 1924 г.). Мэтай яе з'яўлялася прыстасаванне дзяржаўнага апарату да мовы большасці насельніцтва БССР, аднак беларусізацыя фактычна закранула ўсе сферы нацыянальна-культурнага будаўніцтва савецкай часткі Беларусі. Перадумовамі беларусізацыі сталі: 1) развіццё рыначных адносін на вёсцы (свабода гандлю, грашовы падатак, арэнда і наём рабочай сілы, інвентару і г.д.); 2) палітычная амністыя (1923) для тых беларускіх дзеячаў, якія не выступалі са зброяй у руках супраць савецкай улады; гуртаванне беларускіх нацыянальных сіл (вяртанне з замежжа); 3) уз'яднанне Беларусі (сакавік 1924 г., тэрыторыя БССР павялічылася ў два разы); 4) пачатак дзейнасці даследчых (Інбелкульт) і вышэйшых навучальных (БДУ і інш.) устаноў.

Беларусізацыя як дзяржаўная палітыка 1920-х гадоў мела тры этапы: 1) складванне перадумоў (1921 — пачатак 1924 г.); 2) рэальнае ажыццяўленне (1924 — 1928); 3) згортванне (скажэнне) (з 1929 г.). Прычынамі згортвання з'явіліся вяртанне да ідэалогіі сусветнай рэвалюцыі (СССР — "асаджаная крэпасць"), адмова ад новай эканамічнай палітыкі, уніфікацыя і цэнтралізацыя дзяржаўнага кіравання і культурнага развіцця ў СССР.

У развіцці беларускай асветы і навукі 1921 — 1928 гг. акрэсліваюцца два этапы: першы (1921 — 1924), калі ішоў пошук форм і шляхоў развіцця адукацыі і навукі, другі (1925 — 1928), калі адукацыя выяўлялася як сапраўды беларуская па сутнасці і вызначаліся асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў на Беларусі. Гэтыя працэсы пачаліся з адкрыцця ў Мінску дзвюх устаноў: Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1921) і Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта, 1922).

Спробы адкрыцця дзяржаўнага універсітэта прадпрымаліся ўрадам БНР. Адпаведную пастанову прыняў і ЦВК Саветаў Беларусі ў лютым 1919 г., але прынятае рашэнне ажыццявіць змаглі толькі праз два гады. 1 лістапада 1921 г. пачаліся заняткі на двух факультэтах Беларускага дзяржаўнага універсітэта — грамадскіх навук і медыцынскім — у сталіцы БССР Мінску. Першым рэктарам БДУ стаў вядомы гісторык-славіст У.І.Пічэта. У 1925 — 1926 гг.

акрамя БДУ ў БССР дзейнічалі тры вышэйшыя навучальныя ўстановы: Камуністычны універсітэт у Мінску, Беларускі ветэрынарны інстытут у Віцебску і Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія ў Горках. Акрамя таго, у рэспубліцы налічваліся 23 тэхнікумы, 20 прафтэхшкол і 20 іншых спецыяльных навучальных устаноў.

У 20-я гады ў БССР для дзяцей розных нацыянальнасцей пашыраецца магчымасць атрымаць адукацыю на роднай мове. І не толькі на беларускай. Для сістэмы нацыянальных школ (яўрэйскіх, беларускіх, польскіх і г.д.) рыхтаваліся адпаведна і педагагічныя кадры. Да 1928 г. каля 80 % (што адпавядала ўдзельнай вазе беларусаў у агульнай масе насельніцтва БССР) школ былі беларускімі, навучанне ў іх вялося на беларускай мове. Між тым з 1926 г. колькасць выпускнікоў, якія валодалі беларускай мовай, скарачалася і ледзь дасягнула 50 %.

Станаўленне беларускай навукі ў 1920-я гады адбывалася не толькі ў вышэйшых навучальных, але і ў навукова-даследчых установах. Сярод апошніх трэба адзначыць Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), які сфарміраваўся на аснове Навукова-тэрміналагічнай камісіі, створанай у лютым 1921 г. з мэтай распрацоўкі беларускай тэрміналогіі ва ўсіх галінах ведаў. У арганізацыі і працы Інбелкульта прынялі ўдзел Я.Карскі, І.Луцэвіч (Я.Купала), К.Міцкевіч (Я.Колас), Я.Лёсік, С.Плаўнік (З.Бядуля) і інш. У 1920-я гады ў рэспубліку прыехалі вядомыя вучоныя І.Замоцін, М.Нікольскі. У.Перцаў, М.Шчакаціхін і інш. Неадменным сакратаром Інбелкульта ў 1926 – 1928 гг. з'яўляўся вядомы грамадскі і навуковы дзеяч В.Ластоўскі. Распачаўшы сваю дзейнасць з даследаванняў у галіне гуманітарных навук, Інбелкульт паступова распрацоўваў і іншыя навуковыя напрамкі. Ужо з 1924 г. у яго складзе з'яўляюцца навуковыя падраздзяленні прыродазнаўчага профілю: геаграфічная, медыцынская і агранамічная секцыі.

Рост цікавасці да нацыянальнай спадчыны садзейнічаў хуткаму станаўленню беларускай гістарычнай навукі. Беларускія гісторыкі пераважна разглядалі Вялікае Княства Літоўскае як літоўска-беларускую дзяржаву. У прыватнасці, такога погляду прытрымліваўся У.Ігнатоўскі, які з 1925 г. узначальваў Інбелкульт. "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі" У.Ігнатоўскага ў 1919 – 1925 гг. перавыдаваўся чатыры разы. Пры гэтым "Гісторыя Беларусі" М.Доўнар-Запольскага (1926) засталася нявыдадзенай (нацыяналістычнай у 1930-я гады была прызнана і праца

У.Ігнатоўскага). Беларускія гісторыкі ў 20-я гады не абмяжоўваліся толькі сацыяльна-эканамічнай праблематыкай. Так, пытанні нацыянальнай палітыкі царызму на Беларусі, развіццё грамадскай думкі, пытанні беларускага нацыянальнага руху асвятляліся ў манаграфіі А.Цвікевіча "Западноруссизм". Нарысы з гісторыі грамадскай думкі на Беларусі ў XIX – пачатку XX ст."

Перыяд 20-х гадоў – гэта сапраўдны росквіт беларускай літаратуры. Менавіта ў гэты час фарміруюцца і дзейнічаюць першыя літаратурныя аб'яднанні пісьменнікаў: беларускія ("Маладняк", "Узвышша", "Полымя"), рускія ("Звенья", "Минский перевал"), яўрэйскія ("Юнгер арбайтер"), стварэнне якіх было выклікана пошукамі новых шляхоў у мастацтве. Часам гэта садзейнічала ўзнікненню групавых інтарэсаў і барацьбы, але адначасова – шматстайнасці поглядаў, літаратурных форм. З "Маладняка" (1923 – 1928) выйшлі такія таленавітыя пісьменнікі, як К.Чорны, К.Крапіва, М.Зарэцкі, М.Лынькоў, М.Лужанін і інш. У яго асяроддзі вышэй за класавыя інтарэсы ўзняліся стваральнікі новага літаратурна-творчага аб'яднання "Полымя" (М.Чарот і інш.). "Полымя" (1928) аб'яднала як старэйшых беларускіх літаратараў (Я.Купала, Я.Колас, Ц.Гартны), так і маладыя літаратурныя сілы (А.Александровіч, А.Дудар, А.Вольны). Адыход ад прапагандысцкіх форм да належнай літаратурнай творчасці яшчэ раней (1926) прывёў да выхаду з "Маладняка" К.Чорнага, А.Бабарэку, З.Бядулю, К.Крапіву і стварэння новага літаратурнага аб'яднання "Узвышша". Узвышэнцы вызначалі сваю арыентацыю на багатую спадчыну – вусную народную творчасць, якая, на іх думку, павінна была стаць крыніцай паэтычных вобразаў і літаратурных форм. Для пачатковага перыяду дзейнасці "Узвышша" характэрны пафас "антымаладнякізму" (крытыка недахопаў маладнякоўцаў, нігілістычных адносін апошніх да класічнай спадчыны і нацыянальных традыцый). Для 1920-х гадоў характэрна сацыяльна-бытавое апавяданне з арыентацыяй пераважна на вясковы матэрыял, а таксама развіццё эпічных твораў, станаўленне жанру рамана ў беларускай літаратуры ("Сокі цаліны" Ц.Гартнага, трылогія Я.Коласа "На ростанях", раманы М.Зарэцкага, К.Чорнага і інш.). Адначасова з эпічнымі творамі этап станаўлення ў 1920-я гады перажывае і такі жанр літаратуры, як аповесць для юнацтва (найперш творы Я.Маўра, Я.Коласа, З.Бядулі і інш.).

Па сутнасці, менавіта ў 1920-я гады вызначаюцца сваімі

асаблівымі нацыянальнымі рысамі і атрымліваюць дзяржаўную падтрымку беларуская драматургія, тэатр і кіно. Працягваючы традыцыі І.Буйніцкага, у жніўні 1920 г. дэбютаваў беларускі вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам У.Галубка (да 1926 г. меў назву "Трупа Галубка"). Пераважная частка пастановак, ажыццёўленых тэатрам на працягу 1921 — 1928 гг., напісана таксама У.Галубком (найбольш папулярная ў гэты час "Ганка" ставілася каля 800 разоў). Пад кіраўніцтвам выдатнага рэжысёра Я.Міровіча з 1921 па 1931 г. адбывалася станаўленне Беларускага дзяржаўнага тэатра (з 1926 г. — БДТ-1).

Стваральнікамі новага беларускага тэатра ў Віцебску, які атрымаў назву БДТ-2, сталі навучэнцы Беларускай драматычнай студыі ў Маскве, арганізаванай у лістападзе 1920 г. для падрыхтоўкі нацыянальных акцёрскіх кадраў. Творчы рэпертуар тэатра пераважна фарміраваўся яшчэ ў Маскве і не заўсёды радаваў гледача нацыянальнай тэматыкай. І ўсё ж менавіта тут сталі выдатнымі акцёрамі А.Ільінскі, П.Малчанаў, С.Станюта і многія іншыя.

Стварэнне нацыянальнага тэатра садзейнічала росквіту беларускай драматургіі. Вядомыя п'есы 1920-х гадоў ("На Купалле" М.Чарота, "Каваль-ваявода" Е.Міровіча і інш.) пабудаваны на матэрыяле народнай творчасці. І гэта невыпадкова. Пададзеныя ў фальклорна-рамантычным асвятленні народныя героі, увасабляючы непахісны дух і мужнасць народа ў вызваленчай барацьбе мінулых эпох, павінны былі служыць і служылі прыкладам для сучаснікаў, выхоўвалі ў гледача патрыятычныя пачуцці.

Складаная грамадска-палітычная сітуацыя і спроба аналізу з'явы нацыянальнага нігілізму знайшлі сваё ўвасабленне ў вядомай зараз п'есе Я.Купалы "Тутэйшыя" (пастаўленая ў БДТ п'еса адразу ж была забаронена).

Перыяд 1921 — 1928 гг. — час узнікнення і станаўлення беларускага кіно. Першыя беларускія фільмы — гэта пераважна хранікальныя кінастужкі. Але ўжо ў 1926 г. на экраны рэспублікі выйшла першая беларуская мастацкая кінастужка "Лясная быль" — гераіка-рамантычны фільм аб грамадзянскай вайне на Беларусі (кінарэжысёр Ю.Тарыч (Аляксееў)). Для першых "нямых" беларускіх фільмаў характэрны дынамічны, захапляльны сюжэт. Гэтыя стужкі разлічаны на масавага гледача.

1920-я гады не прадвызначылі з'яўлення новай архітэктурнай школы. У жывапісе як вынік барацьбы з абстракцыянізмам (М.Шагал, К.Малевіч і інш.) пачынае

дамінаваць такі жанр, як тэматычная карціна. Пераважаюць сюжэты сацыяльнай барацьбы, для 1920-х гадоў характэрны яе паказ на аснове гістарычнага мінулага Беларусі, рэвалюцыйных падзей у Расіі (В.Волкаў). Уплыў левага пафасу адчуў на сабе М.Філіповіч, у творчасці якога пераважала ўсё ж тэма беларускага фальклору і гістарычных падзей.

Кнігавыданне ў БССР прадвызначыла нараджэнне і станаўленне новага жанру нацыянальнага мастацтва — беларускай кніжнай графікі, заснавальнікамі якога сталі М.Філіповіч, А.Тычына, П.Гуткоўскі, Г.Змудзінскі.

Такім чынам, беларусізацыя абудзіла да свядомага нацыянальнага жыцця шырокія слаі беларускага насельніцтва. За некалькі гадоў было створана тое, што многія нацыі стваралі дзесяцігоддзямі: нацыянальная асвета і даследчыя ўстановы (найперш Акадэмія навук), нацыянальны тэатр, кіно; узрасла шматлікая маладая плынь беларускіх літаратараў і дзяржаўных дзеячаў. Аднак праводзімая зверху, часам павярхоўна, беларусізацыя залежала ад змен у палітыцы далёка не беларусізаванай кампартыі. Змены адбыліся ў канцы 20-х гадоў.

Адсутнасць разнастайнасці форм у эканоміцы, меркаванняў і поглядаў у палітычнай сферы, цэнтралізацыя і уніфікацыя ў дзяржаўным жыцці непазбежна выклікалі адпаведныя працэсы і ў развіцці культуры. Разам з тым, як ніякае іншае, культурнае жыццё было звязана з вялікай роляй творчай асобы і найбольш складана паддавалася уніфікацыі. З мэтай вырашэння апошняй задачы была абвешчана так званая, па словах стваральніка кампартыі У.І.Леніна, "культурная рэвалюцыя". Аднак сталінскае кіраўніцтва істотна змяніла яе сэнс: "культурная рэвалюцыя", з аднаго боку, павінна была выхаваць новую плынь дзеячаў культуры, сацыяльную інтэлігенцыю, з другога — стварыць ідэальны кантроль як над сродкамі інфармацыі, так і рознымі накірункамі развіцця культуры. Пры гэтым акцэнт рабіўся на развіццё масавай культуры не толькі ў сэнсе адпаведнасці яе запатрабаванням шырокіх мас насельніцтва, але і ў сэнсе адмаўлення права пэўнай асобы выяўляць сваю творчую індывідуальнасць.

На мяжы 1920 — 1930-х гадоў у многіх галінах культуры ўзнікаюць арганізацыі, якія ставяць мэтай стварэнне новай пралетарскай культуры. Палітыка беларусізацыі згортваецца. Адстойванне інтарэсаў нацыя-

нальнай культуры і нават прыналежнасць да яе разглядаюцца як варожыя сацыялізму, а гэта значыць і народу. На такой аснове з мэтай знішчэння нацыянальна свядомай часткі інтэлігенцыі НКУС была сфальсіфікавана справа СВБ (Саюз вызвалення Беларусі). Другая хваля рэпрэсій мела месца ў 1936 –1938 гг. Асабліва значны ўрон быў нанесены літаратуры – частцы культуры, якая ў той час мела найбольшы ўплыў на шырокія слаі насельніцтва. У лагерах і турмах загінулі Максім Гарэцкі, Уладзіслаў Галубок, Міхась Чарот, Міхась Зарэцкі, Алесь Дудар, Платон Галавач і шмат іншых літаратараў. У верасні 1930 г. у ліку 115 вучоных быў арыштаваны рэктар БДУ прафесар У.Пічэта (яго выратаваў толькі выпадак – прыезд у СССР прэзідэнта Чэхаславакіі). Першы прэзідэнт АН БССР У.М.Ігнатоўскі, пратэстуючы супраць неабгрунтаваных абвінавачванняў, пакончыў жыццё самагубствам.

Разам з тым нельга не заўважыць і пэўных станоўчых зрухаў у развіцці культуры ў перыяд 1929 – 1939 гг. Нягледзячы на жорсткі ідэалагічны прэсінг, з'яўляліся новыя выдатныя творы. Узрастаў агульны ўзровень адукацыі насельніцтва, павялічвалася колькасць навучальных устаноў, даследчых інстытутаў.

1 студзеня 1929 г. адбылося афіцыйнае адкрыццё Акадэміі навук Беларускай ССР (на аснове рэарганізацыі Інбелкульта). У выніку рэпрэсій істотна пацярпелі ў асноўным філалогія, гісторыя, геаграфія, літаратуразнаўства. Таму найбольшыя поспехі былі дасягнуты ў галіне хіміі, біялогіі, медыцыны, геалогіі. Трэба мець на ўвазе, што шэраг навуковых напрамкаў атрымаў развіццё ў межах структурных падраздзяленняў ВНУ рэспублікі. З БДУ пераважна звязана развіццё фізікі і матэматыкі ў БССР гэтага часу, тут у 1934 г. адкрываецца гістарычны факультэт, на аснове асобных факультэтаў БДУ ўтвараюцца новыя вышэйшыя навучальныя ўстановы (медыцынскі, педагагічны, юрыдычны інстытуты і інш.).

Асноўныя тэмы, якім была аддадзена перавага празаікамі гэтага часу, – адлюстраванне рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, калектывізацыі. Пры гэтым пераважная ўвага надавалася (з пэўнай ступенню гераізацыі і аднабаковага адлюстравання) тым, хто прыняў савецкую ўладу, актыўна змагаўся за яе станаўленне і тыя пераўтварэнні, якія ёю ажыццяўляліся (аповесць Я.Коласа "Дрыгва", раманы К.Чорнага "Бацькаўшчына",

К.Крапівы "Мядзведзічы" і інш.). Менш паспяховымі (у творчым плане) засталіся спробы апісання адзначаных падзей у паэзіі ("Цэхавыя будні" П.Броўкі, "На шляхах волі" Я.Коласа, "Над ракой Арэсай" Я.Купалы). У 1930-я гады з'яўляецца шмат захапляючых твораў для дзяцей, у тым ліку тых, што ўвайшлі ў класіку дзіцячай літаратуры ("Міколка-паравоз" М.Лынькова, "Палескія рабінзоны", "ТВТ" Я.Маўра і інш.). У развіцці драматургіі гэтага часу, акрамя рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, адной з папулярных тэм з'яўлялася тэма "ворагаў народа", даніну павагі якой аддалі Я.Міровіч, Э.Самуйлёнак і інш. Разам з тым і тут былі цікавыя здабыткі, напрыклад сатырычная камедыя "Хто смяецца апошнім" К.Крапівы. У выніку тэатральнай дыскусіі 1928 г. адбыўся зварот тэатраў да "актуальных тэм". Пры гэтым поспех спектакля залежаў ад якасці драматычнага твора і акцёраў, сярод якіх у 1930-я гады ў БССР было шмат выдатных майстроў (У.Крыловіч, П.Глебаў, Б.Платонаў, П.Малчанаў). У 1930-я гады не толькі закрываліся тэатры (тэатр У.Галубка, БДТ-3), але і распачыналі сваю дзейнасць новыя тэатральныя калектывы (Тэатр юнага гледача, Тэатр лялек, Дзяржаўны тэатр оперы і балета). Значнае развіццё атрымала музычнае мастацтва. У 1932 г. была заснавана Беларуская дзяржаўная кансерваторыя, дзе пачаў плённую дзейнасць вучань М.Рымскага-Корсакава выдатны расійскі кампазітар В.Залатароў. Вучні В.Залатарова – А.Багатыроў, П.Падкавыраў, М.Вайнберг, У.Алоўнікаў і іншыя сталі вядомымі беларускімі кампазітарамі, па сутнасці, стваральнікамі беларускай музычнай школы.

Цікавыя знаходкі былі і ў кінамастацтве ("Сосны шумяць", "Атэль "Савой", "Двойчы народжаны"), аднак менавіта яго ў найбольшай ступені закранулі працэсы палітызацыі і ідэалагізацыі.

У галіне архітэктуры БССР у 1930-я гады значная заслуга належыць Г.Лаўрову, па праектах якога быў пабудаваны Беларускі політэхнічны інстытут, зараз акадэмія, а таксама І.Лангбарду (Дом урада, Дом Чырвонай Арміі, будынак Тэатра лялек).

Савецкія беларускія жывапісцы ў гэты перыяд імкнуліся распрацоўваць "вытворчую" тэму (Г.Віер, Я.Кругер, А.Шаўчэнка). У жанры пейзажа па-ранейшаму вядучае месца належала В.Бялыніцкаму-Бірулі, а ў жанры партрэта – В.Волкаву, М.Філіповічу, І.Ахрэмчыку.

Такім чынам, перыяд 1929 – 1939 гг. з'яўляўся адным з найбольш неспрыяльных для развіцця беларускай культуры. Аднак велізарны патэнцыял творчых сіл, разбуджаных нацыянальным адраджэннем, распаўсюджваннем асветы сярод шырокіх слаёў насельніцтва, садзейнічаў таму, што многія выдатныя здабыткі культуры Беларусі былі зроблены менавіта ў гэты час.

У развіцці культуры Заходняй Беларусі можна таксама вызначыць два этапы – 1921 – 1928 і 1929 – 1939 гг. Пры гэтым, у той час як справа нацыянальна-культурнага адраджэння ў БССР у 1920-я гады была падтрымана партыйна-савецкім кіраўніцтвам, у Заходняй Беларусі беларусам прыходзілася змагацца за магчымасць навучаць сваіх дзяцей на роднай мове. Супраць паланізацыі выступіла Таварыства беларускай школы, заснаванае ў 1921 г. з цэнтрам у Вільні. Ля вытоку гэтай арганізацыі стаяў аўтар "Беларускай граматыкі для школ" дырэктар Віленскай беларускай гімназіі Б.Тарашкевіч. Як легальная арганізацыя ТБШ мела права адкрываць і падтрымліваць народныя школы, настаўніцкія семінарыі, бібліятэкі і г.д. У 1920-я гады ТБШ стала самай масавай беларускай арганізацыяй. У 1937 г. дзейнасць ТБШ была забаронена. Напярэдадні (1936) пры садзейнічанні КПЗБ паміж ТБШ і прадстаўнікамі ўплывовай Беларускай хрысціянскай дэмакратыі было падпісана пагадненне аб сумеснай барацьбе за школу на роднай мове.

Асноўным жанрам у заходнебеларускай літаратуры быў паэтычны, які дазваляў хутка і эмацыянальна рэагаваць на грамадска-палітычныя падзеі.

У 1920-я гады пераважаў рамантызм (К.Сваяк, У.Жылка, Л.Родзевіч, Г.Леўчык). З другой паловы 1920-х гадоў пад уздзеяннем Беларускай сялянска-рабочай грамады вызначаецца сатырычны і публіцыстычны жанр. У масавай паэзіі камуністычнага падполля той пары выспявалі новыя таленты, сярод якіх Я.Скурко (псеўданім А.Граніт), пасля стаў вядомы як М.Танк. Тэма сацыяльнай барацьбы характэрна для творчасці В.Таўлая, М.Засіма. Тонкі лірызм, прыродны талент вызначыў асобнае месца беларускай паэтэсы Н.Арсенневай.

У 1920 – 1930-я гады ў Заходняй Беларусі працавалі і выдатныя беларускія мастакі. У 1920-я гады вызначыўся сваім патрыятычным пафасам, нацыянальным каларытам Я.Драздовіч. Першым з беларускіх жывапісцаў ён стварыў цыкл карцін на касмічную тэму. Пры гэтым

нават на чужых планетах Я.Драздовіч згадваў краявіды роднай беларускай прыроды. У 1930-я гады мастак таксама плённа працягвае сімволіка-алегарычную тэму. Яго палотны "Дух зла", "Дух цемры" — гэта трывожнае прадчуванне небяспекі, якое будзіць у гледача неспакой. У залаты фонд беларускага жывапісу ўвайшлі таксама карціны П.Сергіевіча ("Беларусы", "Шляхам жыцця"), М.Сеўрука ("Жніво"). У Заходняй Беларусі пачынаўся творчы шлях Р.Семашкевіча. Партрэты і пейзажы Р.Семашкевіча дазваляюць лічыць яго яркай фігурай у мастацтве гэтага часу. У 1937 г. падчас творчай паездкі ў Савецкую Беларусь ён быў арыштаваны і рэпрэсіраваны. Увогуле жывапіс Заходняй Беларусі пазбаўлены ідэалагічнага прыгнёту, захаваў пэўную свежасць, нацыянальны каларыт, адметнасць.

Развіццё беларускага нацыянальнага тэатра ў Польшчы, акрамя таго, што не мела дзяржаўнай падтрымкі, сустракала на сваім шляху пэўныя перашкоды з боку афіцыйных улад. Яшчэ ў 1926 г. у Вільні Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК) спрабаваў арганізаваць кіраўніцтва мясцовымі сялянскімі гуркамі, выязныя трупы, так званы "аб'яднаны тэатр", што наладжваў канцэрты і спектаклі на вёсках. Аднак тэатральныя пастаноўкі з дакладна акрэсленай нацыянальнай тэматыкай былі забаронены. З канца 1920-х гадоў дзейнасць тэатральных гурткоў у Заходняй Беларусі мела падтрымку з боку Таварыства беларускай школы (ТБШ). Напрыклад, была ажыццёўлена пастаноўка "Паўлінкі" і шэрагу іншых твораў нацыянальнай драматургіі на сцэне беларускай гімназіі ў Вільні (да 1933 г., калі па загаду афіцыйных улад апошняя стала "філіяй" польскай гімназіі імя Ю.Славацкага).

РАЗДЗЕЛ 10

БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1939 — 1945)

1. Аб'яднанне беларускіх зямель

З сярэдзіны 30-х гадоў свет уцягнуўся ў новую вайну. Грамадзянская вайна ў Іспаніі, агрэсія Італіі супраць Эфіопіі, Японіі супраць Кітая, далучэнне да Германіі Аўстрыі, затым Мюнхенская змова, у выніку якой Чэхаславакія знікла з карты Еўропы, — такія трагічныя вехі ў развязванні другой сусветнай вайны. Калі ў канцы 1938 г. фашысцкая Германія пачала дыпламатычны наступ на Польшчу, стварыўшы данцыгскі крызіс і рыхтуючыся да вайны, урад СССР у сакавіку 1939 г. пачаў у Маскве перагаворы з прадстаўнікамі ўрадаў Англіі і Францыі аб заключэнні дагавора аб узаемнай дапамозе. Дэлегацыя СССР прапанавала акрамя заключэння пакта аб узаемнай дапамозе аказаць ваенную дапамогу ўсім усходнееўрапейскім краінам, якія мяжуюць з СССР. Польшча адмовілася ад такой прапановы.

Падчас перагавораў ваенных місій СССР, Англіі і Францыі аб арганізацыі сумеснай абароны супраць агрэсіі ў Еўропе кіраўнік савецкай дэлегацыі К.Варашылаў 14 жніўня 1939 г. для заключэння дагавора аб узаемнай дапамозе і ваеннай канвенцыі паставіў умову: прапусціць савецкія войскі праз польскую тэрыторыю, каб непасрэдна сутыкнуцца з ворагам, калі ён нападзе на Польшчу, або праз румынскую тэрыторыю, калі агрэсар нападзе на Румынію. Гэта прапанова не была прынята. Міністр замежных спраў Польшчы заявіў, што яго ўрад такі дагавор заключаць не збіраецца.

Тым часам становішча паблізу мяжы СССР абвастрылася. 22 сакавіка 1939 г. гітлераўцы занялі Клайпедскую вобласць. Літва заключыла дагавор з Германіяй. Былі заключаны "сяброўскія" дагаворы аб ненападзе Германіі з Літвой і Эстоніяй. У летнія месяцы 1938 і 1939 гг. Чырвонай Арміі давялося адбіваць японскую агрэсію ля возера Хасан і ракі Халхін-Гол. У такіх абставінах І.Сталін і В.Молатаў самастойна прынялі рашэнне аб заключэнні з Германіяй дагавора аб ненападзе і спынілі перагаворы з Англіяй і Францыяй.

23 жніўня 1939 г. у Маскве Молатаў і Рыбентроп у

прысутнасці Сталіна падпісалі пакт аб ненападзе тэрмінам на 10 гадоў. Да яго быў прыкладзены сакрэтны пратакол. Гэтым пратаколам размяжоўваліся "сферы ўплыву Германіі і СССР". Паводле тэксту пратакола, Літва пачаткова была ўключана ў сферу ўплыву Германіі, а Вільня аднесена да Літвы.

Заходняя Беларусь і частка Польшчы на ўсход ад рэк Нараў, Вісла, Сан, таксама Фінляндыя, Эстонія, Латвія і Бесарабія ўвайшлі ў сферу ўплыву СССР. Лёс Польшчы аўтары сакрэтнага пратакола дамовіліся вырашыць у "парадку дружалюбнай двухбаковай згоды".

1 верасня 1939 г. фашысцкая Германія напала на Польшчу. Мужнае супраціўленне польскай арміі не змагло процістаяць адладжанай, высокатэхнічнай машыне гітлераўскага рэйха. Праз два тыдні нямецкія войскі захапілі ўсю Польшчу і 14 верасня занялі Брэст. 17 верасня 1939 г. Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую граніцу і да 25 верасня поўнасцю заняла Заходнюю Беларусь. Ужо 22 верасня генерал Гударыян і камбрыг Крывашэін на галоўнай вуліцы Брэста прымалі парад германскіх і савецкіх войск. Затым нямецкія войскі былі адведзены за Буг.

28 верасня ў Маскве быў падпісаны дагавор паміж СССР і Германіяй аб сяброўстве і граніцах, па якому ўстанаўлівалася новая заходняя мяжа Савецкага Саюза на так званай "лініі Керзона". У сакрэтным дадатковым пратаколе была запісана дамоўленасць аб адыходзе тэрыторыі Літвы ў сферу ўплыву СССР у абмен на Люблінскае і частку Варшаўскага ваяводстваў, якія ўвайшлі ў сферу ўплыву Германіі. У кастрычніку 1939 г. па рашэнню ўрада СССР Літве былі перададзены Вільня і Віленскае ваяводства, а летам 1940 г. — Свянцянскі і Гадуцішкаўскі раёны, частка Астравецкага, Ашмянскага, Пастаўскага і Свірскага раёнаў.

Услед за Чырвонай Арміяй у Заходнюю Беларусь для ўсталявання савецкай улады з усходніх раёнаў было накіравана на партыйную работу 1500 чалавек, на камсамольскую, савецкую, гаспадарчую работу — 12 000 камуністаў і камсамольцаў, сотні работнікаў НКУС, якія не ведалі мясцовага ўкладу жыцця, звычаяў, асаблівасцей мовы, а таму не карысталіся даверам у мясцовага насельніцтва. Ва ўсіх гарадах і паветах былі створаны часовыя ўпраўленні, у вёсках — сялянскія камітэты з мясцовых актывістаў, прадстаўнікоў Чырвонай Арміі і прысланых з

усходніх раёнаў камуністаў і камсамольцаў. Яны стваралі атрады рабочай гвардыі міліцыі, бралі на ўлік фабрыкі і заводы, устанаўлівалі рабочы кантроль, займаліся забеспячэннем насельніцтва харчаваннем, медыцынскім абслугоўваннем, вялі работу на выбарах у Народны (нацыянальны) сход, якія адбыліся 22 кастрычніка 1939 г.

28 — 30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку адбыўся Народны сход Заходняй Беларусі. Ён прыняў дэкларацыі аб абвяшчэнні савецкай улады на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі, аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці. Сход пастанавіў прасіць Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўны Савет БССР прыняць Заходнюю Беларусь у склад СССР і БССР. 2 лістапада 1939 г. сесія Вярхоўнага Савета СССР і 12 лістапада сесія Вярхоўнага Савета БССР адпаведна прынялі законы аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанні яе з БССР.

У снежні 1939 г. — студзені 1940 г. у Заходняй Беларусі быў уведзены новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, створаны Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская і Пінская вобласці і раёны (109), а ў лютым — сакавіку — сельсаветы, партыйныя і камсамольскія арганізацыі. Былі нацыяналізаваны не толькі буйныя і сярэднія прадпрыемствы, але і большая частка дробных, а таксама банкі. Аднаўляліся і рэканструяваліся прамысловыя прадпрыемствы, будаваліся новыя фабрыкі і заводы. Дробныя прадпрыемствы і рамесна-саматужныя майстэрні былі аб'яднаны ў больш буйныя, павялічылася колькасць рабочага класа, паступова ліквідавалася беспрацоўе. К канцу 1940 г. у заходніх абласцях БССР дзейнічалі 392 прамысловыя прадпрыемствы. Аб'ём валавой прадукцыі ў параўнанні з 1938 г. павялічыўся больш чым у два разы. У 1940 г. было арганізавана звыш 100 МТС, у якіх налічвалася 997 трактароў, 368 сеялак, 193 грузавыя аўтамашыны. Да вайны было створана 1115 калгасаў, якія аб'ядналі 6,7 % гаспадарак і 7,8 % зямлі.

У заходніх абласцях была ўведзена савецкая сістэма сацыяльнага забеспячэння, бясплатнае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, адкрыта шмат бальніц, паліклінік, дыспансераў. У 1940/41 навучальным годзе дзейнічала 5958 агульнаадукацыйных школ, з якіх 4500 вялі навучанне на беларускай мове, пяць інстытутаў, 25 сярэдніх спецыяльных устаноў. К канцу 1940 г. працавалі пяць драматычных тэатраў, 100 кінатэатраў і 121 кінаўстаноўка, 92 дамы

культуры і 220 бібліятэк. Сям'ю беларускіх літаратараў папоўнілі пісьменнікі з заходніх абласцей БССР – М.Танк, П.Пястрак, В.Таўлай, М.Машара, М.Васілек, М.Засім і інш. Былі адкрыты абласныя тэатры ў Брэсце, Беластоку, Баранавічах, Пінску.

Адначасова з мерапрыемствамі па пашырэнню сацыяльнай базы новай улады рэпрэсіўны апарат сталінскай дыктатуры ўзмоцнена выкарчоўваў "ворагаў народа", "выкараняў" буржуазныя пережыткі і іншадумства сярод насельніцтва. Адразу пасля ўступлення часцей Чырвонай Арміі на тэрыторыі Заходняй Беларусі пачаліся палітычныя рэпрэсіі. На 22 кастрычніка было арыштавана 4315 памешчыкаў, капіталістаў, прадстаўнікоў былой польскай адміністрацыі, паліцэйскіх, кіраўнікоў палітычных партый і арганізацый.

Па рашэнню НКУС СССР па справах ваеннапалонных і арыштаваных у красавіку – маі 1940 г. былі расстраляны 21 857 чалавек, з іх 14 700 чалавек, якія знаходзіліся ў лагерах для ваеннапалонных у Казельску, Старабельску, Асташкаве і 7305 чалавек у іншых лагерах і турмах Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

5 снежня 1939 г. СНК СССР прыняў сакрэтную пастанову аб высяленні з заходніх абласцей Украіны і Беларусі асаднікаў і работнікаў лясной аховы. У перыяд першай дэпартацыі (10 лютага 1940 г.), у якой удзельнічала 16 279 чалавек аператыўна-каманднага саставу, было рэпрэсіравана 9 584 гаспадарак (50 732 чалавекі). У красавіку было рэпрэсіравана 26 777 чалавек, 29 чэрвеня 1940 г. органы НКУС БССР правялі трэцюю аперацыю, на гэты раз па высяленню бежанцаў з заходніх абласцей. У гэты дзень было рэпрэсіравана і пагружана ў вагоны 747 сямей (22 879 чалавек).

У 1939 – 1941 гг. на тэрыторыі заходніх абласцей існавалі польскія падпольныя арганізацыі "Саюз барацьбы за незалежнасць Польшчы", "Саюз узброенай барацьбы", "Саюз польскіх патрыётаў", "Стральцы", "Сокал", "Вызваленцы", "Партызанка" і інш. Яны назапашвалі зброю, мелі радыёпрыёмнікі, пісалі і распаўсюджвалі антысавецкія лістоўкі, у якіх заклікалі палякаў да супраціўлення акупантам-бальшавікам, да падрыхтоўкі ўзброенага паўстання за аднаўленне Польшчы, у складзе якой яны бачылі і Заходнюю Беларусь. За перыяд з кастрычніка 1939 г. па ліпень 1940 г. было раскрыта і ліквідавана 109 падпольных арганізацый, якія аб'ядноўвалі 3231 чалавека.

У гэты час былі арыштаваны 5584 члены партыі ППС, Бунда, "Стронніцтво народова", ПОВ і інш. У ноч з 19 на 20 чэрвеня 1941 г. была праведзена аперацыя па арышту ўдзельнікаў паўстанцкіх арганізацый і выяўленню членаў іх сямей. Усяго было рэпрэсіравана 24 412 чалавек.

Такім чынам, з кастрычніка 1939 г. па 20 чэрвеня 1941 г. у заходніх абласцях Беларусі было рэпрэсіравана, за выключэннем ваеннапалонных польскай арміі, больш за 125 тыс. чалавек.

У выніку ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР насельніцтва Беларусі павялічылася да 11 млн чалавек. Гістарычнае значэнне гэтай падзеі заключаецца ў тым, што большая частка тэрыторыі Беларусі аб'ядналася ў адзіным нацыянальна-адміністрацыйным утварэнні.

2. Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі

22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія без аб'яўлення вайны напала на СССР. Ваенныя дзеянні разгарнуліся ад Баранцава да Чорнага мораў, дзе вялі наступленні тры буйныя фашысцкія групоўкі — "Поўнач", "Цэнтр" і "Поўдзень". Супраць войск Заходняй асобай ваеннай акругі, якая 22 чэрвеня 1941 г. была пераўтворана ў Заходні фронт (камандуючы Дз. Р. Паўлаў), дзейнічала група армій "Цэнтр" (камандуючы генерал-фельдмаршал Ф. Бок) у складзе 4-й, 9-й палявых армій, 2-й і 3-й танкавых груп, усяго 50 дывізій і дзве матарызаваныя брыгады. Гэтыя сухапутныя сілы падтрымліваў 2-і паветраны флот — 1600 баявых самалётаў. Удар гэтай адборнай групоўкі прынялі на сябе 3, 10, 4-я арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта В. І. Кузняцова, генерал-маёра К. Дз. Голубева, генерал-маёра А. А. Карабкова — усяго 11 стралковых, дзве танкавыя і адна кавалерыйская дывізіі.

У першыя гадзіны вайны праціўнік правёў масіраваны артылерыйскі абстрэл пагранічных раёнаў Беларусі. Магутныя бомбавыя ўдары былі нанесены на скапленні войск Чырвонай Арміі, аэрадромы, чыгуначныя вузлы, на буйнейшыя прамысловыя цэнтры — Баранавічы, Брэст, Ваўкавыск, Гродна і інш. У выніку гэтай аперацыі вораг знішчыў на аэрадромах 528 самалётаў Заходняга фронту, 210 самалётаў былі збіты ў паветраных баях.

Нягледзячы на вельмі неспрыяльныя ўмовы пачатку

Вялікай Айчыннай, воіны Чырвонай Арміі мужна і бясстрашна змагаліся з ворагам. Першыя ўдары прынялі на сябе пагранічнікі і воіны прыгранічных гарнізонаў. Да апошняга патрона абаранялі свае пазіцыі пагранічнікі 4-й заставы пад камандаваннем старшага лейтэнанта І.Г.Ціханава на паўночным захадзе ад Брэста. Выключны гераізм праявілі воіны 3-й заставы 86-га Аўгустоўскага пагранатрада на чале з лейтэнантам В.М.Усавым, якія змагаліся ў раёне Гродна. За дзесяць гадзін бою яны адбілі адну за другой сем атак. В.М.Усаў пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Мужнасцю вызначаліся і дзеянні ваенных лётчыкаў Заходняга фронту. Ужо ў першы дзень вайны яны зрабілі больш за 1,9 тыс. вылетаў, нанеслі шэраг бомбавых удараў па аэрадромах ворага. У паветраных баях было знішчана больш за 100 самалётаў праціўніка. У першыя гадзіны вайны лётчыкі П.С.Рабцаў, А.С.Данілаў, С.М.Гудзімаў таранілі варожыя самалёты.

Назаўсёды застанецца ў памяці людзей гераізм абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Невялікі гарнізон (каля 3,5 чыс. чалавек) мужна абараняўся з першага дня вайны да канца ліпеня. Абарону ўзначальвалі капітан І.М.Зубачоў, палкавы камісар Я.М.Фамін, маёр П.М.Гаўрылаў, лейтэнант А.М.Кіжаватаў і інш. Нягледзячы на колькасную перавагу праціўніка, бесперапынныя ўдары яго авіяцыі, абстрэлы, савецкія воіны пастаянна контратакавалі ворага і наносілі яму вялікія страты.

Прарваўшы абарону пагранічных войск, фашысты, нягледзячы на ўпартае супраціўленне з боку асобных часцей Чырвонай Арміі, даволі хутка рухаліся ў глыб тэрыторыі Беларусі.

Сур'ёзная пагроза захопу ворагам навісла над сталіцай Беларусі Мінскам. Становішча ўскладнялася тым, што Мінскі ўмацаваны раён быў фактычна не падрыхтаваны да абароны. Рашэннем Ваеннага савета Заходняга фронту абарона горада была ўскладзена на войскі 44-га і 2-га стралковых карпусоў. Для дапамогі ім ствараліся добраахвотныя знішчальныя атрады з жыхароў сталіцы. Яны ахоўвалі прадпрыемствы, вузлы і сродкі сувязі, масты. Бітва за Мінск была кароткай, але жорсткай. Гітлераўцы страцілі сотні салдат і афіцэраў, было спалена і падбіта больш за 300 танкаў, шмат іншай баявой тэхнікі. Адчувальныя страты нанеслі праціўніку лётчыкі. Экіпажы савецкіх бамбардзіроўшчыкаў капітана М.Ф.Гастэлы, капітана

А.С.Маслава, старшага лейтэнанта І.З.Прэсайдзена накіравалі свае падбітыя самалёты на вялікую колькасць варожай баявой тэхнікі.

Сілы былі няроўныя і, нягледзячы на ўпартае супраціўленне, савецкім войскам не ўдалося ўтрымаць сталіцу Беларусі. У другой палове дня 28 чэрвеня нямецкія танкі ўварваліся ў Мінск.

У гіганцкім катле на захад ад Мінска ў акружэнні апынуліся амаль цалкам злучэнні 3-й і 10-й армій, а таксама частка сіл 4-й і 13-й армій. Некаторыя з іх прабіліся з акружэння, частка засталася ў лясах і перайшла да партызанскай барацьбы, але значная колькасць трапіла ў палон. Вораг захапіў шмат баявой тэхнікі, зброі і вайсковай маёмасці. Усё гэта вельмі адмоўна паўплывала на баявы стан войск Заходняга фронту, ускладніла яго задачы ў далейшай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Адступаючы на ўсход, часці Чырвонай Арміі вялі цяжкія абарончыя баі. Увесь цяжар абароны Радзімы быў ускладзены на плечы простых воінаў. Толькі 29 чэрвеня была абвешчана дырэктыва СНК СССР і ЦК УКП(б) партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей. У адпаведнасці з ёй праводзілася дадатковая мабілізацыя ў Чырвоную Армію. У чэрвені — жніўні ў яе рады было мабілізавана больш за 500 тыс. жыхароў рэспублікі. Для барацьбы з варожымі дыверсантамі і парашутыстамі ствараліся знішчальныя атрады. Ужо ў сярэдзіне ліпеня існавала 78 знішчальных батальёнаў (больш за 13 тыс. чалавек). Для дапамогі арміі фарміраваліся атрады і палкі народнага апалчэння. У Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Палескай абласцях было створана больш за 200 фарміраванняў народных апалчэнцаў (больш за 33 тыс. чалавек). Яны ўдзельнічалі ў будаўніцтве абарончых аб'ектаў і ў баях з захопнікамі. На прамысловых аб'ектах усходніх абласцей Беларусі наладжвалася вытворчасць боепрыпасаў, праводзіўся рамонт узбраення і баявой тэхнікі. Ва ўсходнія раёны СССР было эвакуіравана больш за 1,5 млн чалавек, вывезена абсталяванне 124 буйных прадпрыемстваў, больш за 17 тыс. адзінак каштоўнага тэхналагічнага абсталявання. Не менш важнае значэнне надавалася эвакуацыі сельскагаспадарчай тэхнікі, грамадскай жывёлы, сыравіны і матэрыялаў, прадуктаў харчавання. У глыбокі тыл было адпраўлена каля 45 тыс. т збожжапрадуктаў, амаль 5 тыс. трактароў, звыш 220 камбайнаў. З неакупіраваных раёнаў на ўсход перагнана 674 тыс. галоў

жывёлы. Тое, што не змаглі вывезці, было раздадзена насельніцтву, воінскім часцям Чырвонай Арміі.

Усяго ў тылавыя раёны было эвакуіравана больш за 60 % трактароў, 18 % камбайнаў, 53 % буйной рагатай жывёлы.

Значная ўвага ўдзялялася эвакуацыі ўстаноў навукі і культуры.

Трэба адзначыць, што эвакуацыйныя мерапрыемствы праводзіліся ў вельмі кароткія тэрміны, у складаных умовах прыфрантавой абстаноўкі, пад артылерыйскімі абстрэламі і налётамі варожай авіяцыі.

У пачатку ліпеня 1941 г. савецкае камандаванне зрабіла захады па стварэнню лініі абароны ўздоўж Заходняй Дзвіны і Дняпра з мэтай не дапусціць прарыву гітлераўцаў на маскоўскім напрамку. Тры дні ішлі баі ў Барысаве на шашы Мінск — Масква. 8 — 9 ліпеня г.п. Талачын двойчы пераходзіў з рук у рукі. 14 ліпеня пад Оршай упершыню прыняў удзел у ваенных дзеяннях дывізіён рэактыўных мінамётаў пад камандаваннем капітана І.А.Флерава. Жорсткія баі разгарнуліся ў раёне Бабруйска за пераправу праз Бярэзіну, дзе ў адным з баёў фашысты страцілі 20 танкаў.

З 3 па 26 ліпеня працягвалася абарона Магілёва. Яе ажыццяўлялі войскі 61-га стралковага корпуса пад камандаваннем генерала Ф.А.Бакуніна. Баі насілі надзвычай напружаны характар. Гітлераўцы страцілі тут шмат жывой сілы і баявой тэхнікі. Толькі ў час 14-гадзіннага бою на Буйніцкім полі было знішчана больш за батальён салдат і афіцэраў праціўніка, 39 танкаў і бронетранспарцёраў.

Цяжкія баі супраць сіл 2-й нямецкай арміі ішлі 12 — 19 жніўня за Гомель. Страціўшы больш за 5200 салдат і афіцэраў, гітлераўцы захапілі горад.

Да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Няўдачы Чырвонай Арміі ў пачатку вайны мелі свае рэальныя прычыны. Сур'ёзныя памылкі сталінскага кіраўніцтва напярэдадні вайны ў знешняй палітыцы, масавае рэпрэсіраванне вышэйшага камандуючага саставу Чырвонай Арміі, непрыняцце належных мер па ўмацаванню абароназдольнасці краіны не дазволілі рэалізаваць ваенны і эканамічны патэнцыял у першыя месяцы вайны, прывялі да вялікіх матэрыяльных і людскіх страт.

Апраўдваючы няўдачы і страты ў пачатковы перыяд вайны, І.В.Сталін абвінаваціў у гэтым камандаванне Заходняга фронту. Яго камандуючы Дз.Р.Паўлаў і некаторыя іншыя военачальнікі былі асуджаны і расстраляны.

Нягледзячы на цяжкае становішча, Чырвоная Армія аказала ўпартае супраціўленне моцнай ваеннай гітлераўскай групоўцы, сваімі гераічнымі дзеяннямі садзейнічала зрыву фашысцкага плана "маланкавай вайны".

3. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі

На працягу чэрвеня — жніўня 1941 г. на тэрыторыі Беларусі быў усталяваны жорсткі акупацыйны рэжым. Асноўнай яго мэтай была татальная эканамічная эксплуатацыя Беларусі дзеля патрэб Германіі, паступовая каланізацыя яе тэрыторыі, германізацыя, высяленне і ў значнай ступені знішчэнне карэннага насельніцтва. У плане аператыўнага кіравання тэрыторыя Беларусі была раздзелена. Паўночна-заходнія раёны Брэсцкай вобласці і Беластоцкую вобласць з гарадамі Гродна і Ваўкавыскам акупанты далучылі да Усходняй Прусіі, паўднёвыя раёны Брэсцкай, Пінскай, Палескай і Гомельскай абласцей па лініі 20 км на поўнач ад чыгуначнай лініі Брэст — Гомель адышлі да рэйхскамісарыята "Украіна", паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці ўключылі ў генеральную акругу Літвы, Віцебскую, Магілёўскую, большую частку Гомельскай і ўсходнія раёны Мінскай абласцей перадалі ў зону аператыўнага тылу групы армій "Цэнтр". У склад генеральнай акругі Беларусі ўвайшлі Баранавіцкая, часткі Вілейскай, Мінскай, Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей, што складала 1/3 частку даваеннай тэрыторыі БССР. Гэта тэрыторыя была ўключана ў склад рэйхскамісарыята Остланд і падзелена на 10 акруг: Баранавіцкую, Барысаўскую, Вілейскую, Ганцавіцкую, Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Навагрудскую, Слонімскую, Слуцкую.

Да верасня 1941 г. тэрыторыя Беларусі была падпарадкавана вайсковай адміністрацыі, яе кіраванне захавалася пазней на значнай частцы Усходняй і Цэнтральнай Беларусі. З 1 верасня 1941 г. у межах генеральнай акругі Беларусі была ўсталявана ўлада цывільнай адміністрацыі на чале з В. фон Кубэ. Аднак функцыі цывільнай улады былі абмежаваны дзейнасцю сіл паліцыі і СС, якія вырашалі пытанні бяспекі і барацьбы з антыфашысцкім рухам. На акупіраванай тэрыторыі дзейнічала мноства будаўнічых, дарожных арганізацый, гаспадарчых служб, якія займаліся арганізацыяй харчовых і фуражных паставак і мабілізацыяй мясцовага насельніцтва для выканання неабходных вайсковых работ.

Палітычныя планы Германіі ў дачыненні да Беларусі, нягледзячы на спробы іх абмеркавання, засталіся нявызначанымі. Нямецкае кіраўніцтва вельмі спадзявалася на хуткую перамогу ў вайне і песімістычна ўспрымала здольнасці беларускага насельніцтва да нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва з-за слабасці этнічнай самасвядомасці. Больш таго, быў распрацаваны генеральны план "Ост", які прадугледжваў праграму каланізацыі акупіраваных тэрыторый, германізацыі, высялення і знішчэння зняволенага насельніцтва. У прыватнасці, планавалася выселіць і знішчыць 75 % беларусаў.

У правядзенні канкрэтных акупацыйных мерапрыемстваў на тэрыторыі Беларусі праявіліся два падыходы, прадстаўленыя цывільнай адміністрацыяй, з аднаго боку, і сіламі СС і паліцыі, з другога. Агульным для іх было тое, што яны аддана служылі інтарэсам Германіі і дзейнічалі дзеля яе інтарэсаў. Але В.Кубэ рабіў стаўку на мясцовы нацыянальна-патрыятычны рух, не цураўся пэўных папулісцкіх крокаў з мэтай змяншэння сацыяльнай базы для разгортвання антыфашысцкай барацьбы і ўмацавання пазіцый, стварэння пэўнага аўтарытэту акупацыйных органаў для больш эфектыўнай эксплуатацыі Беларусі. Эсэсаўскае кіраўніцтва безразважліва арыентавала свае войскі выключна на жорсткае масавае вынішчэнне партызан і мірных жыхароў.

Вясной 1942 г. на тэрыторыі генеральнай акругі Беларусі была праведзена зямельная рэформа. Усе калгасы былі распарцэляваны, а іх зямля і інвентар перайшлі ў сямейны ўжытак сялян у рамках так званых зямельных кааператываў. На тэрыторыі ўсходняй часткі Беларусі калгасы яшчэ доўгі час захоўваліся як эфектыўны сродак задавальнення гаспадарчых патрэб Германіі. Наладжвалася работа прамысловых прадпрыемстваў, транспарту, якія павінны былі працаваць на карысць нямецкіх войск.

В.Кубэ меў намер прыцягнуць да супрацоўніцтва з акупацыйным рэжымам мясцовых жыхароў у рамках дапаможных органаў улады і паліцыі. Але большасць насельніцтва гэтыя мерапрыемствы ўспрыняла індыферэнтна, затое польскае насельніцтва на тэрыторыі Заходняй Беларусі да часу правядзення антыпольскай аперацыі ў пачатку 1942 г. заняло асноўную частку выдзеленых месц у складзе акупацыйных органаў. З ліку беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія звязвалі свае надзеі з фашысцкай Германіяй, 22 кастрычніка 1941 г. была ство-

рана Беларуская народная самапомач. Кіраўніком гэтай калабарацыянісцкай арганізацыі быў прызначаны І.Ермачэнка. Адзінай мэтай яе існавання абвяшчаўся клопат аб ахове здароўя і грамадская апека. Пазней да ліку функцый Беларускай народнай самапомачы былі далучаны пытанні адукацыі і культуры. Быў дадзены дазвол на адкрыццё пачатковых школ, дамоў культуры, чытальняў, бібліятэк і г.д. Адзначаліся таксама крокі да беларусізацыі царкоўнага жыцця, выдаваліся чатыры беларускамоўныя часопісы, былі арганізаваны Беларускае навуковае таварыства, прафсаюзы, Жаночая Ліга, дадзены дазвол на ўжыванне беларускіх нацыянальных сімвалаў і г.д. Паступова быў створаны цэнтральны і мясцовы апарат Беларускай народнай самапомачы. 29 чэрвеня 1942 г. абвяшчалася фарміраванне беларускага Вольнага корпуса самааховы з мэтай барацьбы з узмацніўшыміся партызанскімі сіламі. Аднак яго арганізацыя засталася незавершанай па прычыне супраціўлення з боку кіраўніцтва СС, якое не жадала ствараць нацыянальныя фарміраванні. У выніку супраціўлення з боку сіл бяспекі Беларуская самаахова была распушчана, а дзейнасць БНС абмежавана ранейшымі функцыямі. 22 чэрвеня 1943 г. быў створаны Саюз беларускай моладзі. Гэтую арганізацыю ўзначалілі М.Ганько і Н.Абрамава. СБМ мог займацца шырокай выхаваўчай работай у беларускім нацыянальным духу, але рэалізацыя яго ідэй была утапічнай ва ўмовах акупацыйнага рэжыму. Па ініцыятыве В.Кубэ 27 чэрвеня 1943 г. было абвешчана аб скліканні Рады даверу пры Генеральным камісарыяце Беларусі. Гэты орган быў накшталт адміністрацыйнай камісіі. Адзінай яго задачай стала апрацоўка і прадстаўленне акупацыйным уладам пажаданняў і прапаноў. Ён не быў самастойным органам. 21 снежня 1943 г. замест Рады даверу было абвешчана аб стварэнні Беларускай цэнтральнай рады. Гэта было зроблена К.Готбэргам, які заняў пасаду генеральнага камісара Беларусі пасля забойства партызанамі ў ноч з 21 на 22 верасня 1943 г. В.Кубэ. Прэзідэнтам БЦР быў прызначаны Р.Астроўскі — фігура вельмі адыёзная і беспрынцыповая ў беларускім нацыянальным руху. Рада стала зноў жа дарадчым органам, аднак у пытаннях сацыяльнай апекі, культуры і школьніцтва яна мела права на адносна самастойныя рашэнні. 23 лютага 1944 г. Готбэрг выдаў загад аб стварэнні Беларускай краёвай абароны і даручыў БЦР правесці вайсковую мабілізацыю. Сфарміраваныя да канца сакавіка 45 батальёнаў БКА засталіся кепска

ўзброенымі. Паступова зніжалася іх дысцыпліна, не хапала афіцэраў. Пад канец акупацыі БКА па загаду немцаў пачалі выкарыстоўваць для барацьбы з партызанамі. Апошнім мерапрыемствам БЦР на Беларусі стала правядзенне 27 чэрвеня 1944 г. у Мінску II Усебеларускага кангрэса, які намінальна абвясціў Раду адзіным законным прадстаўніцтвам беларускага народа.

Акупацыйны рэжым прынёс Беларусі незлічоныя беды. У выніку вайны загінула 1/3 частка насельніцтва нашай Бацькаўшчыны, 380 тыс. чалавек вывезена на працу ў Германію. З-за людскіх страт насельніцтва Беларусі ў 1945 г. склала толькі 6,2 млн чалавек. За час акупацыі ў рэспубліцы было знішчана каля 9200 населеных пунктаў, з іх звыш 5295 фашысты знішчылі разам з усім насельніцтвам або яго часткай.

З першых дзён свайго гаспадарання акупанты праводзілі карныя аперацыі супраць партызан і мірных жыхароў. За ўвесь перыяд акупацыі на тэрыторыі Беларусі было спланавана і здзейснена больш за 60 буйных экспедыцый. Па няпоўных звестках, падчас 28 падобных аперацый у 1942 — 1943 гг. ад рук карнікаў загінула больш за 70 тыс. чалавек. Так, у жніўні — верасні 1942 г. акупанты правялі серыю аперацый пад назвай "Зумпфібэр" ("Балотная ліхаманка"). Яна адбывалася на тэрыторыі Генеральнага камісарыята Беларусі. У час яе было забіта ў баях 389 партызан і 9624 цывільныя жыхары, 1217 чалавек захоплены для вывазу на працу ў Германію. Вялікімі знішчэннямі суправаджалася правядзенне аперацый "Горнунг", "Котбус" і інш.

За час акупацыі на тэрыторыі Беларусі было створана звыш 260 лагераў смерці і іх філіялаў. Лагер смерці ў Трасцянцы, што пад Мінскам, па колькасці знішчаных людзей знаходзіцца на трэцім месцы пасля Асвенцыма і Майданэка. У ім было знішчана 206 500 чалавек. У лагерах над зняволенымі праводзіліся доследы з заразнымі хваробамі, газамі і г.д., іх трупілі ў душагубках. Жудасным становішчам вызначаліся яўрэйскія гета. Адным з найбольш буйных з'яўлялася Мінскае гета. Яно пачало дзейнічаць у жніўні 1941 г. У ім было загублена каля 100 тыс. яўрэяў.

За час акупацыі з Беларусі адпраўлена ў Германію шмат матэрыяльных і гістарычных каштоўнасцей, знішчана каля 10 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, вывезена 90 % станочнага і тэхнічнага абсталявання, кнігі, карціны, выдатныя помнікі старажытнасці з беларускіх бібліятэк, му-

зеяў і многае іншае. Па ацэнках заходніх спецыялістаў, Беларусь больш, чым якая-небудзь іншая краіна Еўропы, пацярпела ад вайны.

Водгукам на акупацыйны рэжым сталі масавы антыфашысцкі рух, дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. У заходніх абласцях Беларусі змагалася з ворагам Армія Краёва (АК). Найбольш буйныя яе фарміраванні на тэрыторыі Беларусі былі сканцэнтраваны ў Навагрудскай акрузе. Тут налічвалася звыш 7 тыс. байцоў АК. Армія Краёва імкнулася шляхам зброі вярнуць Польшчы дзяржаўныя межы да 1939 г. У сувязі з гэтай мэтай атрады АК нярэдка праводзілі акцыі супраць беларускага насельніцтва, якое не падтрымлівала ідэю ўзнаўлення Польшчы ў даваенных межах. Антыбеларускі тэрор самых вялікіх памераў дасягнуў у Лідскай акрузе. Тут было забіта каля 1200 чалавек. Савецкія партызаны да вясны 1943 г. падтрымлівалі саюзніцкія адносіны з атрадам АК. Пасля разрыву дыпламатычных адносін паміж СССР і польскім эмігранцкім урадам у Лондане нярэдкімі былі ўзброеныя сутычкі партызан з акаўцамі.

У час акупацыі існавала нешматлікае беларускае нацыянальнае антыфашысцкае падполле. Палітычна яно было прадстаўлена Партыяй беларускіх нацыяналістаў на чале з Я.Станкевічам і В.Іваноўскім, а ў сваіх спадзяваннях арыентавалася на заходнія дзяржавы.

Найбольш масавай і дзейснай сілай змагання з акупантамі быў савецкі партызанскі і падпольны рух.

4. Антыфашысцкая барацьба

З першых дзён фашысцкага нашэсця значная частка насельніцтва Беларусі пачала барацьбу супраць акупантаў. Вялікі ўклад у арганізацыю гэтай барацьбы ўнеслі партыйныя і камсамольскія органы. Аднымі з першых пачалі дзейнічаць Мінскі, Гомельскі, Пінскі абласныя і Гомельскі гарадскі падпольныя партыйныя і камсамольскія камітэты. Ужо ў чэрвені 1941 г. работнік Пінскага абкама партыі В.З.Корж сфарміраваў партызанскі атрад. Увосень 1941 г. ён на чале атрада разам з партызанамі Палесся і Міншчыны прайшоў з баявым рэйдам па захопленых ворагам тэрыторыях Палескай і Мінскай абласцей. У гэты ж час арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад у Суражскім раёне Віцебскай вобласці М.Н.Шмыроў. У Акцябрскім раёне

Палескай вобласці пачаў дзейнічаць партызанскі атрад пад кіраўніцтвам У.П.Бумажкова і Ф.І.Паўлоўскага.

Разам са стварэннем партызанскіх атрадаў і груп на тэрыторыі рэспублікі фарміраваліся буйныя цэнтры партызанскага руху. Нарастала баявая актыўнасць партызан.

Восенню — зімой 1941/42 г. у гарадах і сёлах Беларусі працягваўся працэс стварэння і ўмацавання падпольных арганізацый.

У снежні 1941 г. у час бітвы пад Масквой падпольшчыкі Мінска знішчылі дзве вадакачкі на чыгуначным вузле. У выніку 50 цягнікоў былі пашкоджаны. Падпольшчыкі Оршы з лістапада 1941 г. па люты 1942 г. сапсавалі 170 цягнікоў.

Тысячы былых вайскоўцаў з дапамогай падпольшчыкаў былі вызвалены з фашысцкага палону і накіраваны ў лес да партызан.

Народная барацьба на Беларусі супраць акупантаў садзейнічала перамозе Чырвонай Арміі ў бітве пад Масквой.

Ва ўмовах нарастання супраціўлення насельніцтва рэспублікі фашыстам бальшавікі ўзмацнялі кіраўніцтва падполлем і партызанскім рухам. З гэтай мэтай на акупіраванай тэрыторыі Беларусі была створана шырокая сетка падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, якія ўзначалілі барацьбу з нямецкімі акупантамі. Дзейнічалі 203 абкамы, міжрайкамы, міжрайпартцэнтры, гаркамы і райкамы КП(б)Б, больш за 1200 пярвічных партыйных арганізацый, 224 абласныя, міжраённыя, гарадскія і раённыя камітэты камсамола і звыш 5500 пярвічных камсамольскіх арганізацый. У партызанскіх атрадах і падполлі знаходзілася 135 тыс. камуністаў і камсамольцаў.

У цяжкіх умовах вялі барацьбу з ворагам падпольшчыкі Мінска. Нягледзячы на вялікія страты ў час масавых арыштаў у сакавіку і верасні 1942 г., яны не спынілі барацьбы супраць нямецкіх захопнікаў, арганізавалі шэраг буйных аперацый на прамысловых і ваенных аб'ектах, транспарце. Толькі на чыгуначным вузле ў другой палове 1943 г. было праведзена больш за 50 дыверсій. За тры гады акупацыі падпольшчыкі горада правялі больш за 1500 дыверсій.

У Магілёве актыўна дзейнічала падпольная арганізацыя "Камітэт садзеяння Чырвонай Арміі", створаная ў 1942 г., на чале з К.Ю.Матэ, з 1943 г. — П.І.Крысевічам. Падпольшчыкі паспяхова правялі шэраг аперацый на чыгуначнай станцыі, дэпо, ЦЭЦ, перапраўлі ў партызанскія атрады сотні савецкіх ваеннапалонных і насельніцтва.

Мужна змагаліся з акупантамі падпольшчыкі Віцебска. Восенню 1942 г. стварэннем падпольнай арганізацыі тут займаліся В.З.Харужая — удзельніца рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі. Аднак фашысты схапілі і расстралялі яе. В.З.Харужай пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У 1942 г. падпольшчыкі горада арганізавалі больш за 100 буйных аперацый на транспарце. Да лета 1943 г. у Віцебску налічвалася 60 падпольных груп.

У заходніх абласцях Беларусі ў барацьбе з ворагам змагаліся звыш 40 абласных, міжраённых і раённых антыфашысцкіх падпольных арганізацый, у якіх знаходзілася больш за 12 тыс. чалавек. Гэтыя арганізацыі ўзніклі па ініцыятыве былых членаў КПЗБ і КСМЗБ.

Значны ўклад у барацьбу з нямецкімі акупантамі ўнесла камсамольскае падполле, у арганізацыі якога непасрэдна прымалі ўдзел М.В.Зімянін, К.Т.Мазураў, П.М.Машэраў, С.В.Прытыцкі, Ф.А.Сурганаў.

У Мінску налічвалася каля 70 камсамольскіх і камсамольска-маладзёжных арганізацый і груп, якія мужна змагаліся з ворагам. Камсамольская арганізацыя "Андруша" (кіраўнік М.А.Кедышка, пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза) за два гады сваёй дзейнасці правяла 40 дыверсій на хлебазаводзе, чыгункі, ЦЭЦ-1 і інш.

Значныя страты ворагу нанесла камсамольская арганізацыя "Юныя мсціўцы" чыгуначнай станцыі "Обаль". Патрыёты знішчылі льнозавод, электрастанцыю, вадакачку, некалькі эшалонаў, праводзілі агітацыйную і разведвальную работу. Усяго падпольшчыкі арганізавалі 21 дыверсію. Многія з іх узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Е.Зянькоўай і З.Партновай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Члены Скідзельскага камсамольска-маладзёжнага падполля збіралі звесткі пра варожыя гарнізоны, рух нямецкіх падраздзяленняў па чыгункі і шашэйных дарогах і перадавалі партызанам, аказвалі ім дапамогу зброяй, медыкаментамі, адзеннем і абуткам, распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі. Мужна вялі барацьбу з нямецкімі акупантамі юныя патрыёты іншых населеных пунктаў Беларусі.

Перамога савецкіх войск над нямецка-фашысцкімі захопнікамі пад Масквой, контрнаступленне Чырвонай Арміі зімой 1941/42 г. садзейнічалі актывізацыі партызанскага руху на Беларусі. Партызаны атрадаў Героя Савецкага Саюза Ф.І.Паўлоўскага і А.І.Далідовіча ў студзені 1942 г.

знішчылі варожы гарнізон у Капаткевічах. Сіламі некалькіх партызанскіх атрадаў у лютым быў ліквідаваны нямецкі гарнізон у Азарычах. У гэтым жа месяцы партызанскія атрады М.Ф.Шмырова, Я.З.Захарава, Д.В.Райцава і іншыя сумесна з часцямі Калінінскага фронту прымалі ўдзел у стварэнні "Віцебскіх (Суражскіх) варот", якія дзейнічалі да кастрычніка 1942 г.

З вясны 1942 г. партызанскі рух набыў больш масавы, народны характар. Да лістапада 1942 г. ужо налічвалася 430 партызанскіх атрадаў, на базе якіх былі створаны брыгады і злучэнні. У канцы года налічвалася 59 партызанскіх брыгад. Першыя такія фарміраванні ўзніклі ў Віцебскай і Мінскай абласцях. Стварэнне брыгад і злучэнняў давала магчымасць партызанам праводзіць буйныя аперацыі па знішчэнню гарнізонаў ворага і яго камунікацый.

Толькі ў верасні — лістападзе 1942 г. партызаны ўчынілі 129 крушэнняў воінскіх эшалонаў, узарвалі некалькі чыгуначных мастоў.

З красавіка 1942 г. пачала дзейнічаць 1-я Беларуская партызанская брыгада пад камандаваннем М.Ф.Шмырова. Брыгада сумесна з часцямі Калінінскага фронту абараняла "Віцебскія вароты". На тэрыторыі 15 вызваленых сельскіх Саветаў партызаны аднавілі савецкую ўладу. Партызаны брыгады наносілі ўдары па варожых гарнізонах, чыгуначных і водных камунікацыях. М.Ф.Шмырову было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Мужна змагаліся з нямецкімі акупантамі партызаны брыгады К.Заслонава. Яны разграмілі некалькі варожых гарнізонаў, правялі шэраг дыверсій на чыгунцы і шашэйных дарогах. К.Заслонаў загінуў у баі каля в.Купаваць 14 лістапада 1941 г. Яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

З мэтай цэнтралізацыі аператыўнага кіраўніцтва партызанскім рухам у маі 1942 г. пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР, начальнік — першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка). З верасня 1942 г. пачаў працаваць Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР), які ўзначаліў другі сакратар ЦК КП(б)Б П.З.Калінін. Штаб накіроўваў дзейнасць партызанскіх атрадаў і брыгад, аказваў ім дапамогу кадрамі, зброяй, боепрыпасамі, сувяззю і інш.

У выніку ўзмацнення партызанскага руху некаторыя

раёны рэспублікі былі вызвалены ад ворага. К канцу 1943 г. партызаны ўтрымлівалі і кантралявалі каля 60 % тэрыторыі Беларусі. Тут былі створаны звыш 20 буйных партызанскіх зон. Першыя з іх узніклі яшчэ восенню 1941 г. Найбольш буйнымі зонамі з'яўляліся Акцябрска-Любанская, Барысаўска-Бягомльская, Клічаўская, Полацка-Лепельская, Расонска-Асвейская і інш. Пры аб'яднанні некалькіх зон утвараліся партызанскія краі. У партызанскіх зонах і краях была адноўлена савецкая ўлада.

Сотні тысяч людзей жылі ў партызанскіх зонах пад аховай партызан, напрыклад ва Ушацка-Лепельскай зоне — звыш 73 тыс. чалавек, Клічаўскай — больш за 70 тыс., Івянецка -Налібоцкай — каля 60 тыс. Партызаны дапамагалі сялянам сеяць і збіраць ураджай, партызанскія ўрачы лячылі хворых. У зонах адкрываліся і працавалі дзесяткі школ. У Акцябрскім раёне іх было адкрыта 20. У зонах дзейнічалі гаспадарчыя прадпрыемствы, якія працавалі на патрэбы партызан і мясцовага насельніцтва. Напрыклад, у Расонскай зоне к вясне 1943 г. былі адрамантаваны сем вадзяных і паравых млыноў, 12 гарбарных заводаў, 13 шавецкіх майстэрань. Для партызан было пашыта шмат абутку, вялікая колькасць бялізны і інш.

Зоны з'яўляліся агітацыйна-прапагандысцкімі цэнтрамі. Тут выпускаліся газеты, працавалі радыёстанцыі, праводзіліся гутаркі і лекцыі, дэманстраваліся кінафільмы.

Зразумела, што такія абставіны на захопленай тэрыторыі Беларусі не адпавядалі палітычным мэтам акупантаў.

Нямецкае камандаванне правяло шэраг буйных аперацый па ліквідацыі партызанскіх зон. У ліпені 1942 г. звыш 30 тыс. салдат рэгулярнай арміі і паліцэйскіх пры падтрымцы танкаў, артылерыі і авіяцыі ўдзельнічалі ў карнай экспедыцыі "Адлер" супраць атрадаў Клічаўскай партызанскай зоны. Нягледзячы на цяжкія страты, партызаны выйшлі з акружэння. Не змаглі гітлераўцы знішчыць і Расонска-Асвейскую партызанскую зону ў лютым — сакавіку 1943 г. Буйную аперацыю пад назвай "Котбус", у якой удзельнічалі звыш 80 тыс. карнікаў, нямецкае камандаванне правяло ў маі — чэрвені 1943 г. супраць атрадаў Барысаўска-Бягомльскай і Полацка-Лепельскай партызанскіх зон. Не дасягнуўшы поспеху у знішчэнні партызан, немцы адступілі. З восені 1942 г. па восень 1943 г. супраць партызан Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Мінскай, Магілёўскай і Пінскай абласцей былі праведзены 54 буйныя карныя экспедыцыі.

Але і масавыя карныя аперацыі супраць насельніцтва і партызан не прыносілі жаданых вынікаў, патрыятычны рух нарастаў і пашыраўся.

З мэтай дэзарганізацыі ворага і ўзмацнення партызанскага руху праводзіліся рэйды, у час якіх партызаны грамілі нямецкія гарнізоны, паліцэйскія ўчасткі, разбуралі камунікацыі. У верасні – лістападзе 1943 г. Беластоцкае партызанскае злучэнне правяло 1000-кіламетровы рэйд па Мінскай, Пінскай, Баранавіцкай, Брэсцкай і Беластоцкай абласцях. Паспяхова прайшоў восенню 1943 г. рэйд брыгады імя А.К.Флегантава з Мінскай у Брэсцкую вобласць.

Вялікія страты ворагу нанеслі партызаны Беларусі ў перыяд "рэйкавай вайны" адначасовым масавым разбурэннем чыгуначных камунікацый. Першы этап "рэйкавай вайны" (аперацыя "Рэйкавая вайна") пачаўся ў жніўні 1943 г., калі савецкія войскі перайшлі ў контрнаступленне пад Курскам, і закончыўся ў сярэдзіне верасня 1943 г. Другі этап "рэйкавай вайны" (аперацыя "Канцэрт") праходзіў з другой паловы верасня 1943 г. да канца кастрычніка гэтага ж года. Трэці этап "рэйкавай вайны" пачаўся ў чэрвені 1944 г. напярэдадні Беларускай наступальнай аперацыі "Багратыён" і закончыўся з вызваленнем Беларусі. За час трох этапаў "рэйкавай вайны" партызаны Беларусі падарвалі больш за 270 тыс. рэек, знішчылі шмат чыгуначных станцый, мастоў, варожых гарнізонаў.

Партызанскі рух карыстаўся падтрымкай мясцовага насельніцтва. Яно забяспечвала партызан прадуктамі і адзеннем, вяло разведвальную работу, збірала і перадавала ім зброю і боепрыпасы, удзельнічала ў баявых аперацыях. Цаной свайго жыцця браты Міхаіл і Іван Цубы з вёскі Навіны адмовіліся паказаць немцам месцазнаходжанне партызан. У ліпені 1943 г. каля 3 тыс. мясцовых жыхароў прымалі ўдзел у разбурэнні чыгуначнага палатна на ўчастку Орша – Лепель.

Партызанам аказвалася разнастайная дапамога з-за лініі фронту. Толькі з лета 1942 г. па сакавік 1944 г. яны атрымалі 80 тыс. вінтовак, аўтаматаў, кулямётаў, 100 млн патронаў, 400 т узрыўчаткі. Працоўныя савецкага тылу накіроўвалі партызанам пасылкі з абмундзіраваннем, цёплым адзеннем, медыкаментамі, харчамі, праводзілі збор сродкаў у фонд дапамогі партызанам.

Свой уклад у барацьбу з нямецкімі захопнікамі ўнеслі жыхары Беларусі, эвакуіраваныя ў савецкі тыл. У выніку самаадданай працы рабочых і інжынераў на вывезеных прад-

прыемствах хутка была наладжана вытворчасць прамысловай прадукцыі. Сяляне паспяхова працавалі ў мясцовых калгасах, саўгасах, МТС. Вучоныя Акадэміі навук Беларусі вялі даследаванні, якія мелі важнае народнагаспадарчае і абаронное значэнне. Падрыхтоўкай кадраў займаліся Беларускі дзяржаўны універсітэт на станцыі Сходня пад Масквой, Мінскі медыцынскі інстытут у Яраслаўлі, Беларускі лесатэхнічны інстытут у Свярдлоўску, Беларуская кансерваторыя ў Сарataве. Дзеячы літаратуры і мастацтва стварылі шэраг цікавых твораў. Эвакуіраванья з Беларусі да сакавіка 1943 г. сабралі ў фонд абароны краіны 5394 тыс. руб.

У гады вайны на Беларусі ў радах партызан знаходзілася 374 тыс., у падполлі — звыш 70 тыс. чалавек. Разам з жыхарамі Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў змагаліся прадстаўнікі многіх народаў СССР. Варта адзначыць, што жыхары нашай рэспублікі складалі да 90 % ад агульнай колькасці народных мсціўцаў. Паводле звестак БШПР, па свайму сацыяльнаму складу (да пачатку вайны) гэтыя людзі размяркоўваліся наступным чынам: на долю сялян прыпадала 39,1 % ад усёй колькасці партызан, інтэлігенцыі і служачых — 20,55, рабочых — 17,03, навучэнцаў — 12,16, былых ваеннаслужачых — звыш 11 %. У складзе партызан Беларусі змагаліся сотні польскіх грамадзян, больш за 400 славакаў і чэхаў, 235 югаславаў, каля 70 венграў, 60 французаў, звыш 30 грамадзян Бельгіі, 24 аўстрыйцы, 16 галандцаў, прадстаўнікі іншых еўрапейскіх народаў — усяго каля 4 тыс. антыфашыстаў замежных краін.

Партызаны і падпольшчыкі забілі і паранілі больш за 500 тыс. гітлераўцаў, нанеслі цяжкія страты ворагу ў тэхніцы. За гераізм і адвагу каля 140 тыс. партызан і падпольшчыкаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, 88 з іх прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя жыхарамі Мінска ў барацьбе супраць нямецкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, 26 чэрвеня 1974 г. сталіцы Беларусі — Мінску прысвоена ганаровае званне "горад-герой" з уручэннем ордэна Леніна і медаля "Залатая Зорка".

5. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне другой сусветнай вайны

На тэрыторыю Беларусі савецкія войскі ўступілі восенню 1943 г. пасля разгрому нямецка-фашысцкіх войск пад

17. Зак. 5396.

Курскам. 26 верасня савецкія войскі вызвалілі першы беларускі горад Хоцімск, 28 верасня — Клімавічы і Касцюковічы, 30 верасня — Крычаў.

Наступаючым часцям Чырвонай Арміі актыўна дапамагалі партызаны. Яны абрушвалі ўдары на чыгуначныя камунікацыі ворага, знішчалі нямецкія гарнізоны, дапамагалі войскам пры фарсіраванні рэк. Асабліва вызначыліся ў гэты час партызаны Гомельскага злучэння пад агульным кіраўніцтвам сакратара падпольнага абкама партыі І.П.Кожара. У ходзе далейшага наступлення 26 лістапада 1943 г. быў вызвалены буйны прамысловы і культурны цэнтр Беларусі — Гомель, у студзені 1944 г. — Мазыр і Калінкавічы.

Пасля ўступлення Чырвонай Арміі на тэрыторыю Беларусі перад партызанскімі атрадамі і падпольнымі арганізацыямі была пастаўлена задача ўзмацніць удары па тылах ворага. Партызаны Беларусі актывізавалі баявыя дзеянні. Сумесна с партызанамі Прыбалтыйскіх рэспублік яны ажыццявілі другі этап "рэйкавай вайны". У ім удзельнічала каля 120 тыс. партызан, якіх актыўна падтрымлівала мясцовае насельніцтва.

У ходзе аперацыі было знішчана больш за 90 тыс. рэек, пушчана пад адхон 1000 цягнікоў з жывой сілай і тэхнікай ворага, разбураны 72 чыгуначныя масты. Адначасова з ударамі на чыгуначных камунікацыях партызаны канцэнтраваліся на шашэйных і грунтавых дарогах. Дзеянні беларускіх партызан супраць фашысцкіх акупантаў стваралі спрыяльныя ўмовы для ажыццяўлення Чырвонай Арміяй Беларускай наступальнай аперацыі. У 1944 г. пачаўся завяршаючы этап Вялікай Айчыннай вайны. Перад савецкім народам паўстала задача: канчаткова выгнаць фашысцкіх акупантаў з савецкай зямлі, дапамагчы народам Еўропы вызваліцца з фашысцкага рабства і поўнасцю разграміць гітлераўскую Германію.

Адной з выдатнейшых старонак летапісу Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца бітва за вызваленне Беларусі.

У пачатку чэрвеня 1944 г. лінія фронту на тэрыторыі Беларусі праходзіла на ўсход ад Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва і Бабруйска. З улікам гэтага гітлераўцы стварылі ўздоўж лініі фронту моцную абарону. Непадалёку ад Оршы і Магілёва яны ўтрымлівалі абарончыя рубяжы на Друці, Бярэзіне, Свіслачы і Нёмане.

Нямецкае камандаванне аддало загад абараняць свае пазіцыі ў Беларусі да апошняй магчымасці. У склад фа-

шысцкай групоўкі ўваходзілі 63 дывізіі і 3 брыгады (1,2 млн чалавек), 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат, 1350 самалётаў. Для разгрому акупантаў савецкае Вярхоўнае Галоўнакамандаванне сабрала значна большыя сілы — 2,4 млн чалавек, больш за 36 тыс. гармат і мінамётаў, 5200 танкаў і самаходных артылерыйскіх установак, каля 5,3 тыс. самалётаў. Гэтыя сілы былі аб'яднаны ў франты: 1-ы Прыбалтыйскі (генерал арміі І.Х.Баграмян), 3-і Беларускі (генерал арміі І.Д.Чарняхоўскі), 2-і Беларускі (генерал арміі Г.Ф.Захараў), 1-ы Беларускі (Маршал Савецкага Саюза К.К.Ракасоўскі).

Каардынаваць дзеянні франтоў было даручана Маршалу Савецкага Саюза А.М.Васілеўскаму (1-ы Прыбалтыйскі і 3-і Беларускі) і Маршалу Савецкага Саюза Г.К.Жукаву (2-і і 1-ы Беларускі).

Бітва за поўнае вызваленне Беларусі (кодавая назва "Баграціён") пачалася раніцай 23 чэрвеня 1944 г. У наступленне перайшлі войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў. На другі дзень да іх далучыліся войскі 1-га Беларускага фронту. Сумесна з савецкімі воінамі ў баях за вызваленне Беларусі ўдзельнічалі і французскія лётчыкі эскадрыллі "Нармандыя - Нёман".

24 чэрвеня абарончая лінія нямецкіх войск была прарвана. У выніку наступлення савецкіх войск 26 чэрвеня былі вызвалены Віцебск, Жлобін, 27 чэрвеня — Орша, 28 чэрвеня — Магілёў, Шклоў, Быхаў, Асіповічы.

Пад націскам Чырвонай Арміі фашысцкія захопнікі адступалі. Савецкія войскі імкліва праследавалі ворага, акружалі і знішчалі яго групоўкі. Часці Чырвонай Арміі набліжаліся да Мінска. 3 ліпеня 1944 г. танкісты і пехацінцы 1-га і 3-га Беларускіх франтоў вызвалілі сталіцу Беларусі — Мінск.

Напярэдадні вызвалення Мінска савецкія войскі авалодалі Вілейкай, выйшлі да Маладзечна і адрэзалі праціўніку шляхі адыходу на Вільнюс і Ліду. Фашысцкім войскам была таксама адрэзана дарога на Брэст і Лунінец. Так быў падрыхтаваны "кацёл", у якім апынулася групоўка ворага, што налічвала каля 100 тыс. салдат і афіцэраў. Толькі ў баях за Мінск немцы страцілі забітымі больш за 70 тыс. чалавек. У палон было ўзята каля 40 тыс. гітлераўцаў.

У выніку першага этапу Беларускай аперацыі (23 чэрвеня — 4 ліпеня) варожая група армій "Цэнтр" панесла катастрафічнае паражэнне, галоўныя сілы яе былі разбіты. Савецкія войскі атрымалі магчымасць наступаць на захад.

4 ліпеня быў вызвалены Полацк, 5 ліпеня — Маладзечна і Смаргонь, 8 ліпеня — Баранавічы, 9 ліпеня — Навагрудак, 10 ліпеня — Слонім, 14 ліпеня — Пінск і Ваўкавыск, 16 ліпеня — Гродна. Вызваленнем Брэста (28 ліпеня) закончылася выгнанне нямецка-фашысцкіх захопнікаў з тэрыторыі Беларусі. У выніку другога этапу Беларускай аперацыі ў канцы жніўня савецкія войскі выйшлі да Рыгі, на граніцу з Усходняй Прусіяй, на Нараў і Віслу.

У ходзе аперацыі савецкія войскі поўнасцю разгромілі 17 дывізій і 3 брыгады праціўніка, 50 нямецкіх дывізій страцілі больш за палову свайго саставу. 18 разоў Масква салютавала войскам і партызанам за вызваленне беларускіх гарадоў.

Вялікую дапамогу Чырвонай Арміі ў вызваленні Беларусі аказалі партызаны і падпольшчыкі, увесь беларускі народ, якія паказалі бязмежную адданасць сваёй Радзіме. Сыны і дочкі беларускага народа гераічна змагаліся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у радах Чырвонай Арміі, у партызанскіх атрадах, самаддана працавалі ў савецкім тыле.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя на беларускай зямлі, больш за 1600 генералаў, афіцэраў і салдат атрымалі званне Героя Савецкага Саюза, ордэнамі і медалямі ўзнагароджана больш за 400 тыс. воінаў і партызан. 747 вайсковых часцей і злучэнняў атрымалі ганаровыя назвы "Крычаўская", "Мінская", "Дняпроўская" і інш. У іх складзе мужна змагаліся і аддавалі свае жыцці за Перамогу беларусы, рускія, украінцы, татары, казахі, прадстаўнікі іншых народаў СССР.

Па меры вызвалення беларускай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў паўстала задача аднаўлення эканомікі, адраджэння разбураных ворагам гарадоў і вёсак.

Надзвычайная дзяржаўная камісія па выяўленню злачынстваў захопнікаў высветліла, што толькі прамыя страты Беларусі за гады вайны склалі 75 млрд руб. у цэнах 1941 г. Гэта значыла, што рэспубліка страціла звыш паловы свайго нацыянальнага багацця. Самай балючай і цяжкай стратай для Беларусі было знішчэнне звыш 2,2 млн чалавек. Апусцелі сотні сёл і вёсак, зменшылася колькасць гарадскога насельніцтва. У Мінску да часу вызвалення засталося менш 40 % жыхароў, у Магілёўскай вобласці — толькі 35 % гарадскога насельніцтва, Палескай — 29, Віцебскай — 27, Гомельскай — 18 %. Каля 3 млн чалавек засталіся без прытулку. Акупанты спалілі і разбурылі 209

з 270 гарадоў і раённых цэнтраў, 9200 сёл і вёсак. Было разбурана звыш 10 тыс. прадпрыемстваў. Вялікія страты панесла сельская гаспадарка. Былі разрабаваны і спустошаны ўсе калгасы і саўгасы.

З мэтай аднаўлення народнай гаспадаркі рэспублікі саюзны ўрад ужо восенню 1943 г. перадаў Беларусі значныя грашовыя сродкі, 1 тыс. станкоў, 2 тыс. т металу, 1542 трактары, шмат лесу, шкла і іншых будаўнічых матэрыялаў. У гэты цяжкі час рэспубліцы дапамагалі ўсе народы СССР. Напрыклад, толькі за 10 месяцаў 1944 г. Беларусь атрымала 487 вагонаў з рознымі грузамі ад працоўных Сібіры і Урала.

Увесь цяжар аднаўленчых работ лёг на плечы працоўных рэспублікі. Дзякуючы іх напружанай працы ўжо ў 1944 г. пачалі даваць прадукцыю "Гомсельмаш", фанерна-запалкавы камбінат, маслазавод, спіртзавод у Гомелі. Быў арганізаваны рамонт танкаў на станкабудаўнічым заводзе імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, рамонт вагонаў на Мінскім вагонарамонтным заводзе.

У 1944 г. было адноўлена і пушчана ў эксплуатацыю 196 машынабудаўнічых прадпрыемстваў, у тым ліку 18 буйных. Аднавілі працу прадпрыемствы лёгкай прамысловасці (179 тэкстыльных, 263 пашывачныя і 487 скурна-абутковых).

Адраджалася энергетычная гаспадарка рэспублікі. У другой палове 1944 г. былі адноўлены 72 электрастанцыі, к пачатку 1945 г. працавала ўжо 95. Іх магутнасць у 1945 г. дасягнула каля 50 % даваеннага ўзроўню. Гэта дазваляла ў поўнай меры механізаваць працаёмкія работы, павысіць прадукцыйнасць працы.

У 1945 г. у прамысловасці Беларусі было задзейнічана 45,3 % даваеннай колькасці рабочых і служачых. Аднак імі было выпрацавана толькі 20,1 % прадукцыі 1940 г. Нізкай заставалася прадукцыйнасць працы. У 1945 г. яна складала толькі 47 % даваеннай. Гэта тлумачылася нізкай кваліфікацыяй многіх рабочых, асабліва сельскай моладзі і дэмабілізаваных воінаў, слабай механізацыяй вытворчасці, прастоямі з-за мантажу абсталявання і інш.

Паступова адраджалася сельская гаспадарка рэспублікі. Калгаснае сялянства атрымала ад дзяржавы значную матэрыяльную дапамогу. Пад ураджай 1945 г. калгасы атрымалі насенную пазыку зерня 15 тыс. т., ільну — 2,1, бульбы — 22 тыс. т. На працягу 1945 г. у калгасы было дастаўлена звыш 15 тыс. сельскагаспадарчых машын і

абсталявання, 70 тыс. коней, 109 тыс. кароў, больш за 3 тыс. аўтамашын, 420 трактароў. Аднак становішча ў сельскай гаспадарцы заставалася вельмі цяжкім.

У вытворчасці ўдзельнічала не больш паловы даваеннай колькасці калгаснікаў, у асноўным жанчыны. Паўсюдна зямлю аралі з дапамогай кароў, ускопвалі ўручную. Вясной 1945 г. пасяўныя плошчы склалі толькі 73,8 % даваенных. Нізкай заставалася аплата працы калгаснікаў. Калгасы ў 1945 г. выдалі ў сярэднім на працадзень зерня 0,4 кг, бульбы — 0,7, сена і саломы — 0,5 кг. У большасці гаспадарак ажыццяўлялася толькі натуральная аплата працы.

У гэты перыяд пачалася работа па аднаўленню і будаўніцтву жыллёвага фонду.

Толькі за 1944 — 1945 гг. дзяржаўнымі і кааператыўнымі арганізацыямі (без калгасаў) было пабудавана і адноўлена 1033 тыс. м^2 жыллёвай плошчы. Гарадскім насельніцтвам пабудавана за кошт асабістых сродкаў і пры дапамозе крэдытаў 35 тыс. м^2 жылля. 171 тыс. дамоў было пабудавана ў гэты перыяд калгаснікамі і вясковай інтэлігенцыяй.

Хуткімі тэмпамі аднаўляліся ўстановы аховы здароўя, народнай адукацыі. Колькасць бальнічных ложкаў наблізілася да ўзроўню 1940 г. і склала ў 1945 г. 26 400 супраць 29 600. Ужо ў 1944/45 навучальным годзе агульнаадукацыйнамі школамі было ахоплена 1200 тыс. вучняў. У 1945/46 навучальным годзе працавалі 24 з 25 ВНУ, якія меліся ў рэспубліцы ў 1940 — 1941 гг.

Ва ўстановах навукі і культуры таксама наладжвалася праца. У 1945 г. у рэспубліцы функцыяніравала 38 навуковых устаноў з 51 на канец 1940 г. Аднаўляліся клубныя ўстановы, кінатэатры, музеі і тэатры, бібліятэкі.

У час выпрабаванняў многія сыны і дочкі беларускага народа ўдзельнічалі ў еўрапейскім руху Супраціўлення, актыўна змагаліся супраць фашызму.

На тэрыторыі Польшчы дзейнічала каля 12 тыс. савецкіх партызан. Важную ролю ва ўстанаўленні дружбы і баявога супрацоўніцтва паміж савецкімі і польскімі партызанамі адыграў польскі партызанскі штаб, які ўзначальваў А. Завадскі (намеснікам яго, затым начальнікам штаба быў С. Прытыцкі).

Звыш 17 тыс. савецкіх партызан дзейнічалі на тэрыторыі Чэхаславакіі. Сярод іх ураджэнец Лепельшчыны В. Квіцінскі. Летам 1944 г. ён узначаліў атрад, які затым

вырас у асобную чэхаславацкую партызанскую брыгаду. Партызаны ажыццявілі 156 баявых аперацый, удзельнічалі ў Славацкім паўстанні. В.А.Квіцінскі ўзнагароджаны Залатой Зоркай Героя Савецкага Саюза, двума ордэнамі Леніна, чэтырма ордэнамі ЧССР.

У французскім руху Супраціўлення вызначыўся ўраджэнец Ашмяншчыны Ф.Варанішча. Адным з кіраўнікоў антыфашысцкай падпольнай арганізацыі ў Маўтхаўзене быў ураджэнец Чавус Л.Маневіч.

Разгром нямецка-фашысцкіх войск на тэрыторыі Беларусі стварыў спрыяльныя ўмовы для іншых наступальных аперацый, у выніку ажыццяўлення якіх Чырвоная Армія ў другой палове 1944 г. выгнала ворага з тэрыторыі СССР і пачала вызваленне народаў Еўропы. У студзені 1945 г. савецкія войскі распачалі наступленне на фронце ад Балтыйскага мора да Карпат.

16 красавіка 1945 г. войскі Чырвонай Арміі пачалі Берлінскую аперацыю, акружылі і разграмілі берлінскую групоўку ворага, 30 красавіка ўварваліся ў рэйхстаг і ўзнялі над ім Сцяг Перамогі.

8 мая 1945 г. Германія падпісала Акт аб безумоўнай капітуляцыі.

У жніўні 1945 г. на Далёкім Усходзе Чырвоная Армія з удзелам войск МНР разграміла японскую Квантунскую армію. 2 верасня 1945 г. Японія падпісала Акт аб безумоўнай капітуляцыі, што азначала заканчэнне другой сусветнай вайны.

РАЗДЗЕЛ 11

БССР У ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1945—1991)

1. Беларусь на міжнароднай арэне

Пасля другой сусветнай вайны змянілася палітычнае становішча Беларусі. Яна была адноўлена ў рамках адзінай дзяржавы і пачала выходзіць на міжнародную арэну. Яшчэ на Тэгеранскай канферэнцыі трох вялікіх дзяржаў (лістапад — снежань 1943 г.) было прынята рашэнне аб заснаванні пасля вайны аўтарытэтнай міжнароднай арганізацыі, якая б вырашала важнейшыя праблемы сусветнага жыцця і выступала гарантам міру і бяспекі. Каб павялічыць свой уплыў на яе дзейнасць, урад СССР прапанаваў прызнаць паўнапраўнымі членамі новай арганізацыі ўсе рэспублікі Саюза. З мэтай юрыдычнага абгрунтавання гэтай прапановы 1 лютага 1944 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон аб пашырэнні паўнамоцтваў рэспублік у галіне знешніх зносін і абароны, у адпаведнасці з якім у сакавіку быў утвораны Народны камісарыят замежных спраў БССР (з 1946 г. — міністэрства). Аднак калі пытанне было вынесена на абмеркаванне на канферэнцыі ў Думбартан-Оксе (21 жніўня — 28 верасня 1944 г.), дзе распрацоўваўся праект Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, заходнія дзяржавы кваліфікавалі гэту прапанову СССР як памкненне да "шматлікага членства" з мэтай забеспячэння сабе пэўных пераваг. Прадстаўнікі ўрадаў ЗША і Англіі пагадзіліся толькі на запрашэнне ў ААН Украіны і Беларусі, улічваючы іх вялікі ўклад у разгром фашызму і панесеныя ў час вайны людскія ахвяры і матэрыяльныя страты. У красавіку 1945 г. Украіна і Беларусь атрымалі запрашэнне стаць дзяржавамі-заснавальнікамі ААН. 6 мая 1945 г. беларуская ўрадавая дэлегацыя на чале з наркамам замежных спраў К.В.Кісялёвым прыехала ў Сан-Францыска, дзе актыўна ўключылася ў работу. 26 чэрвеня 1945 г. яна разам з іншымі дэлегацыямі ад 49 краін свету падпісала Статут новай міжнароднай арганізацыі.

Членства ў ААН не прывяло да істотных змен у становішчы рэспублікі як унутры СССР, так і на міжнароднай арэне. Ва ўмовах сталінскага рэжыму ўся знешнепалітычная дзейнасць была манапалізавана саюзным урадам, а паміж рэспублікамі і цэнтрам адсутнічала размежаванне ў функцыях іх кампетэнцыі. Тым не менш удзел

Беларусі ў рабоце ААН меў станоўчае значэнне, бо садзейнічаў развіццю міжнародных сувязей і кантактаў, набыццю дыпламатычнага вопыту і культуры.

Ужо на першай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, якая пачала сваю работу ў студзені 1946 г., дэлегацыя БССР выступіла з ініцыятывай аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў. Яна прапанавала ўсім дзяржавам прыняць неадкладныя захады па арышту і дэпартацыі ваенных злачынцаў з мэтай іх справядлівага пакарання. На другой сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1947) Беларуская ССР была абрана на тры гады ў Эканамічны і Сацыяльны Савет — адзін з шасці галоўных органаў гэтай арганізацыі.

У першыя пасляваенныя гады Беларусь заключыла таксама шэраг пагадненняў з замежнымі краінамі. У верасні 1944 г. паміж урадам БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення было падпісана пагадненне аб абмене насельніцтвам. Што датычылася дагавора аб савецка-польскай мяжы, ён быў заключаны 16 жніўня 1945 г. без удзелу ўпанаважаных прадстаўнікоў БССР. У выніку рэспубліка страціла 17 раёнаў Беластоцкай вобласці з Беластокам і тры раёны Брэсцкай вобласці і атрымала ўзамен з польскага боку 15 вёсак, якія былі населены пераважна беларусамі. У 1946 г. дэлегацыя БССР прымала ўдзел у Парыжскай мірнай канферэнцыі, дзе актыўна выступала ў абмеркаванні тэрытарыяльных і рэпарацыйных пытанняў у пасляваеннай Еўропе. 10 лютага 1947 г. міністр замежных спраў БССР К.В.Кісялёў падпісаў у Парыжы дагавор аб міры з былымі саюзнікамі фашысцкай Германіі — Балгарыяй, Італіяй, Румыніяй, Венгрыяй і Фінляндыяй.

Пачынаючы з 1947 г. міжнародная дзейнасць Беларусі фактычна абмяжоўваецца ўдзелам у рабоце ААН. Гэта было звязана з тым, што ў першае пасляваеннае дзясяцігоддзе ўзнікла і абвастрылася "халодная вайна". Трыбуна ААН стала актыўна выкарыстоўвацца ў супрацьстаянні паміж Захадам і Усходам. Не маючы рэальнай самастойнасці ў міжнародных справах, беларускія дыпламаты вымушаны былі толькі выступаць у падтрымку маскоўскіх прапаноў. Негатыўны адбітак на міжнародныя справы нанесла і ўзмацніўшаяся падазронасць да ўсіх, хто меў кантакты з іншаземцамі, бо ў канцы 40 — пачатку 50-х гадоў праходзіла кампанія па барацьбе з касмапалітамі і нізкапаклонствам перад Захадам. У выніку ў 1944 — 1955 гг. БССР падпісала толькі 30 дагавораў, пагадненняў,

канвенцый і ўступіла ў Міжнародны саюз электрасувязі і Сусветны паштовы саюз (1947), Сусветную метэаралагічную арганізацыю (1948), Міжнародную арганізацыю працы (1954) і інш.

Больш спрыяльныя магчымасці для ажыццяўлення міжнароднай дзейнасці БССР узнікаюць у другой палове 50-х гадоў. Змякчэнне міжнароднай напружанасці і пераход савецкага кіраўніцтва на шлях актыўнага супрацоўніцтва з ААН і яе арганізацыямі садзейнічалі таму, што саюзныя рэспублікі атрымалі больш правоў і паўнамоцтваў. У 1958 г. было адкрыта пастаяннае прадстаўніцтва Беларускай ССР пры ААН, што дазволіла ёй актывізаваць сваю работу.

Па-ранейшаму дэлегацыя Беларусі адстойвала ў ААН лінію на ўмацаванне міру і бяспекі, ліквідацыю каланіялізму, развіццё раўнапраўнага эканамічнага супрацоўніцтва. Пры яе актыўным удзеле ў 1960 г. была прынята Дэкларацыя ААН аб наданні незалежнасці каланіяльным народам і краінам, што садзейнічала развіццю нацыянальна-вызваленчага руху. Яна выступала супраць лакальных войнаў, удзельнічала ў абмеркаванні праблем аб усеагульным і поўным раззбраенні. У 1963 г. у ліку першых БССР падпісала ў Маскве дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, космасе і пад вадой. У 1970 г. быў ратыфікаваны дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Беларуская ССР абіралася непастаянным членам Савета Бяспекі, яе прадстаўніцтвы дзейнічалі ў спецыялізаваных органах ААН, такіх, як ЮНЕСКА (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукцыі, навукі і культуры), МАГАТЭ (Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі) і інш. К сярэдзіне 80-х гадоў рэспубліка падпісала больш за 160 дагавораў і пагадненняў, што яскрава сведчыла аб узмацненні яе міжнароднага аўтарытэту.

У 50-я гады атрымалі развіццё двухбаковыя сувязі паміж Беларуссю і краінамі — членамі СЭУ. Геаграфічнае становішча, блізкасць да еўрапейскіх краін, зручныя шляхі зносін, а таксама наяўнасць пэўнай культурнай супольнасці славянскіх народаў прадвызначылі пашырэнне кантактаў перш за ўсё з Польшчай, Балгарыяй і Чэхаславакіяй. Калі напачатку яны развіваліся на міждзяржаўным узроўні, то затым даволі хутка выйшлі на рэгіянальны. У 1956 г. Гродзенская і Брэсцкая вобласці заключылі пагадненні аб супрацоўніцтве з Беластоцкім і Люблінскім ваяводствамі. У 1985 г. ужо ўсе вобласці Беларусі мелі сістэматычныя

кантакты на аснове дагавораў з 10 ваяводствамі Польшчы, дзвюма акругамі ГДР, акругай Балгарыі і вобласцю Чэхаславакіі.

Пэўны імпульс для далейшага развіцця ў пасляваенны перыяд атрымала эканамічнае супрацоўніцтва з замежнымі краінамі. Маштабы знешнеэканамічных сувязей Беларусі вызначаліся яе прамысловым і навукова-тэхнічным патэнцыялам, а таксама агульным станам эканамічных адносін СССР з замежнымі дзяржавамі. Таму напачатку ў пастаўках на экспарт пераважала галоўным чынам сыравіна. З сярэдзіны 50-х гадоў пачалі вывозіцца машыны і абсталяванне. У 1956 г. звыш 100 беларускіх прадпрыемстваў пастаўлялі сваю прадукцыю 47 краінам свету. К 1985 г. іх колькасць узрасла да 300, а пастаўкі ішлі больш чым у 100 краін свету. Асаблівым попытам за мяжой карысталіся трактары, грузавыя аўтамабілі, сіласаўборачныя камбайны, калійныя ўгнаенні, тавары шырокага ўжытку. Аднак удзельная вага машын і абсталявання, нягледзячы на даволі высокі ўзровень прамысловага развіцця БССР, нават у лепшыя гады не перавышала 30 %. Гэта тлумачылася тым, што ў міжнародным гандлёвым абмене ў рэспубліцы адсутнічала самастойнасць і ўсе экспартна-імпартныя аперацыі вызначаліся саюзнымі міністэрствамі. Большая частка тавараў накіроўвалася краінам — членам СЭУ, каля 10 % прыходзілася на краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, каля 20% — на краіны Захаду.

Прыкладна ў такіх жа памерах вызначаліся імпартныя паступленні. Амаль палова з іх прыходзілася на краіны СЭУ, каля 40 % — на развітыя краіны Захаду і 10 % — на астатнія. За кошт імпартных аперацый у рэспубліку завозіліся тэхналагічныя лініі і абсталяванне, тавары шырокага ўжытку.

Беларусь падтрымлівала ў пасляваенныя гады культурныя і навуковыя сувязі з замежнымі краінамі. Яны ажыццяўляліся дзяржаўнымі ўстановамі і творчымі саюзамі, шматлікімі партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі, працоўнымі калектывамі. Значны ўплыў на іх развіццё аказалі Беларускае таварыства культурных сувязей, якое ў 1958 г. было рэарганізавана ў Беларускае таварыства дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі, Беларускае таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за мяжой (таварыства "Радзіма"). Пры іх непасрэдным удзеле адбываўся навуковы і культурны абмен, наладжваліся вы-

ставы, гастрольныя паездкі, праводзіліся кінафестывалі, арганізоўваліся міжнародныя сустрэчы і кангрэсы.

Інтэнсіўна праходзіў літаратурны абмен. У 1946 – 1985 гг. за мяжой былі надрукаваны 342 асобныя кніжкі 55 беларускіх пісьменнікаў, якія знаёмілі чытача з духоўнымі набыткамі беларускага народа. Значную вядомасць атрымалі творы Я.Купалы, Я.Коласа, Я.Брыля, В.Быкава, А.Адамовіча, Н.Гілевіча, І.Мележа, У.Караткевіча і іншых аўтараў. Творы замежных пісьменнікаў у сваю чаргу перакладаліся на беларускую мову.

У рамках міждзяржаўных пагадненняў паглыбляліся навуковыя сувязі, асабліва з краінамі СЭУ. Адбываўся абмен навуковай інфармацыяй. Беларускія вучоныя ўдзельнічалі ў кангрэсах, сімпозіумах, канферэнцыях, выязджалі за мяжу ў працяглыя камандзіроўкі.

Аднак практычныя выпікі навуковых і культурных сувязей з замежнымі краінамі не адпавядалі патрабаванням часу. Адсутнасць рэальнага суверэнітэту і самастойнасці Беларусі стрымлівала пашырэнне міжнародных кантактаў, што ў сваю чаргу ўплывала на яе сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё.

2. Развіццё эканомікі

Распачатая гітлераўскай Германіяй вайна нанесла Беларусі велізарныя людскія і матэрыяльныя страты. Загінуў амаль кожны трэці жыхар Беларусі. БССР страціла больш паловы нацыянальнага багацця. Па агульнаму ўзроўню развіцця эканомікі рэспубліка была адкінута да 1928 г., поўнасцю ці часткова разбураны гарады і больш за 9000 сельскіх населеных пунктаў. Пасля вызвалення Беларусі ўрад БССР патрабаваў ад Германіі выплаты рэпарацыі на суму 1 млрд 500 млн амерыканскіх долараў, што складала каля 10 % ад панесеных Беларуссю страт (была выплачана толькі нязначная частка).

У межах планавай сістэмы, панаваўшай у СССР, аднаўленне народнай гаспадаркі БССР меркавалася завяршыць на працягу чацвёртага пяцігадовага плана (1946 – 1950). Акцэнт быў зроблены на паскораным аднаўленні торфаздабычы, энергетыкі і развіцці машынабудавання, стварэнні такіх галін прамысловасці, якіх раней на Беларусі не існавала: аўтамабілебудаванне, трактарабудаванне і інш. Паварот у бок вытворчасці сродкаў вытворчасці

вызначаўся імкненнем кіраўнікоў БССР направіць развіццё беларускіх гарадоў па традыцыйным для Расіі шляху індустрыяльных цэнтраў, жаданнем прыцягнуць праз будаўніцтва новых прадпрыемстваў асігнаванні на жыллёвае будаўніцтва і сацыяльнае забеспячэнне, змяненнем геапалітычнага становішча Беларусі (савецкія войскі знаходзіліся ужо ў цэнтры Еўропы). Гэта, аднак, натыкнулася на істотныя цяжкасці з забеспячэннем кваліфікаванымі рабочымі кадрамі і будаўнічымі матэрыяламі.

Такія галіны прамысловасці БССР, як машынабудаванне і металаапрацоўка, аднаўляліся і развіваліся ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе вельмі хутка. Дзякуючы іх росту амаль у 2,5 раза ў параўнанні з 1940 г. прамысловасць рэспублікі ў 1950 г. перавысіла даваенны ўзровень на 20 %. Але перакос у бок вытворчасці сродкаў вытворчасці прывёў да таго, што ў заняпадзе засталіся традыцыйныя для Беларусі лёгкая, харчовая галіны, прамысловасць будаўнічых матэрыялаў. Абсталяванне прадпрыемстваў адзначаных галін фізічна і маральна састарэла, не адпавядала патрабаванням навукова-тэхнічнага прагрэсу. Гэта адбівалася на забеспячэнні насельніцтва самым неабходным.

На працягу гэтага перыяду цяжкім заставалася становішча ў сельскай гаспадарцы і не толькі з прычыны велізарных страт падчас вайны. Пасляваенная індустрыялізацыя БССР вялася ў многім за кошт сельскай гаспадаркі. Адбылося вяртанне да калгаснай сістэмы, хоць для гэтага не існавала ні матэрыяльна-тэхнічных перадумоў (большасць МТС засталася без тэхнікі), ні жадання беларускіх вяскоўцаў (многія з іх спадзяваліся, што калгасы пасля вызвалення будуць распушчаны). Тым калгасам, дзе добра працавалі і мелі станоўчыя вынікі, адпаведна павялічвалі нормы абавязковых нарыхтовак сельгаспрадукцыі. Зверху загадвалі, што, дзе, калі і як сеяць, колькі мець жывёлы (хоць вызначальныя памеры не заўсёды адпавядалі запасу кармоў). Сельгасарцелі мелі велізарныя выдаткі на вытворчыя патрэбы, прадавалі сваю прадукцыю намнога ніжэй сабекошту і ў выніку захоўвалі мізэрны фонд заработнай і натуральнай платы. Таму энтузіязм асобных працаўнікоў вёскі слаба падмацоўваўся матэрыяльнымі стымуламі. Вытворчасць жа асабістых гаспадарак (якія ў першыя пасляваенныя гады давалі да 80 % жывёлагадоўчай прадукцыі) стрымлівалася наяўнасцю жорсткай

падатковай сістэмы (абкладаліся кожны кусцік, кожнае дрэўца, кожная галава жывёлы), якая не толькі забірала ўсе прыбыткі, але часам прымушала красці, каб не памерці з голаду.

Істотна пагоршыла сітуацыю ў сельскай гаспадарцы рэспублікі масавая калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі. Стварэнне першых калгасаў пачалося тут яшчэ на пачатку другой сусветнай вайны. Пасля яе заканчэння ў першыя гады сістэма савецкай улады ў Заходняй Беларусі была яшчэ недастаткова моцнай. Складанай заставалася сітуацыя ў суседней Польшчы. Але ў лютым 1949 г. прымаецца канчатковае рашэнне на XIX з'ездзе КПБ, у выніку чаго за два гады была загнана (часткова заахвочана) у калгасы большасць сялянскіх гаспадарак гэтага рэгіёна Беларусі. Адначасова адбывалася ссяленне хутароў, што разам са зменай традыцыйных форм гаспадарання нанесла адчувальны ўдар па сельскагаспадарчай вытворчасці. Прымусовы характар гэтага мерапрыемства, наяўнасць асобных узброеных банд і груп прывялі да значных ахвяр і рэпрэсій у Заходняй Беларусі.

Па сутнасці сельскагаспадарчая палітыка, якую праводзілі ўлады на Беларусі ў першыя пасляваенныя гады, завяршылася банкруцтвам. Нягледзячы на павелічэнне пагалоўя жывёлы ў калгасах да 1950 г. у параўнанні з даваенным узроўнем на 1/3, мяса было атрымана амаль на столькі ж менш, чым у 1940 г. Вытворчасць малака не дасягнула і 60 % даваеннага ўзроўню. Нават такі экстэнсіўны паказчык, як аб'ём пасяўных плошчаў, не быў выкананы. І калі б адзначанае можна было аднесці да вынікаў вайны, то з гэтага пункту гледжання цяжка растлумачыць зніжэнне сельскагаспадарчай вытворчасці ў 1950 – 1952 гг. (усе паказчыкі былі ніжэйшымі, чым у першы пасляваенны 1946 г). Са зменай кіраўніцтва СССР у 1953 г. рабіліся адпаведныя захады, каб палепшыць сітуацыю ў сельскай гаспадарцы: былі павялічаны закупачныя цэны і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі, спісана запазычанасць з калгасаў, а самае галоўнае – зменена сістэма падаткаабкладання асабістага надзелу вяскоўца (больш пачалі плаціць з памеру зямельнай плошчы, а не з таго, што на ёй вырошчвалася). Гэта, безумоўна, мела станоўчыя вынікі.

З сярэдзіны 1950-х гадоў у свеце разгарнулася навукова-тэхнічная рэвалюцыя, якая адкрывала магчымасці комплекснай аўтаматызацыі вытворчасці, выкарыстання

ЭВМ, новых крыніц энергіі, матэрыялаў і г.д. Гэта не магло не закрануць і эканоміку СССР, а разам з тым і БССР. Пераважнае развіццё атрымалі галіны прамысловасці, якія вызначалі тэхнічны прагрэс: прыборабудаванне, радыётэхнічная, хімічная, нафтахімічная, паліўна-энергетычная. Першы ў гісторыі СССР сямігадовы план (дадаткова да пяцігодкі два гады папярэдняй — 1959 — 1965 гг.) у пэўнай ступені ўлічваў тэндэнцыі сусветнага развіцця, але рабілася гэта недастаткова паслядоўна і энергічна, шляхам колькаснага нарошчвання вытворчасці ў вядомых ужо галінах, што ў рэшце рэшт адбілася на ўзроўні навукова-тэхнічнага развіцця. Разам з тым па тэмпах развіцця прамысловасць БССР пераўзыходзіла агульнасаюзныя паказчыкі.

У першай палове 1950-х гадоў было завершана будаўніцтва і ўступілі ў строй дзеючых у Мінску падшыпнікавы, гадзіннікавы, радыятарны заводы, адзін з буйнейшых у Еўропе камвольны камбінат, шэраг прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. К канцу 1950-х гадоў магчымасці экстэнсіўнага развіцця былі вычарпаны. Пошук новых шляхоў стымулявання вытворчасці (у межах адміністрацыйна-камандная сістэмы), у прыватнасці, знайшоў сваё ўвасабленне ў законе "Аб далейшым удасканаленні арганізацыі кіравання прамысловасцю і транспартам" (май 1957 г.).

Кіраўніцтва прамысловасцю праз саўнаргасы па тэрытарыяльнай адзнацы першапачаткова адыграла пэўную станоўчую ролю. Перш за ўсё гэта выявілася ў павышэнні ролі мясцовых органаў, у разбурэнні ведамасных перашкод у межах беларускага эканамічнага раёна. Саўнаргасы садзейнічалі лепшаму выкарыстанню мясцовых рэсурсаў, узмацненню спецыялізацыі і кааперавання прамысловых вытворчасцей па ўзбуйненню дробных прадпрыемстваў, арганізацыі вытворчых аб'яднанняў (фірма "Прамень" у 1963 г. у Мінску).

У 1961 — 1964 гг. хуткімі тэмпамі развівалася цяжкая прамысловасць, асабліва машынабудаванне і металаапрацоўка. Мінскі аўтамабільны завод пачаў выпускаць галоўным чынам 6—7-тонныя бартавыя машыны, самазвалы і цягачы. Вытворчасць аўтамабіляў грузападымальнасцю 25 т і больш была сканцэнтравана на Беларускім аўтамабільным заводзе ў Жодзіне, дзе ў 1959 г. пачаўся іх серыйны выпуск. На Мінскім трактарным заводзе з 1963 г. пачалася вытворчасць новага трактара МТЗ-50. Па эксплу-

атацыйных якасцях ён перасягаў папярэднія маркі машын і не ўступаў лепшым замежным узорам трактароў свайго класа.

У Беларусі з'явіўся новы від транспарту — трубаправодны. Узніклі і новыя галіны прамысловасці: радыёэлектронная, электратэхнічная, кабельная, нафтаперапрацоўчая, дакладнае прыборабудаванне, вытворчасць сінтэтычных смол. На аснове Старобінскага радовішча калійных соляў, прывазных кольскіх апатытаў і прыроднага газу з Украіны ў рэспубліцы пачала стварацца буйная база па вытворчасці мінеральных угнаенняў.

Разам з тым недастатковая ўвага да развіцця лёгкай прамысловасці з боку партыйных і гаспадарчых кіраўнікоў прадвызначыла яе адставанне. З 1962 г. назіраецца зніжэнне ўсіх паказчыкаў прамысловай вытворчасці, асноўнай прычынай якога было вычарпанне экстэнсіўных шляхоў развіцця.

З 1953 па 1958 г. павялічылася вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі. Тут мелі найбольшае значэнне два фактары:

1) стымуляванне калгасна-саўгаснай вытворчасці;

2) зніжэнне падатковага прэса з адзінаасобных гаспадарак.

Да пачатку 1960-х гадоў назіраецца зніжэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчай прадукцыі, павялічваецца яе сабекошт. Каб выканаць даведзеныя ў тонах паказчыкі, у многіх калгасах і саўгасах пашыраюць пасевы менш каштоўных збожжавых і зернебабовых культур (жыта, гароху, кукурузы) за кошт грэчкі. Былі вычарпаны і магчымасці нарошчвання жывёлагадоўчай прадукцыі шляхам росту пагалоўя. На становішчы спраў у сельскай гаспадарцы Беларусі ў першай палове 1960-х гадоў у значнай ступені адбілася паспешлівасць у рэарганізацыі МТС. Большасць калгасаў, не маючы магчымасці выкупіць адразу ўсю тэхніку, вымушана была пазычаць грошы ў дзяржавы. Істотную небяспеку для сельскай гаспадаркі ўяўляла таксама кампанія па ліквідацыі асабістых гаспадарак, што разгарнулася пад лозунгам непасрэднага пераходу да камунізму.

Пагаршэнне становішча спраў у вытворчасці тавараў масавага попыту і ў сельскай гаспадарцы абвастрыла сацыяльныя канфлікты ў рэспубліцы. Адзначалася ўзросшая колькасць выпадкаў адмаўлення ад работы, і ў вышэйшых эшалонах улады ўсё больш усведамлялася неабходнасць

паступовага пераходу да эканамічна абгрунтаваных метадаў кіравання.

Першапачаткова эканамічная рэформа ўкаранялася толькі на добра развітых у тэхнічных адносінах і высокарэнтабельных прадпрыемствах. У 1967 г. была зроблена спроба распаўсюдзіць яе на цэлыя галіны прамысловасці.

Пасля пераходу на новыя ўмовы планавання і эканамічнага стымулявання пачынаюць прыкметна павялічвацца фонды сацыяльна-культурных мерапрыемстваў і жыллёвага будаўніцтва. З гэтых сродкаў штогод асігнаваліся вялікія сумы на пабудову кватэр для рабочых і служачых, дзіцячых устаноў, набыццё санаторных пуцёвак, арганізацыю культмасавай работы і г.д.

Правядзенне эканамічнай рэформы дало моцны штуршок развіццю прамысловасці, аднак закранула ў самой эканамічнай сістэме толькі знешнюю структуру. Саўнаргасы былі заменены міністэрствамі, скарацілася іх колькасць, але ўяўленне неабходнасці цэнтралізаванага планавання аб'ёмных заданняў і арыентацыя на іх перавыкананне працягвалі дзейнічаць. Рэформа не закранула пытання аб функцыяніраванні грамадскай уласнасці, паколькі лічылася, што ў існуючым выглядзе яна стварае ўсё неабходнае для паспяховага развіцця народнай гаспадаркі. Не падтрыманая палітычнай рэформай эканамічная не была даведзена да заканчэння. Але сітуацыя не была асабліва востpай і крытычнай, паколькі значная частка экстэнсіўных фактараў яшчэ працягвала дзейнічаць і з улікам гэтага захоўвалася магчымасць падтрымліваць пэўны эканамічны рост да сярэдзіны 70-х гадоў.

Вызначаўся шэраг мерапрыемстваў па стымуляванню калгасна-саўгаснай вытворчасці. Была спісана запазычанасць за купленую ў крэдыт тэхніку, зменена сістэма падаходнага абкладання калгасаў, якая істотна знізіла іх фінансавыя абавязкі перад дзяржавай. Значная частка калгасаў поўнасцю вызвалялася ад выплаты падатку. Зацвярджаліся пяцігадовыя планы закупкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Той яе часткай, якая заставалася пасля выканання дзяржаўнага плана, распараджаліся калгасы і саўгасы. Беларусі быў даведзены план штогадовых закупак збожжа у памеры 250 тыс. т — на 77 тыс. т менш, чым было прададзена ў 1964 г. Акрамя таго, уводзіліся новыя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю, павялічаныя ў сярэднім больш чым на

50 %, а на прадаваемую прадукцыю звыш плана — яшчэ на 50 %.

Быў вызначаны курс на спецыялізацыю і канцэнтрацыю жывёлагадоўлі. Аднак пры будаўніцтве адкормачных комплексаў з самага пачатку па-за ўвагай апынуліся экалагічныя праблемы. У шэрагу раёнаў рэспублікі спецыялізацыя жывёлагадоўлі праводзілася без уліку прыродна-эканамічных умоў кожнай гаспадаркі, без адпаведнай падрыхтоўкі, дэкрэтавалася зверху.

У 1970 г. 80 % таварнай прадукцыі саўгасаў і больш за 60 % гэтай прадукцыі калгасаў складала жывёлагадоўчая. Адной з прычын яе нізкай рэнтабельнасці быў перш за ўсё недахоп фуражнага збожжа. Таму важнае значэнне набывала спецыялізацыя ў насенняводстве. Пашырыліся пасевы тэхнічных культур, асабліва льну.

Вынікам з'явілася істотнае (амаль у два разы) павышэнне вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі.

Вялікі размах капітальнага будаўніцтва пры адсутнасці істотных рэзерваў будаўнічых матэрыялаў, рабочых рук, гіпертрафіраванае пераразмеркаванне ў развіцці вытворчасці сродкаў вытворчасці і няўвага да вытворчасці прадметаў спажывання — вось характэрныя заганы эканомікі Беларусі другой паловы 70-х гадоў, віною якіх быў па-ранейшаму галоўны манапаліст — дзяржава. Ужо ў гэтыя гады зніжаюцца ўсе асноўныя паказчыкі (сярэднегадавыя тэмпы росту прадукцыйнасці працы з 8,6 % у 1970 — 1975 гг. да 4,5 % у 1976 — 1980 гг.).

Яшчэ большым адставаннем тэхнічнага ўзроўню Беларусі ад дасягненняў прамыслова развітых краін характарызуецца пачатак 80-х гадоў. У 1982 г. сярэднегадавы прырост нацыянальнага даходу паменшыўся да рэкордна нізкага ўзроўню — 3,4 %.

З сярэдзіны 1970-х гадоў паступова складвалася неўспрымальнасць калгасна-саўгаснай сістэмы да радыкальных змен. Калі ў перыяд з другой паловы 50-х да канца 60-х гадоў шэраг колькасных і якасных паказчыкаў працоўнай, грамадскай і палітычнай актыўнасці вяскоўцаў сведчыў аб тым, што ў многіх з іх пачуццё гаспадара канчаткова згублена не было, то ў 70 — 80-я гады ілюзіі развеяліся. Безгаспадарнасць, адсутнасць ініцыятывы станавіліся характэрнымі рысамі дзейнасці большасці сельскагаспадарчых калектываў. У 1985 г. у сярэднім кожны калгас выдаткоўваў на аплату працы больш, чым атрымлівалі валавога даходу.

Адчужэнне працаўніка ад зямлі і вынікаў сваёй працы паскорыла працэс міграцыі з вёскі ў горад. З 1970 па 1984 г. сельскае насельніцтва ў БССР паменшылася амаль у 1,5 раза.

Пэўныя спробы паляпшэння спраў у сельскай гаспадарцы мелі месца ў 1982 г. Была ліквідавана запазычанасць калгасаў дзяржаве, павышаны закупачныя цэны. Аднак дыктат распарадчых органаў над непасрэднымі вытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі захоўваўся. Не адбылося істотных змен і ў сферы матэрыяльнага заахвочвання калгаснікаў. Таму небяспечныя тэндэнцыі, што выявіліся яскрава ў канцы 70 — пачатку 80-х гадоў, працягвалі дзейнічаць. Узрастаў сабекошт прадукцыі жывёлагадоўлі (з 1971 па 1984 г. амаль у два разы). К 1985 г. каля 90 % патрэб у кармах з ліку збожжавых забяспечвалася ў БССР на аснове імпарту гароху і сорга з Аргенціны, жыта і ячменю з Канады і Францыі, кукурузы з ЗША і нават аўса са Швецыі. Як вынік у ліпені 1988 г. 1 кг камбікармоў каштаваў больш за 1 кг хлеба.

Між тым для насельніцтва суседніх рэспублік Беларусь у сярэдзіне 80-х гадоў заставалася крыніцай у сэнсе забяспечанасці харчовымі і прамысловымі таварамі, аднак гэта тлумачылася адносна іншых рэспублік больш нізкім узроўнем заработнай платы.

У сувязі з велізарным капітальным будаўніцтвам яшчэ больш вострай стала жыллёвая праблема. Асабліва нецярпімае становішча склалася ў бытавым абслугоўванні.

Вынікам падзення жыццёвага ўзроўню насельніцтва рэспублікі з'явіўся забастовачны рух, што пачаўся на шэрагу прадпрыемстваў. Так, у 1979 г. на заводзе "Гомсельмаш", а ў 1980 г. на трактарным заводзе і радыёзаводзе ў Мінску ўспыхнулі забастоўкі, выкліканыя зніжэннем расцэнак. Рабочым удалося адстаяць частку сваіх патрабаванняў.

З 1985 г. эканоміка рэспублікі развівалася ва ўмовах вызначанага партыйным кіраўніцтвам курсу на паскарэнне, якое меркавалася ажыццяўляць на аснове фарсіраванага развіцця машынабудавання. У далейшым вызначыліся такія прыярытэтныя накірункі, як пашырэнне правоў прадпрыемстваў, іх самастойнасці, укараненне гаспадарчага разліку, што азначала пераход ад адміністрацыйных да пераважна эканамічных метадаў кіравання.

Аднак усе мерапрыемствы закончыліся распадам Савец-

кага Саюза. Шэраг распрацаваных праграм, якія былі вызначаны і ў рэспубліцы ("Інтэнсіфікацыя", "Жыллё" і г.д.), засталіся на паперы. Асобныя эксперыменты па пашырэнню гаспадарчага разліку (на чыгуначным транспарце і іншых галінах) таксама не прынеслі жаданых вынікаў. Беларусь, пераўтвораная ў абарончы цэх былога СССР, засталася па сутнасці без рынку збыту прадукцыі для значнай часткі сваіх прадпрыемстваў. Цяжкія выпрабаванні выпалі на долю беларускага народа і ў сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС. Акрамя велізарных эканамічных страт (10 гадавых рэспубліканскіх бюджэтаў), яе вынікі для здароўя насельніцтва з'яўляюцца непрадбачанымі. Радыеактыўнае забруджанне ахапіла пятую частку тэрыторыі рэспублікі, дзе жыло больш за 2 млн чалавек. З гаспадарчага абароту былі выведзены сотні тысяч гектараў ворыўных зямель, што абумовіла значны недабор сельскагаспадарчай прадукцыі.

Разам з тым у азначаны перыяд адбываліся пошукі новых форм інтэграцыі прадпрыемстваў, арганізацыі працы і яе стымулявання.

3. Грамадска-палітычнае жыццё

Заканчэнне вайны парадзіла вялікія надзеі ў грамадстве. Сярод насельніцтва ўзніклі таксама спадзяванні на перамены ў палітычным жыцці, бо многія пачалі ўжо задумвацца над будучым лёсам сацыялізму. Аснову "крытычнай масы" складалі былыя ўдзельнікі вайны, інтэлігенцыя, моладзь, якія ўносілі прапановы аб неабходнасці рэфармавання палітычнай сістэмы і структуры ўлады ў краіне. Выказваліся думкі аб абмежаванні тэрмінаў знаходжання на выбарных пасадах, увядзенні спаборніцтва кандыдатаў пры выбарах у Саветы, недапушчальнасці падмены палітычнага кіраўніцтва адміністрацыйным. Але стыхійны пратэст супраць панаваўшай сістэмы, які ішоў знізу, хутка пачаў згасаць, бо перамогу атрымала жорсткая лінія, накіраваная на ўзмацненне таталітарызму.

На Беларусі, як і па ўсёй краіне, поўнасцю захавалася старая палітычная сістэма, у якой адміністрацыйныя функцыі ажыццяўляла камуністычная партыя. Нягледзячы на тое, што адразу пасля вайны адбылася справаздачна-выбарная кампанія і змянілася партыйнае кіраўніцтва, метады яе работы засталіся нязменнымі. На кіруючыя пасады прыз-

пачаліся асобы, якія раней да Беларусі ніякіх дачыненняў не мелі. У 1953 г. толькі 62,2 % кіраўнікоў рэспубліканскай партыйнай арганізацыі складалі прадстаўнікі карэннай нацыянальнасці. Першымі сакратарамі ЦК кампартыі Беларусі ў 1945 — 1956 гг. з'яўляліся П.Панамарэнка, М.Гусараў, М.Патолічаў, якіх сюды накіравалі з Масквы. У такіх умовах узмацнялася жорсткая партыйная цэнтралізацыя, што ўплывала на грамадска-палітычнае жыццё.

Саветы як органы дзяржаўнай улады павінны былі займацца аднаўленнем народнай гаспадаркі і паляпшэннем умоў жыцця. Аднак яны поўнасцю знаходзіліся пад кантролем партыйнага апарату і рэальнай уладай не валодалі. Вярхоўны Савет БССР дзейнічаў намінальна. Усе заканадаўчыя акты і ўказы, перш чым прымаліся, праходзілі экспертызу ў ЦК КП(б)Б. Парадак работы сесій, пытанні, якія выносіліся на абмеркаванне, працэдура і ход выбараў, кандыдатуры будучых дэпутатаў таксама ўзгадняліся. На адбыўшыхся ў першыя пасляваенныя гады выбарах у Вярхоўны Савет СССР (1946), у Вярхоўны Савет БССР (1947) і мясцовыя Саветы (1948) амаль поўнасцю змяніўся дэпутацкі корпус. Аднак нават Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР М.Наталевіч (1947 — 1948) і В.Казлоў (1948 — 1968) першымі асобамі ў рэспубліцы не з'яўляліся, хоць і займалі пэўнае месца на партыйнай іерархічнай лесвіцы.

Спецыфічнай заставалася роля прафсаюзаў, камсамола і іншых грамадскіх арганізацый, якія ўваходзілі ў палітычную сістэму. Часта яны займаліся не ўласцівымі ім функцыямі, выконвалі волю ўлады і мабілізоўвалі насельніцтва на выкананне чарговых задач.

У такіх умовах грамадска-палітычнае жыццё вызначалася ўсеагульнай рэгламентацыяй і татальным кантролем, было жорстка звязана з сістэмай і падпарадкоўвалася ёй. Як толькі ўзнікала небяспека, сістэма заўсёды ўключала ахоўныя механізмы — пачыналіся масавыя рэпрэсіі.

Такая палітыка не спынялася на Беларусі ў першыя пасляваенныя гады і мела тэндэнцыю да пашырэння. Рэпрэсіўны апарат НКУС лічыў, што ўсе, хто знаходзіўся ў час вайны на акупіраванай тэрыторыі і не прымаў удзелу ў партызанскай барацьбе, з'яўляюцца здраднікамі. Таму ў турмы без усякіх падстаў трапілі многія партызанскія сувязныя, падпольшчыкі і ваеннапалонныя. Адбыліся паўторныя арышты асоб, якія былі асуджаны раней і ўжо панеслі пакаранне. Рабочыя і сяляне за дробныя ўчынкі

караліся турмамі і лагерамі. Асабліва напружанае становішча склалася ў Заходняй Беларусі, дзе пасля вайны дзейнічалі атрады Арміі Краёвай і праходзіла калектывізацыя. Менавіта тут НКУС бачыла "гняздо нацыяналізму і кулацтва" і недавер распаўсюджваўся на ўсё насельніцтва. Махавік рэпрэсій быў спынены толькі пасля смерці Сталіна ў 1953 г.

Пачатая лібералізацыя, а таксама вызначаны курс на правядзенне палітыкі рэформ і аздараўленне маральна-палітычных абставін у краіне выклікалі вялікія надзеі ў грамадстве на хуткія перамены. У рэспубліцы аднаўлялася сацыялістычная законнасць, шырокія памеры набыла рэабілітацыя ахвяр культу асобы Сталіна. Адначасова ажыццяўляліся рэформы, якія былі накіраваны на ўдасканаленне палітычнай сістэмы і дэмакратызацыю.

У дзейнасці кампартыі Беларусі, прафсаюзаў, камсамола паглыблялася калегіяльнасць і рабіліся пэўныя захады да пашырэння ўдзелу працоўных у іх рабоце. У 1962 г. адбылася перабудова грамадскіх і дзяржаўных арганізацый Беларусі па вытворчаму прынцыпу. Аднак калі высветлілася, што гэта рэарганізацыя не прынесла станоўчых вынікаў, у 1964 г. быў адноўлены тэрытарыяльна-вытворчы прынцып іх пабудовы. Змены закранулі і органы дзяржаўнай улады. У 1957 г. была прынята пастанова, накіраваная на паляпшэнне дзейнасці Саветаў у эканоміцы і грамадска-палітычным жыцці. У выніку Саветы атрымалі больш шырокія правы. У практыцы іх работы, асабліва пасля 1961 г., вялікае значэнне набылі шматлікія камісіі, да ўдзелу ў якіх на грамадскіх пачатках прыцягваліся прадстаўнікі рабочых, сялянства і інтэлігенцыі.

Вялікую ролю ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач і ў грамадска-палітычным жыцці адыгрывала сацыялістычнае спаборніцтва. Абвешчаны пераход да пабудовы камунізму выклікаў уздым творчай актыўнасці мас і ўзнікненне руху за камуністычныя адносіны да працы. У 1962 г.у ім удзельнічалі 395,5 тыс. чалавек, больш за 35 тыс. перадавікоў сталі ўдарнікамі камуністычнай працы. Але ў спаборніцтве з'явіліся і негатыўныя моманты, асабліва тады, калі яно пачало выводзіцца за межы вытворчасці і матэрыяльнага інтарэсу. Даволі хутка ўлады ператварылі яго ў рашаючы фактар грамадскага жыцця і фарміравання новага чалавека. Гэта стрымлівала актыўнасць людзей і параджала настрой абыякавасці.

Прагрэсіўныя з'явы ў грамадска-палітычным жыцці не

былі працяглымі і скончыліся тым, што ў другой палове 60-х гадоў узмацніліся кансерватыўныя тэндэнцыі. На змену "адлізе" прыйшла эпоха "застою". Гэта стала магчымым не столькі таму, што адбыліся змены ў кіраўніцтве дзяржавай, колькі ў выніку супярэчнасці паміж дэмакратызацыяй і захаванай палітычнай сістэмай. Паварот у грамадскім жыцці вызначыўся перш за ўсё ў тым, што адбылася кансервацыя сфарміраваных за дзесяцігоддзі форм эканамічнай, дзяржаўнай і грамадска-палітычнай дзейнасці. Убачыўшы безвыніковасць хуткага "скачка ў камунізм", кіраўніцтва дзяржавы вылучыла канцэпцыю развітога сацыялізму. Яна была падмацавана вывадамі аб павышэнні вядучай і накіроўваючай ролі партыі ў жыцці грамадства, узмацненні яго сацыяльнай аднароднасці і пашырэнні калектывізму. З'явілася новае тэарэтычнае палажэнне аб тым, што пачаўся інтэнсіўны працэс інтэграцыі нацый у новую гістарычную супольнасць – савецкі народ. Велічны размах набылі шматлікія ідэалагічныя кампаніі, якія асабліва пампезна праходзілі ў час распрацоўкі і прыняцця Канстытуцыі СССР (1977) і Канстытуцыі БССР (1978). Але пры адсутнасці дэмакратычных свабод і ўзмацненні партыйнага бюракратызму ўсё гэта выклікала ў народа апатыю і песімізм.

Толькі ў часы перабудовы ў рэспубліцы пачалі ажыццяўляцца пэўныя захады да дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця. Значную ролю ў гэтым працэсе адыграла публічнасць. На старонках газет і часопісаў, у тэле- і радыёперадачах разгарнулася небывалая па маштабу палеміка аб умовах грамадскага жыцця, шляхах аднаўлення сацыялізму і паскарэння эканамічнай рэформы. Вялікую зацікаўленасць выклікалі працэсы дэсталінізацыі грамадства і пазбаўлення яго ад дэфармацый культу асобы і рэцыдываў у 70 – 80-я гады. Сродкі масавай інфармацыі паступова падрыхтавалі ў грамадстве думку аб тым, што лёс і паглыбленне перабудовы будуць немагчымыя без рэформы палітычнай сістэмы, якая пачалася ў 1988 г.

Поспех рэформы ў значнай ступені залежаў ад таго, як хутка і ў якім накірунку адбудзецца дэмакратызацыя партыі. Трэба адзначыць, што напачатку ў дзейнасці кампартыі Беларусі з'явіліся некаторыя змены. У партыйных камітэтах былі скасаваны гаспадарча-галіновыя аддзелы і пачалося ўвядзенне ратацыі кадраў. У мэтах пашырэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі былі ўведзены выбары на альтэрнатыўнай аснове, рабіліся захады па пашырэнню

правоў пярвічных арганізацый. Аднак, як паказалі далейшыя падзеі, у прыватнасці XXXI з'езд КПБ (1990), у камуністаў адсутнічала дакладная праграма партыйнага развіцця. У часы жнівеньскага путчу КПБ прадэманстравала сваю поўную немагчымасць падтрымаць прагрэсіўныя пераўтварэнні ў грамадстве, і Вярхоўны Савет РБ 25 жніўня 1991 г. прыпыніў яе дзейнасць.

Важнае значэнне ў рэформе палітычнай сістэмы атрымала аднаўленне поўнаўладдзя Саветаў. Яны павінны былі пашырыць свой уплыў на ўсе бакі кіравання, палепшыць структуру і функцыяніраванне ўсяго дзяржаўнага апарату. У сакавіку 1989 г. адбыліся выбары народных дэпутатаў СССР, якія ў адрозненне ад мінулых гадоў прайшлі на альтэрнатыўнай аснове. У сакавіку 1990 г. па-новаму былі праведзены выбары ў Вярхоўны Савет і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў БССР. У выніку значна абнавіўся дэпутацкі корпус і палепшылася яго работа. Вярхоўны Савет Беларусі разгарнуў вялікую заканадаўчую дзейнасць, накіраваную на рэфармаванне эканомікі, палітычнай сістэмы, усяго ладу жыцця. Былі распрацаваны і прыняты шматлікія законы, у тым ліку аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь, аб уласнасці і пераходзе да рынку, аб арэндзе, прыватызацыі жылля, адукацыі і пенсійным забеспячэнні працоўных.

У адпаведнасці з рэформай палітычнай сістэмы ў 1990 г. быў прыняты закон СССР аб грамадскіх арганізацыях, згодна з якім насельніцтва атрымала правы на стварэнне суполак і таварыстваў, а таксама палітычных партый. Трэба адзначыць, што гэты закон вельмі спазніўся, бо ў рэспубліцы значна раней пачалі ўзнікаць шматлікія нефармальныя аб'яднанні па вывучэнню літаратурнай і гістарычнай спадчыны, краязнаўству і асабістых інтарэсах. У чэрвені 1989 г. арганізацыйна аформіўся грамадска-палітычны рух Беларусі — Народны фронт "Адраджэнне", пасля чаго працэс утварэння новых палітычных партый і аб'яднанняў стаў інтэнсіўна нарастаць. У 1991 г. заявілі аб сабе Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі, Беларуская сялянская партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада, Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі, рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Рух за дэмакратычныя рэформы".

Утварэнне палітычных партый і аб'яднанняў сведчыла пра глыбокія пераўтварэнні ў грамадскім жыцці і развіцці дэмакратыі. Нягледзячы на невялікі колькасны склад, яны

садзейнічалі ўзнікненню ў рэспубліцы парламенцкай апазіцыі, пашырэнню правоў грамадзян, плюралізму мыслення, пошуку падыходаў да вырашэння складаных праблем грамадскага жыцця.

4. Адукацыя, навука і культура

Адраджэнне культурнага жыцця на Беларусі адбывалася ў надзвычай складаных умовах. Па-першае, за гады вайны амаль поўнасцю была знішчана матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў навукі, адукацыі і культуры, многія навукоўцы загінулі, не хапала выкладчыкаў. У школах вучыліся чытаць па старых газетах, іх жа выкарыстоўвалі ў якасці сшыткаў, мелам з'яўляўся звычайны вугаль, а чарніла выраблялася з сажы. На аднаўленне ўстаноў адукацыі кіраўніцтва Саюза і БССР выдзяляла вялікія сродкі, істотную дапамогу аказвалі іншыя рэспублікі СССР, перш за ўсё РСФСР. Міністэрства асветы апошняй даслала беларускім школам каля 10 млн падручнікаў, звыш 3 млн сшыткаў, на мільярд рублёў іншага абсталявання. З дапамогай ВНУ Масквы ля сталіцы СССР на станцыі Сходня з восені 1943 г. аднавіў сваю дзейнасць БДУ.

Асаблівыя цяжкасці прыйшлося пераадолець у Заходняй Беларусі, дзе па сутнасці нанава стваралася сетка беларускіх навучальных устаноў. Шмат хто з настаўнікаў, якія працавалі тут у гады вайны, пакінулі радзіму, іншыя трапілі ў савецкія турмы ці загінулі. Нават хуткатэрміновыя настаўніцкія курсы адразу не дапамаглі вырашыць гэту праблему. Ускладнялі справу і насцярожаныя адносіны сялянства да савецкай улады, наяўнасць узброеных фарміраванняў. Аднак сумесныя намаганні дазволілі ўжо з 1949/50 навучальнага года перайсці да ўсеагульнага сямігадовага навучання на Беларусі.

У 1944 — 1945 гг. вышэйшыя навучальныя ўстановы вяртаюцца на радзіму: у жніўні 1944 г. — Белдзяржуніверсітэт, восенню 1944 г. — Мінскі, Віцебскі, Магілёўскі, Гомельскі і Гродзенскі педагагічныя інстытуты і шэраг настаўніцкіх інстытутаў, пачаўся навучальны год у Белдзяржкансерваторыі, мінскіх медыцынскім, юрыдычным, фізкультурным інстытутах. Ужо ў 1947 г. перавысіў па колькасці студэнтаў даваенны ўзровень Беларускі політэхнічны інстытут. У 1950 г. у БССР мелася 29 вышэйшых навучальных устаноў, больш за 100 тэхнікумаў. Хутка

аднаўлялася матэрыяльна-тэхнічная база акадэмічнай навукі, перавысілі даваенны ўзровень колькасць навукова-даследчых устаноў, выпуск газет, часопісаў і інш. Ужо ў 1946 г. у рэспубліцы дзейнічала 12 тэатраў.

Разам з тым у другой палове 40 — пачатку 50-х гадоў развіццё навукі і культуры наткнулася на жорсткі ідэалагічны прэс. Ва ўмовах узмацнення супрацьстаяння дзвюх супердзяржаў — СССР і ЗША, а таксама недаверу да насельніцтва вызваленай тэрыторыі (асабліва інтэлігенцыі) пачалася далейшая ідэалагізацыя ўсіх сфер жыцця. Вызначаўся дакладны падзел розных галін навукі, культуры на "наша — сацыялістычнае" і "іх — капіталістычнае". Гэта дазваляла той навуковай шэрасці, што была адцеснена падчас вайны, аднавіць і пашырыць свае пазіцыі. Так, у біялогіі пачалі чарговы наступ прыхільнікі Т.Лысенкі. На Беларусі ім супрацьстаяла школа генетыкаў, якую ўзначальваў А.Жэбрак. З пяці вядомых свету відаў цвёрдай пшаніцы тры былі выведзены ў яго лабараторыі генетыкі і цыталогіі. У маі 1947 г. А.Жэбрак быў абраны прэзідэнтам АН БССР, але ўжо ў снежні гэтага ж года ён вызваляецца з пасады, не выбіраецца нават у акадэмікі, а галоўнае — на доўгі час забараняецца ў рэспубліцы развіццё цэлага напрамку ў біялагічнай навуцы. Прысланы на месца прэзідэнта АН БССР М.Грашчанкоў, магчыма, шмат зрабіў для станаўлення нейрахірургіі ў БССР, аднак лічыў немэтазгодным развіццё фундаментальных даследаванняў у галіне фізікі, матэматыкі і іншых навук на Беларусі.

Ужо з 1946 г. пачалася, а з прызначэннем у 1947 г. першым сакратаром М.Гусарава ўзмацнілася (не без дапамогі яго намесніка па ідэалогіі М.Іаўчука) кампанія па барацьбе супраць "нізкапаклонства перад Захадам", супраць "беларускага нацыяналізму" і "бязроднага касмапалітызму". Жорстка крытыкаваліся палажэнне аб дзяржаўнасці Беларусі ў сярэднявеччы, аб "залатым веку" ў гісторыі беларускай культуры, погляды пра тое, быццам "святло культуры ішло з Захаду", і інш. Быў прыпынены выхад выпускаў "Гісторыі БССР", падрыхтаваных М.Нікольскім, К.Палікарповічам, А.П'янковым і іншымі вядомымі навукоўцамі, і пастаўлена задача напісаць новы, "сацыялістычны" падручнік, падрыхтаваны для школы Л.Абецэдарскім. Для кантролю над культурным жыццём Беларусі на пачатку 1947 г. у ЦК КП(б)Б быў утвораны аддзел культуры. Ён пільна сачыў за выкананнем дырэктыў

цэнтральных партыйных органаў па ідэалагічных пытаннях. У прыватнасці, было заслухана пытанне аб выкананні Саюзам пісьменнікаў БССР пастановы ЦК УКП(б) аб часопісах "Звязда" і "Ленінград" (ухіл ад сацыялістычнага рэалізму). "Карысныя" ў ідэалагічным накірунку творы заахвочваліся і маральна і матэрыяльна. У 1946 г. першым з беларускіх пісьменнікаў Сталінскай прэміі быў удастоены А.Куляшоў за паэму "Сцяг брыгады". У літаратуры не выпадкова пераважала тэма вайны, аднак у вялікіх эпічных творах пра гераізм народа часам губляўся канкрэтны жывы чалавек з яго перажываннямі, страхамі, болем. Да таго ж партыйныя цэнзары штурхалі пісьменнікаў, па сутнасці, да пэўнага ідэалагічнага класіцызму, дзе прысутнічалі б толькі дакладна станоўчыя "героі" і адмоўныя "ворагі". За адыход ад азначанай схемы крытыкаваліся п'есы "Мілы чалавек" К.Крапівы, "Заложнікі" А.Кучара.

З развіццём беларускай драматургіі было цесна звязана адраджэнне тэатра на Беларусі. Ідэалагічны дыктат не перашкодзіў творчасці такіх выдатных акцёраў, як Г.Глебаў, Б.Платонаў, С.Станюта і інш. Тэатр оперы і балета ўжо ў 1945 г. распачаў работу над операй Я.Цікоцкага "Алеся" (у першым варыянце "Дзяўчына з Палесся"), дзе галоўную ролю выканала выдатная беларуская спявачка Л.Александроўская. Ствараюцца новыя музычныя калектывы, у прыватнасці ў 1952 г. пачаў выступленні Дзяржаўны народны хор БССР на чале з Г.Цітовічам. Але і кампазітараў вучылі, што пісаць. У 1948 г. быў асуджаны "фармалістычны","антынародны напрамак" у музыцы, да якога прылічылі Дз.Шастаковіча, С.Пракоф'ева, А.Хачатурана. На Беларусі пачаліся нападкі на оперу Я.Цікоцкага "Алеся", Першую сімфонію П.Падкавырава. На пачатку 50-х гадоў быў асуджаны як "югаслаўскі шпіён" міністр асветы БССР П.Саевіч, што меў мужнасць заступіцца за родную беларускую мову, былі арыштаваны і высланы паэт С.Грахоўскі, таленавіты празаік Б.Мікуліч і інш.

У меншай ступені ідэалагічны дыктат закрануў выяўленчае мастацтва. Тут таксама пераважала гераіка-патрыятычная тэматыка, найперш тэма партызанскага руху (Я.Ціхановіч, У.Сухаверхаў). Вызначальны манументалізм характэрны для вядомага жывапісца Я.Зайцава ("Парад беларускіх партызан у 1944 г. у Мінску", "Стаяць насмерць", "Канстанцін Заслонаў"), В.Волкава ("Мінск 3 ліпеня 1944 г."), І.Ахрэмчыка ("Абаронцы Брэсцкай крэпасці"). Гістарычны жанр абмяжоўваўся пераважна пар-

20. Зак. 5396.

тыйна-рэвалюцыйнай тэматыкай. Манументалізм заўважаны таксама ў архітэктуры Беларусі гэтага часу, у прыватнасці ў кампазіцыі Прывакзальнай плошчы, Ленінскага праспекта (зараз Ф.Скарыны). Будынкі ўзводзіліся пераважна па індывідуальных праектах, упрыгожваліся дэкорам, скульптурамі, прысутнічалі элементы ілжэкласіцызму (Галоўпаштамт, Палац культуры Белсаўпрофа і інш.). У гэты час сталі вядомы скульптар З.Азгур, архітэктары А.Воінаў, У.Кароль, М.Паруснікаў.

Такім чынам, разбурэнні, нанесеныя вайной, ідэалагічны дыктат абмяжоўвалі магчымасці развіцця беларускай культуры, але спыніць гэты працэс цалкам не змаглі.

Развіццё адукацыі ў адзначаны перыяд характарызуецца спробамі шматлікіх рэформ і рэарганізацый. Напрыклад, у 1958 г. у рэспубліцы замест усеагульнага абавязковага сямігадовага навучання ўводзілася васьмігадовае, у сярэдняй школе – адзінаццацігадовы тэрмін з абавязковым вытворчым навучаннем. Аднак у 1964 г. школы зноў былі пераведзены на дзесяцігадовы тэрмін навучання. У канчатковым выніку такая структура захавалася на працягу дваццаці гадоў – да 1984 г., калі перайшлі на сістэму навучання з шасцігадовага ўзросту і адбылося вяртанне да адзінаццацігадовага тэрміну навучання. Характэрнай рысай сярэдняй адукацыі ў перыяд з 1977 г. з'яўляўся яе абавязковы характар. У 1950 – 1980-я гады пачалі працаваць новыя вышэйшыя навучальныя ўстановы: Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, Мінскі радыётэхнічны інстытут, адбылося адкрыццё Гомельскага і Гродзенскага дзяржаўных універсітэтаў і інш.

Характэрная рыса навукі гэтага часу – развіццё фундаментальных даследаванняў. Пачатак гэтаму паклаў вядомы ў свеце беларускі біёлаг В.Ф.Купрэвіч, яго справу прадоўжыў М.А.Барысевіч, які з 1969 па 1985 г. з'яўляўся прэзідэнтам Акадэміі навук Беларускай ССР. Вядомы даследчык у галіне спектраскапіі, люмінісцэнцыі і квантавай электронікі, ён у 1992 г. быў выбраны членам Еўрапейскай акадэміі навук, мастацтваў і славеснасці (яе сапраўднымі членамі да гэтага часу былі толькі пяць чалавек з былога Саюза ССР). Рэспубліка ператварылася ў краіну з велізарным навуковым патэнцыялам, аднак укараненне распрацовак у жыццё адбывалася надзвычай марудна.

Развіццё літаратуры з сярэдзіны 1950-х гадоў вызначалася сцвярджэннем новай плыні. У ваеннай прозе галоўнай

тэмай становіцца чалавек на вайне. Псіхалагічная насычанасць характарызуе творы В.Быкава ("Альпійская балада", "Жураўліны крык", "Трэцяя ракета" і інш.), І.Навуменкі, І.Чыгрынава. Дакументальнай праўдзівасцю і эмацыянальнай усхваляванасцю ўражваюць кнігі А.Адамовіча ("Хатынская аповесць", "Вайна пад стрэхамі" і інш.), С.Алексіевіч ("У вайны не жаночы твар"), "Ваенныя дзённікі" І.Мележа. Гістарычная тэма ў беларускай прозе знайшла сваё яркае ўвасабленне ў творах Уладзіміра Караткевіча. Яго вядомыя раманы "Дзікае паляванне караля Стаха", "Чорны замак Альшанскі" і іншыя лепш за многія даследаванні садзейнічалі выхаванню цікавасці да вывучэння беларускай гістарычнай спадчыны. Традыцыі, закладзеныя У.Караткевічам, прадоўжылі К.Тарасаў, В.Іпатава, К.Дайнека і інш.

У жанры паэзіі вызначыліся цікавымі творамі П.Броўка, П.Панчанка, П.Глебка, Н.Гілевіч, Р.Барадулін, А.Лойка і многія іншыя.

Беларуская драматургія папоўнілася выдатнымі п'есамі К.Крапівы, А.Макаёнка, А.Дударава. Пастаноўка п'есы маладога беларускага драматурга А.Дударава "Радавыя" ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я.Купалы была адзначана Дзяржаўнай прэміяй СССР 1985 г.

Гісторыка-рэвалюцыйнай тэме ў кінамастацтве прысвечаны фільмы старэйшага беларускага кінарэжысёра В.Корш-Сабліна "Першыя выпрабаванні", "Масква — Генуя", "Крушэнне імперыі". Шырокай папулярнасцю ў гледача карысталіся фільмы аб вайне "Альпійская балада", "Бацька" (рэжысёр В.Сцяпанаў), "Паланез Агінскага", "Іван Макаравіч" (рэжысёр І.Дабралюбаў), фільмы В.Турава, дзе здымаўся вядомы акцёр і спявак У.Высоцкі.

Шырокую вядомасць набыў Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета. Оперы "Алеся" Я.Цікоцкага, "Зорка Венера" Ю.Семянякі, "Альпійская балада" Я.Глебава, "Пасля балю" Я.Вагнера памножылі скарбонку сусветнай музычнай класікі. Тое ж можна сказаць аб пастаноўках балетаў народнага артыста БССР В.Елізар'ева ("Стварэнне свету" А.Пятрова і інш.). У папулярызацыі беларускай музыкі цяжка пераацаніць ролю ансамбля "Песняры" пад кіраўніцтвам У.Мулявіна. Яго намаганні памножылі ансамблі "Верасы", "Сябры", вакальна-харэаграфічны ансамбль "Харошкі".

Увогуле з пачатку 1960-х гадоў пачынаецца абнаўленне беларускага мастацтва. Прыход у мастацтва моладзі прад-

вызначыў імкненне да перадачы рэчаіснасці ва ўсёй яе шматграннасці — з драматызмам і гераізмам. Беларусь перажывала своеасаблівы культурны ўздым, важнейшай падзеяй стала адкрыццё Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Дамінуючай тэндэнцыяй у мастацтве становіцца манументалізм. У жанры скульптуры гэта прадвызначыла з'яўленне мемарыяльных комплексаў "Хатынь" (С.Селіханаў), "Прарыў" (А.Анікейчык), "Брэсцкая крэпасць-герой" (кіраўнік творчага калектыву А.Кабальнікаў), Курган Славы Савецкай Арміі (А.Бембель, А.Арцімовіч).

У другой палове 50 — 80-х гадоў на Беларусі з'яўляюцца новыя гарады Салігорск, Наваполацк, Светлагорск, узнікаюць новыя жылыя раёны ў Мінску — Зялёны Луг, Серабранка, Усход, Чыжоўка. Сярод найбольш важных грамадскіх збудаванняў можна адзначыць будынкі гасцініц "Кастрычніцкая", "Планета", Тэатра музычнай камедыі, гандлёвага цэнтра "Камароўскі рынак" і інш. У 1977 — 1984 гг. была пабудавана першая лінія Мінскага метрапалітэна.

1960 — 1980-я гады — гэта час імклівага развіцця радыё, кіно, тэлебачання. Завяршылася радыёфікацыя населеных пунктаў. Ужо да пачатку 1970-х гадоў дзейнічала адзіная сістэма тэлебачання.

Адной з важнейшых падзей у культурным жыцці рэспублікі стала стварэнне выдавецтва "Мастацкая літаратура" (1972), на якое ўскладалася задача выпуску літаратуры на беларускай мове.

Разам з тым трэба падкрэсліць, што ў 1970 — 1980-х гадах пошукі новага часам сутыкаліся з рэальнасцю палітычнага жыцця, якое вызначала межы дазволенага ў мастацтве. Многія няздзейсненыя мары пісьменніка У.Караткевіча, трагічны лёс мастака А.Ісачова і шэрагу іншых — яркае таму пацвярджэнне. У гэты перыяд партыйным кіраўніцтвам праводзіліся і шырокамаштабныя мерапрыемствы з мэтай узмацнення кантролю над культурным жыццём рэспублікі. У прыватнасці, у красавіку 1974 г. была прынята пастанова "Аб далейшым павышэнні дзейнасці ідэйна-палітычнай работы ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС". Многія дзеячы культуры і навукі Беларусі крытыкаваліся, былі названы "нацыяналістамі".

РАЗДЗЕЛ 12

РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ (1991 – 1995)

1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі". Дзяржаўны суверэнітэт сцвярджаўся дзеля свабоднага развіцця і дабрабыту, годнага жыцця кожнага грамадзяніна рэспублікі на аснове забеспячэння правоў асобы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР і яе міжнароднымі абавязацельствамі. Вярхоўны Савет абвясціў суверэнітэт як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць у знешніх адносінах.

Адпаведна Дэкларацыі, Беларусь – суверэнная дзяржава, якая ўсталявана на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу. Грамадзяне Беларусі ўсіх нацыянальнасцей складаюць беларускі народ, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы.

Абвяшчэнне суверэнітэту Беларусі, як і суверэнітэту іншых рэспублік СССР, было пошукам новых форм сувязей паміж імі, спробай пераўтварэння нацыянальна-дзяржаўных адносін. Неабходнасць захавання сувязей была пацверджана ў ходзе рэферэндуму аб лёсе Саюза ССР у сакавіку 1991 г. У БССР за захаванне Саюза ССР прагаласавала 82,7% насельніцтва.

25 жніўня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў пакет рашэнняў аб незалежнасці, палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларусі. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі быў нададзены статус канстытуцыйнага закона.

Міністэрства ўнутраных спраў БССР і Камітэт дзяржаўнай бяспекі БССР з саюзна-рэспубліканскіх устаноў былі пераўтвораны ў рэспубліканскія ўстановы. У сувязі з фактычным роспускам КПСС дзейнасць КПБ на тэрыторыі Беларусі была прыпынена. Вярхоўны Савет прыняў рашэнне аб дэпартызацыі органаў дзяржаўнай улады і кіравання, дзяржаўных прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

19 верасня 1991 г. на сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі былі зацверджаны назва — Рэспубліка Беларусь, герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг. Пры зацвярджэнні дзяржаўнага герба і дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь органы ўлады зыходзілі з традыцыі некалькіх стагоддзяў нацыянальнай сімволікі. Герб "Пагоня" з'яўляецца старадаўнім гербам Вялікага Княства Літоўскага і Рускага (Беларуска-Літоўскай дзяржавы), канчаткова зацверджаным у XIY ст. Аднак "Пагоня" мае яшчэ больш старажытнае, беларускае паходжанне, з'яўляецца старадаўнім гербам Полацкага княства — першай дзяржавы на тэрыторыі Беларусі.

"Пагоня" — сімвал усеагульнай барацьбы з іншаземнымі захопнікамі, за выгнанне іх са сваёй зямлі. Бела-чырвона-белы сцяг з'яўляўся вайсковым сцягам беларускіх воінаў у сярэднявеччы. З навуковага гістарычнага пункту гледжання герб "Пагоня" і бела-чырвона-белы сцяг з'яўляюцца адзіна нацыянальнымі і, такім чынам, дзяржаўнымі сімваламі незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Важнейшы крок да сапраўднай незалежнасці рэспублікі быў зроблены 8 снежня 1991 г., калі ў рэзідэнцыі Віскулі ў Белавежскай пушчы кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны падпісалі пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). У іх заяве было адзначана, што перагаворы аб падрыхтоўцы новага Саюзнага дагавора зайшлі ў тупік, аб'ектыўны працэс выхаду рэспублік з саставу СССР і ўтварэння незалежных краін стаў рэальным фактам. Недальнабачная палітыка цэнтра прывяла да глыбокага эканамічнага і палітычнага крызісу, развалу вытворчасці, катастрафічнага зніжэння жыццёвага ўзроўню ўсіх слаёў грамадства. Рост сацыяльнай напружанасці ў многіх рэгіёнах былога СССР прывёў да міжнацыянальных канфліктаў са шматлікімі чалавечымі ахвярамі. Усведамляючы адказнасць перад сваімі народамі і сусветным згуртаваннем у практычным ажыццяўленні палітычных і эканамічных рэформ, кіраўнікі дзяржаў заявілі аб стварэнні СНД. Садружнасць адкрыта для далучэння ўсіх дзяржаў, якія падзяляюць мэты і прынцыпы пагаднення. Афіцыйным месцам знаходжання каардынацыйных органаў Садружнасці быў вызначаны Мінск.

10 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў пагадненне аб стварэнні СНД і прыняў рашэнне аб дэнансацыі Саюзнага дагавора 1922 г. 21 снежня ў Алма-Аце незалежныя дзяржавы Азербайджан, Арменія,

Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Малдова, Расійская Федэрацыя, Таджыкістан, Туркменія, Узбекістан і Украіна падпісалі Дэкларацыю аб утварэнні на роўных правах СНД, якая не з'яўляецца ні дзяржавай, ні наддзяржаўнай структурай. СССР спыніў сваё існаванне.

Беларуская дзяржава ўступіла ў новы этап свайго развіцця. Важнай задачай стала падрыхтоўка і прыняцце 15 сакавіка 1994 г. новай Канстытуцыі. Адпаведна Канстытуцыі, Рэспубліка Беларусь – унітарная дэмакратычная сацыяльна-прававая дзяржава. Найвышэйшай каштоўнасцю грамадства і дзяржавы з'яўляецца чалавек, а адзінай крыніцай дзяржаўнай улады – народ. Дзяржава грунтуецца на прынцыпе падзелу ўлад: заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады з'яўляецца прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнцкая форма дзяржаўнага кіравання прадугледжвае, што менавіта прэзідэнт фарміруе вышэйшы выканаўчы орган і нясе адказнасць за яго дзейнасць. Дзейнасць прэзідэнта рэгламентуецца Канстытуцыяй і законамі, яна падкантрольная толькі вышэйшаму заканадаўчаму органу – парламенту.

10 ліпеня 1994 г. першым прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь быў выбраны Аляксандр Лукашэнка. 20 ліпеня на сесіі Вярхоўнага Савета адбылася цырымонія ўступлення прэзідэнта на пасаду.

Крах таталітарнай палітычнай сістэмы і аб'яўленне Рэспублікай Беларусь свайго дзяржаўнага суверэнітэту змянілі яе становішча ў сістэме міждзяржаўных сувязей. Сёння Беларусь як самастойная дзяржава прызнана ўсімі буйнейшымі краінамі свету. Яна актыўна дзейнічае ў ААН, іншых міжнародных арганізацыях. Беларусь разам з іншымі краінамі стала сааўтарам дакументаў па праблемах раззбраення, умацаванню мер даверу, барацьбе з апартэідам. Прызнанне рэспублікай агульначалавечых каштоўнасцей, удзел у стварэнні ўсеагульнай сістэмы міжнароднай бяспекі прывялі да росту аўтарытэту Беларусі на міжнароднай арэне.

2. Знешняя палітыка Беларусі

Распад СССР абумовіў пачатак прынцыпова новага этапу ў знешнепалітычнай і міжнароднай дзейнасці Беларусі. Першым сур'ёзным крокам у напрамку да ста-

наўлення беларускай дзяржаўнасці і фарміравання яе незалежнага знешнепалітычнага курсу стала Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце. Яна замацавала за беларускім народам неад'емнае права на самавызначэнне, абвясціла незалежнасць рэспублікі ў галіне міжнародных зносін, імкненне стаць без'ядзернай зонай і нейтральнай дзяржавай. З набыццём дэкларацыяй канстытуцыйнага статусу ў жніўні 1991 г. Рэспубліка Беларусь прыступіла да ажыццяўлення самастойнай знешняй палітыкі.

У кастрычніку 1991 г. адбылася 46-я сесія Генеральнай Асамблеі ААН, на якой выступіў з дакладам міністр замежных спраў Беларусі П.К.Краўчанка. З трыбуны ААН было заяўлена, што асноўнымі прынцыпамі і прыярытэтамі новай дзяржавы з'яўляюцца дасягненне рэальнай незалежнасці, мабілізацыя міжнароднай падтрымкі ў вырашэнні чарнобыльскай праблемы, уключэнне ў агульнаеўрапейскі працэс, стварэнне ўмоў для фарміравання рыначнай эканомікі, гарантыі экалагічнай бяспекі і свабоднага ўзаемадзеяння культур. У выступленні падкрэслівалася, што асновай знешнепалітычнага курсу дзяржавы з'яўляюцца жыццёвыя інтарэсы беларускага народа.

Пачынаючы правядзенне сваёй незалежнай знешняй палітыкі, Рэспубліка Беларусь пацвердзіла прыхільнасць да прынцыпаў Статуту ААН, Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, далучылася да факультатыўнага пратакола Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які размешчаны ў Жэневе, у тых выпадках, калі парушаюцца правы асобы. Такая пазіцыя садзейнічала росту яе аўтарытэту на міжнароднай арэне і забяспечыла хуткае дыпламатычнае прызнанне. Па стану на жнівень 1994 г. яе прызналі 123 краіны свету, 97 з іх устанавілі дыпламатычныя адносіны.

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца паўнапраўным членам больш 60 міжнародных арганізацый, у 10 з іх яна мае статус наглядальніка. У 1991 — 1994 гг. падпісана больш за 300 пагадненняў і дагавораў па пытаннях знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці. За гэты час рэспубліка стала паўнапраўным удзельнікам Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Сярод дзяржаў СНД яна першай падпісала Парыжскую хартыю для новай Еўропы, увайшла ў Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк рэканструкцыі і развіцця.

Выконваючы ўзятыя на сябе абавязкі ў галінах бяспекі і раззбраення, Беларусь актыўна ўключылася ў перагавор-

ны працэс. Імкнучыся стварыць міжнародна-прававую базу пераходу да статуса без'ядзернай і нейтральнай дзяржавы, Вярхоўны Савет у 1992 г. ратыфікаваў дагаворы аб стратэгічных наступальных узбраеннях і аб нераспаўсюджанні ядзернай зброі. У адпаведнасці з падпісанымі пагадненнямі стратэгічныя ядзерныя сілы, якія былі размешчаны на тэрыторыі рэспублікі, перайшлі пад юрысдыкцыю Расіі і пачалі выводзіцца за яе межы. Беларусь абавязалася на працягу сямі гадоў поўнасцю пазбавіцца ад гэтага класа ўзбраенняў і па дамоўленасці з Расіяй скараціць тэрмін іх вываду. Ужо маецца рашэнне аб тым, што апошнія расійскія войскі пакінуць Беларусь у 1996 г. Тактычная ядзерная зброя вывезена за межы Беларусі ў 1992 г. Рэспубліка далучылася таксама і да дагавора аб звычайных узброеных сілах у Еўропе і прыступіла да яго выканання ў 1993 г. Прынцыповая і паслядоўная пазіцыя па вызначаных пытаннях была прадыктавана не ваеннымі, а палітычнымі меркаваннямі, што атрымала высокую адзнаку міжнароднага супольніцтва.

Якасна новы характар набылі ў апошнія гады знешнеэканамічныя сувязі Беларусі з замежнымі краінамі. Яны былі накіраваны на стварэнне спрыяльных умоў для ўсебаковага рэфармавання грамадства, глыбокіх пераўтварэнняў у эканоміцы і сацыяльнай сферы. Улічваючы свой эканамічны патэнцыял і геаграфічнае становішча, рэспубліка перш за ўсё імкнулася да паступовай інтэграцыі ў еўрапейскую і сусветную гаспадарку. Пашыраліся гандлёвыя адносіны з краінамі далёкага замежжа. Таварная наменклатура экспарту рэспублікі ўключала амаль 1000 найменняў, пастаўкі ў 1993 г. ажыццяўляліся ў 96 краін свету. Асноўнымі знешнеэканамічнымі партнёрамі Беларусі з'яўляліся еўрапейскія краіны, на долю якіх прыходзілася 70 % знешнегандлёвага абароту. Самыя актыўныя гандлёвыя сувязі падтрымліваліся з Аўстрыяй, Польшчай, Германіяй, ЗША, Вялікабрытаніяй, Італіяй, Турцыяй і Кітаем. У 1994 г. ЗША надалі Беларусі рэжым найбольшага спрыяння ў гандлі, а па аб'ёму тавараабароту сярод краін далёкага замежжа на першае месца выйшла Германія.

Важнае месца ў знешнеэканамічнай дзейнасці належала стварэнню сумесных з замежнымі фірмамі прадпрыемстваў і прыцягненню інвестыцый. У 1994 г. было зарэгістравана 1438 сумесных і 499 замежных прадпрыемстваў з 66 краін свету. Агульная сума замежных крэдытаў на сярэдзіну 1994

г. складала 1 млрд 49,5 млн долараў. З шэрагам развітых краін была заключана дамоўленасць аб абароне інвестыцый і ўстараненні двайнога падаткаабкладання. Але з іх дзейнічалі толькі два — з Германіяй і Швейцарыяй, што значна перашкаджала эканамічнаму супрацоўніцтву.

Паглыбленню знешнеэканамічных сувязей таксама перашкаджалі і неканкурэнтаздольнасць вырабаў беларускіх прадпрыемстваў, антыдэмпінгавыя квоты на калійныя солі і тэкстыль, імкненне замежных прадпрымальнікаў экспартаваць з Беларусі сыравіну і прадукты харчавання. У такіх абставінах асаблівае значэнне набывала праблема эфектыўнага выкарыстання традыцыйных рынкаў збыту ў Расіі і краінах СНД. Беларусь праводзіла курс на ўмацаванне эканамічнага ўзаемадзеяння краін СНД, фарміраванне ўсходнееўрапейскага рынку, развіццё ўсебаковых сувязей з Расіяй. Дзякуючы такім намаганням толькі на ліквідацыю вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС рэспубліка атрымала ад Расіі сродкаў у 10 разоў больш, чым ад усіх краін Заходняй Еўропы, ЗША і міжнародных арганізацый. Не выпадкова, што гэты накірунак у яе знешнеэканамічнай дзейнасці таксама быў прыярытэтным.

У грамадстве зараз існуюць розныя падыходы да вызначэння прыярытэтаў і напрамкаў у знешняй палітыцы Беларусі. Гэта звязана з тым, што яшчэ не распрацавана стратэгічная канцэпцыя міжнароднай дзейнасці, не акрэслены яе інтарэсы і мэты. У зацверджанай у сакавіку 1994 г. Канстытуцыі вызначаюцца толькі прынцыпы знешняй палітыкі. "Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы, — падкрэсліваецца ў Асноўным Законе, — зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў права". Вось чаму ад Вярхоўнага Савета, урада і прэзідэнта патрабуецца тэрміновая распрацоўка такога дакумента, у якім павінны знайсці адлюстраванне палітычныя, эканамічныя і гуманітарныя мэты знешняй палітыкі Беларусі.

3. Сацыяльна-эканамічны крызіс

Адлік часу Беларусь павінна была пачаць з 13 кастрычніка 1990 г., калі Вярхоўны Савет прыняў урадавую праграму пераходу да рыначнай эканомікі. У ёй было

аб'яўлена, што мы будуем нацыянальную самастойную эканоміку. У 1991 г. пасля абвяшчэння палітычнай і эканамічнай незалежнасці Беларусь атрымала магчымасць распачаць самастойныя эканамічныя рэформы. Пасля дэнансацыі Саюзнага дагавора і ўтварэння СНД унітарная гаспадарка былога Савецкага Саюза ператвараецца ў міжнародную эканамічную сістэму. Гэты факт патрабаваў новых падыходаў ва ўзаемаадносінах паміж былымі саюзнымі рэспублікамі ў сферы грашова-крэдытнай, гандлёвай, мытнай палітыкі.

Былі прыняты Дзяржаўная праграма па стабілізацыі эканомікі і сацыяльнай абароне насельніцтва, Дзяржаўная праграма прыватызацыі. Вярхоўны Савет прыняў шэраг законаў, накіраваных на рэфармаванне эканомікі. Сярод іх — законы аб уласнасці, аб Нацыянальным банку і банкаўскай дзейнасці, Мытны кодэкс, аб прадпрымальніцтве, аб дзяржпрадпрыемствах, аб праве ўласнасці на зямлю, аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці, аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкрутстве і інш. Законы стварылі базу для сацыяльна-эканамічнага суверэнітэту, увядзення рынкавых адносін і з іх дапамогай стабілізацыі, затым і павышэння эфектыўнасці гаспадаркі.

Аднак практычна ні адна з мэт не дасягнута. Рэальнымі вынікамі сталі эканамічны крызіс, крах крэдытна-фінансавай сістэмы, імклівы рост інфляцыі і катастрафічнае зніжэнне ўзроўню жыцця насельніцтва Беларусі. Год за годам становішча эканомікі не толькі не паляпшалася, але станавілася ўсё горшым.

Вынікі працы народнай гаспадаркі ў 1991 г. сведчылі аб крызісных з'явах у эканоміцы. Негатыўна паўплывалі разрыў гаспадарчых сувязей, парушэнне абавязкаў па пастаўках прадукцыі з іншых рэспублік. Асабліва востра становішча склалася з пастаўкамі ў рэспубліку сыравіны, матэрыялаў, машын і абсталявання, камплектуючых вырабаў. Крызісная сітуацыя склалася на спажывецкім рынку, узмацніўся ажыятажны попыт, абвастрыліся інфляцыйныя працэсы. Грамадзянам Беларусі выдалі так званыя візітныя карткі спажыўца для набыцця тавараў шырокага ўжытку, а для прадуктаў харчавання — талоны.

Нацыянальны прыбытак рэспублікі ў параўнанні з 1990 г. скараціўся на 3%, вытворчасць прамысловай прадукцыі — на 1,5, сельскагаспадарчай — на 3%. Зводны індэкс рознічных цэнаў склаў 210% пры росце грашовых прыбыткаў на 190%. На долю новых недзяржаўных структур з

улікам уласнасці насельніцтва прыходзілася прыкладна 4% кошту асноўных фондаў рэспублікі, 7% прадукцыі, якая выпускалася.

У 1992 г. нацыянальны даход знізіўся на 11% у параўнанні з 1991 г. Пры гэтым выпуск прадукцыі прамысловасці скараціўся на 9,4%, а ўвод жылля знізіўся да ўзроўню 1980 г. Знешнегандлёвы абарот склаў 1,8 млрд долараў ЗША і зменшыўся ў параўнанні з папярэднім напалавіну. Скарацілася паступленне тавараў і ў рознічную гандлёвую сетку: пастаўкі тавараў уласнай вытворчасці зменшыліся на 10%, паступленне з рэспублік былога СССР — у два, па імпарту — у тры разы. У выніку патрэбнасці насельніцтва ў многіх відах тавараў не задавальняліся.

У 1992 г. востра праявіліся праблемы ў грашова-фінансавай сферы. Не вызначыўшы самастойнай эканамічнай палітыкі, працягваючы выкарыстоўваць рубель у якасці плацежнага сродку, рэспубліка трапіла ў поўную залежнасць ад эканамічнай сітуацыі ў Расійскай Федэрацыі. Пасля жорсткіх мер, прынятых Цэнтральным банкам Расіі, паміж краінамі СНД узнік востры міждзяржаўны плацежны крызіс. Усе рэспублікі пачалі прымаць меры для абароны сваіх спажывецкіх рынкаў. З чэрвеня 1992 г. у Беларусі выпускаюцца ў абарачэнне ў якасці самастойнага плацежнага сродку разліковыя білеты Нацыянальнага банка.

У ліпені 1993 г. Расія ўвяла новыя ўзоры грошай. Адначасова сваёй акцыяй па спыненню існавання рублёвай зоны старога тыпу яна фактычна падштурхнула Беларусь на ўвядзенне сваёй нацыянальнай валюты. Пасля гэтага беларускае кіраўніцтва неаднаразова спрабавала вярнуць расійскі рубель. Быў падпісан шэраг пагадненняў аб аб'яднанні грашовых сістэм. Аднак нежаданне Расіі зрабіць канкрэтныя крокі дзеля рэалізацыі гэтых рашэнняў вымусіла Беларусь у 1994 г. аб'явіць разліковыя білеты Нацыянальнага банка адзіным плацежным сродкам на тэрыторыі рэспублікі.

Нарошчванне адмоўных тэндэнцый пацвярджалася перш за ўсё буйнамаштабным спадам вытворчасці. Пры гэтым ён насіў не структурны, а агульны характар і закранаў практычна ўсе гаспадарчыя галіны. Нацыянальны прыбытак Беларусі за 1993 г. знізіўся на 10 %. У 1994 г. у параўнанні з 1993 г. аб'ём валавога ўнутранага прадукту скараціўся ў параўнальных цэнах на 20%. Аб'ём дадатко-

вага кошту паменшыўся ў прамысловасці на 21%, у будаўніцтве — на 29, у сельскай гаспадарцы — на 14%.

Спад вытворчасці прывёў да павелічэння колькасці беспрацоўных. Калі ў канцы 1993 г. сацыяльны статус беспрацоўнага мелі 66,2 тыс. чалавек, дык на пачатак студзеня 1995 г. іх было 101 999 чалавек.

Прынцыповай праблемай, якая пагражае эканамічнай бяспецы Беларусі, з'яўляецца бесперапынна нарастаючая знешняя запазычанасць. Разам з працэнтамі яна ўжо наблізілася да 2 млрд долараў. Беларусь мае запазычанасць не толькі заходнім краінам, але і дзяржавам СНД, перш за ўсё Расіі, пазыка якой складае амаль 500 млн долараў. Агульная запазычанасць Беларусі з улікам працэнтаў па абслугоўванню знешняй пазыкі перавышае аб'ём ВВП у 1994 г.

Паводле ацэнкі лонданскага часопіса "Еўрамані", Беларусь па ступені рызыкі (эканамічнай, палітычнай і інш.) у канцы 1994 г. займала 138-е месца (для параўнання, Расія — 136-е) сярод 170 краін свету.

Адной з самых вострых праблем працягвае заставацца інфляцыя. Відавочна, што любая антыкрызісная праграма не дасць жаданых вынікаў, калі не спыніць інфляцыйны працэс. За 1994 г. агульны ўзровень інфляцыі ў Беларусі склаў 2599% (дзеля параўнання, на Украіне — 840%).

Галоўнымі генератарамі інфляцыі застаюцца аграрныя і ваенна-прамысловыя комплексы. Колькасць узброеных сіл рэспублікі ў 1992 г. склала 130 тыс. чалавек. З улікам стратэгічных сіл СНД, якія размешчаны на беларускай тэрыторыі, на 43 грамадзянскіх жыхароў прыпадае адзін вайсковец. Гэта найвышэйшы паказчык сярод усіх еўрапейскіх краін.

На патрэбы аграпрамысловага комплексу ў 90-я гады пайшло больш за 70% усіх крэдытаў. Пры гэтым вытворчасць ялавічыны з 1990 по 1995 г. знізілася на 36 %, свініны — напалову, збожжа — на 19 %, бульбы — на 29, цукровых буракоў — на 31, ільновалакна — на 14%. Катастрафічна зніжаецца ўрадлівасць зямель і прадуктыўнасць жывёлы. Асабліва вялікае падзенне назіраецца ў Віцебскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях. Калі не прыняць радыкальных мер, то сельская гаспадарка рэспублікі не зможа забяспечваць насельніцтва прадуктамі харчавання, а прамысловасць — сыравінай.

Складанае эканамічнае становішча непазбежна прывадзіла да падзення жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

Колькасць насельніцтва Рэспублікі Беларусь у студзені 1995 г. склала 10 346 тыс. чалавек і зменшылася за год на 21 тыс. Скарачаецца натуральны прырост насельніцтва. За 1994 г. колькасць народжаных паменшылася на 4% і склала 113 тыс. дзяцей, колькасць памерлых за год павялічылася на 0,7% (129 тыс. чал.). Паводле даных Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь, скарацілася міграцыя насельніцтва. Калі ў 1993 г. у краіну прыбылі 86 тыс. чалавек, а выбылі ў краіны бліжняга замежжа 47 тыс. чалавек, дык у 1994 г. прыбылі 45 тыс. чалавек, выбылі 49 тыс. чалавек.

Аднак у развіцці эканомікі ёсць і пэўныя станоўчыя вынікі. Ідзе фарміраванне элементаў рыначнай інфраструктуры, набіраюць моц новыя формы гаспадарання, паступова пачынае працаваць рыначны механізм попыту і прапаноў, развіваецца малы і сярэдні бізнес. Але станаўленню прыватнага сектара актыўна перашкаджаюць структуры ўлады, свядома ствараючы ўмовы для нераўнапраўнай канкурэнцыі з наменклатурным бізнесам.

Мала чым адрозніваецца ад папярэдніх і бюджэт на 1995 г., курс якога вызначаны ўрадам як "умеранае рэфарматарства". Зноў не вызначаны эканамічныя прыярытэты, значная частка асігнаванняў пойдзе на вырашэнне разавых праблем, не знойдзена магчымасць выдзялення сродкаў на выплату запазычанасці па крэдытах. 24% усіх сродкаў пойдуць на фінансаванне народнай гаспадаркі, 38% — на сацыяльную сферу, амаль 10% — на ліквідацыю вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, столькі ж — на ўтрыманне сілавых структур.

Асноўныя прычыны крызісу эканомікі заключаюцца ў наступным. Па-першае, тэхнічная адсталасць па сусветных мерках, нябачная пры замкнутай эканоміцы і танных рэсурсах, ва ўмовах набліжэння цэн на рэсурсы да сусветных прывяла да неканкурэнтаздольнасці значнай часткі беларускай прадукцыі і рэзкага скарачэння імпарту.

Па-другое, мілітарызацыя эканомікі рэспублікі, адсутнасць прадуманай канверсіі абароннай прамысловасці.

Па-трэцяе, комплекс праблем, звязаных з ліквідацыяй вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Па-чацвёртае, крызіс фінансавай сістэмы, прычынай якога сталі памылкі пры ўвядзенні нацыянальных разліковых білетаў, нярыначная крэдытная палітыка.

Па-пятае, разрыў сталых гаспадарчых сувязей з рэс-

публікамі былога СССР пры недастаткова наладжаных сувязях з іншымі дзяржавамі.

Па-шостае, нераспрацаваная заканадаўчая база пераходу да рынку. Адсутнасць навукова прадуманай, дакладнай праграмы гэтага пераходу.

Па-сёмае, карупцыя і некампетэнтнасць органаў улады практычна на ўсіх узроўнях.

Самай важнай прычынай з'яўляецца непаслядоўнасць эканамічнага курсу, адсутнасць у рэспубліцы глыбокіх эканамічных рэформ.

Шляхі да эфектыўнай рыначнай эканомікі вядомыя, яны ў многіх краінах прынеслі жаданыя вынікі. Выйсце з крызісу звязана з правядзеннем рашучай прыватызацыі: фарміраваннем слоя ўласнікаў, стварэннем стабільнай нацыянальнай фінансавай інфраструктуры, інтэграцыяй у сусветную эканоміку, стварэннем заканадаўчай базы лібералізацыі эканамічных адносін, справядлівай сістэмы сацыяльнай абароны.

Да гэтага часу не ўдалося пераадолець галоўныя негатыўныя тэндэнцыі ў эканамічным і сацыяльным развіцці рэспублікі. Улада не знайшла сіл і рашучасці пайсці па сапраўды рыначнаму шляху. Зараз эканоміка падышла да той мяжы, за якой рэзкі спад вытворчасці, масавае беспрацоўе, гіперінфляцыя. Такі курс затармазіў рэформы, расцягнуў на некалькі гадоў правядзенне неадкладных мер. Супярэчлівасць дзяржаўнага курсу дыскрэдытавала саму ідэю рэформ. Не курс рэформ прывёў да развалу эканомікі, а іх амаль поўная адсутнасць.

Эканоміка і грамадства Беларусі маюць далёка не выкарыстаны патэнцыял. Яны маюць магчымасць выйсці з таго цяжкага становішча, у якім знаходзяцца цяпер. Але для гэтага патрэбны сапраўдныя рэформы, накіраваныя на дабрабыт Беларусі, яе народа.

4. Культура Беларусі на сучасным этапе

Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця, абвяшчэнне дзяржаўнай незалежнасці рэспублікі, а таксама эканамічны крызіс вызначылі накірунак развіцця культуры Беларусі. У змяніўшыхся ўмовах выразна праявіліся новыя яе рысы: паступовае пераадоленне ідэалагічнага і дзяржаўнага кантролю ў культуры, пашырэнне недзяржаўных, альтэрнатыўных форм і жанраў развіцця культуры, здзяй-

сненне пэўных крокаў на шляху да нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі, вяртанне айчыннай гістарычнай спадчыны, скарачэнне ва ўмовах эканамічнага крызісу дзяржаўных выдаткаў на дзейнасць установ культуры, павелічэнне аб'ёму фінансавай падтрымкі з боку недзяржаўных структур. У сувязі з гэтым назіраецца заняпад устаноў навукі і культуры, якія арыентаваны выключна на дзяржаўныя датацыі.

26 студзеня 1990 г. прыняты Закон аб мовах у Беларусі, паводле якога беларуская мова набыла статус дзяржаўнай. Артыкулы закона ў карэктнай форме фармулююць мэты нацыянальнага адраджэння, пры гэтым не ўшчамляюцца правы нацыянальных меншасцей, рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін. Прадугледжваўся паступовы пераход на дзяржаўную мову ўстаноў навукі, культуры, сродкаў масавай інфармацыі — на працягу бліжэйшых трох гадоў, трох-пяці гадоў — для зацвярджэння беларускай мовы як рабочай мовы з'ездаў, канферэнцый, актаў органаў дзяржаўнай улады, пяці гадоў — для беларусізацыі мовы справаводства і сферы абслугоўвання, дзесяці — для мовы судовага справаводства і г.д. Пры падрыхтоўцы і папулярызацыі палажэнняў закона пасля яго прыняцця вялікую ролю адыграла Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны, установы з'езд якога адбыўся 27 чэрвеня 1989 г. Узначальвае гэту арганізацыю народны пісьменнік Беларусі Н.С.Гілевіч. Намаганнямі актывістаў ТБМ выдадзена шмат твораў беларускай гістарычнай спадчыны.

Ля вытокаў сучаснага нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі знаходзілася дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў гісторыка-культурнага і краязнаўчага напрамку. Шырокі рэзананс мела дзейнасць маладзёжных аматарскіх аб'яднанняў "Талака" ў Мінску, "Паходня" ў Гродне і інш. Актыўная грамадзянская пазіцыя гэтых суполак спалучалася з дзейсным удзелам у рэстаўрацыйных работах у Мінску, Гродне, Лідзе, Оршы і інш. 26 — 27 снежня 1987 г. пад Мінскам адбылася першая рэспубліканская нарада (Вальны сойм) беларускіх суполак, дзе шырока абмяркоўваліся вострыя пытанні беларускай гісторыі, культуры, экалагічнага становішча.

Заўважнай на рубяжы 80 — 90-х гадоў была грамадска-культурная дзейнасць Беларускага фонду культуры. З'явай стала правядзенне 9-га (1986) і 10-га (1990) з'ездаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Шырокую вядомасць атрымала згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына", якое

пачало сваю гісторыю ў верасні 1990 г. Намаганнямі найперш гэтай арганізацыі ў ліпені 1993 г. праведзены ў Мінску I з'езд беларусаў свету. На нацыянальна-культурнае адраджэнне Беларусі накіравана дзейнасць Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны, Беларускага краязнаўчага таварыства, створаных у канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў.

У 1990 г. у свеце шырока адзначана 500-годдзе з дня нараджэння беларускага асветніка і першадрукара Ф.Скарыны. Гэтаму юбілею была прысвечана святочная цырымонія ў Парыжы ў штаб-кватэры ЮНЕСКА.

Вяртанню гістарычнай памяці народа садзейнічае выданне часопіса "Спадчына", першы нумар якога выйшаў у верасні 1990 г., а таксама праца рэдакцый "Беларускага гістарычнага часопіса", "Беларускай мінуўшчыны" і інш. Адзінай на прасторах СНД па роду сваёй дзейнасці засталася рэдакцыя Беларускай энцыклапедыі. Яе намаганнямі ў першай палове 90-х гадоў выпушчаны першыя два тамы "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (1994), энцыклапедычныя даведнікі "Археалогія і нумізматыка Беларусі" (1993), "Беларуская мова" (1994), "Архітэктура Беларусі" (1993), "Францыск Скарына і яго час", першыя чатыры тамы біябібліяграфічнага слоўніка "Беларускія пісьменнікі" (1992 — 1994) і інш.

Дэмакратызацыя грамадскага жыцця спрыяла развіццю гуманітарнай навукі і адукацыі. Найбольш значныя поспехі зроблены ў беларусістыцы. Выйшлі ў свет і перавыдадзены дзесяткі даследаванняў па гісторыі і культуры Беларусі. Сярод іх працы А.І.Мальдзіса, А.С.Ліса, М.І.Ермаловіча, У.М.Конана, Г.А.Каханоўскага, А.А.Лойкі, Г.К.Кісялёва, М.В.Біча, Г.В.Штыхава і інш. Вялікая праца праводзіцца па перавыданню твораў рэпрэсіраваных навукоўцаў (А.Цвікевіч, М.Доўнар-Запольскі і інш.), пісьменнікаў, а таксама дзеячаў беларускай эміграцыі (М.Сяднёў, В.Кіпель і інш.). У лютым 1993 г. адбылася першая Усебеларуская канферэнцыя гісторыкаў, на якой абвешчана аб стварэнні Беларускай асацыяцыі гісторыкаў.

На пачатак 1994 г. у Беларусі налічвалася 38 тыс. навуковых работнікаў, у тым ліку 1420 дактароў і 15,8 тыс. кандыдатаў навук. У 1991 г. пачаў працаваць Фонд фундаментальных даследаванняў пры Савеце Міністраў РБ. Асноўнай функцыяй фонду з'яўляецца фінансавая падтрымка творчых калектываў і асобных навукоўцаў у выра-

шэнні актуальных навуковых праблем. Аднак на працягу 90-х гадоў ва ўмовах эканамічнага крызісу значна скараціліся выдаткі дзяржавы на навуку. Гэта прывяло да адтоку здольных вучоных за мяжу і ў іншыя сферы грамадскай дзейнасці.

На сучасным этапе плённай застаецца літаратурная творчасць Р.Барадуліна, Г.Бураўкіна, Я.Брыля, А.Дударава, С.Законнікава і інш. Высокай грамадзянскай пазіцыяй вылучаюцца творы В.Быкава, Н.Гілевіча. Сярод пісьменнікаў адной з найбольш важных з'яўляецца гістарычная тэматыка. Яна пераважае ў творчасці У.Арлова, Л.Дайнекі, К.Тарасава, В.Чаропкі. Выклікаюць цікавасць паэтычныя зборнікі А.Разанава, Т.Сапач, Л.Галубовіча і інш.

Побач з прызнанымі ў свеце творчымі калектывамі Беларускага акадэмічнага тэатра оперы і балета, Беларускага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я.Купалы прафесійным майстэрствам вылучаюцца акцёрскія трупы Маладзёжнага тэатра, тэатра-лабараторыі "Вольная сцэна", Альтэрнатыўнага тэатра, Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне і інш. У ліпені 1989 г. упершыню пад адкрытым небам у двары Траецкага прадмесця ў Мінску была пастаўлена опера У.Солтана "Дзікае паляванне караля Стаха". Новай з'явай стала стварэнне ў 1992 г. у Гомелі першага ў Беларусі прыватнага тэатра. У 1993 г. у рэспубліцы налічвалася 23 тэатры супраць 17 у 1985 г. Традыцыйным стала правядзенне музычных фестываляў "Віцебская восень", "Мінская вясна", "Беларуская сакавіца", беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне і інш.

У сучасным выяўленчым мастацтве Беларусі выразна пашырыліся нефармальныя тэндэнцыі. Адкрыліся недзяржаўныя галерэі: "Арт-творчасць", "Віта-нова", "Жыльбел", "Верхні горад" і інш. З'явіліся неафіцыйныя творчыя аб'яднанні. У складзе адной з такіх суполак "Пагоня" працуюць прызнаныя майстры А.Марачкін, Я.Кулік, К.Харашэвіч, А.Шатэрнік і інш. Традыцыйна высокім прафесіяналізмам вызначаецца беларуская школа графікі: В.Шаранговіч, А.Кашкурэвіч, М.Купава, Ю.Герасіменка-Жызнеўскі і інш.

У 90-х гадах адбыліся змены ў адносінах да суайчыннікаў за межамі Беларусі. Зроблены першыя крокі па азнаямленню грамадскасці з культурнымі набыткамі замежных суродзічаў. Поспехам карысталіся выступленні выканаўцы беларускіх песень Данчыка (Багдана Андрусішына), выставы такіх вядомых беларускіх замежных

мастакоў, як Анатоль Чайкоўскі (ФРГ), Лявон Тарасевіч і Мікола Давідзюк (Польшча), Галіна Русак (ЗША) і інш. З'явілася магчымасць шырэй пазнаёміцца з творчасцю літаратараў, якія апынуліся ў эміграцыі. Гэта незнаёмы дагэтуль шырокаму колу чытачоў пласт літаратурнай спадчыны, творы Н.Арсенневай, М.Сяднёва, К.Акулы, Ю.Віцьбіча і інш. Больш трывалымі сталі культурныя сувязі з беларусамі Польшчы. Наладзілася дзейнасць беларускіх культурна-асветніцкіх аб'яднанняў і таварыстваў у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Рызе. У Вільнюсе адноўлена выданне газеты "Наша ніва".

Дзейнасць па нацыянальна-культурнаму адраджэнню Беларусі, нягледзячы на пэўныя дасягнутыя поспехі, пакуль што не прывяла да кардынальных незваротных зрухаў. Дзяржава, грамадскія сілы не выкарыстоўваюць поўнасцю існуючыя для гэтага спрыяльныя магчымасці. Дзейнасць дзяржаўных устаноў і арганізацый культуры вызначаецца нярэдка адсутнасцю ўзважанай і прадуманай палітыкі, што кампраметуе традыцыі і сімвалы нацыянальнай культуры.

ВАЖНЕЙШЫЯ ДАТЫ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

100 — 35 тыс. гадоў назад	Паяўленне першых людзей на тэрыторыі Беларусі.
24-е тысячагоддзе да н.э.	Верхнепалеалітычная стаянка старажытнага чалавека каля в.Юравічы Калінкавіцкага раёна.
21-е тысячагоддзе да н.э.	Верхнепалеалітычная стаянка каля в.Бердыж Чачэрскага раёна.
862 г.	Першае ўпамінанне пра Полацк ў "Аповесці мінулых гадоў"
Каля 980 г.	Захоп Полацка наўгародскім князем Уладзімірам Святаславічам.
988 г.	Прыняцце хрысціянства ў Кіеўскай Русі.
? — да 1001 г.	Княжанне ў Полацку Ізяслава Уладзіміравіча.
988 — 1015 г.	Княжанне ў Тураве Святаполка Уладзіміравіча.
992 г.	Утварэнне епархіі ў Полацку.
1003 — 1044 гг.	Княжанне ў Полацку Брачыслава Ізяславіча.
1019 г.	Першае ўпамінанне ў летапісах пра г.Бярэсце (Брэст).
1021 г.	Паход полацкага князя Брачыслава Ізяславіча на Ноўгарад. Першае ўпамінанне ў летапісах пра г.Віцебск (датай узнікнення лічыцца 974 г. па паданню з Віцебскага летапісу Панцырнага і Аверкі).
50-я гады XI ст.	Будаўніцтва ў Полацку Сафійскага сабора.
1044 — 1101 гг.	Княжанне ў Полацку Усяслава Брачыславіча (Чарадзея).
1066 г.	Паход полацкага князя Усяслава Брачыславіча на Ноўгарад.
1067 г.	Першае ўпамінанне ў "Аповесці мінулых гадоў" пра г.Мінск (Меньск, Менеск). Бітва на р.Нямізе паміж войскамі полацкага князя Усяслава і кіеўскіх князёў Яраславічаў.
Каля 1120 — 1173 гг.	Жыццё і дзейнасць святой Ефрасінні Полацкай.
Каля 1130 — 1182 гг.	Жыццё і творчасць святога Кірылы Тураўскага.
1203, 1206, 1216 гг.	Паходы полацкіх дружын супраць крыжакоў.
Сярэдзіна XIII ст.	Заснаванне ў Верхнім Панямонні дзяржавы з цэнтрам у Наваградку — асновы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага (ВКЛ).
1293 — 1316 гг.	Княжанне Віценя ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1314 г.	Перамога войска пад камандаваннем гарадзенскага старасты Давыда над крыжакамі пад Наваградкам.
1316 — 1341 гг.	Княжанне Гедыміна ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1322 ці 1323 гг.	Разгром дружынамі гарадзенскага старасты Давыда нямецкіх і дацкіх рыцараў пад Псковам.
1345 — 1377 гг.	Княжанне Альгерда ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1377 — 1392 гг.	Княжанне Ягайлы ў Вялікім Княстве Літоўскім.
8 верасня 1380 г.	Кулікоўская бітва. У бітве ўдзельнічалі князі

	Андрэй, Дзмітрый Альгердавічы і Дзмітрый Баброк Валынскі са сваімі воінамі.
14 жніўня 1385 г.	Крэўская унія (дагавор аб саюзе) ВКЛ і Польскага каралеўства.
1390 г.	Атрыманне Бярэсцем магдэбургскага права.
1392 — 1430 гг.	Княжанне Вітаўта ў Вялікім Княстве Літоўскім.
15 ліпеня 1410 г.	Грунвальдская бітва. Разгром Тэўтонскага ордэна аб'яднанымі войскамі Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага.
1413 г.	Гарадзельская унія Вялікага Княства Літоўскага з Польскім каралеўствам.
1430 — 1432 гг.	Княжанне Свідрыгайлы ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1432 — 1436 гг.	Грамадзянская вайна ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1436 — 1440 гг.	Княжанне Жыгімонта Кейстутавіча ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1440 — 1492 гг.	Княжанне Казіміра ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1468 г.	Выданне судзебніка Казіміра.
Каля 1460 — 1530 гг.	Жыццё і дзейнасць ваеннага і палітычнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага К.І.Астрожскага.
Каля 1470 — каля 1533 гг.	Жыццё і дзейнасць М.Гусоўскага.
Каля 1490 — каля 1551 гг.	Жыццё і дзейнасць Ф.Скарыны.
1492 — 1506 гг.	Княжанне Аляксандра ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1498 г.	Атрыманне Полацкам магдэбургскага права.
1499 г.	Атрыманне Менскам (Мінскам) магдэбургскага права.
1500 — 1503 гг.	Вайна паміж Вялікім Княствам Маскоўскім і Вялікім Княствам Літоўскім.
1506 г.	Разгром войскамі Вялікага Княства Літоўскага пад камандаваннем М.Глінскага татар пад Клецкам.
1506 — 1548 гг.	Княжанне Жыгімонта Старога ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1507 — 1508 гг.	Вайна Вялікага Княства Маскоўскага з Вялікім Княствам Літоўскім.
1508 г.	Мяцеж М.Глінскага.
1512 — 1522 гг.	Вайна Вялікага Княства Маскоўскага з Вялікім Княствам Літоўскім.
8 верасня 1514 г.	Бітва пад Оршай. Разгром войскамі Вялікага Княства Літоўскага на чале з К.Астрожскім маскоўскага войска.
1529 г.	Зацвярджэнне I Статута Вялікага Княства Літоўскага.
1530 — 1593 гг.	Жыццё і дзейнасць С.Буднага.
Каля 1540 — 1600 гг.	Жыццё і дзейнасць В.Цяпінскага.
1548 — 1572 гг.	Княжанне ў ВКЛ Жыгімонта Аўгуста.
1557 г.	Выданне "Уставы на валокі".
1558 — 1583 гг.	Лівонская (Інфлянцкая) вайна.

1565 г.	Адміністрацыйна-тэрытарыяльная і судовая рэформы ў Вялікім Княстве Літоўскім.
1566 г.	Зацвярджэнне II Статута Вялікага Княства Літоўскага.
1 ліпеня 1569 г.	Люблінская унія — аб'яднанне Польскага каралеўства і Вялікага Княства Літоўскага ў адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую.
1572 — 1630 гг.	Жыццё і дзейнасць М.Сматрыцкага.
1579 г.	Заснаванне Віленскай езуіцкай акадэміі (будучы універсітэт).
1582 г.	Ям-Запольскае перамір'е паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай.
1587 — 1632 гг.	Караляванне ў Рэчы Паспалітай Жыгімонта Вазы.
1588 г.	Зацвярджэнне III Статута Вялікага Княства Літоўскага.
1596 г.	Берасцейская царкоўная унія. Стварэнне уніяцкай царквы на тэрыторыі Беларусі і Украіны.
1606 г., 1610 г.	Паўстанні гараджан Магілёва супраць магістрацкіх улад.
1629 — 1680 гг.	Жыццё і дзейнасць Сімяона Полацкага.
Каля 1634 — 1689 гг.	Жыццё і дзейнасць К.Лышчынскага.
1648 — 1651 гг.	Казацка-сялянская вайна на Беларусі.
1654 — 1667 гг.	Вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай.
1700 — 1721 гг.	Паўночная вайна Расіі са Швецыяй.
9 кастрычніка 1708 г.	Разгром рускімі войскамі шведскага корпуса ген. Левенгаўпта каля в.Лясная.
1740 — 1744 гг.	Паўстанне сялян у Крычаўскім старостве.
1768 г.	Рашэнне сейма Рэчы Паспалітай аб ураўноўванні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з каталікамі.
1772 г.	Першы падзел Рэчы Паспалітай, уключэнне ўсходняй часткі Беларусі ў Расійскую імперыю.
3 мая 1791 г.	Прыняцце сеймам Рэчы Паспалітай Канстытуцыі.
1793 г.	Другі падзел Рэчы Паспалітай. Далучэнне цэнтральнай часткі Беларусі да Расійскай імперыі.
1794 г.	Паўстанне Т.Касцюшкі.
1795 г.	Трэці падзел Рэчы Паспалітай, далучэнне заходняй часткі Беларусі да Расійскай імперыі.
1807 — 1884 гг.	Жыццё і творчасць В.І.Дуніна-Марцінкевіча.
1810 г.	Утварэнне ваенных пасяленняў на Беларусі.
12 чэрвеня 1812 г.	Нашэсце арміі Напалеона I на Расію.
1 ліпеня 1812 г.	Утварэнне Часовага ўрада Вялікага Княства Літоўскага.
1830 — 1831 гг.	Шляхецкае паўстанне ў Польшчы, на Беларусі, Правабярэжнай Украіне і ў Літве.
1831 г.	Скасаванне Статута Вялікага Княства Літоўскага ў Віцебскай і Магілёўскай губернях.
1832 г.	Закрыццё Віленскага універсітэта.
1838 — 1864 гг.	Жыццё і дзейнасць К.Каліноўскага.
1839 г.	Скасаванне уніяцкай царквы на Беларусі.

1840 — 1900 гг.	Жыццё і творчасць Ф.К.Багушэвіча.
1840 г.	Указ Мікалая I аб адмене дзеяння Статута Вялікага Княства Літоўскага ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях.
1848 г.	Стварэнне Горы-горацкага земляробчага інстытута.
40-я — сяр. 50-х гг.	Рэформа П.Дз.Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы і інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы.
19 лютага 1861 г.	Адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі.
1863 — 1864 гг.	Паўстанне на Беларусі і ў Літве пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага.
1873 — 1875 гг.	Узнікненне першых народніцкіх гурткоў у беларускіх гарадах.
1876 г.	Забастоўка рабочых Мінскіх чыгуначных майстэрняў.
1879 — 1882 гг.	Дзейнасць у Мінску гуртка ў арганізацыі "Чорны перадзел".
1880 — 1889 гг.	Дзейнасць у Мінску гурткоў "Народнай волі".
1885 г.	Узнікненне першых рабочых гурткоў у Мінску.
1897 г.	Першы з'езд прадстаўнікоў яўрэйскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый у Вільні. Утварэнне Бунда.
1 — 3 (13 — 15) сакавіка 1898 г.	Першы з'езд РСДРП у Мінску.
1902 г.	Утварэнне партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў).
1903 г.	Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ).
1904 г.	Утварэнне Палескага і Паўночна-Заходняга камітэтаў РСДРП.
1905 — 1907 гг.	Першая буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя ў Расіі.
1906 г.	Пачатак выдання першых легальных беларускіх газет "Наша доля" і "Наша ніва".
1907 — 1913 гг.	Дзейнасць Першай беларускай таэтральнай трупы І.Буйніцкага.
1911 г.	Закон аб увядзенні земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях.
19 ліпеня 1914 г.	Аб'яўленне Германіяй і Аўстра-Венгрыяй вайны Расіі.
1915 г.	Акупацыя войскамі Германіі тэрыторыі Беларусі да лініі Дзвінск — Паставы — Баранавічы — Пінск.
Сакавік 1916 г.	Наступальная аперацыя рускіх войскаў Заходняга фронту ў раёне возера Нарач.
27 лютага 1917 г.	Перамога Лютаўскага буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі.
Сакавік 1917 г.	Утварэнне Мінскага, Гомельскага, Віцебскага і іншых Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў.
25 — 27 сакавіка 1917 г.	З'езд беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый (Мінск). Заснаванне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК).
Чэрвень 1917 г.	Утварэнне Заходняй вобласці.

8 — 10 ліпеня 1917 г.	Другі з'езд беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый (Мінск). Стварэнне Цэнтральнай беларускай рады (ЦБР).
15 — 18 верасня 1917 г.	Першая Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б) у Мінску. Утварэнне Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б).
15 — 17 кастрычніка 1917 г.	II сесія Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый.
25 кастрычніка 1917 г.	Перамога ўзброенага паўстання ў Петраградзе.
Кастрычнік — лістапад 1917 г.	Устанаўленне савецкай улады на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі.
26 лістапада 1917 г.	Утварэнне Абласнога выканаўчага камітэта Савета дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах) і Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці.
15 — 17 снежня 1917 г.	I Усебеларускі з'езд (кангрэс) прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый.
12 студзеня 1918 г.	Пачатак мецяжу корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага супраць савецкай улады.
31 студзеня 1918 г.	Дэкрэт СНК РСФСР аб утварэнні Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама).
18 лютага 1918 г.	Пачатак наступлення германскіх войскаў і акупацыі Цэнтральнай і Усходняй Беларусі.
20 — 21 лютага 1918 г.	Стварэнне ў Мінску (ад імя Рады Усебеларускага з'езда) Народнага Сакратарыята Беларусі — першага ўрада Беларусі.
9 сакавіка 1918 г.	Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).
18 сакавіка 1918 г.	Перайменаванне Рады Усебеларускага з'езда ў Раду БНР.
25 сакавіка 1918 г.	Абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).
Лістапад — снежань 1918 г.	Вызваленне Беларусі ад нямецкіх захопнікаў.
1 студзеня 1919 г.	Абвяшчэнне Беларускай ССР. Стварэнне Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі на чале з Д.Ф.Жылуновічам.
2 — 3 лютага 1919 г.	I Усебеларускі з'езд Саветаў. Прынятце першай Канстытуцыі БССР. Выбары ЦВК ЛітССР.
27 лютага 1919 г.	Першае аб'яднанае пасяджэнне ЦВК ЛітССР і ЦВК БССР.
Сакавік 1919 — кастрычнік 1920 г.	Польска-савецкая вайна.
31 ліпеня 1920 г.	Прынятце "Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці БССР".
Лістапад — снежань 1920 г.	Слуцкае паўстанне.
18 сакавіка 1921 г.	Падпісанне ў Рызе мірнага дагавору паміж Савецкай Расіяй і Польшчай.
21 сакавіка 1921 г.	Дэкрэт аб замене харчовай развёрсткі натуральным падаткам. Пачатак новай эканамічнай палітыкі.

14 — 18 снежня 1922 г.	IV Усебеларускі з'езд Саветаў. Рашэнне аб добраахвотным уваходжанні БССР у склад Саюза ССР.
30 снежня 1922 г.	I Усесаюзны з'езд Саветаў. Прыняцце Дэкларацыі і Дагавора аб утварэнні Саюза ССР.
Кастрычнік 1923 г.	I канферэнцыя камуністычных арганізацый Заходняй Беларусі. Стварэнне КПЗБ.
7 сакавіка 1924 г.	Першае ўзбуйненне БССР.
15 ліпеня 1924 г.	Пастанова II сесіі ЦВК БССР аб правядзенні палітыкі беларусізацыі.
Ліпень 1925 — сакавік 1927 г.	Дзейнасць у Заходняй Беларусі Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ).
8 снежня 1926 г.	Другое ўзбуйненне БССР.
5 — 12 красавіка 1927 г.	VIII з'езд Саветаў БССР. Прыняцце новай Канстытуцыі БССР.
1 студзеня 1929 г.	Заснаванне Акадэміі навук Беларускай ССР.
2 жніўня 1932 г.	Пастанова СНК БССР "Аб увядзенні на Беларусі усеагульнага абавязковага навучання для малапісьменных".
1936 — 1938 гг.	Новая хваля масавых арыштаў і рэпрэсій.
19 лютага 1937 г.	Прынятце новай Канстытуцыі БССР.
17 верасня 1939 г.	Пераход Чырвонай Арміяй савецка-польскай граніцы. Далучэнне Заходняй Беларусі да БССР.
28 — 30 кастрычніка 1939 г.	Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі ў Беластоку, на якім прынята дэкларацыя аб абвяшчэнні савецкай улады.
2 лістапада 1939 г.	Прыняцце нечарговай V сесіяй Вярхоўнага Савета СССР закона аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб уз'яднанні яе з Беларускай ССР.
22 чэрвеня 1941 г.	Вераломны напад гітлераўскай Германіі на СССР.
22 чэрвеня — канец ліпеня 1941 г.	Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці.
3 — 26 ліпеня 1941 г.	Абарона Магілёва.
9 верасня 1942 г.	Стварэнне Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР).
3 жніўня — верасень 1943 г.	Першы этап "рэйкавай вайны".
19 верасня — пачатак лістапада 1943 г.	Другі этап "рэйкавай вайны" — аперацыя "Канцэрт".
Верасень — лістапад 1943 г.	Вызваленне ўсходніх раёнаў БССР ад фашысцкіх захопнікаў.
20 чэрвеня — ліпень 1944 г.	Трэці этап "рэйкавай вайны".
17 чэрвеня 1944 г.	Другі Усебеларускі кангрэс, скліканы БЦР у Мінску.
23 чэрвеня — 29 жніўня 1944 г.	Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён".
Чэрвень 1945 г.	Дэлегацыя БССР падпісала статут ААН.

30 жніўня 1945 г.	Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР "Аб ратыфікацыі Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый".
11 верасня 1946 г.	Закон "Аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1946 — 1950 гг."
Снежань 1947 г.	Адмена картачнай сістэмы, грашовая рэформа ў СССР.
Снежань 1948 г.	Пачатак суцэльнай калектывізацыі ў Заходняй Беларусі
1954 г.	Уступленне БССР у міжнародную арганізацыю працы (МАП) і Арганізацыю па пытаннях асветы, навукі і культуры (ЮНЕСКА).
1958 г.	Стварэнне Савета Народнай Гаспадаркі БССР.
1965 г.	Вяртанне ад саўнаргасаў да міністэрстваў.
26 чэрвеня 1974 г.	Прысваенне Мінску ганаровага звання "горад-герой".
1975 г.	Утварэнне вытворчага аб'яднання "Беларуськалій" (у Салігорску).
14 красавіка 1978 г.	Прыняцце новай Канстытуцыі Беларускай ССР.
26 красавіка 1986 г.	Аварыя на Чарнобыльскай АЭС.
30 кастрычніка 1988 г.	Мітынг-рэквіем "Дзяды" ў Мінску.
24 — 25 чэрвеня 1989 г.	Устаноўчы з'езд Беларускага народнага фронту "Адраджэньне" (Вільнюс).
26 студзеня 1990 г.	Прыняты закон аб мовах у Беларускай ССР, паводле якога беларуская мова юрыдычна абвешчана дзяржаўнай.
27 ліпеня 1990 г.	Вярхоўны Савет БССР прыняў "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР".
25 жніўня 1991 г.	Вярхоўны Савет БССР надаў дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР канстытуцыйны статус і прыпыніў дзейнасць КПБ.
8 снежня 1991 г.	Белавежскія пагадненні аб спыненні дзейнасці СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД).
15 сакавіка 1994 г.	Прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.
10 ліпеня 1994 г.	Выбранне першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗМЕСТ

Ад аўтараў 3

РАЗДЗЕЛ 1. ПЕРШАБЫТНАЕ ГРАМАДСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ 4
1. Каменны і бронзавы вякі на беларускіх землях (*А.П. Ігнаценка*) ... 4
2. Насельніцтва Беларусі ў раннім жалезным веку (VII ст. да н.э. – V ст. н. э.) (*А.П. Ігнаценка*) 9

РАЗДЗЕЛ 2. ПАХОДЖАННЕ БЕЛАРУСАЎ (*М.Ф. Піліпенка*) 15

РАЗДЗЕЛ 3. БЕЛАРУСЬ У IX – СЯРЭДЗІНЕ XIII ст. 24
1. Полацкае княства (*С.В. Тарасаў*) 24
2. Тураўскае княства (*С.В. Тарасаў*) 29
3. Феадальная раздробленасць у XII – XIII стст. (*А.П. Ігнаценка*) 32
4. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй і нашэсцем татар (*А.П. Ігнаценка*) .. 35
5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў IX – XIII стст. (*А.П. Ігнаценка*) 40
6. Рэлігія і культура (*С.В. Тарасаў*) 45

РАЗДЗЕЛ 4. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIII – СЯРЭДЗІНЕ XVII ст. 49
1. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (*П.А. Лойка*) 49
2. Унутры- і знешнепалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў XIV – першай палове XVI ст. (*П.А. Лойка*) 54
3. Люблінская унія 1569 г. Месца Вялікага Княства Літоўскага ў палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай (*П.А. Лойка*) 58
4. Царква і рэлігія (сярэдзіна XIII – сярэдзіна XVII ст.) (*С.В.Палуцкая*) 61
5. Развіццё феадальных адносін (*П.А. Лойка*) 68
6. Культура сярэдзіны XIII – сярэдзіны XVII ст. (*Т.П. Казакова*) .. 72
7. Этнічныя працэсы на беларускіх землях (сярэдзіна XIII – сярэдзіна XVII ст.) (*С.В. Палуцкая*) 79

РАЗДЗЕЛ 5. БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII – XVIII ст. 86
1. Войны сярэдзіны XVII ст. (*Г.М. Сагановіч*) 86
2. Эканамічны заняпад і сацыяльныя супярэчнасці ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст. (*А.П. Ігнаценка*) 91
3. Палітычны крызіс (*У.П. Емельянчык*) 95
4. Развіццё эканомікі ў другой палове XVIII ст. (*А.П. Ігнаценка*) 99
5. Спробы рэформ у Рэчы Паспалітай і яе падзелы (*У.П. Емельянчык*) 104
6. Культура Беларусі другой паловы XVII – XVIII ст. (*А.Г. Каханоўскі*) 108

РАЗДЗЕЛ 6. БЕЛАРУСЬ У КАНЦЫ XVIII – СЯРЭДЗІНЕ XIX ст. 117
1. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі (*У.А. Сосна*) 117
2. Вайна 1812 г. і Беларусь (*У.А. Сосна*) 120
3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё (*У.А. Сосна*) 124
4. Грамадскі рух і палітыка царызму. (*У.А. Сосна*) 128
5. Культура (*С.Я. Сяльвестрава*) 132

РАЗДЗЕЛ 7. БЕЛАРУСЬ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. 140
1. Паўстанне 1863 г. Прычыны і характар паўстання (*В.А. Цяплова*).. 140
2. Сельская гаспадарка ў другой палове XIX ст. (*В.А. Цяплова*) 144
3. Развіццё прамысловасці і гарадоў у другой палове XIX ст. (*А.Г. Каханоўскі*) 150
4. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове XIX ст. (*В.А. Цяплова*) 154
5. Фарміраванне беларускай нацыі (*А.Г. Каханоўскі*) 161
6. Культура Беларусі другой паловы XIX ст. (*А.Л. Абецэдарская*) .. 165
7. Рэвалюцыйныя падзеі 1905 – 1907 гг. на Беларусі (*П.І. Брыгадзін*) 169
8. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі у 1906 – 1913 гг. (*П.І. Брыгадзін*) 174
9. Культура Беларусі ў пачатку XX ст. (*В.Р. Рудкін*) 176

РАЗДЗЕЛ 8. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1914 – 1918) 182
1. Становішча на Беларусі ў гады вайны (*В.Р. Рудкін*) 182
2. Змены ў грамадска-палітычных адносінах на Беларусі з лютага па снежань 1917 г. (*П.Г. Брыгадзін*) 187
3. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі і дзейнасць яе Рады (*Ю.Л. Казакоў*) 193

РАЗДЗЕЛ 9. БЕЛАРУСЬ У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1919 – 1939) 199
1. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Савецкай Беларусі (*Я.Ю. Несцяровіч*) 199
2. Савецкая Беларусь ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі (*С.М. Ходзін*) 207
3. БССР у перыяд усталявання таталітарнага рэжыму (*В.І. Меньковскі*) 212
4. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы (*Я.Ю. Несцяровіч*) 221
5. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (*Я.Ю. Несцяровіч*) 224
6. Культура беларускага народа (*С.М. Ходзін*) 230

РАЗДЗЕЛ 10. БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (1939 – 1945) 239
1. Аб'яднанне беларускіх зямель (*П.І. Зялінскі*) 239
2. Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі (*Л.А. Жылуновіч*) 243
3. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі (*А.Г. Каханоўскі*) 247
4. Антыфашысцкая барацьба (*Л.А. Жылуновіч*) 251
5. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне другой сусветнай вайны (*Л.А. Жылуновіч*) 257

РАЗДЗЕЛ 11. БССР У ПАСЛЯВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1945–1991) . 264
1. Беларусь на міжнароднай арэне (*Ю.Л. Казакоў*) 264
2. Развіццё эканомікі (*С.М. Ходзін*) 268
3. Грамадска-палітычнае жыццё (*Ю.Л. Казакоў*) 276
4. Адукацыя, навука і культура (*С.М. Ходзін*) 281

РАЗДЗЕЛ 12. РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ (1991 – 1995) 287
1. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь (*В.І. Меньковскі*) 287
2. Знешняя палітыка Беларусі (*Ю.Л. Казакоў*) 289
3. Сацыяльна-эканамічны крызіс (*В.І. Меньковскі*) 292
4. Культура Беларусі на сучасным этапе (*А.Г. Каханоўскі*) 297

Важнейшыя даты гісторыі Беларусі 302

Вучэбнае выданне

Абецэдарская Алена Лаўрэнцьеўна
Брыгадзін Пётр Іванавіч
Жылуновіч Леанід Аляксандравіч і інш.

Дапаможнік па гісторыі Беларусі
для паступаючых у вышэйшыя
навучальныя ўстановы

Рэдактар Л.М. Салаўёва
Мастак Л.М. Гоманаў

Падпісана ў друк 22.05.95. Фармат 84×108/32. Друк афсетны.
Папера газетная . Ум.друк.арк. 16,2. Ум.фарба-адб. 16,4.
Ул.-выд.арк. 17,9. Тыраж 20 000 экз. Заказ № 5396
Тэкст набраны і апрацаваны на ПК тыпу IBM PC
у тэкставым рэдактары LEXICON.
Вёрстка ажыццёўлена ў праграме XEROX VENTURA PUBLISHER.
Навукова-камерцыйная фірма "Экаперспектыва". Ліцэнзія № 509.
220672, г.Мінск-70, пр.Партызанскі, 26.
Надрукавана з арыгінал-макета фірмы "Экаперспектыва"
у друкарні "Перамога" Міністэрства культуры і друку РБ.
222310, г.Маладзечна, вул. Таўлая, 11.



ДАПАМОЖНІК